ПАМЯЦЬ

БЫХАЎСКІ РАЁН

Быховский районный историко-краеведческий музей

- SCAN -
Быховский районный
историко-краеведческий
музей

БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАМЯЦЬ

ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЯ ХРОНІКА
БЫХАЎСКАГА РАЁНА

Быховский районный историко-краеведческий музей

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ САВЕЦКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ»
ІМЯ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ
1990

ББК 63.3/2Б/
П 15

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

І. П. ШАМЯКІН (галоўны рэдактар), Г. Е. БАРЫСАЎ, Г. К. КІСЯЛЁЎ, Я. В. МАЛАШЭВІЧ (адказны сакратар), А. Р. ПАЗЮМКА, А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), С. П. САМУЭЛЬ, І. П. ХАЎРАТОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара).

КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННЮ
ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

А. Р. ПАЗЮМКА (старшыня камісіі, першы сакратар Быхаўскага райкома партыі), Д. М. АБРАМОВІЧ, В. Ц. АЎХАЧОЎ, С. М. БАЖКОЎ, Г. Е. БАРЫСАЎ, В. Н. БУЕВІЧ, У. М. ГРЫШЧАНКА, М. М. КРАСНІЦКІ, Р. З. СВЯТОХА, П. М. ФІТКЕВІЧ, М. П. ХОБАТАЎ.

Мастак А. М. ХІЛЬКЕВІЧ

П 15 **Памяць:** Гісторыка-дакументальная хроніка Быхаў. р-на/ Беларус. Сав. Энцыкл.; Рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) і інш.; Маст. А. М. Хількевіч.— Мн.: БелСЭ, 1990.—576 с., [8] л. іл.: іл.
ISBN 5-85700-027-0
Память: Историко-документальная хроника Быхов. р-на.

У кнізе змешчаны дакументальныя матэрыялы, успаміны, нарысы, артыкулы, якія расказваюць пра гісторыю раёна, яго выдатных людзей, пра тых, хто заваёўваў і адстойваў Савецкую ўладу. Прыводзяцца звесткі пра загінуўшых партызанаў, падпольшчыкаў і мірных жыхароў — ахвярах фашысцкага тэрору, воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі і пахаваны на тэрыторыі раёна, пра воінаў-землякоў, паўшых на франтах Вялікай Айчыннай вайны, а таксама пра воінаў-інтэрнацыяналістаў, што загінулі ў Афганістане.

П 0503020903—006 / М 318(03)—90 — 5—90

ББК 63.3(2Б)

ISBN 5-85700-027-0

© Выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі, 1990

Быховский районный историко-краеведческий музей

Быховский районный историко-краеведческий музей

Быховский районный историко-краеведческий музей

Быховский районный историко-краеведческий музей

Быховский районный историко-краеведческий музей

Быховский районный историко-краеведческий музей

Быховский районный историко-краеведческий музей

Быховский районный историко-краеведческий музей

Быховский районный историко-краеведческий музей

Быховский районный историко-краеведческий музей

Быховский районный историко-краеведческий музей

Да чытача

Гэта кніга, як і многае на нашай зямлі, рабілася талакою, многімі руплівымі людзьмі, рабілася з добрым сэрцам і ўсведамленнем вялікай вартасці сваёй гісторыі, высокага гонару сваіх продкаў, іх неўміручых спраў і на полі бітвы, і на хлебным полі.

Гісторыка-дакументальная хроніка Быхаўскага раёна складзена на аснове шматлікіх матэрыялаў, якія друкаваліся ў раённай газеце «Маяк Прыдняпроўя» пад рубрыкамі «Адкрытая кніга Быхаўшчыны» і «Летапіс народнай славы», публікацый у іншых газетах і кнігах, на падставе архіўных дакументаў, навуковых даследаванняў, успамінаў удзельнікаў і сведкаў шматлікіх гістарычных падзей, што адбываліся ў жыцці краіны і народа. У пошуку і зборы матэрыялаў прымалі ўдзел прадстаўнікі грамадскасці Быхаўскага раёна, супрацоўнікі архіваў, бібліятэк, музеяў, журналісты, рэдактары БелСЭ.

Сіламі шырокай грамадскасці раёна складзены адзін з асноўных раздзелаў кнігі — спісы загінуўшых воінаў-землякоў, партызан, падпольшчыкаў і мірных жыхароў — ахвяр фашысцкага тэрору, а таксама спісы воінаў Чырвонай Арміі, што загінулі пры абароне і вызваленні Быхаўшчыны ад нямецка-фашысцкіх акупантаў.

У кнізе выкарыстаны матэрыялы і дакументы партархіва Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ, Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі, вышэйшых органаў дзяржаўнай улады і органаў дзяржаўнага кіравання СССР, Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР, Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва СССР, Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва БССР, партархіва Магілёўскага абкома КП Беларусі, Дзяржаўнага архіва Магілёўскай вобласці, Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна, Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Быхаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.

Выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі вельмі ўдзячна ўстановам, арганізацыям і прыватным асобам, якія аказалі садзеянне ў зборы, падрыхтоўцы і ўдакладненні матэрыялаў кнігі «Памяць».

Быховский районный историко-краеведческий музей



Быхаўскі раён размешчаны ў паўднёвай частцы Магілёўскай вобласці. Утвораны 17.7. 1924 г. Плошча 2,3 тыс. км^2. Населеных пунктаў 236 (1988), у тым ліку горад Быхаў — цэнтр раёна. 15 сельсаветаў: Абідавіцкі, Баркалабаўскі, Верхнятошчыцкі, Гарадзецкі, Глухскі, Грудзінаўскі, Дунайкаўскі, Лудчыцкі, Навабыхаўскі, Следзюкоўскі, Трылесінскі, Холстаўскі, Чарнаборскі, Чырвонаслабодскі, Ямніцкі. Тэрыторыя раёна знаходзіцца ў межах Цэнтральнабярэзінскай і Чачорскай раўнін, 60 % тэрыторыі размешчана на вышыні 160—150 м. Карысныя выкапні: торф, мел, пясок, пясчана-жвіровы матэрыял, гліна. Сярэдняя тэмпература студзеня -7,2 °С, ліпеня 18,3 °С. Ападкаў 600 мм за год. Вегетацыйны перыяд 189 сутак. У межах раёна працякаюць рэкі Дняпро з прытокамі Ухлясць, Лахва, Баброўка, Макранка і інш., Друць з прытокамі Грэза і Балонаўка. На мяжы з Кіраўскім раёнам на Друці створана Чыгірынскае вадасховішча. Пад лесам 39 % тэрыторыя раёна, пад сельскагаспадарчымі ўгоддзямі 44,8 % (27,7 % ворных зямель, 16 % сенажацей і пашаў). У раёне 15 калгасаў і 14 саўгасаў, племзавод «Вараніно», якія спецыялізуюцца на малочна-мясной жывёлагадоўлі, ільнаводстве. Прадпрыемствы харчовай, лёгкай, паліўнай прамысловасці, будматэрыялаў. Ёсць лесапаляўнічая гаспадарка. Зоны адпачынку Баброўка, часткова Лахва, Чыгірынка. Працуе дзіцячы санаторый «Чачэвічы». Па тэрыторыі раёна праходзяць чыгунка і аўтамабільная дарога Магілёў — Рагачоў, аўтадарогі Магілёў — Гомель, Магілёў — Бабруйск. Выдаецца раённая газета «Маяк Прыдняпроўя».

Быховский районный историко-краеведческий музей

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Магчыма, чалавек на тэрыторыю Быхаўшчыны пранікаў у эпоху палеаліту, аб чым сведчыць скрэбла часоў мусцьерскай культуры, знойдзенае ў адкладах 2-й надпоймавай тэрасы Дняпра каля вёскі Абідавічы Быхаўскага раёна.

Засяленне Быхаўшчыны адбылося ў раннім мезаліце (9—6-е тысячагоддзі да н. э.). Да таго часу адносяцца стаянкі, выяўленыя каля вёсак Баркалабава, Бароўка, Дальняе Ляда, Лудчыцы, Янава. Археалагічныя раскопкі паселішчаў каля в. Лудчыцы выявілі рэшткі жытла авальнай формы, паглыбленага ў мацярык на 0,1—0,2 м, за 2 м на захад ад яго прасочана агнішча дыяметрам 0,6 м. Тут знойдзены крамянёвыя трохкавыя наканечнікі стрэл, разцы, скрабкі, вастрыі, прылады з выемкамі, пласціны і адшчэпы з рэтушшу і інш. Пры вывучэнні стаянкі каля в. Янава на глыбіні 0,4 м ускрыта 3 скопішчы расшчэпленага крэменю памерам 4×5 м — майстэрні па вырабу прылад працы. Калекцыя крамянёвага інвентару налічвае больш за 2 тысячы экземпляраў. Сярод іх наканечнікі стрэл, бакавыя, сярэдзінныя і вуглавыя разцы, канцавыя скрабкі, прылады з выемкамі, вастрыі, пласціны з рэтушшу і адшчэпы.

Характэрныя рысы эпохі позняга мезаліту (6—5-е тысячагоддзі да н. э.) — паяўленне лука і стрэл, прыручэнне сабакі, пашырэнне макралітычных прылад працы: трубаабабітых трапецападобных і авальных сякер, трохгранных пікападобных прылад, долатаў, разцоў, скрэблаў, разакоў. У эпоху позняга мезаліту ў сувязі з паніжэннем узроўню вады ў рэках змянілася і тапаграфія паселішчаў. Стаянкі гэтага часу выяўлены на 1-й надпоймавай тэрасе Дняпра (Новы Быхаў, Няраж, Холстаў). Тут апрача традыцыйнага інвентару (скрабкі розных форм, разцы, наканечнікі стрэл) знойдзены новыя прылады працы ў выглядзе вырабаў сякерападобных форм, сякерак з перахватам і цёслаў, якія раней не трапляліся.

Размяшчэнне мезалітычных паселішчаў на берагах рэк дазваляла іх жыхарам займацца не толькі паляваннем, але і рыбалоўствам, па-ранейшаму было пашырана збіральніцтва. У эпоху мезаліту адбывалася драбленне вялікіх абшчын на меншыя, паміж якімі захоўваліся сваяцкія адносіны. Абшчыны складалі буйныя этнаграфічныя аб'яднанні — плямёны, што жылі на адзінай тэрыторыі і мелі комплекс агульных устойлівых рыс у сферы матэрыяльнай і духоўнай культуры. Наяўнасць падобных прыкмет дазволіла вылучыць у Верхнім Падняпроўі, у тым ліку і на тэрыторыі Быхаўшчыны, лакальную мезалітычную культуру, якая атрымала назву верхнедняпроўскай.

У канцы 5 — пачатку 4-га тысячагоддзяў да н. э. пачаўся неаліт (новы каменны век). На тэрыторыі Быхаўшчыны вядомы 23 неалітычныя стаянкі. У гэты перыяд больш дакладна акрэсліваліся археалагічныя культуры, у тым ліку верхнедняпроўская. Для носьбітаў верхнедняпроўскіх плямён характэрны паселішчы, размешчаныя на 1-й надпоймавай тэрасе або на невысокіх узгорках у поймах рэк, драўляныя, наземныя, ледзь заглыбленыя ў мацярык жытлы авальнай ці круглаватай формы, вастрадонны і яйцападобны посуд, арнаментаваны грабеньчатым штампам і ямачнымі ўцісканнямі, невялікія крамянёвыя сякеры, наканечнікі стрэл ромбападобнай формы, міндалепадобныя прылады працы.

Найбольш вядомыя і вывучаныя стаянкі верхнедняпроўскай культуры на тэрыторыі Быхаўскага раёна каля в. Вець. Стаянка Вець-1 выяўлена на левым беразе р. Гутлянка, пры ўпадзенні яе ў пойму Дняпра на пясчаным узвышшы, за 0,5 км на поўдзень ад вёскі. Тут знойдзены крамянёвыя скрабкі, нажы, клінападобныя сякеры, фрагменты ляпной керамікі, упрыгожанай адбіткамі грэбеня, ямкамі, лапкамі. Стаянка Вець-2 — на правым беразе воз. Станавое, на невялікім пясчаным узвышшы, за 0,9 км на поўдзень ад вёскі. У культурным пласце знойдзены крамянёвыя наканечнікі стрэл, сякеры, скрабкі, ножападобныя пласціны, адшчэпы, ляпная кераміка, упрыгожаная адбіткамі грэбеня, ямкамі. Размяшчэнне гэтых

Быховский районный историко-краеведческий музей

ПОМНІКІ БЫХАЎСКАГА РАЁНА



сталяк непадалёку ад вады дае магчымасць меркаваць, што ў гаспадарчым укладзе іх жыхароў важнае месца займала рыбная лоўля, былі пашыраны таксама традыцыйныя заняткі: паляванне і збіральніцтва.

На мяжы 3—2-га тысячагоддзяў да н. э. на тэрыторыі Беларускага Падняпроўя пачаўся бронзавы век. Аддаленасць ад старажытных цэнтраў металургіі абумовіла панаванне тут амаль на працягу ўсёй эпохі каменных прылад працы, аднак зроблены яны значна лепш: пры іх апрацоўцы шырока выкарыстоўвалася шліфаванне, свідраванне, пілаванне. У бронзавым веку адбывалася далейшае развіццё жывёлагадоўлі і земляробства і паступовае ператварэнне іх у пануючыя формы гаспадаркі, пашыраўся абмен паміж плямёнамі, мацярынска-родавыя адносіны паступова змяняліся патрыярхальнымі. У канцы 3-га тысяча-

Быховский районный историко-краеведческий музей

годдзя да н. э. жывёлагадоўча-земляробчыя плямёны сярэднедняпроўскай культуры з поўдня прасунуліся ў верхняе Падняпроўе і асімілявалі мясцовае неалітычнае насельніцтва. Максімальная канцэнтрацыя помнікаў сярэднедняпроўскіх плямён прасочваецца ў парэччы Дняпра, у тым ліку і на Быхаўшчыне.

Для носьбітаў сярэднедняпроўскай культуры характэрны невялікія адкрытыя паселішчы ў поймах рэк, на невысокіх узвышшах, радзей на 1-й надпоймавай тэрасе і высокіх узгорках. Іх жытлы былі наземныя, слупавой канструкцыі, у цэнтры размяшчаліся адкрытыя агнішчы, паглыбленыя ў зямлю і абкладзеныя камянямі. На тэрыторыі Быхаўскага раёна выяўлена 10 паселішчаў эпохі ранняй бронзы. Найбольш даследавана паселішча ва ўрочышчы Ксяндзова Гара, за 4 км на поўдзень ад Быхава. Паселішча займала пясчанае ўзвышша ў пойме правага берага Дняпра. Прасочаны рэшткі наземных жытлаў з ямамі ад слупоў. Расчышчаны тры ямы з-пад агнішчаў авальнай і круглай форм, выкапаныя ў мацярык і запоўненыя вуголлем і попелам. Выяўлены тры агнішчы, выкладзеныя з камянёў. Найлепш захавалася агнішча, акрэсленае трыма камянямі, два з якіх ляжалі паралельна адзін аднаму, а трэці перпендыкулярна да іх. Знойдзены крамянёвыя прылады працы: скрабкі на пласцінах і адшчэпах, скрэблы, нажы, клінападобныя сякеры, лістападобныя, ромбападобныя, трохвугольныя наканечнікі стрэл, каменны адбойнік, абломак зерняцёркі і інш. Кераміка прадстаўлена фрагментамі пасудзін 3 тыпаў: з прамой адагнутай шыйкай, круглаватым тулавам і плоскім дном, арнаментаваных у выглядзе адбіткаў перавітай вяровачкі, лінейнага і зубчастага штампаў, наразных ліній, якія ўтвараюць кампазіцыі

Стаянка перыяду ранняга мезаліту каля в. Дальняя Ляда. Агульны выгляд.

трохвугольнікаў, гарызантальных і дыяганальных радоў; пласкадонныя пасудзіны слоікавай формы без арнаменту; танкасценныя пасудзіны з высокай, прама адагнутай шыйкай, шарападобным тулавам і круглаватым дном.

У сярэдзіне 2-га тысячагоддзя да н. э. поўдзень тэрыторыі Магілёўшчыны (да Быхава і Слаўгарада) насялялі плямёны сосніцкай культуры. Яны жылі на паселішчах у паўзямлянкавых жытлах з глінабітнымі агнішчамі ў сярэдзіне, займаліся земляробствам, жывёлагадоўляй, паляваннем, а таксама бронзаліцейнай справай, карысталіся каменнымі і крамянёвымі прыладамі працы, асабліва дзяржанневымі наканечнікамі стрэл і крамянёвымі сярпамі. Іх кераміка — кругладонныя і пласкадонныя гаршкі, упрыгожаныя па ўсёй паверхні зігзагамі, гарызантальнымі палосамі нарэзак або адбіткамі прамавугольнага штампа, ружанцавым, шнуравым або пракрэсленым арнаментам.

У 7 стагоддзі да н. э. на тэрыторыі Магі-



Палеанталагічныя і археалагічныя знаходкі на стэндах Быхаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.

Быховский районный историко-краеведческий музей



Крамянёвыя прылады працы са стаянкі ранняга мезаліту каля в. Дальняя Ляда.

Крамянёвыя прылады працы з паселішча ранняга мезаліту каля в. Лудчыцы.

лёўшчыны пачаўся жалезны век. Жалеза здабывалася з балотнай руды сыродутным спосабам у печах-домніцах. Зроблены з яго прылады працы і зброя былі значна мацнейшыя за каменныя і бронзавыя. Выкарыстанне жалезных прылад працы спрыяла далейшаму развіццю земляробства і жывёлагадоўлі, стварала ўмовы для атрымання прыбавачнага прадукту.

У 7—3 стагоддзях да н. э. тэрыторыю Магілёўшчыны насялялі плямёны мілаградскай культуры (назва ад гарадзішча каля в. Мілаград Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці). Васныя сутыкненні паміж асобнымі родамі і плямёнамі вымушалі родавыя калектывы канцэнтравацца аб ахове сваіх паселішчаў. У сувязі з гэтым адкрытыя пасёлкі, якія існавалі ў эпоху бронзы, саступілі месца гарадзішчам — умацаваным паселішчам у цяжкадаступных месцах, на мысах высокіх і стромкіх берагоў рэк. З трох бакоў звычайна яны былі абмежаваны абрывамі і глыбокімі ярамі, з

Паселішча перыяду ранняга мезаліту каля в. Лудчыцы. Агульны выгляд.

боку поля ўмацаваны земляными дугападобнымі валамі і равамі. Пры адсутнасці мысаў паселішча будавалася на ўчастку карэннага берага ракі і адсякалася ад навакольнай мясцовасці драўляна-земляными ўмацаваннямі. На Быхаўшчыне мілаградскія ўмацаваныя паселішчы выяўлены ў Быхаве, каля вёсак Абідавічы, Баркалабава, Вязьма, Дабужа, Падгор'е, Хамічы, Янава. Найбольш даследаванае з іх гарадзішча каля в. Янава. Яно займала мыс, утвораны старыцай Дняпра і ярам. З боку поля яно мае вал і роў. Вышыня вала 5 м, шырыня 23,5 м, роў глыбінёй 1,5 м, шырынёй 3 м. Выяўлены ямы гаспадарчага прызначэння шарападобнай або авальнай формы і чашападобнай прафілёўкі. Іншыя ямы, шарападобныя ў плане і меншых памераў, былі выемкамі ад слупоў гаспадарчых і жылых пабудоў. Гліняны посуд на прафілёўцы верхніх частак падзяляецца на дзве групы: гаршкі з высокім прамым, адагнутым вонкі венчыкам, яйцападобным ці шарападобным тулавам, чашападобныя пасудзіны з шарападобным дном. Частка гаршкоў першай групы арнаментавана ямкамі, пальцавымі і пазногцевымі ўцісканнямі. Узор размешчаны на шыйцы або верхняй частцы тулава. Сярод іншых мілаградскіх знаходак — гліняныя прасліцы розных форм, посахападобная шпілька, льячка для плаўкі бронзы.

Выяўлены тры мілаградскія пахаванні па абраду трупаспалення. Рэшткі крэмацыі былі ў двух выпадках змешчаны ў авальныя ямы, у трэцім — у шарападобную, там жа выяўлены і фрагменты пасудзін. Іншыя выпадкі пахаванняў на пляцоўцы гарадзішча вельмі рэдкія і на помніках мілаградскай культуры амаль не сустракаюцца. Магчыма, пахаванні адносяцца да той пары, калі

Быховский районный историко-краеведческий музей

жыццё на гарадзішчы амаль спынілася, але нахаванні былі зроблены ў рытуальных мэтах. Асноўным тыпам жылля мілаградскіх плямён былі паўзямлянкі і наземныя або злёгку заглыбленыя ў зямлю жытлы, разлічаныя на адну сям'ю. Яны былі пераважна прамавугольныя ў плане, мелі слупавую канструкцыю. Асноўнымі заняткамі мілаградскіх плямён былі земляробства і жывёлагадоўля, дапаможнымі — паляванне і рыбалоўства, развіваліся здабыча і апрацоўка жалеза, бронзаліцейная справа і інш. Плямёны мілаградскай культуры знаходзіліся на пачатковай стадыі распаду першабытнаабшчыннага ладу.

У канцы 3 — пачатку 2 стагоддзя да н. э. там, дзе раней жылі плямёны мілаградскай культуры, склалася зарубінецкая культура. На тэрыторыі Магілёўшчыны вядомы верхнедняпроўскі лакальны варыянт гэтай культуры. Яе носьбіты жылі на гарадзішчах, што асталіся ад плямён мілаградскай культуры і былі дадаткова ўмацаваны дасыпкай існуючых валоў. Побач з гарадзішчамі ўзнікалі і неўмацаваныя селішчы.

Асноўны тып жылых пабудоў — аднакамерныя наземныя жытлы слупавой канструкцыі, прамавугольнай або квадратнай формы, з двухсхільным дахам. Унутры жытлаў у адным з вуглоў ці каля сцяны размяшчаліся адкрытыя каменныя агнішчы на глінянай пляцоўцы. Плямёны займаліся земляробствам, жывёлагадоўляй, здабычай і апрацоўкай жалеза, апрацоўкай каляровых металаў і інш., выраблялі жалезныя прылады працы, зброю, упрыгожанні. Посуд — пласкадонныя грубаляпныя гаршкі з адагнутым вонкі краем, выразнай шыйкай і круглаватым тулавам, часам упрыгожаныя ў верхняй частцы арнаментам у выглядзе насечак, ямак, зашчыпаў; біканічныя глянцаваныя гаршкі, грубаляпныя і глянцаваныя неарнаментаваныя міскі. Плямёны зарубінецкай культуры мелі сувязі са скіфамі і кельтамі, гарадамі Паўночнага Прычарнамор'я, пра што сведчаць знаходкі наканечнікаў коп'яў, сякер-келтаў, грэчаскіх амфар, шкляных пацерак і інш. Яны знаходзіліся на стадыі распаду першабытнаабшчыннага ладу і складвання тэрытарыяльнай абшчыны, у іх існавала патрыярхальнае рабства. Многія даследчыкі лічаць зарубінецкую культуру старажытнаславянскаю.

На думку некаторых даследчыкаў, да сярэдзіны 2 стагоддзя н. э. класічныя зарубінецкія старажытнасці паўсюдна пачалі знікаць, саступаючы месца помнікам, якія атрымалі назву кіеўскай культуры на Украіне, а ў Беларускім Падняпроўі — старажытнасцей тыпу Абідні — Тайманава (2 — 5 стагоддзі н. э.), па назвах пунктаў у Быхаўскім раёне, дзе былі зроблены значныя раскопкі.

Лічыцца, што новая культура сфарміравалася на аснове зарубінецкай на позднім этапе яе развіцця. У гэты час насельніцтва не будавала ўмацаваных паселішчаў, жыло на селішчах па нізкіх берагах рэк і азёр. У Быхаўскім раёне селішчы 2—5 стагоддзяў вядомы ва ўрочышчы Абідня каля в. Адаменка, каля весак Віляхаўка, Ніжняя Тошчыца, Новы Быхаў, Сялец, Тайманава, Ульянава, Янава, пас. Пакроўскі. Іх памеры ад 1 да 9 га. На ўзвышаных месцах селішчаў будавалі квадратныя ці прамавугольныя ў плане паўзямлянкі, заглыбленыя ў зямлю, з адкрытымі каменнымі агнішчамі. На больш нізкіх месцах ставілі наземныя дамы слупавой канструкцыі. Найбольш даследаваныя з іх Абідня і Тайманава. Пры даследаванні ў 1960—1967 гг. селішча і бескурганнага могільніка ва ўрочышчы Абідня выяўлены рэшткі наземных слупавых жытлаў, 29 паўзямлянак плошчай ад 9 да 20 м^2, у якіх былі каменныя вогнішчы (адна паўзямлянка слупавой канструкцыі не мела вогнішча, замест яго ў паўднёвай частцы выяўлена скопішча шлаку і абпаленай гліны; на думку Л. Д. Побаля, тут жыхары селішча займаліся жалезаробчай вытворчасцю). Сярод знаходак прасліцы, падвескі з эмаллю, сярпы, нажы, шпількі, іголкі, тыглі, рымская

Стаянка-1 у Новым Быхаве.

Агульны выгляд раскопу стаянкі-2 у Новым Быхаве.

Быховский районный историко-краеведческий музей

манета Геты (209—212 гг. н. э.), чырвоная лакавая кераміка, рэшткі бронзавага посуду і інш. На могільніку раскапана 12 пахаванняў з трупаспаленнем.

На поўнач ад Абідні каля в. Тайманава ў 1967—1983 гг. Л. Д. Побалем вывучаўся комплекс селішчаў 2—9 стагоддзяў. Выяўлена 50 паўзямлянкавых жытлаў, каля палавіны з іх адносяцца да 2—5 стагоддзяў н. э. Вядомы тут і наземныя жытлы слупавой канструкцыі. Бытавы інвентар падобны на інвентар зарубінецкай культуры, выключэнне складаюць сярпы, памеры якіх сталі большымі, і біканічныя прасліцы з вялікімі адтулінамі ў сярэдзіне, сярод упрыгожанняў — бронзавыя падвескі — лунніцы з устаўкамі з чырвонай шклопадобнай масы, якая гатавалася на месцы з прывазных пацерак, шмат рэчаў, прывезеных з рымскіх правінцый: шпоры, манеты, чырвоналакавая кераміка і бронзавыя пасудзіны. Посуд — грубаляпныя гладкасценныя гаршкі з адагнутым вонкі краем, слаба выражанай шыйкай і круглаватым тулавам, часам упрыгожаныя расчосамі ці глянцаваныя (вёскі Адаменка, Віляхаўка, Сялец, пас. Янава).

Пахавальны абрад — трупаспаленне. Рэшткі крэмацыі змяшчаліся ў круглыя або авальныя ямы. Вонкава ён падобны на абрад зарубінецкіх плямён, але павялічваецца колькасць неачышчаных ад вогнішча пахаванняў, менш пахаванняў з рэчамі.

У 6—8 стагоддзях Быхаўшчына ўваходзіла ў арэал калачынскай культуры і была пагранічнай з падобнай да яе банцараўскай археалагічнай культурай. Насельніцтва жыло на адкрытых паселішчах на пакатых узвышшах, у поймах рэк і азёр або на мысападобных выступах надпоймавых тэрас (вёскі Віляхаўка, Ніжняя Тошчыца, Сялец, Тайманава, пас. 1 Мая, Пакроўскі; даследаваліся Л. Д. Побалем). Жытлы паўзямлянкавыя, зрубнай канструкцыі, заглыбленыя ў зямлю і наземныя слупавой канструкцыі з печамі-каменкамі, радзей агнішчамі. Шэраг зрубных пабудоў выяўлены ў Тайманаве. Адно з жытлаў добра захавалася і дае ўяўленне аб зменным выглядзе і інтэр'еры. Яно

Археалагічныя знаходкі з курганоў 7—9 ст. каля вёскі Вараніно: 1—3 — ляпныя гаршкі; 4— жалезны нож.

Быховский районный историко-краеведческий музей

мела прамавугольную форму 2,4 × 3 м, паглыблена ў грунт на 0,9 м. Рэшткаў слупавых ям не выяўлена, што дазваляе меркаваць пра зрубную канструкцыю сцен. У адным з вуглоў знойдзены камяні, якія з'яўляюцца развалам печы-каменкі.

Пахавальны абрад — трупаспаленне. Рэшткі крэмацыі змяшчаліся ў пасудзіны-урны або ссыпаліся на дно круглых ці авальных ям. Пахавальны інвентар бедны. У Ніжнятошчыцкім могільніку раскапана 12 пахаванняў, у 4 з іх выяўлены цэлыя гаршкі-урны, у астатніх абломкі посуду, у адным знойдзена прасліца; у некаторых пахаваннях каля в. Новы Быхаў сустракаліся аплаўленыя бронзавыя рэчы. Посуд — слабапрафіляваны, цюльпанападобны і рабрысты. Памер гаршкоў і іх прызначэнне рознае: з дыяметрам па зрэзе да 40 см — для захавання прадуктаў, меншых памераў са слядамі нагару — для прыгатавання ежы. Сярод іншых знаходак — гліняныя бікапічныя прасліцы з вялікімі адтулінамі ў сярэдзіне, сярпы, нажы, свінцовая пячатка 8 ст. з грэчаскім надпісам (в. Новы Быхаў). Насельніцтва займалася земляробствам, жывёлагадоўляй, рыбалоўствам, хатнімі промысламі. Пашырылася суседская абшчына, вялікую ўладу атрымалі правадыры плямён, саветы старэйшын і дружыны.

У 6—9 стагоддзях адбываўся пераход ад першабытнаабшчыннага ладу да феадалізму.

З 9 стагоддзя вядомы першыя летапісныя звесткі пра плямёны на тэрыторыі Беларусі. Быхаўшчына ўваходзіла ў арэал рассялення старажытнаславянскіх плямён радзімічаў і асобных дрыгавіцкіх груповак. Упамінаюцца ў «Аповесці мінулых гадоў». Для радзімічаў да 12 стагоддзя асноўным тыпам паселішчаў былі неўмацаваныя пасёлкі. Селішчы, гарады з'явіліся значна пазней, а ў дрыгавічоў паселішчы гарадскога тыпу фарміраваліся ў 10 стагоддзі. На тэрыторыі Быхаўскага раёна старажытнарускія гарады адсутнічаюць. Сельскія паселішчы вядомы за 2 км на поўдзень ад Быхава ва ўрочышчы Узлужжа, каля вёсак Гарадзец, Камарычы, Ніжняя Тошчыца, аднак даследаваліся яны мала. Больш вядома пра пахаванні дрыгавічоў і радзімічаў — курганы. На тэрыторыі Быхаўшчыны яны выяўлены каля вёсак Вараніно, Ніжняя Тошчыца, Новы і Стары Быхаў, Сялец, Ямава і інш.

У курганнай групе 7—9 стагоддзяў каля в. Вараніно, якая належала радзімічам, Г. Ф. Салаўёва даследавала 11 насыпаў. Пахавальны абрад — трупаспаленне, рэшткі крэмацыі змяшчаліся ў цэнтры курганоў на ўзроўні старажытнага гарызонту або ў неглыбокіх ямах. Адно пахаванне зроблена ў скрыні з абгарэлых плашак. У пахаваннях знойдзены ляпныя гаршкі, жалезны нож, абломак бронзавага скроневага кольца, аплаўленыя шкляныя пацеркі і інш.

Другая курганная група, якую вывучала



Упрыгожанні з курганоў каля вёскі Стары Быхаў: 1 — бранзалет; 2—3 — скроневыя кольцы з дрыгавіцкімі зярнёнымі пацеркамі; 4 — драцяны пярсцёнак; 5 — пласціністы пярсцёнак; 6—11 — пацеркі.

Г. Ф. Салаўёва, размешчана за 4 км на поўдзень ад Быхава, на правым беразе Дняпра, належала дрыгавічам і датуецца 11—12 стагоддзямі. З 60 насыпаў даследавана 8. Усе пахаванні зроблены па абраду трупапалажэння. У адным з курганоў выяўлена парнае пахаванне мужчыны і жанчыны. Нябожчыкі ляжалі галовамі ў розныя бакі: мужчына — на ўсход, жанчына — на захад. На руках жанчыны былі бронзавы віты бранзалет і пярсцёнак. У другім кургане разам з пахаванай жанчынай ляжалі сердалікавая і шкляная пацеркі, пярсцёнкападобнае скроневае кольца. Падобны інвентар знойдзены і ў іншых курганах.

Пры даследаванні курганнага могільніка каля вёскі Сялец знойдзены 3 сярэбранікі кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча. З 9 стагоддзя тэрыторыя сучаснай Магілёўскай вобласці знаходзілася ў складзе старажытнарускай дзяржавы — Кіеўскай Русі. *А. А. Егарэйчанка.*

Быховский районный историко-краеведческий музей

Старонкі мінулага

Гістарычныя крыніцы ўзнікнення Быхава адносяць да часу не раней 1387 г. і не пазней 1406 г. З 14 стагоддзя ў складзе Вялікага княства Літоўскага. Быхаў упамінаецца ў спісе гарадоў гэтага княства, змешчаным ва Уваскрасенскім летапісе і ў актах узвядзення Свідрыгайлы па літоўскі трон у 1430 г. Паводле народнага падання назва горада паходзіць ад слоў «быў хоў», месца, дзе мясцовыя жыхары хаваліся ад нападу непрыяцеля. Прывілеямі караля Сігізмунда-Аўгуста ад 1556 і 1568 гг. Быхаў падараваны старосту жмудскаму і губернатару ліфляндскаму Яну Хадкевічу, які стаў называцца «графам на Быхаве».

Пад канец 16 стагоддзя ў час антыфеадальных паўстанняў на Украіне і Беларусі ў наваколлі Быхава дзейнічалі казацкія атрады. Пры садзеянні гарадской беднаты ў лютым 1590 г. Быхаў заняў атрад Мацюшы, шляхта, ліхвяры і арандатары былі перабіты. Зімой 1595 г. пасля разгрому Магілёва праз Быхаў па Рэчыцу праходзіў атрад Севярына Налівайкі. Улічваючы важнае стратэгічнае становішча горада, гетман Вялікага княства Літоўскага Ян Караль Хадкевіч у 1590—1619 гг. пабудаваў у Быхаве замак і ператварыў горад у магутную крэпасць (падрабязна пра гэта глядзі ў атрыкуле «З архітэктурнай спадчыны»).

З 1628 г., паводле шлюбнага дагавору дачкі Хадкевіча з літоўскім маршалкам Янам Сапегам, горад перайшоў ва ўладанне Сапегаў.

У 14—16 стагоддзях фарміравалася беларуская народнасць. Культура беларускага народа набывала нацыянальную самабытнасць. З Быхаўшчынай звязана жыццё і дзейнасць Лаўрэнція Зізанія (?—1634), беларускага педагога, перакладчыка, царкоўнага дзеяча. Яго «Азбукай» (стварыў разам з братам Стэфанам Зізаніем, 1596) і «Граматыкай» (1596) карысталіся ў брацкіх школах Беларусі, Украіны і Літвы. У 1597—1600 гг. ён працаваў хатнім настаўнікам у крычаўскага старосты князя Б. Саламярэцкага ў Баркалабаве. Мялецій Сматрыцкі [1572 (?) — 1633] — беларускі і ўкраінскі пісьменнік-палеміст, царкоўны і грамадска-палітычны дзеяч таксама настаўнічаў з 1600 г. ў князя Саламярэцкага ў Баркалабаве. Яго «Граматыку» (1619) М. В. Ламаносаў разам з «Арыфметыкай» Л. Магніцкага называў «вратами своей учености».

У арыгінальнай літаратуры пачатку 17 стагоддзя важнае месца заняў гістарычна-мемуарны твор «Баркулабаўская хроніка», дзе апісаны падзеі 1545—1608 гг. Самабытнасць мовы, высокамастацкае адлюстраванне сяляпскага жыцця ставяць «Хроніку» у шэраг найвыдатнейшых помнікаў беларускай нацыянальнай культуры (глядзі асобны артыкул).

У 17 стагоддзі ўзмацнілася барацьба беларускага народа супраць польскіх і літоўскіх феадалаў. Пасіўныя формы супраціўлення магнатам перараслі ў магутны паўстанцкі рух. На пачатак стагоддзя пачасціліся ўцёкі беларускіх сялян і рамеснікаў-гараджан, у тым ліку і з Быхава, у межы Рускай дзяржавы.

У вызваленчую вайну ўкраінскага і беларускага народаў 1648—1654 гг. Быхаў неаднаразова асаджалі казацкія войскі ўраджэнца Быхава Філона Гаркушы. У 1648 г. з атрадам казакаў ён прыбыў з Украіны па Беларусь. Тут рады паўстанцаў папоўнілі беларускія сяляне. Атрадам Гаркушы ў баі каля мястэчка Горваль на пераправе цераз р. Бярэзіна быў разбіты буйны атрад стражніка Вялікага княства Літоўскага Мірскага. У снежні 1648 г. Гаркуша штурмаваў Быхаўскую крэпасць, але штурм быў адбіты і Гаркуша перайшоў да асады Быхава. Атрады польскай шляхты пад камандаваннем Горскага і Паца, якія выступілі з часткай быхаўскага гарнізона на задушэнне сяляпскага паўстання ў Чэрыкаве, павінны былі зноў вярнуцца ў Быхаў. Пад націскам войск Горскага і Паца Гаркуша адступіў. У 1651 г. з атрадам у 15 тысяч чалавек ён ваяваў у раёне р. Прыпяць, разграміў атрад палкоўніка Паўшы. У сакавіку — кастрычніку 1654 г. Гаркуша быў паслом Багдана Хмяльніцкага ў Маскве.

Паводле Зборaўскага дагавору паміж Хмяльніцкім і каралём польскім Янам Казімірам (9 жніўня 1649 г.) Быхаў стаў пагранічным горадам. У кастрычніку 1649 г. гараджане ўзнялі паўстанне, перабілі значную частку паноў і шляхты, але пацярпелі паражэнне.

18 студзеня 1654 г. Украіна ўз'ядналася з Расіяй. У маі таго ж года Расія пачала вайну з Польшчай за Беларусь. На працягу ўсёй вайны Быхаў адыгрываў ролю ўмацаванага горада-крэпасці. Казацкія атрады гетмана Залатарэнкі па загаду цара Аляксея Міхайлавіча ў жніўні 1654 г. асадзілі горад. Аднак працяглая асада і штурм Быхава не далі станоўчых вынікаў. 5 снежня Залатарэнка зняў асаду і з войскам адступіў ад горада. Далейшае развіццё ваенных дзеянняў паказала, што Быхаў трэба ўзяць, і Залатарэнка ў 1655 г. зноў асадзіў крэпасць і ўзяў яе, але сам быў цяжка паранены і памёр. Пасля яго смерці казацкія палкі ўзначаліў Іван Нячай. Маючы намер устанавіць сваё панаванне над паўднёва-ўсходнімі землямі Беларусі, ён перайшоў на бок польскіх паноў і ў канцы 1659 г. адкрыта выступіў супраць Масквы. На задушэнне мяцежнікаў з Магілёва выступілі рускія войскі пад камандаваннем маскоўскіх ваявод Далгарукава, Лабанава-Растоўскага і Сямёна Змеева. Іван Нячай, пацярпеўшы паражэнне пад Мсціславам, схаваўся з рэшткамі сваіх атрадаў у Быхаўскай крэпасці. Рускія войскі ў маі акружылі горад і

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

4 снежня 1659 г. з дапамогай баяр Ільінічаў, верных Расіі, якія ўгаварылі ваявод Ранькоўскага і Шале адчыніць вароты крэпасці, авалодалі ім. Здраднікі па прыгавору баярскага суда былі пакараны смерцю, Нячай і яго брат Юрый сасланы ў Табольск. Да канца вайны Расіі з Польшчай (1667) Быхаў яшчэ не раз трымаў аблогі ваюючых бакоў. У жніўні 1664 г. рускі князь Юрый Мікітавіч Празароўскі разграміў каля Быхава літоўскага ваяводу Паца. У ліку палонных быў і Данііла Меншыкаў, бацька будучага рускага палкаводца, паплечніка Пятра I А. Д. Меншыкава. Паводле Андрусаўскага перамір'я 1667 г. Быхаў адышоў да Польшчы і стаў прыватнаўласніцкім горадам-крэпасцю, дзе размяшчаліся рэзідэнцыя магнатаў-уладальнікаў Хадкевічаў і Сапег, вайсковы гарнізон. Роля стратэгічнага пункта на польска-рускім парубежжы абумовіла эканамічнае і сацыяльнае развіццё горада. Насельніцтва групавалася ў двух абшчынах — мяшчанскай і яўрэйскай. За карыстанне зямлёй яны плацілі ўладальніку горада грашовы чынш, неслі павіннасці па падтрыманню крэпасці ў баявой гатоўнасці. З мэтай папоўніць колькасць гарадскіх мяшчан у 1630-х гадах каля Быхава на левым беразе Дняпра была пабудавана Слабада Лявонаўка, яе пасяленцы былі вызвалены ад подацей і іншых павіннасцей на 14 гадоў.

Развіваліся гандлёвыя сувязі Быхава з шэрагам польскіх і рускіх гарадоў, у тым ліку з Масквой, але з-за частых войнаў і экспансіянісцкай палітыкі каталіцкай царквы, яны не былі сталымі. Рамесніцкая дзейнасць насельніцтва абмяжоўвалася галоўным чынам будаўніцтвам і рамонтам замка і фартыфікацыйных умацаванняў, абслугоўваннем патрэб вайсковага гарнізона і гарадскога апалчэння. У 1655 г. граматай караля Яна Казіміра Быхаў быў вызвалены ад подацей на 20 гадоў, а ў 1676 г. пастановай Сейма — яшчэ на 10 гадоў.

Паўночная вайна Расіі са Швецыяй 1700—1721 гг. прынесла Быхаву і навакольным землям новыя выпрабаванні. Становішча ўскладнялася яшчэ і абвастрэннем міжусобнай барацьбы магнацка-шляхецкай алігархіі Вялікага княства Літоўскага за вярхоўную ўладу. Сапегі — уладальнікі Быхава — перайшлі на бок Карла XII, каб заручыцца яго падтрымкай. На загаду польскага караля Аўгуста II, саюзніка Расіі ў вайне супраць Швецыі, літоўскі генерал-маёр Боіч-Сініцкі на чале атрадаў літоўцаў і татараў пры падтрымцы падмацаванняў, дасланых Пятром I, заняў 5 кастрычніка 1702 г. Быхаў. Восенню 1704 г. руская армія пад камандаваннем Рапніна ачысціла горад ад шведскіх войск і атрадаў Сапегі. 23.6.1706 г. на Дняпроўскім шляху ў Кіеў Пётр I каля Быхава вёў на сваім байдаку перагаворы з камендантам крэпасці Сініцкім аб выкананні ім саюзніцкіх абавязацельстваў у барацьбе супраць шведаў. Каб падмацаваць быхаўскі гарнізон, 24 верасня 1706 г. кароль Аўгуст II, саюзнік Расіі, падпісаў мір са Швецыяй і адрокся ад прастола. На бок стаўленіка шведаў С. Ляшчынскага перайшлі буйныя магнаты Беларусі і Літвы. У 1707 г. Сініцкі адкрыта перайшоў на бок шведскага караля і, зачыніўшыся ў крэпасці, умацаваў

Гераічная абарона Быхава ў 1708 г. З малюнка мастака М. Ц. Гуціева.

Быховский районный историко-краеведческий музей

абарончыя збудаванні і чакаў падыходу шведаў, а летам 1707 г. ў час вылазкі знішчыў рускі атрад, які вёз 40 тысяч рублёў для літоўскіх атрадаў гетмана М. Вішнявецкага.

Разумеючы, што да Быхава з Прыбалтыкі можа падысці шведскі генерал Левенгаупт, Пётр I загадаў генералу Р. Х. Баўэру ўзяць крэпасць. У чэрвені, пасля працяглай аблогі, замак быў узяты. Трапіла ў палон больш за 1000 салдат і афіцэраў. Сініцкага саслалі ў Сібір, з крапасных сцен былі зняты гарматы і па Дняпры адпраўлены ў Кіеў. Для абароны Быхава было пакінута 1451 чалавек на чале з Д. Варанцовым. Камандаванне рускай арміі надавала вялікае значэнне быхаўскай крэпасці і 23 чэрвеня 1708 г. праз рускі ваенны генеральны канспліум загадала гарнізону «обороняться до крайней меры». 13 ліпеня 1708 г. пасля бітвы пад Галоўчынам шведы пачалі штурм Быхава, але ўзяць яго не змаглі. Тады яны паклікалі на дапамогу польскія атрады Сапегі і Хмары і зноў асадзілі горад. Абаронцы не толькі мужна адбіваліся, але і рабілі вылазкі, наносячы ворагу вялікія страты. Сяляне выкарыстоўвалі ўсе магчымасці, каб дапамагчы асаджаным харчаваннем. Камендант горада Варанцоў даносіў Меншыкаву: «Поляки многолюдством в ближних от Быхова местах проезжают и выбирают провиант и приказывают мужикам под страхом смерти, а иных мучат, чтоб до Быхова провиант не возили». Упартая абарона горада спрыяла пасіяховым дзеянням рускай арміі ў бітве пры Лясной (28 верасня 1708 г.).

У 1740 г. ў Быхаўскім старостве адбылося антыфеадальнае ўзброенае выступленне сялян. Яно было выклікана жорсткім сацыяльным прыгнётам, злоўжываннямі мясцовай адміністрацыі і ўзмацненнем нацыянальна-рэлігійнага ўціску.

План Быхава канца 18 стагоддзя: 1 — замак, 2 — гандлёвая плошча, 3 — гарадскія ўмацаванні, 4 — Магілёўская брама, 5 — Рагачоўская брама, 6 — царква, 7 — касцёл, 8 — крамы, 9 — сінагога.

Штуршком да выступлення быў намер М. Сапегі ператварыць праваслаўныя цэрквы ў сваіх уладаннях на Быхаўшчыне ва уніяцкія. Даведаўшыся пра гэта, сяляне і мяшчане мястэчка Дашкаўка (Дашкава) у красавіку 1740 г. забілі уніяцкага пратапопа, які прыехаў сюды, выгналі папскага аканома, перабілі прадстаўнікоў феадальнай адміністрацыі. Сяляне в. Сідаравічы аб'ядналіся з сялянамі навакольных вёсак, наладзілі сувязь з прыгоннымі Магілёўскай эканоміі, стварылі ўзброены атрад з 200 чалавек і выступілі супраць прыгнятальнікаў. На задушэнне хвалявання з Быхаўскага гарнізона 27-красавіка быў пасланы вайсковы атрад на чале з Д. Стахоўскім. Каля в. Сідаравічы сяляне прабілі засаду, раптоўна атакавалі карнікаў і разгромілі іх. У маі выступленне было задушана, а яго ўдзельнікі жорстка пакараны.

У 1747 г. ў Быхаве было 247 двароў, меліся бібліятэка, паташня, лазня, саладоўня, астрог. Насельніцтва групавалася ў мяшчанскай і яўрэйскай абшчынах. За карыстанне зямлёй яны плацілі ўладальніку горада грашовы чынш, выконвалі павіннасці па абслугоўванню крэпасці. У 1755 г. тут было 382 двары, 2522 жыхары, малітоўная школа, 9 сядлёвых радоў, праводзілася 3 кірмашы ў год, склаўся вялікі атрад рамеснікаў — шаўцоў, гарбароў, краўцоў, сталяроў, цесляроў, кавалёў.

У 1784 г. ў в. Езва была наладжана шкляная вытворчасць. Дзейнічалі прыгонныя мануфактуры: у 1789—1832 гг. па вырабу посуду, ліставога шкла ў в. Лубянка (у 1814 г. 18 рабочых), у 1795—1846 гг. па вырабу медных гузікаў у в. Уюн (у 1812 г. 16 рабочых), у 1809—1837 гг. па вытворчасці палатна ў в. Грудзінаўка (у 1830 г. 86 рабочых), у 1813—1846 гг. шкляная ў в. Гута (у 1828 г. 10 рабочых). У фальварку каля в. Сапяжынка ў 1828 г. працавала шкляная гута.

Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай (1772) Быхаў у складзе Расійскай імперыі. З 22.7.1773 г. павятовы горад Магілёўскай правінцыі. Да 1776 г. і з 1802 г. цэнтр павета Магілёўскай губерні. У 1796—1802 гг. заштатны горад Беларускай губерні. У 1778 г. зацверджаны план Быхава, паводле якога старажытная ўмацаваная частка горада з замкам і гандлёвай плошчай захавана як цэнтральнае планіровачнае ядро, вакол якога ствараліся новыя кварталы. Былі пракладзены драўляныя тратуары, зроблена вулічнае асвятленне, устаноўлены гарадскі гадзіннік. У 1781 г. зацверджаны герб Быхава: у верхняй частцы шчыта на залатым полі расійскі двухгаловы арол з каронай, у ніжняй — дзве скрыжаваныя гарматы на чырвоным полі. У 1783 г. ў Быхаве 2622 жыхары, 534 дамы. Дзейнічала школа (павятовае вучылішча). Далучэнне Быхава да ўсерасійскай гаспадарчай сістэмы, пастановы аб бяспошлінным гандлі (люты 1773), скасаванне таможняў і застаў на граніцы Беларусі з Расіяй

Быховский районный историко-краеведческий музей

(1782), патрэбы будаўніцтва Чарнаморскага флоту (1779—1787) спрыялі сацыяльна-эканамічнаму развіццю горада. Развівалася рамяство, павялічвалася роля гарадскога кірмашу. У 1785 г. гандлёвы абарот горада склаў 10—14 тысяч рублёў. У 1786 г. ў Быхаве жыло 1132, у 1811 г.— 5 тысяч чалавек.

Сярод іншых населеных пунктаў Быхаўшчыны найбольш буйнымі былі Баркалабава, Новы Быхаў, Балонаў Сялец 1-ы, Балонаў Сялец 2-і, Гарадзец, Абідавічы, Бынава.

Вёска Баркалабава заснавана ў 16 стагоддзі, з 1633 г. тут быў манастыр. У 1758 г. мястэчка, 64 двары, 171 жыхар мужчынскага полу, тут меліся саладоўня, бровар, 2 гаспадарскія двары, фальварак. З 1780 г. сяло, 69 двароў, 465 жыхароў, 2 царквы, 2 млыны, памешчыцкая ўласнасць. У 1884 г. ў манастыры дзейнічала школа, дзе вучылася 20 дзяўчынак. У 1886 г. быў пастаялы двор. У 1897 г. 93 двары, 605 жыхароў, у Глухскай воласці Быхаўскага павета. У 1904 г. адкрыта царкоўнаприходская школа. У 1909 г. сяло, 110 дамоў, 671 жыхар.

Вёска Новы Быхаў вядома з 16 стагоддзя як мястэчка. Належала Хадкевічам, пазней Сапегам. У 1742 г. мястэчка, 41 двор, у 1758 г. 19 двароў, 6 корчмаў, 3 крамы, сыраварня, праводзіўся кірмаш. У 1772 г. 92 двары, 734 жыхары. Мелася царква. У 1858 г. 435 жыхароў мужчынскага полу, цагельны завод, млын, піцейны дом. У 1864 г. адкрыта школа, пры якой у 1873 г. арганізавана рамеснае аддзяленне. У 1897 г. мястэчка, валасны цэнтр, 342 дамы, 2374 жыхары, хлебазапасны магазін (з 1882), 23 крамы, 2 ветраныя млыны, 2 карчмы, прыстань, царква, 2 сінагогі, 2-класная царкоўнаприходская школа.

Вёска Балонаў Сялец 1-ы заснавана ў 18 стагоддзі, у 1858 г. тут было 485 жыхароў мужчынскага полу, у 1831 г. працавалі сукнавальня, вадзяны млын. У 1883 г. сяло ў Глухскай воласці Быхаўскага павета, 164 двары, 1328 жыхароў. У 1897 г. 149 двароў, 877 жыхароў, царкоўнаприходская школа, хлебазапасны магазін (з 1882), піцейны дом, 2 драўляныя царквы, раз у год праводзіўся кірмаш. У 1909 г. 153 дамы, 944 жыхары.

Вёска Балонаў Сялец 2-і заснавана ў 18 стагоддзі, у 1897 г. тут было 255 двароў, 998 жыхароў, ветраны млын, піцейны дом. У 1905 г. адкрыта казённая вінная крама, у 1907 г.— царкоўнаприходская школа, у 1910 г.— паштова-тэлеграфнае аддзяленне, царква. У 1909 г. 164 двары, 1057 жыхароў.

Вёска Гарадзец вядома з 18 стагоддзя, у 1758 г. 60 двароў, 155 жыхароў мужчынскага полу, карчма, млын, пякарня, 2 бровары. У 1780 г. 69 двароў, 514 жыхароў. У 1866 г. адкрыта народнае вучылішча, дзе ў 1889 г. вучылася 30 хлопчыкаў, у 1907 г.— 118 хлопчыкаў і 25 дзяўчынак. У 1897 г. 148 двароў, 921 жыхар, цэнтр воласці ў Быхаўскім павеце. Працавала бальніца, 2 ветраныя млыны, кузня, крама, царква, піцейны дом. У 1909 г. 165 дамоў, 966 жыхароў.

Вёска Абідавічы вядома з 1742 г. ў Быхаўскім графстве як памешчыцкая ўласнасць. У 1758 г. было 39 двароў, 115 жыхароў мужчынскага полу, млын, карчма. У 1780 г. 81 двор, 484 жыхары. У 1897 г. вёска ў Навабыхаўскай воласці Быхаўскага павета, 178 двароў, 1197 жыхароў. Тут былі хлебазапасны магазін, 3 ветраныя млыны, школа граматы, піцейны дом, паштовая станцыя, народнае вучылішча, у якім у 1905 г. вучылася 50 хлопчыкаў і 10 дзяўчынак. У 1909 г. 132 двары, 1212 жыхароў.

Вёска Бынава вядома з 18 стагоддзя, у 1784 г. 39 двароў, 321 жыхар. У 1897 г. ў Царкоўна-Асавецкай воласці Быхаўскага павета, 45 двароў, 339 жыхароў; у 1909 г. ў Грудзінаўскай воласці Быхаўскага павета, 54 двары, 445 жыхароў.

Новымі драматычнымі падзеямі адзначана гісторыя Быхава ў час нашэсця Напалеона на Расію. У канцы чэрвеня — пачатку ліпеня 1812 г. 2-я Заходняя армія генерала П. І. Багратыёна (45 тыс. чалавек) пад націскам намнога большых напалеонаўскіх войск (297 тыс. чалавек) адыходзіла ад Магілёва, каб пераправіцца цераз Дняпро і ў раёне Смаленска злучыцца з 1-й Заходняй арміяй пад камандаваннем М. Б. Барклая дэ Толі. Каб перашкодзіць ажыццяўленню гэтага плана, 1-ы французскі корпус маршала Л. Даву (72 тыс. чалавек) зрабіў спробу адрэзаць рускую армію ад ракі з боку Магілёва і ва ўзаемадзеянні з іншымі часцямі акружыць яе і разграміць. На працягу двух дзён (11—12 ліпеня) 7-ы корпус генерал-лейтэнанта П. М. Раеўскага стрымліваў французаў на поўнач ад Быхава, чым даў магчымасць Багратыёну пераправіцца цераз Дняпро па мосце каля Новага Быхава. Сам жа, ведучы жорсткі бой, адышоў да Быхава і таксама паспяхова перайшоў на левы бераг Дняпра. У час бою штаб 2-й Заходняй арміі пад камандаваннем П. І. Багратыёна размяшчаўся ў в. Сапяжынка, у 1962 г. ў памяць аб гэтай падзеі тут пастаўлена стэла. У выніку Айчыннай вайны 1812 г. колькасць насельніцтва Быхава значна паменшылася і ў 1815 г. складала 3219 чалавек. Горад паступова страціў ролю ваеннай крэпасці і стаў месцам размяшчэння ваенных гарнізонаў. Агульны ўздым гаспадарчага жыцця гарадоў Расіі ў

Пераправа 2-й рускай арміі цераз Дняпро ў раёне Новага Быхава. Малюнак мастака Б. Аракчэева. Быхаўскі гісторыка-краязнаўчы музей.

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

19 стагоддзі, абумоўлены развіццём капіталістычных адносін, адбіўся і на сацыяльна-эканамічным становішчы Быхава. Побач з рамесніцкімі майстэрнямі мяшчан у 1-й чвэрці 19 стагоддзя ўзнікаюць прадпрыемствы вольнанаёмнай працы. У 1816 г. мешчанін Абель Случкін арандаваў у Сапегі суконна-талесную мануфактуру. Прадпрыемства мела 18 станкоў, 84 рабочых. У 1825 г. ў Быхаве было 569 дамоў, 2 навучальныя ўстановы, 8 крам, 13 піцейных дамоў і корчмаў, 3 лазні, 5 садоў, у 1828 г. 5 гаспадарскіх дамоў, магазін, карцінная галерэя.

У 1829 г. ў маёнтку Быхава адбыліся хваляванні сялян. Вось як пра гэта сведчаць матэрыялы следчай камісіі ваеннага суда ад 13 чэрвеня 1834 года.

Сяляне маёнтка Быхава былі падзелены на тры сотні (сабілаўцы, заюраўцы і белагорцы) і адбывалі прыгон патыдзённа: кожная сотня выходзіла на работу праз два тыдні. Работы гэтыя выконваліся ў межах горада. Пасля Айчыннай вайны 1812 г. памешчык Сапега павялічыў паншчыну і чынш, прымусіў сялян працаваць па-за горадам. Сяляне адмовіліся выконваць загад панскага аканома. Ні ўгаворы, ні бізуны не дзейнічалі. Рантам разнеслася сярод прыгонных чутка, што быхаўскія сяляне не належаць Сапегу, што трэба адшукаць недзе загінуўшыя дакументы. Вырашылі звярнуцца да цара са скаргай. Адстаўны аўдытар Аўрам Васільеў у 1829 г. на імя Мікалая I напісаў прашэнне «Аб непрыналежнасці быхаўскіх сялян князю Сапегу». Мікалай I распарадзіўся пераслаць прашэнне на разгляд міністру фінансаў. Той накіраваў скаргу камітэту міністраў. Адтуль справу для разбору перанравілі ў міністэрства юстыцыі. А з Сената ўсе матэрыялы былі перададзены ў Магілёўскае губернскае ўпраўленне, а потым паступілі ў Быхаўскі павятовы суд. На разгляд справы спатрэбілася больш двух гадоў. Сяляне абівалі парогі павятовага суда, прасілі паведаміць аб ходзе справы. Даверапыя ад прыгонных Фёдар Жданоў і Пётр Арлоўскі, што панеслі ў Магілёўскую губернскую палату скаргу, за непадпарадкаванне пакараны бізунамі і асланы ў 1832 г. ў Сібір на пасяленне.

«Цяпер сяляне з просьбай да царскіх чыноўнікаў ідуць ужо гуртам па 20—30 чалавек, і выявіць падбухторшчыкаў хвалявання,— піша чыноўнік следства,— ніяк нельга, дух непаслушэнства разліўся на ўсёй грамадзе быхаўскіх сялян».

Па просьбе магілёўскага губернатара ў Быхаў «для прывядзення сялян у паслушэнства мерамі, законам устаноўленымі», прыбыў батальён Віцебскага егерскага палка пад камандаваннем падпалкоўніка Аносава. Вайсковае і грамадзянскае начальства, склікаўшы ад кожнай сотні па 10 сялян, спрабавала пераканаць іх «на мове, зразумелай іх розуму». Але ўсе скліканыя заявілі, што не стануць слухацца ніякіх улад, пакуль не будуць вернуты высланыя ў Сібір іх даверапыя Фёдар Жданоў і Пётр Арлоўскі, і што яны абавязаны выконваць надзённыя павіннасці, а не павіннасці эканоміі. Тады скліканыя сяляне і соцкі Мацвей Іваноў былі ўзяты пад варту. Справа аб «смуцьянах» слухалася ў ваенным судзе. Царскія чыноўнікі «выратавалі» яе хутка — удзельнікі хваляванняў былі цяжка пакараны бізунамі, многія з іх асланы ў Сібір (глядзі дакумент «З данясення віцебскага, магілёўскага і смаленскага генерал-губернатара міністру ўнутраных спраў аб рашэнні суда па справе аб хваляваннях сялян маёнтка Быхава Магілёўскай губерні»).



Помнік у гонар штаба рускай 2-й Заходняй арміі ў в. Сапяжынка.

У 1841 г. ў Быхаве было 5475 жыхароў, 652 дамы, якія размяшчаліся на 19 вуліцах і завулках. У рамесных майстэрнях працавалі 14 краўцоў, 12 шаўцоў, 5 кавалёў, 4 майстры па рамонту гадзіннікаў, 3 слесары, 2 алавяшчыкі і 2 майстры-ювеліры па золату і серабру. У 1837 г. тут былі 42 рамеснікі, а ў 1859 г.— 108. Дзейнічалі талесна-фланелевая фабрыка і гарбарны завод, сыравіна для якіх завозілася з розных месцаў, у тым ліку з Масквы. Аб'ём прадукцыі, рэалізаванай гэтымі прадпрыемствамі ў 1847 г. склаў аднаведна 55 і 50 тыс. рублёў. Гандлем у Быхаве займаліся 13 купцоў 3-й гільдыі, якія рэалізавалі тавараў на 24 тыс. рублёў серабром, у 1858 г. тут гандлявала больш за 100 купцоў 1-й і 2-й гільдыі. Галоўным таварам у гандлі была пянька, якой у 1841 г. прададзена 1690 бяркоўцаў. Значную ролю ў жыцці горада адыгрываў сялянскі сектар. У канцы 1830-х гадоў ён склаў 26,4 %. У 1847 г. сяляне трымалі 1425 коней, 1450 галоў буйной рагатай жывёлы, 650 авечак, 646 свіней, 350 коз, вырошчвалі жыта, авёс, ячмень, займаліся агародніцтвам. Два разы ў год праводзіліся кірмашы,

Быховский районный историко-краеведческий музей

у 1847 г. на кірмашах прададзена тавараў на 700 рублёў.

Рэвалюцыйная сітуацыя канца 1850 — пачатку 1860-х гадоў, абумоўленая крызісам феадальна-прыгонніцкай сістэмы і зараджэннем капіталістычных адносін, вымусіла царызм у 1861 г. адмяніць прыгоннае права. Але сялянская рэформа не ліквідавала шматлікіх перажыткаў прыгону і не вырашыла аграрнага пытання. Так, у Быхаўскім павеце ў адпаведнасці з устаўнымі граматамі сялянам адводзілася 59,5 тысячы дзесяцін зямлі супраць 68,8 тысячы, якімі яны карысталіся напярэдадні рэформы. Рабаўніцкі характар рэформы выклікаў шырокі сялянскі рух. 15 ліпеня 1861 г. сяляне памешчыка Сямкоўскага, маёнтак якога знаходзіўся ў вёсцы Лазаравічы, адмовіліся ад выканання павіннасцей і аказалі супраціўленне паліцыі. Для задушэння выступлення ў маёнтак прыбыла каманда ўзброеных салдат. У кастрычніку адмовіліся выконваць павіннасці ў карысць памешчыцы Ганіпроўскай 112 сяляп вёскі Збышына, але і гэта выступленне было задушана царскімі ўладамі. У 1864 г. сяляне з в. Новы Быхаў самавольна пасеклі памешчыцкі лес.

У час паўстання 1863—1864 гг. у Польшчы, Літве і на Беларусі на тэрыторыі павета ў красавіку — маі 1863 г. дзейнічаў Быхаўскі паўстанцкі атрад на чале з І. Анцыпам. Паўстанцы грамілі памешчыцкія сядзібы, валасныя ўправы, знішчалі іх дакументы, уступалі ў сутычкі з атрадамі царскіх войск. 6 чэрвеня 1863 г. па прыгавору ваенна-судовай камісіі ў Магілёве І. Анцыпа быў расстраляны.

Пасля адмены прыгоннага права, з развіццём капіталізму, адзначана паступовае сацыяльна-эканамічнае развіццё Быхава і павета. У 1861 г. на быхаўскім гарбарным заводзе працавала 60 рабочых і выраблялася 65 тысяч адзінак прадукцыі, насельніцтва горада ў 1863 г. склала 5879 чалавек. У канцы 1860-х гадоў Быхаў падзяляўся на 4 часткі: цэнтральную, заселеную гарадскім саслоўем, і 3 сялянскія слабады — Белагорскую, Загор'еўскую і Сабілаўскую, з насельніцтвам 5985 чалавек. Гаспадаркай і справамі гараджан займаліся гарадская ратуша, сіроцкі і славесны суды, гарадскі дэпутацкі сход і кватэрная камісія. Паводле плана Быхава, распрацаванага ў 1778 г., старажытная ўмацаваная частка горада была захавана як планіровачнае ядро, вакол якога вялася новая забудова. Вулічную сетку горада складалі 19 незабрукаваных вуліц, на галоўных з іх у 1870 г. былі пракладзены дашчатыя тратуары, а у 1878 г. ўстаноўлены газавыя ліхтары. У 1879 г. з'явіўся гарадскі гадзіннік, была набыта пажарная машына, у 1882 г. пры паштовай канторы адкрыта тэлеграфная станцыя. З 1872 г. дзейнічала метэаралагічная станцыя Паўночна-Заходняга аддзела рускага імператарскага геаграфічнага таварыства.

З-за адсутнасці водаправода жыхары карысталіся вадой з 4 калодзежаў і з ракі. На пачатак 1880-х гадоў плошча горада складала 3820 дзесяцін. Працавалі 2 прадпрыемствы па вырабу запалак і цэглы, крупадзёрка, 4 ветраныя млыны, 84 крамы, 3 царквы, касцёл, сінагога, 10 малельных школ, 2-класнае павятовае і прыходскае з жаночай зменай вучылішчы, у якіх працавала 8 настаўнікаў. Да канца 19 стагоддзя Быхаў заставаўся невялікім павятовым горадам са слабаразвітай прамысловасцю і поўнай адсутнасцю камунальнай гаспадаркі. У 1897 г. тут жыло 6400 чалавек (36,2 % пісьменных), было 1133 гаспадаркі, з іх 1127 прыватнаўласніцкіх.

У Быхаўскім павеце адкрываліся вінакурныя, дзягцярныя, смолашкіпінарныя, цагельныя, лесапільныя прадпрыемствы. З 1874 г. ў маёнтку Сарочына працаваў вінакурны завод, у 1895 г. тут было 9 рабочых, мелася паравая машына, з 1878 г. вінакурны завод дзейнічаў у в. Грудзінаўка (у 1913 г. 8 рабочых). У 1874 г. ў в. Следзюкі заснаваны смалакурны (у 1881 г. 11 рабочых), у 1881 г. ў в. Радзькаў — дзягцярны і смолашкіпінарны заводы (6 рабочых), у 1881 г. ў вёсках Вець і Ніканавічы — цагельныя заводы. З 1890 г. ў в. Дунаёк працаваў вінакурны завод (у 1895 г. 6 рабочых), дзе мелася паравая машына. У 1897 г. Александрыйскі шклозавод у в. Ветранка выраблял аптэкарскае і лямпавае шкло, посуд, шкляныя дэкаратыўныя ўпрыгожанні. У 1900 г. тут працавала 77, у 1913—86 рабочых. У в. Баркалабава дзейнічала медзеплавільнае прадпрыемства (у 1898 г. 50 рабочых), лесапільны завод (у 1898 г. 50 рабочых), 2 вінакурныя заводы. Развіццю гандлю спрыяла правядзенне кірмашоў і таржкоў. У в. Язвы (з 1964 г. в. Усходняя) у 1897 г. кірмашы праводзіліся тры разы на год, штогод 13 мая ў в. Грудзінаўка праводзіўся таржок. У пачатку 20 ст. адкрываліся новыя заводы: у 1902 г. вінакурны ў в. Радзькава Слабада (у 1913 г. 8 рабочых), у 1903 г. смалакурны ў в. Тошчыца, у 1903 г. лесапільны ў в. Верхняя Тошчыца (у 1913 г. 30 рабочых, быў рухавік магутнасцю 45 конскіх сіл), у 1911 г. ў в. Тошчыца лесапільны і іншыя. У некаторых вёсках павета будаваліся паравыя або ветраныя млыны, існавалі сукнавальні, кузні.

Значныя змены адбыліся ў жыцці Быхава ў пачатку 20 стагоддзя. Расло насельніцтва горада, павялічылася колькасць прамысловых прадпрыемстваў з выкарыстаннем вольнанаёмнай працы. Працэс развіцця капіталістычных адносін суправаджаўся ўзмацненнем эканамічнага ўціску рабочых, ростам іх рэвалюцыйнай свядомасці. У 1902 г. з увядзеннем у эксплуатацыю чыгункі Магілёў — Жлобін Быхаў стаў чыгуначнай станцыяй. Паляпшэнне шляхоў зносін садзейнічала ажыўленню гандлёвай дзейнасці. З ёй былі звязаны 4 аддзяленні дзяржаўных апчадных кас і банкаў, 5 страхавых агентаў, натарыяльная кантора. Тут

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

адбываўся адзін з буйнейшых кірмашоў з гадавым абаротам у 250 тысяч рублёў.

У 1904 г. ў Быхаве было 7270 жыхароў. Працавалі заводы па вырабу скур і мыла, 3 крупадзёркі, 2 маслабойні, 4 ветраныя млыны, 4 панчошныя прадпрыемствы. Усяго было 39 прадпрыемстваў, на якіх працавалі 57 рабочых. Імі выраблена прадукцыі на 9,1 тысячы рублёў. Колькасць рамесніцкіх прадпрыемстваў павялічылася да 162, на іх было занята 670 рамеснікаў. Мянялася і аблічча горада, тут было 974 дамы, з іх 3 мураваныя, 4 гасцініцы, 10 пастаялых двароў, 12 корчмаў, харчэўняў і чайных, колькасць ліхтароў на вуліцах павялічылася да 70. На пачатак 20 стагоддзя ў горадзе меліся 3 пачатковыя навучальныя ўстановы (7 настаўнікаў, 707 вучняў), 2 прыватныя школы, друкарня, фотамайстэрня, бальніца на 12 месцаў, 2 прыёмныя пакоі, аптэка, 4 аптэчныя крамы. Працавалі 3 урачы, 2 акушэркі, 3 фельчары, 1 ветэрынар. На аднаго ўрача прыпадала 2423 жыхары.

Становішча сялянства ў вёсках Быхаўскага павета працягвала аставацца вельмі цяжкім. Беззямелле і галеча вымушалі многіх сялян прасіць дазволу на перасяленне ў аддаленыя раёны Расіі. Так, у ліпені 1896 г. 28 сялянскіх сем'яў (127 чалавек) з вёскі Палкі вырашылі перасяліцца ў Сяміпалацінскую губерню. 15 сямей былі беззямельнымі і перабіваліся выпадковымі заробкамі, і царскі ўрад адмовіў ім у перасяленні, бо яны не мелі для гэтага ніякіх сродкаў. Многа сялянскай беднаты з вёскі Палянінавічы перасялілася ў Іркуцкую губерню.

З развіццём капіталізму і пераходам яго ў стадыю імперыялізму абвастрылася класавая барацьба. У 1899 г. сяляне з в. Новы Быхаў заханілі 40 дзесяцін памешчыцкай зямлі, адбыліся сутычкі з паліцыяй, у в. Ветранка ўспыхнула забастоўка на шклозаводзе. Гэта быў перши крок рабочага руху ў павеце.

Прамысловы крызіс 1900—1905 гг. выклікаў узмацненне капіталістычнай эксплуатацыі рамеснікаў і рабочых. Заработная плата рабочых на прадпрыемствах Быхава складала ў дзень усяго 50—100 капеек у мужчын і 25—70 капеек у жанчын.

Эканамічны прыгнёт і палітычнае бяспраўе ўзмацнілі народнае супраціўленне самадзяржаўю. У маі — чэрвені 1900 г. пад кіраўніцтвам студэнта Харкаўскага універсітэта У. Я. Бабкова (ураджэнец г. Быхава) была створана сацыял-дэмакратычная група, пад уплывам якой у жніўні — верасні 1900 г. адбыліся першыя ў горадзе эканамічныя забастоўкі. У лістападзе 1902 г. адбылася стачка краўцоў, у пачатку 1903 г. — першая вулічная дэманстрацыя, летам 1903 г. — стачка рабочых, у снежні 1903 г.— масоўка, прысвечаная памяці дзекабрыстаў. У 1904 г. створана Быхаўская арганізацыя РСДРП, якая ўваходзіла ў Палескі камітэт. Пад уплывам падзей восенню 1904 г. адбылося хваляванне прызыўнікоў на прызыўным пункце ў Быхаве супраць руска-японскай вайны і царскага самадзяржаўя. Хваляванне суправаджалася сутычкамі з паліцыяй і казакамі. Для кіраўніцтва рэвалюцыйным рухам у павеце пры Быхаўскай арганізацыі РСДРП была створана сялянская група РСДРП.

Працоўныя Быхаўшчыны актыўна ўдзельнічалі ў першай Расійскай рэвалюцыі 1905—1907 гг. Расстрэл рабочых 9 студзеня 1905 г. ў Пецярбургу выклікаў абурэнне народа. Пад кіраўніцтвам мясцовай арганізацыі РСДРП у павеце пачаліся стачкі і палітычныя дэманстрацыі пратэсту супраць крывавага злачынства царызму. У студзені — лютым прайшлі нелегальныя рэвалюцыйныя сходы сялян у вёсках Мокрае, Трасцівец, Сядзіч. Група сялян з вёскі Трасцівец была арыштавана і пасаджана ў Магілёўскую турму. 8 сакавіка 1905 г. рабочыя Быхава явачным парадкам увялі 8-гадзінны рабочы дзень, а 26 сакавіка арганізавалі маніфестацыю, у якой прынялі ўдзел больш за 100 чалавек. 18 красавіка ў Быхаве аб'явілі забастоўку ўсе рабочыя і рамеснікі. 9 ліпеня адбылася масавая дэманстрацыя ў памяць ахвяр «крывавай нядзелі». Сялянская група пры Быхаўскай арганізацыі РСДРП надрукавала пракламацыю, у якой заклікала вяскоўцаў сумесна з гарадскімі рабочымі на барацьбу за звяржэнне царызму. Вялікую агітацыйную работу сярод землякоў праводзіў член РСДРП, селянін з вёскі Сядзіч, няўлоўны агітатар Апанас Пракопавіч Самалётаў. Актыўнымі байцамі

Агульны выгляд Быхава з боку Дняпра. Ілюстрацыя з кнігі «Россия: Полное географическое описание нашего отечества». Т. 9. Спб., 1905.

Быховский районный историко-краеведческий музей

рэвалюцыі былі жыхар вёскі Трасцівец Іван Міхайлавіч Баранкевіч, ураджэнец вёскі Грудзінаўка Аляксандр Апанасавіч Мазураў, які прымаў удзел у паўстанні на браняносцы «Пацёмкін».

Каб стрымаць рэвалюцыйны рух, раскалоць лагер рэвалюцыі, царскі ўрад пачаў выкарыстоўваць палітыку лавіравання. 6 жніўня 1905 г. быў апублікаваны маніфест «Аб заснаванні Дзяржаўнай думы». Пры выбарах у Дзяржаўную думу царскі ўрад зрабіў усё, каб не дапусціць у яе апазіцыйныя элементы. Вось што пісала газета «Русь» у нумары ад 1 лютага 1907 г. ў артыкуле «Злоўжыванні на выбарах у 2-ю Дзяржаўную думу ў гор. Быхаве»: «На выбарах у гарадскім з'ездзе ў Быхаве вялікія злоўжыванні. Выбаршчыкам не былі разасланы павесткі, натарыяльныя пасведчанні асобы не прымаліся, спраўнік Мізгайла ўвесь дзень выбараў быў унутры памяшкання для выбараў і адкрыта там агітаваў за «истиннорусского» Скібінскага. Там жа паліцэйскімі пісаліся пасведчанні асобы і ўручаліся запоўненыя бюлетэні. Выбраны член «Саюза рускага народа» Скібінскі. Насельніцтва раёна абурана самавольствамі...» Працоўныя масы ўсё больш пераконваліся ў ашуканстве цара і рашуча выступалі супраць самадзяржаўя, шырыўся аграрны рух. Сяляне выязджалі ў памешчыцкія лясы і вывозілі бярвенне на вачах у памешчыкаў і ўласнікаў маёнткаў, аказвалі адкрытае супраціўленне лясной ахове і чынам паліцыі. Для задушэння аграрнага руху ў Быхаўскі павет была накіравана з Магілёва рота ўзброеных салдат. У 1905—1907 гг. найбольш буйныя хваляванні адбыліся ў панскіх маёнтках Эйхельмана, Малашыцкай, Манкевіч, у вёсках Мокрае, Сядзіч, Тайманава, Камарычы. У час узброенай сутычкі сялян вёскі Мокрае з паліцыяй быў забіты 22-гадовы селянін Аляксандр Рудкоўскі.

23 снежня 1905 г. сяляне з в. Мокрае зрабілі недазволеную высечку памешчыцкага лесу, у маёнтку Сарочына збілі лесніка і аканома. 5 студзеня 1906 г. яны зноў высеклі памешчыцкі лес, пры спробе адняць яго адбыліся сутычкі з паліцыяй. У ліпені 1906 г. на вясковых сходах у вёсках Мокрае і Тайманава выступаў дэпутат 1-й Дзяржаўнай думы Ф. Буслаў, які пазнаёміў сялян з дзейнасцю членаў Думы па сялянскім пытанні і заклікаў іх падтрымаць партыю трудавікоў. Летам 1906 г. сяляне з в. Мокрае адмовіліся плаціць грошы грудзінаўскай памешчыцы Талстой і лудчыцкім памешчыкам Есманам за арандаваныя на скос лугі. У жніўні 1906 г. разам з сялянамі з в. Следзюкі яны абяззброілі групу лугавых вартаўнікоў памешчыцы Талстой каля Крывога возера. Графіня Талстая у адказ на гэта павялічыла штрафы за патравы атавы на лугах. Восенню 1906 г. 12 стагоў памешчыцкага сена на прыдняпроўскім лузе спалены сялянамі з в. Мокрае. У кастрычніку 1905 г. ў в. Сядзіч была наладжана антыўрадавая агітацыя, у студзені 1906 г. пры арышце агітатара адбыліся сутычкі сялян з паліцыяй. У чэрвені — ліпені 1906 г. з-за нізкай аплаты працы рабочыя з Сядзіч адказаліся працаваць на памешчыка. Восенню 1907 г. на прыдняпроўскім лузе супраць в. Сядзіч сяляне спалілі памешчыцкі хлеў з жывёлай. Вінаватыя ў падпале паліцыяй не выяўлены. Графіня Талстая была вымушана адмяніць штрафы за патраву атавы. 30 снежня 1905 г. сяляне з в. Тайманава самавольна пасеклі памешчыцкі лес. У снежні 1905 г. ў вёсцы былі распаўсюджаны лістоўкі сялянскай групы пры Магілёўскай арганізацыі РСДРП. У сакавіку 1906 г. сяляне зноў пасеклі памешчыцкі лес, а 26 чэрвеня 1906 г. не згадзіліся на памешчыцкія ўмовы аплаты працы, забаставалі. Самавольныя высечкі памешчыцкага лесу адбыліся ў сакавіку 1905 г. ў вёсках Абідавічы і Усохі, у в. Усохі лес быў вывезены на 130 падводах.

У ліпені 1905 г. ў в. Прыбераж ка адбыліся хваляванні сельскагаспадарчых рабочых, якія патрабавалі ад памешчыка паляпшэння харчавання. 26 чэрвеня 1906 г. сяляне-падзёншчыкі з в. Сялец адмовіліся працаваць у в. Букоўе, бо памешчык не заплаціў ім па раней дагаворанай згодзе. У кастрычніку 1906 г. сяляне з в. Глухі адмовіліся выконваць падводную павіннасць, вясковы сход зняў валаснога старшыню і выбраў новага.

У 1907 г. рэвалюцыйны рух у павеце, як і па ўсёй краіне, праходзіў ва ўмовах усё большага ўрадавага тэрору. Рэвалюцыя была задушана. Пасля яе паражэння капіталісты і памешчыкі ўзмацнілі наступленне на рабочы клас і сялянства. Была зніжана зарплата, падоўжаны рабочы дзень, павялічыліся штрафы. У панскім ярме задыхалася сялянства. Велізарным цяжарам на яго плечы клаліся падаткі. За сялянамі накапіліся шматлікія нядоімкі. Каб спагнаць іх, улады апісвалі і прадавалі маёмасць і жывёлу сялян з таргоў.

Царскі ўрад намагаўся ўмацаваць сваю сацыяльную апору на месцах. Гэтаму павінна была паслужыць сталыпінская аграрная рэформа. У выніку яе правядзення ў 1911 г. 135 230 дзесяцін лепшай зямлі ў павеце апынуліся ў руках памешчыкаў, кулакоў, 1792 сялянскія гаспадаркі не мелі коней (1912). Па закліку сялянскай групы пры Быхаўскай арганізацыі РСДРП сяляне павета ўзмацнілі барацьбу супраць землеўладальнікаў, адмаўляліся пакінуць сельскую абшчыну і выходзіць на хутары (у 1913 г. сяляне вёскі Вялікія Боўкі Быхаўскага павета адмовіліся ад прыняцця прыгавору аб развёрстцы зямлі пад хутары).

У 1911 г. ў Быхаве было 39 прамысловых прадпрыемстваў, дзе працавала 69 рабочых, 6 навучальных устаноў, у ліку якіх трохкласнае гарадское вучылішча, ніжэйшае рамеснае вучылі-

Быховский районный историко-краеведческий музей

шча, прыходскае мужчынскае і жаночае вучылішчы, 2 царкоўнапрыходскія школы, ва ўсіх гэтых установах навучалася 646 дзяцей. У 1913 г.— 8,1 тысячы жыхароў, адкрыты першы кінатэатр (Тэатр мастацтваў). У 1916 г. закончана будаўніцтва моста цераз Дняпро. Новае пагоршанне эканамічнага становішча працоўных і ўзмацненне рэвалюцыйнага руху выклікала першая сусветная вайна. Пратэстам супраць вайны сталі ўцёкі салдат з фронту. У 1916 г. ў Быхаве былі затрыманы 24 чалавекі ніжніх чыноў. У студзені 1917 г. іх колькасць павялічылася да 65.

Шырокі водгук у Быхаве знайшлі падзеі Лютаўскай рэвалюцыі ў Петраградзе. У горадзе пракацілася хваля мітынгаў і дэманстрацый. Бальшавіцкія ідэі сталі пранікаць у асяроддзе Быхаўскага гарнізона.

1 сакавіка 1917 г. Петраградскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў выдаў загад № 1 аб выбранні салдацкіх камітэтаў ва ўсіх вайсковых часцях і падраздзяленнях. 7 сакавіка 1917 г. салдаты размешчаных паблізу Быхава палкоў разгромілі гарадскую турму і вызвалілі палітзняволеных, арганізавалі дэманстрацыю. Быў выбраны камітэт рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Па яго пастанове ў сакавіку 1917 г. былі арыштаваны амаль усе камандзіры часцей мясцовага гарнізона. У красавіку 1917 г. Быхаўская арганізацыя РСДРП звярнулася з адозвай да салдат падтрымаць Петраградскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У адказ 8 тысяч салдат 3-га Ужынскага і 112-га Калагрыўскага палкоў увайшлі ў горад і вызвалілі з турмы 7 бальшавікоў — упаўнаважаных Петраградскага Савета, прыгавораных за рэвалюцыйную агітацыю да пакарання смерцю. Быў выбраны гарадскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў, у склад якога ўвайшлі 7 упаўнаважаных Петраградскага Савета, прадстаўнікі часцей гарнізона і гараджан.

11 мая 1917 г. ў Быхаве адбылася дэманстрацыя, арганізаваная пасланцамі рэвалюцыйнага Балтыйскага флоту М. Л. Рудкоўскім (ураджэнец в. Мокрае) і Д. Р. Емяльянавым-Елкіным (ураджэнец в. Сядзіч). Дэманстранты патрабавалі хлеба, міру і свабоды, разбурылі помнік Аляксандру II і вывесілі чырвоны сцяг.

Пасля ліпеньскага 1917 г. расстрэлу ў Петраградзе і пераходу ўлады да Часовага ўрада Быхаўскі Савет быў разагнаны, рэвалюцыйныя вайсковыя часці гарнізона раззброены і адпраўлены на фронт. На сходзе Быхаўскага павятовага зямельнага камітэта была выбрана павятовая зямельная ўправа. Старшынёй яе стаў эсэр А. Ц. Вазіла, а членамі яго бліжэйшыя паплечнікі А. Е. Буслаў, Н. Т. Антонаў. У павеце актывізаваліся розныя буржуазна-рэфармісцкія і нацыяналістычныя партыі. Буйныя памешчыкі Есманы, Радкевічы, Фрэймарк, Сазановіч і іншыя стварылі свой «Саюз зямельных уласнікаў» пад старшынствам памешчыка К. Я. Есмана. Павятовым камісарам быў назначаны памешчык В. І. Есман. Яны імкнуліся не дапусціць размеркавання сялянамі панскіх, царкоўных і манастырскіх зямель.

Пад уздзеяннем бальшавіцкай агітацыі рабочыя і сяляне Быхава разагналі зямельную ўправу з прадстаўнікоў буржуазіі і сталі самастойна вырашаць зямельныя пытанні на сваю карысць. Яны раздзялілі зямлю памешчыка Грускоўскага, сенажаці ў пойме Дняпра братоў Радкевічаў, Есмана, графіні Талстой, Буйніцкага манастыра, Быхаўскай троіцкай царквы.

На час карнілаўскага мяцяжу ў Быхаве дзейнічаў надзвычайны орган па арганізацыі адпору мяцежнікам. З дапамогай рэвалюцыйных салдат і рабочых чыгуначнікаў ён сарваў спробы контррэвалюцыі выкарыстаць чыгуначную станцыю для адпраўкі войск у Петраград і Маскву. Да 13 верасня 1917 г. карнілаўшчына была разгромлена. Генералы Карнілаў, Лукомскі, Маркаў, Раманоўскі, Дзянікін, Эрдэлі і іншыя былі арыштаваны і зняволены, як было паведамлена, у быхаўскую турму. На самай жа справе генералы знаходзіліся не ў турме, а ў памяшканні былой жаночай гімназіі.

Разгром карнілаўскага мяцяжу карэнным чынам змяніў становішча ў краіне. Бальшавікі сваёй пастойнай работай пераканвалі народ у тым, што выратаванне краіны ў ліквідацыі антынароднага Часовага ўрада. У Быхаўскім павеце вялікую работу ў гэты час праводзілі М. Л. Рудкоўскі, Д. Р. Емяльянаў-Елкін, С. К. Дзергачоў і іншыя. Яны растлумачвалі бядняцкім масам бальшавіцкую праграму, заклікалі іх браць уладу ў свае рукі. Набліжалася сацыялістычная рэвалюцыя.

Г. Е. Барысаў, В. М. Удальцоў.

З архітэктурнай спадчыны

Горад Быхаў, вядомы з 14 стагоддзя пад назвай Стары Быхаў, узнік як умацаванае пасяленне на ўзвышаным правым беразе Дняпра пры ўпадзенні ў яго р. Макранкі (Сапежынкі). Высокі бераг Дняпра і шырокая заліўная пойма служылі натуральнымі перашкодамі, якія дапаўняліся штучнымі драўлянымі ўмацаваннямі. Шчыльная драўляная жылая забудова размяшчалася на спакойным роўным плато надпоймавай тэрасы.

З 2-й палавіны 16 стагоддзя Стары Быхаў належаў магнацкаму роду Хадкевічаў. У 1590—1619 гг. гетман Вялікага княства Літоўскага Ян Караль Хадкевіч зрабіў тут сваю ўмацаваную жылую рэзідэнцыю і адначасова перабудаваў го-

Быховский районный историко-краеведческий музей

рад, ператварыўшы яго ў адну з найбольш магутных цытадэлей дзяржавы. Быхаў быў класічным прыкладам горадабудаўніцтва перыяду рэнесансу. Сістэму ўмацаванняў горада складалі земляныя валы з бастыёнамі, равелінамі і равамі, якія ўтваралі ў плане амаль правільны паўкруг радыусам 400 м. Тэрыторыя горада-крэпасці была каля 25 га. Выцягнуты ўсходні 800-метровы дыяметр адпавядаў броўцы рэльефу, што крута паніжаўся да поймы Дняпра. Геаметрычным цэнтрам паўкруглага плана Старога Быхава і кампазіцыйнай дамінантай яго забудовы быў замак феадала, які дапаўняў усходні бок умацаванняў горада-крэпасці. Ад яго пачыналася вялікая (220×90 м) прамавугольная гандлёвая плошча. Яна падзяляла тэрыторыю горада на дзве часткі. Паводле плана Старога Быхава 1781 г. планіровачная структура горада была блізкая да рэгулярнай. Сетка ўзаемна перпендыкулярных вуліц утварала 32 жылыя кварталы. Шырыня галоўнай вуліцы была каля 10 м, астатнія былі вузейшыя, да 4 м. Галоўная вуліца перасякала гандлёвую плошчу пасярэдзіне яе выцягнутых падоўжных бакоў. Кароткія канцавыя адрэзкі галоўнай вуліцы размяшчаліся радыяльна і крыху парушалі прамавугольную сетку вуліц. Яны вялі да сіметрычна размешчаных у поясе ўмацаванняў гарадскіх брам. Паўночная брама, якая адкрывала шлях на Магілёў, называлася Магілёўскай, паўднёвая — Рагачоўскай. Трэцяя брама называлася Падольнай і выводзіла з крэпасці да нізінай поймы Дняпра, на Падол. Сярод жылой забудовы размяшчаліся каталіцкі кляштар, 2 праваслаўныя царквы, сінагога і яўрэйская школа, на гандлёвай плошчы — крамы. Пераважала драўляная забудова. Мураванымі былі толькі замак, гарадскія брамы і сінагога.

Замак з'яўляўся часткай умацаванняў горада-крэпасці і ў той жа час дзеля большай бяспекі феадала быў аддзелены ад горада падатковым ровам і пад'ёмным мостам, меў уласныя абарончыя прыстасаванні. Ён ужо не быў падобны на традыцыйныя прыватнаўласніцкія замкі папярэдняга часу з магутнымі мураванымі абарончымі сценамі і баявымі вежамі. Пад уплывам рэнесансавага светапогляду, эстэтычнага і тэхнічнага ўздзеяння заходнееўрапейскага Адраджэння замкавае дойлідства Беларусі паступова ператварылася ў палацава-замкавае. Рысы гэтага працэсу відавочныя і ў архітэктуры замка ў Старым Быхаве (Быхаўскі палацава-замкавы комплекс збярогся часткова). Замкавы комплекс складаўся з некалькіх мураваных карпусоў, якія ўтваралі ў плане няправільны чатырохвугольнік памерамі 75×70 м. З поўначы ўнутраны двор замыкаўся мураванай сцяной з выхадам на гарадскі вал. Заходні бок замкавага комплексу, павернуты да гандлёвай плошчы, быў забудаваны карпусамі казарм, меў пасярэдзіне ўязную браму з пад'ёмным мостам і фланкіраваўся па вуглах васьміграннымі абарончымі вежамі. На поўдзень ад вежы цягнулася мураваная сцяна, пазней замененая драўлянымі карпусамі. За імі размяшчаўся мураваны двухпавярховы службовы корпус, які прымыкаў да палаца. Выцягнуты будынак самога палаца галоўным падоўжным фасадам быў арыентаваны на ўсход, да Дняпра, быў накрыты высокім двухсхільным чарапічным дахам, па вышыні амаль роўным двум паверхам. Да сярэдзіны ўсходняга і тарцовага паўднёвага фасадаў палаца прылягаюць гранёныя вежы, якія раней былі пяціяруснымі і завяршаліся двух'яруснымі купалкамі-«банькамі» (уплыў архітэктуры нідэрландскага рэнесансу). Фасад палаца, павернуты ўнутр двара, быў афармлены двух'яруснай арачнай галерэяй з уваходамі ва ўнутраныя памяшканні. Аркада першага паверха была мураваная з крыжовымі скляпеннямі, на 2-м паверсе галерэя была драўляная. Пад будынкам размешчаны вялікія скляпістыя падвалы. Першы паверх (таксама з магутнымі крыжовымі скляпеннямі) займалі службовыя памяшканні, каморы, майстэрні. Другі паверх, што прызначаўся для жылля гаспадароў, падзяляўся на дзве палавіны — жаночую і мужчынскую. На тарцы размяшчалася зала прыёмаў, у вежах — капліца, бібліятэка і кабінет гаспадара. Папярочныя мураваныя сцены рытмічна падзяляюць будынак на прыблізна аднолькавыя памяшканні, маюць анфіладную сувязь. Такія ж папярочныя нясучыя сцены, скляпеністыя перакрыцці і анфіладную сувязь памяшканняў мелі і іншыя мураваныя карпусы палацава-замкавага комплексу. На сённяшні дзень страчаны многія элементы дэкору будынкаў, завяршэнні вежаў, першапачатковая ўнутраная планіроўка.

Акрамя жылой рэзідэнцыі феадала абарончыя прыстасаванні мелі таксама гарадскія брамы (аб іх архітэктуры звестак не захавалася) і мураваны будынак сінагогі, які размяшчаўся непадалёку ад Магілёўскай брамы. Будынак быў пастаўлены ў пачатку 17 ст., збярогся да нашых дзён. Збудаванне, у плане блізкае да квадрата (20×21 м), падзялялася чатырма 8-граннымі слупамі, размешчанымі ў цэнтры, на дзевяць частак (палёў).

Будынак замка ў Быхаве.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Вуглавыя часткі перакрыты крыжовымі, прамежкавыя ячэйкі — цыліндрычнымі з распалубкамі скляпеннямі. Лаканічны аб'ём будынка (вышыня 11 м) завяршаўся дэкаратыўна-абарончым атыкам з байніцамі, якія пазней былі замураваны. На паўднёвым рагу будынка размешчана круглая баявая вежа з вітой лесвіцай унутры. Даволі вялікія вокны з раструбамі ў абодва бакі маюць паўцыркульныя арачныя завяршэнні. Ордэрны дэкор фасадаў выкананы ў стылі рэнесансу. У вырашэнні інтэр'ера будынка выкарыстаны элементы барока. Цэнтральнае поле паміж слупамі, якое выкарыстоўвалася для кафедры (біма), мела двух'ярусную кампазіцыю. Ніжні ярус быў перакрыты невялікім паўсферычным купалам, аздобленым ляпным раслінным арнаментам. На другім ярусе са скразнымі арачнымі праёмамі размяшчаўся ліхтар, што стварала своеасаблівую дынаміку асвятлення ў паўцёмным памяшканні з тоўстымі сценамі (1,75 м) і масіўнымі скляпеннямі.

На плане Быхава канца 18 ст. акрамя адзначаных мураваных пабудоў пачатку 17 ст. нанесены больш познія мураваныя будынкі касцёла і крам на гандлёвай плошчы. Касцёл у стылі сталага барока пачатку 18 ст. стаяў на поўнач ад замка, па-за ровам, быў абнесены мураванай сцяной.

У 19 ст. земляныя ўмацаванні горада скасаваны, што спрыяла яго больш свабоднаму развіццю. Былі пракладзены драўляныя тратуары, устаноўлена вулічнае асвятленне, гарадскі гадзіннік. Жылая забудова па-ранейшаму заставалася цалкам драўлянай. У сярэдзіне 19 ст. сярод жылля пастаўлена драўляная Троіцкая царква з рысамі позняга класіцызму. Будынак чатырохзрубны, крыжападобны ў плане. Над сяродкрыжжам — вялікі светлавы васьмерыковы барабан, завершаны купалам. Алтарны і бакавы зрубы маюць гранёную форму. Цэнтрычнасць кампазіцыі парушае выцягнуты прамавугольны зруб бабінца, над якім пры ўваходзе надбудавана 2-ярусная васьмерыковая вежа-званіца, таксама з купальным завяршэннем. Вокны завершаны паўцыркульна. Сцены ашаляваны вертыкальна. Па сваіх традыцыйных формах, канструкцыях і дэкору царква — адзін з нямногіх помнікаў манументальнага драўлянага дойлідства ўсяго прыдняпроўскага рэгіёна.

У 1902 г. на захад ад Быхава пралягла чыгунка, што абумовіла ў значнай ступені яго далейшае развіццё і сучасную планіровачную структуру. Развіццё горада ў савецкі перыяд адбывалася паводле генеральных планаў, распрацаваных у 1947 і 1968 гг. у інстытуце Белдзяржпраект і праекта дэталёвай планіроўкі цэнтра, распрацаванага ў 1947 г. ў Мінскім філіяле ЦНДІПградабудаўніцтва. У 1983 г. ў БелНДІПградабудаўніцтва скарэкціраваны агульні генплан горада, адначасова там жа распрацаваны новы праект дэталёвай планіроўкі цэнтральнай часткі Быхава, паводле іх і вядзецца сучасная забудова.

Акрамя архітэктурных помнікаў Быхава на тэрыторыі раёна таксама захавалася некалькі манументальных культавых збудаванняў, якія з'яўляюцца помнікамі архітэктуры.

У в. Балонаў-Сялец зберагласа драўляная царква, пабудаваная ў сярэдзіне 19 ст. Будынак крыжападобны ў плане, але пяцізрубны. Цэнтральны кубічны аб'ём вышэйшы за астатнія, накрыты высокім чатырохсхільным шатром, завершаным барабанам з галоўкай. Унутры шатра

Будынак былой сінагогі ў Быхаве.

Троіцкая царква ў Быхаве.

Быховский районный историко-краеведческий музей

«схавана» самкнёнае скляпенне, якое ў інтэр'еры абапіраецца на восем слупоў. Да асноўнага аб'ёму прымыкаюць больш нізкія прамавугольныя зрубы бабінца, сіметрычных бакавых аб'ёмаў і пяцігранная алтарная апсіда. Над бабінцам надбудавана двух'ярусная званіца з шатровым завяршэннем, якое адпавядае пакрыццю асноўнага аб'ёму. Архітэктуры царквы ўласцівы шматпланавая аб'ёмна-прасторавая кампазіцыя і выразны сілуэт.

За 1,5 км на паўночны ўсход ад в. Баркалабава ў маляўнічым куточку каля Дняпра захаваліся рэшткі старажытнага праваслаўнага манастыра, дзе быў створаны выдатны помнік беларускага летапісання — Баркулабаўская хроніка. Саборная царква гэтага манастыра была заснавана ў 1641 г. вядомым набожнікам праваслаўнай царквы Багданам Статкевічам і архімандрытам Іаілам Труцэвічам. У 1904 г. на галоўнай вуліцы вёскі Баркалабава была пастаўлена мураваная царква ў псеўдарускім стылі. Будынак падоўжна-восевай кампазіцыі багата аздоблены архітэктурнай пластыкай, мае праёмы разнастайнай формы з абрамленнямі ў выглядзе какошнікаў. Каля царквы пабудавана двухпавярховая манастырская гасцініца.

Выдатным у архітэктурных адносінах з'яўляецца палацава-паркавы ансамбль у в. Грудзінаўка, створаны на працягу 19 ст. У цэнтры сядзібы, на ўзгорку, размешчаны мураваны палац, пабудаваны ў стылі класіцызму. Яго асноўны двухпавярховы амаль кубічны аб'ём завершаны паўсферычным купалам. Сіметрычныя аднапавярховыя прыбудовы ствараюць франтальную кампазіцыю падоўжных фасадаў. Уваход афармлены адкрытай паўкруглай верандай з 6 калонамі, высокім мураваным ганкам. Бакавыя крылы будынка аднапавярховыя, накрытыя вальмавым дахам. Гарманічныя прапорцыі, стрыманы ордэрны дэкор надаюць палацу велічнасць і ўрачыстасць. Парк перад палацам закладзены ў 1-й палавіне 19 ст. Мае рэгулярную планіроўку. Прамыя ліпавыя алеі змяняюцца на ўскраінах маляўнічымі ландшафтнымі кампазіцыямі. Упрыгожвае парк вялікі дэкаратыўны басейн з фантанамі, размешчаны перад верандай палаца. З захаду тэрыторыя парку абмежавана сажалкай, з поўначы — невялікім гаем з лістоўніцы еўрапейскай. У парку растуць елкі звычайная, серабрыстая, калючая блакітная, хвоя веймутава, туя заходняя, кедр сібірскі, дуб звычайны і пірамідальны, ясень пенсільванскі, таполя канадская, ліпа крымская і іншыя пароды дрэў і кустоў. Дзякуючы гарманічнаму спалучэнню архітэктуры і зялёных насаджэнняў сядзіба ў Грудзінаўцы з'яўляецца адным з найбольш каштоўных помнікаў садова-паркавага мастацтва ў рэспубліцы.

Галоўны фасад Грудзінаўскага палаца.

Часткова збераглася драўляная царква ў в. Лубянка, пабудаваная ў пачатку 20 ст. Яна нагадвае простую сялянскую хату. Да асноўнага зруба, накрытага пакатым чатырохсхільным шатром, прылягаюць адполькавага памеру зрубы бабінца і алтара з двухсхільнымі аркамі. Усе зрубы квадратныя ў плане. Помнік адметны выразнасцю і прастатой, уласцівымі традыцыйнаму народнаму драўлянаму дойлідству.

У в. Мокрае таксама захаваўся помнік драўлянага дойлідства з элементамі псеўдарускага стылю — царква, пабудаваная ў 1865 г. Яна складаецца з чатырох зрубаў рознай вышыні, размешчаных на падоўжнай восі і накрытых асобнымі дахамі. Дамінантай у кампазіцыі будынка з'яўляецца квадратны ў плане асноўны аб'ём, які раней быў завершаны светлавым барабанам з купалам. Пры перабудове ў 1930-я гады зроблены двухсхільны дах з залобкам і плоская падшыўная столь унутры. Да асноўнага аб'ёму прылягаюць больш нізкая пяцігранная апсіда, а таксама аб'яднаныя ў адным выцягнутым зрубе дадатковы аб'ём і бабінец, над якім раней была званіца. Сцены гарызантальна ашаляваны, умацаваны лапаткамі. Аконныя праёмы з паўкруглымі завяршэннямі. Дэкаратыўныя дэталі афарбаваны. Будынак мае 3 уваходы — цэнтральны і 2 бакавыя.

Архітэктурная спадчына Быхаўшчыны даволі багатая і разнастайная. Гэтыя помнікі даўніны павінны быць захаваны для будучых пакаленняў.

Т. В. Габрусь.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Баркулабаўская хроніка

Баркулабаўская хроніка (Баркулабаўскі летапіс) — помнік беларускага летапісання пачатку 17 стагоддзя, вядомы ў адзіным спісе, што зберагаецца ў зборніку 17 стагоддзя ў Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве (Сінадальны фонд № 790). Твор ананімны, напісаны ў в. Баркалабава (Баркулабава) Быхаўскага р-на. Храналагічна ахоплівае 1545—1608 гг. Сістэматычнае апісанне падзей пачынаецца з 1564 г.— з часу заснавання беларускім шляхціцам Баркулабам Іванавічам Корсакам вёскі і замка, названых яго імем. Упершыню апублікавана ў 1877 г. ўкраінскім вучоным П. А. Кулішам. Яе вывучалі М. В. Доўнар-Запольскі, Н. Вайтовіч.

У 1-м томе «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» даецца характарыстыка Баркулабаўскай хронікі. Тэкст яе прыводзіцца з нязначнымі скарачэннямі.

Па знешніх чыста фармальных адзнаках твор гэты ў значнай ступені нясе на сабе адбітак старой летапіснай традыцыі, паводле якой з'явы, падзеі, факты звычайна падаюцца ў храналагічнай паслядоўнасці. Кожны запіс тут аднесены да пэўнага года, дата якога адпавядала апісанаму ў творы факту або жыццёва важнаму выпадку.

Прымаючы пад увагу гэту акалічнасць, некаторыя даследчыкі[1] адносілі названы твор да чыста летапіснай літаратуры. Аднак з гэтым нельга цалкам пагадзіцца, бо ў ім няма ні той маналітнасці тэксту, ні таго адзінства аўтарскай канцэпцыі і стылю, якімі звычайна вызначаліся традыцыйныя ўсходнеславянскія летапісы. І калі ўважліва прыгледзецца да зместу, стылю, дат гістарычных падзей і фактаў гэтага твора, то ён хутчэй за ўсё нагадвае «дамашнія запіскі, чым пагадовы запіс з дзяржаўнага пункту погляду»[2].

Старажытны летапісец незалежна ад таго, з'яўляўся ён аўтарам, рэдактарам або толькі кампілятарам іншых летапісных запісаў, не дапускаў такой частай блытаніны дат, імён і падзей, якую мы знаходзім у «Баркулабаўскім летапісу». Тут гістарычныя даведкі не заўсёды адпавядаюць сапраўдным з'явам. У адрозненне ад старажытнага летапісца аўтар разглядаемага твора сапраўды глядзіць на свет пачамі не дзяржаўнага чалавека, а звычайнага жыхара, які сам хоча добра жыць і жадае, каб і іншыя жылі таксама добра. Пытанні дзяржаўнай палітыкі адыходзяць у аўтара на другі план, як толькі ён пераходзіць да апісання жыцця і быту сялянства, яго радасцей і пакут. І тут ён умее вылучыць з жыццёвых з'яў і фактаў найбольш характэрнае і перадаць яго так тыпна і вобразна, што перад чытачом паўстае жывы малюнак тагачаснай рэчаіснасці.

Нататкі пра мінулае, успрынятыя аўтарам з дакументальных пісьмовых крыніц або з вусных пераказаў, не вызначаюцца мастацкімі якасцямі. Стыль іх пазбаўлен мастацкай выразнасці, эмацыянальнасці, якія характэрны для другой часткі твора.

«Баркулабаўскі летапіс» пачынаецца паведамленнем аб Берасцейскім сейме 1544 г., адзначаным тут пад 1545 г., на якім кароль польскі і вялікі князь літоўскі Сігізмунд Казіміравіч I назначыў пераемнікам на княскі трон свайго сына Сігізмунда II Аўгуста. Гэта звычайнае летапіснае паведамленне дае ўяўленне аб той атмасферы парадкасці, у якой тады праводзіліся дзяржаўныя сеймы Вялікага княства Літоўскага, калі яно было яшчэ палітычна незалежным ад Польшчы.

Потым аўтар пераходзіць да паказу падзей і з'яў пераважна мясцовага характару. Запісы, як правіла, падаюцца ў форме традыцыйных для летапісаў пагадовых рамак, але яны не заўсёды падпарадкаваны строгай гістарычнай храналогіі. Так, напрыклад, у запісах ад 1570 да 1592 г. аўтар часта парушае храналагічную паслядоўнасць, дапускае недакладнасці, вольна абыходзіцца з гістарычнымі датамі, падзеямі, імёнамі цароў, епіскапаў і г. д.[4]. Такім чынам, гэта хутчэй за ўсё твор гістарычна-мемуарнага жанру, таму гаварыць аб ім як аб мясцовым летапісу можна толькі ўмоўна.

«Баркулабаўскі летапіс» уключае матэрыял, узяты з самых разнастайных крыніц. У адным выпадку — гэта ўласныя назіранні аўтара над мясцовым жыццём сяла Баркулабава і яго ваколіц, у другім — лісты, пераказы і ўспаміны іншых асоб, у трэцім — афіцыйныя, прыватныя і дзяржаўныя дакументы эпохі і, нарэшце, народныя легенды і паданні. Аднак разнастайны па свайму характару матэрыял аўтар запісаў не змог размясціць у строгай храналагічнай паслядоўнасці і падаць у адзіным стылі. І толькі там, дзе ён пераходзіць да апісання ім самім убачанага або перажытага, яго замалёўкі набываюць адзіны стыль. Аўтар стварае эмацыянальна насычаныя, выразныя малюнкі мясцовага жыцця, яркія пейзажныя замалёўкі, жывыя вобразы сялян, а ў асобных выпадках, як напрыклад, у апісанні жудасных пакут народа ў самым пачатку XVII ст., яму ўдаецца перадаць і напружаны пульс свайго часу.

Тады, зазначае аўтар запісаў, «было жалосно и страшно гледети и выповедити уздыханя и плачу людей убогих, пашников немаетных»[5], якія з прычыны напаткаўшага іх голаду вымушаны былі пакідаць свае абжытыя мясціны ў басейнах вярхоўяў Дняпра і Заходняй Дзвіны, а нярэдка нават і сем'і і ў сцюдзёную, надзвычай снежную зіму цягнуцца на поўдзень у пошуках кавалка хлеба і талеркі цёплага супу. Знясіленыя, пасінелыя ад лютых марозаў, апухлыя ад голаду людзі абмарожваліся, замярзалі і мерлі. Мерлі ў адзіночку і групамі, мерлі на вуліцах, на дарогах,

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

на полі, на ярах, у пустых хатах і гумнах. Мерла так многа людзей, што ўсіх іх не паспявалі закопваць, а таму бывалі выпадкі, калі ў «ровех псы мертвых многих тела ели».

Гэты поўны драматызму малюнак народных пакут яшчэ больш абвастраецца і нават набывае гукавое адценне калі аўтар, імкнучыся быць дакладным, перадае надрыўныя енкі і просьбы галодных людзей, хоць чаго-небудзь паесці. Ён падкрэслівае, што, прастойваючы часамі каля плоту, варот або ў доме, гэтыя людзі: «отец з сыном, сын з отцом, матка з дочкою, дочка з маткою, брат з братом, сестра з сестрою, муж з жоною, тыми словы мовили силне, слезне, горко, молвили так: «Матухно, зезулюхно, утухно, панюшко, сподариня, солнце, месяц, звездухно, дай крошку хлеба!» Тут же подле ворот будет стояти зраня до обеда и до полудня, так то просячи: там же другий под плотом и умрет... А коли варива просили, тые словы мовили: «Сподарыня, перепелочко, зорухно, зернетко, солнушко, дай ложечку дитяти варивца сырого!»

Аўтар балюча перажывае пакуты і гэтых вымушаных голадам вандроўнікаў, і тых, хто яшчэ заставаўся сядзець на месцы ў надзеі выратавацца ад смерці хлебам з недаспелага і завеянага снегам ураджаю ярыны. Але які гэта быў хлеб, «коли муку житную у хлебе спекут, то тесто печеное солодко, а за скорину хотя ж ложки клади, а в печи не печется». Іменна таму, што сам аўтар вельмі блізка стаяў да народа, добра ведаў яго ўмовы жыцця і, відаць, меў прамое дачыненне да працы хлебароба (бо надзвычай часта звяртаў увагу на земляробчы каляндар і цэны на хлеб на працягу ўсяго свайго летапісу), яго адносіны прасякнуты шчырай спагадай да простага працаўніка. Ён спачувае яму і сумуе, калі той церпіць ад стыхійнага бедства. І тады яго апавяданне набывае мінорныя тоны. А калі жыццё становіцца лепшым, апісанні аўтара набываюць светлыя фарбы і мажорныя тоны.

Многа месца ў запісах «Баркулабаўскага летапісу» адводзіцца і апісанню казацкага руху. Не разумеючы значэння гэтага руху ў барацьбе беларускага і ўкраінскага народаў супраць польскай феадальна-каталіцкай агрэсіі, аўтар выказвае свае рэзка адмоўныя адносіны да казакаў, якія шмат дабра і крам спалілі ў Магілёве і «мешчан, бояр, людей учтивых так мужей, яко и жен, детей малых побили, порубали, попоганили», «скарбов теж незличоных побрали». Разам з тым аўтар не выказвае прыхільнасці і да ваяк Радзівіла, якія таксама набралі з «тутошнего краю лупу». Наогул ваенныя паходы, незалежна ад іх характару, аўтар «разглядае з пункту погляду таго, ці многа ад іх было шкоды мясцоваму насельніцтву, як адбіліся яны на жыцці простага люду»[6]. У выніку такога сялянскага падыходу да асвятлення ваенных падзей у яго нават руска-польская вайна 1580 г. занатавана толькі таму, што тады маскоўскі князь «Серебреный з немалым войском место славное Могилев выжог» і спустошыў сёлы па ваколіцах аж да Копысі і Шклова, а літоўскае войска князя Івана Чартарыйскага з татарскім атрадам Цемрука на Дняпры так «сильным трупом язовища загородили», што жыхары «колко недель днепровое рыбы не ядали и воды не пивали, для великого гнюсу трупу московского».

Летапісец даволі часта праяўляе цікавасць да гістарычных, пераважна грамадска-палітычных падзей у жыцці суседняй Маскоўскай дзяржавы. Але ён пазней так выразна не выказваў сваіх адносін да Масквы, як у запісах, прысвечаных падзеям рускай гісторыі за 1605—1607 гг. Падрабязна і цікава расказвае ён, як жыхары Масквы, «змовившися межи собою, в ночи без вести... грозно вдарили на палац самого царя Дмитра Ивановича» і перабілі там усю яго світу. Сімпатыі аўтара цалкам на баку найстаўшых масквічоў, бо яны не маглі пагадзіцца з той недаравальнай абразай, якую прынеслі да іх каталіцкія паны новага цара, калі ў сваім маскоўскім касцёле «служили службу божую, а з руских церквей великое насмеяние чинили, попов московских уруговали» ды і над імі самімі насміхаліся.

Яшчэ больш адмоўна паставіўся аўтар запісаў да новага самазванца, які ў маі 1607 г. аб'явіўся на Мсціслаўшчыне і «менил себе быти оным царем московским». Ён пераканаўча паказвае, што вайна, распачатая самазванцам у мэтах заваявання маскоўскага царскага трона, была справай рук паноў Рэчы Паспалітай, якія дапамаглі «Дмитрашу» падысці аж да самай Масквы. І толькі дзякуючы выключнай стойкасці і арганізаванасці маскоўскіх людзей войску самазванца, пагледзячы на неаднаразовыя спробы, не ўдалося ўзяць сталіцы.

Аўтар выкрывае новаяўленага самазванца, рэзка асуджае і ганьбіць тых паноў і купцоў Рэчы Паспалітай, якія дапамагалі гэтаму авантурысту весці спусташальную вайну супраць Рускай дзяржавы. Яго расказ пра гэтыя падзеі наскрозь прасякнут спагадлівымі адносінамі да Масквы. Як гуманіст, хай сабе часам і вельмі далёкі ад разумення сутнасці ваенных і палітычных праблем сваёй эпохі, ён спачуваў усім, хто станавіўся ахвярай вайны і ў яе пажары страчваў здабыткі сваёй мазольнай працы.

У ліку значных для свайго часу грамадска-палітычных падзей аўтар апісвае варшаўскі вальны сейм 1587 г., Брэсцкі царкоўны сабор 1596 г. і Сандамірскі шляхецкі рокаш* 1606 г.

Як чалавек, для якога пытанні дзяржаўнай палітыкі не з'яўляліся прадметам такой пільнай увагі, якую ён праяўляў да фактаў мясцовага

---

* Рокаш — узброеная форма апазіцыі да праводзімага каралём дзяржаўнага курсу палітыкі.

Быховскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

жыцця насельніцтва свайго сяла і яго добра вядомых яму ваколіц, баркулабаўскі летапісец не заўсёды ўлоўліваў сэнс сучасных яму грамадска-палітычных падзей. А таму многае з таго, што не праходзіла перад яго вачыма, але аб чым яму даводзілася пачуць ад іншых, ён з прычыны абмежаванасці свайго светапогляду разглядаў проста, часам нават да наіўнасці прамалінейна як праяву звычайнага зла, несумяшчальнага з разумнымі формамі грамадскага жыцця. Так, у прыватнасці, ён разглядаў арганізацыю ў гарадах і мястэчках Вялікага княства Літоўскага праваслаўных царкоўных брацтваў, Сандамірскі шляхецкі рокаш 1606 г., увядзенне ў Рэчы Паспалі-



Старонка з «Баркулабаўскай хронікі». 17 ст.

Быховский районный историко-краеведческий музей

тай у 1583 г. каралём Стэфанам Баторыем новага грыгарыянскага календара і некаторыя іншыя падзеі. Аўтар не гаворыць аб сутнасці каляндарнай рэформы. Ён толькі імкнецца занатаваць, што з увядзеннем новага календара і іншых дат для святкаванняў і гандлю для купцоў «адбылося вяликое замешание промежи панами и промеж людми духовными, также и людми простыми», якое суправаджалася мноствам горкіх слёз, спрэчак, моцных дакораў, рабункамі, а ў асобных выпадках нават і забойствамі. Ва ўсіх гэтых выдатках каляндарнай рэформы аўтар схільны бачыць не што іншае, як «начало пристья антихристова».

Аўтар «Баркулабаўскага летапісу» быў чалавекам свецкім. Таму не выпадкова ён пазбягаў закранаць царкоўныя разыходжанні і спрэчкі ў справе веравызнання. Аднак ён моцна стаяў на баку праваслаўных у іх барацьбе з рэлігійным прыгнётам, варожа ставіўся да каталіцызму, ганьбіў уніяцкіх епіскапаў, абвінавачваў іх у кар'ерызме і вераломнай здрадзе праваслаўнай царкве. Разам з тым для яго як міраніна, які жыў у глухой правінцыі і глядзеў на грамадскае жыццё вачыма селяніна, незразумелым быў патрыятычны характар той нацыянальна-рэлігійнай вызваленчай барацьбы, якую вялі царкоўныя брацтвы супраць феадальна-каталіцкай рэакцыі.

Праца селяніна, яго эканамічнае становішча і сацыяльны быт — вось што цікавіць перш за ўсё і стаіць у цэнтры ўвагі аўтара «Баркулабаўскага летапісу». І гэта адлюстравана ў яго запісах так дэталёва і маляўніча, як ні ў адным з сучасных яму помнікаў літаратуры.

Увага аўтара да гаспадарчых бакоў сялянскага жыцця, а ў сувязі з гэтым да капрызаў прыроды і характару кліматычных умоў была такой пільнай, што іменна з гэтага ён часта пачынае свае пагадовыя запісы. Так, пераказваючы падзеі за 1583 г., аўтар не забывае падкрэсліць, што тады «от великого морозу на полех у колосьи жито посохло» і ««многие домы панов зацных от перунов великих погорели». А каля Мінска і Вільні ад вялікай жары «жито, яри, трава, также ярины огородныя,— всё погорело». З прычыны таго ўбогія людзі тых месц за кавалкам хлеба на Украіну і Русь падаваліся. Лета 1592 г. было бураломнае, затое восень стаяла такая цёплая, што «о Покрове на дереве лист не опал и был зелен у восень так, як на весне; а на других деревех так и зимовал». У той год і «цена житу была таней: чверть — по грошей пяти, мера — по грошей двадцати».

Аўтар, як правіла, ніколі не паўтараўся ў сваіх шматлікіх пейзажна-бытавых замалёўках вясковага жыцця. Для кожнай з іх ён знаходзіў адметную і непаўторную па сваёй эмацыянальнай танальнасці фарбу. Так, 1594 г. у абмалёўцы аўтара тым і вылучаецца ад папярэдніх, што ён «велми был молчалив, бурлив, студен; на збожье мерный». А вось пачатак 1602 г. «был грозный, а остаток плачливый: што было огородных речей — капуста, ботвинье, цибуля, маки, горохи, ячмень, ярица,— то все мороз побил, чого з великим плачем были видети тых людей голодных, которые толко огороды были засеяли, а жыта не починали».

Падобных выразных і каларытных замалёвак у «Баркулабаўскім летапісу» надзвычай багата. Аўтар умеў дакладна, лаканічна і па-народнаму трапна выказаць свае адносіны да пачутага, або перажытага самім.

«Баркулабаўскі летапіс» — гэта унікальны мастацкі твор, значная і цікавейшая частка якога прысвечана адлюстраванню будняў сялянскага жыцця тых месц, якія акружалі сяло Баркулабава і пастаянна знаходзіліся ў полі зроку яго надзвычай дапытлівага і руплівага гісторыка-бытапісца.

Жывая зацікаўленасць гэтага безыменнага бытапісца да гісторыі роднай яму мясцовасці абумовіла тое, што ён з асаблівым захапленнем і замілаванасцю, настомна і па крупінцы, як тая пчала, збіраў і заносіў у свае пагадовыя «соткі-ячэйкі» нават самыя дробныя лакальныя звесткі. Аўтар не выпускаў з-пад увагі і лічыў неабходным зазначыць, на якіх умовах адбывалася заснаванне і засяленне некаторых вёсак і сёл, калі, дзе і з выпадку чаго будаваўся той або іншы храм, хто быў яго першым свяшчэннікам, на якім узроўні тады знаходзілася эканамічнае жыццё сялянскіх мас, калі і якія цэны былі на сельскагаспадарчыя прадукты і г. д.

Канцэнтруючы ўвагу пераважна на бытавых фактах сялянскага жыцця, аўтар даў нам яркае ўяўленне аб настроях, пачуццях, імкненнях свайго сучасніка, чалавека сярэдняга дастатку, над якім мелі ўладу сіла традыцый, прывычкі, улада зямлі і з'явы навакольнай прыроды.

«Баркулабаўскі летапіс» ствараўся ў той час, калі адбываўся бурны працэс развіцця рэлігійна-палемічнай публіцыстыкі, літаратурная мова якой ускладнялася часам без належнай патрэбы механічнымі запазычаннямі лексікі з грэчаскай, польскай, лацінскай, царкоўнаславянскай моў. І толькі, відаць, з прычыны таго, што аўтар гэтага твора стаяў у баку ад рэлігійна-палітычнай барацьбы свайго часу, мова яго запісаў, прызначаных для міран, выгадна вылучаецца сваёй выключнай чысцінёй народнай гаворкі. У ёй няма штучнай кніжнай рыторыкі і таму яна простая, лёгкая, але па-народнаму трапная і сакавітая, вострая і лаканічная і надзвычай філігранная ў сваіх эмацыянальна-стылявых адценнях. У гэтым сэнсе аўтар плённа развіваў лінгвістычную традыцыю Скарыны.

Гістарычна-мемуарная літаратура — цікавая і яркая старонка ў развіцці беларускага старажытнага прыгожага пісьменства. Па свайму характару накіраванасці і зместу гэта літаратура стаяла

Быховский районный историко-краеведческий музей

ў баку ад царкоўнага жыцця, а таму яна прасякнута свецкімі матывамі. Усе падзеі і здарэнні прапускаюцца тут праз прызму індывідуальнага светаўспрымання звычайнага, гістарычна канкрэтнага чалавека і падаюцца з жыццёвых, рэалістычных пазіцый. Яны сагрэты цеплынёй аўтарскіх пачуццяў, дзякуючы чаму іх эмацыянальная танальнасць становіцца дамінантай у мастацкім абрамленні ствараемага малюнка.

Аднаўляючы на сваіх старонках пэўныя этапы ў гістарычным жыцці народа, гэта літаратура ўсім сваім жыццесцвярджальным пафасам была скіравана на ўслаўленне зямных інтарэсаў чалавека незалежна ад таго, на якой ступені культурнага развіцця ён стаяў і з якога сацыяльнага асяроддзя паходзіў. І ў гэтым сэнсе яна зрабіла значны крок наперад у параўнанні з помнікамі царкоўна-рэлігійнай пісьменнасці.

[1] Вольскі В. Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры эпохі феадалізму. Мн., 1958. С. 70—75.
[2] Дабрыніі М. К. Беларуская літаратура. Старажытны перыяд. Мн., 1952. С. 271.
[3] Тамсама. С. 272.
[4] Аўтар запісаў час смерці полацкага епіскапа Версанофія Волаха адзначае пад 1570 г. замест фактычнай смерці 1576 г. Двойчы пад рознымі датамі — у адным выпадку пад 1586 г., а ў другім — пад 1588 г. ён запісвае адну і тую ж падзею — абранне каралём Рэчы Паспалітай шведскага каралевіча Сігізмунда III Вазы. Пад 1580 г. адзначае ўзяцце Пскова польскім каралём Стэфанам Баторыем, хоць аблога Пскова Баторыем была зроблена ў 1581 г. Двойчы і пад рознымі датамі, прычым у першым выпадку правільна (1586), а ў другім месцы пад 1588 г. мемуарыст вызначае час смерці і пахавання ў Кракаве Стэфана Баторыя. Двойчы — адзін раз пад 1576 г., а другі пад 1583 г.— і ў абодвух выпадках памылкова ён гаворыць аб увядзенні новага грыгарыянскага календара. Двойчы блытае аўтар імя Барыса Гадунова, імя пераемніка Феафана на полацкай архіепіскапскай кафедры.

Такія ж казусы назіраюцца ў яго пры датаванні каранацыі Гадунова, пры вызначэнні года смерці полацкага архіепіскапа Феафана і імя забітага Грозным свайго сына, пры ўпамінанні ў якасці рускага цара якогасьці Андрэя, а не Васіля Шуйскага і некаторых іншых гістарычных падзей.
[5] Баркулабовская летопись//Унив. изв. Киев, 1898. № 12. Цытаты ў далейшым падаюцца на дадатку ў гэтым выданні.

Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры. Мн., 1968. Т. I. С. 260—268.

СТАРОНКІ БАРКУЛАБАЎСКАЙ ХРОНІКІ

Баркалабов

По взяти Полоцком за господаря короля Августа, за митрополита Девочку, за владыку полоцкого Варсанофия Валоха, за ласкою господаря кроля, за великие почстивые послуги, за силное горловане, за целютование здоровя, и нежаловане маетности у справе рыцерской военной его милости пана Баркулаба Ивановича Корсака, ротмистра и старосту дисенского, на лесе Тяухом, на кгрунте лесном, на врочищу, прозываемом Брус, закликавши на волю и давши слободы год дванадцать людем прихожим, за волею божиею и за благословенством людей духовных заложил замок именем своим Баркулабов року 1564.

Также сооружил храм Святого Духа а другий престол Рожство господа нашего Иисуса Христа и посветил его року 1568. За владыку Варсанофия, за митрополита Иону, року 1568, за кроля Августа, за пана Баркулаба и за врядника его Раковского села Вендорож, Куты, Ловечы, Будища людми прихожими засадили, а потом в том же Вендорожи року 1586 во великий пост церков святаго Покрова сооружена и попу Вендорожскому его милость князь Богдан Соломерецкий тую церков отдал, бо тая была перше парафея Баркулабоская, парафея отца Алексея Гавриловича Мстиславца, отца Феодора Филипповича Могилевца.

Року 1570. Владыка полоцкий Варсанофий Валах переставился; у месте Могилеве поховано, албо погребено его через пана Филона у святаго Спаса в Могилеве.

Того ж року 1570 священника Куренского совершено на владычество Полоцкое именем Феофана.

Року 1576. Наехал, албо взято Стефана Батуру, княжа семикгродское, на кролевство Полское. Тот господарь король Стефан Батура, княжа семикгродское, праве был человек побожный, рыцерский, военный, щасливый, правдивый, правый. Того ж року корону припял, а Гендрик король с кролевства Полского утек до своее земли.

На початку от него повый календар украдоватися почал; прето немного лет и на свете мешкал.

Пан Баркулаб Иванович Корсак, староста дисенский и ротмистр кролевский, войт дисенский, рыцер и военник добрый, славный, замок Дисну, замок Вороничи, замок Леплю, замок Чашники — тые вси замки по взятию Полоцком веспол с паном Романом Ходкевичом сами и з своим людом позакладали и места поосажали людми добрыми.

Быховский районный историко-краеведческий музей

А потом року 1576, месяца августа 20 дня в понеделок у вечере, дву годин в ночи, пан Баркулаб переставился на староствє Дисенском в замку Дисенке, а погребено честно тело его у месте Виленском у церкви Святыя Пречистыя Богородицы.

Праз усё жыццё пранёс Іерафей Васілевіч сваю любоў і павагу да родных мясцін, да працоўнага народа. Асноўным дэвізам яго жыцця была праца дзеля справы, а не дзеля асобы. Гэта асабліва яскрава праявілася ў час яго работы на Беларусі. Пасля сканчэння Ваенна-медыцынскай акадэміі з 1884 г. ён штогод летам прыязджаў у вёску Царкоўны Асавец. У час адпачынку аказваў бясплатную медыцынскую дапамогу землякам.

У Дзяржаўнай публічнай бібліятэцы імя М. Я. Салтыкова-Шчадрына ў Ленінградзе захоўваюцца цікавыя дакументы, якія сведчаць пра ўрачэбную дзейнасць І. В. Касценіча. У адным з іх адзначалася, што за два месяцы 1894 г. ў Рыжкаўскім амбулаторным пакоі і ў сябе дома І. В. Касценічам было прынята 3092 хворых, аперацыйную дапамогу атрымалі 477 чалавек, з іх больш як 200 былі зроблены складаныя аперацыі на вачах.

Прафесар І. В. Касценіч падтрымліваў ідэю аказання хоць бы часовай дапамогі хворым. З 1893 г. Апякунства сляпых пачало накіроўваць на тэрыторыю Беларусі лятучыя атрады акулістаў. І. В. Касценіч патрабаваў далучэння да работы ў іх сельскіх урачоў, сам рыхтаваў медыкаў да аказання афтальмалагічнай дапамогі. Адзін з атрадаў

Быховский районный историко-краеведческий музей

дзейнічаў пад яго кіраўніцтвам у Быхаўскім павеце з 20 чэрвеня да 18 жніўня 1895 г. Прыёмная для хворых знаходзілася ў Царкоўным Асаўцы. У в. Рыжкаўцы прымалі хворых на вочы з больш цяжкімі захворваннямі і пасля аперацый на павеках. Дапамога была аказана больш як 5 тысячам хворых. Працаваць даводзілася шмат. Амаль штодзённа прыём вялі з 7 гадзін раніцы да 6 гадзін вечара, пасля рабілі перавязкі аперыраваным. Як успамінаў І. В. Касценіч, не было куточка ў Быхаўскім, Чавускім і ў палове Магілёўскага паветаў, адкуль бы не прыходзілі хворыя. Людзі дабіраліся з Мінскай і Смаленскай губерняў, часам за 150—170 вёрст. Дапамога аказвалася бясплатна. Толькі на лячэнне аперыраваных хворых І. В. Касценіч прасіў Апякунства сляпых выдзеліць 200 рублёў. Грошы ішлі ў асноўным на паляпшэнне харчавання пацыентаў. За шматгранную і актыўную работу ў вочных атрадах на тэрыторыі Магілёўскай губерні на працягу больш як 12 год І. В. Касценіч атрымаў спецыяльны ўзнагародны знак Апякунства. Да прафесара нярэдка звярталіся за дапамогай хворыя, якія беспаспяхова лячыліся ў буйных замежных спецыялістаў. Зімой 1903 г. І. В. Касценіч бліскуча зрабіў аперацыю на воку славутаму хіміку Дзмітрыю Іванавічу Мендзялееву, зрок якога хутка аднавіўся.

Магіла І. В. Касценіча ў вёсцы Чырвоны Асавец.

Урачэбная дзейнасць І. В. Касценіча вызначалася пастаяннымі творчымі пошукамі новага, самаахвярным служэннем прафесійнаму абавязку, народу. Ім напісана больш як 20 навуковых прац, прысвечаных тэарэтычным і практычным пытанням медыцыны. Частка іх надрукавана на французскай, нямецкай, англійскай мовах і мае цікавасць для сучаснай медыцыны. Да апошніх дзён жыцця І. В. Касценіч служыў народу. Штотыднёвік «Русский врач» (1906. № 12. С. 379) у некралогу І. В. Касценічу адзначаў: «Печальная весть, распространяясь среди лиц, сталкивавшихся с покойным, вызывала неизменно чувство глубокой скорби, особенно ярко выражавшейся среди его многочисленных учеников. За свою приблизительно 10-летнюю профессорскую деятельность, протекавшую преимущественно среди товарищей врачей в качестве слушателей, покойный отдавал любимому делу все свои силы, обширные познания и опытность, приобретенные им с таким трудом путем продолжительной и тщательной подготовки... Теплое, живое отношение к своим слушателям, стремление поделиться с ними своим опытом и знанием с первого же раза устанавливало между учителем и учениками ту необходимую связь, без которой невозможно успешное ведение дела. Непрерывная, напряженная работа подорвала силы И. В. Костенича. Перенеся в течение зимы 1904 г. несколько сухих плевритов, покойный в декабре того же года слег в постель вследствие весьма бурно начавшегося воспалительного процесса в легких, перешедшего затем в гнойный плеврит... После изсечения нескольких ребер Иерофей Васильевич поправился настолько, что мог отправиться на юг Франции. Возвратившись в Петербург летом 1905 г., он вступил в исполнение своих обязанностей... В октябре 1905 г. он слег окончательно в постель... Преждевременная кончина явилась тяжелым ударом для всех близких к нему лиц».

Памёр І. В Касценіч у Пецярбургу, пакінуўшы запавет пахаваць яго на роднай Быхаўшчыне. У апошні шлях свайго любімага доктара праводзілі жыхары Магілёва, навакольных вёсак. Гэту грандыёзную працэсію бачыў 10-гадовы хлапчук, жыхар в. Царкоўны Асавец Восіп Сямёнавіч Ярошка. Праз гады пранёс ён памяць аб І. В. Касценічу. Па яго прапанове і хадайніцтву Беларускага таварыства афтальмолагаў у 1964 г. на магіле І. В. Касценіча ў в. Чырвоны Асавец пастаўлены абеліск.

Быховский районный историко-краеведческий музей

З РАПАРТА СТАРШАГА ЗЕМЛЯМЕРА ЗЕМЛЕЎПАРАДКАВАЛЬНЫХ КАМІСІЙ МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ МАГІЛЁЎСКАМУ ГУБЕРНСКАМУ ЗЕМЛЯМЕРУ

Аб адмове сялян в. Вялікія Боўкі Быхаўскага пав. ад выхаду на хутары

18 мая 1913 г.

6-го числа в 7 час. утра явился в квартиру мою сельский староста Алексей Щемолев с уполномоченным и заявил, что сего числа рано утром был собран сельский сход в полном составе домохозяев дер. Больших Бовок, на котором большинство отказалось от перехода к хуторскому или отрубному землепользованию, заявив при этом, что рабочих людей, а также подвод и вообще никаких материалов давать не будут. Ввиду такого категорического заявления я предложил подать мне заявление письменно, что ими и было исполнено. Донося о сем в. в., имею честь покорнейше просить сообщить мне, хотя бы и телеграфным известием, о дальнейшем моем назначении или пребывании на месте. Причем, считаю не лишним довести до сведения вашего, что желающих в настоящее время оказалось 14 чел. из 85 домохозяев.

Старший землемер Беев.

Документы и материалы по истории Белоруссии (1900—1917 гг.). Мн., 1953. Т. 3. С. 649.

Быховский районный историко-краеведческий музей



Быховский районный историко-краеведческий музей

ЗА ЎЛАДУ САВЕТАЎ

25 кастрычніка (7 лістапада) 1917 года рабочыя, рэвалюцыйныя салдаты і матросы Петраграда пад кіраўніцтвам партыі бальшавікоў скінулі буржуазны Часовы ўрад. Перамагла Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя.

Актыўны ўдзел у штурме Зімняга палаца прымалі ўраджэнцы Быхаўскага павета, маракі рэвалюцыйнага крэйсера «Аўрора» Іоў Пятровіч Бурдалаў, Яўген Рыгоравіч Калееў і Трафім Георгіевіч Рудкоўскі.

Усталяванне Савецкай улады ў Быхаўскім павеце праходзіла ў надзвычай складаных абставінах. Яшчэ ў жніўні 1917 г. ў Быхаў была ўведзена 1-я дывізія польскага корпуса генерала Доўбар-Мусніцкага, тут быў размешчаны і штаб дывізіі, які абараняў інтарэсы памешчыкаў і буржуазіі. Контррэвалюцыя на месцах спрабавала ўтаіць ад народа звесткі аб перамозе рэвалюцыі ў Петраградзе. 10 лістапада ў Быхаўскі павет прыбыў прадстаўнік Петраградскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта Іван Цароў. Ён выступіў з палітычным дакладам перад сялянамі вёсак Камарычы, Новы Быхаў, Абідавічы і іншых. Сяляне Камарыч з радасцю віталі перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі. Акрамя агульнай рэвалюцыі была прынята рэзалюцыя ўстараніць з Быхава Карнілава і аддаць яго рэвалюцыйнаму суду. 20 лістапада 1917 г. рэвалюцыйныя атрады па загаду Савецкага ўрада ліквідавалі ў Магілёве Стаўку старой арміі, у гэты ж дзень з Быхава прыйшло паведамленне аб уцёках з быхаўскага зняволення генералаў Карнілава, Дзянікіна і іншых, што паспрыяла пачатку грамадзянскай вайны.

23 лістапада 1917 г. выканком Магілёўскага губернскага Савета прыняў пастанову аб вывадзе з тэрыторыі павета 1-й дывізіі польскага корпуса генерала Доўбар-Мусніцкага і звярнуўся з просьбай накіраваць у Быхаў узброены рэвалюцыйны атрад. 24 лістапада ў горад прыбыў з бронеатрадам член ваенна-рэвалюцыйнага камітэта пры Стаўцы бальшавік Сцяпан Ільіч Марозаў, які ўзначаліў гарнізон, распусціў земскую ўправу, стварыў рэўком і стаў яго старшынёй. У снежні былі праведзены перавыбары сялянскіх камітэтаў у валасцях, выбраны навятовы выканаўчы камітэт і створаны пры ім аддзелы: працы, фінансаў, аграрны, асветы, ваенны, шляхоў зносін, пошты, харчовы, юстыцыі, грамадскай апекі і гандлю. У горадзе і павеце была створана рабоча-сялянская міліцыя.

Органы Савецкай улады павета і валасцей і 12 камісараў, прызначаных рэўкомам, адразу ж разгарнулі рэвалюцыйную дзейнасць. Праводзілася канфіскацыя панскай зямлі, вялася бязлітасная вайна са спекулянтамі, строга ўлічваўся харчовы запас, наладжвалася забеспячэнне насельніцтва прадуктамі, фарміраваліся атрады Чырвонай гвардыі. За кароткі час было ўзброена 1500 чалавек. У сувязі з тым, што камандаванне польскай дывізіі адмовілася добраахвотна вывесці свае войскі з Быхаўскага павета, пачалося прымусовае раззбраенне размешчаных у сёлах рот і эскадронаў легіянераў. Важнае значэнне надавалася прапагандысцкай рабоце сярод польскіх салдат. Пад уздзеяннем інтэрнацыянальнай работы і растлумачэння сутнасці Кастрычніцкай рэвалюцыі пачасціліся выпадкі, калі польскія салдаты знімалі пагоны з сваіх шынялёў і зрывалі пагоны з афіцэраў. У вёсцы Мокрае салдаты закрылі афіцэрскую сталоўку і прымусілі афіцэраў харчавацца з салдацкай кухні.

Паводле патрабавання Савецкага ўрада і каб пазбегнуць уплыву бальшавікоў, генерал Доўбар-Мусніцкі вымушаны быў у снежні 1917 г. вывесці свае войскі з Быхава і павета. Частка польскіх салдат, пад уплывам бальшавіцкай агітацыі, пакінула корпус і ўступіла ў Чырвоную гвардыю. 12 студзеня 1918 г. 1-ы польскі корпус (3 пяхотныя дывізіі, конніца і артылерыя) на чале з Доўбар-Мусніцкім узняў мяцеж. Пагроза акупацыі навісла і над Быхаўскім паветам. Жыхары Новага Быхава, Лазаравіч, Тошчыцы, Камарыч і іншых вёсак уступалі ў Чырвоную гвар-

Быховский районный историко-краеведческий музей

Мемарыяльная дошка на доме, дзе знаходзіўся Быхаўскі рэўком.

дыю. Неўзабаве ў павеце дзейнічалі тры буйныя чырвонагвардзейскія атрады, якімі камандавалі Дзергачоў, Карпаў і Мельнікаў. Чырвонагвардзейскія атрады разам з рэвалюцыйнымі часцямі Заходняга фронту па-геройску грамілі ворага каля станцыі Тошчыца, у Сяльцы, Дзедаве, пад Рагачовам і ў Рагачове. У 2-й палавіне лютага аднавілася наступленне войск кайзераўскай Германіі. Аб'яднаўшыся пад Жлобінам, недабітыя часці белапалякаў рушылі на Быхаў. 26 лютага 1918 г. павятовы камітэт партыі і рэўком аб'явілі горад на ваенна-асадным становішчы і звярнуліся да насельніцтва з адозвай: «Таварышы! Вораг блізка, ён спрабуе знішчыць нашы рэвалюцыйныя заваёвы і зноў пасадзіць нам на шыю пана і ўрадніка. Уступайце ў Чырвоныя атрады абароны!». Адначасова, на выпадак акупацыі, бальшавікі быхаўскай партарганізацыі стваралі ў павеце падпольныя групы для барацьбы ў тыле ворага. У ноч з 4 на 5 сакавіка 1918 г. па-

Будынак, дзе ў лістападзе 1917 — лютым 1918 г. размяшчаўся Быхаўскі ваенна-рэвалюцыйны камітэт.

чалася эвакуацыя з горада савецкіх і партыйных органаў. Раніцай наступнага дня па загаду рэўкома быў узарваны чыгуначны мост цераз р. Макранку, рэўком на чале з С. І. Марозавым перабраўся з часткай сваіх узброеных атрадаў на левы бераг Дняпра, потым у Прапойск (цяпер Слаўгарад). Па загаду рэвалюцыйнай Стаўкі С. І. Марозаў узначаліў штаб аб'яднаных чырвонагвардзейскіх атрадаў Магілёўскай губерні, якія ў сакавіку — красавіку 1918 г. ачысцілі ад польскіх войск левабярэжную частку Быхаўшчыны з цэнтрам у Прапойску. Тут аднавілі сваю работу органы Савецкай улады, былі выбраны камітэты беднаты, валвыканком Саветаў у Прапойскай, Даўгамошскай, Грудзінаўскай, Баханскай і Бычанскай валасцях. Працягваў працаваць павятовы камітэт РСДРП (сакратар С. П. Сарокін). Рэўком на чале з А. Ц. Шэкавым і павятовы ваенны камісарыят фарміравалі ўзброеныя атрады для папаўнення франтавых часцей. У распараджэнне Стаўкі было перададзена больш за 1500 узброеных байцоў.

5 сакавіка 1918 г. ў Быхаў уступілі кайзераўскія войскі і польскія часці з корпуса Доўбар-Мусніцкага. Уся правабярэжная частка Быхаўшчыны апынулася пад акупацыяй. Органы Савецкай улады тут былі ліквідаваны. Акупацыйныя ўлады адразу ўвялі каменданцкі час, насельніцтву загадалі здаць зброю і боепрыпасы, групамі больш двух чалавек не збірацца, вярнуць маёмасць памешчыкам. Пачаліся масавыя арышты западозраных у бальшавізме. На горад і павет была накладзена кантрыбуцыя. Эшалон за эшалонам вывозіліся ў Германію харчаванне, сыравіна, жывёла. Са згоды акупантаў у Быхаве ўзнікла самазваная дума і павятовая земская ўправа пад старшынствам Мацкевіча. Але расло і супраціўленне народа. Вясной 1918 г. на тэрыторыі павета пачалі дзейнічаць падпольныя партыйныя групы, а ў ліпені створана падпольная павятовая арганізацыя РСДРП.

Першая падпольная партыйная група была створана ў в. Студзёнка і налічвала 21 чалавека. Арганізатарам яе былі салдаты, якія прыбылі з фронту, мясцовыя жыхары браты Яфім Іванавіч і Цімох Іванавіч Сарокіны, найбольш актыўнымі членамі — Андрэй Сівакоў, Якаў Сівакоў, Цімох Сазоненка і іншыя.

«На першым сходзе,— успамінаў Я. І. Сарокін,— усе, хто ўступіў у партыйную групу, далі ўрачыстую клятву, што кожны з нас будзе сумленна змагацца з ворагамі Радзімы і Савецкай улады, будзе дысцыплінаваным і свята захоўваць канспірацыю, безагаворачна выконваць усе даручэнні, і, калі спатрэбіцца, не пашкадуе свайго жыцця за святую будучыню прыгнечанага акупантамі народа... Клятву змацавалі подпісамі і прыступілі да арганізацыйных пытанняў. У першую чаргу трэба было ў кожнай воласці

Быховский районный историко-краеведческий музей

стварыць такія ж групы, для чаго вылучылі самых вопытных таварышаў... У мэтах канспірацыі мы стварылі явачную кватэру і далі кожнаму мянушку» (ПАІГП пры ЦК КПБ, ф. 4483, воп. 3, спр. 466, л. 5).

Падпольная група в. Студзёнка неўзабаве ператварылася ў буйную партыйную арганізацыю. Яна стала арганізацыйным цэнтрам, вакол якога згуртаваліся новыя падпольныя партыйныя арганізацыі ў вёсках Глухскай, Гарадзішчанскай, Чыгірынскай і Стара-Быхаўскай валасцей. Неўзабаве на акупіраванай частцы павета не было, бадай, ні адной вёскі, дзе б не ўзніклі падпольныя партыйныя групы і партызанскія атрады для барацьбы з акупантамі.

У пачатку жніўня 1918 г. на партыйнай канферэнцыі падпольных арганізацый акупіраванай часткі павета быў створаны Быхаўскі падраённы партыйны камітэт. У яго ўвайшлі Ц. І. Сарокін (падпольнае прозвішча Сакалоў) — старшыня, К. Б. Дзем'яновіч — сакратар, Я. І. Сарокін, Н. Л. Француз і іншыя. Актыўнымі ўдзельнікамі падпольнай падраённай партыйнай арганізацыі былі П. Д. Кавалёў, М. І. Сарокін, Ф. Е. Бычкова, С. П. Раманаў, А. М. Радзькоў, Я. П. Рашэтнікаў, В. І. Лагуцёнак, К. Е. Яўменаў, І. Ф. Іваноў, К. Н. Сазоненка, А. Р. Саўчанка, С. А. Брытава і іншыя. Да восені падпольная партыйная арганізацыя налічвала 60 чалавек. На левабярэжжы павета ў грозную сілу выраслі чырвонагвардзейскія атрады. Вялікую работу па іх фарміраванні і ўзбраенні праводзіў штаб па аб'яднанні і кіраўніцтве чырвонагвардзейскімі атрадамі Магілёўскай губерні і Быхаўскі павятовы рэўком, які знаходзіўся ў Прапойску (начальнік штаба С. І. Марозаў, старшыня рэўкома А. Ц. Шэкаў). Чырвонагвардзейцы праводзілі смелыя баявыя аперацыі і дзёрзкія рэйды па тылах акупантаў.

У в. Лазаравічы размясціўся эскадрон польскіх уланаў. Акупанты жорстка здзекаваліся над сялянамі. Камандзір чырвонагвардзейскага атрада Спірыдон Карпавіч Дзергачоў прыняў рашэнне разграміць белапалякаў. Уначы 60 смельчакоў каля в. Вець пераправіліся цераз Дняпро, скрытна перабраліся ў Лазаравічы і напалі на ворага. Амаль усе ўланы былі перабіты, а афіцэра ўзяты ў палон. У баі быў забіты камандзір эскадрона граф Патоцкі. Партызаны захапілі шмат зброі і 50 коней з сёдламі. У баі вызначыліся камандзір узвода Якаў Вяракса, байцы Андрэй Коршыкаў, Якаў Шусцікаў, Цімаф Андрыянаў. Смелыя налёты на акупантаў былі зроблены ў вёсках Сядзіч і Тайманава. У ліпені 1918 г. з мясцовых партызанскіх атрадаў быў сфарміраваны Першы Быхаўскі (пазней 152-і) стралковы полк 17-й стралковай дывізіі Чырвонай Арміі. Штаб палка размяшчаўся ў в. Грудзінаўка і абараняў ад акупантаў участак Заходняй заслоны ад Варанно да прыгарада Магілёва — Лупалава. Палком камандаваў Якаў Васілевіч Шэко, камісарам быў Спірыдон Карпавіч Дзергачоў.

У пачатку лістапада 1918 г. германскае камандаванне пачало адвод сваіх войск. З лістапада на правабярэжжа павета і ў Быхаў увайшлі 152-і і 153-і стралковыя палкі 17-й стралковай дывізіі Чырвонай Арміі. Пасля мнагалюднага мітынгу, на якім выступілі прадстаўнік Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РКП(б) А. С. Славінскі, старшыня павятовага рэўкома А. Ц. Шэкаў, на аб'яднаным пасяджэнні павятовага і над-

Чырвонагвардзейцы атрада С. К. Дзергачова. 1918 г. Здымак захаваў былы начальнік медслужбы атрада Ілья Пракопавіч Рагаленка (у першым радзе першы злева). У першым радзе чацвёрты злева першы старшыня Быхаўскага рэўкома Сцяпан Ільіч Марозаў. У другім радзе крайні справа Спірыдон Карпавіч Дзергачоў.

Быховский районный историко-краеведческий музей



ПРИКАЗ № 11.

Приказ входит в законную силу со дня опубликования.

В. П. Д. Начальник гарнизона гор. Быхова

и Быховского Уездного военного комиссара С. Сорокин.

Военный руководитель П. Сергеев.

Начальник комендантской части А. Василько

XII. 1917 г.

Загад Быхаўскага павятовага ваеннага камісара, які аб'явіў у Быхаве і павеце ваеннае становішча.

ИЗВЕСТИЯ БЫХОВСКОГО РЕВКОМА

Наши кандидаты.

Сегодня день выборов

Граждане сдавайте оружие

Из глубин провинции

Адзін з першых нумароў газеты «Известия Быховского ревкома».

польнага падраённага камітэтаў РКП(б) былі выбраны Быхаўскія павятовы камітэт РКП(б) на чале з Петравіцкім і рэўкомам у складзе Шэкава (старшыня), Ц. Сарокіна, Н. Француза, К. Дзем'яновіча, П. Кавалёва, Лагуцёнка, С. Сарокіна, Раманава, Феакцістава, Вяраксы, М. Сарокіна. Рэўком аб'вясціў сябе (да склікання павятовага з'езда Саветаў) вярхоўнай уладай у павеце і выдаў загад № 1, у якім намячаліся меры па падтрыманню рэвалюцыйнага парадку ў горадзе і павеце, ліквідаваў у Быхаве земскую і гарадскую ўправы і замест іх стварыў павятовы Савет народнай гаспадаркі і гарадскі аддзел народнай гаспадаркі.

Вялікую работу правялі часовы павятовы камітэт РКП(б) і рэўком па арганізацыі камітэтаў беднаты, якія адыгрывалі рашаючую ролю ў размеркаванні зямлі, аднятай у памешчыкаў, у канфіскацыі лішкаў хлеба ў кулакоў і забеспячэнні харчаваннем Чырвонай Арміі і насельніцтва гарадоў. Да канца лістапада 1918 года ў павеце было арганізавана 70 камітэтаў беднаты, у тым ліку 11 валасных і 59 вясковых.

18 снежня 1918 г. адбылася 1-я Быхаўская павятовая партыйная канферэнцыя, дзе былі выбраны пастаянны партыйны камітэт, у які ўвайшлі А. Шэкаў, Ц. Сарокін, А. Старасценка, І. Энцін, К. Дзем'яновіч, В. Лагуцёнак, П. Кавалёў, і дэлегаты на VI Паўночна-Заходнюю абласную канферэнцыю — Першы з'езд КП(б) Беларусі (С. Л. Сарокін і І. М. Энцін). На пасяджэнні павятовага камітэта 21 снежня 1918 г. старшынёй павятовага камітэта быў выбраны А. Шэкаў, сакратаром — К. Дзем'яновіч.

1-я павятовая канферэнцыя галоўную ўвагу звярнула на ўзмацненне арганізатарскай і выхаваўчай работы партыі сярод насельніцтва. Яна намеціла стройную структуру арганізацыі партыйных ячэек. У кожным мястэчку, сяле і вёсцы, гаварылася ў дакладзе па арганізацыйным пытанні, пры партыйнай арганізацыі неабходна стварыць ячэйку спачуваючых камуністам, якая павінна быць апорай Савецкай улады, выразніцай волі бяднейшай рэвалюцыйнай часткі вёскі і правадніком у жыццё праграмы Камуністычнай партыі па ўмацаванню Савецкай улады на ўсёй тэрыторыі павета. У прынятай канферэнцыяй рэзалюцыі падкрэслівалася, што, каб мець здаровыя маладыя партыйныя сілы, выхаваныя ў духу партыйнай дысцыпліны, трэба стварыць у Быхаве партыйную школу. 17 лістапада 1918 г.

Быховский районный историко-краеведческий музей

створана Старабыхаўская партыйная ячэйка, у якой у студзені 1919 г. былі 4 члены партыі і 3 кандыдаты ў члены партыі. Да красавіка 1919 г. Быхаўская павятовая партыйная арганізацыя аб'ядноўвала 12 партыйных ячэек (151 член партыі).

У 1918 г. былі створаны камсамольскія ячэйкі на шклозаводзе ў Ветранцы і ў вёсцы Гарадзец. Камсамольцы актыўна ўдзельнічалі ў палітычнай і культурна-асветніцкай рабоце.

25 снежня 1918 г. пачала выходзіць павятовая газета «Известия Быховского ревкома».

У пачатку 1919 г. прайшлі валасныя з'езды Саветаў, на якіх камбеды зліліся з Саветамі.

10 студзеня 1919 г. адбыўся 1-ы павятовы з'езд Саветаў. На яго прыбылі 110 дэлегатаў: 79 прадстаўнікоў ад 10 валасцей, 20 членаў павятовага рэўкома, прадстаўнікі ад камуністычных ячэек, прафсаюза, ад прамысловых прадпрыемстваў. З'езд вітаў стварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі. На абмеркаванне былі пастаўлены пытанні: бягучы момант, аб рабоце рэўкома і яго аддзелаў, выбары выканкома, змяненне межаў павета і валасцей, выбары новага суда, бягучыя справы.

Павятовы з'езд Саветаў выбраў выканаўчы камітэт з 15 чалавек. У яго ўвайшлі А. Шэкаў, А. Старасценка, Падольскі, С. Сарокін, Я. Красоўскі, Раманоўскі, В. Кавалёў, П. Кавалёў, Г. Кулакоў, К. Манжураў, І. Сокалаў, Сцефанёнка, К. Дзем'яновіч, А. Салановіч, Ц. Сарокін.

Для арганізацыі і кіраўніцтва народнай гаспа-

Возвание!

Товарищи! рабочие и беднейшее крестьянство!

Вы долгое время томились под гнетом соединенного хищнического империализма. Вы долгое время были отрезаны от Власти Советов Власти рожденной беднейшими.

Настал уже тот час, когда вы задохнули свободной грудью освободившись от власти хищников, приветствуя Власть Советов; настал тот час, когда рабочий и беднейший крестьянин Советской Республики совместно с рабочим и крестьянином всего мира, должен дат самый сильный „последний и решительный бой" мировому интернационалу-буржуазии.

Потому, неотложная задача каждого, кто хочет удержать Власть Советов, кто не хочет опять подпасть под большой гнет уже соединенной буржуазии всего мира, которая „ощетинившись и оскалив зубы", желает поглотит русский большевизм, и с ним и подавить беднейших,-пойти в ряды единой рабоче-крестьянской красной армии которая должна стереть с лица земли и разбит в „пух прах" буржуазные фронты и их замыслы.

Итак ТОВАРИЩИ! как только раздастся первый зов СОВЕТСКОЙ ВЛАСТИ власти рабочих и беднейших крестьян, ИДИТЕ, без волокит, в ряды рабоче-крестьянской красной армии; как только раздастся зов к всеобщему обучению, берите ружья в руки и идите обучаться!

Несите военное имущество скрываемое вами от поляков и немцев в БЫХОВСКИЙ УЕЗДНЫЙ ВОЕННЫЙ КОМИССАРИАТ, ибо в нем нуждается наша армия.

Военный Комиссар Я. Красовский

Х/II-1918

Завагитотдел просвет С. Сераки

Адозва Быхаўскага ваеннага камісара да працоўных павета.



Г. Быховъ. Залъ театра Художествъ.

ПРОГРАММА

Спектакля 23 Ноября 1918 года, поставленнаго Обществомъ любителей сценическаго искусства подъ управленіемъ г. ШУМСКАГО

I ОТДѢЛЕНІЕ.

ВЪ ПОШЕХОНЬЕ

Комедія А. ИВАНОВА въ 3-хъ дѣйствіяхъ.

ДѢЙСТВУЮЩІЯ ЛИЦА:

Князь Всеволодъ Ярославовичъ Кудрявый-Сагаръ . . . Д. М. ШУМСКІЙ
Евгенія Аполлинарьевна Махайдина, его жена . . . А. К. МИЛАВИНА
Сергѣй Васильевичъ Тепловъ, ея знакомый . . . К. П. СИТКОВЪ
Клавдія Петровна Бѣлавина . . . М. И. КОСТРИЦКАЯ
Михаилъ Семеновичъ Долгополовъ, купецъ 2-й гильдіи, его крестный отецъ . . . Е. В. ГЕДЕОНОВЪ
Степанида Захаровна, его жена . . . Н. Н. КРУЧИНИНА
Евсей Карповичъ Мышкинъ, отставной штабсъ-офицеръ . . . В. Д. СВѢТЛОВЪ
Пуговкинъ, его сынъ, гимназистъ . . . А. И. ЛЕРУА
Никаша, лакей . . . С. П. КАМСКІЙ
Семенъ Кондратьевъ, камердинеръ князя . . . М. В. ДАРМАТОВЪ

II ОТДѢЛЕНІЕ.

НЕДОРАЗУМѢНІЕ

Оригинальная комедія В. Д. СВѢТЛОВА.

ДѢЙСТВУЮЩІЯ ЛИЦА:

Ундра, Предсѣдатель Сборища пьяницъ . . . М. В. ДАЛМАТОВЪ.
Сборщикъ его товарищъ . . . А. И. ЛЕРУА.
Николай Ивановичъ Поповъ, молодой человѣкъ . . . С. П. КАМСКІЙ.
Человѣкъ, желающій выпить . . . самъ АВТОРЪ.

НАЧАЛО ВЪ 20 ЧАС. (8 ЧАС. ВЕЧЕРА)

Режиссеръ А. М. Шумскій.

Праграма спектакля ў Быхаўскім тэатры мастацтваў. 23 лістапада 1918 г.

Быховский районный историко-краеведческий музей

А. Ц. Шэкаў.

даркай павета 13 студзеня створаны Быхаўскі павятовы савет народнай гаспадаркі з 15 чалавек пад старшынствам А. Ц. Шэкава. Меў аддзелы: кіравання, народнай асветы, аховы здароўя, харчовы, працоўных рэзерваў, зямельны, фінансавы, па барацьбе с контррэвалюцыяй, ваенны, сацыяльнага забеспячэння, інфармацыі.

У складаных умовах грамадзянскай вайны працягвалася работа па сацыялістычным пераўтварэнні гаспадаркі горада і вёскі. Зімой 1918—1919 гг. зямельны павятовы аддзел прыступіў да стварэння калектыўных гаспадарак. Арганізацыйную работу ў Даўгамошскай, Глухскай, Старабыхаўскай валасцях праводзілі І. Марозаў, А. Гвоздзеў, Ц. Сарокін і Ц. Жыхараў.

17 лютага 1919 г. камуністы Ц. І. Сарокін, К. І. Дзем'яновіч, К. К. Сазоненка і іншыя арганізавалі ў в. Сарочына ў былым маёнтку памешчыкаў Радкевічаў першую ў павеце камуну імя Карла Лібкнехта. Спачатку камунараў было 30 чалавек, неўзабаве іх стала 60. Былі арганізаваны Балонава-Сялецкая і Неапалітанская камуны. 20—21 сакавіка 1919 г. адбылося пасяджэнне павятовага зямельнага з'езда, дзе былі разгледжаны пытанні аб арганізацыі ў павеце племяннога рассадніка, аб стварэнні пры сельскіх таварыствах інвентарнага запаснога фонду, аб прыняцці мер да спынення захворванняў жывёлы, па ахове і прывядзенні ў парадак народных садоў, якіх у павеце было каля тысячы дзесяцін, аб перадачы ў распараджэнне зямельнага аддзела млыноў і іншыя. Да лета 1919 г. дзейнічалі 3 камуны, 2 саўгасы, 10 пракатных інвентарных, зернеачышчальных пунктаў. Падрабязна ира сацыялістычныя пераўтварэнні ў сельскай гаспадарцы глядзі ў артыкуле «Зямля — сялянам».

Рэвалюцыйнай перабудовай было ахоплена духоўнае жыццё. У павеце адкрываліся хаты-чытальні і школы, для работы ў школах былі зацверджаны 33 настаўнікі школ 2-й ступені. У 1919 г. ў Быхаве на базе вышэйшага пачатковага вучылішча была створана працоўная школа 1-й ступені імя Кастрычніцкай рэвалюцыі, на базе царкоўнаприходскай школы — 3-я савецкая працоўная школа 1-й ступені.

Вялікую дапамогу Быхаўскай павятовай партарганізацыі ў барацьбе за новы лад аказвала рабоча-сялянская моладзь. Першыя камсамольскія ячэйкі ў горадзе і ў павеце створаны ў 1918 г., іх арганізатарамі былі М. Л. Рудкоўскі, Аўруцін, К. І. Лукашоў. 12 чэрвеня 1919 г. ў Быхаве адбыўся першы павятовы з'езд РКСМ. Старшынёй павятовага камітэта быў выбраны М. Двоскін, сакратаром М. Брылон.

Вясной 1919 г. на тэрыторыю Беларусі ўварваліся войскі буржуазнай Польшчы. Магілёўшчына апынулася ў прыфрантавой паласе. Актывізавалася ўнутраная контррэвалюцыя, якая ў сакавіку 1919 г. справакавала ў Гомелі стракапытаўскі мяцеж. Узнялі мяцеж кулацкія элементы ў Быхаўскім павеце. 27 сакавіка 1919 г. ў Быхаве ў сувязі з актывізацыяй контррэвалюцыйных выступленняў была створана надзвычайная камісія. У дакладзе начальніка палітаддзела Рэўваенсавету 16-й арміі аб контррэвалюцыйным паўстанні ў Быхаўскім і іншых паветах значыцца: «Верхаводы арганізавалі ў некалькіх вёсках банды і падняли паўстанне, кідаючы ў цёмную масу сялян дэмагагічныя лозунгі...

З выступленняў паўстаўшых звяртаюць на сябе ўвагу: ... разграбленне санітарнага абоза і палявой поштовай канторы 8-й дывізіі; ... абяззбройванне ў розных месцах каля 200 чырвонаармейцаў; ... забойства трох членаў Быхаўскага павяткома камуністаў тав. Нікіціна, Садмірскага і Феакціства...

Прычыны паўстання:

1. Актыўная работа ў павеце польскіх агентаў. За гэта гаворыць аналогія зместу паўстанцкіх адозваў і лістовак, якія распаўсюджваюцца з польскіх аэрапланаў, і тое, што пачатак паўстання супаў з пачаткам польскага наступлення на ўчастку 8-й дывізіі, а таксама і спроба ўзарваць чыгуначныя масты каля Рагачова і Жлобіна.

2. Пасяховая контррэвалюцыйная агітацыя кулакоў і шляхты.

3. Незадаволенасць рэквізіцыямі харчавання і канфіскацыяй хлебных лішкаў...» (Борьба за Советскую власть в Белоруссии, 1918—1920 гг. Мн., 1971. Т. 2. С. 303—305).

Для ліквідацыі мяцяжу былі мабілізаваны атрады Чырвонай Арміі.

23 лютага 1919 г., у дзень першай гадавіны Чырвонай Арміі, у Быхаве адбыўся парад вайсковых часцей гарнізона, дэманстрацыя працоўных і мітынг на Сяннай плошчы (цяпер Кастрычніцкая плошча). У час дэманстрацыі і мітынгу было раздадзена шмат літаратуры, прывезенай з цэнтра, а таксама лістовак, напісаных да гадавіны і надрукаваных у мясцовай друкарні. Лістоўкі заклікалі ісці ў рады Чырвонай Арміі, каб абараняць рэвалюцыю і Савецкую ўладу. З мэтай

Быховский районный историко-краеведческий музей

мабілізацыі сіл супраць інтэрвентаў і мяцежнікаў у сакавіку 1919 г. Магілёўская губерня была скасавана і ўвайшла ў Гомельскую губернію.

З 26 красавіка 1919 г. Быхаўскі павет у Гомельскай губерні. У яго складзе 10 валасцей: Баханская, Бычанская, Глухская, Гарадзішчанская, Грудзінаўская, Даўгамошская, Навабыхаўская, Прапойская, Старабыхаўская, Чыгірынская.

22 мая 1919 г. ў Быхаве пачаў работу 2-і Быхаўскі павятовы з'езд Саветаў, на якім былі разгледжаны пытанні бягучага моманту, выбараў выканкома і дэлегатаў на губернскі з'езд. З'езд выказаў згоду на далучэнне Быхаўскага павета да Гомельскай губерні.

27 кастрычніка 1919 г. аднавіў работу Быхаўскі павятовы рэўком. У маі 1920 г. рэўком звярнуўся да камандавання 16-й арміі з просьбай адпусціць зброю і амуніцыю для створанага ім атрада. Да восені 1919 г. павятовая партарганізацыя накіравала на фронт 34 камуністаў. Для дапамогі сем'ям чырвонаармейцаў, што змагаліся на фронце, пры павятовым земаддзеле ў чэрвені 1919 г. была створана спецыяльная камісія. З яе фондаў толькі па Гарадзішчанскай воласці была аказана дапамога на суму 164 100 рублёў.

У 1920 г. ў Быхаве адкрыта аддзяленне Усерасійскага саюза кравецкай прамысловасці, пры якім была ваенна-абмундзіровачная майстэрня для забеспячэння Чырвонай Арміі. Шырокае распаўсюджанне ў павеце атрымалі «дні» і «тыдні» дапамогі фронту. Звычайным было, калі рабочыя і служачыя адлічвалі ў фонд дапамогі фронту частку заработнай платы і прадуктовага пайка. Так, работнікі дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў Быхава ў фонд «тыдня фронту» ўнеслі двухдзённы заработак і паёк. Як толькі маглі падтрымлівалі фронт і сяляне. 13 ліпеня 1920 г. «Красноармейское РОСТА» паведамляла: «Сялянам Чэрыкаўскага, Горацкага, Быхаўскага і Чавускага паветаў працоўным аддзяленнем Савецкага аддзела быў дадзены наряд на працоўнай павіннасці на 3 тыс. фурманак для патрэб Чырвонай Арміі. На працягу трох дзён сяляне выконваюць наряд у колькасці 2600 фурманак, 29 і 30 чэрвеня наряд безумоўна быў выкананы... Усімі фурманкамі вывезена на працягу двух дзён 300 тысяч пудоў розных грузаў для фронту.

Гэта і ёсць тое, што называецца ісці ў нагу з Чырвонай Арміяй».

Вялікую ролю ў аднаўленні гаспадаркі і аказанні дапамогі фронту адыгралі камуністычныя суботнікі. На працягу тыдня з 27 чэрвеня па 4 ліпеня 1920 г. прайшло тры суботнікі па пагрузцы грузаў на 14-м раз'ездзе. У іх прыняло

Дэманстрацыя і мітынг у гонар 1-й гадавіны Чырвонай Арміі ў Быхаве.

Быховский районный историко-краеведческий музей

В. П. Касцюкевіч.

ўдзел 340 служачых і 408 чырвонаармейцаў. Камуністы горада правялі суботнікі па замене шпал на чыгуначнай станцыі. У іх удзельнічала 100 чалавек. Арганізоўваліся суботнікі і па аказанню дапамогі сялянам. Толькі за тыдзень з 17 па 24 жніўня 1920 г. ў час суботнікаў было адрамантавана 662 плугі, зроблена 69 калёс, узарана 257 дзесяцін зямлі, адрамантавана 84 кіламетры дарог, 6 школ. Вялася работа па перабудове сельскай гаспадаркі. У 1920 г. ў павеце было створана 30 калектыўных гаспадарак.

Скарыстаўшы цяжкасці на фронце, да адкрытай барацьбы супраць Савецкай улады перайшла ўнутраная контррэвалюцыя. У 1920—1922 гг. хваля бандыцкіх выступленняў пракацілася і па Быхаўшчыне. Бандыты зрывалі правядзенне продразвёрстак, распраўляліся з камуністамі і савецкімі актывістамі. Ад іх рук загінулі актыўныя барацьбіты за Савецкую ўладу на Быхаўшчыне, члены павятовага камітэта партыі Р. І. Нікіціна, І. Феакцістаў і іншыя.

Для барацьбы з контррэвалюцыяй пры Быхаўскім рэўкоме дзейнічаў надзвычайны орган, які меў узброены атрад. Дапамогу яму аказвалі курсанты размешчаных у Быхаве пяхотных камандных курсаў.

Пасля адыходу фронту на захад 18 жніўня 1920 г. пленум Быхаўскага павятовага камітэта РКП(б) і павятовага рэўкома вынес пастанову аб аднаўленні дзейнасці Саветаў у горадзе і валасцях. Правядзенне павятовага і валасных з'ездаў Саветаў і выбары сельскіх Саветаў назначылі на 1 верасня 1920 г.

У баях за Савецкую ўладу на франтах грамадзянскай вайны прымалі актыўны ўдзел і праславіліся ўраджэнцы Быхаўскага павета: камандзір браняпоезда Васіль Пятровіч Касцюкевіч з в. Ціхінічы (цяпер у Рагачоўскім раёне), стралок каманды конных разведчыкаў 16-й арміі Мікалай Ігнатавіч Сівакоў з в. Праточнае, разведчык чацвёртай роты 150-га палка Павел Ігнатавіч Ціханаў з в. Чырвоная Слабада, чырвонаармейцы Сідар Ігнатавіч Гаўрыленка з в. Хачынка, Анатоль Васілевіч Ставянкоў з в. Касічы і Баніфат Емяльянавіч Шампляхоў з в. Бынава. Усе яны былі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

К канцу 1920 г. грамадзянская вайна была ў асноўным закончана. III з'езд КП(б)Б (22—25.11.1920) падвёў вынікі ўзброенай барацьбы за Савецкую ўладу, на першы план паставіў задачы гаспадарчага будаўніцтва.

Г. Е. Барысаў, В. М. Удальцоў.

Незабыўнае

З успамінаў былога камандзіра ўзвода 112-га Калагрыўскага палка Фёдара Якаўлевіча Шчалко

Вясну 1917 г. я сустрэў у Быхаве. Наша брыгада ў складзе 111-га Унжынскага і 112-га Калагрыўскага палкоў размяшчалася ў палатках і зямлянках на паўднёвай ускраіне горада. Усе мы жылі ў чаканні новых падзей, бо Часовы ўрад не даў нікай палёгкі народу. У адзін з красавіцкіх дзён я завітаў у краму за папяросамі. Купіў і прыпыніўся ў тамбуры закурыць. У гэты час да мяне падышоў чалавек сярэдняга росту, апрануты па-рабочаму, і сказаў:

— Таварышок, я да цябе з важнай справай. Сямёра нашых таварышаў-бальшавікоў схоплены і пасаджаны ў турму. Ім пагражае расстрэл. У вас, салдат, вялікая сіла. Дапамажыце іх выратаваць.

Я згадзіўся. Тады чалавек, які гутарыў са мной, выцягнуў з кішэні аркуш паперы і сказаў:

— Гэта адозва да салдат Быхаўскага гарнізона. У ёй указаны імёны і прозвішчы арыштаваных. Акрамя таго, у кожнага з іх на грудзях будзе прымацаваны чырвоны бант.

Спытаўшы маё прозвішча, чалавек тут жа знік, а я схаваў у патаемную кішэню адозву.

Вечарам пасля праверкі мы ўзводам прачыталі адозву і вырашылі азнаёміць з ёй усіх салдат. Самы актыўны агітатар узводны шавец Іванчанка, ураджэнец Акмолінскай губерні, узяў адозву сабе. За дзве ночы ён азнаёміў з ёй усю брыгаду. Было вырашана, як толькі паступіць загад выходзіць са зброяй на тактычныя заняткі, накіравацца ў горад і вызваліць арыштаваных. Я прапанаваў выдзеліць ад кожнага ўзвода па аднаму чалавеку ў склад праверачнай камісіі. У камісію ўключылі і мяне.

Не ўсё, зразумела, ішло гладка. Прыкмеціўшы наш настрой, камандзір паспрабаваў адмяніць

Быховский районный историко-краеведческий музей

заняткі, але ў яго нічога не атрымалася, і восем тысяч узброеных салдат рушылі ў Быхаў.

Дзень быў ціхі, сонечны. І раптам цішыню ўзарвала страявая салдацкая песня. Калі калона падышла да ўскраіны горада, жыхары высыпалі на вуліцы. Пад прывітальныя воклічы мы пайшлі да крэпасці. Спачатку варта не хацела адчыняць вароты, але мы прыгразілі, што выламаем іх, і нас прапусцілі. Салдаты занялі ўвесь двор, а перадавы ўзвод упаўнаважаных падышоў да памяшкання, дзе знаходзіліся арыштаваныя.

У першай камеры сядзелі пяць-шэсць чалавек, абутых у лапці. Пытаем: «За што сядзіце?» Адказваюць: «Спазніліся да воінскага начальніка».

Каля дзесятка дэзерціраў знаходзілася і ў другой камеры. Нарэшце трэцяя камера. Сырая, змрочная. Пад столлю маленькае акенца. На святло адчыненых дзвярэй выйшла сем чалавек, апранутых у салдацкія шынялі з чырвонымі бантамі на грудзях. Гэта былі прадстаўнікі Петраградскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў. Яны запатрабавалі ад адміністрацыі турмы вярнуць зброю. Ім аддалі па рэвальверу з кабурамі і шаблі.

Адбыўся мітынг. З памяшкання канцылярыі вынеслі сталы і зрабілі з іх трыбуну. На яе падняліся пасланцы Петраграда. Усе прысутныя з вялікай увагай слухалі бальшавікоў, якія расказвалі аб становішчы ў краіне, заклікалі разагнаць земскую ўправу, арганізаваць народны суд, весці жорсткую барацьбу з контррэвалюцыяй, не выконваць распараджэнняў Часовага ўрада. На гэтым мітынгу быў выбраны гарадскі Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. У яго ўвайшлі сямёра ўпаўнаважаных з Петраграда і прадстаўнікі грамадскасці горада. Ад часцей гарнізона ў Савет салдаты выдвінулі мяне. На працягу красавіка — ліпеня я ўдзельнічаў у рабоце Савета.

Потым становішча ў Быхаве рэзка абвастрылася. Зноў узняла галаву контррэвалюцыя. Савет быў разагнаны, а салдат падманным шляхам раззброілі і ў апошніх числах жніўня адправілі на Паўночна-Заходні фронт. Больш у Быхаве мне не давялося бываць.

Быхаў, год 1917...

У жніўні 1917 г. пад кіраўніцтвам генерала Л. Г. Карнілава быў узняты контррэвалюцыйны мяцеж з мэтай разгрому рэвалюцыйных сіл і ўстанаўлення ваеннай дыктатуры ў Расіі. Цэнтр карнілаўшчыны — Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёве. Арганізатарамі і кіраўнікамі барацьбы супраць карнілаўшчыны сталі бальшавікі, пад уплывам іх агітацыі Георгіеўскі батальён, карнілаўскі ўдарны полк не падтрымалі мяцежнікаў. Генералы Л. Г. Карнілаў, А. І. Дзянікін, А. С. Лукомскі, І. П. Раманоўскі, С. Л. Маркаў і іншыя былі ўзяты пад варту ў памяшканні жаночай гімназіі ў Быхаве. Яны знаходзіліся ў распараджэнні створанай Часовым урадам Надзвычайнай следчай камісіі, за ахову іх адказвала Стаўка Вярхоўнага галоўнакамандуючага. 19 лістапада (2 снежня), ужо вызваленыя ад абавязкаў Глаўкаверха, генерал М. М. Духонін арганізаваў уцёкі сваіх паплечнікаў, выратаваўшы іх ад справядлівага рэвалюцыйнага суда. Узнавіць абставіны ўцёкаў Карнілава дазваляе прыведзены ніжэй нарыс.

20 лістапада ў Магілёў уступілі атрады рэвалюцыйных войск на чале з назначаным (9 лістапада) Савецкім урадам Вярхоўным галоўнакамандуючым М. В. Крыленкам. У той жа дзень у Стаўку была атрымана тэрміновая тэлеграма з Быхава ад начальніка гарнізона генерала Астаповіча, што ў мінулую ноч генерал Карнілаў уцёк з месца зняволення разам з Тэкінскім конным палком, пад аховай якога знаходзіўся, а раніцай 19 лістапада ўцяклі ўсе генералы, вызваленыя быццам бы па распараджэнню з Петраграда.

Гэта вестка стала пагібельнай для Духоніна, які быў зняты з пасады Глаўкаверха і знаходзіўся ў той час пад арыштам у поездзе Крыленкі. Распінаны натоўп акружыў вагон і расшкуматаў ворага рэвалюцыі.

На распараджэнню начальніка штаба Вярхоўнага галоўнакамандуючага генерала М. Дз. Бонч-Бруевіча была створана спецыяльная камісія па расследаванню абставін уцёкаў Карнілава. 22 лістапада 1917 г. праведзена дазнанне, пратаколы якога захоўваюцца ў Цэнтральным дзяржаўным ваенна-гістарычным архіве СССР.

З паказанняў яфрэйтара 3-й роты Георгіеўскага батальёна Е. Н. Лугавога:

«Да 18 лістапада ў гімназіі пад арыштам знаходзілася 8 чалавек: генералы Карнілаў, Дзянікін, Маркаў, Лукомскі, Раманоўскі, падпалкоўнік Врагін, капітан Ражэнка і былы член Дзяржаўнай думы Аладзьін. Ахова была падзелена на ўнутраную і знешнюю. Унутраную ахову і праверку ўсялякага роду пропускаў і дакументаў праводзіла варта ад Тэкінскага коннага палка, а ахова знешняя была даручана варце ад нас, георгіеўцаў. Для знешняй аховы знаходзілася ў Быхаве каманда георгіеўцаў з 75 чалавек, якую ўзначальваў прапаршчык Грышын. Камаида гэта штодзённа прызначала варту з пяці знешніх пастоў вартавых пры каравульным унтэр-афіцэры з падначаленнем каравульнаму афіцэру ад Тэкінскага коннага палка. Нясенне службы з самага пачатку было абстаўлена так, што нас, георгіеўцаў, ні ў што не пасвячалі, арыштаваных мы не прымалі, іх не кантралявалі і не вызвалялі — усё гэта было ўскладзена на тэкінцаў, якім не зусім даваралі і якія да нас адносіліся варожа. Аб ненадзейнасці аховы георгіеўцы заявілі ў Магілёўскі выканаўчы камітэт і дэлегацыі ад Паўднёва-Заходняга фронту і прасілі перадаць усю ахову арыштаваных або толькі нам, георгіеўцам, або вызваліць

Быхоўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

нас ад такой службы. На нашы заявы мы адказу не атрымалі...

18 лістапада ў 7 гадзін вечара былі вызвалены Аладзьін, Брагін і Ражэнка. Пры іх вызваленні, як і раней, калі вызвалялі іншых, прысутнічаў камендант Быхава падпалкоўнік Эргарт. Вызваленыя накіраваліся на вакзал, іх праводзіў прапаршчык Грышын, яны паехалі ў поездзе на Кіеў. Нічога падазронага ў вызваленні гэтых арыштаваных прыкмеціць нельга было: усё рабілася звычайна...

19 лістапада раніцай гадзін у 10 вызвалілі Дзянікіна, Маркава, Лукомскага і Раманоўскага. Пранаршчык Грышын растлумачыў варце, што генералы вызвалены на паперах Надзвычайнай следчай камісіі. Папер гэтых нам ніхто не прад'яўляў, таму што пры вызваленні зноў-такі прысутнічаў камендант, і мы не мелі права патрабаваць і правяраць паперы. Вызваленыя накіроўваліся на кватэру да каменданта. Куды накіраваліся ад каменданта вызваленыя, ніхто з нашай каманды не бачыў і да гэтага часу не ведае...».

Паводле ўспамінаў Дзянікіна, на кватэры каменданта ўцекачы нераапрануліся і непазнавальна змянілі свой знешні выгляд. Лукомскі ператварыўся ў «нямецкага каланіста». Маркаў стаў тыповым салдатам, які непараўнаўча імітаваў «свядомага таварыша». Толькі Раманоўскі абмежаваўся адной зменай генеральскіх пагонаў на прапаршчыцкія. Вызваленыя з-пад арышту генералы выраішылі дабірацца да Новачаркаска рознымі шляхамі і атрымалі ў штабе польскай дывізіі фальшывыя дакументы. Дзянікін засведчыў, што начальнік гарнізона генерал Астаповіч меў распараджэнне камандзіра корпуса Доўбар-Мусніцкага садзейнічаць уцекачам.

Дзянікін выехаў з Быхава поездам у палове адзінаццатага вечара 19 лістапада, калі Карнілаў яшчэ заставаўся ў памяшканні гімназіі.

«Такім чынам,— сведчыць далей яфрэйтар Лугавы,— у турме заставаўся адзін генерал Карнілаў, які ў гэты дзень зрабіў звычайную прагулку і вёў сябе зусім так, як ва ўсе папярэднія дні зняволення. З вызваленнем усіх зняволеных, акрамя Карнілава, сама сабой прыходзіла думка, што і Карнілаў будзе вызвалены Надзвычайнай следчай камісіяй. Сапраўды, ноччу, у першай гадзіне на 20 лістапада, у наша каравульнае памяшканне ўбежаў прапаршчык Грышын і сказаў, што Карнілаў вызваляецца на загаду Надзвычайнай следчай камісіі і загадаў зняць вартавых. Карнілава выклікаў камендант, які разам з вартавым начальнікам і прапаршчыкам Грышыным праводзілі Карнілава да памяшкання гімназіі. Грышын быў без шапкі, у адной гімнасцёрцы і ніякіх надазрэнняў не выклікаў. Грышыну мы вельмі давяралі і на яго спадзяваліся, таму што ён выхадзец з нашых жа салдат і заўсёды жыў з намі ў вялікай дружбе.

Як высветлілася раніцай, Карнілаў каля моста цераз Дняпр сеў на свайго ўласнага каня і разам з камендантам, прапаршчыкам Грышыным, з усімі афіцэрамі і тэкінцамі паехаў на Чарнігаўскай шашы на поўдзень. Уцёкі выявіліся праз гадзіну або дзве, калі не вярнуўся прапаршчык Грышын і наш патруль не знайшоў у горадзе нікога з тэкінцаў... Галоўная віна за ўцёкі Карнілава і іншых заключаецца ў поўным садзеянні ім каменданта, усіх тэкінцаў і нашага прапаршчыка Грышына. Усё вялося і рабілася так тонка, што мы не маглі западозрыць уцёкі. Як устанаўліваецца цяпер, калі б мы здагадаліся ў апошнюю хвіліну затрымаць іх, то была б паднята сотня тэкінцаў, і яна сілай зброі ўсё-ткі вызваліла б Карнілава...».

У тую ноч старшы унтэр-афіцэр 3-й роты Георгіеўскага батальёна П. В. Чысцякоў быў каравульным унтэр-афіцэрам і развадзяшчым. Ён паказаў:

«Ноччу, у першай гадзіне на 20 лістапада, у каравульнае памяшканне ўвайшоў прапаршчык Грышын і аб'явіў варце, што Карнілаў вызваляецца. Я спытаў: «Хто дазволіў вызваліць Карнілава?». Грышын адказаў, што на загаду Надзвычайнай следчай камісіі і што ніякіх сумненняў у гэтым не можа быць, таму што Грышын сам чытаў паперы і ўсе яны сапраўдныя і правільныя, за што ён ручаецца галавой, і загадаў зняць вартавых. Вартавыя былі зняты і пайшлі ў каравульнае памяшканне. Генерал Карнілаў спусціўся з верхняга паверха, апрануты ў звычайную форму. Калі ён праходзіў каля нашага памяшкання, сказаў: «Бывайце, георгіеўцы, я ад'язджаю». Карнілава суправаджалі афіцэры. Наш прапаршчык Грышын быў без шапкі і ў адной гімнасцёрцы. Услед за Карнілавым выйшлі тэкінцы ў поўным узбраенні. Ад'езд тэкінцаў падазроным для нас не мог быць, таму што яны лічыліся асабістай вартай Карнілава... Падазронай здалася толькі доўгая адсутнасць прапаршчыка Грышына, які сказаў, што праводзіць Карнілава і вернецца. Прайшла гадзіна, а Грышын не вяртаўся. Варта пачала хваляваца. Я паслаў вартавых з чатырох чалавек адшукаць Грышына. Толькі цяпер выявілася, што Грышын нас падвёў: Карнілаў з усімі тэкінцамі збег...».

У паказаннях яфрэйтара 3-й роты Георгіеўскага батальёна І. А. Бардынюка адзначана, што прапаршчык Грышын за некалькі гадзін да ўцёкаў высвятляў магчымую рэакцыю варты на вызваленне Карнілава і тым часам рыхтаваў салдат да спакойнага ўспрыняцця такога факта.

У справе ёсць паказанні падпрапаршчыка той жа роты С. П. Пятрэнкі, якія пацвярджаюць расказанае яфрэйтарам Бардынюком. З паказанняў ветэрынарнага фельчара 1-га эскадрона Тэкінскага коннага палка А. В. Храпава мы даведаліся, што рабілася ў тую ноч у палку.

«У гадзіну ночы з 19 на 20 лістапада,— чытаем у яго паказаннях,— у 1-м эскадроне афіцэры на трывозе падняліі коннікаў і абоз і загадалі неадкладна строіцца... Усе абозныя рускія адмовіліся выходзіць і не хацелі запрагаць. Нас прымусілі запрагаць і ісці пад аголенымі шашкамі. Эскадрон сабраўся, і паручнік Канкоў павёў яго па Банной вуліцы да моста... коннікі ўзялі напрамак да гімназіі, дзе ўтрымліваўся Карнілаў. У гэты час 2-і і 3-і эскадроны чакалі ў конным страі каля дняпроўскага моста. Праз чвэрць гадзіны каля моста з'явіўся коннік каля асабістага каня Карнілава, сеў на яго, і тады эскадроны пачалі выцягвацца праз мост. Уперадзе пайшоў 2-і эскадрон, за ім 1-ы... 3-і эскадрон і кулямётная каманда. Абоз выйшаў раней і пайшоў наперадзе 2-га эскадрона. Я ехаў на кані ў хвасце 1-га эскадрона. Настрой мой быў трывожны. Я не сумняваўся, што Карнілаў уцякае. Аддзяліцца ад палка не было магчымасці. Калі прайшлі не больш

Электронный историко-архивный музей

чвэрці вярсты ад моста, мяне дагнаў член палкавога камітэта старшы унтэр-афіцэр Хаджынапес Джумі-еў. Я спытаў яго, з якога выпадку была трывога і куды ідзем. Ён сказаў па-туркменску, што баяр Карнілаў уцёк. Я вырашыў у бліжэйшым лесе схавацца і паведаміць аб уцёку Карнілава. Санраўды, у лесе мне ўдалося аддзяліцца ад палка і, калі выйшаў на дарогу, наткнуўся на аўтамабіль, які ішоў з Георгіеўскага батальёна... Я паведаміў аб уцёку Карнілава пасажырам аўтамабіля і паехаў услед за імі ў Быхаў».

Як жа магло здарыцца, што ворагам рэвалюцыі ўдалося выканаць сваю тайную задуму? Ні Надзвычайная следчая камісія, ні Стаўка, у якой заставаўся адданы Карнілаву састаў генералаў і афіцэраў, не клапаціліся аб строгай ізаляцыі арыштаваных. Месцам зняволення быў выбраны Быхаў, дзе стаяла польская дывізія з карнілаўскім камандным саставам. Для аховы вылучаны Тэкінскі полк — асабістая ахова Карнілава ў той час, калі ён быў Вярхоўным галоўнакамандуючым. Рэжым утрымання зняволеных фактычна вызначаў не камендант горада і не начальнік варты, а сам Карнілаў. Арыштаваным дазвалялася гуляць у садзе паблізу гімназіі, Карнілаў у любы час зносіўся са Стаўкай, саветам Саюза казацкіх войск, Доўбар-Мусніцкім і нават з Каледзіным, даваў ім парады аб мерах барацьбы з рэвалюцыйным рухам. Уцёкі Карнілава былі загадзя падрыхтаваны пры ўдзеле Духоніна. У гэту змову былі ўцягнуты афіцэры Тэкінскага палка, камендант Быхава Эргарт, камандзір 1-га польскага корпуса генерал Доўбар-Мусніцкі і іншыя.

24 лістапада Ваенна-рэвалюцыйны камітэт пры Стаўцы даў тэлеграму ўсім тэрміновa прыняць меры для арышту Карнілава.

Неўзабаве контррэвалюцыйныя атрады, якія амаль адначасова з уцёкамі Карнілава адправіліся з Быхава і Магілёва на Дон, былі ліквідаваны. Карнілаў збег у Новачаркаск, дзе з генералам М. В. Аляксеевым узначаліў белагвардзейскую добраахвотніцкую армію. У час штурму Екацярынадара быў забіты.

В. Палікарпаў.

РЭЗАЛЮЦЫЯ ВЫКАНКОМА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА САВЕТА СЯЛЯНСКІХ ДЭПУТАТАЎ АБ БАРАЦЬБЕ СУПРАЦЬ КОНТРРЭВАЛЮЦЫЙНЫХ ДЗЕЯННЯЎ ПОЛЬСКІХ ЛЕГІЁНАЎ

23 лістапада 1917 г.

Исполнительный комитет губернского Совета крестьянских депутатов, обсудив по докладу тов. Пенязькова вопрос о бесчинстве, контрреволюционных действиях и насилиях штаба расположенной в Быхове польской дивизии над крестьянством Быховского у., над земельными комитетами, встречающими в своих правомерных действиях вооруженное сопротивление со стороны польских легионеров, защищающих интересы помещиков и их земли от контроля и учета земельными комитетами, постановил: категорически настаивать на немедленном уходе польской дивизии из Могилевской губ., о чем оповестить центральный оперативный орган революционной армии. Принимая это постановление, исполнительный комитет основывается на следующих мотивах:

1. Нахождение польских национальных частей в Белорусской обл. не вызывается стратегической необходимостью, и их насильническая деятельность может повести к кровавой развязке.

2. Штаб польской дивизии входит в переговоры с «Союзом земельных собственников» отдельных уездов и посылает помещикам отряды, которые выгоняют учетчиков, увозят и угоняют скот, заявляя, что «это достояние польского народа».

3. Пребывание польских частей в губернии и во всем Белорусском крае имеет в конечном итоге своей целью осуществление национальной польской идеи — присоединения Белоруссии к монархической Польше.

Эти агрессивные политические вожделения польской знатной буржуазии об аннексировании Белоруссии и встречают со стороны белорусской демократии самый энергичный, негодующий протест.

Принимая все вышеизложенное во внимание, исполнительный комитет губ[ернского] Совета крестьянских депутатов, стоя на точке зрения сохранения завоеваний революции не только для России, но для части ее — Белоруссии, неотторжимой от России, считает, что в настоящий неустойчивый момент должна быть устранена всякая возможность вооруженного вмешательства иноземных войск в демократический уклад жизни края, угрозы насильственного отторжения Белорусской обл. от матери России. Поэтому губ[ернский] исполком выражает твёрдую уверенность, что Ставка, как высший оперативный орган, примет срочные меры к немедленному уводу польских войск из губернии. В случае же отказа войск подчиниться распоряжениям Ставки, после исчерпания всех мирных средств разрешения конфликта — не останавливаться перед привлечением самых суровых и решительных мер вплоть до ареста польского штаба и расформирования

Быховский районный историко-краеведческий музей

полков. Сам губ[ернский] исполком обратится к войскам с воззванием, а к фронтам, к белорусским частям — с призывом их о помощи, изложив всю сущность создавшейся обстановки.

4. Губ[ернский] Исполком Советов крестьянских депутатов приходит к мысли о создании в крае сильного, активного надежного руководящего центра по самообороне и самозащите Белоруссии, сконцентрировании дисциплинированных военных сил в губернии для противодействия агрессивным замыслам помещиков, для крестьянской самозащиты. При демобилизации губ[ернский] Совет через посредство белорусского военного органа и Ставку будет настаивать [на][1] сконцентрировании демобилизующихся войск белорусских в пределах Белорусского края.

Исполком губ[ернского] Совета приступает к организации в уездах «боевых дружин» из отпускных и уволенных солдат и других добровольцев и для снабжения их оружием ходатайствует перед Ставкой и артиллерийскими оружейными складами об отпуске необходимого оружия для боевых дружин.

Губ[ернский] исполком высказывается за арест тех помещиков, в имениях которых земельным комитетам оказывали вооруженное сопротивление, за арест видных членов «Союза земельных собственников» по всем уездам, за арест всякого лица, оказывающего сопротивление земельным комитетам.

Губ[ернский] исполком требует немедленной посылки дисциплинированных революционных войск из ближайших пунктов: Гомеля, Орши, Жлобина в угрожаемые места: Чериков, Быхов, Могилев, Сенно, в распоряжение крестьянских уездных Советов.

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Мн., 1957. Т. 2. С. 258—260.

ТЭЛЕГРАМА ВАЕННА-РЭВАЛЮЦЫЙНАГА КАМІТЭТА ПРЫ СТАЎЦЫ ЎСІМ САВЕТАМ І ВАЙСКОВЫМ КАМІТЭТАМ АБ ПРЫНЯЦЦІ МЕР ДА АРЫШТУ КАРНІЛАВА

24 лістапада 1917 г.

Фронтовым, армейским, корпусным, дивизионным комитетам, всем Советам солдатских, рабочих и крестьянских депутатов.

24 ноября. Изменник и предатель революции ген. Корнилов, бежав на юг из Быхова в сопровождении 400 текинцев, отправился на юг по направлению Клинцы, Новозыбков, Сураж. По дороге он силой заставил идти с ним 40 солдат-пулеметчиков. Отряд Корнилова насильно забирает от крестьян фураж и хлеб. Жители против Корнилова. Военно-революционный комитет при Ставке требует, чтобы все военно-революционные комитеты, Советы приняли срочно меры для ареста Корнилова и передачи его революционному народному суду. О всех продвижениях и о месте нахождения Корнилова просим телеграфно сообщить Военно-революционному комитету при Ставке.

Председатель Ревкома Ставки Боярский.
Секретарь Зобков.

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Мн., 1957. Т. 2. С. 264.

ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ УЦЕКАХ КАРНІЛАВА З БЫХАЎСКАЙ ТУРМЫ

25 лістапада 1917 г.

По прямому проводу из Могилева получено сообщение о побеге из быховской тюрьмы ген. Корнилова. Вместе с ним бежали главнокомандующий Юго-западным фронтом ген. Деникин, начальник штаба ген. Марков, ген.-квартирмейстер Орлов и другие лица, содержавшиеся в тюрьме. Выйдя из тюрьмы, генерал принял командование над четырьмя сотнями текинцев, перешедших на его сторону, и распорядился об освобождении всех остальных заключенных и затем в полном боевом порядке, во главе отряда, двинулся по шоссе на юг. Слух о том, что ген. Корнилов был освобожден по ордеру главного военно-морского прокурора Шабловского, категорически опровергается чрезвычайной комиссией по расследованию дела о ген. Корнилове и его соучастниках. Местопроживание Корнилова пока еще не обнаружено.

Принимаются меры к его поимке.

---

[1] У тэксце: «о их».

Быховский районный историко-краеведческий музей

Председателем Викжеля Милицким разослан по всем железным дорогам следующий циркуляр.

«Сегодня ночью из Быхова бежал Корнилов сухопутными путями с четырьмя сотнями текинцев и направился к Жлобину, на юг. Предписываю всем железнодорожникам принять все меры к задержанию Корнилова и об аресте меня уведомить.

О побеге и принятых вами мерах уведомите местные Советы солдатских депутатов».

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Мн., 1957. Т. 2. С. 292—293.

Весці з Быхаўшчыны

У бальшавіцкай газеце «Солдатская правда», якая выдавалася ў Петраградзе, у нумары за 1 снежня 1917 г. пад рубрыкай «Весці з правінцыі» былі апублікаваны два матэрыялы, дасланыя ў рэдакцыю з Быхаўскага павета прадстаўніком Петраградскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта І. Царавым.

Першы з іх — рэзалюцыя сходу грамадзян Камарыцкага сельскага таварыства Новабыхаўскай воласці па дакладу І. Царава. У ёй сяляне выказалі падзяку Цэнтральнаму ВРК за спачуванне і прысылку сваіх прадстаўнікоў і засведчылі сваю «поўную падтрымку Саветам аж да апошняй кроплі крыві». У рэзалюцыі сяляне таксама прасілі: «... прыслаць... узброены атрад для рэарганізацыі мясцовага кіравання і падтрымкі нас, безабаронных сялян, і ўстанаўлення Саветаў; ... убраць ...контррэвалюцыйныя войскі польскіх легіянераў, якія прынеслі нам велізарныя страты і шкоду; тэрмінова ўбраць ад нас Карнілава для перадачы яго рэвалюцыйнаму суду».

Падпісана рэзалюцыя была старшынёй сходу І. П. Рагаленкам. Пасля гэтага газета змясціла карэспандэнцыю самога І. Царава. Вось што ён пісаў з Новага Быхава ў Піцер:

«Моцны ўплыў маюць тут памешчыкі, паны, крамнікі. Яны распаўсюджваюць пра бальшавікоў самую недарэчную лухту. Напрыклад, калі сюды прыехаў агітатар-бальшавік, бабы пачалі хаваць дзяцей, баючыся, што «бальшавікі іх парэжуць».

Нягледзячы на ўсё гэта, калі быў назначаны сход для абмеркавання бягучага моманту, то сабралася шмат народу, мястэчка вялікае, і кожнаму хацелася паглядзець на «звера-бальшавіка».

На сходзе выступалі і рабілі шмат шуму нейкія прапары. Усё-такі, нягледзячы на процідзеянне і падкопы прысутнічаўшага папа, была амаль аднадушна (некалькі ўстрымалася) прынята бальшавіцкая рэзалюцыя. У вёсцы Абідавічы той жа Новабыхаўскай воласці пасля дакладу сяляне з радасцю віталі ўладу Саветаў і тужылі аб тым, што Стаўка не дазваляе правесці ў жыццё зямельны закон.

Сяляне вельмі цікавяцца зямельнай праграмай бальшавікоў. Большасць моладзі згаджаецца з нацыяналізацыяй, а старыя ніяк не могуць зразумець, «як гэта будзе і не дома гаспадар».

Апрача І. Царава на Быхаўшчыне бальшавіцкую агітацыю і прапаганду праводзілі і іншыя прадстаўнікі рэвалюцыйнага Петраграда, пасланыя сюды ваенна-рэвалюцыйным камітэтам.

Быхаў у маім жыцці

З успамінаў С. І. Марозава

Сцяпан Ільіч Марозаў нарадзіўся ў 1894 г. ў в. Філатава Тульскай вобл. З сялян. Член КПСС з 1917 г. Удзельнік грамадзянскай вайны. Працоўную дзейнасць пачаў з 15-гадовага ўзросту, у 1908 г. працаваў на фабрыцы ў Маскве. З 1914 г. ў царскай арміі, малодшы афіцэр роты. Вёў бальшавіцкую агітацыю, быў выбраны ў палкавы камітэт, удзельнічаў у ліквідацыі контррэвалюцыйнай Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёве. У канцы 1917 г. першы старшыня Быхаўскага рэўкома. З сакавіка 1918 г. нач. штаба па аб'яднанню і кіраўніцтву ўсімі чырвонагвардзейскімі атрадамі Магілёўскай губерні, у маі—ліпені 1918 камандуючы магілёўскага ўчастка Заходняй заслоны. У 1918 г. дэлегат 5-га Усерасійскага з'езду Саветаў, удзельнічаў у ліквідацыі леваэсэраўскага мяцяжу ў Маскве. У 1919—1921 гг. вучыўся ў Ваеннай акадэміі РСЧА. Пасля займаў камандныя пасады ў Чырвонай Арміі. У Вялікую Айчынную вайну камандаваў корпусам, арміямі на Карэльскім, Заходнім, 3-м Беларускім франтах. З 1949 г. генерал-лейтэнант С. І. Марозаў у адстаўцы. Узнагароджаны ордэнам Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Багдана Хмяльніцкага I ступені, Суворава II ступені, медалямі. Памёр С. І. Марозаў у 1950 г.

...У Шклове мы выгрузіліся і прынялі рэзалюцыю аб падтрымцы Петраградскага Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта і Савета Народных Камісараў. Пры падыходзе да Шклова эшалонаў з Петраграда, у якіх рэвалюцыйныя атрады новага Вярхоўнага галоўнакамандуючага М. В. Крыленкі накіроўваліся для ліквідацыі Стаўкі генера-

Быховский районный историко-краеведческий музей

С. І. Марозаў.

ля Духоніна, я быў выбраны дэлегатам палка і разам з эшалонам чырвонагвардзейцаў прыбыў у Магілёў, каб уручыць рэзалюцыю сходу новаму Главкаверху. У Магілёве мяне ўвялі ў члены ЦК дзеючай арміі і флоту пры Стаўцы галоўнакамандуючага, а праз 2 тыдні ўпаўнаважылі выехаць у Быхаў і патрабаваць ад начальніка польскай дывізіі з корпуса генерала Доўбар-Мусніцкага спыніць умяшанне ва ўнутраныя справы Савецкай улады, здзекі над сялянствам павета і адвесці легіянераў у межы Польшчы. У падмацаванне перагавораў мне быў прыдадзены бронеатрад. У Быхаве я аб'явіў сябе начальнікам гарнізона, распусціў земскую ўправу, арганізаваў рэўком і быў выбраны яго старшынёй. У снежні 1917 г. правялі выбары сялянскіх камітэтаў у валасцях. Мяне выбралі дэлегатам на 3-і Усерасійскі з'езд Саветаў, але паехаць на яго з-за выключна складанай абстаноўкі не змог. Нанава ўтвораныя органы Савецкай улады павета і валасцей і 12 камісараў, прызначаных рэўкомам, адразу ж пачалі работу па добраахвотнаму фарміраванню атрадаў Чырвонай гвардыі з былых салдат, матросаў, настроеных за Савецкую ўладу сялян. У сувязі з тым, што штаб польскай дывізіі адмовіўся добраахвотна пакінуць Быхаў, у павеце пачалося прымусовае раззбраенне рот і эскадронаў польскай дывізіі. У дапамогу нам з Петраграда прыбыў чырвонагвардзейскі атрад, а неўзабаве над вёскай Тошчыца пачаліся ваенапралітныя баі з легіянерамі. Да гэтага ў павеце была аб'яўлена мабілізацыя. Быхаўскі рэўком узброіў і перадаў камандаванню Стаўкі звыш 1500 байцоў, значная частка якіх засталася ў валасцях ачышчаць павет ад польскіх войск.

Здрадніцкі лозунг Троцкага «Ні вайны, ні міру» прывёў да агульнага наступлення на нас немцаў і белапалякаў. У выніку гэтага чырвонагвардзейскія атрады па загаду Стаўкі былі адведзены, а мясцовыя атрады з найбольш патрыятычнай часткай байцоў зведзены мною ў асобны атрад, які ў сакавіку 1918 г. перайшоў на левабярэжжа Дняпра і ўсё лета трымаў там абарону.

З гісторыі партызаншчыны на Магілёўшчыне

Гэты дакументальны расказ былога чырвонагвардзейца, удзельніка грамадзянскай вайны І. К. Мацвяёнка быў надрукаваны ў сакавіцкім нумары часопіса «Наш край» у 1928 г. Іван Кузьміч Мацвяёнак — ураджэнец в. Новы Быхаў. Ваяваў спачатку ў першым Быхаўскім чырвонагвардзейскім атрадзе, потым у 152-м стралковым палку, член КПСС з 1919 г. Артыкул перадрукаваны са скарачэннямі.

Працоўныя Беларусі ў 1917—1918 гг. стварылі адважныя і магутныя партызанскія атрады, каб змагацца супраць сваіх адвечных прыгнятальнікаў — панаў. У гэтыя атрады (Чырвонай гвардыі) уступіла галоўным чынам бядняцкая моладзь. Былі выпадкі пагалоўнага ўступлення яе ў чырвоныя атрады. У такіх вёсках сяляне-бацькі самі пасылалі сваіх сыноў запісвацца ў партызаны і ўсімі сродкамі і магчымасцямі дапамагалі ім матэрыяльна і маральна. Да іх ліку трэба аднесці вёскі Новы Быхаў і Лазаравічы, якія акруговы выканком да дня дзесяцігоддзя Чырвонай Арміі вызначыў як заслужыўшыя ўзнагароды. Уступіўшы бадай поўнасцю ў Чырвоную гвардыю, яны пасля склалі значную частку аднаго з найбольш гераічных 152-га стралковага палка, які прайшоў на польскім фронце ўсе этапы жорсткай вайны.

Партызанскі рух у Прыдняпроўі, на ўсім яго працягу, пачаўся з гэтых вёсак. Таму на гэтым варта спыніцца больш падрабязна.

У пачатку лютага 1918 года польскія войскі Доўбар-Мусніцкага, якія стаялі на Быхаўшчыне, Рагачоўшчыне і Бабруйшчыне, аб'ядналіся пад Жлобінам і павялі наступленне між чыгункай Рагачоў — Быхаў і Дняпром. Супраць цэлага вэрожага корпуса чырвоныя змаглі паслаць пад Рагачоў толькі адзін латышскі полк, эскадрон кавалерыі, атрад Чырвонай гвардыі чалавек у 300, з іх 200 чалавек было матросаў, рэшткі палка, які праязджаў праз Рагачоў з фронту ў глыб Расіі, і бронецягнік з 2 вагонаў з байцамі-матросамі. Гэтых сіл было мала. І таму быхаўскія савецкія органы на чале з начальнікам Чырвонай абароны абвясцілі ў павеце добраахвотны запіс у Чырвоную гвардыю.

Увесь люты месяц ішлі няспынныя баі на тэрыторыі між Рагачовам і Тошчыцай. Але ўрэшце здаюцца адна за адной з баямі вёскі Шчыбрын, Гадзілавічы, Званец. 25 лютага пачынаецца бой за станцыю Тошчыца.

Некалькі разоў станцыя пераходзіць з рук у рукі. Будынак вакзала набіты кулямі і снарадамі,

Быховский районный историко-краеведческий музей

як рэшата. 27 лютага Тошчыца здадзена, чырвоныя адступілі ў вёску Камарычы, каб адтуль даць ворагу моцны адпор.

Здача Тошчыцы стварыла сур'ёзную небяспеку. Гэта разумеў кожны. Станцыя была важным стратэгічным пунктам у барацьбе з белапалякамі. З яе здачай для польскіх легіянераў быў адкрыты шлях на Быхаў і далей. Вось з гэтага часу сотні людзей — і моладзі, і старых — уступілі ў чырвонагвардзейскія атрады.

Як упаміналася ўжо вышэй, цэнтрам партызанскага руху ў гэты час зрабіліся вёскі Новы Быхаў і Лазаравічы. Знаходзяцца яны на беразе Дняпра, раўналежна станцыі Тошчыца. Бой пад Тошчыцай, незалежна ад таго ці іншага яго выніку, ставіў гэтыя вёскі пад непасрэдную пагрозу. Гэта прымушала дзейнічаць.

26 лютага Навабыхаўская воласць атрымала з Быхава (ад штаба Чырвонай абароны) адозву, дзе коратка і выразна было напісана: «Таварышы! Вораг блізка! Ён хоча перашкодзіць спакойнай працы земляроба, ён імкнецца паздзекавацца над нашымі бацькамі, жонкамі, сёстрамі. Пішыцеся ў чырвоныя атрады абароны!».

Адозва зрабіла надзвычайнае ўражанне. Ужо ўвечары гэтага дня аб адозве ведалі ўсе ў Новым Быхаве і суседніх Лазаравічах. Ноч для іх была бяссонная. Назаўтра, 27 лютага, як толькі развіднела, на вуліцы Новага Быхава ўсюды збіралася моладзь. Усхваляваныя твары, гарачыя вочы, трывожныя гутаркі. Па некалькі разоў чытаюць і перачытваюць расклееныя на будынку воласці адозвы.

Унутры, у воласці, поўна... З-за дыму махоркі ледзь бачны абрысы фігур і твараў. Пішуцца... За сталом матрос. Матрос выкрыквае ўголас нумар і прозвішча кожнага запісанага. Чым больш зачытваецца нумар, тым больш захапленнее прысутных. «Нумар 375. Мясковы настаўшік,— матрос называе прозвішча і з асаблівай гордасцю дадае: — Да нас і настаўнікі пішуцца!»

Усяго ў дзвюх вёсках запісаўся да 500 чалавек. На другі дзень у Быхаве яны абмундзіраваліся, узброіліся і атрымалі назву «1-я Навабыхаўская баявая рота». З добраахвотнікаў іншых вёсак была створана 2-я рота. На чале ўсяго атрада стаў камуніст Марозаў. Камандзірам 1-й Навабыхаўскай баявой роты — навабыхаўскі грамадзянін С. Дзергачоў. Разбітыя на ўзводы, роты рассыпаліся па вёсках былых Старабыхаўскай і Чыгірынскай валасцей для вартавой (дазорнай) службы.

1 сакавіка палякі занялі вёску Камарычы і Быхаў. Штабы і абоз перабраліся за Дняпро. Своечасова былі паведамлены ўсе дазорныя часці, якія пайшлі ўслед за імі. А ў тыле ў палякаў, у 15 вярстах ад Быхава ў вёсцы Уюн, засталіся 2 узводы Навабыхаўскай баявой роты, якіх не паспелі папярэдзіць.

Знайшліся баязліўцы. Але такіх мала. У большасці расце адвага. Небяспека робіць энергічнымі, сталёвымі. Зараз жа і думка: з боем не праб'ёмся сваёй жменькай скрозь польскую навалу, дык трэба прасачыцца за Дняпро паціху, у пустым месцы, быць гатовымі на выпадак чаго адбівацца ўсімі сіламі. Жывымі не здавацца. Рашэнне прынята... Яшчэ трошку агітуюць хістаючыхся найлепшыя героі, якія праявілі сябе і ў будучых баях,— І. Кармачоў, М. Полькін, Ф. Шылаў.

Атраду ўдалося перабрацца за Дняпро. Польскі раз'езд «насеяў» быў трошку ўдагонку з кулямёта, але нікога не дастаў.

За Дняпром быў рух і жыццё. Атрады арганізаваліся з рознай колькасці і якасці. Усе ішлі на Рослаў, дзе і думалі канчаткова аформіцца. Арганізаваных атрадаў, чалавек па 300 кожны, прыйшло шэсць: два магілёўскіх, два чавускіх, два быхаўскіх. Былі і маленькія атрады, якія часткова дайшлі да Рослава і там уліліся ў адзін з сямі арганізаваных атрадаў...

Сабраліся атрады ў Рослаў да 12 сакавіка. Некалькі дзён фарміраваліся і 25 сакавіка былі разасланы на фронту. У Рославе застаўся толькі штаб Камандуючага Магілёўскімі атрадамі Рослаўскай групы Заходняй Завесы.

Фронт Рослаўскай групы працягваўся ад Копысі да Рагачова на беразе Дняпра. Ён падзяляўся на дзве часткі — участкі Мсціслаўскі і Чэрыкаўскі. У Мсціславе і Чэрыкаве знаходзіліся штабы войск участкаў. Фронт між імі быў падзелены па лініі Быхаў—Ніканавічы—Прапойск (назней Званец—Прапойск). На Мсціслаўскі ўчастак і былі накіраваны атрады, сфарміраваныя ў Рославе.

1 і 2 Магілёўскія атрады з боем прайшлі лінію Мсціслаў—Шклоў і занялі тэрыторыю па Дняпры Копысь—Шклоў. 3 і 4 Чавускія атрады размясціліся на Дняпры між Шкловам і Магілёвам, 5 і 6 Быхаўскія — між Магілёвам і Быхавам.

Асабліва гераічную барацьбу па ачышчэнню Задняпроўя ад ворагаў прыйшлося вытрымаць быхаўчанам на ўчастку Сухары—Асавец—Лупалава. У адным з такіх баёў (пад Сухарамі) атрад, збіўшы з пазіцыі ворагаў, каб дагнаць іх, разуўся (тады толькі што растаяў снег і ў ботах бегчы было цяжка). Беглі за ворагамі вёрст 5 і... не дагналі, бо яны былі на конях.

На Чэрыкаўскім участку ўсё Задняпроўе было ачышчана ад ворагаў бадай што без баёў.

З гэтага часу (14 красавіка) чырвонаармейцы ўжо выконвалі фактычна толькі пагранічную службу на Дняпры, не супакойваліся толькі яшчэ нейкі час быхаўчане і назалялі палякам. Так, шосты Быхаўскі атрад (былая Навабыхаўская рота), падышоўшы адным узводам да дняпроўскага моста ўначы, даў з паўсотні залпаў, прычым камандзір (С. Дзергачоў) па-

Быховский районный историко-краеведческий музей

даваў каманду: «Батальён, пліі». У гэты ж час кідалі тут жа ў ваду бомбы. Не толькі ў насельніцтва, але і ў палякаў склалася ўражанне бамбардзіроўкі горада і наступлення вялізнай масы войск. Цэлая дывізія (польская) выбралася з горада і вярнулася назад толькі на трэці дзень.

Гэтым жа атрадам праводзіліся вылазкі ў тыл палякаў за харчамі. Так, з фальварка Масток пераправілі за Дняпро да 70 пансkіх кароў, тое ж адбылося ў фальварку Сарочына. Пры дапамозе падпольнай Навабыхаўскай арганізацыі наладжана была гераічная вылазка ў вёску Лазаравічы, дзе палякам нанесены значныя страты.

У ліпені 1918 года ўсе атрады былога Мсціслаўскага ўчастка афармлены ў 5-ы Быхаўскі полк (камандаванне атрадаў спецыяльна хадайнічала перад цэнтрам). У жніўні, калі ўжо аформілася поўнасцю вайсковая сістэма Савецкай Расіі, ён перайменаваўся ў 152-і стралковы полк 17-й дывізіі. Атрады былога Чэрыкаўскага ўчастка склалі 153-і стралковы полк. Гэтыя два палкі пакінулі пасля сябе надта гераічны след, прайшоўшы ўсе этапы грамадзянскай вайны. Толькі лік старых партызан Магілёўшчыны ў іх змяншаўся без канца. Так, напрыклад, перад Варшаўскім наступленнем быхаўчан у 152-м палку было толькі чалавек 50. Загінулі некаторыя на франтах смерцю герояў-рэвалюцыянераў (М. Каржоў з вёскі Камарычы), сталі інвалідамі (М. Пагодкін з Новага Быхава), многія выбылі з палка з-за хвароб і ран.

Сваёй падпольнай рэвалюцыйнай дзейнасцю ў часы панавання на правабярэжнай Магілёўшчыне палякаў і немцаў асабліва вызначаліцца Новы Быхаў і Лазаравічы.

Таварышы, склаўшыя потым ядро падпольнай арганізацыі ў Новым Быхаве, у часе занятця яго палякамі знаходзіліся хто ў арміі, хто на фабрыках і заводах. З'явіліся яны намоў у перыяд найбольшага абвастрэння здзекаў палякаў над мясцовым насельніцтвам. Нягледзячы на ўсё гэта, моладзь Новага Быхава стварыла сваю арганізацыю. Яна вывучала размяшчэнне польскіх войск, настрой насельніцтва і польскіх салдат і перадавала гэтыя звесткі за Дняпро чырвоным. Віднейшыя дзеячы-падпольшчыкі — П. Дзергачоў (расстраляны палякамі), К. Скобаў, С. Тарасенка і іншыя.

Была наладжана сувязь з моладдзю суседніх вёсак. У вёсцы Лазаравічы — з Майсянковым, Пагупом і г. д., у Залескай Слабадзе — з Галіноўскім. Былі надзейныя хлопцы ў Віляхаўцы і Тайманаве. Назапашвалася ўзбраенне на выпадак паўстання.

Здаровыя, зграбныя хлопцы кінуліся ў вочы палякам у абязлюдненым Новым Быхаве. Тыя сталі прычэпліваць без усялякай прычыны. Сустрэўшы К. Скобава, палякі прымусілі яго «гусіным» крокам пайсці дамоў на даволі значную адлегласць. Але выявіць падпольшчыкаў не змаглі. Выпытвалі старых сялян, але ні адзін не сказаў аб іх ні слова, хоць пра групу багата хто ведаў. Урэшце, дакапаўшыся ў суседніх вёсках, расстралялі П. Дзергачова «за партыйную прыналежнасць», а зааарыштавалі К. Скобава. Яго таксама збіраліся забіць. Астатнія хлопцы з арганізацыі ўцякалі за Дняпро. У справе наладжвання сувязі паміж падпольшчыкамі і чырвонымі значную ролю адыгрывалі жанчыны...

Нагул, жанчыны Новага Быхава прынеслі рэвалюцыйнай справе вялікую карысць. Новы Быхаў і Лазаравічы ляжаць на адным беразе Дняпра, а па другі бок у вёсцы Абідавічы стаяць чырвоныя. І вось жанчыны і дзяўчаты часта адпрашваюцца ў палякаў (пазней у немцаў) пераправіцца на той бок у луг «нарваць травы цялятам». Іх часам, добра абшукаўшы, пускалі. А там, у траве, да іх падпаўзаў чырвонаармеец, якому яны і расказвалі ўсё, што ведалі.

Так змагалася за зямлю і волю сялянства ўпамянутых вёсак...

І ўзняўся народ

З успамінаў Андрэя Раманавіча Саўчанкі, былога члена падраённага падпольнага камітэта РКП(б)

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі многія франтавікі вярнуліся ў родныя мясціны. Сялянскія рукі прагнулі зямлі, якую Савецкая ўлада перадала тым, хто яе апрацоўваў. Але ўжо ў лютым 1918 г. кайзераўскія войскі акупіравалі значную частку Беларусі. Пад прыгнётам акупантаў апынулася правабярэжная Быхаўшчына і мая родная вёска Студзёнка.

Разам з акупантамі вярнуліся ў свае маёнткі і паны. З дапамогай польскіх легіянераў і нямецкіх салдат яны адбіралі ў сялян зямлю, жывёлу, сельскагаспадарчы інвентар, жорстка помсцілі за тое, што ў перыяд Кастрычніка страцілі сваю маёмасць. Абурэнне і нянавісць да акупантаў раслі з кожным днём, сяляне ўсё больш і больш усведамлялі, што трэба аказваць інтэрвентам актыўнае супраціўленне. Актывістам нашай вёскі ўдалося наладзіць сувязь з падпольнымі бальшавіцкімі арганізацыямі на акупіраванай тэрыторыі павета. Неўзабаве быў арганізаваны падраённы падпольны камітэт РКП(б), які распачаў падрыхтоўку да паўстання супраць акупантаў. У многіх вёсках былі створаны паўстанцкія групы з праверaных, адданых Савецкай уладзе таварышаў. Паўстанцкія групы ўзначалілі: у Гарадцы Фёдар Кірэеў, у Сушчове Аляксей Грыцаў, у Клятным Пётр і Дзмітрый Антонавы, у Залатве А. Мельнікаў. Групы збіралі зброю і боепрыпасы, распаўсюджвалі сярод насельніцтва

Быховский районный историко-краеведческий музей

і кайзераўскіх салдат бальшавіцкую літаратуру, зрывалі нарыхтоўкі жывёлы і хлеба для акупантаў, праводзілі вярбоўку ў партызанскія атрады.

Пасля таго, як Я. І. Сарокін пабываў на краявой канферэнцыі камуністычных арганізацый у Смаленску, наладзілася трывалая сувязь з Ваенна-рэвалюцыйным камітэтам Заходняга фронту, адкуль мы атрымлівалі ўказанні, літаратуру, зброю і боепрыпасы. Для гэтага на левабярэжжы Дняпра ў в. Следзюкі быў арганізаваны склад забеспячэння. Дастаўка зброі і літаратуры цераз Дняпро была нялёгкай справай, але людзі ішлі на ўсё. Мне запомніўся Васіль Сазоненка з вёскі Студзёнка. Ён добраахвотна ўзяўся за гэту рызыкоўную справу. Праявіўшы смеласць і знаходлівасць, Сазоненка даставіў фурманку зброі ў паўстанцкі цэнтр. Паўстанцкія групы добра арганізавалі працоўных і прынялі на сходах пратэст супраць далучэння Беларусі да Украінскай нацыяналістычнай рады. Быхаўскіх падпольшчыкаў наведаў А. С. Славінскі, адзін з арганізатараў падполля Беларусі. Ён правёў інструктаж, расказаў, як лепш арганізаваць супраціўленне акупантам. Адначасова паведаміў аб наспяваючай рэвалюцыі ў Германіі. Сход актыву падпольшчыкаў праходзіў на хутары ў хаце Кандрата Сарокіна. На ім прысутнічала каля ста чалавек. Была ўстаноўлена цесная сувязь з павятовым рэўкомам, які знаходзіўся ў Прапойску. Адтуль прыбыў Пётр Лагуцёнак. Разам з ім падпольны камітэт падабраў састаў рэвалюцыйных камітэтаў валасцей.

З лістапада 1918 г. над Быхавам зноў залунаў чырвоны сцяг. Рэўком абвясціў сябе вышэйшай уладай, сфарміраваў народную міліцыю, прызначыў кіраўнікоў устаноў. Начальнікам міліцыі стаў Дзмітрый Мікалаевіч Антонаў з Клятнога, а яго намеснікам Я. Г. Сівакоў з Студзёнкі. Мне, як члену Быхаўскага валрэўкома і загадчыку прадкома, давялося ўдзельнічаць у рэквізіцыі жывёлы і хлебапрадуктаў для Чырвонай Арміі, весці ўлік ураджаю ў насельніцтва воласці. Разам з Ц. І. Сарокіным і іншымі таварышамі ўдзельнічаў у арганізацыі Сарочынскай камуны, у фарміраванні ўзвода асобага прызначэння, камандзірам якога быў П. М. Антонаў. Падраённы падпольны камітэт РКП(б) адыграў важную ролю ў аднаўленні Савецкай улады на Быхаўшчыне, у выхаванні людзей, якія смела пайшлі за бальшавікамі.

З успамінаў Сяргея Паўлавіча Раманава, былога члена Быхаўскага рэўкома

Кастрычніцкая рэвалюцыя застала мяне ў Румыніі. Вайсковая часць, у якой я служыў, была перакінута сюды ў 1916 г. Чуткі аб падзеях на радзіме да нас даходзілі з вялікім спазненнем. Памятаю, у адным румынскім горадзе былі расклеены лозунгі. Адны заклікалі працягваць імперыялістычную вайну да перамогі, другія, бальшавіцкія, патрабавалі міру без

А. Р. Саўчанка.

С. П. Раманаў.

анексіі і кантрыбуцыі, фабрыкі і заводы — рабочым, зямлю — сялянам, уладу — Саветам. Бальшавіцкія лозунгі былі блізкімі сэрцу салдат.

Старая армія развальвалася, салдаты кідалі фронт і прабіраліся з Румыніі дадому. З вялікімі цяжкасцямі ў пачатку 1918 г. дабраўся і я да сваёй вёскі Лазаравічы. Вёска, горад Быхаў і ўсе населеныя пункты на правым беразе Дняпра былі акупіраваны немцамі. Праз некаторы час я даведаўся, што на Быхаўшчыне створана падпольная арганізацыя, цэнтр якой знаходзіўся ў в. Студзёнка. Абмінаючы вёскі, дзе стаялі кайзераўскія войскі, я накіраваўся ў Студзёнку. У камітэце мяне сустрэлі Цімох Сарокін, Яфім Дзем'яновіч, Конан Дзем'яновіч і Пахом Кавалёў. Яны расказвалі аб мэтах і задачах арганізацыі. Мне вызначылі раён для работы, атрымаў літаратуру на нямецкай мове для распаўсюджвання сярод нямецкіх салдат. У выніку работы, праведзенай арганізацыяй, у вёсках Новы Быхаў, Лазаравічы, Чырвоны Бераг, Істопкі, Дзедава, Тайманава, Камарычы і іншых былі створаны ўзброеныя групы.

Пасля ўстанаўлення Савецкай улады ў павеце ўвесь актыў быў накіраваны ў воласці для склікання валасных з'ездаў Саветаў і стварэння валасных органаў Савецкай улады. Мяне паслалі ў Навабыхаўскую воласць. Адначасова стварыў там групу спачуваючых бальшавікам, якая потым стала партыйнай ячэйкай. У гэту групу ўвайшлі тры браты Скобавы — Іван, Канстанцін і Піліп, Пётр Вараб'ёў, Крамачоў і іншыя. Працаваў я ў Быхаве да чэрвеня 1919 года. У гэты час паступіў заклік У. І. Леніна аб мабілізацыі камуністаў і камсамольцаў на фронт, дзе становішча было цяжкім. Нас, камуністаў, мабілізаваў павятовы камітэт партыі. На фронце я знаходзіўся на розных пасадах, камандаваў узводам, ротай і інш. Апрача таго, выконваў грамадскія даручэнні ў палку. Дэмабілізаваўся з Чырвонай Арміі ў канцы снежня 1922 г.

Быховский районный историко-краеведческий музей

З успамінаў Ціхана Яфімавіча Міранцова, былога чырвонагвардзейца

Вясной 1918 г. лінія абароны праходзіла па Дняпры. На правым беразе стаялі белапалякі, а на левым — атрады Чырвонай гвардыі і партызан. Белапалякі спрабавалі прарвацца на левабярэжжа і перарэзаць важную ў стратэгічных адносінах шашу Магілёў—Гомель, але, сустрэўшы ўпартае супраціўленне чырвонагвардзейцаў, адкаціліся назад.

Быхаўскі чырвонагвардзейскі атрад, якім камандаваў Карпаў, абараняў участак ад перакрыжавання дарог каля в. Варанiно і далей уніз па Дняпры. Само перакрыжаванне і падыходы да яго з боку Быхава абараняў заслон, камандаваў якім я. Адзіным магчымым шляхам перапраўкі цераз Дняпро ў час веснавой паводкі былі 2 драўляныя масты, што цераз дамбу звязвалі абодва берагі. У другой палавіне красавіка 1918 г. белапалякі задумалі прарвацца праз масты і перарэзаць шашу. На золаку атрад легіянераў прыкладна ў сто шашак перайшоў галоўны мост на Дняпры і ўступіў на дамбу. Непрыяцеля заўважыў кулямётчык Парфімовіч, які стаяў на варце. 28 байцоў заслону, узброеныя кулямётам «Максім» і вінтоўкамі, падрыхтаваліся да бою. Калі разведчыкі белапалякаў уз'ехалі на абараняемы намі другі мост, мы адкрылі кулямётны і вінтовачны агонь. Разведчыкі былі знішчаны, а галоўныя сілы спешыліся і завязалі бой. Пераканаўшыся, што прабіцца да пароткі шашы ім не ўдасца, белапалякі адступілі. У аперацыі, як высветлілася пасля, яны страцілі 15 чалавек забітымі і 28 былі паранены. Мы страт не мелі. У баі вызначыліся кулямётчык Парфімовіч, Мікіта Новікаў, Акім Кадраў, Ціхан Кірпічэнка, Кірыла Кадраў, Якаў Яцэнка, Рыгор Дзюндзікаў, Яўхім Быкаў, Емяльян Пазнякоў і іншыя.

У маі 1918 г. камандзір атрада Карпаў загадаў разведаць сілы праціўніка ў раёне Быхава. На правы бераг Дняпра мы з Дзімам Міранцовым пераправіліся ноччу. Там прабылі два дні і атрымалі падрабязныя звесткі аб праціўніку. Калі вярталіся назад, узнікла думка прыхапіць з сабой і дзесятак-другі коней праціўніка, якія пасвіліся на лузе непадалёку ад Дняпра. Задумана — зроблена. Коні спачатку ішлі добра, а калі засталося да берага 30—40 крокаў, пачалі разбягацца. Давялося пабегаць, каб не выпусціць здабычу з рук. Дзіма ад беганіны стаміўся і крыху адстаў. Коні ў гэты час супакоіліся і паслухмяна ўвайшлі ў ваду. Яшчэ некалькі хвілін — і мэта будзе ажыццёўлена. А дзе ж Дзіма? Я спыніўся і раптам справа ад сябе пачуў конскі тупат, а потым убачыў белапалякаў, якія з аголенымі шашкамі і нацэленымі рэвальверамі імчалі на нас. «Смерць!» — мільганула ў галаве. Не паспеў як трэба ацаніць абстаноўку, як мяне акружылі коннікі.

— Партызан, бальшавік! — закрычаў афіцэр, размахваючы рэвальверам каля майго твару.

Прыняўшы збянтэжаны выгляд, я гучна, каб і Дзіма пачуў, сказаў: «Паночак, мы вартаўнікі лугу. Нам абшчына паказала ўсіх коней зганяць з лугу». Дзіма пачуў маё словы і дабавіў: «Ад нас, вартаўнікоў, абшчына патрабуе надзейнай аховы лугу, таму і зганяем мы адсюль усіх коней!».

— Абшукаць! — загадаў афіцэр салдату. Той саскочыў з каня. У мяне ў гадзіннікавай кішэні дулам уніз ляжаў браўнінг. Але на вялікае шчасце, салдат нічога не знайшоў. Абшукалі і Дзіму. За яго я не хвалюваўся, зброі пры ім не было. Афіцэр ужо больш спакойна спытаў:

— А дзе ж вашы дакументы?

— Навошта ж вартаўніком дакументы? Жывёлу з лугу можна і без дакументаў сагнаць,— пажартаваў Дзіма.

— Я табе, пся крэў! — крыкнуў афіцэр.— Марш дадому!

Мы толькі гэтага і чакалі. Агледзеліся, калі адбеглі на добрую адлегласць. У некалькіх крокаў ад сябе заўважылі белапаляка. Ён ехаў на кані, а другога каня вёў на павадзе. Некалькі хвілін — і коннік быў зняты. Мы селі на коней — і к Дняпру. Азірнуліся і бачым, што ўслед скачуць некалькі польскіх уланаў. Чакаць нельга. На сярэдзіне Дняпра пачулі рэвальверныя стрэлы. На шчасце, даплылі да другога берага.

Так скончылася наша разведка ў тыл ворага.

У пачатку чэрвеня 1918 г. штаб нашага чырвонагвардзейскага атрада пад камандаваннем Шылава, які змяніў Карпава, сумесна са штабам партызанскага атрада Дзергачова распрацавалі план ліквідацыі групы польскіх акупантаў у вёсцы Лазаравічы. На ліквідацыю ворага было выдзелена каля 70 байцоў-добраахвотнікаў, пераважна жыхароў навакольных вёсак, якія добра ведалі Лазаравічы і маглі прабрацца да праціўніка, як кажуць, без адзінага гуку. Згодна дамоўленасці з мясцовымі жыхарамі, да нашага заслону, які знаходзіўся паміж вёскамі Вець і Абідавічы, у вызначаны час падышло некалькі лодак. Мы пагрузіліся і паплылі на правы бок. Ноч была без адзінай зоркі, на зямлю апусціўся лёгкі туман. Як толькі першыя лодкі дасягнулі правага берага, некалькі байцоў з групы дзергачоўскага атрада былі пасланы ў дазор. Хутка ад іх прыйшла вестка, што недалёка ад берага ў хмызняку імі захоплены ў палон польскі коннік — патрульны. Апошні даў каштоўныя звесткі аб размяшчэнні пастоў польскага каравула і, галоўнае, паведаміў пароль і адказ на яго. Калі ўсе байцы пераправіліся на правы бераг, аператыўная група раздзялілася на асобныя групкі. Перад кожнай была пастаўлена баявая задача.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Да світанку з эскадронам польскай шляхты ў Лазаравічах было пакончана. Што ж датычыцца камандзіра польскіх легіянераў графа Патоцкага (малодшага), то ён быў узяты ў палон. Аднак, калі яго канваіравалі, хацеў збегчы, тут яго і дагнала куля.

У якасці баявых трафеяў мы ўзялі 45 коней з поўнай амуніцыяй, кулямёт, шмат вінтовак, боепрыпасаў і абмундзіраванне. У аперацыі вызначыліся Якім Ігнатавіч Кадраў, Ціхан Якаўлевіч Кірпічэнка, Емяльян Мітрафанавіч Пазнякоў, былы марак Дарафей Цімафеевіч Караленка, Захар Васілевіч Болабаў і іншыя.

З успамінаў Феадосіі Яўсееўны Пятровай (Бычковай), былой падпольшчыцы з в. Трасцівец

Летам 1918 г. пачалі дзейнічаць падпольныя партыйныя арганізацыі ў акупіраваных валасцях Быхаўскага павета. Першая такая група была створана ў в. Студзёнка. Пазней яна была ператворана ў падпольны падраённы камітэт. Рады падпольшчыкаў хутка раслі. Актыўнымі байцамі сталі Цімафей Жыхараў, Якаў Рашэтнікаў, Васіль Лагуцёнак, Андрэй Радзькоў, Сяргей Раманаў, Конан Дзем'яновіч, Навум Француз, Марк Сарокін, Дзмітрый Антонаў і іншыя.

Партыйны камітэт і групы разгарнулі арганізацыйную і палітмасавую работу ў акупіраваных вёсках. Ствараліся новыя ячэйкі і баявыя групы, з якіх фарміраваліся партызанскія атрады. Расла сувязь з працоўнымі масамі.

Перад падпольным камітэтам, у кіруючае ядро якога ўваходзіла і я, ставілася задача расцаўсюджвання сярод салдат акупацыйнай арміі газет на нямецкай мове з рэвалюцыйнымі заклікамі, складанне і распаўсюджванне адозваў да сялян, дастаўка зброі партызанам і падпольшчыкам, падрыхтоўка іх да барацьбы з чужаземцамі. Газеты мы атрымлівалі з Смаленска, дзе знаходзіўся тады выканаўчы камітэт Заходняй вобласці і штаб фронту. А вось адозвы і лістоўкі друкаваліся падпольна ў Быхаўскай друкарні.

Цяжэй за ўсё было дастаўляць зброю. Рызыка вялікая, але дзякуючы падтрымцы сялян вялася гэта работа паспяхова. Аднойчы яе давялося выконваць Пахому Кавалёву і мне. На фурманцы мы пераехалі Дняпро і спыніліся каля Лутаўскай грывы. Сюды павінны былі прывезці зброю і абутак для партызан таварышы, якія прынялі эстафету ад пасланцаў Смаленска. Дачакаліся іх. Пераклалі ўсё ў сваю фурманку, замаскіравалі сенам, рушылі да моста, які меў двайную ахову: на левым беразе — нашы, на правым — нямецкі вартавы. Пахом пайшоў па месце наперад і затаіўся за вуглом, каб у выпадку, калі вартавы затрымае фурманку, зняць яго і гнаць каня назад за Дняпро. А мая задача — не разгубіцца, захаваць спакой на твары, не даць западозрыць сябе.

— Куды едзеш? — спытаў вартавы.

— Дамоў!

Ф. Я. Пятрова (Бычкова).

Ён махнуў рукой — праязджай.

У другі раз, калі трэба было перавезці гранаты і кулямёты, нам дапамаглі макранскія падпольшчыкі: пераправілі зброю цераз Дняпро на чаўнах.

Аднойчы члены камітэта сабраліся ў нашай хаце. Засядзеліся да ночы — пісалі адозву да сялян. Мой бацька быў за вартавога. Скончыўшы справу, Сарокін і Кавалёў панеслі тэкст у Быхаў, каб надрукаваць, Антонаў і Жыхараў рушылі дамоў. Усё быццам бы было спакойна. А ўсталі раніцай — на двары засада: немцы з кулямётамі. Тыдзень нікога не выпускалі з двара. Добра, што да нас у той час ніхто не прыходзіў. Так ворагі і пайшлі, нічога не дабіўшыся.

На ўсё жыццё запомніўся такі выпадак. Была цёмная ноч. На небе — ні зорачкі. Цішыня, быццам усё вымерла. Нясу адозву да сялян і газеты для нямецкіх салдат. Падыходжу да вёскі Сушчоў. Чую з боку рова нейкі плач і стогн, раздзіраючы душу. Кінулася туды. Гляджу — жанчына схілілася над трупам. І раптам пазнаю Малахаву. Маці пяцярых дзяцей. Яе муж памёр гады за два перад гэтым. Дзеці — малы малога менш. Старэйшаму шаснаццаць. Жабравалі. Харчаваліся тым, што людзі дадуць. Старэйшы хлапец зайшоў да намешчыка — выгналі. У істопцы схапіў буханку хлеба і наўцёкі. Пан заявіў немцам. А тыя без суда і следства расстралялі хлопца і кінулі ў роў. Настрой у мяне быў кепскі, але заданне выканаць. Прайшла па прыціхлай вёсцы, расклеіла адозвы, газеты так і панесла з сабой. Назаўтра зноў пайшла ў Сушчоў. Бачу, сяляне чытаюць адозву, даведалася ад іх, у каго нямецкія салдаты начуюць, і падкінула туды газеты.

Калі пад націскам Чырвонай Арміі і партызан немцы паспешліва пакідалі акупіраваныя раёны, імкнуліся вывезці ўсё, што толькі можна. Абоз з нарабаваным адправілі акупанты і з Быхава. Наўздагон ім рэўком тэрмінова накіраваў узброены атрад. Затрымалі абоз каля Лубянкі. Усё выгрузілі ў лесе, а потым перавезлі ў Быхаў.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Пасля выгнання акупантаў улада ў горадзе перайшла ў рукі Быхаўскага павятовага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта, створанага з прадстаўнікоў павятовай улады, што знаходзілася ў неакупіраваным Прапойску (цяпер Слаўгарад) і падпольнага падраённага камітэта. Партактыў размясціўся ў будынку былой валасной управы. Па загаду рэўкома быў устаноўлены каменданцкі час. Назначылі патрулёў — два чалавекі з атрада і адзін з актыву. Актывісты жылі камунай.

Такім мне запомніўся першы крок да новага жыцця.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАЗЕТЫ АБ БАРАЦЬБЕ СЯЛЯН БЫХАЎСКАГА ПАВЕТА З ГЕРМАНСКІМІ АКУПАНТАМІ І МЕРАПРЫЕМСТВАХ ПА АДНАЎЛЕННЮ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ Ў ПАВЕЦЕ

Под властью поляков и немцев. Террор. Контрибуция и обложение. Восстание крестьян. Очищение левой стороны Днепра. Соединенный уезд. Расстроенное хозяйство. Уцелевшее добро. Борьба со спекуляцией.

Территория нашего Быховского у. с начала января и до половины марта переходила два раза к полякам и немцам. Длительное хозяйничанье польских легионов и немецких банд совершенно расстроило хозяйственную и политическую жизнь уезда и привело к полнейшему обнищанию.

Все ценное, как бывших помещичьих имений, так и крестьянских хозяйств, главным образом продовольствие и фураж, было увезено польскими легионерами. С помощью помещиков и «социал-предателей», до покорения края прикрывавшихся социализмом, прочно утвердившаяся в уезде Советская власть была разогнана: советские и партийные деятели (большевики и левые эсеры) арестовывались и подвергались смертным казням, жестоким избиениям шомполами, приговаривались временно-полевыми судами к долгосрочной каторге и тюремным заключениям. По отношению к остальному трудовому населению был установлен страшный террор: расстреливались и сжигались целиком отдельные селения с людьми независимо от пола и возраста и их имуществом. Царили поголовное избиение и непомерные обложения. На крестьянское население была наложена контрибуция. В течение трех дней каждая волость обязана была внести польским властям под страхом избиения, двойного обложения и штрафа в 5 тыс. рублей — 5 тыс. п. ржи, 3 тыс. п. овса, 1 тыс. п. ячменя, 4 тыс. п. гречихи, 5 тыс. п. картофеля, 1 тыс. п. сена, 4 тыс. штук яиц, а также представить 7 лошадей, 40 коров и 3 гуся. Свиное сало совершенно отнималось. Кроме того, установился налог на окна, двери, кур, собак, кошек и прочий домашний скот. Введена была барщина: крестьяне в восстановленных помещичьих имениях должны были бесплатно два дня в неделю выполнять хозяйственные работы.

На защиту от польского и немецкого хозяйничанья и гнета возмущенное крестьянское население поднялось поголовно. Навстречу наступавшим польским регулярным отрядам выступило не только взрослое население, но даже дети, наспех формировались партизанские отряды, из соседних неоккупированных уездов прибыли отряды Красной Армии. И наконец к началу апреля по левую сторону р. Днепра половина Быховского и Рогачевского у. была очищена от непрошеных гостей, правый же берег реки остался и до настоящего времени оккупированным.

Немцами польские легионы разоружены, но установившиеся от начала оккупации вражеские порядки там остались неизменными и по сие время. Исстрадавшееся оккупированное население в любой час готово подняться и выступить на защиту своих попранных прав и ждет не дождется прихода на помощь Красной Армии изнутри республики.

Освободившись от насильников, крестьянское население левого берега Днепра, 10 волостей Быховского и Рогачевского у. образовало у себя один соединенный уезд, именуя его Быховским, и 26 апреля в спешном порядке сконструировало уездный Совет крестьянских, рабочих и солдатских депутатов с установлением административного центра в м. Пропойске.

Приняв власть в соединенном уезде и ведя беспощадную борьбу с контрреволюционными элементами, самочинными реквизициями, конфискациями и грабежами, Совет стал приводить расстроенное хозяйство в порядок, налаживать политический строй и подводить итоги наличности всего того, что осталось после произвольного хозяйничанья немецко-польских банд и разбойничьих шаек. Хаос, неразбериха царствовали повсюду: как хищные вороны, выползали контрреволюционеры и вносили смуту и разлад между населением и партизанскими отрядами, восстанавливая как тех, так и других против Советов и Советского правительства.

В первое время строительства, в трудные дни смуты, разрухи и разложения в насе-

Быховский районный историко-краевед. Мемориальный музей

лении нам, немногим защитникам революции и ее завоеваний, принявшим власть в свои руки, некогда было думать о материальном положении края, а потому все силы были направлены главным образом к восстановлению революционных завоеваний и советского строя.

Наладив с этой стороны жизнь уезда созданием волостных Советов и затем подведя итоги всему уцелевшему от разграбления народному имуществу, Советы нашли, что в уезде не все еще расхищено. Оказалось уцелевшим до 15 тыс. п. льняного семени и до 12 тыс. п. пеньки. Часть этого товара, закупленного спекулянтами, но вовремя задержанного Советами, не имея на месте сбыта, подвергается порче; местные же торговцы порываются вывезти его за пределы демаркационной линии и для сбыта в Германию, соблазняя население обещаниями дать ему взамен сельскохозяйственные орудия и машины и другие предметы массового потребления, которых в крае полное отсутствие.

Имея нужду в этих предметах, население склонно привести в исполнение предложение спекулянтов, и только несогласие и решительное запрещение уездного Совета на время остановило сбыт означенного сырья за пределы республики. Наряду с запрещением сбыта пеньки в пределы Германии Совет находит целесообразным вывоз их в центр республики.

Известия исполнительного комитета Советов Западной области и Смоленского Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов. 1918. 25 авг.

Бой за станцыю Тошчыца

З успамінаў Філімона Платонавіча Кулікова, былога чырвонагвардзейца

Вясной 1917 г. вярнуўся я з германскага фронту ў свае родныя Лудчыцы з Георгіеўскім крыжам і двума цяжкімі раненнямі. Разам з аднавяскоўцамі радаваўся Кастрычніцкай рэвалюцыі, дзяліў зямлю і маёмасць мясцовага пана Есмана. Але нядоўгай была наша радасць. Пад аховай мяцежных легіянераў польскага генерала Доўбар-Мусніцкага вярнуўся ў маёнтак пан. Але мы не збіраліся проста так аддаць заваяванае нашай крывёю і потам. Стварылі чырвонагвардзейскі атрад. На дапамогу нам прыйшлі піцерскія рабочыя-чырвонагвардзейцы, рэвалюцыйныя маракі і латышскія чырвоныя стралкі. Піцерскім атрадам камандаваў наш зямляк з Таймановa Мікалай Міхайлавіч Сакалоў. Атрад яго на цягунцы прыбыў на 15-ы раз'езд. Група чырвонагвардзейцаў была паслана ў Лудчыцы за данясеннем. У хаце Аляксея Емяльянавіча Савіцкага прайшоў сход і запіс добраахвотнікаў. Было раздадзена 52 вінтоўкі і каля 6 тысяч патронаў. Камандзірам новага атрада стаў Трыфан Лявонцьевіч Нікіцін. Мясцовыя сяляне ўліліся ў атрад Сакалова. Баявое хрышчэнне мы прынялі ля станцыі Тошчыца. Станцыя некалькі разоў пераходзіла з рук у рукі, але ў рэшце рэшт перамога засталася за намі, легіянераў прагналі пад Жлобін. Газета «Советская правда» пісала тады, у нумары за 31 студзеня 1918 г., аб гэтых баях: «Тошчыца занята рэвалюцыйнымі войскамі. Жорсткі бой ідзе ля станцыі Жлобін...». Нашы атрады пазней уліліся ў 152-і стралковы полк 17-й дывізіі Чырвонай Арміі. У складзе палка прыйшлося мне прайсці яшчэ нямала кіламетраў франтавымі дарогамі.

Дрэвы Свабоды

З успамінаў А. Р. Хрушчова, удзельніка грамадзянскай вайны

У Быхаве на перакрыжаванні вуліц Савецкай і Пралетарскай у скверыку растуць чатыры ліпы, якія маюць сваю гісторыю.

У студзені 1918 года група салдат з 47 чалавек, у ёй быў і я, накіравалася з Паўднёва-Заходняга фронту на Беларусь. Праводзячы нас у дарогу, прадстаўнік палкавога камітэта салдацкіх дэпутатаў Андрэеў расказаў аб становішчы ў краіне і параіў коней і зброю не здаваць: «Яны вам яшчэ спатрэбяцца для абароны заваёў рэвалюцыі». У пачатку лютага 1918 года мы былі ўжо каля станцыі Тошчыца. Там нас сустрэў раз'езд польскіх легіянераў, які значна пераўзыходзіў нашу групу па сілах. Першае, што яны запатрабавалі,— здаць коней і зброю. Зразумела, мы адмовіліся і прынялі няроўны бой. Акупанты адцяснілі нас да вёскі Віляхаўка. Тут нам на дапамогу прыйшлі чырвонагвардзейцы з атрада Спірыдона Карпавіча Дзергачова, і мы разам спынілі легіянераў, а потым і адагналі іх. Спірыдон Карпавіч загадаў нам перабірацца цераз Дняпро. У той час у вёсцы Ніканавічы стаяў конны атрад Карпава. Дзергачоў заняў вёску Следзюкі. Наша конная група, якую папоўнілі

Быховский районный историко-краеведческий музей

А. Р. Хрушчоў.

С. Л. Сарокін.

мясцовыя добраахвотнікі, стала самастойным атрадам. Камандзірам мы выбралі Мельнікава.

У атрадзе Карпава я сустрэў аднавяскоўцаў са Студзёнкі. Ад іх даведаўся, што з Петраграда прыехалі рэвалюцыянеры Цімафей Іванавіч Сарокін, Цімафей Васілевіч Сазонаў, Якаў Савельевіч Сівакоў, Андрэй Герасімавіч Сівакоў. Нашы атрады, якія былі размешчаны на левабярэжжы Дняпра, вялі з польскімі акупантамі жорсткую барацьбу.

Летам з атрада мяне накіравалі ў Студзёнку, дзе арганізоўваўся падраённы падпольны паўстанцкі камітэт. Сустрэўся з Цімафеем Іванавічам Сарокіным, перадаў яму звесткі, расказаў аб дзейнасці чырвонагвардзейскіх атрадаў і задачах, якія перад ім пастаўлены. У пачатку жніўня ў будане на сенажаці адбылася партыйная канферэнцыя падпольных арганізацый акупіраванай часткі Быхаўскага павета. Быў створаны падпольны падраённы камітэт. Члены камітэта разгарнулі актыўную работу сярод насельніцтва. На маю долю выпала дастаўка і распаўсюджанне бальшавіцкіх лістовак і літаратуры на рускай і нямецкай мовах. Цімафей Іванавіч Сарокін займаўся фарміраваннем паўстанцкіх партызанскіх атрадаў. У хуткім часе пад рэвалюцыйны сцяг стала больш за 700 партызан, якія наносілі адчувальныя ўдары па ворагу, не дазвалялі немцам рабаваць жыхароў вёскі, забіраць у Германію жывёлу.

Работа, якую праводзіў падпольны партыйны камітэт сярод нямецкіх войск, прынесла поспех. Салдаты адмаўляліся выконваць загады сваіх афіцэраў, у войсках пачалося брадзяжнічанне. У лістападзе 1918 года ў Германіі адбылася рэвалюцыя. Мы вырашылі выкарыстаць зручны момант і заняць Быхаў. Пытанне было абмеркавана на сумесным пасяджэнні павятовага рэвалюцыйнага камітэта, які знаходзіўся ў Прапойску (цяпер Слаўгарад), і падпольнага падраённага партыйнага камітэта. У ноч на 9 лістапада 1918 года паўстанцкія атрады, якія знаходзіліся ў розных населеных пунктах, былі сабраны ў вёску Студзёнка і раніцай са зброяй у руках рушылі ў Быхаў. Упарадзе партызаны неслі на двух коп'ях чырвоны сцяг з надпісам: «Быхаўскі падраённы камітэт Камуністычнай партыі». Над калонай бадзёра гучала песня:

Смело, товарищи, в ногу,
Духом окрепнем в борьбе...

У горад атрад увайшоў па Сялецкай вуліцы (цяпер Савецкая). Тут нас сустрэлі прадстаўнікі павятовага рэвалюцыйнага камітэта, якія прыбылі разам з узброеным атрадам з Прапойска. У іх таксама быў двухкап'ёвы чырвоны сцяг з надпісам. Сцяганосцы сталі насупраць адзін аднаго. Пасля заканчэння мітынгу ў тых месцах, дзе стаялі коп'і сцягоў, былі пасаджаны чатыры ліпкі, якія былі названы дрэвамі Свабоды[1].

Незабыўныя сустрэчы

З успамінаў Сяргея Лаўрэнцьевіча Сарокіна, члена КПСС з 1918 г., былога сакратара Быхаўскага павятовага камітэта РКП(б), дэлегата VI Усерасійскага Надзвычайнага з'езда Саветаў, I з'езда Камуністычнай партыі Беларусі

Восенню 1918 г. мне выпала вялікае шчасце быць дэлегатам VI Усерасійскага Надзвычайнага з'езда Саветаў ад Быхаўскага павета. Тады ўпершыню я бачыў Уладзіміра Ільіча Леніна і чуў чатыры яго палымяныя прамовы.

6 лістапада 1918 г. Вялікі тэатр запоўнілі дэлегаты. Адкрыў з'езд Я. М. Свярдлоў. Па першым пытанні «Аб гадавіне рэвалюцыі» Якаў Міхайлавіч даў слова таварышу Леніну. Узрыў апладысментаў, усе ўстаюць. Уладзімір Ільіч хутка ідзе да трыбуны. З-за новай буры авацый і воклічаў ён доўга не можа пачаць свой даклад. Ільіч паказвае на гадзіннік — час дарагі.

Я ўпершыню бачу Леніна і, затаіўшы дыханне, слухаю простыя, ясныя, мудрыя, захапляючыя і пранікнёныя ленінскія словы аб пройдзеным за год шляху і аб тым, што наперадзе яшчэ вялікія цяжкасці і трэба падрыхтавацца і напружыць усе сілы для адпору міжнароднаму імперыялізму.

Другую прамову правадыра рэвалюцыі разам з дэлегатамі з'езда Саветаў слухаў у дзень пер-

[1] У 1987 г. на плошчы, дзе адбываўся мітынг і якая зараз носіць назву Савецкая, устаноўлены помнік барацьбітам за Савецкую ўладу на Быхаўшчыне.

Быховский районный историко-краеведческий музей

шай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Уладзімір Ільіч гаварыў з трыбуны на Чырвонай плошчы і заклікаў удзельнікаў шматтысячнай дэманстрацыі ўзмацняць барацьбу за ўладу Саветаў. У той жа дзень Ільіч выступіў з кароткай і захапляючай прамовай на шматтысячным мітынгу пры адкрыцці помніка Марксу і Энгельсу. Назаўтра ў зале пасяджэнняў з'езда Саветаў мне пашчасціла ў чацвёрты раз слухаць Леніна. Ён выступаў з прамовай аб міжнародным становішчы. Кожны раз гаварыў ён па-новаму, без паўтарэнняў, ярка і пераканаўча. Яго погляд увесь час быў накіраваны на слухачоў, ён літаральна авалодваў іх увагай і як бы гутарыў з імі.

У дні работы з'езда Ленін увесь час прысутнічаў на пасяджэннях, уважліва слухаў дакладчыкаў па іншых пытаннях і выступаючых. У перапынках паміж пасяджэннямі У. І. Ленін быў сярод дэлегатаў з'езда, па-сяброўску і задушэўна гутарыў з імі. Неяк падышоў і я да групы дэлегатаў, каб паслухаць, аб чым гаворыць з імі Ільіч. І тут нечакана ён звярнуўся да мяне з пытаннем:

— А вы адкуль, таварыш?

— Дэлегат ад Быхаўскага павета Магілёўскай губерні,— адказваю.

— З Быхава? — ажывіўся Ільіч.— Дык горад жа акупіраваны немцамі.

— Так, Уладзімір Ільіч,— пацвердзіў я і тут жа растлумачыў, што з палавіны Быхаўскага павета, з левабярэжжа Дняпра выгналі захопнікаў, стварылі Быхаўскі павятовы камітэт РКП(б), а я — сакратар гэтага камітэта. У вызваленай мясцовасці ўстанавілі Савецкую ўладу. Паколькі Быхаў у руках ворагаў, то Быхаўскі павятовы выканком знаходзіцца пакуль у мястэчку Прапойск.

Ільіч сказаў на гэта неяк смела і падбадзёрліва: «Значыць, вы аб'явілі права Савецкай улады на г. Быхаў і ўвесь павет. Вось гэта правільна!»

Вярнуўшыся з Масквы, я расказваў сваім таварышам аб вынніках работы з'езда Саветаў, аб мудрых і прарочых словах правадыра рэвалюцыі. У другой дэкадзе лістапада 1918 г. акупіраваная нямецкімі войскамі частка Быхаўскага павета была вызвалена. 10 студзеня 1919 г. ў Быхаве адбыўся першы Быхаўскі агульнапавятовы з'езд Саветаў. Ганаровым старшынёй з'езда мы аднадушна выбралі таварыша Уладзіміра Ільіча Леніна.

* * *

Канец 1918 г. Доўга і цяжка дабіраўся я да Смаленска ў брудных цяплушках, у ледзяных тамбурах перапоўненых вагонаў. Там, у завейным Смаленску, у халоднай няўтульнай зале з яркачырвонымі плакатамі пачала работу 6-я Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РКП(б), якая абвясціла сябе потым першым з'ездам Камуністычнай партыі Беларусі. Памятаю няспынную, акрыляючую радасць і буру апладысментаў, калі было абвешчана: «З цяперашняга дня Беларусь — Савецкая рэспубліка — становіцца рэспублікай працоўнага народа, работных, сялянскай беднаты і чырвонаармейцаў Беларусі». З'езд выбраў Цэнтральнае Бюро КП(б)Б. Тады ж быў утвораны і Часовы рэвалюцыйна-сялянскі ўрад Беларусі. У першы дзень 1919 года мы раз'язджаліся са Смаленска. Дома нас чакалі вялікія неадкладныя справы, цяжкая барацьба. Маімі сябрамі па справе былі надзвычайныя людзі, смелыя, мужныя рэвалюцыянеры — балтыйскі марак Аляксандр Шэкаў, Ілья Феакцістаў, Раман Нікіцін, Кірыл Манжураў, Пётр Лагуцёнак, Аляксей Старасценка. Усе яны толькі нядаўна вярнуліся з фронту, усе былі перапоўнены жаданнем перабудаваць жыццё, разграміць контррэвалюцыянераў і інтэрвентаў. Па вёсках і хутарах прытаіліся і хавалі сваю злосць супраць народнай улады кулакі і іншыя контррэвалюцыйныя элементы. Праз два гады яны падымуць паўстанне і са звярынай жорсткасцю расправяцца з бальшавікамі і актывістамі Савецкай улады. У той час загінуць страшнай смерцю расстраляныя, распятыя, пасечаныя на кавалкі мае сябры Ілья Феакцістаў, Раман Нікіцін, Аляксей Старасценка. А ў тыя напружаныя, кіпучыя дні 1918 — пачатку 1919 г. мы разумелі, што мала абвясціць Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку. Трэба было ўмацаваць яе, адстаяць ад ворагаў, вырваць з учэпістых лап невуцтва, адсталасці, галечы. Адной з першачарговых задач нашага павяткома было ўмацаванне і папаўненне Чырвонай Арміі. Вялікія цяжкасці даводзілася нам пераадольваць. Але і вялікая энергія была ў нашых сэрцах, сэрцах беларускіх камуністаў.

ЗАГАД № 1 БЫХАЎСКАГА ПАВЯТОВАГА ВАЕННА-РЭВАЛЮЦЫЙНАГА КАМІТЭТА

5 лістапада 1918 г.

1. На основании постановления Могилевского губернского воепревкома Быховский уездный военно-революционный комитет в составе тт. Шекова, Логутенка, Ковалева, С. Сорокина, Вераксо, Феактистова, М. Сорокина, Романова, Т. Сорокина, Е. Сорокина, Демьянова и Н. Француза объявляет себя временно (до созыва уездного съезда Советов) верховной властью уезда.

2. Все распоряжения и декреты центральной и местных советских властей объявляются законом, неисполнение которых влечет за собой предание военно-революционному суду вплоть до расстрела.

Быховский районный историко-краеведческий музей

3. Уезд объявляется на военном положении. Гуляние разрешается до 18 часов (до 6 часов вечера). После означенного времени появляющиеся на улицах будут арестовываться и подвергаться штрафу.

Торговля как на рынке, так и в закрытых помещениях разрешается с 8 до 16 часов (до 4 час. вечера).

4. Торговля спиртными напитками безусловно воспрещается, тайное винокурение карается расстрелом.

5. Собрания без разрешения военревкома воспрещаются.

6. Всякие попытки контрреволюционных банд к выступлению, откуда бы они ни исходили, будут подавляться в корне.

7. Обыски, аресты и реквизиции производятся только по ордерам военревкома, всякие самочинные будут караться расстрелом.

8. В течение трех дней со дня опубликования сего приказа сдать всякое оружие и вещи как-то: пулеметы, пулеметные ленты, бомбометы, бомбы, винтовки, патроны, шашки, револьверы, бинокли и седла военного образца волостным и уездным военревкомам...

Настоящий приказ входит в силу со дня его опубликования.

Быховский уездный военно-революционный комитет.

Фотакопія загада захоўваецца ў Быхаўскім гісторыка-краязнаўчым музеі.

ТЭЛЕГРАМА БЫХАЎСКАГА ПАВЯТОВАГА КАМІТЭТА РКП(б) У ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНІ АБЛАСНЫ КАМІТЭТ ПАРТЫІ АБ ПАРАДКУ АБ'ЯДНАННЯ З НЕЛЕГАЛЬНАЙ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫЯЙ, СТВОРАНАЙ НА АКУПІРАВАНАЙ ТЭРЫТОРЫІ ПАВЕТА

30 лістапада 1918 г.

Как вести работу в оккупированной местности, где появилась называющая себя нелегальной партия коммунистов-большевиков на почве повстанческого движения, у которых даже теперь нет партийных билетов? Кто главой должен быть: или комитет Быховской уездной организации, или только что сорганизовавшийся нелегальный комитет? До созыва уездной конференции можно ли без партийных билетов принимать в рядовые члены партии по рекомендации только что создавшегося комитета, куда входят тоже не состоявшие раньше в партии, или они все должны пройти стаж и записаться сначала в сочувствующие? Можно ли пойти на компромисс с тем, чтобы влить в комитет трех из нелегальной и переизбрать председателя комитета без его участия и ведома? Адрес ответа: Военкомиссариат.

Секретарь Быховской уездной организации
Сергей Сорокин.

ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 59, воп. 1, сп. 27, лл. 10—11. Тэлеграфная стужка.

ТЭЛЕГРАМА ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯГА АБЛАСНОГА КАМІТЭТА РКП(б) БЫХАЎСКАМУ ПАВЯТОВАМУ КАМІТЭТУ ПАРТЫІ АБ РЭГІСТРАЦЫІ ЧЛЕНАЎ НЕЛЕГАЛЬНАЙ ПАРТЫЙНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ І СКЛІКАННІ ПАВЯТОВАЙ ПАРТЫЙНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ

2 снежня 1918 г.

Может существовать только одна коммунистическая организация во главе с Быховским уездным комитетом РКП(б). Состоявших в нелегальной организации регистрируйте по рекомендации комитета, после чего созовите уездную конференцию для перевыборов комитета. Информируйте о ходе работ.

Секретарь ОК В. Кнорин.

ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 59, воп. 1, сп. 27, л. 12. Арыгінал.

СА СПРАВАЗДАЧЫ БЫХАЎСКАЙ ПАВЯТОВАЙ КАМІСІІ ПА АКАЗАННІ ДАПАМОГІ СЕМ'ЯМ ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ

С июня месяца 1919 года согласно предложению губернского отдела при уездном земельном отделе организована уездная комиссия по оказанию помощи семьям красноармейцев. Председателем каковой комиссии назначен заведующий уземотделом. Цель и задачи означенной комиссии — оказывать помощь семьям красноармейцев: деньгами,

Быховский районный историко-краеведческий музей

семенами, живым и мертвым инвентарем, а также в необходимых случаях и рабочей силой...

За все время существования уездной комиссией выдано пособий на сумму 164 100 руб. по Городищенской волости и роздано семьям красноармейцев 26 лошадей, кроме того выдано на обсеменение: пшеницы 230 пудов 2 ф., проса 244 пуд. 15 ф., гречихи 86 пуд. 10 ф., плугов 292, кос 2605, брусков к ним 3200 и серпов 310, соломорезок 10, веялок 2, сеялок 6 и борон 16, и успешно идет работа по сбору сведений на предмет удовлетворения всех красноармейцев уезда согласно предписаниям и инструкциям, данным из центра.

К 1 ноября 1919 года зарегистрировано всего семей красноармейцев 334, каковым семействам и необходимо оказать пособие...

ДА Магілёўскай вобласці, ф. 83, воп. 1, сп. 31, л. 206.

ДАКЛАД АБ ДЗЕЙНАСЦІ БЫХАЎСКАГА ПАВЯТОВАГА ЗЯМЕЛЬНАГА АДДЗЕЛА ГОМЕЛЬСКАЙ ГУБЕРНІ

Не пазней 8 ліпеня 1919 г.[1]

В зимний период 1918—1919 гг. уездным земельным отделом было обращено серьезное внимание на организацию коллективных хозяйств, не имея при том в своем распоряжении ни одного инструктора до марта месяца сего года. Вся эта работа лежала всецело на коллегии, которой пришлось сделать массовые выезды по деревням с целью агитации и организации коллективов. Посредством усиленной агитационной работы среди массы граждан, которая вышла только что из-под оккупации немцев и которой коммунистическая идея еще не известна, коллегии все-таки удалось организовать и зарегистрировать четыре коммуны и две артели, из коих одна коммуна и две артели распались, а три коммуны работают и можно смело сказать, что коммуны эти будут примером для тех масс, кои еще не могут согласиться обрабатывать землю общими силами. Нужно отметить, что начало эти коммуны застигли в таком положении: рассадниками коммунальной жизни оказалась одна беднота, не имеющая ни хлеба, ни живого, ни мертвого инвентаря, не говоря о семенных материалах, на покупку каковых явилось полное отсутствие средств. Идя навстречу коммунальным начинаниям, уземотдел напряг все свои силы, дабы поддержать эти коммуны, и в первую очередь было возбуждено ходатайство перед уездпродкомом о снабжении продуктами продовольствия и семенами. Небольшое количество продовольствия и семенной материал были отпущены. Кроме сего, из полученных семян по нарядам из центра выдано всем коммунам по 15 пуд. гречихи, пшеницы Сорочинской коммуне 84 пуда и Болоново-Селецкой 36 пуд., Неаполитанской 24 пуд. Отпущены также коммунам и огородные семена из закупленных заведующим земельным отделом на Украине.

Благодаря энергичной и неустанной работе коллегии и прибывшей в марте месяце сего года Инструкции по организации сельскохозяйственных трудовых коммун и артелей, а также своевременному отпуску средств для Сорочинской коммуны, удалось приобрести 9 лошадей. Что же касается коммун Неаполитанской и Болоново-Селецкой, то у последних ощущается большой недостаток в живом инвентаре.

Большая задача также перед уездным земельным отделом относительно организации советских хозяйств. Членам коллегии по этому вопросу пришлось также сделать массовые выезды на места для ознакомления населения с целями и задачами советских хозяйств, так как население было буквально настроено против, контрреволюционные элементы, при помощи коего и при их гнусной агитации были подожжены некоторые здания, а именно: в Лудчицах сгорел амбар с земледельческими орудиями, принесший убыток около 300 000, и в имении Городок дом, где жил раньше помещик, кроме сего было много захватов земли.

20—21 марта состоялось заседание Быховского всеуездного земельного съезда, на котором были заслушаны вопросы, имеющие весьма важное значение в переживаемое время, а именно об организации в Быховском уезде племенного рассадника, об устройстве при сельских обществах инвентарного запасного фонда, о принятии мер к прекращению заболеваний среди скота, о закупке семян для обсеменения свободных полей, о принятии мер к охране и приведении в порядок изгородей в народных садах, о принятии в ведение земельного отдела мельниц и много др. вопросов.

---

[1] Дата суправаджальнай, даклад не датаваны.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Для приведения в исполнение обсужденных вопросов необходимы денежные средства, о переводе каковых представлено по инстанции своевременно. Не имея в своем распоряжении технических работников, уездному земельному отделу пришлось сравнительно выполнить в натуре план, хотя главным образом был составлен план работ на летний полевой период землемерных работ и вообще коллегии отдела пришлось вести самую усиленную работу по всем отраслям, как по борьбе с самочинными действиями граждан по всякого рода спорам, так главным образом, по самовольным порубкам леса, для чего коллегии зимой приходилось ежедневно совершать массовые выезды, равно как по землеустройству, сельскому хозяйству и др. отраслям при полном отсутствии специальных технических и канцелярских работников, преданных Советской власти, в присутствии только таковых, кои смотрят «из-под палки», не имея никакого желания проявить хотя бы сколько-нибудь своей собственной инициативы.

Вся работа, касающаяся специально технического персонала, так и канцелярии, ложится на тех партийных работников коллегии, на долю коих также упадает партийная работа и которые, ставши во власти от сохи и станка, еще мало знакомы со специально-техническими вопросами.

Принимая во внимание те условия работы уземотдела, в коих ему приходилось работать и дабы впредь работа была бы продуктивнее и успешнее, уземотдел обращается с просьбой дать ему работников с хорошей подготовкой в специально-техническом отношении, а также для постановки дела на имениях, отпустить средства на содержание волостных земотделов и на агрономический персонал, так как помощники агрономов не получают жалованья уже по три месяца, несмотря на то, что сметы на первую половину представлены были еще в ноябре месяце 1918 г. и вторично в январе месяце 1919 г., кредиты не получены и по настоящее время.

Таким образом, все эти работы, которые предполагались коллегии провести, они остались не проведенными. Что же касается статистического отделения, то последнее можно только поставить на должную высоту при наличии средств и при условии присылки центром опытных работников, т. к. последних в уезде нет вовсе.

Проводя идею коммунизма не нужно забывать и то, что пока граждане еще не воспримут этой великой идеи, необходимо провести уравнение с поселковыми расселениями, о чем поступает масса ходатайств, но, не имея тех необходимых точных статистических данных, уземотделу не представляется возможным установить трудовой потребительской нормы в правильном выводе. При таком распределении, какое ведется сейчас, земля не может оставаться, так как культура ее падает с каждым годом, ибо всякий гражданин, получив кусок земли, в первую очередь не старается ее удобрить, а старается только эксплуатировать самым беспощадным образом, и такая эксплуатация земли может привести уже и до того расшатанное наше сельское хозяйство до полнейшего краха.

Также в плане уземотдела лежит первое создание побольше советских хозяйств и другого вида коллективов. От уравнения земли с поселковым разверстанием можно надеяться, что население перейдет скоро к общественной обработке земли, для этой цели, как уже и сказано, нужны специалисты, техники, статисты, землемеры и средства.

Большой и сложной задачей в настоящее время в уземотделе является распределение лугов: в данное время уземотдел лишился тех немногих работников из членов коллегии, которые могли бы принести большую пользу при распределении, т. к. эти работники мобилизованы и вся работа сейчас свалилась на плечи заведующего и одного члена коллегии, которые и без этого перегружены работой, для каковой работы уземотдел просит выслать достаточное количество землемеров на небольшой срок, хотя бы недели на две. Имея в уезде около 1000 дес. садов и принимая во внимание, что, как выяснено волземотделами, все сады необходимо привести в надлежащую исправность, как по их очистке, так равно и по постановке изгороди, на что необходимы денежные средства. Не имея же средств, уземотдел предложил уземпродкому и кооперативам уезда принять народные сады во временное пользование с принятием расходов на приведение садов в образцовый порядок.

Докладывая об этом, уездный земельный отдел не теряет надежды, что центр придет на помощь Быховскому уезду и ассигнует необходимые средства на испрошенные надобности и вышлет необходимых специалистов-работников, с помощью каковых средств и сил уездный земельный отдел станет на высоту своего положения.

Верно: Секретарь, подпись.

ДА Магілёўскай вобласці, ф. 83, воп. 31, лл. 162—163. Копія.

Быховский районный историко-краеведческий музей

ПРАТАКОЛ ПАСЯДЖЭННЯ БЫХАЎСКАГА ПАВЯТОВАГА КАМІТЭТА РКП(б) АБ МАБІЛІЗАЦЫІ КАМУНІСТАЎ НА ФРОНТ

14 кастрычніка 1919 г.

Слушали: 1. Предложение губкома о мобилизации минимума 10 процентов коммунистов.

Постановили: Принимая во внимание, что в первую мобилизацию комитетом мобилизовано вместо пяти процентов пятьдесят процентов (63—31), что в настоящее время в организации насчитывается только 42 человека, постановили мобилизовать лишь 10 процентов из наличного числа.

При обсуждении кандидатов к мобилизации признали возможным мобилизовать следующих товарищей, уход которых не отразится на работе организации и кои принесут максимальную пользу фронту: Якименко Герасима, Савченко Андрея, Феоктистова Илью и Стефаненко Антона.

Ввиду отъезда председателя и секретаря на пленум губкома, выполнение его постановления поручить делопроизводителю укома и военкому.

Председатель ЧК Старостенко.
Члены Кротов, Логутенок.
Секретарь Ковалев.

ПА ІГП пры ЦК КПБ, ф. 8, воп. 1, сп. 24, л. 15. Арыгінал. Рукапіс.

Зямля — сялянам

На тэрыторыі Быхаўскага павета канфіскацыя памешчыцкіх зямель была пачата адразу ж пасля перамогі Кастрычніка. 29 лістапада 1917 г. Магілёўскі ваенна-рэвалюцыйны камітэт выдаў загад аб перадачы ў распараджэнне зямельных камітэтаў памешчыцкіх маёнткаў, указваў на неабходнасць арганізаваць улік жывога і мёртвага інвентару. Быхаўскі зямельны камітэт распачаў вопіс і раздзел маёнткаў. Аднак эсэры, якія вяршылі справы ў зямкоме, па сутнасці праводзілі фіктыўную канфіскацыю, фактычна пакідаючы маёнткі ў руках іх былых уладальнікаў. Працоўнае сялянства Быхаўскага павета рашуча змагалася супраць такой «канфіскацыі». Па патрабаванню сялян Журавіцкі зямельны камітэт пачаў правёў улік і вопіс памешчыцкай маёмасці маёнтка Хатоўня, якая была перададзена новаму ўпраўляючаму са згоды сялян навакольных вёсак. Для аховы маёнтка былі прызначаны два кантралёры.

Канфіскацыя маёнткаў звычайна пачыналася са склікання агульнавясковых сялянскіх сходаў. Сходы стваралі спецыяльныя ўліковыя камісіі, і тыя праводзілі вопіс памешчыцкай маёмасці, вызначалі парадак раздзелу зямлі. Так, сходы прадстаўнікоў вёсак Студзёнка, Гарадзец, Залатва і Дубянка прапанавалі вызначыць у кожнай вёсцы колькасць беззямельных сялян, якіх неабходна ў першую чаргу надзяліць зямлёй з маёнткаў Славінскага і Рубанава. Пры размеркаванні зямлі і ўсіх угоддзяў была ўстаноўлена норма 2,5 дзесяціны на рабочую душу і 1 дзесяціна на нерабочую. Усяго вясной 1918 г. ў Быхаўскім павеце на неакупіраванай тэрыторыі было раздзелена больш як 30 тысяч дзесяцін зямлі.

Адначасова з пытаннем размеркавання зямлі бальшавіцкія арганізацыі займаліся забеспячэннем беднякоў інвентаром. Для вясковай беднаты гэта пытанне было вельмі важным, таму што большасць сялян уласнага інвентару не мела, а значная зноў магла трапіць у кулацкую кабалу.

Каб лепш забяспечыць бядняцкае сялянства інвентаром, у павеце стварылі 10 пракатных і 4 зернеачышчальныя пункты, куды было сабрана 120 сельскагаспадарчых машын і прылад. Пункты абслугоўвалі ў першую чаргу калектыўныя і бядняцкія гаспадаркі. Адначасова пішло размеркаванне жывёлы з панскіх маёнткаў, ствараліся племянныя рассаднікі. У павеце к вясне 1918 г. было арганізавана 5 рассаднікаў. Для правядзення сяўбы бяднейшаму сялянству выдавалася насенне. Былыя панскія маёнткі, што яшчэ нядаўна былі цэнтрамі эксплуатацыі і прыгнечання сялян, ва ўмовах пралетарскай дзяржавы ператвараліся ў апорныя пункты калектыўнага гаспадарання і культурнай рэвалюцыі ў вёсцы. У маёнтках адкрываліся школы, народныя дамы, бібліятэкі.

1918 год быў годам пачатку арганізацыі калектыўных гаспадарак — першых парасткаў сацыялізму. У архіве збярогся пратакол нарады зямельных работнікаў ад 1 верасня 1918 г., дзе запісана рашэнне: «Даручыць павятоваму зямельнаму аддзелу ўвайсці з хадайніцтвам у аддзел земляробства Заходняй Камуны аб камандзіраванні ў павет інструктара-камуніста для арганізацыі ў межах павета камуністычнай гаспадаркі» (Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці, ф. 79, воп. 1, спр. 4, л. 7). Спачатку калектыўныя гаспадаркі ствараліся на левабярэжнай частцы павета, а ў канцы года, пасля выгнання нямецка-польскіх акупантаў, і на правабярэжжы.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Працоўнае сялянства на ўласным вопыце пераконвалася ў неабходнасці пераходу ад дробных гаспадарак да буйной грамадскай вытворчасці. У вёсцы нараджаліся новыя, нябачаныя ў гісторыі грамадства формы гаспадаркі — саўгасы, камуны, арцелі, таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі і іншыя кааператыўныя аб'яднанні сялян. Да правядзення веснавой пасяўной кампаніі 1919 г. ў Быхаўскім павеце рыхтаваліся 12 саўгасаў, арцелей і камун. Гэта сельскагаспадарчая камуна імя К. Лібкнехта ў маёнтку Сарочына (60 працаздольных чалавек, 28 непрацаздольных), Сялец-Балонаўская камуна ў маёнтку Сазановіча (25 працаздольных, 15 непрацаздольных) камуна «Праца» ў маёнтку Неапалітанскім (24 працаздольныя, 11 непрацаздольных), Славянская камуна ў маёнтку Славянка (40 працаздольных, 20 непрацаздольных), Радчынская арцель у маёнтку Радчына, саўгасы ў былых маёнтках Гарадок, Батунь, Лудчыцы, Масток, у Баркалабаўскім манастыры, Грудзінаўцы, Раймундаве. Павятовая камісія па рэгістрацыі камун і арцеляў 17 лютага 1919 г. пастановай зацвердзіла статуты Сарочынскай камуны і Радчынскай сельскагаспадарчай працоўнай арцелі. Крыху пазней былі зацверджаны статуты астатніх калектыўных гаспадарак.

Для ажыццяўлення прынятых рашэнняў павятовы партыйны камітэт паслаў у вёску бальшавікоў-арганізатараў. Вось што запісана ў адным з рашэнняў: «Камандзіраваць у павет інструктара-камуніста для арганізацыі ў межах павета камунальных гаспадарак, так як насельніцтва павета, ідучы насустрач, само не ў сілах іх арганізаваць» (тамсама, ф. 79, воп. 1, стр. 4, л. 7). У Даўгамошскую воласць былі паслапы бальшавікі Іосіф Агапеевіч Марозаў, былы член палкавога камітэта, і Архіп Уласавіч Гваздзёў. Апошні ў 1917 г. з'яўляўся членам Петраградскага Савета. Пасведчанне інструктара па арганізацыі калектыўных форм сельскай гаспадаркі ў Чыгірынскай воласці атрымаў Цімафей Жыхараў, у Навабыхаўскай — загадчык валаснога земаддзела бальшавік Гаўрыла Цярэнцьевіч Куляшоў, у Глухскай і Старабыхаўскай валасцях — член калегіі Быхаўскага павятовага аддзела Цімафей Іванавіч Сарокін, у Гарадзішчанскай, Глухскай валасцях і мястэчку Журавічы — Нічыпар Іваноў.

Арганізацыя, станаўленне і работа калектыўных гаспадарак праходзілі пад увагай павятовага зямельнага аддзела. Улічваючы неабходнасць каардынацыі ўсёй работы пры павятовым земаддзеле, быў створаны камунальны пададдзел, які ўзначалілі Цімафей Іванавіч Сарокін і Аляксандр Мацвеевіч Шылкоў. Пададдзел і яго кіраўнікі праводзілі вялікую арганізацыйную, растлумачальную і агітацыйную работу.

Калектыўныя гаспадаркі зараджаліся і раслі ў жорсткай барацьбе з варожымі элементамі. Але сялян, якія ў калектыўных формах гаспадарання бачылі выйсце з галечы, не палохалі кулацкія вылазкі.

Перад пачаткам палявых работ 1919 г. ў горад Ромны быў накіраваны член калегіі павятовага земаддзела Т. Ф. Цімашкоў, якому было даручана закупіць і даставіць у Быхаўскі павет коней для савецкіх гаспадарак. Для закупкі коней, насення гародніны ў Палтаўскую губерню быў камандзіраваны Ц. І. Сарокін. 25 тысяч рублёў на закупку на Украіне насення было асігнавана Быхаўскаму павятоваму ўпраўляючаму савецкімі гаспадаркамі Н. Н. Буйноўскаму.

Калектыўныя гаспадаркі паспяхова правялі сельскагаспадарчую кампанію, дамагліся добрых

Першыя члены камуны імя Карла Лібкнехта ў вёсцы Сарочына (злева направа): Кузьма Дзем'яновіч, Патап Кірпічэнка, Лазар Кірпічэнка, Піліп Кірпічэнка, Васіль Сазоненка, Аўгуст Дзем'яновіч.

Быховский районный историко-краеведческий музей

вынікаў. Напрыклад, калі ў сялянскіх гаспадарках павета ўраджайнасць збожжавых склала 50 пудоў з дзесяціны, то ў калектыўных — звыш 100 пудоў. Прыклады самаадданай працы ў камунах і арцелях паказвалі камуністы.

У канцы 1919 г. былі створаны працоўная камуна імя Свярдлова ў маёнтку Іскань і працоўная камуна ў маёнтку Рэкта, працоўныя арцелі «Зара» ў в. Кузькавічы, «Араты» ў мястэчку Журавічы, «Прасвета» ў Новым Быхаве, арцелі «Прапойская», «Прамень», «Праца» ў Грудзінаўскай воласці.

Для лепшага кіраўніцтва саўгасамі павета ў лістападзе 1919 г. была створана калегія райсаўгаса, у якую ўвайшлі У. Е. Кавалёў (старшыня), С. А. Мышкевіч (тэхнічны кіраўнік), Нікіцін і Марозаў (члены ад павятовага земаддзёла). Інструктарам па саўгасах была прызначана Ганна Нікіціна. Зямельнаму аддзелу было прапанавана перадаць райсаўгасу ўсе машынапракатныя станцыі і зернеачышчальныя пункты з усёй іх маёмасцю. (Дырэктыва аб стварэнні ў краіне райсаўгасаў падпісана У. І. Леніным.) Акрамя саўгасаў у склад райсаўгаса ўваходзілі Навабыхаўскі, Старабыхаўскі і Грудзінаўскі ўчасткі садоў і 9 савецкіх маёнткаў.

Ажыццяўленне ленінскага Дэкрэта аб зямлі, арганізацыя першых калектыўных гаспадарак далі пачатак будаўніцтву сацыялізму ў вёсцы.

Падарунак Ільічу

З успамінаў Емяльяна Мітрафанавіча Пазнякова, удзельніка грамадзянскай вайны, ураджэнца в. Усходняя

Е. М. Пазнякоў.

Было гэта ў памятным 1918 годзе. Контррэвалюцыйныя сілы белагвардзейцаў і інтэрвентаў рабілі адчайную спробу задушыць Савецкую ўладу. Асабліва небяспечным было становішча на Усходнім фронце. Па закліку партыі 126 кавалерыстаў з 1-га Быхаўскага чырвонагвардзейскага атрэда выказалі жаданне добраахвотна паехаць на Усходні фронт. У жніўні з Чэрыкава нас накіравалі пад Казань, а адтуль — у 2-ю зводную дывізію. Яе фарміраваў беларус У. М. Азін з асобных атрадаў Чырвонай гвардыі і партызан розных нацыянальнасцей: рускіх, украінцаў, беларусаў, латышоў, літоўцаў і інш. Фарміраванне ішло хутка, а вось узбраенне чырвонаармейцаў затрымлівалася. Іжэўскі і Воткінскі зброевыя заводы знаходзіліся ў руках белагвардзейцаў. Іх трэба было як мага хутчэй вызваліць. Такі быў загад Леніна.

У канцы кастрычніка наша дывізія штурмам авалодала вёскай Нечкіна і выйшла да чыгункі Агрыз — Іжэўск. Днём 5 лістапада канаводы кармілі асядланых коней, а мы грэліся каля кастра. Пад'ехаў камандзір эскадрона, наш зямляк Мікіта Ліпскі. У руках ён трымаў лістоўку.

— Усе да мяне! — паклікаў ён усхваляваным голасам.— Атрыман загад Рэўваенсавета...

Сціхла гаменка. Мы слухалі загад, затаіўшы дыханне. «Таварыш Ленін просіць члена Рэўваенсавета т. Гусева, які вярнуўся з Масквы, перадаць,— чытаў Ліпскі,— што да ўрачыстага дня гадавіны рабоча-сялянскай улады ў Расіі ён чакае данясення аб узяцці Іжэўска. Рэўваенсавет упэўнен, што чырвонаармейцы апраўдаюць надзеі таварыша Леніна і дадуць магчымасць паслаць 7 лістапада на ўрачыстае пасяджэнне Усерасійскага з'езда Саветаў экстранную телеграму аб узяцці Іжэўска». Заданне было не з лёгкіх. Вораг намнога пераўзыходзіў нашы сілы, быў добра ўзброены. Але на нашым баку былі вялікая праўда і давер'е Ільіча. У дзень першай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі чырвонаармейцы Жалезнай дывізіі пайшлі ў бой. Нашаму эскадрону было загадана захапіць плаціну і турму. Імклівым ударам кавалерысты выканалі гэту задачу, не далі ворагу магчымасці ўзарваць плаціну і завод зброі, вызвалілі сотні палітзняволеных, а на станцыі захапілі больш двух дзесяткаў вагонаў з ваенным рыштункам, многа палонных. Байцы Жалезнай дывізіі выканалі свой абавязак, парадавалі дарагога Уладзіміра Ільіча сапраўды святочным падарункам — вызваленнем Іжэўска. Тады ж рабочыя завода на вінтоўцы-сувеніры зрабілі надпіс: «Вялікаму пралетарскаму правадыру т. Леніну на памяць аб узяцці Іжэўска ад 2-й Жалезнай дывізіі і Рэвалюцыйнага грамадзянскага Савета Іжэўска. 7.11.1918 г.». Гэта быў асабісты падарунак Ільічу.

Раніцай 8 лістапада кожнаму байцу была ўручана лістоўка-тэлеграма У. І. Леніна, у якой ён віншаваў са святам і перамогай.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Камандзір 152-га Быхаўскага...

Якаў Васілевіч Шэко — кавалер двух ордэнаў Чырвонага Сцяга, герой грамадзянскай вайны — быў асобай легендарнай. Яму споўніўся 21 год, калі пачалася першая сусветная вайна. Малады афіцэр праявіў выдатныя здольнасці камандзіра. У 1917 г. ён меў чын штабс-капітана. У чэрвені 1918 г. Якаў Васілевіч назаўсёды звязаў свой лёс з Чырвонай Арміяй. Ён быў прызначаны памочнікам камандзіра 5-га Быхаўскага палка, а праз некалькі месяцаў камандзірам 152-га стралковага палка 17-й стралковай дывізіі, у які ўліліся быхаўскія чырвонагвардзейскія атрады. Гэта злучэнне вельмі многае зрабіла для абароны Савецкай улады на Беларусі. Полк граміў акупантаў пад Быхавам і Магілёвам, пад Рагачовам і Бабруйскам, пад Калінкавічамі і на поўначы Украіны. Ён разам з іншымі войскамі спыніў прасоўванне пятлюраўцаў да граніц Беларусі. Палкі 17-й стралковай дывізіі вызвалялі Бабруйск і Пясвіж, Мір і Вільню. Хутка чырвоны камандзір Я. В. Шэко быў накіраваны на вучобу, а пасля ў Першую Конную армію як ваенны карэспандэнт. Так ён стаў адным з першых савецкіх ваенных журналістаў. Неўзабаве камандаванне Першай Коннай прызначыла яго камандзірам для асобых даручэнняў Рэўваенсавета арміі, а крыху пазней, начальнікам штаба 6-й кавалерыйскай дывізіі. У крывапралітных баях за Крым вызначыўся і Я. В. Шэко. У загадзе Рэўваенсавета рэспублікі № 182 ад 29.5.1921 пазначана: «Узнагароджваюцца ордэнам Чырвонага Сцяга па 1-й Коннай Арміі... начштаба 6-й кавалерыйскай дывізіі тав. Шэко Якаў Васілевіч за ўзяцце ў 1920 г. на ўрангелеўскім фронце двума пешымі эскадронамі станцыі Завады, дзе былі ўзарваны ўсе пуці і адрэзаны броненаязды праціўніка, чым адначасова было дасягнута і забяспечана значнае ўмацаванне ў агульным становішчы Коннай Арміі».

22.2.1933 г. Рэўваенсавет СССР за выключную храбрасць, мужнасць і ўмелае кіраўніцтва баявымі дзеяннямі ў гады грамадзянскай вайны ордэнам Чырвонага Сцяга ўзнагародзіў групу камандзіраў, сярод іх Я. В. Шэко. Гэта быў яго другі ордэн Чырвонага Сцяга.

Пасля грамадзянскай вайны Якаў Шэко вучыўся ў Акадэміі Генеральнага штаба, скончыў яе і быў прызначаны начальнікам інспекцыі кавалерыі Чырвонай Арміі. Пазней камандаваў 1-й Томскай дывізіяй, быў памочнікам камандзіра 16-й і 20-й стралковых дывізій, а потым памочнікам камандуючага войскамі Маскоўскай ваеннай акругі. Калі Мангольская Народная Рэспубліка пачала ствараць сваю армію, Я. В. Шэко быў накіраваны ў брацкую рэспубліку саветнікам ваеннага міністра. Ён быў узнагароджаны некалькімі вышэйшымі мангольскімі баявымі ордэнамі. У 2-й палавіне 1930-х гадоў Я. В. Шэко знаходзіўся на камандных пасадах у Паўночна-Каўказскай ваеннай акрузе.

У перыяд культу асобы Сталіна быў незаконна рэпрэсіраваны і загінуў у канцы 1930-х гадоў.

М. Ф. Мельнікаў.

Сын рэвалюцыі

У 1917 г. ў родную вёску Новы Быхаў пасля працяглай і нялёгкай флоцкай службы прыехаў Спірыдон Карпавіч Дзергачоў. Было яму 35 гадоў, меў трох сыноў і бацькаву хаціну ў людным мястэчку.

Калі Быхаўскі павет акупіравалі германскія войскі, Дзергачоў арганізаваў з сяляк навакольных вёсак чырвонагвардзейскі атрад. Смелымі налётамі, дзёрзкасцю і згуртаванасцю вылучаўся ён. Страх перад дзергачоўцамі і іх камандзірам-матросам прымусіў акупантаў, што стаялі ў Новым Быхаве, выліць пару бочак дзёгцю на мост цераз Дняпро і спаліць яго дашчэнту. Пазней шматсоценны чырвонагвардзейскі атрад Дзергачова ўліўся ў Чырвоную Армію, стаў касцяком 152-га палка 17-й стралковай дывізіі, а Спірыдон Карпавіч — камісарам палка. У кнізе «Рэвалюцыйныя камітэты БССР (лістапад 1918 г.— ліпень 1920 г.)» (1961) змешчаны дакументы, падпісаныя ваенкомам С. К. Дзергачовым.

У канцы 1920 г. сын прывёз параненага ў ногі Спірыдона Карпавіча дадому. Адляжаўся Дзергачоў, трохі ачуняў. Стаўшы на ногі, з галавой акунуўся ў сялянскія справы. Ён, бядняк з бедняцкоў, прагнуў новага жыцця. Быў Спірыдон Карпавіч надзіва здольным арганізатарам. Першая партыйная ячэйка пры Навабыхаўскім сельсавеце, таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі і крэдытаванню, камбед — ён іх арганізоўваў. Неўзабаве з сям'ёй перабраўся ў в. Вотню. У 1922 г. разам са сваімі паплечнікамі-чырвонагвардзейцамі стварыў камуну. Назву выбралі светлую і гордую — «Пралетарская рэспубліка». Дзергачова выбралі старшынёй. Спірыдон Карпавіч недзе змог раздабыць надзвычай рэдкія для таго часу рэчы — трактар і нафтарухавік, пабудавалі млын, пачалі будаваць лесапільню, сталоўку, сыраварню. Камуна «Пралетарская рэспубліка» праіснавала сем гадоў. Некаторыя з камунараў успаміналі: «І не снілася нам раней такое жыццё, як у камуне. Заможнікамі сталі». Як і заўсёды ў жыцці, сустракалася і смешнае. Той жа Спірыдон

Быховский районный историко-краеведческий музей

Карпавіч, нацэлены на «сусветны камунізм», шумеў па прастаце сваёй душэўнай: «Не абагуліце пчол — прастрэлю ўсе вуллі». А наогул у камуне жылі дружна і даволі заможна для таго часу. У часы калектывізацыі разгарнуўся арганізатарскі талент С. К. Дзергачова. Кажуць, што прамоўца ён быў рэдкі. Мог словам прымусіць слухачоў плакаць, мог кінуць у нястрымны смех. І справа не ў тым, што гаварыў ён «як па пісанаму». Вера ў будучыню, камуністычная перакананасць, яснае ўсведамленне мэт і задач партыі, веданне душы кожнага селяніна — вось чым браў Дзергачоў. Ён заўсёды і ва ўсім быў прыкладам, ніколі нікога не падводзіў: паабяцаў — зробіць, дасць параду — як у заўтрашні дзень зазірне, дапамагаў людзям чым мог, і яго паважалі, верылі яму.

У сваёй камуне стварыць калгас яму было прасцей, там яго падтрымлівалі былыя баявыя сябры. Куды цяжэй у навакольных вёсках. Толькі 12 навабыхаўскіх гаспадарак з 320 аб'ядналіся ў арцель «Чырвоны баец» у 1929 г.— былы партызан Мітрафан Альховік, удава Настасся Петруленка, бацька дзесяці дзяцей Патап Іваноў, настаўнік Барыс Тамашоў, яго калегі Андрэй Голубаў і Сяргей Шутаў, яшчэ некаторыя сем'і. У двары настаўніка Голубава была калгасная ферма з 12 кароў, у двары Яўмена Карпісонава — насенны фонд. Зімовай ноччу гумно з насеннем успыхнула.

Тое, што з такім напружаннем ствараў Дзергачоў і яго сябры-камуністы, іншы раз бурылася раптоўна. У жніўні 1933 агонь праглынуў арцельнае сена. У наступным годзе ахутаўся полымем дом настаўніка Тамашова. Тым жа часам конь прывёз з прастрэленай галавой калгасніка Апанаса Альховіка, пасланага ў Быхаў за насеннем.

Мала спаў тады Дзергачоў. У сцюжу, завею, глухой ноччу хадзіў Спірыдон Карпавіч праз пусты сасоннік у Новы Быхаў і ніякага «чорта» з абрэзам не баяўся. Насіў (па «модзе» тых трывожных гадоў) у кішэні кажушка маўзер страшэннага калібру. Але каб давялося калі страляць, то, напэўна, доўга размотваў бы метровы шнурок-рамяшчык, якім абкручваў тую сваю «артылерыю». Ды перасцярогі жонкі дабрадушна пасмейваўся: «Мяне заб'юць? Эге, колькі такіх Дзергачовых мае Савецкая ўлада!»

Пазней Спірыдон Карпавіч займаў яшчэ некалькі пасад. Але партыйная работа, работа з людзьмі, была і заставалася для яго любімай і асноўнай. Чалавек неабсяжнага аўтарытэту і ўплыву, ён стаў для людзей прыкладам справядлівасці і правільнасці жыцця. А жыў ён сумленна і сціпла, каб не сказаць беднавата — пры ўсёй сваёй значнасці і пашане, якой быў акружаны. Ішлі да яго людзі штодня — хто за парадай, хто за дапамогай, хто проста пагутарыць ці паслухаць разумнага чалавека.

Я. І. Шэко.

С. К. Дзергачоў.

Перад Айчыннай вайной Дзергачоў хварэў: разбалеліся раны. Ды і далёка не малады ўжо быў — шэсць дзесяткаў гадоў пражыў. А калі напалі фашысцкія захопнікі, не верыў стары бальшавік, што далёка прасунуцца яны па нашай зямлі. І толькі калі ўжо зашугаў небасхіл блізкім крывава-пунсовым заравам, узяў Спірыдон Карпавіч падарожны кіёк і самым апошнім з мясцовых камуністаў адправіўся ў горкі шлях.

Не склаў крылы стары сокал. Як яго ў такіх гадах і пры такім здароўі прынялі ў. армію — невядома. Але ваяваў Спірыдон Карпавіч яшчэ некалькі гадоў, абараняў ад фашыстаў сваю родную ўладу літаральна да апошняй кроплі крыві: памёр ён у 1944 г. ў адным са шпіталяў Саратаўскай вобласці ад ран і старых і новых.

Выгадаваў Спірыдон Карпавіч мужнымі і дастойнымі сваіх дзяцей. Два яго сыны-франтавікі — Еўдакім і Фёдар — аддалі жыццё за Радзіму. Загінула, ратуючы баявога таварыша, і дачка-партызанка Жэня. Лёс быў літасцівы толькі да аднаго Івана Спірыдонавіча — старэйшага сына, таксама франтавіка.

Чысты ленінец, заўзяты камуніст — такое можна пачуць пра Дзергачова ў яго родных мясцінах. Людзі з удзячнасцю ўспамінаюць светлага чалавека, які пакінуў за сабой глыбокі жыццёвы след.

І. Патапаў.

СІДАР ІГНАТАВІЧ ГАЎРЫЛЕНКА

Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Нарадзіўся ў 1897 г., жыў у в. Хачынка Быхаўскага р-на. Добраахвотна ўступіў у Чырвоную гвардыю і Чырвоную Армію. Змагаўся з ворагамі Савецкай улады на Украіне. Камандзір узвода 86-га стралковага палка Гаўрыленка вызначыўся ў 1920 годзе ў баях на польскім фронце, калі са сваім узводам разграміў атрад белапалякаў, што прабраўся ў тыл наступаючых савецкіх войск. За

Быховский районный историко-краеведческий музей

С. І. Гаўрыленка.

Дз. Р. Емяльянаў-Елкін.

А. А. Ждан.

Я. У. Індзюкоў.

гэты гераічны ўчынак Гаўрыленка быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Пасля грамадзянскай вайны вярнуўся на радзіму і ўключыўся ў барацьбу за новае, сацыялістычнае жыццё. У пачатку 1930-х гадоў С. І. Гаўрыленка разам з іншымі аднавяскоўцамі стварыў калектыўную гаспадарку імя Галадзеда (старшынёй калгаса быў выбраны С. І. Гаўрыленка). У пачатку Вялікай Айчыннай вайны камандзір запасу старшы лейтэнант С. І. Гаўрыленка на фронце, выходзячы з акружэння, трапіў у фашысцкі палон, адкуль уцёк і пайшоў у партызаны. З 1942 г. ён у 45-м партызанскім атрадзе «За Радзіму». Неаднаразова хадзіў у разведку, удзельнічаў у разгроме варожых гарнізонаў. Загінуў у баі 14 снежня 1942 г. на Браншчыне.

ДЗМІТРЫЙ РАМАНАВІЧ ЕМЯЛЬЯНАЎ-ЕЛКІН

Удзельнік грамадзянскай вайны, барацьбы за Савецкую ўладу. Нарадзіўся ў 1888 г. ў в. Сядзіч Быхаўскага р-на. Член КПСС з 1918 г. З сялян. Рэвалюцыйная біяграфія яго пачалася на крэйсеры «Петрапаўлаўск» Балтыйскага флоту. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. прыехаў на Быхаўшчыну, дзе праводзіў рэвалюцыйную работу сярод сялян павета і салдат шматлікага ў той час Быхаўскага гарнізона, а таксама войск, якія следавалі ў эшалонах на чыгунцы. Напярэдадні 1 Мая 1917 г. па ініцыятыве бальшавікоў М. Л. Рудкоўскага і Дз. Р. Емяльянава-Елкіна ў Быхаве былі разбураны 2 помнікі цару Аляксандру II і вывешаны чырвоныя сцягі. Агітацыя рэвалюцыянераў-бальшавікоў прынесла свой плён: вайсковыя часці гарнізона былі распрапагандаваны, і ўрад Керанскага вывеў іх з Быхава. Калі ў Быхаўскі павет былі ўведзены часці польскай дывізіі з корпуса Доўбар-Мусніцкага, Дз. Р. Емяльянаў-Елкін і іншыя бальшавікі разгарнулі сярод салдат і малодшых афіцэраў растлумачальную работу. Увосень 1917 г. ў Сядзіцкай школе польскія афіцэры праводзілі сход салдат, на які з'явіліся Емяльянаў-Елкін і Рудкоўскі. Салдаты патрабавалі даць слова бальшавікам. Іх выступленні былі сустрэты з вялікай увагай. Сімпаты салдат былі на баку бальшавікоў, таму афіцэры не адважыліся іх адкрыта арыштаваць, а зрабілі засаду, каб забіць іх па дарозе ў Быхаў. Аб гэтым даведалася настаўніца Пабядзінская і паведаміла бальшавікоў-агітатараў аб небяспецы. Пазней Емяльянаў-Елкін — баец матроскага атрада, якім камандаваў П. Я. Дыбенка, удзельнічаў у разгроме контррэвалюцыйнай Стаўкі ў Магілёве, уваходзіў у склад Быхаўскага павятовага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта, змагаўся за ўсталяванне Савецкай улады ў Быхаўскім павеце. У канцы сакавіка 1918 г. пад націскам кайзераўскіх і белапольскіх войск Чырвоная гвардыя вымушана была пакінуць Быхаў. Да гэтага бальшавік Емяльянаў-Елкін і іншыя члены рэўкома арганізавалі падпольныя групы для работы ў тыле ворага, устанавілі месцы явак, прынялі меры, каб са станцыі Быхаў былі выведзены на Оршу паравозы і вагоны, узарвалі чыгуначны мост на рацэ Макранцы. Потым Дз. Р. Емяльянаў-Елкін ваяваў на франтах грамадзянскай вайны, працаваў у органах ВЧК. Памёр у 1965 г.

АЛЯКСАНДР АЛЯКСЕЕВІЧ ЖДАН

Удзельнік грамадзянскай вайны. Нарадзіўся ў 1894 г. ў г. Быхаў. У сакавіку 1919 г. буксірны параход «Кур'ер», на якім А. А. Ждан працаваў старшым машыністам, увайшоў у склад Дняпроўскай ваеннай флатыліі. Ждан удзельнічаў у баях з бандамі пад Трыполлем, Чарнобылем, Чаркасамі. 17.8.1919 г. «Кур'ер» быў адрэзаны ворагам ад асноўных часцей. Камандаванне прыняло рашэнне затапіць бронепараход. А. А. Ждан разам з таварышамі па варожых тылах прабраўся да сваіх і зноў працягваў службу на флоце.

Быховский районный историко-краеведческий музей

1.12.1919 г. прызначаны механікам захопленага ў ворага бронепарахода «Добраахвотнік» (пазней называўся «Пралетарый», кананерская лодка «Згубны»). Вясной 1920 г. ўдзельнічаў у баях супраць флатыліі белапалякаў на Прыпяці, 27.4.1920 г. ў баі лодка загінула. А. А. Ждан выратаваўся і ў складзе пераходнай роты флатыліі працягваў ваяваць. Пасля грамадзянскай вайны працаваў механікам Дняпроўскага параходства на параходах «Пераяслаў», «Кіеў», «Чаркасы» і інш. Памёр у 1959 г. *І. Я. Краўцоў.*

ЯКАЎ УЛЬЯНАВІЧ ІНДЗЮКОЎ

Удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Нарадзіўся ў 1899 г. ў в. Трасцівец Быхаўскага р-на. З сялян. Член КПСС з 1923 г. З 13 гадоў паступіў вучнем у прыватную друкарню і авалодаў прафесіяй наборшчыка. У час 1-й сусветнай вайны ўключыўся ў рэвалюцыйную работу. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі набіраў газету «Известия Быховского ревкома». З 1919 г. ў Чырвонай Арміі, удзельнічаў у баях з войскамі генерала Юдзеніча пад Петраградам, потым на Заходнім фронце супраць белапалякаў, быў паранены. Пасля дэмабілізацыі ў 1922 г. вярнуўся ў Быхаў, адкуль павятовы камітэт партыі накіраваў яго ў Рэчыцкую савецка-партыйную школу. Пасля яе заканчэння працаваў наборшчыкам спачатку ў Рэчыцкай, потым у Гомельскай чыгуначнай друкарнях. У 1930—1940-я гады на савецкай і партыйнай рабоце, у студзені 1940 г. па рашэнню ЦК КПБ накіраваны ў Брэсцкую вобласць сакратаром Высокаўскага райкома партыі па кадрах.

У гады Вялікай Айчыннай вайны Я. У. Індзюкоў на фронце, потым у тыле праціўніка ў Мінскай вобласці, дзе арганізоўваў падпольныя райкомы партыі, удзельнічаў у аперацыях па разгрому гітлераўскіх гарнізонаў. У красавіку 1943 г. Індзюкоў адкліканы ў распараджэнне БШПР. Пасля вайны працаваў першым сакратаром Дзівінскага райкома партыі. У 1947 г. вылучаны кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Памёр Я. У. Індзюкоў 26 верасня 1947 г. пасля цяжкай хваробы.

СЦЯПАН СЦЯПАНАВІЧ КАНДРАЦЬЕЎ

Удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны на Беларусі. Нарадзіўся ў 1891 г. ў Быхаве. Член КПСС з 1917 г. У гады 1-й сусветнай вайны марак Балтыйскага флоту. З 1918 г. ў Чырвонай Арміі: камісар санчасці, шпіталя, ваенком усеагульнага ваеннага навучання ў Петраградзе, камісар 10-й стралковай дывізіі. Вызначыўся 3—4.11.1919 г. ў баях пад Гдовам і 14—17.11. 1920 г. пры разгроме бандаў Булак-Балаховіча

Ф. Р. Каравацкі.

К. Л. Клепік.

ў Рэчыцкім павеце. Пасля грамадзянскай вайны ваенком 2-га стралковага корпуса. З 1924 г. на адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце. Узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонага Сцяга. Памёр С. С. Кандрацьеў у 1956 г.

ФЕАКЦІСТ РЫГОРАВІЧ КАРАВАЦКІ

Удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Нарадзіўся ў 1900 г. ў в. Глухі Быхаўскага р-на. З сялян. Член КПСС. У 1919—1921 гг. у складзе 3-й арміі ўдзельнічаў у грамадзянскай вайне на Заходнім фронце. Пасля працаваў у мясцовых савецкіх і партыйных органах, быў старшынёй выканкома сельсавета, з 1940 г.— інструктар Быхаўскага райкома партыі. У Вялікую Айчынную вайну на фронце. Пасля вайны Ф. Р. Каравацкі на розных пасадах у народнай гаспадарцы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Памёр 20 жніўня 1979 г.

КАНСТАНЦІН ЛЯВОНЦЬЕВІЧ КЛЕПІК

Удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Нарадзіўся ў 1902 г. ў в. Мокрае Быхаўскага раёна. Член КПСС з 1926 г. Скончыў фельчарскую школу. У 1918 г. добраахвотнікам уступіў у Чырвоную Армію, служыў фельчарам. У адным з баёў быў кантужаны. З лістапада 1919 г. лекарскі памочнік на кананерскай лодцы «Гарачы» Дняпроўскай ваеннай флатыліі. У 1926 г. скончыў Кіеўскую артылерыйскую школу, займаў розныя камандныя пасады ў берагавой ахове Ціхаакіянскага флоту, пасля выкладаў у шэрагу ваенна-марскіх вучылішчаў. З 1954 г. звольнены ў запас, палкоўнік. Працягваў работу па ваенна-патрыятычным выхаванні моладзі. Адзін з аўтараў кнігі нарысаў пра Герояў Савецкага Саюза — ураджэнцаў Кіеўскай вобласці «Баявыя зоркі кіяўлян». Узна-

Быховский районный историко-краеведческий музей

А. Ц. Мамаеў.

гароджаны ордэнам Леніна, двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, многімі медалямі. Памёр у 1983 г.

І. Я. Краўцоў.

АДАМ ЦІМАФЕЕВІЧ МАМАЕЎ

Удзельнік барацьбы за Савецкую ўладу на Быхаўшчыне. Нарадзіўся ў 1892 г. ў в. Новы Быхаў Быхаўскага р-на. З сялян. У 1-ю сусветную вайну знаходзіўся на германскім фронце. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ваенны камісар першага Быхаўскага навятовага рэўкома на Навабыхаўскай воласці, праводзіў мабілізацыю ў Чырвоную Армію. У 1918—1921 гг. у Чырвонай Арміі. Пасля дэмабілізацыі на розных пасадах у Новым Быхаве, з 1930 г. працаваў настаўнікам у пачатковых школах раёна. У гады Вялікай Айчыннай вайны партызан 810-га партызанскага палка. З сакавіка 1944 г. пасля вызвалення левабярэжжа раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў загадваў аддзелам сацыяльнага забеспячэння Быхаўскага райвыканкома, у 1946—1962 гг. працаваў дырэктарам Няражскай, Чырвонабярэжскай пачатковых школ. Удастоен шасці ўрадавых узнагарод. Памёр А. Ц. Мамаеў 7 ліпеня 1978 г.

ПАВЕЛ ІВАНАВІЧ МІЧУКОЎ

Удзельнік грамадзянскай вайны, нарадзіўся ў 1905 г. ў Гельсінгфорсе (цяпер Хельсінкі) у сям'і ваеннага марака. У 1917 г. сям'я Мічукоўых пераехала на Быхаўшчыну ў в. Баркалабава, адкуль быў родам бацька. Пасля смерці бацькоў Паўла забраў да сябе дзядзька, які працаваў у Кіеве ў рачным параходстве. П. І. Мічукоў стаў плаваць на параходах, зарабляючы сабе на пражыццё. Калі над Савецкай Украінай навісла пагроза, ён добраахвотна пайшоў у рады абаронцаў рэвалюцыі, быў кулямётчыкам спачатку на браняпоездзе 7-й стралковай дывізіі, а потым на браніраваным параходзе «Мукамол» (пазней кананерская лодка «Грамавы»). П. І. Мічукоў мужна змагаўся з белагвардзейцамі і інтэрвентамі пад Екацярынаслаўлем (цяпер Днепрапятроўск), абараняў дняпроўскія рубяжы, хадзіў у разведку. Пасля грамадзянскай вайны служыў на вартавых караблях «Громкі» і «Геройскі», удзельнічаў у разгроме розных бандаў. У 1921 г. былы юнга вярнуўся ў Баркалабава, уключыўся ў работу па ўмацаванню Савецкай улады на вёсцы, наладжванню калектыўнай формы вядзення сельскай гаспадаркі, стаў селькорам і арганізатарам самадзейнасці. У 1934 г. ён паехаў на асваенне далёкаўсходніх зямель. Там захварэў і памёр.

ЯФРЭМ ТРАФІМАВІЧ МУЖЫЧКОЎ

Удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Нарадзіўся ў 1898 г. ў Быхаве. З сялян. Член КПСС з 1943 г. У 1-ю сусветную вайну салдат, курсант, прапаршчык, камандзір узвода маршавага батальёна і камандзір роты 405-га Льгоўскага палка на Паўднёва-Заходнім фронце. У 1917 г. з радасцю сустрэў Кастрычніцкую рэвалюцыю, стаў актыўным змагаром за ўладу Саветаў. У Чырвонай Арміі вёў барацьбу з дэзерцірамі, потым на Заходнім фронце камандаваў ротай у 152-м стралковым палку, сфарміраваным з чырвонагвардзейскіх атрадаў Быхаўшчыны. Пасля грамадзянскай вайны працаваў у сельскай гаспадарцы. У 1939 г. ўдзельнічаў у вызваленчым паходзе Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны на фронце. Пасля вайны працаваў у народнай гаспадарцы. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі «За абарону Масквы», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.». Памёр Я. Т. Мужычкоў у 1970 г.

РАМАН ІВАНАВІЧ НІКІЦІН

Удзельнік барацьбы за ўстанаўленне Савецкай улады на Быхаўшчыне. Нарадзіўся ў 1886 г. ў г. Слаўгарад (былы Прапойск) Магілёўскай вобл. З ранніх гадоў працаваў на кафельным заводзе, юнаком стаў на шлях рэвалюцыйнай барацьбы з царскім самадзяржаўем. За ўдзел у рэвалюцыі 1905—1907 гг. быў на 5 гадоў сасланы ў Сібір. Пасля ссылкі мабілізаваны ў царскую армію. У жніўні 1917 г. выбраны ў Савет салдацкіх дэпутатаў ад запаснога палка, які знаходзіўся ў Рослаўлі на Смаленшчыне. Вясной 1918 г. вярнуўся на радзіму і актыўна ўключыўся ў барацьбу за ўстанаўленне Савецкай улады ў неакупіраваных вёсках Быхаўскага павета. У ліпені 1918 г. выбраны дэлегатам на 5-ы Усерасійскі з'езд Саветаў, на якім слухаў выступленне У. І. Леніна; прымаў удзел у разгроме леваэсэраўскага мяцежу ў Маскве. 10.1.1919 г. як член рэўкома Р. І. Нікіцін удзель-

Быховский районный историко-краеведческий музей

Я. Т. Мужычкоў.

М. Л. Рудкоўскі.

Р. В. Савіцкі.

Ц. І. Сарокін.

нічаў у рабоце Быхаўскага павятовага з'езда Саветаў. Вясной 1920 г. прыфрантавы Быхаўскі павет перажыў цяжкія дні, у некаторых валасцях павета пачаліся кулацкія паўстанні. Член Быхаўскага павятовага камітэта, выканкома, калегіі зямельнага аддзела Р. І. Нікіцін рашуча выкараняў супраціўленне кулакоў. Забіты ворагамі Савецкай улады 20.5.1920 г. ў в. Доўгі Мох. Пахаваны ў Быхаве. Імем Р. І. Нікіціна названы вуліца, завулак і спуск у Быхаве.

МАЦВЕЙ ЛЯВОНЦЬЕВІЧ РУДКОЎСКІ

Удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, барацьбы за Савецкую ўладу на Быхаўшчыне. Нарадзіўся ў 1894 г. ў в. Мокрае Быхаўскага р-на. З сялян. Член КПСС з 1917 г. Вясной 1917 г. партыя накіравала марака Балтыйскага флоту М. Л. Рудкоўскага з Петраграда на радзіму для рэвалюцыйнай работы. Удзельнічаў у стварэнні ў Быхаве бальшавіцкай арганізацыі, вёў агітацыю сярод сялян. У верасні 1917 г. вярнуўся ў Петраград, дзе ўдзельнічаў у Кастрычніцкай рэвалюцыі, потым у складзе зводнага чырвонагвардзейскага атрада прымаў удзел у ліквідацыі контррэвалюцыйнай Стаўкі ў Магілёве. М. Л. Рудкоўскі многае зрабіў па ўмацаванню Савецкай улады ў Быхаўскім павеце і стварэнню чырвонагвардзейскіх атрадаў. З 1918 г. ў Чырвонай Арміі, удзельнічаў у вызваленні тэрыторыі Беларусі ад нямецкіх акупантаў і польскіх легіянераў. Пасля грамадзянскай вайны да 1924 г. працаваў старшынёй валвыканкома ў Доўску і Жлобіне, у 1924—1926 гг.— старшынёй Быхаўскага райвыканкома і інструктарам Магілёўскага акрвыканкома, у 1930—1940 гг. на гаспадарчай рабоце ў Мінску. У гады Айчыннай вайны ў эвакуацыі ў Тамбоўскай вобласці. Пасля вайны працаваў у Міністэрстве лясной прамысловасці БССР. Памёр М. Л. Рудкоўскі ў 1957 г.

РАМАН ВАРФАЛАМЕЕВІЧ САВІЦКІ

Удзельнік Лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Нарадзіўся ў 1895 г. ў в. Кароўчына Быхаўскага раёна. У 1915 г. прызваны на флот, служыў на Балтыцы. Удзельнічаў ва ўзброеным паўстанні ў ноч з 28 лютага на 1 сакавіка 1917 г. у Кранштаце. З красавіка 1917 г. машыніны унтэр-афіцэр на мінаносцы. У лютым 1918 г. дэмабілізаваўся, вярнуўся дамоў, працаваў настаўнікам валасной школы. З восені 1919 г. ў Чырвонай Арміі, спачатку ў 3-м Гомельскім крапасным стралковым палку, потым пераведзены на Дняпроўскую ваенную флатылію. Вясной 1920 г. прызначаны машыністам кананерскай лодкі «Меткі», удзельнічаў у баях пад Кіевам, у абароне Лоева. Пасля таго як у баі ў ноч з 1 на 2 чэрвеня 1920 г. лодка затанула, Р. В. Савіцкі быў прызначаны машыністам другой кананеркі — «Гарачы». У лістападзе 1920 г. звольнены ў запас. Да 1930 г. працаваў слесарам на металургічным заводзе ў Каменскім (цяпер Днепрадзяржынск), пасля электраманцёрам гарбарнага завода ў Магілёве. У Вялікую Айчынную вайну сувязны партызанскага атрада. Пасля вызвалення Магілёўшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прызваны на фронт. Пасля вайны працаваў лесніком. Памёр 23.12.1979 г.

І. Я. Краўцоў.

ЦІМОХ ІВАНАВІЧ САРОКІН

Удзельнік барацьбы за Савецкую ўладу на Быхаўшчыне. Нарадзіўся ў 1886 г. ў в. Студзёнка Быхаўскага р-на. З сялян. Член КПСС з 1917 г. У 1906—1911 гг. працаваў у кравецкай майстэрні ў Кіеве, потым качагарам на параходзе акцыянернага таварыства, у 1912—1914 гг. чаляднікам у кравецкай майстэрні ў Петраградзе. У 1914—1917 гг. у царскай арміі, удзельнічаў у 1-й сусветнай вайне (Заходні фронт),

Быховский районный историко-краеведческий музей

Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. У дні Кастрычніка быў выбраны старшынёй ваенна-рэвалюцыйнага камітэта 64-й інжынернай дружыны. У снежні 1917—1918 гг. на радзіме ўдзельнічаў у 1-м з'ездзе Саветаў Быхаўскага павета, выбраны членам павятовага выканкома, вёў падпольную работу на тэрыторыі акупіраванай кайзераўскімі войскамі правабярэжнай часткі Быхаўскага павета, стварыў падпольную партыйную арганізацыю ў в. Студзёнка, партызанскі атрад і кіраваў ім. Удзельнічаў у партыйнай канферэнцыі падпольных арганізацый і быў выбраны старшынёй Быхаўскага падраённага падпольнага камітэта РКП(б). Пасля вызвалення Быхава ад інтэрвентаў Ц. І. Сарокін у саставе Быхаўскага рэўкома. У студзені 1919 г. на 1-м агульнапавятовым з'ездзе Саветаў выбраны членам выканаўчага камітэта і прызначаны загадчыкам камунальнага пададдзела пры Быхаўскім павятовым зямельным аддзеле. У 1919 г. арганізаваў у в. Сарочына на Быхаўшчыне адну з першых на Беларусі сельскагаспадарчую камуну імя Карла Лібкнехта, быў яе старшынёй. Пасля грамадзянскай вайны член бюро павятовага камітэта партыі ў г. Старадубе (тады Гомельскай губерні, цяпер Бранскай вобл.), потым вярнуўся на радзіму і працаваў у камуне, пазней выбраны старшынёй Акруговай зямельнай камісіі Акрзем-аддзела ў Магілёве. У 1928—1930 гг. на гаспадарчай рабоце ў Оршы і Віцебску. Пасля заканчэння ў 1931 г. Вышэйшай калгаснай школы ў Маскве працаваў у Мінску ў органах Наркамзема БССР. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны пакінуў Мінск і пайшоў на ўсход, разам з узброенай групай перайшоў лінію фронту і прыбыў у г. Бялёў Тульскай вобл., у 1942 г. па хваробе эвакуіраваны ў г. Горкі, дзе і памёр 9 мая 1942 г.

МІКАЛАЙ ІГНАТАВІЧ СІВАКОЎ

Удзельнік грамадзянскай вайны. Нарадзіўся ў 1897 г. ў в. Праточнае Быхаўскага р-на. З сялян. У 1-ую сусветную вайну служыў радавым на Заходнім фронце. У канцы 1917 г. вярнуўся на радзіму. У 1918 г. добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, служыў у коннай разведцы 150-га палка 18-й стралковай дывізіі. У 1920 г. ўдзельнічаў у вызваленні Мінска ад белапалякаў. У 1920 г. быў узнагароджаны вышэйшай адзнакай Рэспублікі — ордэнам Чырвонага Сцяга.

Пасля грамадзянскай вайны М. І. Сівакоў вярнуўся ў родныя мясціны, займаўся сельскай гаспадаркай, працаваў на лесараспрацоўках. Вясной 1927 г. арганізаваў першы ў былым Чачэвіцкім раёне калгас «Чырвоныя ўсходы», быў яго старшынёй. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны гітлераўцы разрабавалі калгас «Чырвоныя ўсходы», спалілі вёску і грамадскія пабудовы. М. І. Сівакоў пайшоў у партызаны.

Пасля вайны працаваў у саўгасе «Кіпячы». Памёр М. І. Сівакоў у 1985 г.

* * *

З ЗАГАДА РВС РЭСПУБЛІКІ АБ УЗНАГАРОДЗЕ ОРДЭНАМІ ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ВАЕННАСЛУЖАЧЫХ 150-ГА ПАЛКА 18-Й СТРАЛКОВАЙ ДЫВІЗІІ ЗА БАЯВЫЯ ПОСПЕХІ Ў БАЯХ ПАД Г. ПОЛАЦКАМ

№ 32 **28 студзеня 1920 г.**

Утверждается присуждение на основании приказа РВСР 1919 г. за № 511 Реввоенсоветом 16-й армии ордена Красного Знамени.

... Стрелку команды конных разведчиков тов. СИВАКОВУ Николаю Игнатьевичу — за то, что в бою под м. Прозороки 2 ноября 1919 г. он, будучи посыльным ординарцем при 2-м батальоне и несмотря на сильный пулеметный и ружейный огонь противника, неоднократно доставлял донесения и словесные приказания ротным командирам на передовую линию, чем подавал в бою пример остальным своим товарищам-красноармейцам.

Заместитель председателя Революционного Военного Совета Республики

Э. Склянский

Главнокомандующий всеми вооруженными силами Республики

С. Каменев

Член Революционного Военного Совета Республики

Курский

Быховский районный историко-краеведческий музей

М. І. Сівакоў.

І. І. Феакцістаў.

АЛЯКСЕЙ ПЯТРОВІЧ СТАРАСЦЕНКА

Удзельнік барацьбы за Савецкую ўладу на Быхаўшчыне, чэкіст. Нарадзіўся ў 1886 г. З сялян. Бальшавік. У 1918 г. ўдзельнічаў у стварэнні чырвонагвардзейскіх атрадаў, якія аказвалі рашучае супраціўленне акупантам на тэрыторыі Быхаўскага павета. Пасля вызвалення Быхаўшчыны ад інтэрвентаў А. П. Старасценка — член Быхаўскага павятовага камітэта РКП(б), старшыня Быхаўскай павятовай надзвычайнай камісіі, арганізоўваў камітэты беднаты, першыя сельскія Саветы. У 1918 г. ўдзельнічаў у рабоце 5-га Усерасійскага з'езда Саветаў у Маскве, у студзені 1919 — на 1-м аб'яднаным павятовым з'ездзе Саветаў выбраны намеснікам старшыні з'езда і членам павятовага выканкома. Ворагі Савецкай улады неаднаразова рабілі замах на яго жыццё, і ў ліпені 1920 г. А. П. Старасценка быў забіты.

МЕЧАСЛАЎ СТАФАНОЎСКІ

Удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі ў Маскве. Нарадзіўся ў 1897 г. ў фальварку Банькоў Быхаўскага павета. Бальшавік. У час рэвалюцыі служыў у тэлеграфна-пражэктарным палку, быў выбраны членам ваенна-рэвалюцыйнага штаба раёна і камандзірам палка, на чале якога М. Стафаноўскі ўдзельнічаў у ачышчэнні цэнтра Масквы ад юнкераў. У кастрычніку 1917 г. ў час штурму тэлефоннай станцыі быў цяжка паранены. Памёр ад ран у лістападзе 1917 г. Пахаваны на Краснай плошчы каля Крамлёўскай сцяны.

Удзельнікі кастрычніцкіх баёў у Маскве ўспаміналі пра М. Стафаноўскага: «Салдат 4-й роты, ён адзін з першых, паказваючы прыклад іншым, з'явіўся ў ваенна-рэвалюцыйны штаб Благуша-Лефортаўскага раёна Масквы і працаваў з такой самаадданасцю, што многія радаваліся і здзіўляліся. У час бою на тэлефонную станцыю Стафаноўскі выбег на сярэдзіну двара і, стоячы, пачаў расстрэльваць контрыкаў, якія паяўляліся ўверсе (на дахах дамоў — рэд.). Але хутка забіты падае». На самай справе ён паранены. Яго прозвішча значыцца ў спісе параненых Мясніцкага лазарэта № 1610, апублікаваным 9.11. 1917 г. газетай «Утро России». У другім архіўным дакуменце пра М. Стафаноўскага паведамлялася: «20 гадоў, халасцяк, памёр ад ран». У снежні 1917 г. ў прывітанні Благуша-Лефортаўскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў першаму тэлеграфна-пражэктарнаму палку гаварылася: «У слаўныя дні рэвалюцыйнай барацьбы супраць ворагаў народа ў Маскве наш полк першы з нашага раёна даў мужных байцоў за народную справу. Імёны загінуўшых з іх таварыш Стафаноўскага і іншых заўсёды будуць жыць у нашай памяці».

Да 1-й гадавіны Вялікага Кастрычніка было вырашана паставіць помнік загінуўшым у кастрычніцкіх баях камуністам-лефортаўцам — Стафаноўскаму і рабочаму Шчарбакову. Аднак з пачаткам грамадзянскай вайны і з-за цяжкага становішча краіны паставіць помнік не ўдалося.

ІЛЬЯ ІЛЬІЧ ФЕАКЦІСТАЎ

І. І. Феакцістаў нарадзіўся ў 1895 г. ў г. Слаўгарад (тады мястэчка Прапойск Быхаўскага павета). З дзяцінства прывучыўся ён да цяжкай сялянскай працы, бачыў і разумеў пакуты прапоўных.

Восенню 1915 г. Феакцістаў быў прызваны ў армію, але на фронце заставаўся нядоўга, праз год быў дэмабілізаваны па стану здароўя. Год жыцця ў акопах не прайшоў дарэмна. Ён стаў для салдата вялікай палітычнай школай. Яшчэ большы ўплыў на светапогляд Ільі зрабіў яго старэйшы брат Дзмітрый, які ўступіў у партыю бальшавікоў у 1908 г. Працаваў Дзмітрый Ільіч у Петраградзе. Ён дапамог брату ўладкавацца рабочым. У Петраградзе Феакцістаў стаў членам ленінскай партыі, прымаў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы Кастрычніцкага ўзброенага паўстання.

У красавіку 1918 г. па заданню партыі ён прыехаў на Быхаўшчыну як агітатар. Першым яго крокам было наладжванне сувязей з мясцовымі камуністамі. З іх дапамогай ён арганізоўваў партызанскія атрады для барацьбы з акупантамі. Пешшу Ілья Ільіч абышоў дзесяткі вёсак, выступаў на сходах сялян. Калі ў Прапойску быў створаны Быхаўскі павятовы камітэт партыі, у яго ўвайшоў і І. І. Феакцістаў. Крыху пазней, на павятовым з'ездзе Саветаў, таварыш Феакцістаў быў выбраны членам павятовага выканкома і прызначаны намеснікам старшыні павятовай надзвычайнай камісіі. Разам са старшынёй гэтай камісіі Аляксеем Пятровічам Старасценкам Феакцістаў праводзіў работу па ачышчэнню органаў Савецкай улады ад эсэраў і меншаві-

Быховский районный историко-краеведческий музей

коў, вёў барацьбу з контррэвалюцыяй. І. І. Феакцістаў і член павятовага камітэта РКП(б) П. П. Лагуцёнак двойчы (у верасні і кастрычніку 1918 г.) пабывалі на акупіраванай тэрыторыі павета і ўстанавілі трывалыя сувязі з падпольнымі арганізацыямі камуністаў, аказалі ім практычную дапамогу.

Пасля вызвалення Быхаўскага павета ад нямецкіх акупантаў на аб'яднаным з'ездзе Саветаў, які адбыўся 10 студзеня 1919 г., Феакцістаў быў уведзены ў састаў павятовага рэўкома, выбраны членам павятовага выканкома.

У гэты час маладая Савецкая рэспубліка вяла цяжкую барацьбу супраць унутраных і знешніх ворагаў. Большасць камуністаў уступіла ў Чырвоную Армію. Нягледзячы на дрэнны стан здароўя пайшоў на фронт і Феакцістаў, стаў палітработнікам 47-й стралковай дывізіі Заходняга фронту. У студзені 1920 г. Ілья Ільіч захварэў на тыф. Пасля лячэння ў шпіталі атрымаў дадатковы водпуск і прыехаў у Прапойск. Прыфрантавы Быхаўскі павет перажываў цяжкія дні. На вызваленую тэрыторыю Беларусі засыпаліся банды тэрарыстаў. Адна з такіх бандаў справакавала кулацкі мяцеж у Баханскай, Прапойскай і Даўгамошскай валасцях. Мяцеж быў хутка ліквідаваны, аднак многія камуністы загінулі ў барацьбе з ворагамі рэвалюцыі. 11 сакавіка 1920 г. па-геройску загінуў у гэтай барацьбе і верны сын партыі І. І. Феакцістаў.

МІКАЛАЙ КАНСТАНЦІНАВІЧ ЦІТОВІЧ

Удзельнік грамадзянскай вайны. Нарадзіўся ў 1891 г. ў г. Быхаў. Працаваў настаўнікам. У 1915 г. скончыў скарочаны курс ваеннага вучылішча, з лютага 1917 г. штабс-капітан, пасля камандзір роты, батальёна. Са снежня 1918 г. камандзір 20-га Украінскага савецкага палка, з лютага 1919 г.— 9-га Украінскага савецкага палка, з 1.5.1919 г.— памочнік начальніка 1-й брыгады караблёў Дняпроўскай ваеннай флатыліі, з 3.8.1919 г. начальнік штаба флатыліі, пасля начальнік дэсантнага атрада Дняпроўскай ваеннай флатыліі, начальнік штаба зводнага дэсантнага атрада Азоўскага ўзбярэжжа, начальнік штаба Марской экспедыцыйнай дывізіі. 6.2.1921 г. прызначаны начальнікам атрада суднаў воднай аховы Дняпра Кіеўскай ваеннай акругі, 13.11.1922 г.— памочнікам начальніка штаба 14-га стралковага корпуса РСЧА. У перыяд культу асобы Сталіна быў рэпрэсіраваны, загінуў у 1938 г.

І. Я. Краўцоў.

ПАВЕЛ ЯКАЎЛЕВІЧ ЦІХАНАЎ

Удзельнік грамадзянскай вайны. Нарадзіўся ў 1902 г. ў в. Чырвоная Слабада Быхаўскага р-на. З сялян. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі П. Я. Ціханаў разам са сваімі аднавяскоўцамі са зброяй у руках абараняў яе заваёвы, быў у партызанскім атрадзе. З 1918 г. ў Чырвонай Арміі, разведчык 4-й роты 150-га палка 17-й дывізіі, удзельнічаў у задушэнні страканытаўскага мяцяжу ў Гомелі, потым ваяваў супраць пятлюраўцаў і белапалякаў на Пінскім баявым участку каля Маладзечна, у раёне Полацк — Лепель, каля р. Бярэзіна. Камандзір аддзялення разведчыкаў П. Я. Ціханаў здзейсніў пямала смелых рэйдаў па тылах ворага, даставіў важныя звесткі свайму камандаванню. Пра адзін з яго подзвігаў і ўзнагароду ў загадзе Рэўваенсавета Заходняга фронту гаварылася: «Узнагародзіць ордэнам Чырвонага Сцяга разведчыкаў чацвёртай роты 150-га палка Паўла Якаўлевіча Ціханава і Трафіма Васілевіча Васільева за тое, што ў ноч з 13 на 14 студзеня 1920 года яны ў час разведкі ў занятай праціўнікам вёсцы Вілы абяззброілі і ўзялі ў палон 9 легіянераў, якія далі каштоўныя звесткі камандаванню аб сілах праціўніка». Загінуў П. Я. Ціханаў у красавіку 1920 г.

Ордэн героя быў перасланы праз год яго бацьку. У час нямецка-фашысцкай акупацыі той жыў у в. Чырвоная Слабада. Калі восенню 1943 г. фронт наблізіўся да Быхаўшчыны, Якаў Ігнатавіч прымацаваў сынаў ордэн да грудзей і падаўся ў лес. Суседзям сказаў: «Паспрабую перайсці лінію фронту». Але гэта яму не ўдалося. Ён трапіў у блакіраваны лес і загінуў ад рук карнікаў.

Ф. К. Шычко.

ФЁДАР КАЛІНКАВІЧ ШЫЧКО

Удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Нарадзіўся ў 1899 г. З сялян. Член КПСС. З 1917 г. ў Чырвонай гвардыі, радавы Мінскай рэвалюцыйнай дружыны, потым начальнік коннай разведкі 1-га кавалерыйскага палка 8-й дывізіі. Пасля грамадзянскай вайны ўдзельнічаў ва ўсталяванні Савецкай улады на Беларусі, быў арганізатарам вытворчасці. У Вялікую Айчынную вайну камандаваў партызанскім атрадам «За Савецкую Беларусь», які дзейнічаў

Быховский районный историко-краеведческий музей

на акупіраванай тэрыторыі Магілёўскай вобласці. Пасля дэмабілізацыі ў 1944 г. знаходзіўся на гаспадарчай рабоце ў Гомельскай вобл., а з 1948 г. на Грудзінаўскім спіртзаводзе. З 1963 г. на пенсіі. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга (1967). Памёр Ф. К. Шычко 27.2.1971 г.

Удзельніца трох войнаў

Удзельніца першай сусветнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, медыцынскі работнік Еўдакія Уладзіміраўна Бельская нарадзілася ў 1894 г. ў Быхаве ў сям'і селяніна. Скончыла фельчарска-акушэрскую школу. У 1914 г. пасля кароткатэрміновых курсаў пры Магілёўскай абшчыне медыцынскіх сясцёр працавала медыцынскай сястрой на Паўднёва-Заходнім фронце і ў 8-й асобай арміі. У ліпені 1916 г. ў час Брусілаўскага прарыву пад варожымі шраннелямі і кулямі Еўдакія Уладзіміраўна аказала першую дапамогу і перавязала больш двухсот параненых салдат. 4 лістапада 1916 г., калі скончыўся перавязачны матэрыял, сваю форменную сукенку і бялізну яна разарвала на бінты, ратуючы жыццё салдат, сцякаючых крывёю. Аб гэтым пісала газета «Русское слово» (№ 184 ад 18.8. 1916). Аб самаадданасці Е. У. Бельскай ведала ўся медыцынская грамадскасць Расіі, яна была ўзнагароджана Георгіеўскімі крыжамі IV, III, II ступеняў і медалём «За стараннасць». З 1918 г. Е. У. Бельская ў Чырвонай Арміі на пасадзе аперацыйнай сястры, працавала ў лазарэце 10-й стралковай дывізіі 16-й арміі. У маі 1920 г. белапалякі выявілі пашу пера праву цераз Бярэзіну і адкрылі ўраганны артылерыйскі агонь. Многія чырвонаармейцы былі паранены і пачалі тануць. Добра ўмеючы плаваць (у дзяцінстве навучылася на Дняпры), Бельская кінулася ў хвалі Бярэзіны і выцягнула цяжкараненага чырвонаармейца. Потым яна зноў паплыла і выратавала яшчэ некалькі чалавек. За подзвігі ў гэтых баях была ўзнагароджана тадзіннікам з надпісам «Сумленнаму воіну Чырвонай Арміі ад Петраградскага Савета рабочых і сялянскіх дэпутатаў». У 1920 г. ў час наступлення 10-й стралковай дывізіі на Варшаву сама медсястра была двойчы паранена. Асабліва цяжкае раненне атрымала яна ў пераносіцу і страціла зрок, які потым з цяжкасцю аднавіўся. Пасля заканчэння вайны з белапалякамі Е. У. Бельская была камандзіравана з групай медыцынскіх сясцёр на Паўднёвы фронт і ўдзельнічала ў баях за Перакоп. Яна ішла ў першых радах наступаючых, патхняючы гэтым чырвонаармейцаў, тут жа аказвала дапамогу параненым. Пасля грамадзянскай вайны Е. У. Бельская працавала медсястрой у санаторыі «Талласа» ў Еўпаторыі. Там ёй давялося аказваць медыцынскую дапамогу сястры У. І. Леніна Ганне Ільінічне Ульянавай, якая лячылася ў санаторыі. У Вялікую Айчынную вайну вопытная медсястра працавала ў шпіталях Заходняга фронту, потым у хірургічным палявым перасоўным шпіталі 40-й арміі 1-га Украінскага фронту, удзельнічала ў вызваленні Чэхаславакіі. За ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне Е. У. Бельская была ўзнагароджана шасцю ўрадавымі ўзнагародамі. У пасляваенныя гады праводзіла вялікую грамадскую работу ў таварыстве Чырвонага Крыжа і медыцынскай групе Савецкага камітэта ветэранаў вайны. Памерла Е. У. Бельская ў кастрычніку 1966 г. ў Маскве.

Д. Абрамовіч.

Бой быў няроўны...

З успамінаў былога чонаўца А. Атліваніка

На адваротным баку вокладкі кароткай справаздачы аб дзейнасці Быхаўскага павятовага гарадскога камітэта РКП (бальшавікоў) за перыяд з VI павятовай канферэнцыі 18 жніўня 1920 года па 25 студзеня 1921 года, надрукаванай у Быхаўскай савецкай друкарні, у чорнай рамцы змешчаны тэкст: «У час правядзення харчовага трохтыднёвіка бандытамі былі закатаваны тт. Часніцкі, Цёмкін, Раманаў (члены РКП) і т. Аўруцін (член павятовага камітэта камсамола). Вечная памяць і вечная слава загінуўшым за справу рэвалюцыі!»

З 1 па 22 лістапада 1920 г. ў Быхаўскім павеце праходзіў харчовы трохтыднёвік. На правядзенне яго былі мабілізаваны 25 камуністаў, 25 членаў прафсаюза і 10 камсамольцаў.

Раз'ехаўшыся па воласці, упаўнаважаныя павятовага камітэта партыі разгарнулі шырокую растлумачальную работу сярод сялян. Дзякуючы гэтаму колькасць нарыхтаваных прадуктаў для Чырвонай Арміі і пралетарыяту горада рэзка павялічылася. Гэта выклікала шаленства ў бандытаў і кулакоў. Пачасціліся іх выступленні супраць органаў улады на месцы. На барацьбу з бандытызмам выступілі часці асобага назначэння (ЧОН). Быў арганізаваны такі атрад і ў мястэчку Журавічы Быхаўскага павета. Камандаваў атрадам дэмабілізаваны пасля ранення на фронце баец Чырвонай Арміі камуніст Батхан. Усяго ў атрадзе нас было 20 чалавек. Кожную ноч байцы неслі каравульную службу ў мястэчку і сельскагаспадарчай камуне, пярэдка ўступалі ў стычкі з бандытамі.

У лістападзе 1920 г. ў Журавічы прыбыла з

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

Быхава камсамольская група ЧОНа з дзесяці чалавек пад камандаваннем члена павятовага камітэта камсамола І. Аўруціна. Па заданню Быхаўскага палітбюро (ЧК) патрэбна было разведаць абстаноўку ў Даўгамошскай воласці. Па звестках, якія паступілі да нас, там дзейнічала банда. Атраду даручылі таксама правесці рэквізіцыю збожжа ў кулакоў. Раніцай атрад накіраваўся на заданне. У Доўгім Моху чонаўцы сабралі сход беднякоў і абмеркавалі пытанне аб рэквізіцыі. Адных актывістаў прызначылі ў групы, якія пойдуць разам з камсамольцамі па хатах кулакоў, другім даручылі падрыхтаваць фурманкі. За справу рашылі ўзяцца, як толькі зоймецца золак. Далёка за поўнач стомленыя камсамольцы паснулі. Вартавы, які стаяў на вуліцы, таксама заснуў. Не спалі ў тую ноч ворагі. Упачы банда зняла вартавога і акружыла хату. Успыхнуў няроўны бой...

Мінула пяць дзён. Мы захвалявaліся. Хлопцы ж абяцалі вярнуцца ў Журавічы праз 2—3 дні. Камандзір нашага атрада паведаміў павяткому партыі. У Доўгі Мох у спешным парадку быў накіраваны з Быхава чонаўскі атрад. Туды ж прыбыў конны атрад Гомельскага губернскага ЧК. Агульнымі сіламі ўдалося вылавіць бандытаў. Закатаванyя юнакі былі знойдзены пад ярусам накачанага на іх бярвення. Загінуўшых прывезлі ў Быхаў і пахавалі на брацкіх могілках.

УДЗЕЛЬНІКІ ВЯЛІКАЙ КАСТРЫЧНІЦКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭВАЛЮЦЫІ І ГРАМАДЗЯНСКАЙ ВАЙНЫ

АБІДАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

АНДРЭЕЎ Еўдакім Зосімавіч, нарадзіўся ў в. Абідавічы ў 1882, памёр у 1972.

АНДРЭЙЧЫКАЎ Кірыла Ягоравіч, нарадзіўся ў 1889 у в. Палянінавічы; у 1918 добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, удзельнічаў у баях супраць кайзераўскіх, пятлюраўскіх, дзянікінскіх і белапольскіх войск.

КАКУЛЬКІН Пётр Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Вець, памёр у 1988.

КОРШУНАЎ Андрэй Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Абідавічы, памёр у 1986.

ЛАБАДЫРОЎ Дзмітрый Іванавіч, нарадзіўся ў в. Вець.

ЛАРКОЎ Сцяпан, нарадзіўся ў в. Вець, загінуў у грамадзянскую вайну.

НЯБРАЕЎ Фёдар, нарадзіўся ў в. Вець, загінуў у грамадзянскую вайну.

СЯКЕРКА Архіп, нарадзіўся ў в. Вець, загінуў у грамадзянскую вайну.

ШАБЛАЎНЕЎ Пракоп Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Вець, загінуў на фронце ў Вялікую Айчынную вайну.

ШАРЫПАЎ Прокоп Мікітавіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Плоскае.

БАРКАЛАБАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

КЛІМАЎ Малах Ціханавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Лядо; у Чырвонай Арміі ў 1918—1921, ваяваў з бандамі на Украіне, вызваляў ад белагвардзейцаў станцыю Вёшанскую; памёр у 1981.

МІЦУКОЎ Павел Іванавіч (глядзі асобны артыкул).

РАБЗЭВІЧ Аляксандр Яфімавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Ліпаўка; у Чырвонай Арміі ў 1919—1922, удзельнік штурму Перакопа; памёр у 1982.

РУДНІКАЎ Фёдар Фаміч, нарадзіўся ў 1897 у в. Касічы; у Чырвонай Арміі ў 1918—1922, служыў у 1-й Коннай арміі.

СТАВЯНКОЎ Анатоль Васілевіч (глядзі асобны артыкул).

ЦІХАНОЎСКІ Павел Севасцьянавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Хадуцічы; у Чырвонай Арміі ў 1919—1923, удзельнічаў у грамадзянскай вайне ў складзе асобага артылерыйскага дывізіёна; памёр у 1983.

ЯЦКЕВІЧ Цімафей Ульянавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Хадуцічы, ваяваў супраць арміі Юдзеніча, памёр у 1983.

Е. З. Андрэеў.

П. А. Васькоў.

А. І. Кадраў.

І. І. Шпак.

Быховский районный историко-краеведческий музей

К. М. Івашка.

М. М. Каган.

Ф. С. Пчалянкоў.

С. А. Рудкоўскі.

Быховский районный историко-краеведческий музей

ГОРАД БЫХАЎ

БУРДАЛАЎ Іоў Пятровіч, ураджэнец Быхаўскага павета, служыў на крэйсеры «Аўрора», удзельнік штурму Зімняга палаца.

ВАСЬКОЎ Пётр Аляксеевіч, нарадзіўся ў 1900, удзельнік грамадзянскай вайны і ўстанаўлення Савецкай улады на Быхаўшчыне, потым на партыйнай і прафсаюзнай рабоце ў Быхаве і Мінску, памёр у 1931, пахаваны на брацкіх могілках у Быхаве.

ДОРАХАЎ Георгій Яўменавіч (глядзі асобны артыкул).

ЖДАН Аляксандр Аляксеевіч (глядзі асобны артыкул).

ІВАШКА Кірыла Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1900 у Быхаве, памёр у 1974.

ІСКОЛЬСКІ Міхаіл Абрамавіч, нарадзіўся ў 1901 год смерці не ўстаноўлены.

КАГАН Меер Мендэлевіч, нарадзіўся ў 1893 у фальварку Феліксполле Быхаўскага павета, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, працаваў старшынёй гарсавета ў Быхаве, памёр у 1972.

КАДРАЎ Акім Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1899, удзельнік баёў з бандамі Стракапытава і Кулак-Балаховіча, быў байцом Жалезнай Азінскай дывізіі, памёр у 1976.

КАЛЕЕЎ Яўген Рыгоравіч, ураджэнец Быхаўскага павета, служыў унтэр-афіцэрам на крэйсеры «Аўрора», удзельнік штурму Зімняга палаца.

КАМАНДЫШКА Міхалай Цярэнцьевіч, нарадзіўся ў 1903 у Быхаве, з 1919 па 1921 на франтах грамадзянскай вайны, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, палкоўнік, памёр у 1977.

КАНДРАЦЬЕЎ Сцяпан Сцяпанавіч (глядзі асобны артыкул).

КАРЗО Павел Цімафеевіч, нарадзіўся ў Быхаве, у 1919—1920 у Чырвонай Арміі, ваяваў супраць белапалякаў у дэсантным атрадзе Дняпроўскай ваеннай флатыліі.

КУЗЬМІН Андрэй Мацвеевіч, нарадзіўся ў 1896, памёр у 1978.

МАГАЗІНШЧЫКАЎ Фоцій Яфімавіч, нарадзіўся ў 1883 у Быхаве, у 1919—1920 ваяваў у 508-м стралковым палку.

МУЖЫЧКОЎ Яфрэм Трафімавіч (глядзі асобны артыкул).

МУРАШКА Пётр Вікенцьевіч, нарадзіўся ў 1899, памёр у 1978.

МУШТУКОЎ Ананій Акімавіч (глядзі асобны артыкул).

ПЧАЛЯНКОЎ Фёдар Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1895, памёр у 1968.

РАСІН Абрам Пілевіч, нарадзіўся ў 1890 у Быхаве, памёр у 1970.

РУДКОЎСКІ Сцяпан Антонавіч, нарадзіўся ў 1898, памёр у 1982.

РУДКОЎСКІ Трафім Георгіевіч, нарадзіўся ў 1892 у Быхаўскім павеце, служыў на крэйсеры «Аўрора», удзельнічаў у штурме Зімняга палаца.

СКАЖАНЮК Юлій Паўлавіч (глядзі асобны артыкул).

ТУРЧЫКАЎ Іосіф Цярэнцьевіч, нарадзіўся ў 1901, памёр у 1982.

ФРАНЦУЗ Навум Лазаравіч (глядзі асобны артыкул).

ЦІТОВІЧ Мікалай Канстанцінавіч (глядзі асобны артыкул).

ЧАРКАШЫН Васіль Пракопавіч, нарадзіўся ў 1895, памёр у 1971.

ЧОРСТВЫ Мікалай Філімонавіч, нарадзіўся ў 1901 у Быхаве, добраахвотнікам пайшоў у Чырвоную Армію, ваяваў на поўначы, удзельнічаў у падаўленні контррэвалюцыйнага мяцяжу ў Кранштаце ў 1921.

ШПАК Іосіф Іванавіч, нарадзіўся ў 1876 у Быхаве, у 1919 памочнік механіка дапаможных суднаў Дняпроўскай ваеннай флатыліі, ваяваў супраць дзянікінскіх і белапольскіх войск на Украіне і Беларусі; расстраляны фашыстамі ў 1943 у Кіеве за падпольную дзейнасць.

ШЫБАНАЎ Кузьма Назаравіч, нарадзіўся ў 1900, удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, памёр у 1972.

ВЕРХНЯТОШЧЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

АНДРЭЕНКА Емяльян Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Чырвоны Бераг, у грамадзянскую вайну камандаваў узводам 153-га стралковага палка, памёр у 1981.

АНДРЭЕНКА Іван Яфімавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Чырвоны Бераг, памёр у 1984.

АНДРЭЕНКА Карп Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Чырвоны Бераг, памёр у 1930.

АРХІПЕНКА Макар Максімавіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Верхняя Тошчыца, памёр у 1982.

К. Я. Андрэйчыкаў.

Г. М. Павецкі.

АРХІПЕНКА Парфен Ціханавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Верхняя Тошчыца, памёр у 1976.

АСІПЕНКА Максім Яфімавіч, нарадзіўся ў 1895 на станцыі Тошчыца, памёр у 1984.

АСІПЕНКА Мікалай Яфімавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Чырвоны Бераг, памёр у 1988.

БАЛОТНІКАЎ Макар Мікітавіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Верхняя Тошчыца, памёр у 1942.

БОНДАРАЎ Іван Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Вялікі Лес, памёр у 1973.

БОНДАРАЎ Кузьма Гаўрылавіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Верхняя Тошчыца, памёр у 1949.

БУРКАНАЎ Архіп Парфенавіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Верхняя Тошчыца, памёр у 1974.

БЯЛЯЕЎ Фёдар Восіпавіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Віляхаўка, памёр у 1988.

ГАЙДУКОЎ Фёдар Палікарпавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Верхняя Тошчыца, памёр у 1959.

ДЗЯМІДАЎ Карней Гаўрылавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Рыхартава, памёр у 1942.

ЕЛІСЕЕНКА Павел Восіпавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Чырвоны Бераг, памёр у 1920.

ЕРМАЛІЦКІ Ціт Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Чырвоны Бераг, памёр у 1919.

ІЛЬІН Фядот Аляксеевіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Верхняя Тошчыца, памёр у 1979.

КАВАЛЕНКА Васіль Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Чырвоны Бераг, памёр у 1955.

КАВАЛЕНКА Пічыпар Раманавіч, нарадзіўся ў 1899 у в. Чырвоны Бераг, у час грамадзянскай вайны ваяваў у 153-м стралковым палку; расстраляны нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў 1943 за сувязь з партызанамі.

КАЗЛОЎ Якаў Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Віляхаўка, памёр у 1983.

КАРАКОЎ Іван Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Верхняя Тошчыца, памёр у 1981.

КАРНАВУХАЎ Кірыла Андрэевіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Ніжняя Тошчыца, памёр у 1983.

КАРНАВУХАЎ Піліп Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Рыхартава, памёр у 1983.

КАРНАВУХАЎ Сяргей Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Ліпа, памёр у 1947.

КУЛІКАЎ Сямён Андрэевіч, нарадзіўся ў 1893 на станцыі Тошчыца, памёр у 1979.

КУХАРЭНКА Ананас Барысавіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Вялікі Лес, памёр у 1954.

КУХТАЎ Восіп Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Верхняя Тошчыца, памёр у 1959.

ЛАТЫШАЎ Міхаіл Захаравіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Рыхартава, год смерці не ўстаноўлены.

МАГЕРАЎ Раман Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Чырвоны Бераг, памёр у 1959.

МАЛАХАЎ Пётр Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Верхняя Тошчыца, памёр у 1980.

МАРТЫНЕНКА Пётр, нарадзіўся ў 1893 у в. Істопкі, да 1917 служыў матарыстам у 2-й Ціхаакіянскай эскадры, удзельнік грамадзянскай вайны.

МАРЧАНКА Фёдар Кірылавіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Верхняя Тошчыца, памёр у 1942.

МЕЛЬНІКАЎ Трафім Уладзіміравіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Вялікі Лес, памёр у 1974.

МЕНДЗЕЛЕЎ Іван Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Рыхартава, памёр у 1939.

МЕНДЗЕЛЕЎ Якім Сяргеевіч, нарадзіўся ў 1901 у в. Ліпа, памёр у 1986.

МУЗЫЧЭНКА Дзмітрый Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Верхняя Тошчыца, памёр у 1978.

ПАСЫНКАЎ Архіп Пятровіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Чырвоны Бераг.

ПАСЫНКАЎ Васіль Восіпавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Чырвоны Бераг, памёр у 1920.

ПРЫБЫЛЬСКІ Емяльян Парфенавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Віляхаўка, памёр у 1980.

САЛДАЦЕНКА Мартын Андрэевіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Верхняя Тошчыца, памёр у 1958.

САНРОНЕНКА Несцер Мікітавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Чырвоны Бераг, памёр у 1936.

СВІРЫДАЎ Яфім Іванавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Верхняя Тошчыца, памёр у 1959.

СІДАРЭНКА Ананас Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1899 у в. Чырвоны Бераг, памёр у 1980.

СІДАРЭНКА Тарас Макаравіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Чырвоны Бераг, памёр у 1920.

СІДАРЭНКА Фадзей Герасімавіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Чырвоны Бераг, памёр у 1935.

СІДАРЭНКА Цімафей Іванавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Чырвоны Бераг, памёр у 1936.

ФЁДАРАЎ Ілья Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Чырвоны Бераг, памёр у 1942.

ФЁДАРАЎ Малах Андрэевіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Чырвоны Бераг, памёр у 1974.

ФЁДАРАЎ Фёдар Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Чырвоны Бераг, памёр у 1937.

ФЯДЗЯЧАНКА Антон Ціханавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Чырвоны Бераг, памёр у 1969.

ФЯДЗЯЧАНКА Аўрам Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Чырвоны Бераг, памёр у 1976.

ФЯДЗЯЧАНКА Ціхан Іванавіч, нарадзіўся ў 1897, памёр у 1936.

ХАХЛОЎ Кузьма Антонавіч, нарадзіўся ў 1897 на станцыі Тошчыца, памёр у 1984.

ЦІМАФЕЕЎ Аляксей Захаравіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Верхняя Тошчыца, памёр у 1957.

ЦІТОЎ Фадзей Пятровіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Чырвоны Бераг, памёр у 1936.

ШЛЯХТАЎ Сцяпан Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1897 на станцыі Тошчыца, памёр у 1938.

ЯЗЭПАЎ Майсей Іванавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Віляхаўка, памёр у 1980.

ЯШКОЎ Ілья Трафімавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Першае Мая.

ГАРАДЗЕЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАБЦОЎ Сідар Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Лубянка, памёр у 1986.

Бобруйский районный историко-краеведческий музей

БРЫТАВА (Кірпічэнка) Сусана Ананасаўна, нарадзілася ў в. Гарадзец у 1897; была сувязной Быхаўскага падраённага падпольнага камітэта РКП(б) у 1918, першая жанчына-кіраўнік камуны на Быхаўшчыне; памерла ў 1967.

ЖЫГАЛАЎ Аляксей Іванавіч, нарадзіўся ў 1886 у в. Гарадзец, памёр у 1970.

КАЗЛОЎ Арцём Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Лубянка, памёр у 1979.

КІРПІЧЭНКА Міхаіл Елісеевіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Гарадзец, загінуў у 1944.

КІРЭЕЎ Фёдар, узначальваў паўстанцкую групу ў в. Гарадзец у час акупацыі тэрыторыі павета кайзераўскімі войскамі.

МІХАСЕЎ Нічыпар Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Брасавінка, памёр у 1979.

НОСАРАЎ Мікалай Арцёмавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Гарадзец, памёр у 1967.

СІМАНКОЎ Акім Пятровіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Гарадзец, памёр у 1974.

СЫСОЕЎ Мікіта Максімавіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Гарадзец, памёр у 1978.

ТАРАНАЎ Якаў Пятровіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Гарадзец, памёр у 1972.

ФІЛІМОНАЎ Даніла Пятровіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Гарадзец, памёр у 1980.

ЦАГЕЛЬНІКАЎ Антон Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Гарадзец, загінуў у 1919.

ГЛУХСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АДАСЁЎ Карп Лаўрэнцьевіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Студзёнка, памёр у 1972.

БАДЗЬКОЎ Уладзімір Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Студзёнка, памёр у 1981.

ДРАЗДОЎСКІ Уладзімір Іванавіч (глядзі асобны артыкул).

КАДУНОЎ Харлам Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Глухі.

КАРАВАЦКІ Феакціст Рыгоравіч (глядзі асобны артыкул).

КРАСОЎСКІ Сцяпан Акімавіч (глядзі артыкул «Маршал авіяцыі»).

КУРАКІН Мікалай Паўлавіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Студзёнка, памёр у 1984.

КУРБАЦКІ Іосіф Іванавіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Новая Слабодка, у 1918—1920 у Чырвонай Арміі, ваяваў супраць белапалякаў у дэсантным атрадзе Дняпроўскай ваеннай флатыліі.

МАКЕЕЎ Гаўрыла Лявонцьевіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Усходняя.

ПАВЕЦКІ Георгій Мартынавіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Забродзе; у 1918—1920 ваяваў супраць інтэрвентаў і белагвардзейцаў у складзе Дняпроўскай ваеннай флатыліі; памёр у 1971.

ПАЗНЯКОЎ Емяльян Мітрафанавіч, нарадзіўся ў 1899 у в. Усходняя; з 1918 чырвоны партызан, чырвонаармеец 2-й Жалезнай дывізіі; памёр у 1970.

ПРОХАРАЎ Цімафей Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Глухі, памёр у 1979.

РАДЗЬКОЎ Тарас, нарадзіўся ў 1899 у в. Студзёнка, загінуў.

САЗОНЕНКА Фядос Васілевіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Студзёнка, памёр у 1983.

САРОКІН М. І.

САРОКІН Цімох Іванавіч (глядзі асобны артыкул).

САРОКІН Яфім Іванавіч, адзін з кіраўнікоў падпольнай групы ў в. Студзёнка, член падпольнага надрайкома РК КП(б)Б.

А. Ф. Казлоў.

М. А. Носараў.

САЎЧАНКА Андрэй Раманавіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Студзёнка; член Быхаўскага падпольнага падрайкома РКП(б) у час германскай акупацыі 1918; год смерці не ўстаноўлены.

САЎЧАНКА Сільвестр Мітрафанавіч, нарадзіўся ў 1892 ў в. Студзёнка, у 1920 машыніст кананерскай лодкі «Мудрый», ваяваў супраць белапалякаў.

СІВАКОЎ Дзмітрый Емяльянавіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Студзёнка, памёр у 1984.

СІВАКОЎ Якаў Герасімавіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Студзёнка; член Быхаўскага падраённага падпольнага камітэта РКП(б) у 1918, з лістапада 1918 — памочнік начальніка Быхаўскай павятовай міліцыі; год смерці не ўстаноўлены.

СУШЧЫНСКІ Ануфрый Захаравіч, нарадзіўся ў 1888 у в. Усходняя, памёр у 1973.

СУШЧЫНСКІ Ягор Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Усходняя, памёр у 1945.

ХАРЛАНАЎ Дарафей Пракопавіч, нарадзіўся ў в. Студзёнка, памёр у 1946.

ХАРЛАНАЎ Цімафей Пракопавіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Студзёнка.

ЯФРЭМАЎ Несцер Арцёмавіч, нарадзіўся ў в. Студзёнка, памёр у 1971.

ЯЎМЕНАЎ Яфім Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1899 у в. Студзёнка, памёр у 1980.

ГРУДЗІНАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАБРОЎ Восіп Васілевіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Рыжкаўка.

БАГДАНАЎ Фёдар Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1899 у в. Рыжкаўка, памёр у 1983.

БЕЛЫ Андрэй Іванавіч, нарадзіўся ў 1889 у в. Рыжкаўка.

БУРАЧКОЎ Ігнат Фаміч, нарадзіўся ў 1898 у в. Бутрамееўка.

ДЗЕМІНСКІ Сяргей Захаравіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Прыбераж.жа.

ЗАЙЦАЎ Тарас Ягоравіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Бынава, памёр у 1980.

КРАСЕЎ Ніканор Варфаламеевіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Рыжкаўка, памёр у 1983.

ЛАПЦЕЎ Ананас Пятровіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Чырвоны Асавец, памёр у 1986.

МАКСІМАЎ Антон Іванавіч, нарадзіўся ў 1888 у в. Прыбераж.жа, памёр у 1979.

СЕЛІВЕРСТАЎ Ягор Піліпавіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Грудзінаўка.

Быховский районный историко-краеведческий музей

З. А. Сцепанькоў.

Б. Е. Шампляхоў.

К. К. Шайтар.

В. К. Ярошка.

СМАЛЯКОЎ Леанід Апанасавіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Чырвоны Асавец.

СТАРАВОЙТАЎ Павел Іванавіч, нарадзіўся ў 1882 у в. Давыдавічы, памёр у 1980.

СЦЕПАНЬКОЎ Зосім Антонавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Чырвоны Асавец; баец 152-га стралковага палка, удзельнічаў у баях з нямецкімі інтэрвентамі, белапалякамі, пятлюраўцамі; памёр у 1988.

ЦАРАЎ Фёдар Антонавіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Бутрамееўка, памёр у 1986.

ЦЫГАНКОЎ Васіль Іванавіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Грудзінаўка.

ЧЫЖОЎ Піліп Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Бынава, памёр у 1977.

ШАМПЛЯХОЎ Баніфат Емяльянавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Бынава; у гады грамадзянскай вайны ваяваў супраць інтэрвентаў і белагвардзейцаў у партызанскім атрадзе, потым у Чырвонай Арміі ў корпусе Г. Дз. Гая і 1-й Коннай арміі, вызначыўся ў разгроме бандаў Махно, узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга; памёр у 1967.

ШЫЧКО Фёдар Калінкавіч (глядзі асобны артыкул).

ШАЙТАР Карп Купрыянавіч, нарадзіўся ў 1894, жыў у в. Грудзінаўка, памёр у 1973.

ШЧАРБІН Вілефан Кузьміч, нарадзіўся ў 1893 у в. Перакладавічы, памёр у 1981.

ЯРОШКА Восіп Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Чырвоны Асавец, памёр у 1967.

ДУНАЙКОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ДАНІЛАЎ Павел Парфенавіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Дзедава, памёр у 1988.

ДЗМІТРАЎ Карней Іванавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Хамічы, памёр у 1979.

ЛУКЯНАЎ Самуіл Карпавіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Дзедава, памёр у 1977.

МАКАРАНКА Фёдар Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Дунаёк, памёр у 1983.

МЕЛЬНІКАЎ Мікалай Ананьевіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Хамічы, памёр у 1978.

МЕЛЬНІКАЎ Сяргей Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Хамічы, памёр у 1977.

ПАЛАВІКОЎ Захар Архіпавіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Дзедава, памёр у 1943.

ПАЛАВІКОЎ Максім Піліпавіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Дзедава, памёр у 1943.

ПАЛАВІКОЎ Сцяпан Кіпанавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Тартак, памёр у 1980.

ПАЛАВІКОЎ Сцяпан Піліпавіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Дзедава, памёр у 1940.

ПАЛАВІКОЎ Уладзімір Іванавіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Дзедава, памёр у 1942.

ПАФЕРАЎ Васіль Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Хамічы, памёр у 1956.

ПІЛКОЎ Іван, нарадзіўся ў в. Дунаёк, у 1919 ваяваў у 1-й роце 149-га стралковага палка.

СІВАКОЎ Мікалай Ігнатавіч (глядзі асобны артыкул).

СІВАКОЎ Міхаіл Іванавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Праточнае, памёр у 1984.

СІВАКОЎ Міхаіл Раманавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Праточнае, памёр у 1981.

ТРАФІМАЎ Прохар Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Дзедава, памёр у 1978.

ШАНЦІЛЕНКА Герман Іларыёнавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Уюн, памёр у 1981.

ХМЯЛЬНІЦКІ Сямён Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Дзедава, памёр у 1955.

ЯКУБАЎ Сяргей Іванавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Дунаёк, памёр у 1980.

ЛУДЧЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

БАРАНАЎ Платон Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Няраж; у грамадзянскую вайну ўдзельнічаў у баях на Заходнім фронце; памёр у 1978.

БОНДАРАЎ Савелій Іларыёнавіч, нарадзіўся ў 1888 у в. Лудчыцы; у грамадзянскую вайну ўдзельнічаў у баях на Заходнім фронце; памёр у 1941.

БУБЛІКАЎ Васіль Селівестравіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Лудчыцы; у грамадзянскую вайну ваяваў у Чапаеўскай дывізіі; памёр у 1965.

БУДЗЯНКОЎ Фёдар Кузьміч, нарадзіўся ў 1887 у в. Няраж; у грамадзянскую вайну ўдзельнічаў у баях на Заходнім фронце; памёр у 1975.

ВОЛКАЎ Ягор Іванавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Лудчыцы; у грамадзянскую вайну ўдзельнічаў у баях на Заходнім фронце; памёр у 1970.

ГАЛІНОВІЧ Мікалай Максімавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Слабада.

ІВАНОЎ Кірыла Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Лудчыцы; у грамадзянскую вайну ваяваў у Чапаеўскай дывізіі; памёр у 1977.

Быховский районный историко-краеведческий музей

КАШАЛЬКОЎ Ілья Андрэевіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Няраж; у грамадзянскую вайну ваяваў у Чапаеўскай дывізіі; памёр у 1963.

КІРПІЧЭНКА Ціхан Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1896 у пас. Дубавое; ваяваў у 1-й Коннай арміі, вызваляў ад белагвардзейцаў Данбас, Крым. Скончыў у 1923 кавалерыйскую школу чырвоных камандзіраў, удзельнічаў у баях з басмачамі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны; памёр у 1983.

КУЛІКОЎ Філімон Платонавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Лудчыцы, чырвонагвардзеец, баец 152-га стралковага палка, год смерці не ўстаноўлены.

ЛАЦАПНЁЎ Іван Сідаравіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Лудчыцы; у грамадзянскую вайну ваяваў у Чапаеўскай дывізіі.

МАРОЗАЎ Аляксандр Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Няраж; у грамадзянскую вайну ваяваў у Чапаеўскай дывізіі; памёр у 1957.

НАВУМЕНКА Мікалай Навумавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Няраж; у грамадзянскую вайну ваяваў у Чапаеўскай дывізіі; памёр у 1953.

СІЛКОЎ Якаў Сяргеевіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Няраж; у грамадзянскую вайну ўдзельнічаў у баях на Заходнім фронце; памёр у 1975.

СМАЛЯКОЎ Мікалай Восіпавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Лудчыцы; у грамадзянскую вайну ўдзельнічаў у баях на Заходнім фронце.

ТУПАЛАЎ Сафрон Макеевіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Лудчыцы; у грамадзянскую вайну ваяваў у Чапаеўскай дывізіі; памёр у 1986.

НАВАБЫХАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АЛЬХОВІК Іван Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Лазаравічы, памёр у 1941.

АЛЬХОВІК Мітрафан Сідаравіч (глядзі асобны артыкул).

БЭЗАЎ Атрох Андрэевіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Ульянава, памёр у 1975.

БЭЗАЎ Ягор Андрэевіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Ульянава, памёр у 1957.

БЯЛКОЎ Фёдар Максімавіч, нарадзіўся ў 1901 у в. Лазаравічы, у 1919—1920 чырвонаармеец 4-й роты 508-га стралковага палка, ваяваў супраць белапалякаў на Гомельшчыне.

ВАРАБ'ЁЎ Антон Андрэевіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Новы Быхаў, памёр у 1983.

ДАВЫДАЎ Лекандрый Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Новы Быхаў, памёр у 1937.

ДАВЫДАЎ Пракоп Маркавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Новы Быхаў, памёр у 1953.

ДАВЫДАЎ Трафім Маркавіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Новы Быхаў.

ДАВЫДАЎ Ягор Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Новы Быхаў, загінуў у баях з калчакаўцамі.

ДЗЕРГАЧОЎ Андрэй Васілевіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Новы Быхаў, памёр у 1939.

ДЗЕРГАЧОЎ П., нарадзіўся ў в. Новы Быхаў, падпольшчык, расстраляны белапалякамі.

ДЗЕРГАЧОЎ Рыгор Захаравіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Новы Быхаў, памёр у 1975.

ДЗЕРГАЧОЎ Спірыдон Карпавіч (глядзі артыкул «Сын рэвалюцыі»).

ЕРАШЭНКА Барыс Піліпавіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Новы Быхаў, памёр у 1958.

ЕРАШЭНКА Талімон Піліпавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Новы Быхаў, памёр у 1979.

КАВАЛЁЎ Сямён Дзмітрыевіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Новы Быхаў, памёр у 1941.

М. М. Галіновіч.

Ц. Я. Кірпічэнка.

КАМІСАРАЎ Кірыла Талімонавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Новы Быхаў, памёр у 1952.

КАПОРЫКАЎ Ягор Ларыёнавіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Новы Быхаў, памёр у 1937.

КАРПІСОНАЎ Антон Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Новы Быхаў, у грамадзянскую вайну казначэй 508-га стралковага палка.

КІЖДУБЕНКА Еўдакім Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Новы Быхаў, памёр у 1936.

КУЛЯШОЎ Васіль Паўлавіч, нарадзіўся ў 1895 у пас. Рыхартава; удзельнік рэвалюцыйных падзей 1917 — 1918 чырвоны партызан, чырвонаармеец Гатчынскага палка, удзельнічаў у разгроме белай арміі Юдзеніча; памёр у 1971.

МАМАЕЎ Адам Цімафеевіч (глядзі асобны артыкул).

МАЦВЕЕНКА Васіль Яўменавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Новы Быхаў, памёр у 1935.

МАЦВЕЕНКА Піліп Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Новы Быхаў, памёр у 1937.

МАЦВЯЁНАК Іван Кузьміч, нарадзіўся ў 1895 у в. Новы Быхаў, чырвоны партызан, чырвонаармеец 152-га палка 17-й дывізіі, член КПСС, пасля грамадзянскай вайны жыў і працаваў у Мінску, у часы культу асобы Сталіна быў рэпрэсіраваны.

МІРОНЧЫК Канстанцін Несцеравіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Новы Быхаў, памёр у 1957.

ПАГОДКІН М.

ПОЛЬКІН Макар Фядосавіч, нарадзіўся ў в. Ульянава, памёр у 1939.

РАГАЛЁНКА Ілья Пракопавіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Тайманава; змагаўся за Савецкую ўладу ў чырвонагвардзейскім атрадзе, быў начальнікам медыцынскай службы, пасля грамадзянскай вайны скончыў медыцынскі інстытут у Ленінградзе, працаваў на розных пасадах у медыцынскіх установах; у Вялікую Айчынную вайну ўрач у перасоўным ваенным шпіталі, пасля вайны працаваў у Навабыхаўскай участковай бальніцы; памёр у 1970.

РАМАНАЎ Сяргей Паўлавіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Лазаравічы; член Быхаўскага рэўкома, у Чырвонай Арміі ў 1919—1922 камандаваў узводам, ротай; памёр у 1968.

САКАЛОЎ Мікалай Міхайлавіч, нарадзіўся ў в. Тайманава; камандаваў атрадам рабочых-чырвонагвардзейцаў з Петраграда, накіраваны на Быхаўшчыну для арганізацыі барацьбы супраць белапалякаў і кайзераўскіх войск.

Быховский районный историко-краеведческий музей

І. П. Рагаленка.

Р. Г. Каліноўскі.



Л. Д. Кардабнёў.

А. В. Лёвачкін.

САЛДЫБАНАЎ Аўлас Гаўрылавіч, нарадзіўся у 1893 у в. Новы Быхаў, памёр у 1976.

САЛДЫБАНАЎ Мацвей Гаўрылавіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Новы Быхаў, памёр у 1943.

СЕЛІВАНАЎ Аляксандр Пятровіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Новы Быхаў, памёр у 1933.

СЯРГЕЕНКА Мікіта Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Лазаравічы, памёр у 1970.

УСІКАЎ Восіп Кузьміч, нарадзіўся ў 1895 у в. Новы Быхаў, памёр у 1960.

ФЕДАСЕЕНКА Раман Васілевіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Новы Быхаў, памёр у 1960.

ЦІТКОЎ Емяльян Васілевіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Адаменка, памёр у 1957.

ШАБЛАЎНЁЎ Восіп Сафонавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Новы Быхаў, памёр у 1933.

ШАБЛАЎНЁЎ Павел Сафонавіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Новы Быхаў, памёр у 1959.

ШЧАРБАКОЎ Кандрат Яўменавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Новы Быхаў, памёр у 1965.

ЯКІМАЎ Цімох Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Лазаравічы, памёр у 1939.

ЯКІМЧАНКА Захар Сідаравіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Лазаравічы, памёр у 1978.

ЯЎСЕЕЎ Іван Сяргеевіч, нарадзіўся ў 1901 у в. Лазаравічы, чырвонаармеец 4-й роты 508-га стралковага палка, ваяваў супраць белапольскіх войск на Гомельшчыне.

ЯЎСЕЕЎ Мацвей Андрэевіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Лазаравічы, памёр у 1958.

СЛЕДЗЮКОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АЗАРАНКА Якоп Платонавіч, нарадзіўся ў 1899 у в. Хацьмілле, памёр у 1984.

АНІКЕЕЎ Міхаіл Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Следзюкі, памёр у 1948.

БЕЛАВУСАЎ Андрэй Паўлавіч, нарадзіўся ў 1885 у в. Следзюкі, памёр у 1939.

БУКЕТАЎ Іван Емяльянавіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Следзюкі, памёр у 1972.

БУКЕТАЎ Сяргей Емяльянавіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Следзюкі, памёр у 1930.

БЭЗАЎ Ягор Андрэевіч, нарадзіўся ў 1888 у в. Следзюкі, памёр у 1968.

ВЕЛЯШКОЎ Пётр Іванавіч, нарадзіўся ў 1899 у в. Следзюкі, памёр у 1984.

ГУЗЛОЎ Пётр Іванавіч, нарадзіўся ў в. Следзюкі ў 1898, памёр у 1982.

ЗЕЙДАК Фрыц Іванавіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Латкалонія, памёр у 1977.

КАВАЛЁЎ Лукаш Антонавіч, нарадзіўся ў 1889 у в. Следзюкі, памёр у 1964.

КАВАЛЁЎ Піліп Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Следзюкі, памёр у 1951.

КАВАЛЁЎ Сяргей Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Следзюкі памёр у 1960.

КАЛАЎШКІН Гаўрыла Лазаравіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Следзюкі, памёр у 1982.

КАРДАБНЁЎ Лаўрэнцій Данілавіч, нарадзіўся ў 1880 у в. Кузькавічы, памёр у 1942 у Магнітагорску.

КУДАКЦІН Ціт Іванавіч, нарадзіўся ў 1889 у в. Следзюкі, памёр у 1969.

КУЛЯШОЎ Апанас Арцёмавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Следзюкі, памёр у 1973.

КУЛЯШОЎ Ізот Арцёмавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Следзюкі, загінуў у 1919.

КУЛЯШОЎ Сяргей Адамавіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Следзюкі, памёр у 1945.

КУСІНАЎ Яўграф Капітонавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Следзюкі, памёр у 1921.

КУХАРАЎ Фядос Спірыдонавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Следзюкі, памёр у 1964.

ЛЁВАЧКІН Андрэй Восіпавіч, нарадзіўся ў 1899 у в. Краснiца, памёр у 1980.

МАХУНОЎ Антон Майсеевіч, нарадзіўся ў 1888 у в. Следзюкі, памёр у 1981.

ПЕКУСАЎ Андрэй Іванавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Следзюкі, памёр у 1940.

ПРАХАРЭНКА Парфен Кандратавіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Следзюкі, памёр у 1968.

РАБЦАЎ Міхаіл Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1889 у в. Следзюкі, памёр у 1959.

РАБЦАЎ Якаў Васілевіч, нарадзіўся ў 1887 у в. Следзюкі, памёр у 1978.

СЛАШЧЫКАЎ Павел Яфімавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Следзюкі, памёр у 1943.

ФЯДОСАЎ Пракоп Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1887 у в. Следзюкі.

ЧАРНЯКОЎ Пракоп Мартынавіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Следзюкі.

ЯКІМАЎ Максім Аўрамавіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Следзюкі, памёр у 1953.

ТРЫЛЕСІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АРЭШКАЎ Стафан, нарадзіўся ў 1889 у в. Трылесіна, загінуў у 1917.

Быховский районный историко-краеведческий музей

БАРЫСЕВІЧ Антон, нарадзіўся ў в. Ветранка, загінуў у баях з басмачамі.

БАХАНЬКОЎ Мікалай Стафанавіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Трылесіна, памёр у 1942.

ГАНЧАРОЎ Якаў Мартынавіч, нарадзіўся ў 1883 у в. Трылесіна, памёр у 1965.

ГАРАЎЦОЎ Павел Ільіч, нарадзіўся ў 1884 у в. Трылесіна, памёр у 1968.

ДВАРАКОЎ Мікіта Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1872 у в. Трылесіна, памёр у 1947.

ДВАРАКОЎ Цімафей Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1878 у в. Трылесіна, памёр у 1948.

КІШКУНОЎ Сяргей Дзянісавіч, нарадзіўся ў 1873 у в. Трылесіна, памёр у 1944.

КУЛАЖЫН Васіль Іванавіч, нарадзіўся ў 1883 у в. Трылесіна, памёр у 1942.

КУЛАЖЫН Марк Іванавіч, нарадзіўся ў 1872 у в. Трылесіна, памёр у 1939.

КУЛАЖЫН Пётр Юр'евіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Трылесіна, памёр у 1936.

КУЛАЖЫН Фёдар Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Трылесіна, памёр у 1980.

КУЛІКОЎ Ілья Емяльянавіч, нарадзіўся ў 1876 у в. Боўкі, памёр у 1970.

КУРСАКОЎ Павел Трафімавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Ветранка; у Чырвонай Арміі з 1918, камандзір узвода, эскадрона, камісар палка (падрабязна яго біяграфію глядзі ў артыкуле «Справа ўсяго жыцця»).

ЛАЧОЎ Уладзімір Аляксеевіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Трылесіна, памёр у 1942.

МАЁРАЎ Канстанцін Антонавіч, нарадзіўся ў 1902 у в. Ветранка.

МАЛАШОНАК Якаў Майсеевіч, нарадзіўся ў 1880 у в. Трылесіна, памёр у 1969.

ПУГАЧОЎ Максім Іванавіч, нарадзіўся ў 1880 у в. Трылесіна, памёр у 1928.

РАДЗЬКО Марыя Антонаўна, нарадзілася ў 1893 у в. Ветранка; у 1918 сувязная Быхаўскага падраённага падпольнага камітэта РКП(б); памерла ў 1973.

СТАНКОЎ Васіль Пятровіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Трылесіна, памёр у 1976.

ШАРШНЕЎ Мікіта Кузьміч, нарадзіўся ў 1887 у в. Боўкі, памёр у 1943.

ШВАЕЎ Барыс Цярэнцьевіч, нарадзіўся ў 1877 у в. Трылесіна, памёр у 1943.

ШВАЕЎ Пётр Цярэнцьевіч, нарадзіўся ў 1886 у в. Трылесіна, памёр у 1945.

ШВАЕЎ Фядос Цярэнцьевіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Трылесіна, памёр у 1943.

ХОЛСТАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

АБРАМОВІЧ Данііла Мартынавіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Мокрае.

АБРАМОВІЧ Рыгор Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Пінюці; у 1919—1922 у Чырвонай Арміі, інвалід Вялікай Айчыннай вайны, памёр у 1981.

БЕЛЬСКАЯ Еўдакія Уладзіміраўна, нарадзілася ў 1894 у в. Мокрае; з 1918 па 1921 медсястра ў 10-й дывізіі 16-й арміі; памерла ў 1966 (больш падрабязна пра Е. У. Бельскую глядзі ў артыкуле «Удзельніца трох войнаў»).

БАРАНКЕВІЧ Сямён Яфімавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Мокрае; з 1919 у Чырвонай Арміі, удзельнічаў у баях супраць арміі генерала Юдзеніча; памёр у 1981.

ДЗІГАЛЁЎ Раман Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1899 у в. Лапша; у 1919—1922 у Чырвонай Арміі; памёр у 1980.

М. А. Радзько.

Д. М. Абрамовіч.

ЕМЯЛЬЯНАЎ-ЕЛКІН Дзмітрый Раманавіч (глядзі асобны артыкул).

ІНДЗЮКОЎ Пётр Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Трасцівец; у 1919—1921 у Чырвонай Арміі; памёр у 1986.

ІНДЗЮКОЎ Якаў Ульянавіч (глядзі асобны артыкул).

КАЛІНОЎСКІ Рыгор Герасімавіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Сушчоў; ваяваў у 152-м Быхаўскім палку, потым працаваў у калгасе; памёр у 1969.

КЛЕЦІК Канстанцін Лявонцьевіч (глядзі асобны артыкул).

КРАСІЦКІ Сцяпан Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Мокрае, загінуў у Вялікую Айчынную вайну.

КРАСНІЦКІ Андрэй Дзмітрыевіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Мокрае; у 1918 добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію; памёр у 1941.

КРАСНІЦКІ Іван.

КРАСНІЦКІ Кірыла Максімавіч, нарадзіўся ў 1899 у в. Мокрае, загінуў у баях за Савецкую ўладу.

КУЛЯШОЎ Фама Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1888 у в. Сядзіч, памёр у 1934.

ЛЯВОНАЎ Нічыпар Сяргеевіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Сядзіч; у 1918—1922 добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, служыў да 1922; памёр у 1985.

МАНДРЫК Аляксандр Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1900; загінуў у 1919 у Гомелі ў час падаўлення стракапытаўскага мяцяжу.

МАНДРЫК Апанас Кандратавіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Мокрае, загінуў у Вялікую Айчынную вайну.

МАНДРЫК Іван Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Мокрае; у 1918 добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію; памёр у 1973.

МАНДРЫК Мікалай Іванавіч, нарадзіўся ў 1892 у в. Мокрае; у 1918 добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію; памёр у 1972.

МАНДРЫК Пётр Раманавіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Макранскія Хутары; у 1919—1922 у Чырвонай Арміі; памёр у 1983.

МАНДРЫК Раман Апанасавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Мокрае, загінуў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

МАНДРЫК Фёдар Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Мокрае, загінуў у баях за Савецкую ўладу.

НАРОЎСКІ Барыс Аляксеевіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Мокрае; служыў у Чырвонай гвардыі; памёр у 1919.

НАРОЎСКІ Пётр Уласавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Мокрае; адзін з арганізатараў Савецкай улады на Бы-

Быховский районный историко-краеведческий музей

С. Я. Караткевіч.

І. Ф. Касцюкоў.

хаўшчыне ў 1917, член павятовага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта; памёр у 1942.

НОВІКАЎ Фёдар Раманавіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Холстава; у 1919—1922 у Чырвонай Арміі; памёр у 1981.

ПІВАВАРАЎ Ілья Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Сядзіч; у 1918 добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, служыў да 1921; памёр у 1981.

ПІСАРЭНКА Ягор Парфенавіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Мокрае, памёр пасля ранення на фронце ў Вялікую Айчынную вайну.

ПЯТРОВА Феадосся Яўсееўна, нарадзілася ў 1897 у в. Людкоў; член бальшавіцкай падпольнай арганізацыі ў час белапольскай і нямецкай акупацыі ў 1918; памерла ў 1979.

РУДКОЎСКІ Апанас Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1899 у в. Мокрае, загінуў у 1920.

РУДКОЎСКІ Даніла Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Мокрае; у 1918 добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію; памёр у 1968.

РУДКОЎСКІ Мацвей Лявонцьевіч (глядзі асобны артыкул).

РУДКОЎСКІ Мікалай Лявонавіч, нарадзіўся ў 1878 у в. Мокрае; служыў у чырвонагвардзейскім атрадзе П. Е. Дубенкі, удзельнічаў у разгроме контррэвалюцыйнай Стаўкі ў Магілёве; памёр у 1947.

САМАЛЁТАЎ Апанас Пракопавіч, нарадзіўся ў 1886 у в. Сядзіч, загінуў у 1919 пры вызваленні Кіева ад белагвардзейцаў.

СТАРАВОЙТАЎ Іван Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1899 у в. Холстава; у 1919—1922 у Чырвонай Арміі; памёр у 1986.

САЎЧАНКА Сямён Мітрафанавіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Сушчоў; памёр у 1973.

СЦЯПАНАЎ Пётр Фаміч, нарадзіўся ў 1900 у в. Малінаўка, памёр у 1973.

ФІТКЕВІЧ Георгій Міронавіч, нарадзіўся ў 1895 у в. Мокрае; у 1918 добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію; памёр у 1942.

ФЯДКЕВІЧ Георгій Мікітавіч (Міхайлавіч), нарадзіўся ў 1896 у в. Макранскія Хутары, удзельнік штурму Зімняга палаца, у 1920 у складзе Дняпроўскай ваеннай флатыліі ўдзельнічаў у Лоеўскім прарыве караблёў супраць войск буржуазнай Польшчы.

ЮРКЕВІЧ Ісак Яўгенавіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Мокрае; служыў у Чырвонай гвардыі; памёр у 1931.

ЧАРНАБОРСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЕРХАЎЦОЎ Мітрафан Алімпавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Яленшчына, памёр у 1987.

КАРАТКЕВІЧ Сяргей Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Балонаўка, памёр у 1972.

ЛАЗАРЭНКА Сямён Аляксеевіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Балонаў Сялец, у 1919—1920 у Чырвонай Арміі, машыніст кананерскай лодкі «Громкі» Дняпроўскай ваеннай флатыліі.

ЛАХАДЫНАЎ Мікіта Пракопавіч, нарадзіўся ў 1901 у в. Падгаворка; член КПСС, у грамадзянскую вайну з 1920 чырвонаармеец 137-га стралковага палка 45-й стралковай дывізіі, удзельнічаў у баях супраць белапалякаў, арміі генерала Урангеля, штурмаваў Перакоп.

МЕЛЬНІКАЎ Аляксандр Паўлавіч, нарадзіўся ў 1899 у в. Чачэвічы, памёр у 1986.

ПАЗНЯКОЎ Яфім Кузьміч, нарадзіўся ў 1901 у в. Балонаўка, памёр у 1983.

ПАЛЯНСКІ Сцяпан Елісеевіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Балонаў Сялец, ваяваў у складзе Дняпроўскай ваеннай флатыліі.

ПУТРАНКОЎ Васіль Парфенавіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Чачэвічы, памёр у 1981.

ПЯЧКОЎСКІ Канстанцін Ермалаевіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Чачэвічы, памёр у 1979.

САВІЦКІ Раман Варфаламеевіч (глядзі асобны артыкул).

СТАФАНОЎСКІ Мечаслаў (глядзі асобны артыкул).

ЧАХОЎСКІ Ілья Макаравіч, нарадзіўся ў 1886 у в. Кучын, у 1920 марак Дняпроўскай ваеннай флатыліі.

ЧЫРВОНАСЛАБОДСКІ СЕЛЬСАВЕТ

БУХМІСТРАЎ Ерафей Навумавіч, нарадзіўся ў в. Хачынка.

ГАЎРЫЛЕНКА Сідар Ігнатавіч (глядзі асобны артыкул).

КАПЛУНОЎ Андрэй Ягоравіч, нарадзіўся ў 1897 у в. Чырвоная Слабада.

КАДРАЎ Філімон Васілевіч, нарадзіўся ў 1893 у в. Прыбар, памёр у 1976.

КЛІМАЎ Іларыён Андрэевіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Александроў, памёр у 1982.

КРЫВУЛЬКІН Ісак Цітавіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Хачынка.

КУЛІКОЎ Андрэй Яфрэмавіч, нарадзіўся ў 1891 у в. Прыбар, памёр у 1980.

ЛАЗАРАЎ Іван Малахавіч, нарадзіўся ў 1889 у в. Хачынка, памёр у 1982.

ЛОСІКАЎ Дзяніс Арцёмавіч, нарадзіўся ў 1896 у в. Чырвоная Слабада, памёр у 1981.

МАКСІМЕНКА Ягор Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1898 у в. Чырвоная Слабада, памёр у 1983.

МІКАЛАЕЎ Антон Цітавіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Чырвоная Слабада, памёр у 1981.

СВІРЫДЗЕНКА Мітрафан Паўлавіч, нарадзіўся ў в. Новы Свет, памёр у 1981.

СІВАГРАКАЎ Максім Сямёнавіч (глядзі асобны артыкул).

СІВАГРАКАЎ Якаў Дзямідавіч, нарадзіўся ў 1890 у в. Ліпаўка, памёр у 1986.

ЦІХАНАЎ Павел Якаўлевіч (глядзі асобны артыкул).

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

ЯМНІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

АНТОНАЎ Дзмітрый Мікалаевіч.

АНТОНАЎ Пётр Мікалаевіч (глядзі артыкул «Браты Антонавы»).

КАСЦЮКОЎ Іван Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Ямнае; у грамадзянскую вайну на Паўднёвым фронце, удзельнік баёў супраць войск генерала Урангеля; удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі; памёр у 1987.

МІРАНЦОЎ Ціхан Яфімавіч (глядзі асобны артыкул).

ЯКУБЁНАК Фёдар Пятровіч, нарадзіўся ў 1902 у в. Ямнае, памёр у 1979.

ЯШЧАНКА Піліп Сідаравіч, нарадзіўся ў 1894 у в. Лагадава; у грамадзянскую вайну на Паўднёвым фронце; удзельнік баёў супраць войск генерала Урангеля; памёр у 1973.

* * *

БУДКЕВІЧ Іван Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1900 у в. Соліна Глухскай воласці Быхаўскага павета; у 1921—1922 чырвонаармеец, служыў на вартавым судне «Горды».

САБАЛЕЎСКІ Цімафей Дзмітрыевіч, нарадзіўся ў в. Зарэчча Глухскай воласці, у 1918 разведчык 151-га стралковага палка Чырвонай Арміі.

Узнагароды ветэранам

28 кастрычніка 1967 г. ў сувязі з 50-годдзем Вялікага Кастрычніка Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР выдаў Указ аб узнагароджанні актыўных удзельнікаў Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, грамадзянскай вайны і барацьбы за ўстанаўленне Савецкай улады ў 1917—1922 гг. ордэнамі і медалямі СССР. Па Быхаўскім раёне былі ўзнагароджаны:

ордэнам Леніна: Скажанюк Юлій Паўлавіч; **ордэнам Чырвонага Сцяга:** Кірпічэнка Ціхан Якаўлевіч, Пазнякоў Яфім Кузьміч, Шычко Фёдар Калінкавіч; **ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга:** Шайтар Карп Купрыянавіч; **ордэнам Чырвонай Зоркі:** Мужычкоў Яфрэм Трафімавіч; **ордэнам «Знак Пашаны»:** Пчалянкоў Фёдар Сцяпанавіч, Рагаленка Ілья Пракопавіч; **медалём «За адвагу»:** Галіновіч Мікалай Максімавіч, Івашка Кірыла Міхайлавіч, Каган Меер Мендэлевіч, Караткевіч Сяргей Якаўлевіч, Кузняцоў Андрэй Сямёнавіч, Мурашка Пётр Вікенцьевіч, Расін Абрам Гілевіч; **медалём «За баявыя заслугі»:** Абрамовіч Даніла Мартынавіч, Гузлоў Пётр Іванавіч, Дзёмінскі Сяргей Захаравіч, Кадраў Філімон Васілевіч, Казлоў Арцём Фёдаравіч, Куляшоў Васіль Паўлавіч, Лёвачкін Андрэй Восіпавіч, Маёраў Канстанцін Антонавіч, Муштукоў Ананій Акімавіч, Пазнякоў Емяльян Мітрафанавіч, Рудкоўскі Сцяпан Антонавіч, Саўчанка Сямён Мітрафанавіч, Турчыкаў Іосіф Цярэнцьевіч, Чаркашын Васіль Пракопавіч, Шыбанаў Кузьма Назаравіч; **медалём «За працоўную доблесць»:** Андрэёў Еўдакім Зосімавіч, Каравацкі Феакціст Рыгоравіч, Кузьмін Андрэй Мацвеевіч, Пячкоўскі Канстанцін Ермалаевіч, Радзько Марыя Антонаўна; **медалём «За працоўную адзнаку»:** Іскольскі Міхаіл Абрамавіч, Сцяпанаў Пётр Фаміч.

Быховский районный историко-краеведческий музей



1921
1941

Быховский районный историко-краеведческий музей

ДА НОВАГА ЖЫЦЦЯ

У выніку інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны Быхаўскі павет, як і ўся Беларусь, перажываў вялікія эканамічныя цяжкасці. Значна скараціліся пасяўныя плошчы, знізілася ўраджайнасць. Бяздзейнічала большасць прамысловых прадпрыемстваў.

У гэты цяжкі час сапраўдным штабам быў павятовы камітэт партыі, які шмат увагі аддаваў палітычнай рабоце і ўмацаванню Саветаў, прафсаюзаў, кааператываў і камітэтаў узаемадапамогі, жансаветаў і камсамола, праз якія мабілізаваў працоўных на аднаўленне народнай гаспадаркі.

У рэзалюцыі VI Быхаўскай павятовай партыйнай канферэнцыі, што адбылася ў жніўні 1920 г., было запісана:

«Камуністычная партыя, воляй Рэвалюцыі стаўшая на чале змагаючагася пралетарыяту, прыцягвала ў свае рады масы рабочых, сялян і працоўнай інтэлігенцыі. Гэтыя масы, інстынктыўна імкнучыся да партыі, часта з-за сваёй палітычнай неадукаванасці, пад уплывам суровых умоў моманту або зусім выходзяць з партыі, або не могуць прыносіць ёй карысці, застаючыся ў яе радах. Таму велізарная ўвага павінна быць звернута на палітычнае выхаванне членаў РКП».

У адпаведнасці з рашэннем канферэнцыі ў пачатку лістапада 1920 г. павятком партыі стварыў партыйную школу, першы выпуск яе (15 чалавек) адбыўся 5 лютага 1921 г.

11 верасня 1920 г. ў Быхаве быў скліканы з'езд прафсаюзаў, на якім прысутнічала 55 дэлегатаў. У парадку дня — даклады старшыні павятовага саўнаргаса т. Брытава, камісара павятовага прадкома т. Трафімава, пытанні выхавання мас, прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, забеспячэння рабочых і г. д.

На наступны дзень адбыўся IV павятовы з'езд Саветаў, яму папярэднічалі перавыбары сельскіх і валасных Саветаў. Асноўнае пытанне на з'ездзе — пераход да мірнай працы. Была прынята адозва да сялян Быхаўшчыны. У склад павятовага выканкома былі выбраны 16 камуністаў, а ўзначаліў выканком Яўхім Сарокін, чалавек, чый аўтарытэт сярод сялян быў непахісным.

11 студзеня 1921 г. адбылася павятовая канферэнцыя работніц і сялянак. Быў створаны жансавет, у састаў якога павятком партыі рэкамендаваў трох актывістак — Нікіціну, Рыжанкову і Двоскіну. Камітэт партыі прымаў меры па ўмацаванню павятовага палітбюро (ЧК), на гэтую адказную работу былі рэкамендаваны Н. Л. Француз і Г. Я. Дорахаў. Шмат увагі аддавалі моладзі. Адказным за работу з ёй у павяткоме прызначылі члена бюро Азерскага. Ва ўсе воласці павета накіравалі інструктараў для арганізацыі камсамольскіх ячэек. Першыя ж камсамольскія ячэйкі на Быхаўшчыне былі створаны ў 1918—1920 гг. у Быхаве, на шклозаводзе ў Ветранцы, у вёсках Новы Быхаў, Гарадзец. У Быхаве склікаецца беспартыйная канферэнцыя моладзі, праходзяць сумесныя пасяджэнні павяткомаў партыі і камсамола. Шырокі размах набыла агітацыйна-прапагандысцкая і культурна-асветная работа. Звыклай з'явай сталі мітынгі, мітынгі-канцэрты. Адчыняліся хаты-чытальні, агітпункты, бібліятэкі. У в. Балонаў Сялец ініцыятыўная камсамолка Дар'я Верхаўцова ўзначаліла работу хаты-чыталь-

Члены Быхаўскага павятовага камітэта партыі. 1920 г.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Д. А. Вярхоўцава.

ні і зрабіла яе лепшай у павеце. У Ветранцы камсамольцы шклозавода стварылі агітбрыгаду. Па ініцыятыве аддзела палітасветы павяткома партыі былі арганізаваны курсы загадчыкаў хатчытальняў. Першы набор курсаў — 40 чалавек.

Прымаліся першыя захады па ліквідацыі непісьменнасці: у вёсках адкрывалі пачатковыя дзённыя і вячэрнія школы сялянскай моладзі. У Касіцкай школе, напрыклад, пажадалі вучыцца 40 чалавек дарослых, сярод іх 16 жанчын. Звярталася ўвага на ахову здароўя сялян, былі арганізаваны фельчарскія пункты. У першай пяцігодцы ў раёне працавала 13 медустаноў.

Дзейнасць павяткома партыі ахоплівала розныя бакі жыцця: аднаўленне гаспадаркі і нарыхтоўка хлеба для рабочых і Чырвонай Арміі, дапамога галадаючым і будаўніцтва мастоў, рамонт дарог, стварэнне школ і барацьба з бандытызмам. А жыццё ставіла ўсё новыя і новыя праблемы.

Асноўная ўвага была скіравана на адраджэнне сельскай гаспадаркі: краіне патрэбен быў хлеб. Актыўна дапамагалі вёсцы гараджане. У жніўні 1920 г. жыхары Быхава на суботніках адрамантавалі сялянам 662 плугі, 16 хлявоў, перацягнулі 23 колы, зрабілі 69 вазоў, узаралі 257 дзесяцін зямлі, адрамантавалі 6 школ, больш за 80 км дарог і г. д. 8 жніўня 1920 г. газета «Боха и молот» пісала, што чырвонаармейцы 5-га ўчастка Заходняй шашы правялі ў в. Чачэвічы камуністычны суботнік па аказанню дапамогі сем'ям чырвонаармейцаў у палявых работах: «...Касілі лугі. Ішоўшыя са сваіх работ сяляне на прапанову палітработніка дапамагчы агульнай рабоце, ахвотна згадзіліся... Суботнік пакінуў у мясцовых сялян добрае ўражанне».

Важнай падзеяй з'явілася першая павятовая сельгасканферэнцыя (1—3 красавіка 1922 г.). Асноўным пытаннем было зямельнае. У пастанове гаварылася, што канферэнцыя цалкам ухваляе пастанову УСНК, якая дала магчымасць усяму сялянству адрадзіць гаспадарку па свайму меркаванню, падзяленне грамадзян зямлёй прайшло па рашэнню ўзвых трэціх жыхароў сяла. Пры вырашэнні зямельнага пытання асаблівая ўвага аддавалася беззямельным сялянам. Яны надзяляліся зямлёй у першую чаргу. Ім аказвалі дапамогу інвентаром, насеннем, лесаматэрыяламі і інш.

У рэзалюцыі аб сельскагаспадарчай кааперацыі самай жыццёвай неабходнасцю на той момант

Дэлегаты 2-й Быхаўскай павятовай канферэнцыі РКСМ.
Восень 1920 г.

Быховский районный историко-краеведческий музей

было названа аб'яднанне сялян у сельскагаспадарчыя кааператывы. Пры падтрымцы дзяржавы кааператыўныя аб'яднанні слабых гаспадарак змогуць стаць у хуткім часе незалежнымі ад моцных, часта не працоўных гаспадарак. Прызнаючы важнасць і неабходнасць развіцця сельгаскааперацыі, канферэнцыя адзначыла, што галоўным і асноўным рычагом у развіцці кааперацыі на тым этапе з'яўляліся крэдытныя таварыствы, вакол якіх і павінны аб'ядноўвацца разрозненыя гаспадаркі. Канферэнцыя заклікала сялян павета ствараць селькомы там, дзе іх яшчэ не было.

Вялікая палітычная і арганізатарская работа, самаадданая праца рабочых і сялян прынеслі свае вынікі. На 15 сакавіка 1923 г. ў Быхаве былі адноўлены і працавалі 148 прамысловых прадпрыемстваў і арцелей. Пачаў даваць прадукцыю шклозавод у в. Ветранка. У 1922—1923 гг. сяляне павета здалі дзяржаве 353 тысячы пудоў збожжа. У 1923—1924 гг. прыступілі да меліярацыі зямель. У Быхаве былі створаны меліярацыйныя таварыствы імя Леніна і «Праца». У 1926 г. сяляне в. Вараніно таксама стварылі меліярацыйнае таварыства. На асушаных землях было вырашана заснаваць лугавую гаспадарку (у 1930 г. створаны саўгас «Вараніно», да 1938 г. спецыялізаваўся на нарыхтоўцы сена для кавалерыйскіх часцей Чырвонай Арміі).

У напружанай рабоце па аднаўленні народнай гаспадаркі нараджаліся першыя героі працы, актывісты. 28 ліпеня 1921 г. селянін в. Чыгірынка Мікіта Захаравіч Мінчукоў стаў першым кавалерам ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга. Высокай узнагароды ён быў удастоены за выключны гераізм, праяўлены пры выратаванні моста цераз р. Друць у час крыгаходу. У 1925 г. сялянка в. Трасцівец Юлія Пятроўна Казлоўская першая з жанчын рэспублікі была выбрана членам ЦВК БССР. Праз два гады членам урада рэспублікі выбралі работніцу шклозавода «Ільіч» Сцепаніду Антонаўну Радзько. Былая вясковая настаўніца, адважная падпольшчыца ў час польскай і нямецкай акупацыі Сусана Апанасаўна Брытава (Кірпічэнка) разам з аднавяскоўцамі арганізавала камуну, якой далі імя К. Маркса.

У 1-й палове 1920-х гадоў працоўныя краіны ўважліва, з трывогай і надзеяй сачылі за паведамленнямі аб стане здароўя правадыра рэвалюцыі У. І. Леніна. У гэтыя дні ў адрас Ільіча ішлі сотні пісем, тэлеграм з усіх бакоў неабсяжнай краіны з пажаданнямі хутчэйшага выздараўлення, словамі падтрымкі. Ішлі яны і з Быхаўскага павета. У студзені 1924 г. вялікае гора напаткала краіну — памёр У. І. Ленін. Усюды праходзілі жалобныя мітынгі і сходы. Адбыліся яны і ў Быхаве і вёсках павета.

ТЕАТР ХУДОЖЕСТВ

В среду 18 Февраля 1920 г.

Состоятся ДОКЛАДЫ тов.

СЫРОМОЛОТОВА

На тему

Коммунистическая Молодежь и Мировая Революция

С. СОРОКИН

История юношеского движения и коммунистическ. Интернационал Молодежи

После докладов большой

КОНЦЕРТ

Вход по билетам которые можно получ бесплатно в комсомоле

Начало в 6 час. веч. Выховск. к-т союза молодежи

Аб'ява Быхаўскага райкома камсамола.

Рабочыя Ветранскага шклозавода «Ільіч» 29 студзеня паслалі ў адрас ЦК РКП(б) пісьмо, якое зберагліся ў архіве. Вось што яны пісалі: «Рабочыя шклозавода «Ільіч» Быхаўскага павета выказваюць Вам свой смутак і заяўляюць: цяжкая наша агульная страта, але калектыўнымі намаганнямі рабочага класа пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі будуць поўнасцю ажыццёўлены запаветы Ільіча.

У дзень пахавання нашага любімага правадыра, імем якога названы наш завод, агульны сход нашых рабочых выказвае глыбокае спачуванне Камуністычнай партыі і Камінтэрну, пад сцягам якіх жыў, змагаўся і памёр Ільіч.

Рабочаму класу і сялянству Расіі ўдалося перамагчы і ўзяць уладу ў свае рукі толькі таму, што яны ішлі нага ў нагу з Камуністычнай партыяй, пад кіраўніцтвам выпрабаванага правадыра-барацьбіта тав. Леніна.

Цяжкія выпрабаванні прадстаяць яшчэ рабочаму класу. На шляху да перамогі цяжкасці ўскладняюцца стратай Ільіча. Толькі шчыльней самкнуўшы свае рады і з'яднаўшыся вакол Камуністычнай партыі, увасобіўшай у сабе запаветы тав. Леніна, мы здолеем пераадолець цяжкасці ў барацьбе за канчатковыя мэты рабочага класа.

Ільіч памёр, але запаветы яго жывыя. Гэтыя запаветы мы ажыццявім пад кіраўніцтвам Расійскай Камуністычнай партыі.

Старшыня сходу Якаўлеў».

На мітынгах і сходах з выпадку смерці У. І. Леніна перадавыя рабочыя выказвалі просьбы аб прыёме іх у партыю. Паводле рашэння Пле-

Быховский районный историко-краеведческий музей

нума ЦК РКП(б) быў аб'яўлены масавы прыём у партыю перадавых рабочых ад станка. У выніку ленінскага прызыву ў партыю Быхаўская партарганізацыя папоўнілася яшчэ дзвюма партячэйкамі (на чыгуначнай станцыі і лесапільным заводзе).

Сацыялістычныя пераўтварэнні на Быхаўшчыне, як і ў цэлым па краіне, праходзілі няпроста, у складаных абставінах абвастрэння класавай барацьбы, пошукаў рэальных і эфектыўных шляхоў будаўніцтва новага ладу. Палітыка ваеннага камунізму, харчразвёрстка і іншыя меры ўлады выклікалі супрацьдзеянні як адкрытых ворагаў, так і некаторай часткі, пераважна заможнага, сялянства. Праяўляліся яны ў актах сабатажу, ухілення ад харчразвёрсткі, бандытызму. У лістападзе 1920 г. бандыты люта закатавалі камуністаў Часніцкага, Цёмкіна, Раманава і члена павятовага камітэта камсамола Аўруціна. Бандыцкія стрэлы абарвалі жыццё палымяных бальшавікоў старшыні Грудзінаўскага валрэўкома Сцяпана Кандрычыны, чэкістаў — старшыні павятовага палітбюро Навума Француза і сакратара палітбюро Георгія Дорахава. 21 студзеня 1925 г. кулакі з-за вугла забілі старшыню Макранскага камітэта сялянскай узаемадапамогі, сакратара камсамольскай ячэйкі Пятра Баранкевіча. Жыхары раёна шануюць памяць аб загінуўшых: аб гэтым сведчаць помнікі, мемарыяльныя дошкі, назвы вуліц.

Да 1923 г. Быхаўскі павет знаходзіўся ў Гомельскай губерні. 9 лютага 1923 г. ён быў ліквідаваны, тэрыторыі Гарадзішчанскай, Глухскай, Грудзінаўскай, Старабыхаўскай валасцей і сам г. Быхаў былі перададзены Магілёўскаму павету, тэрыторыі Баханскай, Бычанскай, Навабыхаўскай і Чыгірынскай валасцей — Рагачоўскаму, Даўгамошскай і Прапойскай — Чэрыкаўскаму паветам.

17 ліпеня 1924 г. ў рэспубліцы скасаваны паветы і воласці і ўтвораны акругі і раёны. У склад Магілёўскай акругі ўвайшоў Быхаўскі раён. У ім былі наступныя сельсаветы: Баркалабаўскі, Быхаўскі, Гарадзецкі, Глухскі, Грудзінаўскі I і Грудзінаўскі II, Дабужскі, Лудчыцкі, Макранскі, Навабыхаўскі, Ніканавіцкі, Следзюкоўскі, Студзянецкі, Сялецка-Халапееўскі, Тайманаўскі, Узніцкі, Царкоўнаасавецкі, Чырвонабярэжскі, Ямніцкі. Першым старшынёй Быхаўскага райвыканкома стаў актыўны ўдзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, ураджэнец в. Мокрае Мацвей Лявонцьевіч Рудкоўскі, які да гэтага працаваў старшынёй Навабыхаўскага валвыканкома. Пры непасрэдным удзеле Рудкоўскага былі праведзены выбары выканкомаў ва ўсіх 19 сельскіх Саветах раёна.

У ліпені 1931 г. былі ўнесены некаторыя змены ў адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел рэспублікі. Датычылі яны і Быхаўшчыны. Па-

Асабовы склад быхаўскай міліцыі. 1922 г.

Быховский районный историко-краеведческий музей

водле пастановы ЦВК і СНК БССР ад 8 ліпеня 1931 г. да Быхаўскага раёна былі далучаны Балонава-Сялецкі, Дунайкоўскі, Кучынскі, Падсельскі, Чачэвіцкі, Чыгірынскі сельсаветы Чачэвіцкага і Абідавіцкі, Баханьскі, Званецкі, Зімніцкі, Ісканскі, Хатаўнянскі сельсаветы Журавіцкага раёнаў, якія былі скасаваны.

Паступова ў раёне развілася прамысловая кааперацыя, мадэрнізаваліся старыя прадпрыемствы, будаваліся новыя. У Сарочынскай камуне імя К. Лібкнехта ў 1924 г. быў заснаваны крухмальны завод, які даваў за сезон 23 тоны крухмалу. Мелавая арцель «Маяк камуны» (прадукцыйнасць 560 тон вапны ў год) была арганізавана С. К. Дзергачовым у 1926 г. ў в. Лазаравічы. У 1927 г. каля в. Сядзіч была арганізавана прамысловая арцель «Чырвоны будаўнік» (31 рабочы, 7 служачых, давала ў год 838 тыс. цаглін), арцель «Працоўны смалакур» налічвала 11 чалавек, у год выпускала 42 тоны шкіпінару, 86 тон смалы, 161 тону драўнянага вугалю. Існавалі такія прамысловыя арцелі, як «Металіст», шавецкая «Чырвоны саматужнік», кравецкая «Аб'яднанне» і інш. Гарадская хлебапякарня (9 чалавек) была арганізавана ў 1928 г., у год выпякала 226 тон хлеба.

У адпаведнасці з пяцігадовым планам развіцця народнай гаспадаркі ў 1929 г. ў Быхаве было завершана будаўніцтва электрастанцыі. У наступным годзе яна выпрацавала 37 696 кілават электраэнергіі. Пачалі даваць прадукцыю торфазаводы «Ленінскі шлях» і «Чырвоная Беларусь», у 1930 г. ўступіў у строй сыраварны завод, на ім працавала 59 рабочых і 6 служачых. Гадавая прадукцыйнасць — 99 тон масла, 18 тон галандскага сыру і 97 тон іншай малочнай прадукцыі. Паскорана ішло будаўніцтва ацэтонава-бутылавага завода і электрастанцыі пры ім (уведзены ў дзеянне ў 1932 г.). Замест невялічкай лесапільні ў Быхаве з'явілася лесапільная арцель імя Калініна (у 1932 г. яна выпусціла прадукцыі на суму звыш мільёна рублёў). Дробная кавальская арцель там жа ў райцэнтры стала буйной майстэрняй стандартнага абозабудавання, за год яна давала прадукцыі на паўмільёна рублёў. Увогуле прамысловасць раёна ў 1932 г. вырабіла прадукцыі на 7,2 млн. рублёў.

Паводле ленінскага кааператыўнага плана ў першыя гады Савецкай улады на Быхаўшчыне ўзніклі калектыўныя сельскія гаспадаркі. У 1919 г. створаны саўгасы ў Грудзінаўцы, Баркалабаве, Лудчыцах. Апошні меў свінагадоўчую спецыялізацыю (160 га ворыва, 50 га лугоў, 1000 свіней). Ва ўсіх саўгасах працавалі сельскагаспадарчыя курсы, арганізоўваліся выстаўкі, лекцыі, на якія запрашаліся сяляне навакольных вёсак. У вёсках ствараліся таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі, камуны. Асноўным прынцыпам іх фарміравання была добраахвотнасць. У в. Прыбар Чырвонаслабодскага сельсавета, напрыклад, сельгаскааператыў так і назвалі «Згода». У в. Сарочына Баркалабаўскага сельсавета ў пачатку 1919 г. была створана адна з першых на Беларусі сельскагаспадарчых камун — імя К. Лібкнехта. У 1922 г. камунары адрамантавалі памяшканне для клуба, адкрылі бібліятэку, чытальню. У 1924 г. камуна атрымала трактар, першы выезд на поле камунараў-трактарыстаў Хвядоса Міронава, Трыфана Карпікава і Івана Лагунова ператварыўся ў велічнае, незабыўнае свята і быў лепшай агітацыяй за «камунію». У 1924 г. тут адбылася сельскагаспадарчая выстаўка, на якой апрача лібкнехтаўцаў экспанаты прадстаўляў саўгас з в. Баркалабава. У 1927 г. калгас імя К. Лібкнехта (да таго часу камуна была пераўтворана ў калгас) атрымаў дыплом на Усебеларускім сельскагаспадарчым конкурсе. У памяць аб камуне ў вёсцы ў 1972 г. ўстаноўлены помнік.

У 1927 г. XV з'езд партыі прыняў рашэнне аб правядзенні калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Даследаванні гісторыкаў, эканамістаў і публіцыстаў канца 1980-х гадоў дазваляюць зірнуць на гэту з'яву гістарычнага мінулага без прыкрас, без ідэалагічных і прапагандысцкіх напластаванняў розных часоў. Ва ўмовах аўтарытарна-бюракратычнай сістэмы кіравання план стварэння калгасаў, а пазней суцэльнай калектывізацыі, успрымаўся партыйнымі і савецкімі работнікамі, сельскімі актывістамі як адзіна правільны, і яны самаддана праводзілі яго ў жыццё. Таму былі і аб'ектыўныя прычыны: першыя поспехі сельскагаспадарчых кааператываў (агітавалі за калектыўнае гаспадараванне лепш за іншыя лозунгі), вялікі аўтарытэт партыі, непахісная вера ў правільнасць яе рашэнняў і шляхоў выканання. Выконваючы рашэнні з'езда, раённая партыйная арганізацыя ўзмацніла палітычную і культурна-асветную работу ў вёсцы, згуртоўвала бядняцка-батрацкія і серадняцкія масы.

У 1928—1929 гг. мясцовыя актывісты Марк Левы, Аляксей Агееў, Мітрафан Альховік у вёсках Давыдавічы, Іскань, Новы Быхаў ствараюць калгасы. Утвараюцца калектыўныя гаспадаркі ў вёсках Падгор'е, Усохі, Няраж і іншых месцах.

У кастрычніку 1929 г. ў Быхаве была арганізавана сельскагаспадарчая выстаўка. Яе мэта — паказаць поспехі ў калектывізацыі. Газета «Беларуская вёска» пісала ў тыя дні, што наведвальнікаў выстаўкі зацікавілі экспанаты селяніна-беднякa з в. Камарычы Ісака Мархоценкі, які прыехаў на выстаўку з жонкай і прывёз у якасці экспанатаў лубін, турнэпс, буракі, насенне канюшыны, авёс, старую драўляную саху і такую ж барану. Сваімі экспанатамі ён агітаваў за калектывізацыю.

Аб гэтым сведчылі напісаныя ім лозунгі, расклееныя перад экспанатамі на чырвоным сцягу, зробленым з жаночай хусткі: «Прывітанне сацыялістычным элементам вёскі, няхай жыве дзень

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

ураджаю і калектывізацыі!», «Дзякуем нашай Камуністычнай партыі, нашаму Савецкаму ўраду — кіраўнікам агратэхнічнай сілы», «Няхай жыве агіткультура, няхай згіне панскі і папоўскі дурман», надпіс на сасе: «...Няхай жыве хуткі рост трактарызацыі, няхай згіне невуцтва, бескультур'е і папоўскі дурман!».

Такія ж думкі селянін выказаў і на мітынгу. Ён заклікаў запісвацца ў калгас і абяцаў зрабіць гэта першым. І. Мархоценка стаў арганізатарам і першым старшынёй калгаса «Чырвоная Зорка» ў в. Камарычы.

25 лютага 1931 г. раённая газета «Маяк камуны», пераемніца газеты «Известия Быховского ревкома» апублікавала пісьмо чырвоных партызан Быхаўшчыны, прынятае ў дзень святкавання 13-й гадавіны Чырвонай Арміі. Сябры-аднапалчане ўспомнілі свой баявы гераічны шлях у складзе конных партызанскіх атрадаў Дзергачова і Мельнікава, а потым 17-й стралковай дывізіі, затым перайшлі да размовы аб калектывізацыі вёскі. Ветэраны гаварылі аб цяжкасцях і памылках у гэтай справе. У час размовы і нарадзілася думка звярнуцца з пісьмом да чырвоных партызан Быхаўшчыны. «Наш абавязак — гаварылася ў закліку,— абавязак чырвоных партызан, барацьбітоў за Савецкую ўладу... з рэвалюцыйным уздымам працаваць над сацыялістычнай перабудовай вёскі...»

Будаваць новае, мацаваць і развіваць усё лепшае — вось дэвіз ветэранаў грамадзянскай вайны. Пісьмо іх так і названа: «Да ўсіх чырвоных партызан, беднякоў і сераднякоў Быхаўскага раёна БССР». Пад ім подпісы Ціхана Кірпічэнкі, Івана Красніцкага, Андрэя Красніцкага, Апанаса Мандрыка і іншых.

Як і ў многія іншыя раёны Беларусі і краіны, на Быхаўшчыну былі накіраваны прадстаўнікі рабочага класа — дваццаціпяцітысячнікі, чый арганізатарскі вопыт і пралетарская загартоўка павінны былі дапамагчы ў арганізацыі калектыўнага гаспадарання. Добрую памяць пакінулі аб сабе пасланцы Ленінграда, камуніст-інтэрнацыяналіст Пётр Захарыеў, сормаўскія рабочыя Іван Васілевіч Стулаў і Пётр Аляксеевіч Міронаў. Яны арганізавалі і ўзначалілі калгасы «1 Мая», «Чырвоны партызан», «Камінтэрн», пад іх кіраўніцтвам гаспадаркі ўмацоўваліся, сталі лепшымі ў раёне. Але было нямала прыкладаў іншага роду. Паспешна створаныя калгасы распадаліся, няўмелае кіраўніцтва, парушэнне прынцыпаў добраахвотнасці і іншыя сур'ёзныя хібы прымушалі разважлівых па натуры сялян насцярожана адносіцца да новай справы. Усё было ў той час: зрываліся вясковыя сходы ў адказ на занадта патрабавальныя прамовы некаторых упаўнаважаных (як правіла, настойвалі на абавязковай 100 % калектывізацыі), былі і «жаночыя бунты» (у Рыжкаўцы, Верхняй Тошчыцы), былі і больш актыўныя дзеянні працаўнікаў калектывізацыі — падпальвалі калгасныя двары, пабудовы, стралялі ў калгасных актывістаў. У 1932 г. быў забіты старшыня выканкома Ніканавіцкага сельскага Савета Міхей Белакузаў.

Але выбару іншага не існавала. Курс на суцэльную калектывізацыю лічыўся адзіна правільным шляхам сацыялістычнага будаўніцтва ў вёсцы, іншыя думкі, прапановы, на якім бы ўзроўні яны не выказваліся, адвяргаліся, прызнаваліся «шкодніцкімі». Няцяжка ўявіць, які выбар павінны былі зрабіць тыя сяляне, што яшчэ вагаліся, ва ўмовах жорсткіх камандных метадаў кіраўніцтва, палітыкі раскулачвання (як вядома, сярод «раскулачаных» большасць складалі сераднякі), якая стала сапраўднай трагедыяй сялянства.

Спробы сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі вяліся і на базе новай сельскагаспадарчай тэхнікі. У краіне будаваліся заводы па вырабу трактароў і сельскагаспадарчых машын. Пачалі стварацца машынна-трактарныя станцыі. У адным з першых нумароў газеты «Маяк камуны» была надрукавана такая тэлеграма: «Быхаў райкому КП(б)Б. У вашым раёне вызначана будаўніцтва машынна-трактарнай станцыі. Неадкладна разгарніце работу па мабілізацыі 70 тысяч рублёў трактарацэнтру... Сакратар ЦК КП(б)Б Гей».

Гэта вестка была ўспрынята з задавальненнем, калгаснікі адлічвалі грошы на будаўніцтва МТС, у тым жа нумары газеты ў падборцы матэрыялаў на гэту тэму чытаем: «Агульны сход калгаса «Чырвоны партызан» вітае ініцыятыву аб стварэнні МТС у Быхаўскім раёне. Мы першыя даём на станцыю тры тысячы рублёў і выклікаем на спаборніцтва калгас «Новы свет».

У 1931 г. на паўночна-заходняй ускраіне Быхава (на месцы сучаснага рабочага пасёлка Колас) пачалося будаўніцтва МТС.

Вось як успамінае аб гэтым адзін з першых будаўнікоў станцыі Зоя Піліпаўна Цыркунова: «Малодзенькай дзяўчынай прыйшла я на будаўніцтва. На месцы станцыі стаяў тады толькі барак для будаўнікоў. Працавалі мы па-ўдарнаму. І праз паўтара года на былой пустэчы з'явіліся рамонтная майстэрня, склады для запчастак, павеці для захоўвання тэхнікі, інтэрнат, клуб, сталовая, кантора. Пачалі прыбываць першыя трактары, камбайны «Север» і «Камунар», грузавыя аўтамабілі і іншая тэхніка. Многія будаўнікі пайшлі на курсы і сталі трактарыстамі. Заўсёды добрым словам успамінаю першага дырэктара МТС камуніста Івана Герасімавіча Бурака. Гэта дзякуючы яго добрай парадзе і я закончыла курсы і стала трактарысткай».

Крыху пазней былі створаны яшчэ 2 МТС — Лудчыцкая і Кузькавіцкая. У 1933 г. пры МТС і саўгасах пачалі працаваць палітаддзелы. Яны выдавалі свае газеты, на Быхаўшчыне іх было тры, асабліва вызначалася сваёй вастрынёй шматтыражка ў саўгасе «Чырвоны маяк» (зараз пас. Пралетарый Абідавіцкага сельсавета), якую рэдагаваў член партыі з 1919 г. Сцяпан Мікалаевіч Свірыд. Істотную ролю ў грамадскім жыц-

Быховский районный историко-краеведческий музей

ці Быхаўшчыны таго часу адыгрывалі жанчыны-актывісткі. Дэлегаткай 1-га Усесаюзнага з'езда жанчын-калгасніц (снежань 1929) была быхаўская калгасніца С. А. Брытава. Начальнік палітаддзела Кузькавіцкай МТС Ефрасіння Іванаўна Антонава і намеснік начальніка палітаддзела Быхаўскай МТС Наталля Майсееўна Сцяпняк былі заўсёды сярод людзей, ведалі іх клопаты, дзялілі з імі радасць і гора, дапамагалі ім усімі сіламі. Па ўсім Прыдняпроўі ішла слава аб трактарыстцы Кузькавіцкай МТС Веры Цімафееўне Сіўцовай, даярцы з в. Студзёнка Суклеце Сілкаўне Яўменавай і іншых. Работніцы прамысловых прадпрыемстваў Быхава Соф'я Рудкоўская, Марыя Сімановіч і іншыя паклалі пачатак стаханаўскаму руху ў раёне. У канцы 1936 г. тут ужо налічвалася 168 стаханаўцаў.

Адначасова з сацыялістычнымі пераўтварэннямі ў прамысловасці і на вёсцы адбываліся змены ў галіне адукацыі, культуры. У 1931 г. ў раёне працавала 112 школ з чатырохгадовым і 8 школ з сямігадовым тэрмінам навучання, школа сельскай моладзі. Займалася ў іх 12 728 чалавек, працавала 275 настаўнікаў. Для падрыхтоўкі кадраў будаўнікоў у Быхаве быў адкрыты будаўнічы тэхнікум. У 1932 г. ў ім займалася 80 студэнтаў. Апрача таго меліся 2 школы фабрычна-заводскага навучання, 19 школ калгаснай моладзі (ШКМ), дзе вучылася 5638 юнакоў і дзяўчат.

Актыўна неслі культуру ў масы настаўнікі Раман Варфаламеевіч Савіцкі, Мікалай Арцёмавіч Носараў, Мартын Паўлавіч Паляўцоў, Якаў Яфрэмавіч Караткевіч, Якаў Сцяпанавіч Коўшар, Адам Цімафеевіч Мамаеў, Аляксей Сцяпанавіч Дзямідаў і многія іншыя. А. С. Дзямідаў першы сярод настаўнікаў раёна ў 1939 г. быў удастоены ўрадавай узнагароды — медаля «За працоўную адзнаку».

У лютым 1935 г. ў Маскве праходзіў 2-і Усесаюзны з'езд калгаснікаў-ударнікаў. Быхаўскі раён прадстаўляў на ім старшыня калгаса «Рэвалюцыя» Максім Сямёнавіч Сівагракаў. Ён быў уключаны ў камісію па выпрацоўцы праекта прыкладнога Статута сельскагаспадарчай арцелі.

Раён у тыя гады нагадваў сабой будаўнічую пляцоўку: узводзіліся новыя школы, жылыя дамы, гаспадарчыя збудаванні, ішла рэканструкцыя прадпрыемстваў. У 1935 г. быў рэканструяваны шклозавод «Ільіч», пачаў працаваць хімлясгас. Пры заводзе «Ільіч» вырас прыгожы рабочы пасёлак з клубам, радыёвузлом, бальніцай, няпоўнай сярэдняй школай, лазняй. Для забеспячэння Быхаўскага ацэтона-бутылавага завода палівам у 1935 г. каля в. Ямнае быў пабудаваны торфазавод «Другая пяцігодка». У 1936 г. ён даў 11 тыс. тон паліва. Колькасць рабочых на прамысловых прадпрыемствах складала амаль 2,5 тыс. чалавек. 22 прадпрыемствы, што працавалі ў раёне ў 1938 г., далі валавой прадукцыі на суму звыш 7,3 мільёна рублёў.

У сельскай гаспадарцы ў гэты час павысілася ўраджайнасць і адпаведна павялічыўся кошт працадня калгасніка: у 1934 г. ў сярэднім па раёну на працадзень было выдадзена па 2,5 кг збожжа, 7 кг бульбы, іншая прадукцыя і грошы. У некаторых калгасах на працадзень атрымлівалі па 5—6 кг збожжа і 15—20 кг бульбы. У 1934 г. ў калгасах і саўгасах мелася 139 малочнатаварных, 102 свінагадоўчыя, 58 авечкагадоўчых і 3 конегадоўчыя фермы. Папулярным было пчалярства: у калгасах налічвалася каля 70 пчаляроў, 2 тыс. вулляў.

Пачалі ажыццяўляць план перасялення калгаснікаў з хутароў у вёскі. Ішло наступленне на балоты. Працаўнікі калгаса «Зара» з Кузькавіч за 2 гады асушылі 103 гектары балот і асвоілі 83 га тарфянікаў. Гэта іх дасягненне было адзначана вялікім сярэбраным медалём Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі.

На сярэдзіну 1939 г. ў Быхаўскім раёне існавалі 142 калгасы, якія аб'ядноўвалі больш за 12 тыс. сялянскіх гаспадарак. Пад пасевамі збожжавых і збожжабабовых культур было занята 31 260 га, пад бульбай 7428 га, ільном, канопляй 2328 га. У калгасах налічвалася каля 7,5 тыс. галоў буйной рагатай жывёлы, звыш 3,5 тыс. свіней, 2,6 тыс. авечак і коз, 8,8 тыс. коней. Папаўняўся і машынна-трактарны парк: у канцы 1940 г. 3 МТС мелі 115 трактароў, 23 камбайны і іншую сельскагаспадарчую тэхніку. Абслугоўвалі яе 242 механізатары. Асабліва вядомымі з іх былі ў той час Фядос Міронаў, Вера Сіўцова, Іван Альховік, Пятро Ігнатаў і многія іншыя. Трактарыст з саўгаса «Вараніно» Ігнат Кавалёў першы ў 1938 г. стаў удзельнікам Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, выставачны камітэт адзначыў яго працу дыпломам.

За гады перадваенных пяцігодак істотна змянілася аблічча старажытнага Быхава. Вуліцы ўпрыгожылі новыя дамы, шмат было пасаджана дрэў. У 1938 г. на вул. Чырвонаармейскай быхаўчане ўрачыста адкрылі помнік У. І. Леніну. З ростам горада павялічвалася і колькасць насельніцтва: у 1939 г. ў Быхаве было 11 тыс. жыхароў.

Яскравай была і статыстыка культурных пераўтварэнняў. Да рэвалюцыі ў павеце налічвалася 37 царкоўнаприходскіх школ, у якіх вучылася 1086 дзяцей, дадаткова ў 2 гімназіях і 2-класным вучылішчы займалася яшчэ 600 дзяцей. У 1940 г. ў раёне 101 школа і 17 тысяч вучняў, працавалі гарадская і дзіцячая бібліятэкі, бібліятэкі былі таксама пры партыйных і педагагічных кабінетах, пры ўсіх хатах-чытальнях (іх было 19) і школах. У ВНУ і сярэдніх спецыяльных установах у 1940 г. займалася больш за 400 быхаўчан. Самыя здольныя і таленавітыя крочылі ў вялікую навуку, сярод іх былі Канстанцін Лукашоў, Дасіфей Надтачэеў, Емяльян Азаранка і іншыя.

У канцы 1930-х гадоў адбыліся выбары ў вы-

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

шэйшыя органы Савецкай улады краіны і рэспублікі. Дэпутатамі ў Савет Саюза і Савет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР былі выбраны прадстаўнікі раёна — настаўнік Чырвонаасавецкай няпоўнай сярэдняй школы Васіль Паўлавіч Іваноў і даярка студзёніцкага калгаса «Запаветы Ільіча» С. С. Яўменава. У Вярхоўным Савеце БССР раён прадстаўляў старшыня выканкома Тайманаўскага сельскага Савета Васіль Паўлавіч Куляшоў, сакратар Быхаўскага райкома партыі Ціт Фёдаравіч Субоцін.

1930-я гады...— супярэчлівы час, калі побач ужываліся працоўны ўздым, энтузіязм мільёнаў, іх самаадданая, ударная праца і жорсткая бюракратычная сістэма кіравання, ідэалагічнай апрацоўкі мас, насаджэння культу асобы «правадыра і генія ўсіх народаў», нагнятанне атмасферы падазронасці, пошукаў «ворагаў народа», калі царыла беззаконне, ахвярамі якога сталі сотні тысяч лепшых прадстаўнікоў партыі і народа. Сярод іх і тыя, чый лёс быў так ці інакш звязаны з Быхаўшчынай. У гады культу асобы Сталіна былі рэпрэсіраваны першы біёграф У. І. Леніна І. М. Баранкевіч, былы камандзір 152-й Быхаўскай дывізіі Я. В. Шэко, былы рэвалюцыянер, партыйны і савецкі работнік У. І. Драздоўскі і іншыя. Аб тым, што ўяўляў сабой канвеер рэпрэсій, яскрава сведчыць лёс Міканора Сцяпанавіча Крыцкага, беларуса па нацыянальнасці: працаваў дырэктарам сярэдняй школы № 1 у Быхаве. 24 снежня 1937 г. быў арыштаваны па абвінавачванню ў шпіянажы, на наступны дзень яго выключылі з партыі, а 20 студзеня 1938 г. быў прыгавораны да расстрэлу. У наш час Крыцкі, як і многія іншыя нявінныя ахвяры рэпрэсій, быў рэабілітаваны і паводле рашэння бюро Магілёўскага абкома КПБ ад 27 верасня 1988 г. адноўлены ў партыі.

Падобны лёс напаткаў і сакратароў Быхаўскага РК КП(б)Б С. К. Ігнатовіча і Е. П. Баярчанку, майстра-шкловыдзімальшчыка завода «Ільіч» М. В. Багінскага і іншых нявінных ахвяр.

Станіслаў Канстанцінавіч Ігнатовіч працаваў другім сакратаром Быхаўскага РК КП(б)Б, быў арыштаваны 1 студзеня 1938 г., а 11 кастрычніка 1938 г. па прыгавору асобай тройкі НКУС расстраляны. У абвінаваўчым заключэнні напісана, што ён нібыта «з'яўляўся ўдзельнікам польскай шпіёнскай дыверсійнай арганізацыі..., праводзіў дыверсійна-шкодніцкую работу ў сельскай гаспадарцы і гандлі, насаджваў варожыя кадры з мэтай іх выкарыстання ў контррэвалюцыйных мэтах, збіраў звесткі аб палітыка-эканамічным стане шэрагу раёнаў БССР і настроі насельніцтва ў адносінах да мерапрыемстваў партыі і Савецкай улады».

Емяльяна Пятровіча Баярчанку, сакратара Быхаўскага РК КП(б)Б, члена партыі з 1919 г., у 1938 г. абвінавацілі ў актыўным удзеле ў антысавецкай, трацкісцкай, тэрарыстычнай арганізацыі, шкодніцкай рабоце ў галіне сельскай гаспадаркі, накіраванай на развал калгаснага будаўніцтва... Ён быў таксама прыгавораны да расстрэлу.

Агентам польскай разведкі зрабілі малапісьменнага Мечыслава Вікенцьевіча Багінскага, які жыў у Ветранцы і працаваў на цыклозаводзе. За сувязь з рэпрэсіраванымі роднымі яго ў 1937 г. выключылі з партыі, а ў самым канцы 1937 г. арыштавалі. Усяго месяц разглядалася яго справа, а яшчэ праз месяц — 19 лютага 1938 г. Багінскі быў расстраляны. У сталінскіх лагерах згубіўся жыццёвы след простага селяніна-калгасніка з в. Галееўка Міхаіла Ульянавіча Краўцова, арыштаванага і несправядліва асуджанага ў 1932 г. Не вытрымаў і года лагернага жыцця селянін-аднаасобнік з в. Вець Кузьма Конанавіч Канцавы, які памёр у месцах зняволення ў чэрвені 1938 г.

Пазней іх справы былі перагледжаны і спынены з-за адсутнасці складу злачынства, а несправядлівыя прыгаворы адменены.

Трывога і занепакоенасць, выкліканыя складанасцямі ўнутранага развіцця краіны, дапоўніліся трывогай і занепакоенасцю за лёс усёй краіны: міжнароднае становішча абвастралася. Ваенныя канфлікты з японскімі мілітарыстамі, савецка-фінляндская вайна, пачатак 2-й сусветнай і пахабнае, пераможнае шэсце гітлераўскіх армій па Еўропе гаварылі аб непазбежнасці сутыкнення сацыялізму з фашызмам. І зноў супярэчнасць: з аднаго боку падрыхтоўка да вайны — перабудова эканомікі, узмацненне абаронча-масавай работы, заклік да моладзі ісці на флот, у авіяцыю і г. д., з другога — непаслядоўнасць, маруднасць у ажыццяўленні прынятых мер, непахісная вера ў прадбачлівасць «правадыра» і магутнасць нашай арміі, магчымасць вядзення вайны «малой крывёю і на чужой тэрыторыі». Людзі жадалі міру, праглі стваральнай працы, жылі і нараджалі дзяцей, радаваліся жыццю і былі поўныя надзей на лепшую будучыню.

Быховский районный историко-краеведческий музей

З ДАКЛАДА АСОБАЎПАЎНАВАЖАНАГА ПА ГЛУХСКАЙ ВОЛАСЦІ БЫХАЎСКАМУ ПАВЯТОВАМУ ЗЯМЕЛЬНАМУ АДДЗЕЛУ І ПАВЯТОВАМУ ПАСЯЎКОМУ АБ РАБОЦЕ СЕЛЬКОМАЎ, ПАСЯЎКОМАЎ І ПРАВЯДЗЕННІ ДВУХТЫДНЁВІКА «ЧЫРВОНЫ АРАТЫ»

21 красавіка 1921 г.

Согласно командировки от 1 апреля 1921 г. я отправился в Глухскую волость по проведению двухнедельника «Красного пахаря». Прибывши на место не пришлось приступить к прямым своим обязанностям, потому что во всей волости еще не было организовано селькомов и волпосевкома, поэтому пришлось первым долгом приступить к организации таковых. К организации селькомов крестьяне относились отрицательно, в особенности кулаческий элемент. С одной стороны, потому что не понимают государственной важности и значения работы посевкомов, а с другой стороны противники Советской власти вели гнусную агитацию и этим самым запугивали крестьян, что посевкомы посадят на паек, на один фунт хлеба, поэтому работу очень трудно пришлось проводить и неудачно — селькомы организованы только в 9 деревнях, а в 21 деревне от организации селькомов отказались. Волпосевком организован волостным съездом состоявшимся 18 сего апреля, где участвовали представители селькомов и представители сельсоветов.

Организованы селькомы в следующих деревнях: с. Селец Болонов, Поплавщина, Слоневщина, Борколабово, Боровка, Ботунь, Глухская Селиба, Людков, Новая Слободка.

Не организованы по своему нежеланию в следующих деревнях: Косичи, Ходутичи, Зарече, Твердов, д. Болонов Селец, Олень, Кучин, Незовка, Досовичи, Пестилы, Бовшево, Досов, Бовшовец, Стайки, Липовка, Язвы, Забродье, Звонцовка, Черноград, Глухи.

Починочные мастерские организовать не удалось. Несмотря на то, что постановлением волисполкома совместно с зав. волпосевкомом и мною было постановлено мобилизовать всех кузнецов и кузницы для того, чтобы мастерские пустить в работу необходимо было снабдить их материалом. Несмотря на все наши усилия, нам не удалось даже привезти угля, потому что крестьяне отказались дать подвод.

Семена распределены в следующем порядке: овес 950 пудов распределен для всех деревень волости пропорционально, учитывая имущественное положение деревни, население и землю. Но отпуск производится только селькомом, а там где не организованы таковые, то на днях ожидается распоряжение от упосевкома.

Что же касается двухнедельника «Красного пахаря», почти что ничего не сделано или же кое-где что-то сделано, но и то совсем мало; письменного отчета от особо райуполномоченного не поступило, сами же крестьяне сделать умеют, но написать и объяснить своей работы не умеют.

ДА Магілёўскай вобл., ф. 83, воп. 1, спр. 238, лл. 20—21.

ЗАГАД БЫХАЎСКАЙ ПАВЯТОВАЙ КАМІСІІ ПА БАРАЦЬБЕ З БАНДЫТЫЗМАМ

16 верасня 1921 г.

На основании распоряжения Предгубкомбанда все находящиеся на территории Быховского уезда бандиты в течение двухнедельного срока должны добровольно явиться к местным властям, начальникам отрядов для сдачи. Являющиеся бандиты ни в коем случае не должны иметь при себе оружие и только после сдачи, они должны указать, где таковое находится.

Все добровольно явившиеся бандиты проходят через суд Революционного Трибунала, причем им будет дано снисхождение.

Семьи бандитов, не явившихся в течение семи дней со дня издания настоящего приказа, будут взяты заложниками и в случае неявки бандитов в двухнедельный срок будут высланы из пределов Гомельской губернии, и имущество их будет конфисковано. Никакие переговоры как с бандами, так и с отдельными бандитами вестись не будут, а бандиты, которые придут сдаваться имея при себе оружие, будут расстреливаться на месте.

Борьба с бандами и отдельными бандитами будет вестись самая жестокая и снисхождение будет оказано только добровольно явившимся.

Настоящий приказ подлежит широкому оглашению на всех сельских сходах и должен быть вывешен на видных местах в каждом селении под личную ответственность предволисполкома и председьсовета.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Уездной милиции приказывается наблюсти за широким распространением настоящего приказа.

Приказ входит в силу с 18 сентября сего 1921 года.

Лица, срывающие настоящий приказ, будут арестовываться и предаваться суду.

Быховская Уездная Комиссия по борьбе с бандитизмом.

Фотакопія загада знаходзіцца ў Быхаўскім гісторыка-краязнаўчым музеі.

У дваццаць першым...

Адгрымелі баі грамадзянскай вайны. У павеце пачалося аднаўленне народнай гаспадаркі. Толькі мірнаму будаўніцтву перашкаджалі варожыя элементы. Нахабна дзейнічалі банды Багдановіча і Вярбіцкага. Яны тэрарызавалі насельніцтва, распраўляліся з актывістамі. У адным з баёў банда Багдановіча была разгромлена. Павятовы камітэт партыі і выканаўчы камітэт патрабавалі ад павятовага палітбюро (ЧК) і ваенкамата хутчэй ліквідаваць і банду Вярбіцкага. Было вырашана накіраваць паручэнца пры ваенкоме чырвонага камандзіра Берзіна за Дняпро, каб разведаць дыслакацыю банды і распачаць з ёю перагаворы. Неўзабаве яму ўдалося натрапіць на яе след. Адбылася сустрэча. Берзін выклаў умовы здачы і дадаў: «Справа ваша гіблая. Чырвонаармейцы і атрады ЧОНа ідуць па вашых слядах. Не здасцеся — будзеце знішчаны. Літасці потым не прасіце».

Вечарам 18 верасня 1921 г. сямёра бандытаў прыехалі ў Быхаў і адразу накіраваліся ў павятовы ваенкамат. Іх сустрэў ваенком Лявонаў, загадаў здаць зброю. Па той паспешлівасці, з якой бандыты кінулі вінтоўкі, ваенком западозрыў нядобрае. Праз некаторы час кожнаму, хто прыйшоў здавацца, былі выпісаны дакументы. Лявонаў заявіў, што паколькі яны знаходзіліся ў бандзе, падпісаць пасведчанні павінен старшыня ЧК, ён жа і выдасць іх, а пакуль трэба ісці спаць, час ужо позні.

Ноччу ў адзін з пакояў двухпавярховага дома, дзе размяшчалася ЧК, ваенком скрытна правёў групу курсантаў, якія павінны былі затрымаць

Пахаванне Г. Я. Дорахава і Н. Л. Француза.

Быховский районный историко-краеведческий музей

бандытаў, як толькі тыя ўвойдуць у будынак. Аднак усё здарылася інакш...

Раніцай 19 верасня Берзін узяў выпісаныя часовыя пасведчанні і павёў бандытаў у ЧК. Ці то курсанты спазніліся, ці то Берзін прывёў бандытаў раней, але так ці інакш усе яны прайшлі ў пакой на другім паверсе, дзе знаходзіліся старшыня павятовай ЧК Навум Француз, яго памочнік Хаськін і сакратар Георгій Дорахаў. Берзін паклаў на подпіс Французу дакументы. Бандыты стаялі перад сталом купкай, уперадзе — Вярбіцкі. Падпісваючы яго пасведчанне, Француз узняў вочы і спыніў погляд на Вярбіцкім. Вельмі не спадабаўся яму насцярожаны твар бандыта. Чырвонаармейцаў усё не было. Француз унутрана захваляваўся, але віду не падаў. Падпісаўшы апошні дакумент, ён рантам ускочыў з-за стала і крыкнуў бандытам: «Рукі ўгору!»,— спадзеючыся, што яго пачуюць курсанты. Вярбіцкі тут жа выхапіў рэвальвер. Стрэл, яшчэ два... Некалькі бандытаў кінуліся разбіваць вокны, астатнія пачалі страляць па дзвярах, не даючы магчымасці нікому ўвайсці. Потым саскочылі з другога паверха і кінуліся да Дняпра...

Калі курсанты ўварваліся ў пакой, яны ўбачылі забітых Француза, Дорахава і параненага Хаськіна. Але не ўдалося ўцячы і бандытам. Іх дагналі чырвонаармейскія кулі.

Пахаваны Г. Я. Дорахаў і Н. Л. Француз у Быхаве на Кастрычніцкай плошчы ў брацкай магіле барацьбітоў за Савецкую ўладу, савецкіх воінаў і партызан. Іх імёнамі названы вуліцы ў Быхаве.

І. Дрыгант.

Г. Я. Дорахаў.

Н. Л. Француз.

ГЕОРГІЙ ЯЎМЕНАВІЧ ДОРАХАЎ

Удзельнік барацьбы за ўстанаўленне Савецкай улады ў Быхаўскім р-не. Нарадзіўся 19.6.1897 г. ў в. Старынка Прапойскай воласці Быхаўскага павета (цяпер Слаўгарадскі р-н). Член КПСС з 1918 г. Скончыў чатырохкласную школу. Працаваў на кардоннай фабрыцы, дзе атрымаў першую рэвалюцыйную загартоўку, памочнікам пісара ў Баханьскай павятовай управе. Пасля службы ў Чырвонай Арміі працаваў у павятовым ваенкамаце, сакратаром павятовага выканкома, сакратаром Быхаўскай павятовай ЧК. Разам з таварышамі-чэкістамі вёў вялікую работу па нармалізацыі жыцця ў павеце. Загінуў 19.9.1921 г. ў час ліквідацыі банды.

НАВУМ ЛАЗАРАВІЧ ФРАНЦУЗ

Удзельнік барацьбы за ўстанаўленне Савецкай улады ў Быхаўскім р-не. Нарадзіўся 16.5.1900 г. ў г. Быхаў. Член КПСС з 1918 г. У 1914 г. скончыў Быхаўскае пачатковае вучылішча імя М. І. Кутузава. Працаваў прыказчыкам у гандляра мануфактурай. У гэты час звязаўся з падпольнай бальшавіцкай арганізацыяй, выконваў яе даручэнні. У гады польскай і нямецкай акупацыі (1918—1920 гг.) перайшоў на нелегальнае становішча. Рызыкуючы жыццём, арганізаваў дастаўку зброі і бальшавіцкай літаратуры з пераваліачнага пункта ў Оршы ў в. Студзёнка Быхаўскага р-на, дзе фарміраваўся партызанскі атрад, а таксама ў Гарадзішчанскую, Чыгірынскую і Глухскую воласці. Актыўна ўдзельнічаў у арганізацыі падраённага падпольнага камітэта партыі, быў яго членам. Пасля вызвалення Быхаўскага р-на член павятовага рэўкома, потым старшыня Быхаўскай павятовай ЧК. Загінуў 19.9.1921 г. ў час ліквідацыі банды.

Першы кавалер ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга

«М. Мінчукоў — селянін сяла Чыгірынка[1] Быхаўскага павета Гомельскай губерні за самаадданую абарону моста прадстаўляецца да ўзнагароды Краіны Саветаў».

(З хадайніцтва Вышэйшага Савета народнай гаспадаркі аб узнагароджанні М. З. Мінчукова.)

Мікіта Мінчукоў адзін з тых, хто ўсім сэрцам успрыняў Савецкую ўладу, у любы момант гатоў быў жыццё за яе аддаць. У 1921 годзе рашылі чыгірынцы арганізаваць камуну і назваць яе дарагім для ўсіх імем «Кастрычнік». Вясна ў той год выдалася ранняя, цёплая, з палёў хутка сышоў снег, настрой у сялян быў бадзёры, прыўзняты: ранняя вясна — к хлебу. А сеяць было чым, дзяржава дапамагла насеннем, сельскагаспадарчым інвентаром...

Пятляе па лугах ціхая Друць, прабіраючыся

[1] Зараз в. Чыгірынка знаходзіцца ў Кіраўскім раёне.

Быховский районный историко-краеведческий музей

М. З. Мінчукоў.

да Дняпра. Але не заўсёды цячэнне яе павольнае, бывае яно і бурлівым, неўтаймоўным. І тады нясе Друць такую сілу, што можа зруйнаваць усё на сваім шляху. Адпойчы веснавым днём ішоў Мікіта з поля па беразе рэчкі. Падышоў да моста і спыніўся, аглушаны ровам вады, трэскам крыг, што напаўзалі адна на адну. Узышоўшы на мост, Мікіта адчуў, што той ледзь трымаецца пад шалёнымі ўдарамі вады і лёду. «Знясе мост,— мільганула ў галаве,— не вытрымае. Трэба разбіваць крыгі».

На беразе сабралася шмат людзей, але смельчакоў не было. Мікіта кінуўся да бліжэйшай хаты, схапіў там сякеру, лом і вярнуўся назад.

— Не лезь,— прасілі жанчыны,— можна ўтапіцца.

Але Мікіта крыкнуў: «Кідайце вяроўку». Яго абвязалі, і былы салдат смела рушыў на яёд. Ён сек тоўстыя крыгі, разбіваў іх ломам. Раптам крыга, на якой стаяў Мікіта, перавярнулася. Бурны паток панёс чалавека пад мост, парвалася вяроўка, вада накрыла яго з галавой. Але яму ўдалося выплысці па Гарэлую Грыву — маленькі астравок, што на сярэдзіне рэчкі. Сяляне спусцілі на ваду човен, і вось ужо Мікіта на беразе. Хтосьці даў яму сухую вопратку і зноў, абвязаўшыся вяроўкай, ён палез у раку.

Доўга ішла барацьба чалавека са стыхіяй, і мост быў выратаваны.

Праз нейкі час падаспелі чырвонаармейцы, яны прывезлі мяшкі з пяском, жалезныя тросы, замацавалі як трэба мост. Да Мікіты Мінчукова падышоў камандзір, моцна паціснуў яму руку і ўсхвалявана прамовіў:

— Дзякуй, дарагі таварыш! Ты здзейсніў сапраўдны подзвіг і заслугоўваеш самай высокай узнагароды. Я буду дакладваць пра цябе камандаванню.

— Нічога мне не трэба,— адказаў Мікіта. Затым, крыху падумаўшы, дадаў: — Вось, калі можаце, дайце солі. Дзеці хварэюць.

А неўзабаве ў Чыгірынцы было свята. Першы старшыня выканкома сельсавета Георгій Цярэнцьевіч Мінчукоў уручыў свайму цёзку па прозвішчы працоўны ордэн Расійскай Савецкай Федэратыўнай Рэспублікі. Адначасова яму ўручылі прэмію— бавоўняны адрэз у белую палоску і пуд солі. У памяшканні валаснога выканкома сабраліся жыхары з усёй вёскі, прыехаў ваенны аркестр.

Так першым кавалерам ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга ў ліпені 1921 г. стаў просты беларускі селянін Мікіта Захаравіч Мінчукоў.

Сумленна пражыў сваё жыццё вясковы герой. Памёр ён у 1933 годзе, пакінуўшы аб сабе глыбокую памяць у сэрцах аднавяскоўцаў.

Поўны Георгіеўскі кавалер

— Праскоўя, здай мне ўзнагароды, залаты і сярэбраны крыжы, у фонд дапамогі галадаючым Паволжа. Там людзі пухнуць з голаду.

— Рыгор, у нас няма грошай, а твае раны не зажылі, як жа ты будзеш?

— Мае раны зажывуць... Дробненькай бульбай залечацца. А там дзеці, разумееш, дзеці з голаду паміраюць. Заўтра ж завязі і здай. Я хутка падымуся.

Інакш ён паступіць не мог, бо такі ўжо ён быў дзіўны чалавек, Рыгор Ягоравіч Андрэйчыкаў, поўны Георгіеўскі кавалер. Нарадзіўся ён у 1891 г. ў сям'і селяніна. Хлопец быў ад прыроды кемлівы, цікаўны, дужы і працалюбівы. Яшчэ зусім малым зацікавіўся справамі суседа, заўзятага садавода-аматара. У чатырнаццаць гадоў хлопец ведаў, калі і якую грушу можна прышчапіць да яблыні і наадварот. Таму і працаваў ён у панскіх гаспадарках садаводам, нягледзячы на свой малады ўзрост. Непазнавальна мяняўся панскі сад, пасля таго, як да яго прыкладваў свае рупліявыя рукі Рыгор, але заробак усё роўна быў мізэрны. Працаваў і ў маёнтку «Анеліна», і ў Рагачове, а ў 1911 г. трапіў у Кіеў, садоўнікам у гаспадарку нейкага немца Крыйсцера. У Кіеве Рыгор пазнаёміўся з рэвалюцыйным падполлем, аднак трапіў пад нагляд улад і праз год вярнуўся дадому. У кастрычніку 1912 г. яго прызвалі ў армію і накіравалі ў Рыгу ў вучэбнае падраздзяленне кавалерыйскага палка. Тут на працягу ўсёй вучобы ён лічыўся палітычна ненадзейным, аднак начальства нічога з ім зрабіць не магло, бо вучыўся ён выдатна і скончыў вучобу з першым прызам (імянным сярэбраным гадзіннікам). А тут — вайна. У першы ж дзень разведчыкам коннага раз'езду прыйшлося прыняць удзел у баявых дзеяннях у раёне Вержбалова на Нёмане.

— Першую георгіеўскую ўзнагароду,— успамінаў Р. Я. Андрэйчыкаў,— я атрымаў за ўдалую разведку ў Асавецкіх балотах. Другі раз быў узнагароджаны

Бяловежский районный историко-краеведческий музей

Георгіеўскім крыжам III ступені за выратаванне штаба палка. У час падрыхтоўкі наступлення на аўстрыйскім фронце ў 1916 г. (я быў тады камандзірам раз'езда) за дзёрзкі рэйд у глыб фронту на відавоку ў ворага я быў узнагароджаны Георгіеўскім крыжам II ступені. Георгія I ступені атрымаў за падрыў моста цераз раку. Адступілі мы, памятаю, за водны рубеж, а камандаванне наша забылася аддаць загад узарваць мост. Калі спахапіліся, непрыяцель ужо падыходзіў да ракі. Пад праліўным свінцовым дажджом мне і майму памочніку прыйшлося дабірацца да моста. З вялікімі цяжкасцямі, калі ворагі беглі ўжо на мосце, нам удалося падняць яго ў паветра. Пасля таго, як я стаў поўным Георгіеўскім кавалерам, мне было прысвоена званне падпрапаршчыка.

У пачатку кастрычніка 1917 г. ў час адступлення з Румыніі пры ахове моста цераз невялікую раку выбухам снарада Рыгор Ягоравіч быў цяжка паранены і кантужаны. Пасля лячэння ў шпіталі ў маі 1918 г. вярнуўся дамоў. Тут працаваў у камбедзе да сканчэння яго паўнамоцтваў, а потым па даручэнні павятовага камітэта працаваў памочнікам загадчыка садамі на левабярэжжы Дняпра. А потым быў садаводам у былым маёнтку «Славянка».

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Рыгора Ягоравіча на фронт не ўзялі з-за інваліднасці. Аднак ён стараўся хоць чым-небудзь дапамагчы фронту. Пасля таго, як Ветранка была акупіравана, яго кватэра стала часовым прытулкам для акружэнцаў, а калі пачаў развівацца партызанскі рух — явачнай кватэрай. Яго адзіны сын Міхась стаў партызанам, загінуў у кастрычніку 1943 г. ў час блакады.

У 1943 г., пасля вызвалення Ветранкі, Палянінавіч і іншых вёсак, арганізаваў сельпо, дзе працаваў да 1947 г. Нягледзячы на інваліднасць, Рыгор Ягоравіч усё сваё жыццё працаваў і не мысліў сябе без работы. Большасць мірных дзён жыцця гэтага чалавека звязаны з размнажэннем садоў, з квеценню яблынь і груш. Хто каштаваў яблыкі з яго саду, той ніколі не забудзе водару роднай зямлі.

Р. Я. Андрэйчыкаў.

У 1971 г., у 80-гадовы юбілей Рыгора Ягоравіча, пастановай праўлення калгаса «Расія» яму было прысвоена званне ганаровага калгасніка. Р. Я. Андрэйчыкаў памёр у 1980 г. *Я. Р. Гапееў.*

Добрая памяць

З успамінаў былога загадчыка палітасветы Грудзінаўскага валаснога выканкома Мітрафана Тарасавіча Панасевіча

У лістападзе 1918 г. павятовы камітэт партыі разгледзеў пытанне развіцця народнай асветы. Правялі рэгістрацыю настаўніцкіх кадраў і адкрылі больш за восемдзесят, пераважна пачатковых, школ. Вельмі многа для развіцця народнай асветы ў павеце зрабіў Ігнацій Юр'евіч Міцкевіч, дзядзька Якуба Коласа. Прыехаў ён у Грудзінаўку пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. За плячыма ў яго быў прыродазнаўча-гістарычны факультэт Маскоўскага гарадскога народнага універсітэта імя А. Л. Шаняўскага. І. Ю. Міцкевічу даручылі адкрыць школу ў в. Рыжкаўка. З дапамогай сялян быў адрамантаваны будынак, выраблена мэбля. На першыя заняткі прыйшлі 19 хлопчыкаў і 7 дзяўчынак. Ігнацій Юр'евіч не замыкаўся ў школьных сценах, актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці. У грудзінаўскім саўгасе вечарамі вёў курсы аграмінімуму, дабіўся адкрыцця хаты-чытальні, дзе паладзіў чытку і абмеркаванне газетных артыкулаў. Быў створаны і калектыў самадзейнасці, дзе І. Ю. Міцкевіч іграў на скрыпцы. У 1921 г. яго прызначылі загадчыкам Грудзінаўскага валаснога аддзела народнай асветы. За адзін толькі год па ініцыятыве аддзела народнай асветы было адкрыта 16 школ па ліквідацыі непісьменнасці. У іх вучылася

Быховский районный историко-краеведческий музей

звыш чатырохсот чалавек дарослага насельніцтва. У 1927 г. І. Ю. Міцкевіч пераехаў у Мінск і працаваў там выкладчыкам беларускай мовы ў камвну. Пасля Вялікай Айчыннай вайны быў арганізатарам і дырэктарам сярэдняй школы на сваёй радзіме ў в. Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна. Памёр восенню 1949 г.

З імем Леніна

Першыя гады існавання маладой Савецкай рэспублікі... З імем У. І. Леніна працоўныя краіны звязвалі самае светлае, яму прысвячалі ваенныя і працоўныя перамогі, на яго ўскладалі надзеі і планы на лепшае будучае, з ім дзяліліся набалелым. Шчырыя словы ішлі з глыбіні душы і сведчылі аб велізарнай любві і павазе народа да правадыра. Адным з такіх сведчанняў сталі пісьмы працоўных, што пасыпаліся з розных куткоў краіны ў адрас Ільіча. Ішлі такія лісты і з Быхаўшчыны...

АД ЧЫРВОНААРМЕЙЦАЎ 5-га ПАНТОННАГА БАТАЛЬЁНА ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ[1]

23 красавіка 1923 г.

Другу и учителю мирового пролетариата Владимиру Ильичу Ленину.

Мы, красные понтонеры 5-го понтонного батальона Западного фронта, в день Вашего рождения шлем Вам горячий привет и братски желаем Вам одержать победу над Вашим недугом и скорей вернуться к управлению рулём революции и заняться плодотворной работой на счастье всем угнетенным на земле.

Вместе с тем в день Вашего рождения мы на торжественном общебатальонном собрании постановили зачислить Вас в списки батальона почетным старшим понтонером 5-го понтонного батальона Западного фронта как рулевого, управляющего рулем революции, а мы, как гребцы, будем наваливаться и грести туда, куда Вы будете направлять руль революции.

Да здравствует друг и учитель мирового пролетариата!

Председатель собрания *Казаков.*
Секретарь *Бейзер.*

Письма трудящихся к В. И. Ленину, 1917—1924 гг. М., 1960. С. 392.

АД XIII З'ЕЗДА САВЕТАЎ ГРУДЗІНАЎСКАЙ ВОЛАСЦІ МАГІЛЁЎСКАГА ПАВЕТА

1923 г.

Москва, Кремль, Ленину

XIII съезд Советов Грудиновской вол., Могилевского у., Гомельской губ., шлет свой привет вождю и учителю идей коммунизма всего мира Владимиру Ильичу Ленину и желает (ему) в скором времени стать у руля революции.

Председатель съезда (подпись неразборчива).

Письма трудящихся Белоруссии В. И. Ленину, 1917—1924. 3 изд. Мн., 1980. С. 184.

АД БЕСПАРТЫЙНАЙ, СЯЛЯНСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ СТАРАБЫХАЎСКАЙ ВОЛАСЦІ МАГІЛЁЎСКАГА ПАВЕТА

5 лістапада 1923 г.

Дорогой Ильич!

Широкая волостная беспартийная крестьянская конференция Старо-Быховской вол., Могилевского у., заслушав информацию о твоем здоровье, дорогой Ильич, шлет тебе горячий привет. Международное положение, назревающие события в Германии ставят перед международным пролетариатом и крестьянством, в том числе и трудящимися Союза ССР, важные и сложные задачи. Мы надеемся, что недалек тот час, когда под твоим непосредственным руководством трудящиеся всего мира сделают Красный Октябрь, каков сделан трудящимися Союза ССР в 17 году под твоим руководством.

---

[1] 5-ы пантонны батальён у 1923 г. дыслацыраваўся ў Быхаве.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Да здравствует всемирный Красный Октябрь!
Да здравствует наш дорогой Ильич — идейный вдохновитель всемирного Октября!
Президиум конференции.

Письма трудящихся Белоруссии В. И. Ленину, 1917—1924, 3 изд. Мн., 1980. С. 177—178.

* * *

У 1920—30-я гады лепшым прадпрыемствам, калгасам і ўстановам Быхаўшчыны было прысвоена імя У. І. Леніна. Гэтага гонару былі ўдастоены Ветранскі шклозавод, калгасы ў Следзюках і Студзёнцы, Рыжкаўская сельская бальніца, сярэдняя школа ў Быхаве. Апрача таго імем Леніна названы вуліца ў Быхаве, два пасёлкі ў раёне (былыя вёскі Стары Фальварак у Верхнятошчыцкім і Падасінаўе ў Навабыхаўскім сельсаветах). Адным з першых біёграфаў правадыра быў ураджэнец Быхаўшчыны І. М. Баранкевіч (глядзі пра яго асобны артыкул). Яго кніга пра У. І. Леніна была выдадзена ў Петраградзе ў 1919 годзе.

Па ленінскім прызыве

З успамінаў ветэрана партыі Івана Піліпавіча Галіновіча

Пленум ЦК РКП(б), які адбыўся пасля смерці У. І. Леніна ў канцы студзеня 1924 г., аб'явіў масавы прыём у партыю перадавых рабочых ад станка. На той час у Быхаве існавала толькі адна агульнагарадская партыйная ячэйка, на ўліку ў якой былі камуністы, што працавалі ў раённых установах і на прамысловых прадпрыемствах. У час правядзення ленінскага прызыву ў партыю ў Быхаве была створана партячэйка на чыгуначнай станцыі. І. П. Галіновіч працаваў тады брыгадзірам чыгуначнікаў-рамонтнікаў і хадзіў у спачуваючых.

Чутка аб стварэнні на станцыі партыйнай ячэйкі імгненна разнеслася сярод чыгуначнікаў. На кожным раз'ездзе (ад станцыі Тошчыца да Барсукоў), у будках пуцявых абходчыкаў толькі і было гаворкі аб гэтай вялікай падзеі. Са стварэннем ячэйкі новыя камуністы прыступілі да сур'ёзнай, глыбокай вучобы. Былі прыняты спачатку меры па ліквідацыі непісьменнасці, а потым заняліся павышэннем палітычнага ўзроўню. Адначасова з камуністамі займаліся і мы, спачуваючыя, беспартыйныя рабочыя. Кожную суботу ўвечары прыязджала да нас інструктар палітаддзела Магілёўскага аддзялення дарогі Захарава. Яна вяла школу палітграматы. Вывучалі Праграму і Статут партыі, біяграфію У. І. Леніна, пытанні палітычнага жыцця краіны, унутранага становішча. Хадзілі на заняткі з ахвотай. Былі і самі зацікаўлены, ды і інструктар аказалася вельмі адукаванай, люба было паслухаць.

Цікава праходзілі і партыйныя сходы. Адбываліся яны кожны тыдзень, у нядзелю. Акрамя камуністаў прысутнічалі ўсе свабодныя ад работы чыгуначнікі. Гэта было за правіла, ды і як інакш, калі на сходах вырашаліся надзённыя, жыццёва важныя пытанні нашай работы. Такія, як, напрыклад, забеспячэнне нармальнага руху цягнікоў. А гэта на той час мела вельмі вялікае значэнне. Калі мне давялося ў саракавых-пяцідзесятых гадах працаваць сакратаром чыгуначнай партарганізацыі, то неаднойчы прыпамінаў дзейнасць партячэйкі дваццатых гадоў, яе сакратара. Усё лепшае, капітальнае выкарыстоўваў у сваёй рабоце.

Помнік У. І. Леніну ў г. Быхаве.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Яны былі першымі...

З успамінаў аднаго з першых камсамольцаў в. Грудзінаўкі Сяргея Антонавіча Астаповіча

У 1919 годзе ў былым маёнтку графіні Талстой быў створаны саўгас. Моладзь арганізавалася ў камсамольскую ячэйку. Яе сакратаром, сапраўдным важаком моладзі быў Косця Якімаў, яго брат Лёня кіраваў драматычным гуртком пры саўгасным клубе. Клуб быў нашым штабам, месцам правядзення палітвучобы, гульняў і інш. цікавай работы.

Памятаю, з якім велізарным юнацкім запалам працавалі тады першыя камсамольцы Н. В. Удалееў, Наташа Сакалова, браты Казловы і інш. Мы ўцягвалі ў актыўнае грамадскае жыццё і моладзь суседніх вёсак, вялі работу сярод сялян, якія прыязджалі да нас на млын. Чыталі ім газеты, растлумачвалі палітыку партыі.

Грудзінаўка засталася ў памяці і таму, што там я працаваў першым сакратаром сельсавета, які быў створаны пасля ліквідацыі воласці ў 1924 г. Першая ідэйная загартоўка і вопыт арганізатарскай работы спатрэбіліся мне пазней, калі ў 1925 г. пераехаў на Браншчыну і працаваў у Жыздраўскім раённым камітэце камсамола да прызыву ў Чырвоную Армію. Пачаў я службу радавым, закончыў яе палкоўнікам.

Цяпер, праз гады, яшчэ больш бачна, як многа даў мне камсамол. У камсамоле і праз камсамол я атрымаў сваё выхаванне як грамадзянін, як воін. Камсамол вучыў мяне жыць для шчасця народа.

Незабыўны след у маёй памяці пакінулі сустрэчы з вядомымі военачальнікамі, кіраўнікамі партыі і ўрада. Мне пашчасціла слухаць прамовы А. В. Луначарскага, С. М. Кірава і іншых выдатных людзей. Вялікай падзеяй у жыцці лічу той час, калі мне давялося стаяць на ганаровым посту каля Маўзалея У. І. Леніна. Сюды няспынным патокам ішлі людзі: рабочыя, з якімі правадыр калісьці шчыра гутарыў, сяляне, што прыехалі за тысячы вёрст, каб аддаць яму зямны паклон, вучоныя, каб зверыць свае думкі па Ільічу. Камсамольская загартоўка спатрэбілася і ў час знаходжання на ахове дзяржаўнай граніцы СССР. Там, на рубяжы двух светаў, асабліва адчувалася адказнасць за лёс краіны, за мірную працу савецкіх людзей.

З успамінаў камсамольца з 1919 г. Канстанціна Антонавіча Маёрава

Пятнаццацігадовым юнаком сустрэў я вестку аб Вялікім Кастрычніку. Быў я тады ўжо загартаваным рабочым, адпрацаваў на гуце ў Ветранцы шэсць год. Пачуццё гаспадара краіны, якое прынёс нам Кастрычнік, давала вялікую крыліцу энергіі, стойкасці маім таварышам-аднагодкам. Камсамольская ячэйка на шклозаводзе працавала з пачатку 1919 г. У яе ўваходзілі Андрэй Цёмкін, Ананас Рудкоўскі, Іван Каштанаў, Рыхарт Шэйнрок, Антон Барысевіч і я. Разам са старэйшымі таварышамі-камуністамі мы ўдзельнічалі ў падаўленні бандаў, якія шпырылі ў лясах, наладжвалі суботнікі, праводзілі палітычную і асветніцкую работу сярод вяскоўцаў.

Потым я добраахвотна ўступіў у рады Чырвонай Арміі, ваяваў супраць белагвардзейцаў. Узмужнелым, шмат набачыўшым праз тры гады вярнуўся ў родную Ветранку. Зноў акунуўся ў кіпучае камсамольскае жыццё. Цяпер першачарговай задачай стала мірная праца. Неўзабаве на шклозаводзе «Ільіч» пачалі стварацца камсамольскія брыгады. Наша брыгада, дзе апрача мяне майстрамі-шкловыдзімальшчыкамі былі Казімір Барысевіч і Пётр Краўчанка, у 1924—1925 гг. была перадавой. У 1930 г. я стаў членам Ленінскай партыі. Рослі і мае сябры. Андрэй Цёмкін стаў міністрам, Ананас Рудкоўскі старшынёй калгаса, Іван Каштанаў гандлёвым кіраўніком, Антон Барысевіч загінуў у баях з басмачамі, Казімір Барысевіч і Пётр Краўчанка не вярнуліся з Вялікай Айчыннай вайны. Першыя ветранскія камсамольцы пранеслі праз усё жыццё рэвалюцыйны энтузіязм, партыйную непрымірымасць да ўсяго варожага Савецкай уладзе. Усё, аб чым мы марылі, збылося.

З успамінаў камсамольца 20-х гадоў Мартына Паўлавіча Паляўцова

Пасля выгнання белапольскіх акупантаў працоўныя Быхаўшчыны пачалі будаваць новае жыццё. Але ворагі ўсяляк імкнуліся шкодзіць, запалохвалі людзей, спрабуючы перацягнуць іх на свой бок, учынялі напады на актывістаў.

У такіх абставінах і нарадзілася ў вёсцы Гарадзец камсамольская ячэйка, якая аб'яднала шэсць чалавек. Сакратаром выбралі Івана Носарава, пасля яго ячэйку ўзначаліў К. І. Лукашоў, а яшчэ пазней — я. Працавалі пад кіраўніцтвам камуністаў. Тады не было ў нас радыё, рэдка хто выпісваў газеты. Мы праводзілі палітмасавую работу ў вёсках Гарадзец, Лубянка, Замошша, Гута, Пянюгі, Падклённе, Уюн і інш. Растлумачвалі сялянам сутнасць дэкрэтаў і пастаноў Савецкай дзяржавы, знаёмілі а падзеямі ўнутры краіны і за мяжой.

У Гарадцы адкрылі чытальню і клуб, які неўзабаве стаў цэнтрам масава-палітычнай і культурнай работы. На нашы вечары збіралася шмат людзей. Спачатку рабілі даклад на злабадзённую тэму, потым выступалі самадзейныя артысты. Гучалі рэвалюцыйныя песні, ставіліся п'есы, гуль-

Быховский районный историко-краеведческий музей

К. А. Маёраў.

М. П. Паляўцоў.

ні і танцы. У камсамольцаў ячэйкі была высокая дысцыпліна. Памятаю, з якой акуратнасцю збіраліся мы на сходы, вядома, пасля працоўнага дня, хоць некаторым ісці даводзілася 6—8 км. Ні цёмная ноч, ні дождж, ні зімовая завіруха не былі перашкодай. Атрыманыя заданні выконвалі бездакорна. Ячэйка расла колькасна і якасна. Той, хто жадаў уступіць у камсамол, на працягу года быў спачуваючым. Яму давалі розныя даручэнні. Прымалі самых актыўных. Усе мы з гонарам пранеслі праз жыццё высокае званне камсамольца.

З успамінаў камсамольца з 1922 г. Канстанціна Ігнатавіча Лукашова

Нарадзіўся я ў беднай сялянскай сям'і. Бацькі мае былі непісьменныя, таму ім вельмі хацелася, каб вучыўся сын. Пачатковую школу я скончыў у 1918 г. і паступіў у павятовую, што знаходзілася ў Старым Быхаве за 15 км ад маёй вёскі Гарадзец.

Калі я прыходзіў у суботу дамоў, у нас збіраліся суседзі, распытвалі аб горадзе, аб падзеях на фронце. Вяскоўцы таксама аказвалі дапамогу фронту: збіралі прадукты, адпраўлялі добраахвотнікаў. Камсамольцы ж бралі пад сваю ўвагу сем'і, кармільцы якіх змагаліся з ворагам. Сельскія камуністы і актывісты прапагандавалі новыя формы працы — таварыствы па сумеснай апрацоўцы зямлі і сельскагаспадарчыя камуны. У 1922 г. я стаў камсамольцам, а ў 1923 г. мяне выбралі сакратаром Гарадзецкай камсамольскай ячэйкі. Працаваць давялося ў выключна цяжкіх умовах. Актывізавалася кулацтва. Любы наш незначны промах яно імкнулася раздуць да неверагодных памераў, сарваць сваю злосць і бяссілле на нас. Дзеля гэтага кулакі не грэбавалі нічым. Але мы цвёрда стаялі на ленінскіх пазіцыях.

У дні першага Ленінскага прызыву Гарадзецкая камсамольская арганізацыя дала мне рэкамендацыю для ўступлення ў партыю балышавікоў. У тым жа годзе па рашэнню райкома партыі мяне прызначылі сакратаром камітэта сялянскага таварыства ўзаемадапамогі. Новая работа цалкам захапіла мяне. Я адчуваў сябе непасрэдным удзельнікам будаўніцтва новай беларускай вёскі. Адпачасова з'яўляўся сакратаром аб'яднанай вытворчай ячэйкі Быхава і членам павяткома камсамола. Здаецца, не было дня, каб мы не збіраліся разам. Працавалі гурткі мастацкай самадзейнасці, палітычнай і агульнаадукацыйнай пісьменнасці, антырэлігійныя семінары, выпускалася насценная газета. Баявое, кіпучае жыццё было ў нас. Самы актыўны ўдзел прымалі камсамольцы ў зямельных камісіях, дапамагалі партыйным арганізацыям і Саветам правесці землеўпарадкаванне, адабраць лішкі зямлі ў кулакоў і надзяліць ёю ў першую чаргу беднякоў і батракоў, а таксама малазямельных сялян.

Неўзабаве па рашэнню райкома партыі мяне накіравалі на шклозавод імя Ільіча ў вёску Ветранка. Камсамольцы завода выбралі мяне сваім сакратаром. Тут, як і на іншых фабрыках і заводах, адбываліся вялікія змены. А потым па пуцёўцы камсамола я паехаў вучыцца ў Ленінградскі універсітэт. Далейшае маё жыццё ўжо было звязана з навукай. (Гл. артыкул «Канстанцін Ігнатавіч Лукашоў» у раздзеле «Родам з Быхаўшчыны...».)

Заўсёды гатовы

З гісторыі піянерскай арганізацыі раёна

Быхаўская арганізацыя юных ленінцаў была створана ў 1924 г. Піянеры актыўна ўдзельнічалі ў сацыялістычным будаўніцтве: старанна вучыліся, збіралі попел для калгасных палёў, зерне, шылі мяшкі. Другому Усебеларускаму злёту піянераў, які адбыўся ў 1930 г., Быхаўская раённая арганізацыя рапартавала:

«...Арганізацыя выросла на 2 атрады за лік дзяцей батракоў, калгаснікаў і рабочых. Мы сталі сапраўднымі памочнікамі партыі і камсамола. Атрад саўгаса «Грудзінаўка» ачысціў 400 пудоў зерня і пратруціў 200 пудоў у час пасяўной кампаніі. Такую работу ў час пасяўной кампаніі правялі амаль усе атрады раёна. Па ініцыятыве піянераў ачышчана зерне ва ўсім сельсавеце, закладзены тры доследныя ўчасткі.

Мы заяўляем, што дагавор з райкалгассаюзам і райземчасткай выкананы намі на 80 працэнтаў, і зараз, калі праходзіць уборачная кампанія і кампанія рэалізацыі пазыкі «Трэці рашаючы», уся піянерская арганізацыя аб'явіла сябе ўдарнай».

Аб рабоце піянераў і школьнікаў 1-й Быхаўскай

Быховский районный историко-краеведческий музей

Мемарыяльная дошка П. І. Баранкевічу ў вёсцы Трасцівец.

П. І. Баранкевіч.

Х. Х. Міронаў.

сярэдняй школы 10 кастрычніка 1940 г. пісала газета «Піянер Беларусі». Рабяты спаборнічалі адзін з адным за добрыя адзнакі, за глыбокія веды. Важатыя звеняў вялі спецыяльныя дзённікі, дзе адзначалася выкананне абавязацельстваў. У класах у канцы тыдня падводзіліся вынікі вучобы кожнага вучня. Школьная радыёгазета на вялікім перапынку таксама паведамляла аб ходзе спаборніцтва класаў і вучняў. Для таго, каб рабяты маглі расшырыць свае веды па тым ці іншым прадмеце, у школе, акрамя існуючых гурткоў, ствараліся геаграфічны, літаратурны, гістарычны, матэматычны. Гэта давала магчымасць вывучаць дадатковы матэрыял. Рабяты самі рыхтавалі даклады, праводзілі свае зборы, каб расказаць аб зробленым, каб павучыцца ў лепшых. Піянеры з першых дзён нараджэння сваёй арганізацыі заўсёды былі надзейнымі памочнікамі старэйшых.

Т. Бабкова.

ПЁТР ІВАНАВІЧ БАРАНКЕВІЧ

Камсамольскі актывіст. Нарадзіўся 11.7.1903 г. ў в. Трасцівец Быхаўскага р-на. Вёў арганізацыйную, прапагандысцкую і культурную работу сярод вясковай моладзі. У 1924 г. стварыў і ўзначаліў у в. Мокрае камсамольскую ячэйку, старшыня Макранскага камітэта сялянскай узаемадапамогі. Насценная газета, якую выдавалі камсамольцы, іх выступленні ў перыядычным друку выкрывалі варожую дзейнасць кулацкіх элементаў, растлумачвалі сялянам неабходнасць арганізацыі калектыўнай сацыялістычнай гаспадаркі. Кулакі вырашылі адпомсціць камсамольскаму важаку. 20.1.1925 г. ноччу, калі Пётр Баранкевіч вяртаўся з в. Холстава, дзе праводзіў сход, прысвечаны першай гадавіне смерці У. І. Леніна, на яго быў зроблены злачынны замах. Памёр 21.1. 1925 г. ў быхаўскай бальніцы. Як успамінала яго сястра Вольга Іванаўна Бутэнка, шмат людзей прыйшло праводзіць Пятра ў апошні шлях. На плошчы ў Быхаве адбыўся жалобны мітынг. Прагучаў вінтовачны салют. І яшчэ ёй запомніліся радкі з акруговай газеты «Соха и молот»: «Забойца за кратамі. Па заслугах адплаціць яму рэвалюцыйны суд. А вы, макранская моладзь, тыя, што рвуцца да новага светлага жыцця, не смуткуйце. Памятайце, што забойства Баранкевіча не выпадковае. Ахвяры немінучы ў той барацьбе, якую вядзе беднаты з багацеямі».

Пахаваны П. І. Баранкевіч у Быхаве ў брацкай магіле барацьбітоў за Савецкую ўладу, савецкіх воінаў і партызан. Землякі свята шануюць памяць аб ім. На доме, дзе нарадзіўся П. І. Баранкевіч, устаноўлена мемарыяльная дошка, яго імя прысвоена камсамольскай арганізацыі Макранскай сярэдняй школы.

Першы трактар

З успамінаў першага трактарыста раёна Хвядоса Яфрэмавіча Міронава

У 1919 г. ў нашым Сарочыне ў маёнтку панаў Радкевічаў партыец Цімох Сарокін арганізаваў камуну. Спачатку ў яе аб'ядналася дзевяць сямей. Вядома, адна беднота гаротная. Але справы пайшлі добра. Хутка і маламоцнае сялянства пацягнулася да камунараў. Прынялі і мяне. Адразу неяк дзіўна было. Раней, што было ў цябе, казаў «маё». А тут табе паказваюць усё вакол

Быховский районный историко-краеведческий музей

і гавораць: «Ты гаспадар над усім». Аж не верылася. Справы ў камуне ладзіліся. Ах, як спорна праца ішла! Аднойчы вечарам барометр паказваў на дождж. У нас жа 20 га жыта ў снапах на полі. Вырашылі ўбраць. Запалілі ліхтары. Вазілі і пасілі снапы ў гумно цэлую ноч. Раніцай зарадзіў дождж, і на некалькі дзён.

Знаходзіліся і такія, каму не па нутру была камуна. Ворагі ноччу спалілі кароўнік з каровамі і стагі канюшыны, з-за вугла стралялі па актывістах камуны. Думалі, мярзотнікі, што разбяжымся. Не атрымалася па-іхняму. А ў 1924 г. нам трактар выдзелілі. На трактарыстаў паслалі вучыцца Івана Лагунова, Трыфана Карпікава і мяне. Я да гэтага з тэхнікай быў крыху знаёмы — працаваў на паравым млыне. Трактар весці ў Сарочына даручылі мне. Здавалася, не машынай кіраваў, а ўсёй зямлёй. У вёсках дзівіліся на трактар, як на цуд нейкі. А калі ў поле выязджалі, цэлае шэсце з навакольных вёсак збіралася. Некаторыя меркавалі глыбіню ворыва. Помніцца, як адзін дзядзька на каленях поўзаў па раллі, пераварочваў скібы зямлі і ўсё параўноўваў, лепш трактар арэ за каня ці не.

Ездзіў я дапамагаць у Кучын у камуну імя М. В. Фрунзе. Трактар жа быў адзін на ўвесь раён. У 1933 г. стаў працаваць у Быхаўскай МТС.

Мінулі гады, і на палях раёна сталі працаваць сотні розных трактароў. А ўсё ж не забываецца той, на якім давялося праклясці першую баразну на калектыўным полі.

Змаганне за камуну

Гэты артыкул пра 1-ю Сарочынскую камуну імя Карла Лібкнехта быў надрукаваны ў святочным нумары газеты «Савецкая Беларусь» ад 7 лістапада 1927 г., прысвечаным 10-годдзю Вялікага Кастрычніка.

У васьмі вярстах ад Быхава, недалёка ад чыгункі жыве камуна імя Карла Лібкнехта, атрымаўшая на ўсебеларускім сельскагаспадарчым конкурсе дыплом першынства.

Некалі тут быў маёнтак багатых паноў Радкевічаў — «Сарочына». А навокал ляпіліся бедныя, убогія вёскі. Малазямельныя, забітыя сяляне з зайздрасцю і затоенай злобай глядзелі на набытае іх крывёй панскае багацце.

Прагучэў гром вялікай рэвалюцыі. Паляцелі ўверх нагамі паны. Маёнтак стаў уласнасцю батракоў і сялян.

...У 1919 годзе ў Сарочыне 30 былых батракоў і сялян-беднякоў засноўваюць камуну, якая названа імем Карла Лібкнехта.

Цяжка было ў першыя часы камунарам.

Грамадзянская вайна, польская і нямецкая акупацыя, наскокі бандытаў — вось першыя старонкі гісторыі камуны.

Акружныя кулакі і баркалабаўскія манашкі ўсімі сіламі стваралі ў колах больш адсталага сялянства варожы настрой супраць камунараў.

Але камунары не здаваліся. Упарта рабілі яны сваю справу, трымаючы ў адной руцэ плуг, а ў другой вінтоўку.

Раззлаваліся кулакі ў 1924 годзе, падпалілі камуну. Згарэлі маёмасць, жывёла, будынкі,— усё тое, што было набыта ўпартай цяжкай работай.

Узрадаваліся ворагі камуны. Але дарэмна. Велічэзным размахам энергічнай і ўпартай работы лібкнехтаўцы аднавілі зруйнаванае.

Навакольнае сялянства ўбачыла моц калектыву, з павагай стала адносіцца да камунараў.

А камуна шырокім крокам ішла да новых дасягненняў.

...Зараз камуна налічвае ў сваіх шэрагах 150 камунараў (ліцвы і дзяцей). Унутры распарадак камуны наскрозь прасякнуты калектывізмам. Жывуць усе ў адным вялікім будынку,—

Помнік у вёсцы Сарочына ў гонар камуны імя К. Лібкнехта.

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

Члены праўлення камуны імя К. Лібкнехта. 1928 г.

підзе непрыкметна ні бруду, ні непарадку. Усюды чыстата... У кожнай кватэры кніжныя полкі, кветкі на вокнах.

Ядуць камунары ўсе ў адной харчэўні. Многа спажываецца мясных і малочных прадуктаў. Сама харчэўня — велічэзны светлы пакой...

Уся праца ў камуне размеркавана паміж асобнымі камунарамі па спецыяльнасцях і жаданню.

Ёсць у камуне паравы млын, крухмальны завод, невялікая лесапілка, арандуемы ў Быхаўскім ВРК ветравы млын.

Абрабляюцца камунарскія палі сельскагаспадарчымі машынамі. Маюцца трактары, сеялкі, касілкі, жнейкі і іншыя.

30 працэнтаў пасяўной плошчы засяваюцца караняплодамі і кармавымі травамі. Камунары — мастакі паляводства.

Імі выведзен новы палепшаны, досыць ураджайны гатунак жыта.

Ураджай камунарскіх палёў далёка заставіў за сабой сялянскія нівы.

Наогул камуна з'яўляецца буйным культурным цэнтрам сярод мора сялянскіх гаспадарак.

Паміж сялянствам і камунарамі самая цесная сувязь, навакольнае сялянства добра разумела значэнне камуны. Камунары аказваюць ім усякую магчымую дапамогу.

У камуне можна заўсёды знайсці добры гатунак збожжа і г. д. Калі патрэбна парада, ці бяда якая здарыцца, селянін жа да камунараў. Яны ніколі не аставяць без дапамогі.

А галоўнае — гэта прыклад камуны. Камуна арганізоўвае думкі сялянства ў напрамку калектывізму, у напрамку паляпшэння іх гаспадаркі. На жывым прыкладзе камуны сяляне бачаць моц калектыву, які, перамогшы велічэзныя перашкоды, зараз муруе сцены светлай будучыні.

ТЭЛЕГРАМА КАЛЕКТЫВУ ШКЛОЗАВОДА «ІЛЬІЧ» (БЫХАЎСКІ РАЁН) ВЦВК БССР І БЕЛШКЛАТРЭСТУ АБ ПУСКУ РЭКАНСТРУЯВАНАГА ЗАВОДА

9 лістапада 1927 г.

Дорогие товарищи!

В подарок 10-й годовщине Октября усилиями рабочих под руководством Компартии мы с гордостью преподносим заново переоборудованный завод, названный великим именем «Ильич».

Разделяя нашу радость с вами, мы от души приветствуем вас и заверяем, что завод, носящий великое имя, оправдает надежды и возложенную на него задачу.

Да здравствует 10-я годовщина Октября!

Рабочие, гости, организации завода «Ильич».

Индустриализация Белорусской ССР (1926—1941 гг.): Сб. документов и материалов. Мн., 1975. С. 70.

Быховский районный историко-краеведческий музей

РЭЗАЛЮЦЫЯ БЮРО БЫХАЎСКАГА РАЙКОМА КП(б)Б «АБ СТАНЕ ВЫТВОРЧАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ КААПЕРАЦЫІ Ў РАЁНЕ»

9 лютага 1928 г.

1. Калектывізацыя і кааперыраванне па вытворчых галінах сельскай гаспадаркі па раёну характарызуюцца наступным: маецца 2 камуны, 8 калгасаў, з якіх землеўпарадкавана 5 калгасаў і 2 камуны, якія займаюць плошчу 44 дзес., аб'яднана 142 гаспадаркі, або 1,5 % гаспадарак раёна. У мінулым, 1927 г., арганізавана 7 калектываў, павелічэнне росту на 200 % . Арганізавана жывёлагадоўчае і пчалаводнае таварыствы — 140 пайшчыкаў, або аб'яднана 1,5 % гаспадарак; арганізавана 2 машынных таварыствы, быццам таварыстваў з 92 пайшчыкамі; 2 малочных арцелі арганізаваны ў мінулым годзе і 3 у 1927 г. з 165 пайшчыкамі, або 1,6 % усіх гаспадарак, садова-агародных таварыстваў 4 з 34 гаспадаркамі, меліяратыўных таварыстваў 49 з 2200 гаспадаркамі, або 21,7 % гаспадарак, тарфяных таварыстваў 2 з 29 гаспадаркамі, вогнетрывалых 3 з 60 гаспадаркамі і сельскагаспадарчых крэдытных таварыстваў 3, з якіх 2 арганізаваны ў 1927 г., якія ахопліваюць 3500 гаспадарак, або 30 % гаспадарак па раёну. Усяго вытворчых аб'яднанняў 87 з 5922 гаспадаркамі, або 58 % усіх гаспадарак па раёну.

2. У землеўпарадкаваных калгасах уводзіцца складанне вытворчых праграм і смет, а таксама абагульнены сродкі вытворчасці і пачынае складацца і накаплівацца недзялімы капітал.

3. Узмацняецца сувязь з акаляючым насельніцтвам шляхам арганізацыі і абслугоўвання злучнымі пунктамі і семянамі, у выніках чаго ўзрастае аўтарытэт калектываў.

У далейшым неабходна:

1. Пераабразаванне мелкіх індывідуальных сялянскіх гаспадарак у буйныя калектывы павінна быць пастаўлена ў грунтовы загад фракцыі РВК і партячэек, якія да гэтага моманту гэтай працы зварочвалі зусім мала ўвагі.

2. Сельскагаспадарчы крэдыт накіроўваць такім чынам, каб хутчэй развіваць вытворчае кааперыраванне бядняцкіх гаспадарак, узмацніўшы ўвагу справе ваўлячэння сялянскіх укладаў і асабліва справе арганізацыі кааператыўных прадпрыемстваў па перапрацоўцы і інш.

3. Фракцыі РВК паставіць спецыяльным загадам распрацоўку практычных пытанняў арганізацыі і планавання работ сельскагаспадарчых калектываў і іншых пярвічных аб'яднанняў.

4. Фракцыі РВК праз крэдытныя таварыствы ўсямерна падтрымліваць пашырэнне сеткі бядняцка-серадняцкіх таварыстваў па прыабраценню і супольнаму карыстанню сельскагаспадарчымі машынамі, адначасова павесці рашучую барацьбу супраць лжэтаварыстваў і лжэкааператыўных налогаў.

5. Неабходна звярнуць больш увагі на замацаванне існуючых калектыўных гаспадарак і на разгортванне самых простых відаў калектывізацыі — розных першапачатковых аб'яднанняў (машынных, па агульнай апрацоўцы глебы і г. д.) і ператварэнне іх у калектывы.

6. Фракцыі РВК распачаць працу па падрыхтоўцы кадраў кіраўнікоў калектыўных гаспадарак, пры кам КПБ узмацніць партыйны ўплыў у іх, больш разгортваць працу па ўмацаванню грамадзянскай думкі, растлумачэнню мэты і задачы калектыўных гаспадарак, арганізоўваючы іх так, каб яны з'яўляліся прыкладам для акаляючага насельніцтва.

7. Прымаючы пад увагу ўзрост усіх відаў аб'яднанняў, неабходна ў мэтах усебаковага абслугоўвання іх мець паміж маючыхся ўжо аграпрацаўнікоў яшчэ спецыяльнага агранома-кааператара, для чаго фракцыі РВК хадайнічаць перад акрвыканкомам аб дадатковым асігнаванні на адчыненне ў Быхаўскім раёне пасады інструктара-кааператара.

Подготовка сплошной коллективизации сельского хозяйства Белорусской ССР (ноябрь 1927 г.— ноябрь 1929 г.): Сб. документов и материалов. Мн., 1976. С. 44—45.

Член ЦВК

Пасля смерці мужа Юлія Пятроўна Казлоўская пераехала з дваімі малалетнімі дзецьмі з Гомельшчыны на Быхаўшчыну. Толькі-толькі скончылася грамадзянская вайна. Вёскі раёна бурлілі. Амаль штодня праходзілі сходы сялян. Юлія Пятроўна з галавой акунулася ў грамадскую работу: як дэпутат Макранскага сельсавета згуртоўвала бядняцкія масы, растлумачвала ім сэнс палітыкі

Быховский районный историко-краевед ческий музей

Ю. П. Казлоўская.

партыі на сяле, працавала ў жаночым савеце сельвыканкома, старшынёй касы ўзаемадапамогі. З'яўляючыся членам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР у 1925—1927 гг., Юлія Пятроўна прыкладала шмат намаганняў, каб у вёсцы Мокрае пабудаваць школу. Але не было сродкаў. У 1927 г. Казлоўская на сельскагаспадарчай парадзе ў Маскве сустрэлася з Н. К. Крупскай. Надзея Канстанцінаўна з вялікай цікавасцю распытвала дэлегатаў, як ідзе ліквідацыя непісьменнасці ў вёсках. Юлія Пятроўна расказвала ёй, што затрымліваецца будаўніцтва школы ў Макранскім сельсавеце. Крупская паабяцала дапамагчы. Праз некаторы час у цэнтры вёскі Мокрае быў пастаўлены двухпавярховы будынак новай школы.

Тройчы ў час калектывізацыі стралялі ў Юлію Пятроўну кулакі, помсцячы за актыўную работу па арганізацыі калгасаў. Тройчы смерць стаяла побач. Новыя цяжкасці выпалі на яе долю ў Вялікую Айчынную вайну. Казлоўскай было ўжо за пяцьдзесят, хворая, яна не змагла эвакуіравацца на ўсход і засталася на акупіраванай тэрыторыі. Здраднікі данеслі фашыстам, што ў вёсцы Трасцівец жыве член Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР. Але дзякуючы добрым людзям Юлія Пятроўна пазбегла расправы. Пад чужым прозвішчам яна жыла ў вёсцы Абідавічы да прыходу Чырвонай Арміі.

Памерла Ю. П. Казлоўская 22 лістапада 1968 г.

Дэлегатка жаночага з'езда

У 1918 г. маладая пастаўніца з в. Гарадзец Сусанна Апанасаўна Кірпічэнка ўключылася ў барацьбу супраць польскіх і нямецкіх акупантаў. Па заданню Быхаўскага падраённага падпольнага камітэта партыі дастаўляла паўстанцам зброю, распаўсюджвала бальшавіцкія адозвы, вяла агітацыйную работу сярод сялян і варожых салдат. Пасля вызвалення Быхаўшчыны пераехала ў в. Сарочына, дзе ўступіла ў камуну імя К. Лібкнехта. Самаадданай працай, цвёрдай верай у новае жыццё, выдатнымі арганізатарскімі здольнасцямі заслужыла Сусанна Апанасаўна аўтарытэт у вяскоўцаў. У 1924 г. раённы камітэт партыі прызначыў яе загадчыцай жаночага аддзела. Працавала з натхненнем, яе цікавілі грамадска-палітычная актыўнасць жанчын, ліквідацыя непісьменнасці, ахова здароўя дзяцей і маці. Хутка яна выйшла замуж за знаёмага яшчэ па падполлі камуніста Брытава. Райком партыі даручыў С. А. Брытавай стварыць камуну ў яе родным Гарадцы. І ў 1926 г. яна ўзначаліла створаную ёй жа камуну імя К. Маркса. У снежні 1929 г. ў Маскве адбыўся 1-ы Усесаюзны з'езд жанчын-калгаснiц. У ліку дэлегатаў была і Сусанна Апанасаўна. З дакладам на з'ездзе выступала Н. К. Крупская, якая на развітанне сфатаграфавалася з групай дэлегатак. Сярод іх была і С. А. Брытава.

Пабудаваны ў першай пяцігодцы

Летам 1929 г. на ўрочышча «Эсманава» прыехалі інжынеры, каб даследаваць балота. Моладзь прагна слухала тлумачэнні гасцей, ахвотна ішла ў брыгады пошукавых работ. Хутка даследчыкі атрымалі звесткі аб заляганні тарфяной масы, усе характарыстыкі будучага паліва. Аналізы пацвердзілі, што торф можна выкарыстоўваць як паліва для цеплаэлектрацэнтралі Магілёўскага завода штучнага валакна. У гэтым жа годзе пачалося будаўніцтва торфапрадпрыемства «Чырвоная Беларусь». Людзі пайшлі ў наступ на балота: зводзілі хмыз, капалі канавы, спускалі ржавую ваду і асушалі дрыгву. Змаганне было нялёгкім. Амаль усё рабілася ўручную. Але цяжкасці не палохалі маладых рабочых. На будаўніцтве торфазавода самаадданa працавалі Віктар Ляшчоў, Фрол Арэшка, Пётр Станкевіч, Герман Жыхараў, Рыгор Піваварaў і інш. Гэта былі нашы першыя стаханаўцы. Пасля таго, як былі пракапаны цэнтральныя магістральныя каналы, балота пачало асядаць, а неўзабаве быў адкрыты першы кар'ер. Падрыхтавалі палі для сушкі торфу. У 1931 г. пусцілі ў ход элеватарную машыну з 48-сільным лакамабілем і пачалі здабычу кавалкавага торфу. Паліва пачало паступаць з «Чырвонай Беларусі» на цеплаэлектрацэнтраль. Вялося будаўніцтва і ў рабочым пасёлку. Былі ўзведзены жылыя дамы, сталовая, клуб, магазін і іншыя будынкі.

Быховский районный историко-краевед ческий музей

Дваццаціпяцітысячнік Пётр Захарыеў

Пётр Захаравіч Захарыеў нарадзіўся ў 1890 г. ў Балгарыі. Напярэдадні 1-й сусветнай вайны прыехаў вучыцца ў Пецярбург. Прызнаўшы Кастрычніцкую рэвалюцыю, стаў яе байцом. Узначаліў Петраградскую групу балгар камуністаў, быў старшынёй балгарскай секцыі РКП(б). У 1918 г. прымаў удзел у Міжнародным мітынгу, дзе разам з балгарынам М. А. Антонавым выступіў як адзін з аўтараў Маніфеста да сваіх суайчыннікаў. Некалькі разоў бачыў і слухаў У. І. Леніна, а 17.1.1919 г. ў Маскве сустрэўся з правадыром рэвалюцыі. Было гэта ў час работы канферэнцыі камуністаў балканскіх краін. П. З. Захарыеў успамінаў гэтыя падзеі так: «Мы накіраваліся ў Вялікі тэатр слухаць даклад Леніна. Нас пасадзілі ў ложу насупраць трыбуны. На трыбуну падняўся Ленін. Ён гаварыў, што становішча цяжкае, што мы акружаны. Чэрчыль мабілізаваў 14 дзяржаў супраць нашай рэспублікі і рашыў яе задушыць. Кулак пасадзіў на васьмушку хлеба рабочых прамысловых цэнтраў... Яшчэ адна такая зіма, і пытанне аб існаванні Савецкай улады можа стаць у парадак дня! Пад канец Ленін з характэрным для яго жэстам усклікнуў, што справа рабочага класа непераможная. Зала напоўнілася апладысментамі, запелі «Інтэрнацыянал...»

Калі да чырвонага Петраграда падышоў Юдзеніч, Захарыеў уступіў у рады Чырвонай Арміі і ўзначаліў ваенны шпіталь. Пасля грамадзянскай вайны працаваў дырэктарам бальніцы імя І. І. Мечнікава ў Ленінградзе. У канцы лютага 1930 г. ў складзе групы з 16 ленінградскіх камуністаў ён быў накіраваны ў Магілёў спецыяльным упаўнаважаным прадстаўніком ЦК РКП(б) па пытаннях калектывізацыі. У сакавіку 1930 г. ў лісце свайму сябру М. Антонаву ён паведамляў: «...У Магілёве нас размеркавалі па раёнах, і я першага сакавіка прыехаў у Быхаў, а праз дзень разам з прадстаўніком ЦК Беларусі накіраваўся ў «цяжкую» вёску. Абстаноўка складаная, як на фронце. Мужыкі заняці пасіўную лінію, прыкрываюцца словамі: «Куды людзі, туды і мы», а жанчыны наступаюць: «Не хочам!» Урэшце-рэшт правялі перавыбары сельсавета і сходку беднаты.

5 сакавіка мяне адкліканлі ў Ніжнятошчыцкі сельсавет, дзе, як расказалі мне, нядаўна адбыўся «жаночы бунт» супраць калектывізацыі. Ніхто ніякіх парад мне не даваў, ды і не мог даць. Ідзі працуй. Спачатку трэба было разабрацца ў абстаноўцы, даведацца, чаму ўзнік «бунт», заключыць «перамір'е» з сялянамі, правільней з жанчынамі. Пачаў склікаць сходкі. Некаторыя таварышы папярэджвалі, што мне не дадуць гаварыць, але далі... Пабываў ва ўсіх вёсках сельсавета і правёў гутаркі з былымі чырвонаармейцамі, скалаціў актыў з бяднейшай часткі сялян для арганізацыі сельгасарцелі...»

У гэтым жа пісьме П. З. Захарыеў рэзка крытыкаваў «гора-калектывізатараў», «правядзенне калектывізацыі з канца», калі рабіліся вывады,

Брыгада А. М. Азаранка па сушцы і ўборцы торфу торфзавода «Чырвоная Беларусь».

Быховский районный историко-краеведческий музей

П. З. Захарыеў.

В. П. Куляшоў.

што пры калектывізацыі адразу наступіць рай зямны і ўсё за кошт камуны. Выступіў супраць пагоні за лічбамі і працэнтамі, выказваў свае думкі аб неабходнасці дапамогі пачынаючым калгасам кадрамі, аб асабістай матэрыяльнай зацікаўленасці сялян, якія працавалі ў калгасах, аб форме аплаты за іх працу і г. д.

У гэтых складаных абставінах асабліва праявіліся арганізатарскія здольнасці Захарыева. Каб заваяваць давер сялян, ён дазволіў ім узяць назад абагульнены насенны фонд. Сяляне ў сваю чаргу паабяцалі, што зберагуць насенне да пасяўной. Паступова яны паверылі ў новага кіраўніка. 1 красавіка 1930 г. ў в. Ніжняя Тошчыца з бядняцкіх гаспадарак быў арганізаваны калгас «Першае Мая». Пётр Захаравіч паехаў у Быхаў, дабіўся пазыкі і на гэтыя грошы купіў пару коней, набыў сякі-такі інвентар, угнаенні. З суседняга саўгаса «Інтэрнацыянал» прыйшоў трактар з чырвоным сцягам і ў прысутнасці ўсіх членаў арцелі была пракладзена першая баразна на калгасным полі. Пасяўную правялі паспяхова. Віды на ўраджай былі добрыя.

У чэрвені канчаўся тэрмін камандзіроўкі Захарыева. Усе жыхары вёскі прыйшлі праводзіць свайго старшыню. У знак павагі калгасніцы падаравалі яму вышытую кашулю (пазней яна захоўваецца ў Быхаўскім гісторыка-краязнаўчым музеі). Доўгі час пасля П. З. Захарыеў меў сувязь з жыхарамі Ніжняй Тошчыцы. Не раз прасілі яны ў яго дапамогі парады і заўсёды адчувалі падтрымку.

Бальніца імя І. І. Мечнікава, якую ўзначальваў П. З. Захарыеў, была адной з лепшых медыцынскіх устаноў. У савецка-фінляндскую вайну 1939—1940 гг. намеснік начальніка гарадскога аддзела аховы здароўя П. З. Захарыеў арганізоўваў шпіталі, у Вялікую Айчынную вайну займаўся эвакуацыяй хворых з блакаднага Ленінграда. Перад пенсіяй працаваў дырэктарам аднаго з кніжных магазінаў Ленінграда.

У 1971 г. за заслугі ў справе ўмацавання савецка-балгарскай дружбы Прэзідыум Народнага Сходу НРБ узнагародзіў П. З. Захарыева ордэнам «9 верасня 1944» I ступені. Такой жа ўзнагароды ён быў удастоены і ў 1975 г. Памёр П. З. Захарыеў у лютым 1977 г. *В. А. Белакузаў.*

Адданыя справе

З успамінаў В. П. Куляшова

Васіль Паўлавіч Куляшоў нарадзіўся ў 1895 г. ў вас. Рыхартава Быхаўскага р-на. З сялян. Член КПСС з 1940 г. Удзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, грамадзянскай вайны. Змагаўся ў партызанскім атрадзе С. К. Дзергачова, у складзе Гатчынскага палка ўдзельнічаў у разгроме войск Юдзеніча пад Петраградам. Адзін з арганізатараў калгаснага руху на Быхаўшчыне. З 1928 г. выбіраўся членам, сакратаром і старшынёй Таймanаўскага сельсавета, у 1938 г.— дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР па Навабыхаўскай выбарчай акрузе. У Вялікую Айчынную вайну старшыня сельсавета і загадчык райсабеса ў Варонежскай вобл., пасля вайны на савецкай і гаспадарчай рабоце ў Быхаўскім р-не. Памёр 5.4.1977 г.

Быў люты 1917 года. Чаканячы крок, па Луцку ішоў наш 900-ы полк. Не спыняючыся, мы ўвайшлі ў турэмныя вароты. З акоп пачуліся воклічы: «Браткі-салдаты! Мы палітычныя. Вызваліце нас!» Мы кінуліся на жандараў, абяззброілі іх і выпусцілі з камер зняволеных. Так я атрымаў першы рэвалюцыйны ўрок.

18 чэрвеня быў аддадзены загад аб наступленні. Наш полк адмовіўся падпарадкоўвацца Часоваму ўраду. Калі прыбылі карнікі, мы іх сустрэлі кулямётным і ружэйным агнём. Гэта быў мой другі рэвалюцыйны ўрок.

Праз чатыры месяцы адбылася Кастрычніцкая рэвалюцыя. Я з іншымі салдатамі зрываў пагоны з афіцэраў, потым крочыў у лаві не дэманстрантаў па вуліцах Роўна, трымаючы дрэўка чырвонага сцяга.

Калі полк расфарміравалі, я падаўся дамоў. Нялёгкім быў гэты шлях. На ім былі нямецкія і пятлюраўскія заставы, палон, турма ў Гомелі і, нарэшце, родныя Камарычы.

Але і дома было нясмачна. Тут гаспадарылі польскія легіянеры і кайзераўскія салдаты. Яны аднавілі стары парадак. Тых, хто не падпарадкоўваўся, секлі шомпаламі, расстрэльвалі. І падаўся я за Дняпро ў партызанскі атрад Спірыдона Дзергачова. Пасля стварэння Чырвонай Арміі ваяваў за Савецкую ўладу ў складзе 17-й дывізіі, пазней трапіў у Гатчынскі полк, змагаўся з

Быховский районный историко-краеведческий музей

Юдзенічам, англійскімі інтэрвентамі пад Архангельскам. Пасля цяжкага ранення вярнуўся дамоў. У вёсцы якраз дзялілі зямлю пана Мінкевіча. Пайшоў у поле і я. Паглядзеў і сэрца сціснулася. Тут гаспадарылі кулакі. Яны адмяралі сабе лепшую зямлю, а беднякі стаялі, не адважваючыся спыніць агіднасць.

— Чаго маўчыце, землякі? — закрычаў я.— Зараз зямля наша. І дзяліць яе будзем мы.

Народ пайшоў за мной. Усе беднякі атрымалі зямлю. Не даравалі кулакі мне гэтага. Неяк уначы спалілі хату, якую я пабудаваў на былой панскай зямлі. Давялося зноў будавацца. З 1928 г. землякі выбіралі мяне членам, сакратаром і старшынёй Тайманаўскага сельсавета. Шмат давялося працаваць. Добрымі памочнікамі ва ўсіх справах былі сормаўскі камуніст-дваццацітысячнік Шчаглоў і актывісты Іван і Ісак Мархоценкі, Мітрафан Куляшоў, Наста Шусцікава, Марыя Антоненка, Мікалай Стральцоў і інш. Гэта былі людзі адданыя справе.

Разам з паперамі і пячаткай Тайманаўскага сельсавета прыняў я і клопаты аб калектывізацыі. Амаль кожны дзень праходзілі сходы. Слухалі нас уважліва, многія ківалі галовамі ў знак згоды, а калі ставілася пытанне на галасаванне аб уступленні ў калгас, узнімаліся толькі рукі беднякоў. Бывала, неасцярожна кінутае слова псавала ўсю работу. Неяк прыехаў у сельсавет на сход прадстаўнік наркамзема. Гаварыў ён доўга, усё больш рабіў націск на стопрацэнтную калектывізацыю. Пасля выступлення нехта спытаў: «А што будзе з тымі, хто не ўступіць у калгас?» — «Няхай лепш не чакае таго, што будзе»,— не то ў жарт, не то сур'ёзна выгукнуў ён. Адказ такі выклікаў абурэнне. Лямпа рантам патухла. Чыесьці рукі пацягнуліся да прамоўцы. Нам ледзь удалося выратаваць яго ад бяды. Процілегласцю ямы быў рабочы завода «Чырвонае Сормава» Міхаіл Іванавіч Шчаглоў. Яго тактоўнасць і вытрымка, ідэйная перакананасць і справядлівасць прыцягвалі людзей.

Трынаццаць дзён Міхея Белакузава

Вясной 1929 г. камуністы і актывісты спрабавалі арганізаваць у Ніканавічах калгас. Сход праводзілі ўпаўнаважаныя з раёна на чале з аграномам Бяляевым. Гаварылі доўга і красамоўна, але як практычна падысці да справы, не ведалі. Проста паставілі пытанне так: «Хто супраць камуны, той супраць Савецкай улады». Такая катэгарычнасць выклікала абурэнне прысутных. Зазвінела шкло разбітай лямпы. Сход сарваўся. Сакратар партыйнай ячэйкі Іван Чыжоў, Арцём Смалячкоў, Дзямід Клінцоў, Міхей Белакузаў, Саўка Лапуноў, Павел Гапееў і іншыя актывісты сабраліся пасля сходкі ў хаце старшыні сельсавета Пракопа Ігнацьева. Раіліся, што рабіць далей. Вырашылі ўзмацніць агітацыю сярод сялянскай беднаты і самім уступіць у існуючы ў Падгор'і калгас «Згода». У той час і пераехаў у Падгор'е Міхей Феафанавіч Белакузаў. Малады камуніст энергічна праводзіў у жыццё лінію партыі. Днём працаваў у калгасе, увечары ішоў у Ніканавічы да аднаасобнікаў, каб яшчэ і яшчэ раз пагутарыць аб іх будучым жыцці. Але не драмалі і ворагі. Яны палілі сялібы актывістаў, распаўсюджвалі антысавецкія плёткі, правакавалі сялян рэзаць жывёлу, птушку перад уступленнем у калгас. Міхей Белакузаў выступаў на сходах, патрабуючы спыніць разбоі. І ворагі затаілі злосць на яго.

12 красавіка 1930 г. вяскоўцы выбралі М. Ф. Белакузава старшынёй Ніканавіцкага сельсавета. З першага ж дня сваёй дзейнасці Міхей з галавой акунуўся ў новую работу.

25 красавіка 1930 г. М. Ф. Белакузаў вяртаўся ў Падгор'е пасля сходу. Не заўважыў, як прыйшоў дадому. Пяцігадовая дачушка яшчэ не спала, чакала бацьку. Міхей узяў яе на рукі, пацалаваў і палажыў спаць. Потым зняў кашулю і падышоў да печкі. У гэты момант і грымнулі за акном два бандыцкія стрэлы. Ногі Міхея падкасіліся, і ён цяжка апусціўся на падлогу. Гэта здарылася на 13-ы дзень пасля таго, як ён узначаліў Ніканавіцкі сельсавет... *А. Гарошка.*

Браты Антонавы

Дзмітрый Мікалаевіч Антонаў нарадзіўся ў 1897 г. ў в. Клятное Быхаўскага р-на. З сялян. Член КПСС. У час 1-й сусветнай вайны быў прызваны ў царскую армію, вёў рэвалюцыйную бальшавіцкую прапаганду сярод салдат, распаўсюджваў лістоўкі з лозунгамі аб ператварэнні вайны імперыялістычнай у вайну супраць пануючых класаў, з заклікам да знішчэння царызму. За гэта ў канцы 1916 г. быў зняволены ў турму. Пасля Лютаўскай буржуазнай рэвалюцыі выйшаў на волю і адразу ўключыўся ў рэвалюцыйную дзейнасць спачатку ў г. Асташкаве Цвярской губерні (там працягваў службу), а з жніўня 1917 г. ў Быхаве. Пасля акупацыі правабярэжнай Быхаўшчыны белапалякамі, потым кайзераўскімі войскамі, знаходзіўся ў падполлі, разам з іншымі бальшавікамі рыхтаваў паўстанне супраць акупантаў, вёў рэвалюцыйную прапаганду сярод нямецкіх салдат. Пасля вызвалення павета узначаліў міліцыю ў Быхаве, быў народным

Быховский районный историко-краеведческий музей

П. М. Антонаў.

суддзёй, потым чэкістам. У 1919 г. прымаў удзел у падаўленні эсэраўскага мяцяжу ў раёне Прапойска. Працаваў асобаўпаўнаважаным у Смаленску. За праяўленую ініцыятыву і настойлівасць пры ліквідацыі бандаў на тэрыторыі Цвярской і Смаленскай губерняў узнагароджаны ў 1927 г. імянной зброяй. Памёр Дз. М. Антонаў у 1930 г.

Пётр Мікалаевіч Антонаў нарадзіўся ў 1895 г. ў в. Клятное. З сялян. Член КПСС з 1919 г. Удзельнічаў у 1-й сусветнай вайне на Паўднёва-Заходнім фронце. У лістападзе 1917 г. ўступіў у чырвонагвардзейскі атрад, стаў байцом першага аўтабранявога рэвалюцыйнага аддзялення. Удзельнік грамадзянскай вайны, у час акупацыі Быхаўскага павета знаходзіўся ў партызанскім атрадзе, з снежня 1918 г. рэўком накіраваў яго камандзірам узвода асобага прызначэння пры павятовым ваенным камісарыяце, вёў барацьбу з бандытызмам. З 1919 г. памочнік, потым камандзір атрада асобага прызначэння пры Гомельскім губваенкамаце, з 1921 г. намеснік камандзіра 37-га асобнага стралковага батальёна пры Гомельскай губернскай ЧК. У 1930 г. старшыня Жлобінскага райвыканкома. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, быў паранены, кантужаны, доўгі час знаходзіўся на лячэнні ў ваенных шпіталях. Пасля вайны ўзначальваў Галоўнае ўпраўленне рыбнай прамысловасці БССР, працаваў у цэнтральных і рэспубліканскіх арганізацыях ДТСААФ. Памёр П. М. Антонаў у 1968 г.

Анісім Мікалаевіч Антонаў нарадзіўся ў 1903 г. ў в. Клятное. З сялян. Член КПСС з 1927. Да 1928 г. працаваў у сельскай гаспадарцы, з 1928 г. міліцыянерам у Талачыне Віцебскай вобласці, вучыўся ў Мінскай школе міліцыі імя М. В. Фрунзе, працаваў старшым міліцыянерам у Горках Магілёўскай вобласці, старшынёй рабочага камітэта, загадчыкам вытворчага ўчастка Собалеўскага саўгаса імя У. І. Леніна ў Горках. У 1931—1934 гг. вучыўся ў вышэйшай камуністычнай сельскагаспадарчай школе ў Мінску, пасля скончэння якой працаваў дырэктарам саўгасаў у Слуцкім і Старобінскім раёнах Мінскай вобласці. З 1938 г. на савецкай рабоце ў Старобінскім, Любанскім раёнах Мінскай вобласці і ў Літоўскай ССР. У Айчынную вайну ў Чырвонай Арміі, удзельнік баёў на Заходнім, 2-м Украінскім, Забайкальскім франтах. З 1946 г. на гаспадарчай і партыйнай рабоце. З 1963 г. на пенсіі. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, 9 медалямі. Памёр А. М. Антонаў 11 красавіка 1984 г.

БЫХАЎСКІ РАЁН У ПАЧАТКУ 30-Х ГАДОЎ

У 1933 г. ў выдавецтве Беларускай акадэміі навук выйшаў эканамічны даведнік «Усе раёны БССР», дзе прыводзяцца статыстычныя звесткі і па Быхаўскім раёне.

На 1.10.1931 г. ў раёне 30 сельсаветаў, насельніцтва складае 98 597 чалавек, нацыянальны склад яго (у %) такі: беларусаў 96,54, яўрэяў 1,25, палякаў 0,17, рускіх 0,42, латышоў 0,77, іншых 0,84. У 1932 г. існавала 21 дзяржаўнае і 45 кааператыўных, усяго 66 прамысловых прадпрыемстваў, 13 з іх мелі рухавікі. Асноўнымі прамысловымі прадпрыемствамі раёна былі: торфаарцель у в. Перакладавічы (46 рабочых), торфазаводы «Чырвоная Беларусь», «Ленінскі шлях», «Бохань» (усяго 549 рабочых), арцель «Металіст» (83 рабочых), арцель «Труд смалакура» (61 рабочы), цагельна-бетонная арцель у Быхаве (50 рабочых), швейная арцель «Маяк Камуны» (23 рабочых), лесазаводы імя Калініна і «Чырвоны партызан» (усяго 141 рабочы), абутковая арцель «Чырвоны кустар» (41 рабочы), арцель «Чырвоны карзіначнік» (33 рабочых), шклозавод «Ільіч» (450 рабочых), швейная арцель «Аб'яднанне» (38 рабочых). Спажывецкая кааперацыя мае 23 сельпо з гандлёвай сеткай 79 адзінак (22 922 пайшчыкі).

Тэрыторыю раёна займаюць 8596 га балот. Сельская гаспадарка спецыялізуецца ў жывёлагадоўча-бульбяным напрамку. У раёне 6 саўгасаў: «Чырвоны Маяк» — са свінагадоўчым напрамкам, з плошчай сенапахаці 856 га і 102 рабочымі; «Лудчыцы» — са свінагадоўчым напрамкам, 702,6 га сенапахаці, 55 рабочых, «Грудзінаўка» — малочнага кірунку, 657,7 га сенапахаці, 140 рабочых; «Ударнік» — садова-гароднінны, 250 га сенапахаці, 46 рабочых; «Вароніна» — лугаводны, 2300 га сенапахаці, 76 рабочых; «Чачэвічы» — насенны, з плошчай 1976 га.

У раёне ёсць 15 394 гаспадаркі, з іх на 1.1.1933 г. калектывізавана 4917, што складае 31,9 %. Усяго ў раёне 132 калгасы, якія па плошчы сенапахаці займаюць 27,4 %. У калгасах 30 ферм буйной рагатай жывёлы з агульным пагалоўем на 10.9.1932 г. 3473, 19 малочнатаварных ферм (2234 каровы на 10.9.1932 г.), 22 цялятнікі (1410 галоў на 1.10.1932 г.), 4 конефермы (173 кані на 1.10.1932 г.). У калгасах ёсць таксама складаныя сельскагаспадарчыя машыны: 87 сенакасі-

Быхаўскі гісторыка-краязнаўчы музей

лак, 109 жняярак, 32 бульбакапалкі, 7 трактароў, 89 конных грабель, 8 снопавязалак, 153 радковыя сеялкі, 6 складаных малатарняў.

Пасяўная плошча раёна ў 1932 г. складала 75 936 га, у т. л. пад збожжавымі было занята 69,3 %, бульбай 18,5, тэхнічнымі культурамі 5,4, палявымі травамі 4,3 %.

У 1932 г. нарыхтавана 241 т ільновалакна, 322 т ільнасемя, 40 т пянькі, 29 т канапель, 1245 т саломы.

Сетка навучальных устаноў раёна: 1 тэхнікум будвуч, дзе навучаецца 80 студэнтаў; 97 чатырохгодак, дзе 232 настаўнікі і 10 476 вучняў; 19 ШКМ, дзе 133 настаўнікі і 5320 вучняў; 2 ФЗС, дзе 21 настаўнік і 318 вучняў.

Партарганізацыя раёна складаецца з 44 ячэек, у якіх 338 членаў КП(б)Б і 233 кандыдаты ў члены партыі. Налічваецца 56 камсамольскіх ячэек, якія аб'ядноўваюць 1039 камсамольцаў.

У раёне ёсць палітаддзел пры саўгасе «Чырвоны Маяк».

Выдаецца раённая газета «Маяк камуны».

Друкуецца па кн.: Усе раёны БССР. Мн., 1933. С. 262—265.

Раёнка паведамляла...

Па старонках газеты «Маяк камуны» за 1932 г.

25 кастрычніка

Агульны сход калгаснікаў калгаса «Зара» Кузькаўскага сельсавета вынес пастанову паслаць Ленінграду звыш плана адзін вагон бульбы.

На гэтым жа сходзе калгаснікі ў парадку сацспаборніцтва сабралі 100 пудоў бульбы (з ураджаю сваіх прыватных участкаў) для пасылкі пралетарыям Ленінграда.

7 лістапада

Да 15-й гадавіны Кастрычніка раён падыходзіць з 5 савецкімі гаспадаркамі з агульнай зямельнай плошчай у 6225 га (у параўнанні з 1919 годам — рост у 6 разоў). Калектыўныя гаспадаркі раёна аб'ядноўваюць 4555 двароў, што ў адносінах да агульнага ліку гаспадарак раёна складае 28,6 %. Раён мае трактарны парк у колькасці 25 машын, 18 з іх працуюць у савецкіх гаспадарках.

З 1930 г. ўведзена ўсеагульнае абавязковае навучанне на базе 4-гадовай школы, а з бягучага 1932/33 навучальнага года абавязковае навучанне праводзіцца на базе сямігодкі. У 1931/32 навучальным годзе было 56 лікпунктаў, 120 школ малапісьменных і 6 вячэрніх школ 2-га канцэнтру, за адзін толькі гэты год ліквідавана непісьменнасць каля 4 тыс. асоб.

15 лістапада

8-га лістапада адбыўся ўрачысты пуск цеплаэлектрацэнтралі Быхаўскага ацэтонавага завода. Пуск ЦЭЦ з'яўляецца ўрачыстасцю працоўных Быхаўшчыны, бо яна акрамя асвятлення дае і сімавую энергію прадпрыемствам Быхава.

Наша шматтыражка

З успамінаў былога рэдактара шматтыражнай газеты «Ударнік саўгаса», члена КПСС з 1919 г. Сцяпана Мікалаевіча Свірыда

С. М. Свірыд.

С. С. Яўменава.

У 30-я гады ў буйных саўгасах і МТС былі арганізаваны палітаддзелы. Ім дазволілі выпускаць малафарматныя шматтыражныя газеты. У 1933 г. мяне прызначылі рэдактарам палітаддзельскай газеты ў свінагадоўчым саўгасе «Чырвоны маяк» Сялец-Халапееўскага сельсавета. Гаспадарка з'яўлялася эканамічна слабай, малалікай была і партыйная арганізацыя. Нас у палітаддзеле было чацвёра. Працавалі з поўнай аддачай, пастаянна знаходзіліся сярод людзей. Спачатку не ўсё ладзілася. Справы паленшалі, калі палітаддзел узначаліў энергічны, умелы арганізатар стары бальшавік Дындзін. Мацнела эканоміка саўгаса, добрасумленна працавалі людзі. З ліку перадавых работнікаў выраслі і партыйная арганізацыя. Клопатаў было і ў мяне. Газета выходзіла раз на тыдзень, часам два разы. Набіралі тыраж у друкарні раённай газеты «Маяк камуны». Мне даводзілася з падрыхтаванымі матэрыяламі пешшу хадзіць з Сяльца-Халапеева ў Быхаў і на другі дзень вяртацца з газетамі. Складана было з матэрыяламі. Большасць рабочых саўгаса была малапісьменная

Быховский районный историко-краеведческий музей

або зусім непісьменная. Заметкі пісаць самі яны не маглі. Даводзілася мне гутарыць, запісваць, як кажуць, браць інтэрв'ю. З часам вакол газеты згуртаваўся селькораўскі актыў. Выпускаць шматтыражку дапамагалі работнікі палітаддзела, камуністы. Друкаванае слова тады цанілася вельмі высока.

Перад вайной я быў рэдактарам быхаўскай раённай газеты «Маяк камуны».

Ад служанкі да члена ўрада

З успамінаў дэпутата Вярхоўнага Савета СССР 1-га склікання Суклеты Сілкаўны Яўменавай

Шаснаццацігадовай дзяўчынкай пакінула я бацькаву хату і паехала ў Петраград шукаць лепшай долі. Уладкавацца на завод ці фабрыку мне не ўдалося. Хутка скончыліся небагатыя запасы харчоў і грошы, што сабралі мне на дарогу родныя. І пайшла я служанкай у багаты дом. Самая брудная і цяжкая праца клалася на мае плечы. У 1916 г. нарэшце ўдалося трапіць на карданажную фабрыку. Але і там было не салодка: праца з сямі гадзін раніцы і да васьмі вечара вымотвала сілы. Рабочыя баставалі, наладжваліся дэманстрацыі. Як і ўсе рабочыя, я з радасцю сустрэла Кастрычніцкую рэвалюцыю. Да студзеня 1918 г. пратрымалася на фабрыцы, а потым падалася дамоў. Голадна і холадна было ў Піцеры. Пасля заканчэння грамадзянскай вайны выйшла замуж за былога кавалерыста-будзёнаўца Харытона Іванавіча Яўменава. У 1930 г. наша сям'я ўступіла ў калгас «Запаветы Ільіча». Я стала працаваць даяркай. З кожным годам дужэў калгас. Расла і я. Скончыла школу лікбезу, стала стаханаўкай. 12 снежня 1937 г. мяне выбралі дэпутатам у Савет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР па Быхаўскай выбарчай акрузе. На 1-й сесіі Вярхоўнага Савета СССР мне пашчасціла мець гутарку з Надзеяй Канстанцінаўнай Крупскай і Міхаілам Іванавічам Калініным.

У 1938 г. ўступіла ў партыю. Толькі мірныя планы нашы перакрэсліла вайна. Праводзіла на фронт мужа і сына. Пярэнція. Сама з дочкамі Насцяй, Таняй, Зінай і Валяй эвакуіравалася ў Харкаўскую вобласць, дзе сталі працаваць на ферме. Калі і да Харкава наблізіўся фронт, эвакуіраваліся ў станіцу Верхняя Дабрэнька Сталінградскай вобласці. Працавала рабочай у МТС, потым старшынёй сельсавета. Старэйшыя дочкі Таня і Насця добраахвотна пайшлі на фронт. Пасля вайны я вярнулася ў сваю родную Студзёнку. Жывымі выйшлі з вайны мае муж і дзеці.

(**Ад рэдакцыі:** С. С. Яўменава памерла 13 лютага 1980 г.)

Раёнка паведамляла...

Па старонках газеты «Маяк камуны» за 1933—1936 гг.

1933 г.

13 сакавіка

9 і 10 сакавіка адбыўся першы раённы злёт калгаснікаў-ударнікаў. На злёце прысутнічала 212 калгаснікаў-ударнікаў, з іх жанчын 50, камуністаў 27, камсамольцаў 8 і беспартыйных 177 чалавек.

25 сакавіка

21 сакавіка распачаў працу Усебеларускі з'езд калгаснікаў-ударнікаў.

Калгас «КІМ» 1-га Грудзінаўскага сельсавета як адзін з лепшых калгасаў па Быхаўшчыне паслаў свайго дэлегата Сокалава Сідара Антонавіча — камсамольца, члена рэдкалегіі насценнай газеты. «КІМ» першым у раёне выканаў свае абавязкі па здачы нарыхтовак пралетарскай дзяржаве. З поспехам быў праведзены сеў азімых культур. Згодна плана ў вясну гэтага года калгас «КІМ» павінен засеяць яравых культур: аўсу — 20 га, ячменю — 10 га, пшаніцы — 3 га, вікі — 8 га, лёну — 4 га, бульбы — 25 га і гародных культур — 2,5 га. Калгас поўнасцю забяспечыў сябе насеннем. У калгасе маецца 31 рабочы конь і 9 маладняку. Сельскагаспадарчы інвентар спраўны. Маецца 16 жалезных плугоў, якія поўнасцю адрамантаваны, куплена новых 28 барон. Калёс 37, з іх на жалезным хаду 18. Гэтых посцехаў калгас дабіўся дзякуючы таму, што калгаснікі вялі жорсткую барацьбу з кулацкімі элементамі, разгарнулі ўдарную работу па падрыхтоўцы да сяўбы пад кіраўніцтвам партыйнай і камсамольскай арганізацый.

Сокалаў уступіў у калгас «КІМ» з самага пачатку яго арганізацыі. Да ўступлення быў серадняком, падатку плаціў 8—12 руб. Сокалаў ніколі не робіць прагулаў, ён сваім прыкладам мабілізуе астатніх камсамольцаў на актыўную барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае і палітычнае ўмацаванне калгаса. Сокалаў занесены на Чырвоную дошку.

1934 г.

7 студзеня

Газета змясціла выступленне сакратара РК КП(б)Б тав. Рэзнікава на 4-й раённай партыйнай

Быховский районный историко-краеведческий музей

канферэнцыі. У ім даецца аналіз гаспадарчага і сацыяльнага развіцця раёна:

«Мы дасягнулі значных поспехаў. 6012 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак аб'ядналіся ў калгасы. Пасяўная плошча калгасаў павялічылася з 22 285 га у 1931 г. да 24 165 га у 1933 г. Калгасы дабіліся павышэння ўраджайнасці зернавых культур з 7,5 ц з га у 1931 да 8,8 ц у 1933 г., бульбы з 90 ц да 102 ц. Калі ў 1932 г. на працадзень прыпадала ў сярэднім па раёну 1,3 кг зернавых і 3 кг бульбы, то ў 1933 г. ўжо зернавых 3 кг, бульбы 8 кг, а ў калгасе «Шлях Леніна» атрымліваюць на працадзень 5 кг зернавых, 10,5 кг бульбы, у калгасе «Іскра» — 4 кг зерня і 15 кг бульбы. Рост вагі працадня — гэта рост заможнага, культурнага калгаснага жыцця. Уведзена ўсеагульнае абавязковае навучанне, ахоп усенавучам на базе чатырохгодкі — 98,8 %, на базе сямігодкі — 92,8 %. Да рэвалюцыі ў раёне было 72 % непісьменных».

1 верасня

Мы працоўныя аднаасобнікі вёскі Лудчыцы ў ліку 40 гаспадарак пераканаліся, што адзіна правільны шлях да заможнага і культурнага жыцця — гэта шлях калектывізацыі. Мы рашылі назаўсёды пакінуць свае аднаасобныя гаспадаркі і арганізаваліся ў калгас «Іскра». 25 жніўня мы абралі праўленне калгаса і інспекцыю па якасці. Пры дапамозе суседніх калгасаў мы ўзаралі пад жыта 15 га папару. Мы заклікаем усіх працоўных аднаасобнікаў Лудчыцкага сельсавета і ўсяго Быхаўскага раёна наследаваць нашаму прыкладу.

Па даручэнню сходу падпісаліся
Несцярэнка, Немцаў, Лапцінёў.

* * *

Лудчыцкі сельсавет з адстаючага ў справе калектывізацыі выходзіць у шэраг перадавых. За апошнія дні ў сельсавеце арганізавана 6 новых калгасаў, у якія ўступіла 209 гаспадарак. Прыліў у калгасы працягваецца.

16 кастрычніка

У Кучынскім сельсавеце арганізаван новы калгас «17 кастрычніка», у які ўступіла 112 аднаасобных гаспадарак. Прыліў у калгас працягваецца.

* * *

На 10 кастрычніка ў раёне масцца калектывізаваных гаспадарак 11 803, што складае 70,1 % усіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак раёна.

14 снежня

З АБ'ЯВЫ Ў ГАЗЕЦЕ

З 1-га студзеня 1935 г. адмяніць картачную сістэму снабжэння хлебам, мукой і крупой і ўстанавіць усюды шырокі продаж хлеба і іншых прадуктаў насельніцтву з дзяржаўных і кааператыўных магазінаў. На гэтыя прадукты ўстанаўліваюцца адзіныя паясныя дзяржаўныя цэны.

* * *

15 снежня 1934 г. пачаў работу раённы з'езд Саветаў. Сярод дэлегатаў была і работніца шклозавода «Ільіч» Ганна Рудкоўская. 18 снежня 1934 г. газета змясціла яе расказ «Вялікія абавязкі я з гонарам выканаю».

У майго бацькі было 7 душ сям'і. Ён быў рабочым і атрымоўваў усяго па 12 рублёў у месяц. За гэтыя грошы ён не мог усіх нас адзяваць і накарміць.

Заўсёды мы былі напаўгалодныя. На ўсю нашу сям'ю мелася адна пара ботаў. Насілі іх па чарзе. Малыя дзеці і гэтага не мелі. Усе, у тым ліку і я, былі босыя. Вучыцца мы не маглі, і засталася я зусім непісьменная.

Ох і цяжка ўспомніць сваё мінулае жыццё. Яшчэ горш стала мне жыць, як памер мой бацька. Тады мне было ўсяго 10 год. Я вымушана была пайсці на вытворчасць працаваць.

Вось ужо 20 год як я працую на заводзе «Ільіч». Прыйшлося мне працаваць і да Кастрычніцкай рэвалюцыі. Тады я працавала па 15—16 гадзін у суткі і атрымоўвала па 8—10 рублёў у месяц. Зразумела, што гэта мне не хапала на маё жыццё. І хіба ж гэта можна назваць жыццём.

Жыць па-сапраўднаму я пачала толькі пры Савецкай уладзе. Я зразумела, што непісьменнаму чалавеку нельга жыць. Я пайшла вучыцца. Партыя і савецкая ўлада дала для гэтага нам усе магчымасці.

Працую я зараз на шклозаводзе майстрам-прасаўшчыком. За ўдарную работу з 1929 года кожны год прэміруюць мяне. Я ў лістападзе месяцы выканала свой прамфінплан на 124 працэнты, за першую дэкаду снежня месяца выканала на 126 працэнтаў. Я свой прамфінплан заўсёды выконваю і перавыконваю. Я выпрацоўваю кожны месяц па 180—190 рублёў.

Я з'яўляюся парторгам 3-й змены імя Кірава. Наша змена ўвесь час змагаецца за выкананне і перавыкананне прамфінплана. Яна атрымала ад дырэкцыі завода пераходны Чырвоны сцяг. Сёння я дэлегат раённага з'езда Саветаў. Гэта ўскладае вялікую адказнасць і вялікі абавязак, які я з гонарам выканаю.

29 снежня

28 снежня ў Быхаве пачаў сваю работу Беларускі тэатр рабочай моладзі горада Быхава. Тэатр існуе 4 гады. Пад мастацкім кіраўніцтвам заслужанага артыста рэспублікі т. Міровіча, тэатр значна творча ўзрос. За 4 гады мы выхавалі здольны маладняк, які ўпэўнена крок за крокам аўладзявае акцёрскім майстэрствам. Наш рэпертуар пабудаваны на здаровым савецкім смеху, смех бадзёры без пошласцей, які дае здаровую зарадку для работы каля варштата і ў полі. Наш малады задор у аднолькавай ступені заражае і старых і маладых...

1935 г.

7 лютага

Права насылкі дэлегата на II Усесаюзны з'езд

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

калгаснікаў-ударнікаў заваяваў калгас «Рэвалюцыя». 1934 год быў годам вялікага росту і ўмацавання калгаса. На працадзень калгаснікі атрымалі зернавых 2,1 кг, бульбы 9,6 кг, гародніны 4 кг, сена 1,2 кг, грошай па 60 кап. Колькасць гаспадарак у калгасе павялічылася да 226. Гэта дасягнута таму, што ў калгасе шырока разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва і выхаваны моцны калгасны актыў. На масавым сходзе калгаснікаў з калгасаў «Рэвалюцыя» і «Шлях Леніна» з удзелам значнай часткі калгаснікаў з іншых калгасаў дэлегатам выбраны тав. Сівагракаў, старшыня калгаса «Рэвалюцыя».

29 кастрычніка

У Гарадзецкай школе праходзіць урачысты сход. Калгасная вёска атрымала ад пралетарскай дзяржавы зямлю на вечнае карыстанне. За калгасам «Пралетарый» навечна замацавана 1905 га зямлі.

* * *

Да свята 18-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі радыёфікаваны некаторыя калгасы Макранскага сельсавета. Калгаснікі калгаса імя Свярдлова ўсвядомілі ўсю важнасць радыё ў культурным і грамадскім развіцці і выдзелілі з свайго фонду 200 руб. на закупку матэрыялаў для радыёправодкі. Акрамя гэтага, яны вывезлі і паставілі слупы для праводкі. Кожная кватэра калгасніка будзе мець радыё. Таксама будзе радыёфікавана МТС.

1936 г.

16 жніўня

У гэтым годзе будзе адчынена ў раёне 59 вячэрніх школ моладзі — 46 пачатковых і 13 сярэдніх з 6, 7, 8, 9 класамі, з ахопам у іх больш 5 тысяч чалавек. Акрамя гэтага пачатковыя школы будуць адчынены пры кожным прадпрыемстве. На шклозаводзе «Ільіч» ужо праводзіцца падрыхтоўка да адчынення сярэдняй тэхнічнай школы.

21 лістапада

19 лістапада 1936 г. 10 дэлегатаў Быхаўшчыны выехалі на Усебеларускі з'езд Саветаў:

Рэзнікаў — 1-ы сакратар РК КП(б)Б.

Грынкевіч — старшыня РВК.

Ардэнаносец тав. Лісоўскі (камандзір РСЧ Арміі, узнагароджаны ордэнам Леніна).

Палкоўнік тав. Зайцаў.

Старшыня калгаса «Чырвоны партызан» Ч.-Бярэжскага сельсавета Андрэенка.

Стаханаўка шклозавода «Ільіч» т. Будыхіна Ганна.

Старшыня Н.-Лошчыцкага сельсавета тав. Альховік.

Даярка з саўгаса «Лудчыцы» тав. Зыкава Хоўра, якая надбілася ўдою малака ад каровы на 2920—3370 літраў.

Старшыня Ч.-Асавецкага сельсавета Каравацкі.

Тузава Алена — лепшы брыгадзір брыгады № 5 калгаса «Чырвоны баец» Н.-Быхаўскага сельсавета.

20 лістапада 1936 г. адкрыўся 12-ы Усебеларускі з'езд Саветаў (надзвычайны).

Такое не забываецца

З успамінаў дэпутата Вярхоўнага Савета СССР 1-га склікання Васіля Паўлавіча Іванова

В. П. Іваноў.

А. П. Агееў.

Сам я з сям'і чыгуначніка. У юнацкія гады таксама працаваў на чыгунцы. Пасля вучыўся на настаўніка, быў інспектарам рана, з 1933 г. стаў дырэктарам Чырвонаасавецкай няпоўнай сярэдняй школы. Некаторы час быў адзіным членам партыі ў Чырвонаасавецкім сельсавеце. Працаваць было цяжка. Сельсавет адсталы, не давалі спакою кулакі і іх памагатыя. Бандытамі праз акно ў сваім доме быў забіты лепшы актывіст сельсавета старшыня калгаса тав. Башарымаў. Даводзілася весці масава-палітычную і арганізатарскую работу сярод насельніцтва. Хутка наш сельсавет выйшаў у перадавыя, атрымаў абласны пераходны Чырвоны Сцяг.

12 снежня 1937 г. ў краіне прайшлі першыя выбары ў Вярхоўны Савет СССР. Быць дэпутатам пашчасціла і мне. Усхваляваны і радасны ехаў я ўпершыню ў Маскву на 1-ю сесію Вярхоўнага Савета СССР. Адкрыў сесію старэйшы дэпутат, вучоны Аляксей Мікалаевіч Бах...

Назаўсёды засталіся ў памяці і дні работы 10-й і 11-й сесій Вярхоўнага Савета СССР у час Вялікай Айчыннай вайны. Дэпутатамі былі ўхвалены дзяржаўныя бюджэты краіны, накіраваныя

Быховский районный историко-краеведческий музей

на поўнае забеспячэнне фінансавымі рэсурсамі патрэб фронту, на аднаўленне разбуранай фашыстамі народнай гаспадаркі вызваленых раёнаў.

Пасля вызвалення Беларусі ЦК КП(б)Б і СМ БССР накіравалі мяне ў Быхаўскі раён для аказання дапамогі насельніцтву. Мне давялося пабываць у Чырвонаасавецкім сельсавеце праз некалькі дзён пасля яго вызвалення. Жахлівая карціна адкрылася вачам: школа, якую будавалі калгаснікі, спалена, разбураны калгасы, знішчана іх маёмасць. У вёсцы Давыдавічы ў першыя дні акупацыі фашысты расстралялі старшыню калгаса «Новае жыццё» Марка Левага і яго сям'ю. Вёску Гарадзец акупанты знішчылі цалкам, у тым ліку і прыгожую школу, адну з лепшых у раёне, закатавалі многіх яе жыхароў.

12-я сесія Вярхоўнага Савета СССР запомнілася асабліва. Пасля яе 24 чэрвеня 1945 г. на Краснай плошчы адбыўся Парад Перамогі. На ім прысутнічалі ўсе дэпутаты. Такое не забываецца.

АЛЯКСЕЙ ПЯТРОВІЧ АГЕЕЎ

А. П. Агееў нарадзіўся ў 1903 г. ў в. Іскань Быхаўскага раёна ў сялянскай сям'і. У сем год стаў пастушком. Вучыцца ў школе пачаў толькі ў адзінаццацігадовым узросце. У 1922 г. стварыў ініцыятыўную групу, якая вяла растлумачальную работу сярод сялян, выступала з канцэртамі мастацкай самадзейнасці. На базе гэтай групы ў 1924 г. была створана камсамольская ячэйка, сакратаром якой стаў Аляксей Агееў. У 1925 г. яго прызвалі ў Чырвоную Армію. Пасля службы працаваў на шахтах Данбаса. У 1929 г. вярнуўся ў родную вёску. Землякі выбралі яго сакратаром, потым старшынёй выканкома Іскańскага сельскага Савета. У 1930 г. стаў членам КПСС.

У кастрычніку 1929 г. ў Іскані быў створаны калгас «Іскра». Першымі падалі заяву А. П. Агееў і яго сястра Ліза. Старшынёй выбралі А. П. Агеева. Ён узначальваў гаспадарку да 1932 г. Пасля працаваў загадчыкам хаты-чытальні, старшынёй калгаса імя К. Лібкнехта, старшынёй Студзёніцкага сельсавета. Вялікая Айчынная вайна застала Аляксея Пятровіча на пасадзе дырэктара Лудчыцкай МТС. А ліпеня ён пачаў эвакуацыю машыннага парку ў Разанскую вобласць. Ад прапановы стаць дырэктарам адной з МТС адмовіўся і быў прызваны ў дзеючую армію. У складзе сапёрнага батальёна ён з баямі прайшоў ад Ціхвіна да Эльбы. Памёр А. П. Агееў у 1975 г. ў г. Мелітопаль Украінскай ССР.

МІТРАФАН СІДАРАВІЧ АЛЬХОВІК

Сельскі актывіст, удзельнік грамадзянскай вайны. Нарадзіўся ў 1898 г. ў в. Новы Быхаў Быхаўскага р-на ў сялянскай сям'і. Член КПСС. У 1918 г. добраахвотнікам уступіў у партызанскі атрад С. К. Дзергачова. Пасля грамадзянскай вайны працаваў у сельскай гаспадарцы. У 1929 г. ўзначаліў у Новым Быхаве арцель «Чырвоны баец», членамі якой сталі былыя партызаны, беднякі, удовы. З 1933 г. на савецкай рабоце — старшыня Навабыхаўскага, Верхнятошчыцкага і зноў Навабыхаўскага сельсаветаў. Да акупацыі раёна нямецка-фашысцкімі захопнікамі заставаўся на сваім посту, кіруючы мабілізацыяй і эвакуацыяй калгаснай маёмасці на Усход. Перад самым набліжэннем ворага стаў у рады Чырвонай Арміі. Пад Бранскам трапіў у палон. Пасля неадназовых спроб яму ўдалося ўцячы з лагера ваеннапалонных у Мінску. Змардаваны і хворы ў 1942 г. ён дабраўся дамоў, дзе быў схоплены фашыстамі і расстраляны.

ІВАН МІХАЙЛАВІЧ БАРАНКЕВІЧ

Савецкі пісьменнік, удзельнік першай рэвалюцыі 1905—1907 гг. Нарадзіўся ў 1888 г. ў в. Трасцівец Быхаўскага р-на ў сялян. У 1910—1911 гг. служыў у царскай арміі, у 1917 г. на Паўднёва-Заходнім фронце, удзельнічаў у рабоце Надзвычайнага з'езда фронту ў Бярдзічаве на Украіне. Перад першай сусветнай вайной супрацоўнічаў у часопісе «Вестник Могилевского земства», у 1914 г. ў ім змясціў артыкул да 100-годдзя з дня нараджэння Т. Р. Шаўчэнкі, пад псеўданімам Беларус — апавяданне «Фантазёр». У 1918—1919 гг. загадчык агітацыйна-выдавецкага пададдзела Беларускага аддзела камісарыята па справах нацыянальнасцей Саюза камун Паўночнай вобласці. Супрацоўнічаў у часопісе «Чырвоны шлях», быў рэдактарам часопіса «Белорусская криница». Аўтар біяграфіі У. І. Леніна, выдадзенай у Петраградзе ў 1919 г. пад псеўданімам Беларус. Даследаванне І. М. Баранкевіча адрозніваласа ад іншых большым аб'ёмам, храналагічным ахопам і грунтоўным расказам аб жыцці і дзейнасці правадыра. З павагай і любоўю да У. І. Леніна аўтар пісаў: «И он же осенью 1917 г. ребром поставил вопрос о пролетарском восстании против буржуазной власти, преодолев все сомнения колеблющихся элементов в собственных рядах. Жизнь подтвердила правильность его взглядов... Владимир Ильич поставлен жизнью на почетное и тяжелое место — главы Советского правительства в неслыханно трудных условиях. Такова судьба героя, осознавшего объективный ход движения народных масс и шедшего в соответствующем направлении. Только на долю Владимира Ленина выпало великое счастье, которое не было дано прежним борцам за освобождение труда: он руководит победоносной революцией; в первый раз в мировой истории вождь рабочей революции становится во главе государства, ставшего официально рабоче-крестьянским государством,— во главе Российской Социалистической Федеративной Советской Республики». У канцы аўтар заключае: «Как видим, Владимир Ильич своей

Быховский районный историко-краеведческий музей

личностью являет необычно удачное сочетание черт: выдающегося аналитика-теоретика, провидящего будущее в настоящем, и отличного политика-практика, правильно оценивающего и умело использовывающего момента, благоприятный для проведения в жизнь теоретических построений. На фоне развернувшегося движения народных масс это редкое сочетание черт у Ленина-борца обусловило яркий блеск его личности и крупную ее роль в истории освобождения труда.

Каков бы ни был исход современной мировой революции, всемирная история первый прыжок человечества из царства необходимости в царство свободы свяжет с именем вождя русского коммунизма — Владимира Ильича Ульянова-Ленина».

У 1923—1925 гг. І. М. Баранкевіч супрацоўнічаў у газетах «Соха и молот», «Магілёўскі селянін» (Магілёў), падпісваўся псеўданімам Іван Лапаць, у 1927—1929 гг. друкаваўся ў часопісе «Резец» (Ленінград), уваходзіў у літаратурную групу «Резец». Аўтар апавяданняў пра Леніна, на рускую мову пераклаў кнігу Я . Коласа «На прасторах жыцця» (1930). У часы культу асобы Сталіна І. М. Баранкевіч быў двойчы незаконна рэпрэсіраваны (1931 і 1941). Памёр у 1942 г., рэабілітаваны ў 1982 г.

АДАМ МАРТЫНАВІЧ ДЗМІТРЫЕЎ

Савецкі пісьменнік, нарадзіўся ў 1902 г. ў в. Ніканавічы Быхаўскага р-на. Член КПСС з 1920. У 1912 г. сям'я А. М. Дзмітрыева пераехала на жыхарства ў Сібір. Пасля ўстанаўлення Савецкай улады працаваў у валасным выканкоме. У пачатку 1920-х гадоў скончыў камвуз, працаваў у павятовым рэўкоме, у губкоме партыі, упаўнаважаным па збору харчовага падатку. У канцы 1922 г. ён — чырванафлоцец, потым палітработнік на Далёкаўсходнім флоце, удзельнічаў у дэсанце ў Ахоцкім моры пры ліквідацыі рэшткаў бандаў генерала Пепяляева. З 1925 г. на Балтыйскім флоце: памочнік камісара крэйсера «Прафінтэрн», сакратар партыйнага камітэта брыгады эсмінцаў і інструктар палітупраўлення марскіх сіл Балтыйскага мора. Тут пачалася літаратурная дзейнасць А. М. Дзмітрыева. У 1926 г. ў часопісе «Красный Флот» было надрукавана першае апавяданне пісьменніка «За драпежнікамі» (пра барацьбу Далёкаўсходняй флатыліі супраць японскіх інтэрвентаў). У пачатку 1930-х гадоў была створана літаратурнае аб'яднанне Чырвонай Арміі і Флоту, і адным з арганізатараў і кіраўнікоў яго стаў ваенны пісьменнік-марыніст А. М. Дзмітрыеў. У 1931 г. выйшла першая яго кніга-аповесць «Ёсць — весці карабель», у 1934 г.— раман «Адмірал Макараў», прысвечаны грамадзянскай вайне на Далёкім Усходзе. Цяжкая хвароба надоўга прыкавала Дзмітрыева да ложка. У студзені 1936 г. пісьменніка не стала. «Литературная газета» 20.1.1936 г. змясціла некралог, падпісаны пісьменнікамі А. Шчарбаковым, У. Вішнеўскім, К. Федзіным, Л. Собалевым, Новікавым-Прыбоем, Матэ Залкам, М. Святловым і іншымі, у якім гаварылася: «Адам Дзмітрыеў да апошняга дыхання жыў агульным жыццём партыі, жыццём нашай Чырвонай Арміі, жыццём савецкай літаратуры... Адам Дзмітрыеў загінуў на пасту. Ён з гонарам пранёс праз сваё жыццё званне камуніста-пісьменніка, чырвонага маёра. Мы бяром яго рукапісы, дзе аслабелая рука апошні раз напісала апошнюю літару... І гэта літара, родны Адам, аддадзена табой нашай краіне, Кастрычніку...

Бывай, верны, добры таварыш!»

Пісьменнік Леанід Собалеў любоўна-паважліва называў Адама Дзмітрыева сваім «камісарам», «самым блізкім сябрам», які займаў у яго жыцці — і ў творчым, і ў асабістым — значнае месца. «Ён быў першым камуністам, з якім я адчуваў сябе, як з самім сабой...»,— успамінаў Л. Собалеў.

УЛАДЗІМІР ІВАНАВІЧ ДРАЗДОЎСКІ

Рэвалюцыянер, удзельнік рэвалюцыі 1905—1907 гг. у Днепрапятроўску, грамадзянскай вайны, савецкі партыйны дзеяч. Нарадзіўся ў 1880 г. ў в. Зарэчча Быхаўскага р-на Магілёўскай вобласці. З сялян. Член КПСС з 1917 г. З 1905 г. працаваў у Екацярынаславе (цяпер Днепрапятроўск), наладзіў сувязь з групай рэвалюцыянераў Бранскага (цяпер Пятроўскага) завода, перайшоў туды на работу і ўключыўся ў актыўную падпольную рэвалюцыйную дзейнасць. З 1917 г. чырвонагвардзеец, удзельнік устанаўлення Савецкай улады ў Днепрапятроўску. У грамадзянскую вайну змагаўся ў атрадзе П. Я. Дыбенкі, камісар артылерыйскіх складоў, арганізатар вывазу вагона золата і каштоўнасцей з Екацярынаслава ў Луганск (цяпер Варашылаўград). З 1921 г. працаваў у Саюзе харчавікоў, загадваў аддзелам укома партыі, быў старшынёй бюро

У. І. Драздоўскі.

М. С. Сівагракаў.

Быховский районный историко-краеведческий музей

скаргаў рабоча-сялянскай інспекцыі ў Днепрапятроўску. З 1930 г. ўзначальваў Днепрапятроўскі гарадскі, у 1936—1938 гг. абласны аддзелы сацыяльнага забеспячэння. У 1930 г. У. І. Драздоўскі выбіраўся дэлегатам XVI з'езда ВКП(б) з правам рашаючага голасу, быў членам ЦК КП(б)У, дэлегатам III Усеўкраінскай канферэнцыі КП(б)У (1932). У 1938 г. ў перыяд культу асобы Сталіна У. І. Драздоўскі быў рэпрэсіраваны, у 1956 г. рэабілітаваны.

МАКСІМ СЯМЁНАВІЧ СІВАГРАКАЎ

М. С. Сівагракаў нарадзіўся ў 1898 г. ў в. Вузніца (цяпер Чырвоная Слабада) Быхаўскага р-на. З 1918 г. ў Чырвонай Арміі. Пасля дэмабілізацыі вярнуўся ў родную вёску, быў сакратаром сельсавета. У 1929 г. арганізаваў і ўзначаліў калгас «Новы свет». Гаспадарка па тым часе дабілася добрых паказчыкаў. Хутка М. С. Сівагракава прызначылі загадчыкам будаўнічай канторы райкалгассаюза, потым дырэктарам саўгаса «Ударнік». На пачатак 1934 г. склалася цяжкае становішча ў калгасе «Рэвалюцыя». Як вопытнага кіраўніка райком партыі рэкамендаваў М. С. Сівагракава старшынёй.

11 лютага 1935 г. М. С. Сівагракаў прадстаўляў землякоў на 2-м Усесаюзным з'ездзе калгаснікаў, дзе быў выбраны ў камісію па выпрацоўцы Прыкладнога статута сельскагаспадарчай арцелі, выступаў на адным з пасяджэнняў. Натхнёны рашэннямі з'езда, з яшчэ большай энергіяй узяўся за работу. Неўзабаве калгас «Рэвалюцыя» стаў адным з лепшых у вобласці, да яго далучылі землі калгаса «Шлях Леніна». Клопатаў прыбавілася, але справы ладзіліся. Добрага гаспадара-старшыню хутка перавялі дырэктарам МТС, потым намеснікам загадчыка райземаддзела, старшынёй планавай камісіі, загадчыкам райзем-аддзела. З цягам часу справы ў калгасе «Рэвалюцыя» пагоршыліся. Забілі трывогу вяскоўцы, сталі прасіць назад былога старшыню. Многа бяссонных начэй правёў М. С. Сівагракаў, каб выправіць становішча...

Мірныя, стваральныя планы перакрэсліла вайна. На плечы ляглі клопаты па эвакуацыі калгаснай маёмасці, жывёлы. Найпрададні акупацыі раёна нямецка-фашысцкімі захопнікамі Максім Сямёнавіч пайшоў на фронт. Змагаўся на Украіне. Трапіў у акружэнне. Прарвацца лінію фронту не ўдалося, і ён прабіраўся на Быхаўшчыну. Вясной 1942 г. ўступіў у партызанскую групу Стратопа Мардашкіна. Быў камандзірам разведкі, пасля палітруком роты партызанскага атрада «За Радзіму», камісарам дыверсійна-разведвальнай групы. Пасля вайны аднаўляў разбураную гаспадарку. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі. Памёр 24.7.1964 г.

Раёнка паведамляла...

Па старонках газеты «Маяк камуны» за 1937, 1939 гг.

1 студзеня

ВАДЗІЦЕЛІ МАШЫН

1936 год багаты не толькі над'ёмам ураджайнасці калгасных палёў, але і ростам новых людзей — стаханаўцаў сацыялістычнага земляробства. Асабліва развіт стаханаўскі рух на МТС імя Молатава. Вось трактарыст-стаханавец Бубноў Трафім. За сезон палных трактарных работ узараў 693 га замест нормы ў 300 га. Ён выпрацаваў 460 працадзён, на якія атрымае 1362 кг зернавых, 1127 рублёў 98 капеек грашыма і інш. Такі вынік яго работы за 1936 год...

На МТС імя Молатава было разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва не толькі паміж асобнымі трактарыстамі, але і паміж трактарнымі брыгадамі. Першынство ў гэтым спаборніцтве заваявала брыгада № 5, брыгадзірам якой працуе тав. Сафонаў. Тры гады ён працуе на гэтай рабоце і заўсёды меў добрыя поспехі. У гэтым годзе яго брыгадзе быў даведзен план 900 га на тры трактары. Напружана і чэсна працавалі яны ўвесь летні перыяд і да канца сезона трактарных работ узаралі сваімі сталёвымі коньмі 2206 га, што складае 245 % нормы і зэканомілі гаручага 1062 кг.

Да ліку перадавых адносяцца яшчэ трактарысты-стаханаўцы Падголін Васіль, Лашкоў Яфім, Белавусаў Васіль Восіпавіч. Іх метад працы з'яўляецца часткай таго вялікага выдатнага стаханаўскага руху, які ахапіў самыя аддаленыя куткі нашай неабдымнай радзімы.

Ігнацьеў.

4 студзеня

РАДАСНА ЖЫЦЬ

На месцы быўшай царквы зараз пабудавана 7-гадовая школа. У гэтай школе навучаецца 380 дзяцей калгаснікаў.

Пры царызме вёска Следзюкі была самай адсталай вёскай. Не было тут пісьменных. Сялянскія дзеці не ведалі, што такое школа, як гэта можна па ўмоўных знаках гаварыць, пісаць і інш. Толькі пасля пралетарскай рэвалюцыі вёска Следзюкі пачала працвітаць. Зараз дзецям працоўных прадстаўляюцца шырокія правы на вучобу. Весела і культурна сталі жыць дзеці.

Баварэнка Д.

13 студзеня

8 студзеня 1937 года 61 шматсямейная жанчына Быхаўскага раёна атрымала 122 тысячы рублёў на выхаванне сваіх дзяцей. Радасныя, шчаслівыя

Быхаўскі гісторыка-краязнаўчы музей

маці ад усяго сэрца дзякавалі партыі, ураду за клопаты аб шматсямейных і іх дзецях.

З атрыманых грошай жанчыны ўнеслі ў фонд дапамогі жанчынам і дзецям працоўных Іспаніі 123 рублі і ў адказ фашысцкім піратам, якія патапілі наш цеплаход «Камсамол», унеслі 300 рублёў для пабудовы новых цеплаходаў.

* * *

У Быхаве адбыўся першы раённы шашачны турнір, у якім удзельнічала 40 чалавек. Першае месца ў турніры заняла Міхасёва Соня, калгасніца калгаса «Перамога» Гарадзецкага сельсавета. Другое месца занялі Мінчэнкава П. (калгас «Перамога» Гарадзецкага сельсавета), Голубеў Федар (калгас «17 Акцябр» Кучынскага сельсавета). Трэцяе месца заняў Пахомаў (калгас «Перамога» Гарадзецкага сельсавета), Науменка Надзя (калгас «Пераможац» Лудчыцкага сельсавета). Лепшыя шашысты прэміраваны.

15 студзеня

Культурна і весела праводзяць свой вольны час калгаснікі калгаса «Другая пяцігодка» Клятнянскага сельсавета. Яны пасля работы збіраюцца ў калгасны клуб, чытаюць газеты, гуляюць у шашкі, шахматы, даміно, на більярдзе. Спяваюць песні і танцуюць пад вясёлыя гукі баяна.

* * *

Дзе культурна і весела правесці вольны час, задумваюцца калгаснікі калгаса «Майское утро» Н-Тошчыцкага сельсавета. У калгасе ёсць дом сацкультуры, але старшыня калгаса Каралёў заняў яго пад амбар.

Калгаснікам няма куды сабрацца, пачытаць газеты, кніжкі. Бібліятэка, якую закупілі за калгасныя грошы, не працуе, і кніжак з яе ніхто не чытае, таму што іх нікому не выдаюць.

Калгаснікі патрабуюць ад праўлення калгаса, каб яно ў хуткім часе стварыла ўмовы для культурнага адпачынку.

* * *

7 студзеня 1937 г. ў Мінску адкрылася 1-я Усебеларуская нарада жанчын-трактарыстак. На ёй былі і прадстаўніцы з Быхаўшчыны. 15 студзеня газета змясціла пад агульнай рубрыкай «Гавораць удзельнікі Усебеларускай нарады трактарыстак-стахановак, трактарысткі МТС імя Молатава» іх расказы.

ЛЮБІМАЯ РАБОТА

Працаваць на якой-небудзь машыне я марыла яшчэ з самых малых год. І вось мае мары збыліся. Я скончыла курсы і працую трактарысткай. На рабоце сябе апраўдваю. Работа на трактары з'яўляецца любімай маёй работай. Я, як дэлегатка нарады, буду ў гэтым годзе паказваць яшчэ лепшыя абразцы работы. Узару за сезон 600 гектараў.

Тумакова.

МАЯ РАДАСЦЬ

У г. Мінску я была першы раз. І за час нарады многа чаго бачыла ў сталіцы квітнеючай ардэнаноснай Беларусі. Прынялі нас у Мінску як дарагіх гасцей. Пасля пасяджэнняў нарады мы былі на экскурсіі. Наведалі дом Чырвонай Арміі, Палац піянераў, канфетную фабрыку «Камунарка», былі ў тэатры.

Зараз пасля нарады я буду працаваць з утроенай энергіяй. Усе дэталі трактара ведаю добра. Дзякуючы добраму догляду трактара і яго асваення ў мяне ўвесь час добра працаваў трактар, не было паломак і псаванняў. У гэтым годзе даб'юся яшчэ лепшых вынікаў у сваёй рабоце.

Галынская А.

ГОНАР І СЛАВА

У мінулым годзе я скончыла курсы трактарыстак на выдатна. Працаваўшы ў мінулым сезоне на трактары, я перавыконвала норму выпрацоўкі. Пры норме 3 гектары ўзорвала па 5,5 гектара.

На нарадзе мела шчасце выступіць і расказаць аб сваёй рабоце. Узяла абавязак за сезон будучага года ўзараць 600 гектараў. Узяты абавязак выканаю з гонарам.

Стралкоўская Вольга.

14 сакавіка

Пры райкоме «Чырвонага крыжа» былі арганізаваны гурткі жанчын-рабочых, служачых і хатніх гаспадынь горада па вывучэнню справы санітарнай абароны, 8 сакавіка 65 жанчын атрымалі значкі ГСО.

30 жанчын калгасніц, якія займаюцца на курсах ясельных работнікаў, таксама рыхтуюцца да здачы нормы на значок санітарнай абароны.

* * *

Пры райза арганізаваны курсы па падрыхтоўцы калгасных садаводаў-агароднікаў. На курсах вучацца 28 чалавек.

19 сакавіка

У вёсцы Баркалабава Баркалабаўскага сельсавета пабудавана і адчынена новая хата-радзільня.

24 сакавіка

Калгаснікі калгаса «Баявы шлях» Клятнянскага сельсавета вывучаюць Канстытуцыю БССР. Па вывучэнню Канстытуцыі створаны чатыры гурткі (па брыгадах), якімі кіруюць настаўнікі-камсамольцы.

28 сакавіка

У горадзе Быхаве распачата будаўніцтва новага дзетсада. На гэту справу адпушчана 65 тысяч рублёў.

Дзетсадам будзе ахоплена 60 дзяцей рабочых і служачых горада.

11 ліпеня

ШТО ЁСЦЬ

У 1937 годзе ў Быхаўскім раёне ёсць: ацэтонавы завод, які мае ўсесаюзнае значэнне; занава рэкан-

Быховский районный историко-краеведческий музей

струяваны шклозавод, вінзавод і лесазавод; 3 торфазаводы, цагельны завод; арцелі: «Металіст», швейная, сапожная, карзіначная, квасная, мелавая, смалакурня; электрастанцыя; 2 машынатрактарныя станцыі, 145 калгасаў, 2 саўгасы, 4 бальніцы, 9 амбулаторый, 4 урачэбныя пункты, 6 фельчарскіх пунктаў, дзеткансультацыя, рэнтгенаўскі кабінет, 5 аптэк, 11 урачоў, 19 фельчараў, 13 акушэрак, 24 медсястры, 10 фельчарыц, 75 пачатковых школ, 27 НСШ, 2 ПСШ, 14 800 вучняў, 476 настаўнікаў і інш.

СУВЯЗЬ РАНЕЙ І ЗАРАЗ

Да Вялікай пралетарскай рэвалюцыі ў Быхаўскім раёне працоўнае сялянства амаль не атрымоўвала журналаў і газет. Аб гэтым гавораць наступныя лічбы: на ўвесь горад і раён атрымоўвалі ўсяго 20—25 газет і 4—10 журналаў у дзень. Гэту літаратуру большасць атрымоўвалі ў горадзе, а некалькі экземпляраў, якія прыпадалі на раён, яны аддаваліся папам і ксяндзам... Зараз у райаддзеле сувязі атрымоўваецца і адпраўляецца для працоўных мас Быхаўшчыны 13 тысяч перыядычных выданняў газет і журналаў, што складае ў сярэднім па адной газеце на кожны двор.

У 1920 годзе было толькі адно паштовае аддзяленне ў адным толькі Быхаве. У сучасны момант па нашаму раёну адкрываюцца і прыступаюць к рабоце 10 новых паштовых аддзяленняў сувязі.

У 1920 годзе па раёну мелася 92 кіламетры ліній, 769 км правадоў і тэлефонных апаратаў 0; па гораду Быхаву ліній 5 км, правадоў 15 км, тэлефонных апаратаў 15 штук.

У 1937 годзе маецца ліній па раёну 345 км, правадоў 2089 км і тэлефонных апаратаў 51 шт. Па гораду Быхаву ліній 9,5 км, правадоў 146 км і тэлефонных апаратаў 170 штук.

У сучасны момант на тэрыторыі Быхаўскага раёна маецца дзесяткі эфірных радыёўстановак. У нас ёсць больш як 700 радыёточак. У нас ёсць свае лепшыя працаўнікі-сувязісты, калгасныя пісьманосцы (Вузнікі — Курбацкі; тэлефаністкі — Кільчыцкая і другія), якія аддана работаюць і змагаюцца за чоткую і культурную сувязь у раёне.

Нач. раённага аддзела сувязі Лебедзеў.

ВОСЬ КІМ ЯНЫ СТАЛІ ПРЫ САВЕЦКАЙ УЛАДЗЕ

...Свабодны беларускі народ вылучыў з сваіх пятраў таленавіцейшых арганізатараў, кіраўнікоў работнікаў сацыялістычнай прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

У адным толькі Быхаўскім раёне з сем'яў, раней прыгнечаных і бяспраўных, выраслі выдатнейшыя людзі: урачы, прафесары, камандзіры Чырвонай Арміі, артысты, інжынеры і г. д.

У калгасніка калгаса «Рэвалюцыя» Быхаўскага гарсавета Карыцкага Рамана маецца 7 дзяцей. Большасць з іх скончылі вышэйшыя навучальныя ўстановы, з'яўляюцца савецкімі спецыялістамі. Старэйшы сын **Іосіф** працуе галоўным ваенным ветурачом у Ленінградзе. **Ганна** — урач-гінеколаг, працуе ў горадзе Саратаве. **Даша** працуе ўрачом-хірургам у Ленінградзе. **Уладзімір** — санурач, працуе ў горадзе Остраў. **Грыгорый** — перайшоў на трэці курс сельскагаспадарчага інстытута, камсамолец. Ён увесь час вучыцца толькі на «выдатна». **Ліда** — заатэхнік. І самая малодшая дачка **Елена** вучыцца ў медтэхнікуме. Усе дзеці Карыцкага спакойны за сваё будучае, яны атрымалі выдатную пуцёўку ў жыццё.

Быўшы беспрытульны Кузьмін Павел (горад Быхаў) скончыў авіяшколу, зараз з'яўляецца лётчыкам.

Канусценка Іван (Быхаў) сірата — студэнт хімфака...

Вось Мельнікаў Віктар, сын селяніна-беднякa з вёскі Баркалабава — працуе эканамістам.

Каршуноў Пётр, сын беднякa з вёскі Баркалабава — журналіст.

Кульманаў Сямён, з гэтай жа вёскі, сын рабочага, скончыў Камуністычны універсітэт народаў Усходу. Зараз працуе ў паўпрэдстве ў Манголіі.

Мельнікаў Фёдар, сын селяніна-беднякa з вёскі Гарадзец Гарадзецкага сельсавета — прафесар Маскоўскага універсітэта.

Хуткі Леанід (горад Быхаў) сын рабочага — артыст дзяржтэатра.

Многа яшчэ можна было б пералічыць выразных і растучых савецкіх беларускіх кадраў з Быхаўскага раёна, якіх пры капіталістычным ладзе немінуча сустрэла б цемра і некультур'е...

Люба Чарнова.

1939 г.

6 кастрычніка

Быхаўскі райкультмаг прыступіў да ўкамплектавання бібліятэчкі для працоўных Заходняй Беларусі і Украіны. У склад бібліятэчкі ўжо падабрана звыш 600 кніг, куды ўваходзяць Канстытуцыя СССР і БССР — 300 экземпляраў, кнігі «Савецкая Беларусь» — 120 штук, звыш 50 кніг народнага пісьменніка Якуба Коласа і іншыя.

Гэтымі днямі падборка кніг для працоўных Заходняй Беларусі заканчваецца і літаратура будзе накіравана па прызначэнню.

Таксама распачалі падборку кніг для школ Заходняй Беларусі педкабінет і бібліятэка райкома саюза пачатковых і сярэдніх школ, а таксама 1-я сярэдняя Быхаўская школа. *Свірыд.*

27 лістапада

АВАЛОДВАЮЦЬ НОВЫМ МЕТАДАМ РАБОТЫ

Шырокі размах набыло сацыялістычнае спаборніцтва сярод рабочых шклозавода «Ільіч». Перайшоўшы з 1-га лістапада на новы метад выдування шклопасуды пры дапамозе трубак-самадувак, майстры шкладувы паспяхова авалодваюць гэтым складаным працэсам работы.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Прымяняючы механізаваны працэс майстры шкладувы таварышы Свінціцкі, Стукачоў, Барысевіч, Сяброўскі і другія дзённыя заданні перавыконваюць на 15—20 працэнтаў.

З увядзеннем трубак-самадувак зараз могуць выдуваць шклопасуду і жанчыны. Для гэтай работы ў якасці вучаніц шкладуваў вылучана 4 жанчыны з ліку чорнарабочых. *А. Цароў.*

5 снежня

НОВАЯ ВЁСКА, НОВЫЯ ЛЮДЗІ

Калісьці ў вёсцы Студзёнкі жыў пан Славінскі, які ў сваім карыстанні трымаў некалькі фальваркаў з прыгоннымі сялянамі. Пазней гэта зямля перайшла пад уладанне пана Гартынскага. На яго зямлі ад цямна да цямна гнулі свае спіны працоўныя сяляне. На былых панскіх землях у 1930 годзе арганізаваўся калгас «Заветы Ільіча». 1014 гектараў зямлі замацавана за калгасам навечна. За кароткі час вёска Студзёнка змяніла сваё аблічча. Калгас мае ўзорную малочнатаварную ферму, якая налічвае 107 галоў буйной рагатай жывёлы, аўцагадоўчую і свінагадоўчую фермы. Пабудаваны кароўнік, цялятнік, два амбары, млын, кузня і школа. Ліквідавана непісьменнасць калгаснікаў.

Вёска Студзёнка дала краіне двух інжынераў, 5 медыцынскіх работнікаў, 9 настаўнікаў, 7 камандзіраў Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, 4 трактарыстаў і другіх работнікаў сельскай гаспадаркі.

У сям'і калгасніка Кузькова Рыгора адзін сын лётчык, другі настаўнік, трэці дарожны майстар, чацвёрты вучыцца ў дзесяцігодцы.

Дзеці калгасніка Сазоненкі Паўла таксама вучацца. Дачка ў гэтым годзе канчае медыцынскі інстытут, сын працуе настаўнікам. Другі сын аграном і чацвёрты навучаецца ў сярэдняй школе.

Калгас вырасціў знатных людзей сацыялістычнай працы. Радавая калгасніца Сукласта Сілкаўна Яўменава зараз вылучана загадчыцай малочнатаварнай фермы калгаса, абрана дэпутатам Вярхоўнага Савета Саюза ССР. Былы радавы калгаснік Яроменка Андрэй вылучан старшынёй калгаса і за добрую пастаноўку работы ў калгасе прэміраван Наркамземам.

Лепшыя наватары сацыялістычнай працы Яўменаў Іван, Шыбяноўскі, Яроменка, Пестуноў і рад другіх у гэтым годзе ўзначальвалі барацьбу за атрыманне сталінскага ўраджаю.

Павялічыўся даход калгаса і значна павялічылася культурнасць працадня. *В. Апенка.*

ВОІНЫ-ЗЕМЛЯКІ, ЯКІЯ ЗАГІНУЛІ Ў САВЕЦКА-ФІНЛЯНДСКУЮ ВАЙНУ 1939—1940 гг.

АБІДАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЕЦЬ

КАЗЛОЎ Якаў Мартынавіч, нарадзіўся ў 1912, працаваў у калгасе, у Чырвонай Арміі з 1940, прапаў без вестак у лютым 1940.

КАРЖОЎ Іван Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1909, працаваў у калгасе, у Чырвонай Арміі з 1939, загінуў 18.3.1940.

ВЁСКА ПАЛЯНІНАВІЧЫ

АНДРЭЙЧЫКАЎ Ягор Пілімавіч, працаваў у калгасе, у Чырвонай Арміі з 1939, загінуў у 1940.

ГАРБАЧОЎ Ігнат Іванавіч, нарадзіўся ў 1919, у Чырвонай Арміі з 1939, загінуў у студзені 1940.

ГУЗАЎ Аляксандр Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1920, вучыўся ў Гомельскім педінстытуце, у Чырвонай Арміі з 1939, загінуў 3.2.1940.

ДУНАЙКОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ХАМІЧЫ

АНТОНАЎ Міхей Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1902, працаваў у калгасе «Новае жыццё».

ІВАНЧЫКАЎ Сцяпан Ігнатавіч, нарадзіўся ў 1905, працаваў у калгасе «Новае жыццё».

ПЕТРУШОЎ Кузьма Ціханавіч, нарадзіўся ў 1914, працаваў у калгасе «Новае жыццё», загінуў у 1940.

ЛУДЧЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЛУДЧЫЦЫ

ЛАЦАПНЁЎ Іларыён Сідаравіч, нарадзіўся ў 1913, радавы, загінуў 30.1.1940.

НАВАБЫХАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ПАСЁЛАК ПРЫВАЛЫЖКА

САМУСЕЎ Пётр Сідаравіч, нарадзіўся ў 1908, працаваў у калгасе «Пралетарская рэспубліка», у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў 7.12.1939.

ВЁСКА КАМАРЫЧЫ

КУЛЯШОЎ Сяргей Лазаравіч, нарадзіўся ў 1913, працаваў у калгасе «Новае жыццё», у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў у 1940.

КУЛЯШОЎ Ягор Кузьміч, нарадзіўся ў 1907, працаваў пастухом у калгасе «Новае жыццё», у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў у 1939.

СТРАЛЬЦОЎ Платон Яўціхавіч, нарадзіўся ў 1912, працаваў у калгасе «Новае жыццё», у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў у 1939.

ЦЕРАШКОЎ Сямён Яўсеевіч, нарадзіўся ў 1913, працаваў у калгасе «Новы шлях», у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў у 1939.

ЯНАЧКІН Іван Данілавіч, нарадзіўся ў 1912,

Быховский районный историко-краеведческий музей

працаваў у калгасе «Новае жыццё», у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў у 1939.

ВЁСКА ТАЙМАНАВА

КАЗЮЛЬКА Канстанцін Апанасавіч, нарадзіўся ў 1911, у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў у 1940.

КОХАНАЎ Мікалай Арцімонавіч, нарадзіўся ў 1909, працаваў у калгасе імя Дзяржынскага, у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў у 1939.

ПЕТРУСЁЎ Цярэнцій Васілевіч, нарадзіўся ў 1912, працаваў у калгасе «Перамога», у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў у 1939.

ХОЛСТАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

МАКРАНСКІЯ ХУТАРЫ

ПРАСМЫЦКІ Васіль Іванавіч, нарадзіўся ў 1916, працаваў на чыгунцы, загінуў 28.2.1940.

ВЁСКА МОКРАЕ

КАМАРОВІЧ Андрэй Ягоравіч, нарадзіўся ў 1908, працаваў у калгасе, у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў 18.1.1940.

ВЁСКА ХОЛСТАВА

МІХАЙЛОЎСКІ Сямён Сцяпанавіч, нарадзіўся ў 1918, працаваў у калгасе «Рашаючы», мал. сяржант, прапаў без вестак у сакавіку 1940.

ЧЫРВОНАСЛАБОДСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЛІПАЎКА

МІХЕЕНКА Іван Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1913, загінуў у 1940.

ВЁСКА НІКАНАВІЧЫ

ІГНАЦЬЕЎ Васіль Кірылавіч, нарадзіўся ў 1907, працаваў галоўным бухгалтарам у калгасе, у Чырвонай Арміі з 1939.

ТРЫФАНЕНКА Мікалай Емяльянавіч, нарадзіўся ў 1914, у Чырвонай Арміі з 1939.

ВЁСКА НОВАЯ ТРАСНА

РАБЧАНКА Фёдар Аляксеевіч, нарадзіўся ў 1904, у Чырвонай Арміі з 1939.

ВЁСКА ХАЧЫНКА

КУБЛІЦКІ Сяргей Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1914, у Чырвонай Арміі з 1939, працаваў брыгадзірам у калгасе, загінуў у 1939 пад г. Выбарг.

* * *

ЛАЗАРАЎ Андрэй Ульянавіч, нарадзіўся ў 1915 у в. Трасцівец Холстаўскага сельсавета, працаваў у калгасе імя М. П. Каманіна, у Чырвонай Арміі з 1939, радавы, загінуў у 1939 у час вызваленчага паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Быховский районный историко-краеведческий музей

ІШЛА ВАЙНА СВЯШЧЭННАЯ

Вялікая Айчынная вайна — самае цяжкае выпрабаванне ў гісторыі нашага народа. Доўгім і складаным быў яго шлях да перамогі. Асабліва цяжкім быў першы перыяд вайны. У крывапралітных баях Чырвоная Армія наносіла ўдары па ворагу, але пад напорам яго пераўзыходзячых сіл нашы абяскроўленыя дывізіі вымушаны былі адыходзіць у глыб краіны. Ужо на другім тыдні полымя вайны ахапіла Быхаўшчыну. У тыя цяжкія ліпеньскія дні 1941 г. Быхаўскі раён абараняла ад ворага 187-я стралковая дывізія (камандзір палкоўнік І. І. Іваноў). Яе 338-ы стралковы полк і 101-ы асобны разведбатальён дзейнічалі на рубяжы Мокрае — Быхаў — Няраж, а асноўныя сілы разгортваліся на ўсходнім беразе Дняпра. У цэлым абарона дывізіі ўяўляла сабой даволі няшчыльны ланцуг, расцягнуты больш чым на 50 км. Уздоўж шашы ад Магілёва ў напрамку Бабруйска дзейнічалі падраздзяленні 514-га і 388-га стралковых палкоў 172-й дывізіі. Паводле рашэння савецкага Вярхоўнага Галоўнакамандавання на ўсходнім беразе Дняпра ствараўся другі стратэгічны эшалон Заходняга фронту. Аднак накапленне войск на Быхаўшчыне ішло павольна, дывізіі прыбывалі са спазненнем, разрознена і да пачатку баёў не паспелі стварыць трывалую і глыбокую абарону. Улічваючы слабасць войск, гатовых абараняцца на подступах да Дняпра ў заходняй частцы Быхаўскага раёна, камандзірам 172-й і 187-й стралковых дывізій быў аддадзены загад прыкрываць гэты напрамак невялікімі рухомымі атрадамі. 1 ліпеня 1941 г. стралковая рота пад камандаваннем лейтэнанта Ларыёнава 514-га палка 172-й дывізіі з прыдадзенымі ёй узводам станковых кулямётаў і батарэяй супрацьтанкавых гармат у раёне в. Чачэвічы ўступіла ў бой з буйным атрадам 3-й танкавай дывізіі гітлераўцаў. Страціўшы 4 танкі, больш як роту мотапяхоты і 12 аўтамашын, вораг адступіў. У той жа дзень у раёне шклозавода ў Ветранцы праціўнік высадзіў паветраны дэсант, на яго знішчэнне была паслана група 388-га стралковага палка.

Накіраваўшы асноўныя ўдары на Магілёў, Рагачоў, Жлобін, праціўнік адначасова спрабаваў танкавымі атрадамі захапіць мост цераз Дняпро ў Быхаве. 3 ліпеня такі атрад з 20 фашысцкіх танкаў і мотапяхоты пераправіўся цераз р. Друць у раёне в. Вязьма і пачаў наступленне на Быхаў. Каля в. Уюн ворага сустрэў рухомы атрад 338-га стралковага палка. Савецкія воіны аказалі яму ўпартае супраціўленне. Раніцай 4 ліпеня ў горад прарвалася каля батальёна варожых танкаў і мотапяхоты. Завязаўся цяжкі бой. На подступах да моста танкі перагрупаваліся і з ходу адкрылі ўраганны агонь па нашай пяхоце. Байцы і камандзіры 338-га стралковага палка стойка абаранялі мост. Ім на дапамогу хутка падаспелі падраздзяленні 236-га стралковага палка, а з левага берага Дняпра ўпарта вяла агонь па ворагу наша артылерыя. Гітлераўскія танкі некалькі разоў адкочваліся назад, але потым з новай ярасцю атакавалі гераічных абаронцаў моста. У другой палове дня напал бою працягваў нарастаць, некалькім танкам праціўніка ўдалося прарвацца цераз мост на левы бераг ракі. Камандзір палка А. Ф. Пашкоў атрымаў загад узарваць мост і адвесці войскі. Мост рухнуў, бой заціх. Як сведчыць падпісаны палкоўнікам Пашковым дакумент, які захоўваецца ў Быхаўскім гісторыка-краязнаўчым музеі, на полі бою засталося каля 40 варожых танкаў, прычым 5 з іх стаялі разбітыя на левым беразе Дняпра.

Камандаванне 24-га матарызаванага корпуса гітлераўцаў упарта спрабавала прарвацца на левы бераг Дняпра. І кожны раз фашысты натыкаліся на жорсткі арганізаваны адпор чырвонаармейцаў, гублялі людзей і танкі. Аднак гэтыя баі дапамаглі гітлераўцам выявіць характар нашай абароны на флангавым стыку 13-й і 21-й армій у раёне Быхава, Рагачова, Жлобіна, дзе параней шаму слабым месцам заставаўся ўчастак

Быховский районный историко-краеведческий музей



Удостоверение

Тов Михневич Т.С. действительно
Является Инструктором Быховско
Рк.кпбб и в настоящее время Райко
партии Направляется для Нала
вания Связи и получения информации
о положении в Быхове.

4/VII 41г. Секретарь РК кпбб (Бурд
Бурдилов
Направляется из совхоза Вор

т. Бурдилову

Часть отошла на западный берег Днепра
и держит его. Мост через р.Днепр взорван
Уничтожено до 40 танков врага из которых
5 стоят разбитыми на этом берегу у моста
Город (вся центральная часть) сожжен дамиста
и в отдельных местах горит до сих пор

Полковник
(Пашков)

Перапіска сакратара Быхаўскага РК КП(б)Б Бурдзілава з камандзірам 338-га стралковага палка палкоўнікам А. Ф. Пашковым пра становішча ў Быхаве.

187-й стралковай дывізіі ў Быхаўскім раёне. Сюды праціўнік і накіраваўся. У ноч на 10 ліпеня ён непрыкметна для разведкі 187-й дывізіі перагрупаваўся ў раён Быхава. Раніцай пасля масіраванай артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі войскі 24-га нямецкага корпуса пачалі перапраўляцца на левы бераг. Завязаўся жорсткі бой. Праціўнік захапіў 7-кіламетровы плацдарм і стаў паглыбляцца далей па тэрыторыі левабярэжжа ў напрамку Следзюкоў. Па загаду камандуючага 45-м корпусам генерала Э. Я. Магона часці 187-й дывізіі адышлі на рубеж в. Чырвоная Слабада, адначасова да месца прарыву перакідвалася рэзервовая 137-я стралковая дывізія (камандзір палкоўнік І. Ц. Грышын), да 18 гадзін сюды прыбылі яе 4 батальёны і 2 першыя батальёны 148-й стралковай дывізіі (камандзір Ф. М. Чаракманаў), якая рухалася з глыбіні краіны. Увечары бой разгарэўся з новай сілай. Аб'яднаўшыся, чырвонаармейскія батальёны пачалі контратакаваць праціўніка. Упершыню за ўсе цяжкія дні баёў на Быхаўшчыне ў небе з'явіліся чырвапазорныя самалёты, якія сталі бамбіць баявыя парадкі і пераправы ворага. Гэта яшчэ больш натхніла нашых воінаў, прыдало ім сілы на новыя атакі. Вораг спыніў пераправу, аднак захопленага плацдарма не пакінуў. Ноччу, над прыкрыццём цемнаты ён зноў стаў рыхтаваць пераправы, накапліваццa на левым беразе. Раніцай 11 ліпеня бой разгарэўся з новай сілай. Самааддана змагаліся чырвонаармейцы 187-й і часці 137-й і 148-й стралковых дывізій. Але сілы былі няроўныя — праціўнік сканцэнтраваў на левым беразе 3-ю і 4-ю танкавыя, 10-ю матарызаваную дывізіі 24-га корпуса, карпусную артылерыю, часці забеспячэння. Гітлераўцы пераадолелі супраціўленне нашых стралковых дывізій і рушылі на Чавусы і Прапойск.

У гэты цяжкі час камандаванне Заходняга фронту паставіла перад войскамі задачу закрыць прарыў, утвораны на ўсім участку фронту 13-й арміі ад Шклова да Быхава, адрэзаць варожыя часці, што прарваліся, і ўсімі сіламі абрушыцца на іх. У раёне Быхава гэту задачу выконвалі 45-ы стралковы корпус (187-я, 137-я дывізіі) і 132-я стралковая дывізія (камандзір генерал-маёр С. С. Бірузоў), якая прыбыла 12 ліпеня з-пад Оршы. 13 ліпеня часці 132-й і 137-й дывізій спрабавалі наступаць і да 13 гадзін выйшлі на рубеж Рыжкаўкі. 102-я стралковая дывізія (камандзір палкоўнік П. М. Гудзь) 45-га корпуса ў ноч з 13 на 14 ліпеня фарсіравала Дняпро паміж Новым Быхавам і Гадзілавічамі. Сярод іншых часцей паспяхова дзейнічаў 467-ы стралковы полк пад камандаваннем палкоўніка Кіпіяні. У данясенні ў штаб корпуса 21 ліпеня пра гэты полк сказана, што ён перайшоў у наступленне і захапіў у палон гітлераўцаў 17-га пяхотнага палка. У данясенні 22 ліпеня паведамлялася, што сувязі з палком няма, полк вядзе баі ў акружэнні, просіць дапамагчы яму танкамі. У данясенні 23 ліпеня паведамлялася, што 467-ы полк, ведучы бой у акружэнні, знішчыў амаль паўтара батальёна праціўніка, часткова выйшаў з акружэння і прыводзіць сябе ў парадак. Камандзір палка Кіпіяні, якому адарвала абедзве нагі, загінуў у гэтым баі. Часці 115-й стралковай дывізіі (камандзір генерал-маёр В. І. Нярэцін), што прыбылі з-пад Гомеля, 10 ліпеня занялі абарону на левым беразе Дняп-

Быховский районный историко-краеведческий музей

ра ў Быхаўскім раёне, 20 ліпеня перад дывізіяй была пастаўлена задача наступаць з поўдня на Быхаў. Аднак гітлераўцы іх апярэдзілі і, хоць панеслі вялікія страты, паглыбіліся ў нашу абарону на 4 кіламетры. Да 15 жніўня 115-й дывізіі ўдалося ўтрымаць рубяжы ў раёне Абідавіч, Веці, Доўска. Часці 117-й стралковай дывізіі (камандзір палкоўнік І. Л. Хіжняк), нягледзячы на колькасную перавагу ворага, упарта прасоўваліся наперад, не раз пераходзячы ў наступленне ў раёне вёсак Вялікая Зімніца, Палкі, Палянінавічы. У выніку ўзмоцненай контратакі праціўніка дывізія трапіла ў двайное акружэнне, пасля 6-гадзіннага бою здолела выйсці з яго пад прыкрыццём 820-га палка. У далейшым спробы наступаць поспеху не мелі.

Мужна і самаадданa змагаліся чырвонаармейцы за кожную пядзю беларускай зямлі. Цуды храбрасці праявілі яны ў баях за Быхаў, пад Заячэннем і Хачынкай, Прыберажжам і Грудзінаўкай, Рыжкаўкай і Іскапню. На месцы прарыву над Хачынкай вораг сканцэнтраваў шмат тэхнікі і жывой сілы. Артылерыйскі і кулямётны абстрэл, бамбёжка нашых пазіцый працягваліся няспынна некалькі сутак. Гарэла зямля. І калі здавалася, што нішто не ўстаіць перад напорам фашыстаў, сярод чырвонаармейцаў з'яўляўся камісар палка Рыгор Лукіч Каліна і як бы ўліваў у байцоў новыя сілы. І зноў контратака. Вораг адкінуты. Але вось фашыстам удалося пераўзыходзячымі сіламі акружыць нашу часць. Здавалася, выратавання няма: або смерць, або палон. Узначаліўшы групу воінаў на адным з участкаў бою, камісар Каліна некалькі разоў адкідваў назад наступаючыя ланцугі ворага. Усё менш і менш вакол камісара заставалася байцоў. Асатанела лезлі фашысцкія аўтаматчыкі, камісар зноў павёў байцоў на прарыў. І яны штыкамі і гранатамі прарвалі варожае кальцо, але ў гэтым баі пад Хачынкай загінуў камісар Каліна. Такіх прыкладаў храбрасці, адданасці Радзіме было шмат. Асабліва вызначыліся воіны Бабрыхін, Рабацяшкін, Іваноў, Хамякоў і іншыя. Ветэран 626-га стралковага палка, былы камандзір роты Г. Швайбовіч успамінаў: «Мы, малодшыя афіцэры, бралі прыклад з свайго камандзіра — палкоўніка Аляксеева. Ён умела кіраваў боем, пастаянна знаходзіўся ў баявых парадках пяхоты, прымаў асабісты ўдзел у адбіцці атак праціўніка. Мінай яму адарвала абедзве нагі. Не паспелі санітары перавязаць цяжкія раны камандзіра, як група варожых аўтаматчыкаў прарвалася да каманднага пункта палка. Штабныя афіцэры і байцы ўступілі ў бой. Палкоўнік Аляксееў да апошняга дыхання вёў агонь па праціўніку з асабістай зброі». Камандзір 4-й стралковай роты малодшы лейтэнант Багян неаднаразова вадзіў сваіх байцоў у штыкавую атаку. У адной з атак ён быў скошаны аўтаматнай чаргой. Радавы Скіба ўступіў у адзінаборства з трыма гітлераўцамі, двух закалоў штыком, а трэцяга застрэліў.

Услед за танкавымі войскамі 24-га матарызаванага корпуса фашыстаў, якія першымі ўварваліся на Быхаўшчыну, тут канцэнтраваліся таксама перадавыя часці і злучэнні 4-й і 2-й нямецкіх армій. Моцна патрапаныя ў жорсткіх баях з Чырвонай Арміяй, фашысты спешна рыхтаваліся да чарговага кідка на Маскву.

Да канца ліпеня, нягледзячы на самаадданае супраціўленне чырвонаармейцаў, Быхаўшчына была акупіравана фашыстамі. Пачаліся пакутлівыя, поўныя жахаў і знявагі над чалавечай асобай дні жыцця нашых людзей ва ўмовах акупацыйнага рэжыму. Адначасова гэта былі і бяспрыкладныя ў гісторыі дні гераізму і шчырай адданасці людзей сваёй Радзіме.

Аднойчы ў кастрычніку 1941 г. ў небе над Быхавам з'явіўся чырванаборны самалёт, скінуў бомбы на чыгуначную станцыю, а людзям некалькі тысяч лістовак, у паветраным баі над горадам збіў варожы знішчальнік Ме-109. Вестка аб гэтым хутка абляцела навакольныя вёскі. Людзі яшчэ доўга ўспаміналі гэту падзею. Пілатаваў жа той самалёт камандзір эскадрыллі старшы лейтэнант Дз. В. Чумачэнка — будучы Герой Савецкага Саюза.

Быхаў, разбураны ў першыя ж дні вайны налётам варожай авіяцыі, па сведчанню відавочцаў, быў падобны на вулкан з чорнымі прабаламі пасярэдзіне. Цэнтральная вуліца, што вяла да вакзала, ляжала ў руінах, не засталося ніводнага ўцалелага будынка.

Жорсткі акупацыйны рэжым быў устаноўлены адразу. Тэрыторыя раёна кантралявалася пры дапамозе ваенных гарнізонаў у буйных населеных пунктах і варожых участкаў, пастоў і гарнізонаў у валасных цэнтрах і іншых населеных пунктах. Пачалася расправа над камуністамі, камсамольцамі, партыйнымі і савецкімі работнікамі, актывістамі і патрыётамі.

Зімой 1941 г. фашысцкія каты сабралі савецкіх грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці і павялі за Быхаў да процітанкавых равоў. Перад пакараннем іх раздзетых заганялі на дошку, перакінутую цераз роў. Параненыя і жывыя, якія не маглі ўтрымацца на дошцы, разам з забітымі падалі ў гэту магілу. Пасля яе запаўнення фашысцкія вылюдкі перасоўвалі дошку далей і працягвалі сваю крывавую справу. Маленькіх дзяцей яны вырывалі з рук маці, падкідвалі іх над ямай і з дзікім азартам стралялі з аўтаматаў па жывых мішэнях. Пасля расстрэлу марадзёры распачалі продаж адзення сваіх ахвяр. Аднак торг не адбыўся — з пагардай і нянавісцю адварочваліся людзі ад крывавых гандляроў. Увесь гэты злачынны тавар быў пагружаны ў вагоны з надпісам «фатэрлянд».

Летам 1942 г. акупанты поўнасцю спалілі вёску Красніца. У полымі згарэлі 769 чалавек,

Быховский районный историко-краеведческий музей



Загад № 1 аб стварэнні партызанскага атрада асобага прызначэння Г. І. Сазонава. Партархіў Смаленскага абкома КПСС.

жывымі засталіся толькі тыя, каго ў той час па нейкай прычыне не было ў вёсцы. Вінаватасць людзей была ў тым, што ля вёскі партызаны збілі нямецкі самалёт. У першай палове ліпеня карнікі спалілі таксама вёскі Ветранка, Смаліца, Трылесіна, Дабужа. У пачатку лета 1942 г. акупацыйныя ўлады актыўна ўзяліся за вярбоўку насельніцтва ў Германію. Абяцалі там райскае жыццё. Адпак на зборны пункт людзі не з'явіліся, не спакусіліся на «лёгкае» жыццё і працу. Тады з дапамогай узброеных каманд вярбоўшчыкі рабілі аблавы, акружыўшы вёску звычайна раніцай, і пад канвоем забіралі працаздольных людзей ад 15 да 45 гадоў.

У такіх абставінах нянавісці да крывавага акупацыйнага рэжыму расло імкненне людзей да барацьбы з каварным ворагам. Савецкія патрыёты разам з уцёкшымі ваеннапалоннымі і ваеннаслужачымі, якія адсталі ў час абарончых баёў ад сваіх часцей і на зіму засталіся ў навакольных вёсках, аб'ядналіся ў адзіным жаданні помсціць акупантам за нявінную кроў нашых людзей.

Партызанскі рух зараджаўся ў правабярэжнай і левабярэжнай частках раёна самастойна. Люты 1942 г. стаў пачаткам фарміравання першай партызанскай групы з рабочых шклозавода «Ільіч» у в. Ветранка, якая ў канцы красавіка выйшла ў лес да в. Смаліца (потым група базіравалася каля в. Пчэльня). Групу ўзначаліў акружэнец камуніст Я. А. Курпачэнка. Пазней у Хачынскі лес прыйшлі дыверсійна-разведвальныя групы М. Іванова і Г. І. Сазонава, дэсантаваныя штабам Заходняга фронту. Сюды ж прыбыла група ваеннаслужачых з в. Дабужа на чале з малодшым палітруком М. П. Фёдаравым і група патрыётаў з в. Рыжкаўка на чале з І. П. Памятнёвым. Усе партызанскія групы левабярэжжа аб'ядналіся паміж сабой, з іх у чэрвені 1942 г. ўтварыўся атрад пад камандаваннем Г. І. Сазонава. На працягу ліпеня — жніўня атрад Г. І. Сазонава папоўніўся жыхарамі вёсак Ветранка, Смаліца, невялікай групай партызан з Кіраўскага раёна і ўтварыў групу аб'яднаных атрадаў, узначаліўшы іх (у гісторыю партызанскага руху ўмоўна ўвайшла пад назвай 1-я Быхаўская брыгада).

Партызанскі атрад на чале з М. К. Марусавым утварыўся каля в. Кучына ў красавіку 1942 г. і стаў першым атрадам у правабярэжнай (заходняй) частцы Быхаўскага раёна. У Гарадзецкім лесе ў чэрвені 1942 г. сфарміраваўся партызанскі атрад пад камандаваннем М. П. Кураліна. Трэці партызанскі атрад на правабярэжжы Быхаўшчыны ўтварыўся ў Ніжнятошчыцкім сельсавеце (з 20 жніўня 1942 г. яму прысвоены 810-ы нумар). Яго першым камандзірам стаў М. Л. Максімаў-Лебедзеў. У сакавіку 1943 г. пры стварэнні 11-й Быхаўскай брыгады гэтыя тры атрады склалі яе асноўны касцяк.

Нялёгкі шлях прайшлі партызаны Быхаўшчыны ў Вялікую Айчынную. Карныя аперацыі летам і восенню 1942 г., у маі 1943 г., гераічная Боўкінская абарона (кастрычнік 1943 г.) сталі сапраўдным выпрабаваннем на мужнасць, арганізаванасць, баявую здольнасць партызан (падрабязна аб стварэнні і развіцці партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Быхаўскага раёна і баявых дзеяннях партызан глядзі ў нарысе «Партызанскі фронт»). Праз вогненную зямлю Быхаўшчыны прайшлі таксама баявыя шляхі славутага партызанскага палка «Трынаццаць», 15-га, 152-га палкоў, шматлікіх палкоў і асобных атрадаў Клічаўскага, Слаўгарадскага, Бялыніцкага, Чэрыкаўскага, Рагачоўскага, Бярэзінскага раёнаў. Яшчэ больш узмацніў палітычную

Быховский районный историко-краеведческий музей

і арганізатарскую работу па далейшаму разгортванню партызанскага руху ў раёне Быхаўскі падпольны райком партыі, створаны ўпаўнаважаным ЦК КП(б)Б па Магілёўскай вобласці І. М. Кардовічам 7 сакавіка 1943 г.

Раней, у верасні 1942 г., быў створаны Быхаўскі падпольны райком ЛКСМБ.

Быхаўскі падпольны райком КП(б)Б

Сакратары: Адасёў Кары Лаўрэнцьевіч (7—17.3. 1943 г.), Андрэенкаў Емяльян Цімафеевіч (17.3—15.11.1943 г.), Падалян Фядот Пракопавіч (15.11. 1943 г.— 24.2.1944 г.). Члены райкома: Лукашоў Фёдар Іванавіч (7.3.1943 г.— 24.2.1944 г.), Куракін Мікалай Паўлавіч (7.3.1943 г.— 24.2.1944 г.), Каспрук Станіслаў Паўлавіч (7.3—10.5.1943 г.), Ляўшынскі Цімафей Іванавіч (7.3.1943 г.— 24.2.1944 г.), Падалян Фядот Пракопавіч (15.4—15.11.1943 г.), Федзячэнка Іван Паўлавіч (15.12.1943 г.— 24.2.1944 г.).

Быхаўскі падпольны райком ЛКСМБ

Сакратары: Куракін Віктар Мікалаевіч (вер. 1942 г.—27.2.1943 г.), сакратар па прапагандзе (27.2 —1.7.1943 г.), Караленка Павел Міхайлавіч (27.2. 1943 г.— 24.2.1944 г.), Ракітнянская Елізавета Піліпаўна (сакратар па прапагандзе 1.7.1943 г.— 24.2.1944 г.). Члены райкома: Куракін Віктар Мікалаевіч (1.7.1943 г.— 24.2.1944 г.), Ісакаў Аляксандр Сяргеевіч (з верасня 1942 г. па 1.12.1943 г.), Вараб'ёва Ганна Ігнацьеўна (1.3.1943 г.— 24.2.1944 г.), Дамброўскі Пётр Міхайлавіч (1.3.1943 г.— 24.2. 1944 г.).

У ліпені 1943 г. пры Быхаўскім падпольным РК КП(б)Б у адпаведнасці з пастановай Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б была створана ваенна-аператыўная група (ВАГ). Аб'яднаўшы 810-ы, 425-ы і 225-ы атрады 11-й Быхаўскай брыгады і 152-і асобны атрад, яна стала асноўным інструментам райкома партыі па ваенным кіраванні партызанскім рухам у раёне, распрацавала і ажыццявіла шэраг баявых аперацый партызан.

Ішоў к канцу 1943 год. На заходнім напрамку працягваліся жорсткія баі. Чырвонай Арміяй былі вызвалены часткі Полацкай, Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай і Палескай абласцей. Быў вызвалены першы абласны горад Беларусі — Гомель. У лістападзе 1943 г. войскі 3-й арміі (камандуючы генерал-лейтэнант А. В. Гарбатаў) Беларускага фронту і 50-й арміі (камандуючы генерал-лейтэнант І. В. Болдзін) Заходняга фронту, прарваўшы нямецкую абарону на р. Сож, выйшлі да Дняпра, авалодалі вёскамі Палянінавічы, Іскань, Сялец-Халапееў, Абідавічы, Вець, пачаўшы вызваленне Быхаўскага раёна. У ноч з 10 на 11 снежня 1943 г. 108-я і 110-я стралковыя дывізіі вызвалілі Хачынку і Папоўку, а неўзабаве святкавалі сваё вызваленне Чырвоная Слабада, Усохі, Ніканавічы і іншыя вёскі левабярэжнай часткі Быхаўшчыны. Хоць і не заціхала артылерыйская кананада, вызваленыя вёскі сталі жыць новым, савецкім жыццём. На левабярэжжы Дняпра, у в. Папоўка Чырвонаслабодскага сельсавета размясціліся і пачалі дзейнічаць раённы камітэт партыі, раённы выканаўчы камітэт, іншыя раённыя арганізацыі. Да дня вызвалення Быхава — 28 чэрвеня 1944 г.— Папоўка была цэнтрам Быхаўскага раёна. Адсюль вялі сваю вялікую арганізацыйную і палітычную работу раённы камітэт партыі, які ўзначаліў былы сакратар Быхаўскага падпольнага райкома партыі Е. Ц. Андрэенкаў, адкліканы ЦК КПБ з варожага тылу 15 лістапада, і раённы выканаўчы камітэт на чале з К. С. Касцюком. Надзвычай цяжкі і галодны быў тады час. Фашысты ўшчэнт зруйнавалі калгасы, разбурылі жыллё. Палі зараслі быльнягом, не было пугла, рабочых рук. Патрэбны былі вялікія намаганні, самаадданая работа партыйных і савецкіх органаў, насельніцтва вызваленых вёсак, каб аднавіць рапейшы, савецкі лад жыцця. У вызваленых мясцінах пачалі дзейнічаць выканкомы сельскіх Саветаў, калгасы, школы. Старшынёй выканкома Чырвонаслабодскага сельсавета стаў Касякоў — партызан Быхаўскай ВАГ, вывезены за лінію фронту па раненню, старшынёй выканкома сельсавета ў Ніканавічах — Краўчанка. Сельскія Саветы клапаціліся аб матэрыяльным забеспячэнні сем'яў франтавікоў і партызан, аб уладкаванні сірот, якіх нямала засталося пасля фашысцкага нашэсця, аб навучанні дзяцей. У в. Хачынка праз тыдзень пасля вызвалення пачала працаваць пачатковая школа. Настаўніцы М. Н. Ісакова, А. І. Жураўская шмат аддалі сіл і старання, каб абудзіць у дзяцей, якія столькі пабачылі і перацярпелі, прагу да ведаў, каб у іх сумных вачанятах зноў заіскрылася радасць.

У вёсках Хачынка і Папоўка быў адноўлены калгас «Рассвет». Старшынёй яго калгаснікі аднадушна выбралі А. І. Юрчанку, былую партызанку. У в. Александрова адрадзіўся калгас імя Кірава. Узначаліў яго былы партызанскі збройнік Фама Міхайлавіч Еўмушкоў, у Чырвонай Слабадзе было даручана кіраваць калгасам Кліму Макаравічу Азаранку. У калгасе «Рассвет» брыгадзірам 3-й паляводчай брыгады была Ганна Сяргееўна Жыглянкова. Набліжалася веснавая сяўба, а насення — ні каліва. «Родныя мае, выручайце»,— звярнулася да аднавяскоўцаў на сходзе Ганна Сяргееўна. І калгасніцы адгукнуліся на просьбу брыгадзіра. Адрываючы ад сваіх і без таго бедных запасаў, яны сабралі насенне яравых і «вочкі» бульбы, а вясной, цягаючы на сабе плугі, засеялі брыгаднае поле.

Адступаючы, вораг спаліў больш за дзвесце дамоў па тэрыторыі вызваленых сельсаветаў. Людзі засталіся пад адкрытым небам. Па рашэнню райкома партыі ў калгасах былі створаны будаўнічыя брыгады. Працавалі ў іх у асноўным падлеткі. Вялікую дапамогу ў будаўніцтве ака-

Быховский районный историко-краеведческий музей

залі байцы Чырвонай Арміі. Яны дзяліліся інструментам, дапамагалі вывозіць бярвенне, клалі зрубы і печы, выконвалі шмат іншай работы.

21 лютага 1944 г. войскі 283-й стралковай дывізіі (камандзір генерал-маёр В. А. Канавалаў) прарвалі ўмацаваную абарону 9-й арміі праціўніка на заходнім беразе Дняпра, авалодалі населенымі пунктамі Новы Быхаў, Янава, Калініна, Тайманава. Так пачалося вызваленне правабярэжнай часткі Быхаўшчыны.

Асобны лыжны батальён 5-й стралковай дывізіі пад камандаваннем Героя Савецкага Саюза Б. Я. Каваленкі разам з 336-м стралковым палком 23 лютага 1944 г. прабраўся ў тыл праціўніка. Яны з боем захапілі станцыю Тошчыца, перарэзалі чыгунку Магілёў — Жлобін, вызвалілі вёскі Верхняя і Ніжняя Тошчыца, Дзедава. 24 лютага асобны лыжны батальён і іншыя часці 5-й дывізіі ў раёне в. Дзедава злучыліся з партызанамі Быхаўскай ВАГ.

На працягу некалькіх дзён лютага была вызвалена значная частка раёна ад Дняпра да Друці. Зноў сталі савецкімі Навабыхаўскі, Тайманаўскі і Верхнятошчыцкі сельсаветы. У асенне-зімовых баях 1943—1944 гг. за вызваленне Быхаўскага раёна прымалі ўдзел таксама 169-я, 269-я, 17-я (лыжны батальён гэтай дывізіі ноччу 4 студзеня 1944 г. поўнасцю разграміў штаб 267-й нямецкай пяхотнай дывізіі ў в. Прыбар), 129-я, 362-я, 380-я, 413-я, 238-я, 369-я, 324-я стралковыя дывізіі. У сакавіку 1944 г. ў склад 50-й арміі ўвайшла 82-я стралковая дывізія, якая заняла абарону ў раёне в. Боўкі. 25 сакавіка 210-ы і 250-ы стралковыя палкі разгарнуліся ў баявыя парадкі і занялі зыходныя пазіцыі для наступлення на Красніцу. Абарона праціўніка тут была трывалай, насычанай вялікай колькасцю артылерыі і мінамётаў. Фашысты часта пераходзілі ў контратакі вялікімі сіламі ў суправаджэнні танкаў і самаходнай артылерыі. 26 сакавіка пасля жорсткіх баёў Красніца была вызвалена. Воіны дывізіі аказалі вялікую дапамогу жыхарам в. Боўкі і суседніх з ёй вёсак. З 15 па 25 сакавіка яны дапамаглі адрамантаваць 4 прыхаваныя ад акупантаў трактары і іншую сельскагаспадарчую тэхніку і інвентар. У час пасяўной было выдзелена з трафейных прадуктовых складоў насеннае зерне пшаніцы і ячменю, сіламі часцей дывізіі было засеяна 153 га зямлі.

Помнік у вёсцы Сялец на месцы размежавання 1-га і 2-га Беларускіх франтоў пры вызваленні Быхаўскага раёна ў сакавіку — чэрвені 1944 г.

К вясне 1944 г. фронт стабілізаваўся, часці перайшлі ў абарону. Праціўнік умацаваўся на рацэ Езва, займаючы Хамічы, Гуту Раманяцкую і далей па чыгуначнай дарозе да 15-га раз'езда. А ў вёсцы Папоўка ў гэты час разгортвалася арганізатарская і палітычная работа. Вялікі ўклад у аднаўленне гаспадаркі і ўсяго савецкага жыцця ў раёне зрабілі намеснік старшыні райвыканкома Архіпец, загадчык раённага зямельнага аддзела Сівагракаў, загадчык раённага аддзела народнай асветы Казлоў, загадчык райфінаддзела Стральцоў, загадчык райсабеса Хапанцаў, райваенком Баглаеў, сакратар райкома камсамола Караленка, які змяніў на гэтым пасту Цімаховіча. На вызваленым правабярэжжы ў кашчы красавіка заняткі ішлі ўжо ў васьмі школах. Вялікую ролю ў аднаўленні народнай гаспадаркі, дапамозе фронту адыгралі моладзь і камсамол. Яны па першым заклiку райкома камсамола ішлі на самыя адказныя і цяжкія ўчасткі. Сорак дзевяць юнакоў паступілі на курсы мінёраў, каб ачысціць калгасныя палі ад мін. Баявым памочнікам раённага камітэта партыі была раённая газета «Сацыялістычная перамога». 1-ы нумар яе выйшаў у в. Папоўка 13 красавіка 1944 г. Рэдагаваў газету былы палітрук партызанскай роты, настаўнік па прафесіі Марк Філімонавіч Філімонаў, адказным сакратаром рэдакцыі была Ніна Андрэеўна Гулянкова, былая партызанка.

Вясной 1944 г. на ўсім заходнім напрамку настала часовае зацішша. Войскі Чырвонай Арміі адпачывалі, папаўняліся людзьмі, боепрыпасамі, гаручым, танкамі і іншай баявой тэхнікай, рыхтаваліся да Беларускай наступальнай аперацыі, якая стала адной з самых яркіх старо-

Быховский районный историко-краеведческий музей

нак у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У падраздзяленнях войск, якія вясной 1944 г. займалі пазіцыі на тэрыторыі Быхаўскага раёна, вялася вялікая падрыхтоўчая работа. Вельмі важную ролю ў летнім наступленні 1944 г. адыграў плацдарм, захоплены зімой на заходнім беразе Дняпра. Чырвонаармейцаў чакала новая суровая бітва за вызваленне беларускай зямлі — вораг не збіраўся здаваць свае пазіцыі, ён падрыхтаваў магутную сістэму абарончых умацаванняў. Асабліва моцнай была абарона праціўніка перад нашым плацдармам за р. Друць. Глыбіня яе тут дасягала 7 км. Перад 1-й і 2-й траншэямі былі суцэльныя мінныя палі. Пазіцыі прыкрываліся драцянымі загародамі ў шэсць радоў. Многія агнявыя кропкі знаходзіліся пад металічнымі каўпакамі. Генерал арміі А. В. Гарбатаў, былы камандуючы 3-й арміяй, успамінаючы тыя дні, пісаў: «У састаў арміі ўваходзілі 35, 40, 41, 42, 46 і 80-ы стралковыя, 9-ы танкавы і артылерыйскі карпусы. Мы стварылі рэльефны план нашай паласы да р. Бярэзіна. На ім праводзіліся заняткі з камандзірамі карпусоў, дывізій і іх намеснікамі. Камандзіры карпусоў і дывізій у сваю чаргу праводзілі заняткі з сваімі падначаленымі на такіх жа планах, але ўжо тых палос, у якіх яны павінны былі наступаць.

Вялікую работу праводзілі палітаддзелы, партыйныя і камсамольскія арганізацыі, камандзіры часцей і злучэнняў. Яны гутарылі з воінамі, вывучалі іх запатрабаванні і інтарэсы. Нярэдка гутаркі праводзілі партызаны, тысячы якіх улілі ся ў армію. Яны расказвалі аб тым, як цяжка жывецца пад ігам фашыстаў савецкім людзям, як вораг здзекуецца над мясцовым насельніцтвам, расказвалі найбольш цікавыя эпізоды аб партызанскіх дзеяннях. Усё гэта выклікала ў нашых воінаў яшчэ большую нянавісць да фашысцкіх захопнікаў...

Да апошняга дня 46-ы стралковы і 9-ы танкавы карпусы мы пакідалі на ўсходнім беразе Дняпра.

Незадоўга да пачатку наступлення на 1-ы Беларускі фронт прыбыў з Стаўкі Маршал Савецкага Саюза Г. К. Жукаў. Ён пабываў на пярэднім краі абароны нашай арміі...

У апошнюю ноч перад наступленнем, як толькі згусціўся змрок, засвяціліся фары нашых аўтамашын, якія былі акапаны на пярэднім краі абароны. Промні святла, павернутыя на ўсход, абазначалі наш пярэдні край, яшчэ больш к усходу запаліліся кастры...

Калі настала поўная цемра, мы пачулі спачатку нарастаючы шум нашай лёгкай начной авіяцыі, якая ішла бамбіць агнявыя пазіцыі і траншэі праціўніка. Потым гэты шум змяніў гул цяжкіх самалётаў дальняй авіяцыі...

У гэту ноч пад шум і грукат бамбёжкі, у непасрэднай блізкасці ад праціўніка, часта пад ружэйным і кулямётным агнём працаўнікі-сапёры зрабілі і пазначылі сотні праходаў у мінных палях і драцяных загародах для пяхоты, танкаў і артылерыі...

Сігналам да пачатку артпадрыхтоўкі быў залп гвардзейскіх міпамётаў. Услед за ім загрымелі выстралы дзвюх тысяч артылерыйскіх і мінамётных ствалоў. Праціўнік быў так ашаломлены, што доўгі час маўчаў і толькі з другой гадзіны пачаў адказваць слабым артылерыйскім агнём. З НП праглядалася ўся даліна р. Друць. Мы бачылі, як сапёры пад гром артпадрыхтоўкі, нягледзячы на кулямётны агонь праціўніка, прыступілі да навядзення мастоў на пярэдне забітых палях і штурмавых мосцікаў з загадзя падрыхтаваных дэталей. Сігналам да атакі быў другі залп «катюш»...

Да зыходу першага дня 35-ы стралковы корпус сваім правым флангам, а 41-ы корпус — левым, фарсіраваўшы раку і пераадолеўшы моцнае агнявое супраціўленне, прасунуліся на 3—4 км, а часці, якія наступалі з плацдарма, прасунуліся ўсяго на адзін кіламетр, галоўным чынам таму, што перад другой траншэяй праціўніка аказаліся мінныя палі. 80-ы стралковы корпус, наступаючы на другарадным напрамку без моцнай артпадрыхтоўкі, абмежаваўся агнявым налётам і прасунуўся на 10—12 км; 283-я стралковая дывізія, авалодаўшы в. Хамічы, ужо адбівала контратакі ворага, ёй якраз і быў падпарадкаваны запасны полк, пастаўлены ў абарону замест корпуса.

25 чэрвеня поспех 1-га Беларускага фронту быў адзначаны салютам і падзякай Вярхоўнага Галоўнакамандуючага». (Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Освобождение Белоруссии, 1944. 2 изд. М., 1974. С. 354—359.)

Так разгортваліся падзеі аперацыі «Баграціён» на Быхаўшчыне. 5-я і 186-я дывізіі ўдарылі на Ліпкі, Будаўку, Нямкі. Да 13 гадзін 24 чэрвеня яны прарвалі пазіцыі ворага на глыбіню 5 кіламетраў. Фашысты аказвалі жорсткае супраціўленне. Чырвонаармейцы адбілі бясконцыя контратакі пяхоты і танкаў праціўніка і да канца дня 24 чэрвеня прарвалі яго абарону. Гэта дало магчымасць выйсці на фланг і ў тыл фашыстаў як у паўночным, так і ў паўднёвым напрамку. Праціўнік адчайна спрабаваў сарваць наступленне войск нашага 80-га стралковага корпуса і па напрамак галоўнага ўдару кінуў свае матарызаваныя часці з раёна Быхава. Чырвонаармейцы адбівалі па 25 контратак у дзень і адстаялі занятыя рубяжы, забяспечылі наступленне галоўных сіл 3-й арміі. 27 чэрвеня часці 80-га стралковага корпуса нанеслі ўдар па ворагу ўздоўж заходняга берага Друці на поўнач і захапілі дарогу на Быхаў, Чыгірынку, Перунова. 5-я дывізія вызваліла Шмакі, Прыбар, Чыгірынку. 186-я дывізія пасля напружанага чатырохгадзіннага бою штурмам авалодала Чачэвічамі і пераправамі на Друці. У раёне на ўсход

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей



Мемарыяльная дошка ў гонар вызвалення Быхава на будынку дзіцячага сада № 4.

ад Чыгірынкі і Чачэвіч абыходным манеўрам быў завершаны разгром 164-га пяхотнага і 137-га артылерыйскага палкоў 57-й нямецкай дывізіі.

362-я стралковая дывізія (камандзір генерал-маёр Еншын Міхаіл Аляксандравіч — ганаровы грамадзянін Быхава) 19-га стралковага корпуса 50-й арміі 2-га Беларускага фронту з лістапада 1943 г. да чэрвеня 1944 г. займала абарону ў раёне на поўнач ад Ніканавіч і Старой Трасны і каля в. Прыбар, вяла баі мясцовага значэння. 28 чэрвеня 1944 г. дывізія фарсіравала Дняпро і вызваліла Быхаў, а пасля яшчэ 30 населеных пунктаў, 30 чэрвеня ў раёне Чыгірынкі фарсіравала Друць. У вызваленні паўночнай часткі раёна прымалі ўдзел 362-я, 324-я, 110-я стралковыя дывізіі.

Вызваляючы ад ворага Быхаўскую зямлю, савецкія воіны не шкадавалі ні сіл, ні жыцця. Пад Смаліцай і Красніцай, Лудчыцамі і Яшавам, Прыбарам і Ніканавічамі, Тошчыцай і Быхавам прадэманстравалі яны сапраўдныя ўзоры мужнасці і гераізму (больш падрабязна гэтыдзі ў артыкулах «Вызваленне», «Яны вызвалялі Быхаўшчыну» і інш.). Адзінаццаці з іх, самым адважным сынам розных народаў СССР, было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза. Вось іх імёны: Іван Андрэевіч Барысевіч, Пётр Дзмітрыевіч Вінічэнка, Пётр Аляксеевіч Данілаў, Сундуткалі Іскалі́еў, Барыс Яўгенавіч Каваленка, Сідар Захаравіч Кульбашны, Уладзімір Кірылавіч Мартынаў, Галакціён Самсонавіч Размадзе, Мухітдзін Умурдзінаў, Яфім Барысавіч Фрадкоў, Гулям Якубаў. Каля 7 тысяч савецкіх воінаў назаўсёды засталіся ляжаць у Быхаўскай зямлі, аддаўшы за яе свабоду і незалежнасць самае дарагое — сваё жыццё. Пацвярджэнне таму — шматлікія помнікі і абеліскі, якія ўзвышаюцца на Быхаўшчыне як сімвалы вечнай памяці аб іх высокім подзвігу. Але ёсць у Быхаўскім раёне месца асаблівае, святое — Лудчыцкая вышыня — Вышыня Герояў, як назваў яе народ. З зімы да канца чэрвеня 1944 г. не сціхалі баі на подступах да вышыні і на самой вышыні 150,9 — так была пазначана на штабных картах вышыня каля Лудчыц. У лістападзе 1943 г. на подступах да вышыні ў баі каля в. Сялец-Халапееў камандзір мінамётнай роты лейтэнант П. Дз. Вінічэнка ў крытычны момант бою, калі скончыліся міны, павёў роту ў рукапашную. Вораг быў адкінуты, але П. Дз. Вінічэнка загінуў. Камандзір стралковай роты капітан Г. С. Размадзе вызначыўся пры фарсіраванні Дняпра, а ў баі за станцыю Тошчыца 23.2.1944 г. са сваёй ротай адбіў 5 контратак ворага, сам быў тройчы паранены, але поля бою не пакінуў. У гэты ж час маёр Б. Я. Каваленка на чале асобнага лыжнага батальёна непрыкметна пераправіўся цераз Дняпро, наладзіў сувязь з партызанамі і нечаканым ударам разграміў гарнізон на станцыі Тошчыца. На подступах да вышыні 150,9 камандзір гарматы старшы сяржант І. А. Барысевіч 22 лютага быў паранены, адзін з усяго разліку застаўся жывым, падбіў 2 танкі, а трэці прымусіў адступіць. 23.2.1944 г. яго аднапалчанін камандзір гарматы той жа 3-й батарэі 971-га артпалка старшы сяржант Я. Б. Фрадкоў адзін з першых пераправіўся цераз Дняпро і

Быховский районный историко-краеведческий музей

вызначыўся ў баі на плацдарме ў раёне вышыні 150,9. У час Беларускай наступальнай аперацыі 24 чэрвеня 1944 г. на долю 556-га стралковага палка (камандзір падпалкоўнік П. В. Качур) 169-й дывізіі 3-й арміі выпала асаблівая задача: стварыць моцны перадавы атрад і правесці разведку боем у напрамку Лудчыцы — Быхаў, захапіць мост цераз Дняпро. Дзеянні гэтага атрада павінны былі скаваць як мага болей сіл ворага і тым самым адцягнуць яго ад галоўнай групоўкі 1-га Беларускага фронту. Адным словам, патрэбна было штурмам авалодаць вышынёй 150,9 і любой цаной утрымаць яе. Таму што яна ўкліньвалася ў нашу абарону і была тут самым умацаваным пунктам праціўніка. Фашысты не давалі чырвонаармейцам узняць галаву. Хоць і дарагой цаной, але вышыня была ўзята і ўтрымана. Баявое заданне было выканана, а трое воінаў — аўтаматчык радавы Сундуткалі Іскаліеў і камандзіры стралковых рот старшы лейтэнант У. К. Мартынаў і капітан Гулям Якубаў пасмяротна былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза. Зараз на Лудчыцкай вышыні створаны Мемарыял воінскай славы (больш падрабязна глядзі ў артыкуле «Вышыня Герояў»).

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў радах Чырвонай Арміі і ў тыле ворага мужна змагаліся тысячы быхаўчан. На заходняй граніцы нашай краіны і на подступах да яе сталіцы — Масквы, пад Сталінградам і Курскам, на роднай сваёй быхаўскай зямлі, у Польшчы і Берліне — усюды змагаліся яны з ненавісным ворагам мужна і самааддана. 11 ураджэнцам раёна было прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза. Яго былі ўдастоены: Дзмітрый Яфімавіч Аскаленка, лётчык, камандзір звяна знішчальнай авіяцыі; Канстанцін Іванавіч Арлоўскі, камандзір танкавага батальёна; Леанід Сямёнавіч Данілюк, камандзір самаходнага артпалка; Сцяпан Акімавіч Красоўскі, маршал авіяцыі; Георгій Мяфодзьевіч Надтачэеў, адважны лётчык-штурмавік; Арцём Іванавіч Салодышаў, камандзір стралковага аддзялення; Гемел-Міхайлавіч Станкевіч, камандзір танкавага ўзвода; Фёдар Фёдаравіч Раўчакоў, камандзір стралковай роты; Фядос Арцёмавіч Смалячкоў, адважны снайпер; Цярэнцій Яфрэмавіч Сычкоў, камандзір інжынернай роты; Васіль Іванавіч Цямчук, храбры артылерыст. Поўнымі кавалерамі ордэна Славы сталі Мікіта Іосіфавіч Перавознікаў, памочнік камандзіра стралковага ўзвода, і Мікалай Рыгоравіч Бяляеў, камандзір мінамётнага разліку (глядзі адпаведныя артыкулы).

Гады «гаспадарання» нямецка-фашысцкіх захопнікаў на беларускай зямлі прынеслі незлічоныя страты і пакуты нашаму народу. У выніку карных аперацый, бамбёжак былі знішчаны мірныя жыхары, згарэлі жылыя дамы, гаспадарчыя

М. А. Еншын.

пабудовы, культурныя ўстановы. У Быхаўскім раёне разам з жыхарамі былі спалены вёскі Красніца, Студзёнка, Залатое Дно. Усяго за гады акупацыі было знішчана 9158 мірных жыхароў. На франтах вайны загінула каля 3 тысяч ураджэнцаў Быхаўшчыны. У фашысцкае рабства было вывезена 1889 чалавек, у асноўным моладзь. Было разбурана і спалена 8301 жылы дом, 3 машынна-трактарныя станцыі, 8900 калгасных пабудоў, 6500 хлявоў, 2952 свірны, 83 школы, 22 хаты-чытальні, 15 клубаў. Былі ператвораны ў руіны Ветрашскі шклозавод, Быхаўскі ацэтонава-бутылачны завод, Грудзінаўскі спіртзавод, поўнасцю быў знішчаны ўсе прадпрыемствы прамысловай кааперацыі, грамадскага харчавання, гандлю. У грашовым выражэнні матэрыяльныя страты, нанесеныя раёну, склалі 656 074 тыс. рублёў. Раённая газета «Сацыялістычная перамога» 11 ліпеня 1944 г. ў карэспандэнцыі «Паднімем з руін наш родны Быхаў» пісала: «Фашысцкія разбуральнікі зруйнавалі і спалілі самае каштоўнае, што было ў нашым горадзе. Электрастанцыю, тры сярэднія школы, два будынкі ясляў, кінатэатр, клуб, аптэку, усе магазіны, лесапільны завод, буйную майстэрню металістаў, маслазавод і рад іншых прадпрыемстваў і ўстаноў фашысцкія варвары ператварылі ў руіны і папялішчы.

Самы цэнтр любімага горада з лепшымі збудаваннямі быў разбураны і спалены. Больш тысячы сем'яў засталіся без жылля.

Перад тым, як уцячы з Быхава, атрад разбуральнікаў думаў зруйнаваць ушчэнт увесь горад і не пакінуць ніводнага будынка. Але свае злачынныя планы ажыццявіць да канца гітлераўцы не змаглі. Пад ударамі Чырвонай Арміі яны вымушаны былі адкаціцца далёка назад».

Савецкі народ выйшаў пераможцам у самай цяжкай з войнаў, адстаяў заваёвы Кастрычніка, сваю свабоду і незалежнасць. Нягледзячы на цяжкія людскія і матэрыяльныя страты, наш народ выйшаў з гэтай вайны моцны духам, яшчэ больш згуртаваны, поўны жадання хутчэй узняць з руін сваю любімую Радзіму.

Г. Е. Барысаў, А. Л. Манаенкаў.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Так пачалася вайна

З успамінаў Ягора Емяльянавіча Гаўрыленкі, жыхара в. Гута Раманяцкая, удзельніка абароны Брэсцкай крэпасці

У Чырвоную Армію я быў прызваны Быхаўскім райваенкаматам у 1938 г. і накіраваны ў 44-ы стралковы полк. Камандаваў палком маёр Гаўрылаў. У 1941 г. полк размяшчаўся ў адной з казарм Брэсцкай крэпасці. Наша рота знаходзілася на першым паверсе казармы.

У суботні вечар 21 чэрвеня 1941 г. да 24 гадзін глядзелі кінафільм. Пад раніцу, калі ўсе, акрамя дзяжурных і вартавых, спалі, пазванілі пагранічнікі і паведамілі, што гітлераўцы парушылі граніцу. А потым пачаўся артналёт на крэпасць. Першым снарадам быў забіты дзяжурны па роце, другім зачапіла нары, запальны разарваўся пасярод памяшкання. Многа забітых і параненых, а потым снарады ляцелі ўжо бесперапынна. Тыя, хто застаўся ў жывых, у тым ліку і я, кінуліся ў падвал. Артабстрэл працягваўся гадзіны дзве. Калі развіднела, стральніна спынілася. Да нас у падвал спусціўся камандзір роты Зібнеў, аддаў каманду ўзяць зброю і заняць месцы каля амбразур.

Углядаюся і бачу, што да рэчкі Мухавец сцяной рухаецца варожая пяхота, каб фарсіраваць раку. Дружным агнём мы адбілі атаку, на месцы бою засталося шмат варожых трупаў. А потым наляцелі нямецкія самалёты. Ішлі яны хваля за хваляй. А потым зноў атака пяхоты. Камандзір палка маёр Гаўрылаў у гэты час наводзіў парадак на лініі абароны. Яго прысутнасць і бясстрашша натхнялі ўсіх нас. Пасля налёту авіяцыі я заўважыў 3 нямецкія танкі, над прыкрыццём якіх рухалася пяхота. Адзін танк мы падбілі, 2 павярнулі назад. Мы з сяржантам (прозвішча яго не памятаю) атрымалі загад устанавіць тэлефонную сувязь з суседнім палком. Пры выкананні загаду сяржант быў забіты, у мяне на плячах асколкам снарада пашкодзіла катушку з кабелем.

Потым па загаду камандзіра роты Зібнева мы бралі са склада мяшкі з мукой і рабілі ўкрыцце для кулямётаў і людзей. Пяцёра сутак абаранялі рубеж.

А пасля наша рота атрымала загад фарсіраваць раку Мухавец. З намі быў камандзір роты Зібнеў, сібірак, чалавек валявы, смелы, адважны, каманды аддаваў дакладныя. Мы пераплылі раку і паспрабавалі адбіць фашыстаў ад моста. Вораг адкрыў шалёны агонь. Давялося павярнуць назад у крэпасць. Налёты варожай авіяцыі не спыняліся ні на адзін дзень. Цераз мост нам прабрацца так і не ўдалося. Вораг, відаць, нас абышоў.

На адзінаццаты або дванаццаты дзень вайны (дакладна не памятаю) мы атрымалі загад пераплысці Мухавец і разведаць сілы ворага. Уплаў учатырох перабраліся на другі бераг. Калі вярталіся назад, наткнуліся на гітлераўцаў і пасля жорсткага бою трапілі ў палон. Нас загналі ў нейкі хлеў, замкнулі, там было многа жанчын і дзяцей. Зібнеў сказаў, што трэба любымі сродкамі вырвацца. Падкапаліся пад сцяну. Зібнеў, я і яшчэ чалавек дзесяць з намі ўцяклі з хлява. Пры падыходзе да рэчкі мы натрапілі на варожую засаду. Шэсць чалавек было забіта, а я, хоць і быў паранены, застаўся ў жывых. Аб сваім бясстрашным ротным Зібневе з таго моманту і да гэтага часу нічога, на жаль, не ведаю...

У ліпені 1941...

З дзённікавых запісаў А. Я. Слуцкага

Андрэй Яфімавіч Слуцкі нарадзіўся ў 1917 г. ў сяле Багадухаўка Чарнабаеўскага р-на Чаркаскай вобл. Скончыў педтэхнікум у г. Залатаноша. У 1938 г. прызваны ў Чырвоную Армію. У 1940 г. дэмабілізаваўся і працаваў памочнікам бухгалтара ў калгасе. 28 мая 1941 г. старшыну запаса А. Я. Слуцкага прызвалі на 45-сутачныя вайсковыя зборы ў 519-ы стралковы полк. Там ён быў прызначаны камандзірам санітарнага ўзвода 3-га батальёна. У нядзелю, 22 чэрвеня 1941 г., ён пайшоў у роту мінамётчыкаў другога батальёна наведаць роднага брата Міхаіла Яфімавіча, які служыў палітруком. Хутка пачуўся сігнал баявой трывогі. Быў пастроены полк, і салдатам аб'явілі аб вераломным нападзе фашысцкай Германіі. Вечарам 28 чэрвеня пешым парадкам полк рушыў з летніх лагераў. Атрымалі боепрыпасы, харчаванне і накіраваліся на фронт. Хутка полк прыбыў на Быхаўшчыну і заняў агнявыя пазіцыі ў раёне Хатоўня — Іскань. Воін вёў дзённікавыя запісы. Калі фашысты ўзялі ў палон кантужанага Слуцкага, у яго ўжо не было ў кішэнях нічога — фатаграфіі, дакументы, дзённік Андрэй Яфімавіч закапаў пад куст бульбы. Іх потым знайшла настаўніца Марыя Якаўлеўна Дварэцкая і захоўвала да канца вайны. Пасля адаслала іх на радзіму воіна. Родны брат А. Я. Слуцкага палітрук роты Міхаіл Яфімавіч Слуцкі загінуў у тых цяжкіх баях за вёску Іскань. А Андрэй Яфімавіч вярнуўся з вайны ў родную Багадухаўку. Працаваў бухгалтарам, потым сакратаром у мясцовай школе. Памёр у 1986 г.

...Занялі абарону на палях вёскі Іскань. Першы і другі батальёны размешчаны да самай Хатоўні. Цэлы дзень нічога не елі. На лінію абароны немагчыма дастаўляць харчаванне. У ноч на 20 ліпеня фашыст спрабаваў некалькі разоў атака-

Бобруйский районный историко-краеведческий музей

ваць нас, але страціў многа забітымі і параненымі. Ёсць страты і ў нас. Але мы не адступілі.

22 ліпеня 1941 года. Ноч прайшла добра, пакуль ва ўзводзе ўсе жывыя, некалькі лёгкапараненых. Уранку немец зноў пайшоў у наступленне. Пачалася моцная артылерыйская падрыхтоўка. Няспынныя разрывы снарадаў і мін не давалі падняць галаву. Стаяў суцэльны дым і пыл. Карыстаючыся дымавой заслонай, наш санузвод дзейнічаў на перадавой, выносілі параненых. Наша артылерыя ад Хатоўні сваім агнём штурмавала нямецкую лінію абароны.

23 ліпеня. З раніцы немцы пачалі артылерыйскі і мінамётны абстрэл. У адказ адкрывала агонь наша артылерыя.

Да позняга вечара рабілі перавязкі. Калі сцямнела, з поля бою прынеслі ў Іскань палітрука, пахавалі каля школы...

25 ліпеня 1941 года. Усю ноч вывозілі параненых, адпачыць давялося гадзіны паўтары. Ідзе дождж. З раніцы зацішша. Мы трымаемся, але лінія абароны перасунулася бліжэй да Іскані. Стральба ўзмацнілася. Вечарам падышло падмацаванне. Частка мясцовых, частка з Краснадарскага краю.

26 ліпеня. Субота. Начаваў наш санузвод у Іскані. Яшчэ не развіднела, як немцы пайшлі ў наступленне. Узвод накіроўваецца на перадавую. Тут сустрэў роднага брата Міхаіла, палітрука мінроты.

27 ліпеня. У вёсцы Іскань пажары. Становішча наша пагоршылася. У 2 гадзіны дня немцы пайшлі ў наступленне. У іх было больш людзей і тэхнікі. На левым і правым флангах немцы прарваліся. Пад прыкрыццём нашых гармат і мінамётаў адступаем на Журавічы.

На аўтамашынах, матацыклах немцы нарэшце ўварваліся ў Іскань. Але далей не прасунуліся ні на крок. Заняўшы акопы і траншэі нашых войск, устанавілі тут артылерыю. Вядуць агонь са сваіх гармат. Мы стаім насмерць...

З успамінаў Кандрата Іванавіча Мяркулава, былога начальніка артылерыі 771-га стралковага палка 137-й стралковай дывізіі

Раніцай 12 ліпеня 1941 г. наш полк займаў абарону каля в. Серадзінная Буда. Тут праціўнік высадзіў дэсант. Для знішчэння яго былі кінуты першы батальён, кавалерыйскі эскадрон і палкавыя батарэі. Амаль увесь дэсант быў знішчаны, некалькіх фашыстаў захапілі ў палон. Сярод іх асабліва запомніўся высокі рыжы яфрэйтар з закасанымі рукавамі. У яго планшэце ляжала карта, на якой стрэлкамі былі абазначаны маршруты на Маскву. Яфрэйтар на пытанні не адказваў, а толькі вадзіў па карце алоўкам у напрамку Масквы і крычаў: «Москаў капут!», «Сталін капут!», «Рус капут!»

На досвітку наступнага дня полк з баямі

А. Я. Слуцкі.

К. І. Мяркулаў.

выходзіў на рубеж Серадзінная Буда і Чырвоны Асавец. На гэтым участку завязаўся гарачы няроўны бой. Танкі праціўніка рваліся ўперад, а за імі на бронетранспарцёрах рухалася пяхота. Нашы артылерысты ўступілі ў адзінаборства з ворагам. Трапна стралялі байцы з дывізіёна капітана Манамарова, батарэі Пахлябаева, Гарбушына, Цярэшчанкі, ствараючы магутную агнявую перашкоду праціўніку. Аднак вораг упарта паўтараў атаку за атакай. Нашы воіны праяўлялі цуды стойкасці, мужнасці і храбрасці. Пехацінцы з першай роты капітана Асадчага ў час танкавай атакі ўзбіраліся на танкі праціўніка, закрывалі плашч-палаткамі назіральныя шчыліны, аблівалі варожыя машыны гаручым і падпальвалі.

У крытычны момант, калі быў забіты кулямётчык, камандзір кулямётнай роты лейтэнант Паўлаў, які быў паранены ў галаву, лёг за кулямёт. Трапным агнём ён адбіў атаку і з невялікай групай байцоў кінуўся ўперад і захапіў варожы бронетранспарцёр з буйнакаліберным кулямётам. Бой першага дня быў выйграны.

Ледзь мінула ноч, як наша артылерыя і мінамёты адкрылі агонь па размяшчэнню праціўніка. Але і на нашы баявыя парадкі пасыпаліся снарады і міны, а праз некалькі мінут на полі зноў паказаліся танкі, самаходкі і транспарцёры з пяхотай. Вораг сканцэнтраваў асноўны ўдар на нашым флангу. На вялікай скорасці на наш назіральны пункт імчаўся танк. Радавы Чайка са звязкай гранат кінуўся яму насустрач. Некалькі напружаных секунд — і мы ўбачылі, як танк падскочыў, апісаў круг і спыніўся. Дзве нашы гарматы адкрылі агонь і падпалілі яго. З люка выскачылі гітлераўцы. Сяржант Радзюк і радавы Савін расстралялі іх з аўтаматаў.

Надвячоркам пад прыкрыццём агню з усіх відаў зброі мы пачалі наступленне. Праціўнік пачаў адыходзіць. Асабліва паспяхова наступаў трэці батальён капітана Гарбунова. Праз гадзіну

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

нашы падраздзяленні наблізіліся да в. Чырвоны Асавец. Адтуль выскачыла нямецкая легкавая аўтамашына. Каля яе ўзарвалася некалькі снарадаў, выпушчаных нашай палкавой батарэяй. Машына спынілася. Нашы разведчыкі кінуліся да яе і захапілі. Праз некалькі мінут камандзір узвода разведкі прынёс некалькі скураных партфеляў, у якіх знаходзіліся ваенныя паперы і стратэгічныя карты.

Два дні полк вёў бой са значна пераўзыходзячымі сіламі гудэрыянаўскіх часцей. Знішчыўшы каля пяцідзесяці танкаў, самаходных гармат і транспарцёраў, каля двухсот салдат і афіцэраў, мы да зыходу другога дня занялі Чырвоны Асавец. А асобныя падраздзяленні выйшлі ў раён в. Сідаравічы і прасоўваліся да Дняпра. 624-ы стралковы полк, які наступаў справа, паспяхова авалодаў Будай.

У Чырвоным Асаўцы мы з палітруком Навумавым звярнулі ўвагу на абгарэлы танк праціўніка. Недалёка ад яго ляжаў абпалены чырвонаармеец. Ён загінуў, але ворага не прапусціў. Мы зняліся каскі, аддаючы даніну ўдзячнасці яго подзвігу...

З успамінаў Восіпа Сямёнавіча Ярошкі, жыхара в. Чырвоны Асавец

Гэта было 12 ліпеня 1941 г. На ўскраіне вёскі Рыжкаўка, каля балотца Крачык, заросшага хвойнікам, размясцілася артылерыйская батарэя адной з часцей 45-га стралковага корпуса. Яна рыхтавалася сустрэць агнём наступаўшага ворага. На дарозе Рыжкаўка — Красніца спачатку з'явіўся нямецкі матацыкліст, а потым цэлая калона танкаў. Батарэя адкрыла агонь. Ад першых жа снарадаў узляцеў у паветра матацыкліст, спыніліся і закруціліся на месцы некалькі падбітых фашысцкіх танкаў. А адзін з снарадаў трапіў прама ў аўтамашыну, у якой ехаў якісьці военачальнік. Фашысты адкрылі агонь. Пачаўся жорсткі бой жменькі савецкіх байцоў з танкавай часцю. Сведкай яго сталі многія жыхары Рыжкаўкі. На полі бою засталося многа забітых нямецкіх салдат і афіцэраў, падбітай тэхнікі. Чырвонаармейцы-артылерысты біліся з ворагам да апошняга патрона. Сярод іх была жанчына, медык. Кінутай з-за ўкрыцця бутэлькай з гаручай вадкасцю яна падпаліла нямецкі танк, а потым забіла з пісталета афіцэра, які выскачыў з палаючай машыны. З такой жа мужнасцю змагаліся і іншыя. Лейтэнант-артылерыст заняў абарону ў пустой хаце. Ад яго трапных выстралаў знайшоў магілу не адзін фашыст. Ворагі ніяк не маглі ўзяць храбрага лейтэнанта. Тады яны зайшлі з тылу і падпалілі хату. Афіцэр-герой згарэў, але ворагу жывым не здаўся. Гэтак жа паступіў і радавы чырвонаармеец, які засеў у другой пустой хаце. Каля дарогі ў кювеце малады лейтэнант з перабітай нагой біў ворага, пакуль хапіла патронаў, а апошні пакінуў сабе.

Вось так гераічна і самааддана абаранялі савецкія байцы нашу зямлю. Толькі цяжкапараненыя трапілі ў рукі ворагаў. Раз'юшаныя фашысты расстралялі іх групамі і на адным тут жа, у Рыжкаўцы.

15 радавых байцоў і малодшых камандзіраў пахаваў жыхар вёскі А. Д. Рабычын. Ён узяў іх дакументы, але яны не захаваліся, згарэлі разам з хатай. Каля хаты Е. Е. Шылікава фашысты расстралялі пяць чырвонаармейцаў і сярод іх тую мужную жанчыну ў медыцынскай форме. Яна ішла на расстрэл з горда ўзнятай галавой і ў перадсмяротную хвіліну крыкнула: «Памятайце, вораг будзе пераможаны!»

Генерал Магон

Эрман Якаўлевіч Магон нарадзіўся 15.10.1898 г. ў Кулдзігскім раёне Латвійскай ССР. У 1919 г. добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, у складзе 2-й латышскай дывізіі мужна змагаўся за ўладу Саветаў. Член КПСС з 1921 г. У 1924 г. яго накіравалі на вучобу ў ваенную акадэмію. Камандаванне дало яму такую характарыстыку: «Добры страявік, з незвычайнай працаздольнасцю, шырокай і разумнай ініцыятывай. У любой абстаноўцы свабодна і хутка разбіраецца. Валодае здольнасцю ўмела падысці да чырвонаармейцаў, любімы імі. Цвёрды партыец. Просты, дысцыплінаваны, патрабавальны камандзір».

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Э. Я. Магон камандаваў 45-м стралковым корпусам, які стаяў у Чарнігаве. Быў атрыманы загад выйсці да Дняпра і тут сустрэць ворага, а дакладней, трэба было абараняць усходні бераг Дняпра на фронце Баркалабава — Новы Быхаў і не дапусціць пераправы гітлераўцаў цераз раку. Пачаліся жорсткія баі. Воіны корпуса не толькі адбівалі атакі ворага, але і контратакавалі. Так, 8 ліпеня 1941 г. разведатрад 187-й стралковай дывізіі захапіў паўночную ўскраіну г. Быхава. 9 ліпеня часці гэтай жа дывізіі выбілі фашыстаў з Новага Быхава. Але вораг падцягваў сілы. Таму новая контратака ў раёне Быхава не ўдалася (тут быў асноўны ўчастак фарсіравання Дняпра, вызначаны Гудэрыянам для 24-га танкавага корпуса). 10 ліпеня ў 10 гадзін 30 мінут пачалося фарсіраванне Дняпра гітлераўцамі на поўдзень ад Быхава і ў раёне Баркалабава.

Да 13 гадзін групе нямецкіх танкаў і бронемашын удалося прарвацца праз наш пярэдні край і авалодаць вёскамі Следзюкі і Сідара-

Быховский районный историко-краеведческий музей

вічы. У гэтай складанай абстаноўцы Эрман Магон не толькі праяўляў уменне кіраваць войскамі, але і ўласны гераізм: у крытычны момант бою ён стаў да гарматы і ва ўпор расстрэльваў фашысцкія танкі, што прарваліся цераз мост. Часці 187-й стралковай дывізіі абаранялiся на фронце ў 70 км. Дывізія за 10 гадзін баёў панесла вялікія страты, але байцы мужна змагаліся з ворагам на новым рубяжы: Сідаравічы — Грудзінаўка — Рыжкаўка — Сутокі.

Знаходзячыся ў раёне Грудзінаўкі з аператыўнай групай штаба, Э. Я. Магон трапіў у акружэнне. Але ён хутка падрыхтаваў прарыў і здзейсніў яго.

Неяк праязджаючы ноччу праз вёску, генерал заўважыў групу нямецкіх разведчыкаў. «Нельга дазваляць вылюдкам беспакарана гуляць на нашай зямлі»,— сказаў ён байцам, якія суправаджалі яго, і рвануўся ў атаку. Ад яго гранаты было забіта трое фашыстаў, байцы застрэлілі яшчэ пяцёра.

У баях на Дняпры, Сажы пад Крычавам і Рослаўлем, у час абароны і контратак, выхаду з акружэння Э. Я. Магон вёў сябе надзвычай мужна, спакойна, быў прыкладам для салдат.

Э. Я. Магон.

Л. А. Цітова (Сідарава).

За ўмелае кіраўніцтва войскамі, за асабістую мужнасць, праяўленую ў баях на Быхаўскім плацдарме, Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 9.8.1941 г. Э. Я. Магон быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

Загінуў генерал Магон 11.9.1941 г. каля в. Малашкавічы Клімавіцкага раёна.

Сямёра з Ветранкі

Камсамольцы Раман і Станіслаў Багінскія, Васіль Квартальны, Віктар і Леанід Безабразавы, Зося Лабкоўская, Ліда Цітова з вёскі Ветранка ў першыя ж дні акупацыі сталі памочнікамі нашых байцоў і камандзіраў, якія выходзілі з акружэння і імкнуліся прарвацца праз лінію фронту. Адна з груп, каля 120 чалавек, на чале з камандзірам 61-га корпуса генерал-маёрам Ф. А. Бакуніным ішла з-пад Магілёва. Сярод байцоў быў параненыя. Чырвонаармейцы спыніліся ў лесе каля Ветранкі на кароткі адпачынак. Камсамольцы насілі байцам харчы, медыкаменты. Аднойчы «баця», так называлі яны паміж сабой Ф. А. Бакуніна, паклікаў Зосю Лабкоўскую і Ліду Цітову і папрасіў разведаць шлях да Сожа. Дзяўчаты накіраваліся ў в. Гайшына да свайго знаёмага, які паабяцаў да месца пераправы прыгнаць некалькі чаўноў. Разам з байцамі пайшлі на ўсход і сямёра ветранскіх камсамольцаў. Ішлі праз вёскі Смаліца, Кульшычы, днём перачакалі ў лесе, а ноччу ўдала пераправіліся цераз Сож. І зноў Ліда і Зося пад выглядам жабрачак ішлі ў разведку, каб знайсці далейшы, менш небяспечны шлях. Часам на шляху групы сустракаліся склады, абозы, варожыя гарнізоны, якія нельга было абысці, і тады байцы іх знішчалі.

Засталіся ззаду родныя прасторы Беларусі, рэкі Сож, Іпуць, з дзесятак малых рэк. Наперадзе была Дзясна. Каля в. Стружанка дзяўчаты разведалі падыходы да чыгуначнага моста цераз раку, а ноччу дыверсійная група і група прыкрыцця былі на чыгунцы. Пад раніцу паляцеў пад адхон варожы эшалон. У час гэтай аперацыі загінуў Раман Багінскі, першы з ветранскай сямёркі. Шмат было праведзена аперацый, у якіх камсамольцы-ветранцы праявілі сапраўдны гераізм. Аб гэтым сведчыць і баявая характарыстыка Лідзіі Цітовай, падпісаная Ф. А. Бакуніным: «Цітова Лідзія Аляксандраўна з ліпеня па снежань 1941 года знаходзілася ў баявой групе савецкіх байцоў. За гэты час яна праявіла сябе дысцыплінаваным, смелым і мужным воінам, выканала рад адказных баявых заданняў. У баях вяла сябе смела і стойка. Неаднаразова хадзіла ў разведку і прыносіла вельмі каштоўныя звесткі аб праціўніку. Пры яе дапамозе былі арганізаваны пераправа цераз Сож, падрыў мастоў на чыгунках і шашэйных дарогах, разбураны лініі сувязі і г. д...»

Снежаньскай ноччу 1941 г. пад градам куль і снарадаў група Бакуніна прарвалася да «зброевай майстэрні Расіі» — Тулы. У час прарыву загінуў Вася Квартальны. Пазней смерцю храбрых загінулі на фронце Віктар і Леанід Безабразавы. Толькі пасля вайны вярнулася на родную Быхаўшчыну Ліда Цітова (Сідарава), стала працаваць на торфабрыкетным заводзе «Дняпроўскі».

Быховский районный историко-краеведческий музей

Партызанскі фронт

10 і 11 ліпеня 1941 г. 24-ы матарызаваны корпус ворага фарсіраваў Дняпро, і на наступны дзень гітлераўцы пачалі займаць левабярэжную частку раёна. Жорсткія баі за пераправы пакінулі цяжкі след на быхаўскай зямлі — яна ляжала знявечаная супрацьтанкавымі равамі, траншэямі, варонкамі бомбаў і снарадаў, сярод вывернутых дзотаў і разбураных бліндажоў.

Доўгі час Быхаўшчына заставалася франтавым перакрыжаваннем нямецкіх войск. Да сярэдзіны жніўня яе запаўнялі палявыя пяхотныя, артылерыйскія войскі, аўтатранспартныя калоны, будаўнічыя батальёны, аэрадромныя і лётныя часці. Тэрыторыя раёна да самага вызвалення знаходзілася ў межах армейскага тылу групы армій «Цэнтр».

Паводле загаду Гітлера ад 17 ліпеня 1941 г., уся паўната ўлады на акупіраванай тэрыторыі належала ваеннаму камандаванню. Яшчэ адным загадам, выдадзеным у той жа дзень, паліцэйская ахова тэрыторый ускладалася на рэйхсфюрэра Гімлера. Паўсюдна насаджаўся акупацыйны апарат, тэрор і грабеж. Каб кантраляваць і трымаць у страху насельніцтва, акупанты асталявалі свае гарнізоны ў Быхаве, вёсках Гарадзец, Студзёнка, Мокрае, па два-тры паліцэйскія гарнізоны ў валасцях і іншых буйных населеных пунктах. Стварылі таксама два мабільныя карныя атрады, якія размясцілі ў Быхаве і ў в. Чачэвічы. Зімой 1941 г. быхаўскі гарнізон папоўніўся мадзьярамі (160 чалавек), а ў 1942 г. ў раён аэрадрома перабазіраваўся 2-і палявы вучэбны полк ВПС.

Рэпрэсіі пачаліся адразу. Гітлераўцы абрушылі іх перш за ўсё на партыйна-савецкі актыў і патрыётаў, якія не жадалі супрацоўнічаць з акупантамі. Першымі іх ахвярамі сталі старшыня калгаса вёскі Уюн Сцепанцоў, які ахоўваў калгаснае дабро ад ворага, настаўнік Апейка. Ад рук карнікаў загінулі сакратар Быхаўскага райкома партыі Серы, старшыня Навабыхаўскага сельсавета Дзмітрый Альховік і інш. У верасні карнікі сагналі жыхароў в. Студзёнка ў цэнтр і на іх вачах павесілі 7 савецкіх воінаў. Чырвонаармейцы адсталі ад сваіх часцей у раёне Слоніма. Група пад камандаваннем афіцэра 121-й стралковай дывізіі (прозвішчы не ўстаноўлены) выходзіла на ўсход, пападаючы на невялікія падраздзяленні, адзіночныя машыны. Чырвонаармейцы былі акружаны і разбіты, а 7 воінаў захоплены ў палон.

Восенню 1941 г. нямецкія ўлады аднавілі дэманціраваны перад акупацыяй раёна шклозавод у в. Ветранка. На работу зганялі мясцовых жыхароў, акружэнцаў, што жылі ў вёсцы, палонных. Па меры знаёмства расла салідарнасць рабочых. У канцы лютага 1942 г. 28 рабочых, пераважна былыя ваеннаслужачыя, сабраліся на сход каля в. Смаліца, каб абмеркаваць пытанне аб партызанскай барацьбе. 27 красавіка з надыходам веснавога цяпла ў лес выйшла першая група ваеннаслужачых з 6 чалавек: лейтэнант Я. А. Курпачэнка, слухач вышэйшых афіцэрскіх курсаў у г. Вінніца, камуністы Е. С. Арцёменка, П. А. Кабушкін з Яраслаўля, Фёдар Парыцкі з Ленінграда, Мікалай Емяльянаў з Мардовіі і Ваня (прозвішча не ўстаноўлена, мабыць, Іван Сямёнаў). З дапамогай жыхароў вёсак Дабужа, Радзькаў, Папоўка партызаны змянілі сваё зусім зношанае адзенне на новую ваенную форму, здабылі вінтоўку, 2 наганы, некалькі гранат, 500 патронаў. Група, камандзірам якой выбралі Я. А. Курпачэнку, размяшчалася ў Хачынскім лесе. Праз патрыётаў в. Грудзінаўка 1 ліпеня яны ўстанавілі сувязь з даваенным сакратаром Быхаўскага РК КП(б)Б С. Е. Падольцавым і дырэктарам Грудзінаўскай МТС А. П. Тамілам, якія былі перакінуты на самалёце па заданню ЦК КП(б)Б з савецкага тылу (загінулі 5 ліпеня 1942 г. каля в. Янава).

У красавіку штабам Заходняга фронту каля в. Дабужа была дэсантавана група з 4 чалавек, якая мела радыёстанцыю (яе ўзначальваў лейтэнант Мікалай Іваноў, ён жа Суворaў). Праз

Быхаўскі гісторыка-краязнаўчы музей. Стэнд, прысвечаны партызанскаму руху ў раёне.

Быховский районный историко-краеведческий музей

некаторы час у Хачынскім лесе з'явілася група капітана Г. І. Сазонава, таксама закінутая штабам Заходняга фронту. Пазней сюды прыйшлі група ваеннаслужачых з в. Дабужа на чале з малодшым палітруком 26-й танкавай дывізіі М. П. Фёдаравым і група патрыётаў з в. Рыжкаўка на чале з І. П. Памятнёвым, ураджэнцам в. Косцінка Магілёўскага раёна. Спачатку ўсе групы аб'ядналіся, а 18 чэрвеня 1942 г. сарганізаваліся ў атрад. Камандзірам быў выбраны старшы па воінскім званні афіцэр Г. І. Сазонаў, камісарам — батальённы камісар М. І. Палявы, начальнікам штаба — І. П. Памятнёў. Атрад меў радыёстанцыю, быў звязаны са штабам Заходняга фронту і выконваў яго заданні. Партызаны зрабілі налёт на гарнізон у в. Вейна і разбілі яго, забраўшы зброю, грузавую аўтамашыну, 12 коней. 30 чэрвеня арганізавалі засаду на групу гітлераўскіх салдат, якія рухаліся па дарозе з в. Кузькавічы на Ветранку. У баі праціўнік быў амаль поўнасцю знішчаны. У якасці трафеяў партызанам дасталіся кулямёт, аўтамат, пісталеты і патроны. Пасля гэтага бою партызаны атрада прыйшлі ў в. Ветранка. Убачыўшы іх, паліцыя і гітлераўцы разбегліся. Разам з партызанамі з вёскі пайшлі 97 рабочых завода «Ільіч». На наступны дзень з жыхароў Ветранкі быў створаны новы атрад, камандзірам якога прызначылі майстра цэха шклозавода С. П. Мардашкіна. Пры атрадзе Г. І. Сазонава стварылі шпіталь, які ўзначаліў ваенны ўрач Ю. М. Мурашоў. Праз некалькі дзён арганізаваўся яшчэ адзін атрад, ядро якога склалі партызаны групы Я. А. Курпачэнкі, вылучаныя з атрада Г. І. Сазонава, і жыхары в. Смаліца (каля 50 чалавек). Камандзірам стаў Я. А. Курпачэнка. Амаль адначасова ў Хачынскі лес з варожай блакады, што праводзілася ў Кіраўскім раёне, выйшлі 7 партызан 620-га атрада імя В. І. Чапаева. Групу ўзначальваў Фралоў. Яна папоўнілася людзьмі і зброяй з ліку мясцовых партызан і рэзерву і была афармлена ў атрад Фралова. Гэтак жа былі сфарміраваны атрады І. П. Памятнёва, І. С. Сямёнава. У жніўні 1942 г. з вылучанага асабовага складу атрада С. П. Мардашкіна аформіўся новы атрад пад камандаваннем І. П. Дзюбы. Такім чынам утварылася група аб'яднаных атрадаў на чале з галаўным атрадам пад камандаваннем Г. І. Сазонава — 1-я Быхаўская брыгада[1].

У прыкабярэжнай, заходняй частцы Быхаўскага раёна адным з першых сфарміраваўся 255-ы партызанскі атрад, месцам зараджэння якога стаў Кучынскі лес. 28 красавіка 1942 г. да в. Кучын выйшла група ваеннаслужачых — А. А. Бірукоў, М. К. Марусаў, Дз. А. Залатароў, М. А. Канстанцінаў, А. Е. Галашчапаў і інш. Гэта быў ужо згуртаваны падпольнай работай калектыў. Тут група папоўнілася па папярэдняй дамоўленасці моладдзю вёсак Кучын, Цвёрдаў, Алень, Камуна, Фрунзе (да 32 чалавек) і аформілася ў атрад, камандзірам стаў М. К. Марусаў, камісарам — А. А. Бірукоў. У хуткім часе ў атрад увайшла група камуністаў з в. Залатва: К. Л. Адасёў (Адасеў), Т. І. Ляўшынскі, І. С. Зычкоў, Г. К. Амараў і інш. Да ліпеня 1942 г. атрад называўся па прозвішчы камандзіра.

У Гарадзецкім лесе пачаў фарміравацца 425-ы партызанскі атрад. 5 мая тут з'явіліся былыя ваеннаслужачыя Ф. Ф. Сухаў, С. В. Скокаў і Г. І. Чарнышоў. Праз 2 дні яны сустрэліся з камуністамі М. П. Куракіным і І. Я. Трылесінкам, якія 24 верасня 1941 г. прыбылі з савецкага тылу па заданні ЦК КП(б)Б. Групу ўзначаліў М. П. Куракін. У ходзе баёў партызаны ўзброіліся, да іх прыйшлі акружэнцы з вёсак Лубянка, Гарадзец, а таксама групы М. В. Бабкова і партыйнага актыву на чале з К. Л. Адасёвым (перайшла з 255-га партызанскага атрада), што значна ўмацавала партызанскі калектыў. Былі створаны камсамольская і партыйная арганізацыі, павысілася баявая актыўнасць. У чэрвені 1942 г. група аформілася ў атрад. Камандзірам партызаны выбралі М. П. Куракіна (да 20 жніўня 1942 г. атрад называўся па прозвішчы камандзіра).

У Ніжнятопчыцкім сельсавеце ў канцы красавіка 1942 г. сфарміраваўся трэці партызанскі атрад на правабярэжжы Быхаўшчыны, які з 20 жніўня стаў называцца 810-м. У вёсках Вялікі Лес і Жыліхаўка жылі члены групы партыйна-савецкага актыву В. Ц. Гадунцоў, М. Л. Максімаў (псеўданім Лебедзеў), І. К. Казлоў, Павел Шэйбус, Леанід Лістраценка (загінуў), Арцёменка і інш. Вясной вакол іх згуртаваліся патрыёты. Збіраць узбраенне камуністу Арцёменку дапамагалі браты Дзмітрый і Павел Гадунцовы, Леанід і Сева Навумавы, Андрэй Барадзіноў, Дзмітрый Аўсяннікаў і інш. (у канцы мая атрад налічваў паўсотні добра ўзброеных байцоў). Атрад хутка рос, аднак стварыць моцную баявую адзінку доўга не ўдавалася — спачатку з яго ў атрад «Другія» (камандзір П. П. Качуеўскі) перайшлі 13 партызан, 2 ліпеня яшчэ 46 чалавек далучыліся да роты капітана М. П. Каленчанкі, які збіраўся ісці за лінію фронту.

Першыя партызанскія групы і дробныя атрады спачатку дзейнічалі разрозненa, у адпаведнасці са сваімі сіламі, не мелі сувязі з партыйнымі і аператыўнымі органамі кіраўніцтва. На пачатку барацьбы партызанскія групы накіроўвалі свае дзеянні ў аспоўным супраць паліцыі і іншых здраднікаў, а таксама супраць дробных гарнізонаў праціўніка, яго парыхтоўчых пунктаў і рабочых камand.

Група М. П. Куракіна пачала партызанскія

[1] Назва ўмоўная — для вызначэння дакладнай арганізацыйнай формы гэтай групы аб'яднаных атрадаў патрабуецца дадатковы дакументальны матэрыял.

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

Партизан Быховщины

ПАРТИЗАН, КРЕПЧЕ БЕЙ ЗВЕРЯ-НЕМЦА!

Начало освобождение Белоруссии

Молодцы, подрывники!

Газета «Партизан Быховщины» Быхаўскага падпольнага райкома КП(б)Б.

дзеянні 5 чэрвеня 1942 г. нападзеннем на малочны пункт у в. Глухі. Былі разбіты прыёмны і вытворчыя цэхі, сепаратары, сапсавана кала тоны сыру, каля 10 тысяч яек, знішчана дакументацыя. Праз 2 дні такую ж аперацыю здзейснілі партызаны атрада М. К. Марусава ў в. Лубянка, дзе таксама быў знішчаны малочны пункт. 10 чэрвеня Ф. Ф. Сухаў з двума таварышамі разагналі паліцыю ў в. Гарадзец, забілі іх начальніка, вызвалілі арыштаваных.

Атрады М. П. Куракіна і М. Л. Максімава-Лебедзева на працягу лета разагналі паліцыю і невялікія варожыя гарнізоны акупантаў у шэрагу вёсак правабярэжнай часткі, а таксама ў суседніх раёнах.

Аднак больш актыўна развіваліся падзеі ва ўсходняй, левабярэжнай частцы раёна, дзе смела і рашуча дзейнічалі партызаны 1-й Быхаўскай партызанскай брыгады (да пачатку верасня 1942 г. брыгада налічвала каля 750 партызан, мела рэзерв, сямейныя лагеры). На ўзбраенні партызан былі вінтоўкі, аўтаматы, 5 станковых, 47 ручных кулямётаў, 2 пушкі, гарматы, больш за 300 снарадаў да іх, 12 мінамётаў. Баявыя дзеянні атрады вялі ў асноўным на шашэйных і грунтавых дарогах у Быхаўскім, Слаўгарадскім, Чавускім, Чэрыкаўскім, Рагачоўскім раёнах. Яны ліквідавалі ў 27 населеных пунктах невялікія ваенныя гарнізоны, паліцэйскія пасты і валасныя ўправы. З засад знішчылі каля 200 аўтамашын з рознымі грузамі, 13 мастоў. У жніўні 1942 г. ў ходзе аперацыі разгромілі адначасова 2 нямецкія гарнізоны — у вёсках Ніканавічы і Кузькавічы. Атрады Г. І. Сазонава і частка партызан атрадаў І. С. Сямёнава, І. П. Дзюбы напалі на гарнізон вёскі Ніканавічы і штаб вайсковай часці, які спыніўся ў вёсцы напач. Пасля працяглага бою гарнізон і штаб былі разгромлены. Атрады С. П. Мардашкіна і Я. А. Курпачэнкі ў той самы дзень разгромілі нямецкі гарнізон у в. Кузькавічы. На чыгунцы дыверсійныя групы атрадаў падарвалі 7 эшалонаў праціўніка. Партызаны атрада С. П. Мардашкіна збілі варожы самалёт каля в. Красніца. Непадалёку ад Быхава знаходзіўся дзеючы аэрадром, дзе адначасова базіравалася 45—50 самалётаў. Аднойчы, па даных партызанскай разведкі, наша авіяцыя зрабіла налёт на гэты аэрадром і знішчыла больш як 25 самалётаў.

У канцы ліпеня 1942 г. ў Быхаўскім раёне дзейнічала 9 атрадаў, агульная колькасць партызан не перавышала 900 (без рэзерву і не ўлічваючы 253-ы атрад, які перайшоў у Рагачоўскі раён).

З ростам і арганізацыйным умацаваннем партызанскага руху народныя мсціўцы пашыралі рамкі баявых дзеянняў, выцясняючы праціўніка з «забытых» ім тэрыторый. Перанос партызанскіх баявых аперацый летам 1942 г. на транспартныя камунікацыі стварыў рэальную пагрозу зрыву ваенных перавозак па чыгуначных і шашэйных дарогах. Немалы ўрон быў нанесены эканамічнай палітыцы акупантаў. Вымушаныя перайсці пад ударамі партызан у буйныя гарнізоны, яны пазбаўляліся значнай часткі сельскай тэрыторыі, трацілі кантроль над насельніцтвам. На вызваленай тэрыторыі былі гаспадарамі партызаны. Сяляне, абапіраючыся на ўзброеную падтрымку партызан, праяўлялі акты масавага сабатажу — ухіляліся ад сельгаспаставак, працоўнай павіннасці, актыўна дапамагалі партызанам усім неабходным. Тыл нямецкай арміі станавіўся вельмі неспакойным і нестабільным. Для яго аховы камандаванню даводзілася адцягваць усё больш і больш сіл з фронту.

Каб засцерагчы ад небяспекі тылавы раён групы армій «Цэнтр», нямецкае камандаванне правяло супраць партызан Клічаўскай зоны, якая ахоплівала вялікую тэрыторыю, дзве буйныя карныя аперацыі: «Майскі жук» і «Арол». У аперацыі «Майскі жук» (1—19 ліпеня) удзельнічалі войскі 203-й ахоўнай дывізіі, батальёны «Ост», «Днепр», «Беразіна», у аперацыі «Арол» (2—7 верасня) — 286-я ахоўная дывізія, два артдывізіёны, узмоцненыя каманды тайнай паліцыі і СД, 2-і паліцэйскі полк, спецкаманды па захопу рабочай сілы і

Быховский районный историко-краеведческий музей

дзве гаспадарчыя каманды для вывазу нарабаванай маёмасці.

Галоўны ўдар карнікі накіравалі супраць Клічаўскага злучэння (з 2 верасня 1942 г. Клічаўскі аператыўны цэнтр), якім камандаваў палкоўнік У. І. Нічыпаровіч, камандзір 208-га атрада імя І. В. Сталіна. У Быхаўскім раёне ў разгар карнай аперацыі «Майскі жук» 13 ліпеня каля вёсак Кучын, Брадок і Лубянка з'явілася ўзмоцненая рота карнага батальёна Барчыка. Аб'яднаўшы свае намаганні, атрады М. П. Куракіна і М. К. Марусава арганізавалі абарону. У гранічна напружаным баі партызаны забілі 23 карнікаў, многіх паранілі, захапілі стралковую зброю. Пасля бою на даносу здрадніка карнікі арыштавалі і павесілі ў Быхаве старасту в. Рэзкі Ягора Сталярова, які актыўна дапамагаў партызанам і насельніцтву. У далейшым Быхаўскія атрады імкнуліся ўхіляцца ад сустрэч з праціўнікам. Атрад М. К. Марусава перайшоў у Рагачоўскі раён, дзе аб'яднаўся з атрадам Рагачоўскага падпольнага райкома партыі. Атрады М. П. Куракіна і М. Л. Максімава пэўны час хаваліся ў быхаўскіх і клічаўскіх лясах, дзе 20 жніўня былі падпарадкаваны аператыўнаму кіраўніцтву галаўнога 208-га атрада імя І. В. Сталіна з прысваенням ім адпаведна нумароў 425-ы і 810-ы. Яшчэ раней, 18—21 ліпеня, атрад М. К. Марусава пад нумарам 255 таксама быў падпарадкаваны кіраўніцтву 208-га партызанскага атрада. Перад атрадамі была пастаўлена задача перанесці асноўныя намаганні на зрыў варожых перавозак у раёне Быхава, Рагачова і Жлобіна.

У левабярэжнай частцы раёна карная экспедыцыя супраць партызан пад кодавай назвай «Паўночнае мора» пачалася 2 верасня. Гітлераўцы сканцэнтравалі тут войскі 14-га палка СС і паліцыі, батальён «Днепр» і іншыя падраздзяленні. Галоўны ўдар нацэльваўся на партызан у Хачынскім лесе, дзе, акрамя партызан 1-й Быхаўскай брыгады, знаходзіўся 620-ы атрад імя В. І. Чапаева (камандзір М. С. Міхалап), які толькі што прыбыў. Першае сутыкненне з ворагам адбылося 4 верасня. Раніцай на дарозе з Быхава ў в. Ветранка паказаўся перадавы атрад карнікаў на грузавых машынах у суправаджэнні лёгкага танка. Другая калона карнікаў рухалася ў бок в. Дабужа. З'яўленне праціўніка для партызан было нечаканым. Пасля кароткіх, не звязаных паміж сабой абарончых баёў атрады пакінулі свае базы і пачалі самастойна адыходзіць за р. Проня, потым — у Клятнянскія лясы, дзе атрады Г. І. Сазонава і І. П. Дзюбы засталіся ў падпарадкаванні штаба Заходняга фронту, атрымалі загад перадыслацыравацца ў новыя раёны дзеяння. Атрады Фралова, І. Ц. Сямёнава, С. П. Мардашкіна, І. П. Памятнёва ў Клятнянскіх лясах у канцы кастрычніка — лістападзе 1942 г. ўліліся ў партызанскае злучэнне чарнігаўскіх партызан на чале з А. Ф. Фёдаравым. Атрад Я. А. Курпачэнкі пасля бою з карнікамі каля в. Дабужа да сярэдзіны верасня знаходзіўся ў Хачынскім лесе, потым атрымаў заданне рухацца на злучэнне з асноўнымі сіламі ў Клятнянскі раён. У дарозе атрад раздзяліўся — адна частка пайшла ў Клятнянскі раён, дзе таксама ўлілася ў злучэнне А. Ф. Фёдарава. Другая на чале з камандзірам Курпачэнкам і начальнікам штаба М. П. Фёдаравым вярнулася ў Хачынскі лес. Тут яна сустрэлася з групай капітана Ф. С. Тарасевіча, што адлучылася ад 620-га атрада імя В. І. Чапаева. Групы накіраваліся ў Клічаўскі аператыўны цэнтр для атрымання новых заданняў, у дарозе аб'ядналіся ў атрад, які быў уключаны ў Клічаўскі аператыўны цэнтр пад нумарам 760.

Наступала другая ваенная зіма, а з ёй — нялёгкае выпрабаванне для партызан ва ўмовах ляснога жыцця. Засталіся ззаду цяжкія летнія блакадныя баі з карнікамі. Партызаны падлічвалі свае страты. 1-я Быхаўская брыгада, разбіўшыся на невялікія падраздзяленні, многія з якіх уліліся ў атрады і злучэнні арлоўскіх і чарнігаўскіх партызан, перастала існаваць. 425-ы і 810-ы атрады знаходзіліся ў Клічаўскіх лясах побач з больш моцнымі ў баявых і арганізацыйных адносінах партызанскімі фарміраваннямі. На тэрыторыі Быхаўскага раёна не засталося ніводнай сваёй групы. Аднак сюды часта заходзілі партызанскія падраздзяленні іншых атрадаў, у асноўным з Клічаўскай партызанскай зоны, дзе існавала Савецкая ўлада, стварыліся падпольныя райкомы партыі, і кіруючы ваенны орган — Клічаўскі аператыўны цэнтр, які ахапіў сваім уплывам і Быхаўскі раён, меў пастаянную авія- і радыёсувязь са штабам Заходняга фронту і Цэнтральным штабам партызанскага руху (ЦШПР) пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Усё гэта мела вялікі палітычны рэзананс, згуртоўвала і натхняла савецкіх людзей, накіроўвала іх у адзінае рэчышча народнага партызанскага руху. Атрады пад кіраўніцтвам аператыўнага цэнтра ў 1942 г. (па падліках гісторыка П. С. Паўлаўца) разграмілі 112 варожых гарнізонаў. У другой палове лета паводле загаду камандавання Заходняга фронту ад 25 ліпеня 1942 г. аператыўны цэнтр правёў перагрупоўку партызанскіх сіл зоны. За атрадамі замацоўваліся пэўныя раёны баявых дзеянняў. Удары партызан пераносіліся на чыгунку і шашэйныя дарогі. Яны атакоўвалі чыгунку на ўчастках Барысаў — Крупкі, Асіповічы — Жлобін, Магілёў — Жлобін, поўнасцю вывелі са строю чыгунку на ўчастку Магілёў — Асіповічы. 425-ы, 810-ы і 255-ы атрады, выцесненыя праціўнікам з Быхаўскага раёна ў час блакадных баёў, атрымалі загад дзейнічаць на транспартных камунікацыях у раёнах Быхава і Рагачова. Восенню і зімой 1942—1943 гг. падрыўнікі 255-га атрада пусцілі пад адхон больш як 10 паяздоў, на ўчастку Быхаў — Жлобін у студзені 1943 г. яны падарвалі і пусцілі пад адхон 6 эшалонаў. 11 лі-

Быховский районный историко-краеведческий музей

стапада 1942 г. партызаны 620-га атрада імя В. І. Чапаева паміж раз'ездамі 15-ы і Залатое Дно падарвалі паравоз і разбілі 5 вагонаў. Вясной 1943 г. ў Быхаўскі раён заходзілі дыверсійныя групы 537-га, 539-га, 100-га, 277-га, 345-га, 128-га і 115-га атрадаў. З пачатку лютага і да 20 сакавіка 1943 г. толькі каля станцыі Тошчыца яны падарвалі або пусцілі пад адхон 11 паяздоў праціўніка з ваеннымі грузамі. 27 сакавіка і 5 красавіка ў гэтым жа месцы пусцілі пад адхон паязды падрыўнікі 277-га і 100-га атрадаў.

Партызаны 61-га атрада, які базіраваўся ў в. Падлоззе, акрамя баявых дзеянняў у Клічаўскім раёне, разбурылі масты на дарогах Лубянка — Рэзкі, Гута — Гарадзец, спалілі мост каля в. Глухская Сяліба. 9 жніўня 1942 г. ўзвод лейтэнанта Каўшыркі гэтага атрада вёў цяжкі бой з карнікамі каля в. Кучын. Гераічна абараняліся байцы, знішчылі шмат варожых салдат, аднак і самі загінулі смерцю герояў.

425-ы атрад у лістападзе 1942 г. базіраваўся ў Сіпайлаўскім лесе Бялыніцкага раёна, дзе быў уключаны ў 6-ю Магілёўскую брыгаду. Удзельнічаў у разгроме гарнізонаў у вёсках Падзевічы, Вендараж, Вугольшчына, на торфазаводзе Ямнае. 13 красавіка ў складзе 6-й Магілёўскай брыгады ўдзельнічаў у арганізаванай аперацыі па адначасовым разгроме 8 варожых гарнізонаў, размешчаных уздоўж шашэйнай дарогі Мінск — Магілёў. Усе гарнізоны былі разгромлены, у выніку партызаны адкрылі падыход да шашы, па якой ішло інтэнсіўнае забеспячэнне войск 4-й нямецкай арміі.

Вясной 1943 г., у сувязі з рашэннем лютаўскага Пленума ЦК КП(б)Б «Аб становішчы і задачах работы партыйных органаў і партыйных арганізацый у акупіраваных раёнах Беларусі», у тыле ворага разгарнулася шырокая палітыка-масавая і арганізатарская работа. У дапамогу Магілёўскім камуністам на месцах ЦК КП(б)Б прыслаў некалькі арганізатарскіх груп, якія прайшлі курс навучання ў партызанскіх школах ЦШПР. 16 сакавіка 1943 г. на Клічаўскім аэрадроме прызямліўся самалёт з Вялікай зямлі з членам ЦК КП(б)Б намеснікам начальніка Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР) І. П. Ганенкам і арганізатарская партыйная група на чале з даваенным сакратаром Магілёўскага абкома партыі Д. Ц. Маўчанскім. Яшчэ раней, 7 сакавіка, упаўнаважаны ЦК КП(б)Б па Магілёўскай вобласці І. М. Кардовіч стварыў Быхаўскі падпольны райком партыі. Яго сакратаром быў прызначаны адзін з арганізатараў партызанскага руху ў раёне К. Л. Адасёў, а потым Е. Ц. Андрэенкаў, прысланы з савецкага тылу (з 15 лістапада 1943 г. ў сувязі з вяртаннем у савецкі тыл Е. Ц. Андрэенкава сакратаром быў зацверджаны Ф. П. Падалян). Падпольны райком выдаваў сваю газету «Партизан Быховщины» (рэдактар М. П. Куракін).

Пастановай Магілёўскага абкома партыі і загадам яго ваенна-аператыўнай групы 8 красавіка 1943 г. была створана 11-я Быхаўская партызанская брыгада. Яна аб'яднала 810-ы асобны (187 чалавек) і 425-ы (131 чалавек) атрады з 6-й Магілёўскай брыгады. 20 красавіка абодва атрады, кіраўніцтва брыгады і падпольны райком партыі злучыліся каля в. Ізбенка.

Вяртанне быхаўскіх атрадаў у свой раён азначала новы этап у развіцці партызанскага руху на Быхаўшчыне. Яны перанеслі свае базы непасрэдна ў раён баявых дзеянняў. Праз мясцовых партызан падпольны райком партыі здолеў хутка наладзіць масавую і палітычную работу сярод насельніцтва, накіраваць людзей на канкрэтную і ўсямерную дапамогу партызанам. У далейшым райком выпрацаваў шэраг пастаноў, якія вызначалі ўзаемаадносіны насельніцтва і партызан, а таксама замацоўвалі населеныя пункты за партызанскімі атрадамі. Гэта абавязвала аказваць сялянам неабходную дапамогу і забяспечваць іх ахову ад акупацыйных улад. Акрамя таго, самым найлепшым чынам вырашалася задача росту партызанскіх сіл. Аднак на першым часе брыгадзе не ўдавалася замацавацца пастаянна на адным месцы. За час адсутнасці партызанскіх атрадаў у раёне праціўнік зноў стварыў густую сетку гарнізонаў і невялікіх пастоў. Да таго ж з 3 па 7 мая 1943 г. была праведзена яшчэ адна карная аперацыя супраць партызан Клічаўскай зоны. 11-й Быхаўскай брыгадзе давялося манеўраваць у лясах Быхаўскага, Кіраўскага і Рагачоўскага раёнаў і на працягу мая 1943 г. партызаны брыгады ўвесь час знаходзіліся на маршы. У час паходу падрыўнікі брыгады праводзілі дыверсіі на дарогах, байцы атрадаў вялі баі ў засадах, тэрарызавалі праціўніка нечаканымі налётамі на гарнізоны. У баях сілы брыгады раслі, павышалася яе баяздольнасць. У маі 1943 г. падрыўнікі пусцілі пад адхон 5 эшалонаў. Былі знішчаны 2 паравозы, 6 вагонаў з жывой сілай праціўніка, 21 — з



Сцяг 11-й Быхаўскай партызанскай брыгады. Быхаўскі гісторыка-краязнаўчы музей.

Быховский районный историко-краеведческий музей

рознымі грузамі і 3 платформы з тэхнікай. Нарошчванне партызанскіх удараў зноў прымусіла працiўніка адмовіцца ад суцэльнага кантролю тэрыторыі ў раёне. Акупацыйная адміністрацыя скараціла дробныя гарнізоны, сканцэнтраваўшы ўсе сілы ў буйных апорных пунктах. Так, у ноч на 1 чэрвеня 1943 г. працiўнік вывеў свае гарнізоны з вёсак Тайманава, Новы Быхаў, Тошчыца, 15-ы раз'езд, Хамічы, Вязьма, Гарадзец, Балонаў Сяльц. Партызаны разбурылі ўмацаванні пакінутых гарнізонаў, каб вораг зноў не выкарыстаў іх у барацьбе з імі. 6 ліпеня 1943 г. брыгада авалодала чыгуначнай лініяй паміж станцыяй Тошчыца і 15-м раз'ездам, пашкодзіла 400 метраў палатна, падарвала мост і 90 рэек. Пасля гэтага сіламі 425-га атрада быў разгромлены гарнізон торфазавода Ямнае. 17 ліпеня 1943 г. Магілёўскі падпольны абком партыі прыняў пастанову аб стварэнні ваенна-аператыўнай групы (ВАГ) пры Быхаўскім падпольным райкоме партыі. У яе склад увайшлі сакратар райкома Е. Ц. Андрэенкаў, камандзір злучэння Ф. П. Падалян, начальнік штаба І. П. Федзячэнка. Пры фарміраванні ВАГ камандаванне брыгады было скасавана, а яе атрады 425-ы, 810-ы, 225-ы увайшлі ў падпарадкаванне ВАГ самастойнымі баявымі адзінкамі. Адначасова ваенна-аператыўнай групе перадаваўся 152-і атрад (у наступным у складзе ВАГ былі арганізаваны новыя 820-ы і 830-ы атрады). 425-ы, 810-ы, 152-і атрады, якія выраслі колькасна і ў баявых адносінах, былі разгорнуты ў палкі пад тымі ж нумарамі.

Летам 1943 г. на цэнтральным участку савецка-германскага фронту разгарнулася Курская бітва. З абодвух бакоў былі прыцягнуты велізарныя сілы. У сувязі з гэтым на дарогах рэзка павялічылася напружанасць грузавых патокаў. Вораг выкарыстоўваў чыгуначныя, шашэйныя і грунтавыя дарогі Магілёўскай вобласці для падвозу і перагрупоўкі жывой сілы, тэхнікі і сродкаў матэрыяльнага забеспячэння войск 4, 9, 2-й палявых і 2-й танкавай армій. Для аховы ваенных транспартаў ад удараў партызан акупанты стваралі новыя і ўзмацнялі існуючыя гарнізоны. Па даных штаба Магілёўскай (абласной) ВАГ, колькасць войск гарнізона ў Быхаве павялічылася да 4 тыс. салдат і афіцэраў нямецкіх і здрадніцкіх фарміраванняў, на станцыі Тошчыца — да 200, у в. Ямнае — 400 гітлераўцаў, Балонавым Сяльцы — 170, у Гарадцы, Баркалабаве і іншых населеных пунктах колькасць працiўніка дасягала ад 75 да 120 чалавек.

У хутказменлівай ваенна-аператыўнай абстаноўцы мянялася і ўдасканальвалася тактыка барацьбы партызан на камунікацыях і ў гарнізонах працiўніка. Асноўнымі ў баявых дзеяннях становяцца арганізаваныя аперацыі — узгодненыя па часе і месцы дзеяння. Такі метад барацьбы пазбаўляў працiўніка манеўранасці і магчымасці аказваць дапамогу суседнім гарнізонам.

Мемарыяльная дошка на будынку вакзала чыгуначнай станцыі Тошчыца

Летам і восенню 1943 г. быхаўскія партызаны ўдзельнічалі ў аперацыях «Рэйкавая вайна», «Канцэрт». Акрамя асноўных удараў, яны сістэматычна праводзілі дыверсіі на чыгунцы, дарогах, разбуралі масты, станцыйныя збудаванні. Першы ўдар па чыгунцы ў Быхаўскім раёне быў нанесены ў ноч на 3 жніўня сіламі 14 атрадаў Бярэзінскай, Быхаўскай і часткай сіл Магілёўскай і Бялыніцкай ваенна-аператыўных груп агульнай колькасцю 2,5 тыс. партызан. Гэтай ноччу атрады 345, 340, 120, 130, 113, 121, 122, 600, 810, 425, 152, 225, 435, 820-ы атакавалі чыгуначную лінію на ўчастку станцыя Дашкоўка — пасёлак Чырвоны Араты, знішчылі дзоты, патрульныя вартавыя пасты і падарвалі 3598 рэек. Разбурылі мост, асобныя станцыйныя збудаванні, знішчылі некалькі кіламетраў правадной сувязі.

Быхаўская ВАГ, якая напярэдадні базіравалася ў 2-м лесахімічным участку каля в. Гамарня, у ноч на 3 жніўня дзейнічала ў раёне станцыі Тошчыца. Да месца дзеяння партызаны выйшлі непрыкметна і размясціліся ўздоўж чыгуначнай лініі. Апоўначы пачалася атака. Штурмуючыя групы агнём з аўтаматаў і кулямётаў падаўлялі варожыя бункеры. Авалодаўшы чыгункай, народныя мсціўцы перабілі 1117 рэек, у некалькіх месцах знішчылі тэлефонна-тэлеграфную сувязь.

Фронт набліжаўся. Працiўнік працягваў нарошчваць сілы сваіх гарнізонаў. Сюды ж адводзіліся разбітыя часці і падраздзяленні, тылавыя службы і будаўнічыя каманды. Гітлераўцы, занепакоеныя актывізацыяй баявых дзеянняў партызан, перайшлі да больш рашучых мер супраць іх — рабілі засады, распачалі адчайныя спробы забяспечыць

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

нармальны перавоз войск па дарогах. Тылавыя службы і падраздзяленні рабавалі насельніцтва, гналі працаздольных людзей на будаўніцтва новых абарончых збудаванняў, грабілі новы ўраджай. Гаспадарчыя камандыры падтрымцы войсковых падраздзяленняў прарываліся ў аддаленыя вёскі і забіралі з палёў хлеб у снапах. У сувязі з гэтым Магілёўскі падпольны абком партыі звярнуў увагу кіраўнікоў райкомаў і партызанскіх фарміраванняў на ўмацаванне дзеянняў атрадаў па выратаванню насельніцтва і ўраджаю. Абком прапанаваў перадаць у дапамогу сялянам на час уборачных работ коней і транспартныя сродкі. Атрады павінны былі забяспечыць масавыя разбурэнні дарог, каб вораг не змог выкарыстаць іх ні для ваенных, ні для гаспадарчых патрэб.

Не аслабляючы дзеянняў на чыгункі, партызаны на працягу жніўня знішчылі або разагналі гарнізоны ў населеных пунктах Тайманава, Балонаў Сялец, Кучын і інш. 8 жніўня паліцэйскі гарнізон у в. Касічы пры з'яўленні партызан атрадаў 152-га, 435-га, «Слаўны» разбегся. Партызаны знішчылі казармы, умацаванні, забралі прадукты і пакінутую зброю. Гэтай жа ноччу адначасова 810-ы атрад напаў на гарнізоны ў вёсках Тайманава і Камарычы. У Тайманаве пасля нечаканага для праціўніка артылерыйскага і мінамётнага абстрэлу стралковыя роты атакавалі вёску з флангаў. Стральба прамой наводкай па дзотах і імклівая атака завяршылі бой за некалькі мінут. Абодва гарнізоны былі падаўлены, разбураны іх умацаванні. Партызанам дасталіся стралковая зброя, мінамёт, прадукты харчавання і рэчавая маёмасць. На наступную ноч 425-ы атрад, які разам з 820-м партызанскім атрадам прыкрываў магчымыя шляхі падыходу падмацавання праціўніка, напаў на гарнізон торфазавода Ямнае. Захапіўшы 3 ручныя кулямёты, 22 вінтоўкі, прадуктовы склад, 7 коней з павозамі, разбурыў умацаванні, знішчыў машыну для сушкі торфу. 11 жніўня 152-і і 435-ы атрады разагналі гарнізон у в. Балонаў Сялец — разбурылі ўмацаванні, спалілі трактар і малатарню, прывезеныя сюды для абмалоту нарабаванага ў сялян ураджаю. 425-ы атрад у раёне в. Гамарня 17 жніўня завязаў бой з гітлераўцамі, што прыбылі для захопу рабочай сілы. Праціўнік адступіў. У в. Чырвоны Вераг у пачатку верасня 1943 г. правёў бой 152-і атрад супраць каманды, якая імкнулася захапіць жыхароў вёскі для адпраўкі ў Германію.

Барацьба за выратаванне людзей, вырашчанага ўраджаю спалучалася з дыверсіямі і аперацыямі партызан на дарогах. Так, 14 жніўня 425-ы атрад напаў на чыгунку каля станцыі Тошчыца. 18 жніўня ўзвод Баранава з 820-га атрада падарваў мост на дарозе паміж вёскамі Новы Быхаў і Адаменка. Адначасова 225-ы атрад разграміў гарнізон у в. Новы Быхаў. На наступны дзень 11 партызан гэтага атрада на чале з камандзірам узвода Смірновым паміж станцыяй Тошчыца і Емяльянавай будкай (мясцовая назва) падарвалі 34 рэйкі.

Восенню і зімой 1943 г. барацьба партызан яшчэ больш актывізавалася. У верасні партызаны зрабілі налёты на гарнізоны на станцыі Тошчыца, у вёсках Новы Быхаў, Гарадзец, Новы Гарадок, Сарочына, на 14-м, 15-м раз'ездах. 152-і партызанскі атрад удзельнічаў у арганізаванай аперацыі па адначасовым разгроме 10 гарнізонаў. 5 верасня партызанскія групы Быхаўскай ВАГ удзельнічалі ў разгроме гарнізона на станцыі Тошчыца.

Партызанскі рух ва ўсходняй, левабярэжнай частцы раёна па-ранейшаму развіваўся самастойна. Пасля выхаду 1-й Быхаўскай брыгады з Хачынскага лесу ў верасні 1942 г. сюды прыйшлі на зімоўку невялікія атрады М. М. Іванова, М. Ц. Перапечкіна, І. В. Кананыхіна, І. І. Бажыкава (Бажукова) і інш. Аднак большую частку зімы яны знаходзіліся ў Гіжанскіх і Чачэрскіх лясах. Вясной 1943 г. Магілёўскі падпольны абком партыі і яго ВАГ арганізавалі і накіравалі ў Слаўгарадскі раён 15-ы атрад. 5 мая атрад прыбыў з Клімаўскай зоны ў Хачынскі лес і размясціўся каля в. Александрова. Невялікі колькасна, аднак добра зладжаны і валявы партызанскі калектыў хутка асвоіў новы раён дыслакацыі. Атрад хутка рос з ліку мясцовага насельніцтва Быхаўскага і Слаўгарадскага раёнаў. З жніўня 1943 г. атрад быў разгорнуты ў 15-ы полк двухбатальённага складу. У станаўленні і ўмацаванні баяздольнасці палка немалую ролю адыграла мясцовае насельніцтва. За перыяд станаўлення атрада і палка савецкія патрыёты перадалі партызанам 62 кулямёты, 3 аўтаматы, 460 вінтовак, 4 гарматы і шмат боепрыпасаў. Партызаны палка дзейнічалі ў асноўным метадам дыверсій і засад на чыгункі і шашэйных дарогах Быхаўскага, Слаўгарадскага і Чавускага раёнаў. Асабліва адчувальнымі былі ўдары партызан у час Курскай бітвы. 20 ліпеня, напрыклад, на чыгункі Магілёў — Крычаў, паміж в. Атрожжа і в. Вілейка падарвалі 426 рэек, на аўтамабільных дарогах у жніўні знішчылі 46 аўтамашын, падарвалі 8 чыгуначных эшалонаў. К лету 1943 г. ў Хачынскі лес перайшоў Смаленскі полк «Трынаццаць», адзін з самых лепшых высокаарганізаваных партызанскіх палкоў перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Яго асабовы склад валодаў высокімі маральнымі і баявымі якасцямі. Пачатак арганізацыі палка адносіцца да лістапада 1941 г., калі ў в. Фаміно Дарагабужскага раёна з ваеннаслужачых, якія не змаглі выйсці з варожага тылу, быў створаны невялікі партызанскі атрад. Адным з першых яго арганізатараў быў на той час малодшы лейтэнант танкіст С. У. Грышын. К лету 1942 г. атрад колькасна вырас, устанавіў сувязь з Заходнім штабам партызанскага руху (ЗШПР) і па яго загаду ў канцы чэрвеня разгарнуўся ў полк. Дзей-

Быховский районный историко-краеведческий музей

нічаў у аператыўным тыле 3-й, 2-й танкавых і 4-й палявой армій. Увесь час знаходзіўся на рэйдзе. На тэрыторыю Беларусі полк прыйшоў 22 красавіка 1943 г., з баямі адарваўшыся ад карнікаў у Манастыршчынскім раёне. Полк наносіў моцныя ўдары па чыгункі Орша — Крычаў, Магілёў — Крычаў. Ноччу 14 мая ўсім складам ажыццявіў налёт на станцыі Чавусы і Верамейкі, раз'езд Шашына. 8 жніўня партызанам удалося здзейсніць масавыя разбурэнні на чыгунцы Магілёў — Чавусы. 18 верасня батальёны палка нанеслі адначасовы ўдар па чыгунцы Орша — Крычаў і Магілёў — Крычаў, падарваўшы паўтары тысячы рэек.

25 верасня полк «Трынаццаць» атрымаў загад ЦШПР пакінуць на месцы палкавыя рэзервы і частку маёмасці, параненых пераправіць цераз лінію фронту ў савецкі тыл, а асноўны баявы склад вывесці за Дняпро — далейшы баявы шлях палка павінен быў прадаўжацца ў Беластоцкай вобласці. 27 верасня полк выступіў на марш. Тым часам часці Чырвонай Арміі ўступілі на беларускую зямлю — былі вызвалены Хоцімск, Клімавічы, Крычаў, Чэрыкаў. Перадавыя часці выйшлі да ракі Сож, потым да Проні і спыніліся. Праціўнік адразу ж выкарыстаў перапынак і частку сваіх сіл разгарнуў фронтам на захад, супраць партызан, якія апынуліся ў тылавой паласе 4-й нямецкай арміі паміж Дняпром і Прояй. Акрамя таго, камандаванне групы армій «Цэнтр» арганізавала тут самастойную карную аперацыю (каля 25 тыс. салдат і афіцэраў 707-й грэнадзёрскай дывізіі і прыдадзеных ёй артылерыйскіх і пяхотных часцей). Становішча партызан, заціснутых паміж Сожам і Дняпром, з кожным днём ускладнялася. Канчаліся боепрыпасы, расла колькасць параненых байцоў. Мірнае насельніцтва партызанскай зоны стрымлівала манеўр падраздзяленняў — фактар няўлоўнасці перастаў «працаваць» на партызан. Праціўнік кантраляваў усялякае перамяшчэнне партызан і пастаянна атакаваў іх у нечаканых месцах. Полк «Трынаццаць» за 2 дні маршу далёка адысці не змог. На шляху ад в. Іванішчавічы да в. Кудзіна ён двойчы завязваў бой, адбіваючыся ад пагоні варожай пяхоты. Разведка Дняпра паказала, што заходні бераг ракі і населеныя пункты кішаць нямецкімі войскамі і што фарсіраваць Дняпро магчыма толькі з боем. Вырашылі пераправіцца на плытах. Пра становішча на маршы і рашэнні фарсіраваць Дняпро камандаванне палка далажыла ў ЦШПР. 30 верасня прыйшла радыёграма, у якой выхад за Дняпро адмяняўся — палку было прапанавана выходзіць за лінію фронту, у савецкі тыл.

У гэты час 15-ы полк, які базіраваўся ў Хачынскім лесе, ідучы насустрач Чырвонай Арміі, 29 верасня 1943 г. выйшаў да в. Студзянец Слаўгарадскага раёна. Тут ужо знаходзіліся 17-я партызанская брыгада, атрад «Перамога» з палкавым шпіталем. Разам партызаны напалі на Студзянецкі гарнізон з мэтай прарвацца ў гэтым месцы на левы бераг р. Сож. Атака не ўдалася. На зваротным шляху партызаны правялі бой каля вёсак Дубраўка, Хоцішча Прапойскага раёна. 2 кастрычніка калоны партызан прыйшлі ў Хачынскі лес. На наступны дзень у Грабаўскі лес вярнуўся полк «Трынаццаць». Пачаліся гераічныя блакадныя баі (4—19 кастрычніка), якія ўвайшлі ў гісторыю партызанскага руху як Боўкінская абарона.

У Хачынскім, Боўкінскім, Грабаўскім лясах к гэтаму часу сканцэнтраваліся палкі «Трынаццаць», 15-ы, 17-я партызанская брыгада (без 124-га атрада), асобныя атрады 48-ы Прапойскі, 19-ы, 3-я рота 720-га атрада, рота з 14-й Цемналескай брыгады, дыверсійна-разведвальная група Варажышчава агульнай колькасцю больш за 4 тыс. партызан (без рэзервовага падраздзялення палка «Трынаццаць»), а таксама мірнае насельніцтва партызанскай зоны.

Байцы занялі кругавую абарону на правым беразе ракі Ухлясць (шпіталь, гаспадарчыя падраздзяленні і насельніцтва знаходзіліся ў глыбіні лесу). Праціўнік размясціў буйныя сілы ў вёсках Хоцішча, Хачынка, Александрова, Боўкі, Трылесіна, Дабужа, Смаліца, Ліпаўка і інш. Вызначыўшы прыкладныя межы партызанскай абароны, варожая авіяцыя і артылерыя абрушылі свае ўдары па асаджаных. Да 13 кастрычніка партызаны паспяхова адбівалі атакі пяхоты. За гэты час праціўнік канчаткова вызначыў стан партызанскай абароны і перайшоў да рашучага наступлення па ўсім яе перыметры. Атакі пяхоты, паветраная бамбардзіроўка і артылерыйская стральба з самалётнай карэкціроўкай прыносілі абаронцам вялікія страты. Сітуацыя абвастралася з кожным новым націскам ворага. Дапамога, якую чакалі з фронту, зацягвалася, а праціўнік нарошчваў сілы і ўдары. У другой палове дня 13 кастрычніка адбыўся сход камандзіраў складу партызанскіх фарміраванняў. Дамовіліся правесці дадатковыя арганізацыйныя меры ўнутры палка і атрадаў і змяніць пазіцыю, каб хоць на нейкі час звесці ў зман варожую артылерыю і авіяцыю. Ноччу батальёны і атрады пакінулі першую лінію абароны і глыбей уцягнуліся ў лес. Аднак праціўнік хутка вызначыў перадавыя пазіцыі партызан і біў цяпер па меншых па плошчы пачыльных радах партызан. Страты сярод байцоў і мірнага насельніцтва ўвесь час раслі. 15-ы полк, амаль поўнасцю растраціўшы патроны, у ноч на 15 кастрычніка стаў прарывацца праз кальцо блакады на ўчастку Смаліца — Радзькава. 1-ы батальён штурмам змёў праціўніка. Аднак наперадзе яго чакалі новыя выпрабаванні — ўздоўж дарогі Ветранка — Ліпаўка былі арганізаваны засады з танкаў, бронемашын з пяхотай праціўніка. Адступаць было некуды, партызаны ўступілі ў жорсткі няроўны бой. Многія загінулі,

Брэсцкі гарадскі гісторыка-краязнаўчы музей

у тым ліку начальнік штаба палка І. І. Вішнеўскі, камісар батальёна І. Ц. Каўшырка, памочнік начальніка штаба А. І. Шубадзёраў. Камандзір 1-га батальёна М. Р. Пракапенка быў цяжка паранены, каб не абцяжарваць таварышаў, ён застрэліўся. 2-і батальён, штаб палка, штабныя і тылавыя падраздзяленні адышлі на зыходныя пазіцыі.

16 дзён і начэй працягвалася ўпартая і самаадданая абарона. Апошнія некалькі дзён партызаны і мірныя жыхары былі без ежы. На вінтоўку заставалася ўсяго па пяць патронаў. Ноччу 17 кастрычніка полк «Трынаццаць», сабраўшы апошнія сілы, пайшоў у атаку, адбіў свае першыя пазіцыі, якія займаў да 13 кастрычніка, і захапіў трафеі, у тым ліку 2 павозкі з патронамі. Цяпер кожны партызан меў па 20 патронаў па вінтоўку і па 200 на кожны трафейны кулямёт. У абароне іх хапіла б на 2 мінуты бою, а для прарыву блакады на вузкім участку можна было б расцягнуць на 7—8 мінут. Іншага выйсця не было. Выхад да Дняпра быў адрэзаны дзвюма лініямі блакіроўкі, заставаўся адзіны шлях — на ўсход, у бок фронту.

У ноч на 19 кастрычніка партызанскія палкі, брыгада і асобныя атрады разам з параненымі выйшлі з акружэння з Грабаўскага лесу. Раніцай партызаны дайшлі да Жалезінскага балота, дзе занялі кругавую абарону. Прылеглыя да балота вёскі былі заняты праціўнікам, які яшчэ раней поўнасцю заблакіраваў балота. Да позняга вечара не змаўкалі артылерыйская кананада і бомбавыя разрывы. У другой палове дня на сходзе камандзіраў было вырашана прарывацца (на шчасце, не так, як чакаў праціўнік). Полк «Трынаццаць» павінен быў выходзіць самастойнымі батальёнамі за Дняпро. Падраздзяленні 15-га палка памячалі прарыў у бок лесу, на захад ад в. Чырвоная Паляна. Мясцовым партызанам даручалася заставацца на месцы і манеўраваць дробнымі групамі, ухіляючыся ад сустрэч з ворагам. У балоце заставаліся таксама атрад «Перамога», штаб палка «Трынаццаць» з каменданцкай ротай (пазней яны прарваліся ў Хачынскі лес) і рэзервовым падраздзяленнем 17-я партызанская брыгада ўсім складам выйшла ў Камарынскі лес. Група партызан (60 чалавек) з 19-га атрада і многія іншыя групы выйшлі асобна за Дняпро, дзе ўліліся ў атрады Быхаўскай ВАГ. Канец кастрычніка і ўвесь лістапад 1943 г. партызаны працягвалі манеўраваць невялікімі групамі ў тылавой мяжы войск праціўніка паміж ракой Проняй і Дняпром, да злучэння з войскамі 46-га стралковага корпуса 50-й арміі.

Выконваючы загад камандзіра палка «Трынаццаць», 3-і і 5-ы батальёны за двое сутак прарваліся да Дняпра ў раёне вёсак Старая Трасна і Бароўка, фарсіравалі яго і выйшлі да вёсак Вязьма Быхаўскага і Каменка Магілёўскага раёнаў. 1-ы і 2-і батальёны дайшлі да вёсак Кадзіна, Лёўкаўшчына, уступілі каля Кадзінскага лесу ў бой з праціўнікам. Аднак да Дняпра не змаглі прайсці і доўгі час манеўравалі ў Камарынскім, Грабаўскім лясах. Сюды ж у пачатку лістапада прыбыў 6-ы батальён, які таксама не прайшоў да Дняпра. Не выйшлі з Жалезінскага балота камандзір палка з каменданцкай ротай, штаб палка на чале з начальнікам штаба, атрад «Перамога» і шмат іншых разрозненых груп. Камандзір палка С. У. Грышын вырашыў ноччу 22 кастрычніка ўсімі сіламі прарвацца на найбольш слабым участку блакады, праз вёскі Іванішчавічы і Малыя Боркі Слаўгарадскага раёна. Намер быў ажыццёўлены — партызаны выйшлі ў Грабаўскі лес, страціўшы ў баі 9 партызан, у тым ліку начальніка штаба палка М. В. Вузлова, афіцэра сувязі ЗШПР Кардана. У канцы лістапада ўсе падраздзяленні палка злучыліся. 30 лістапада фарсіравалі р. Друць і размясціліся ў раёне вёсак Ядрына Слабада, Гарадзішча, Аляксандраўка, Гулы. Страты палка ў блакадных баях былі вялікія — 105 партызан забіта, 42 прапала без вестак, 110 параненa. Акрамя таго, невядомым застаўся лёс 96 параненых да блакады партызан і 74 партызан, якія былі вылучаны для аховы і медабслугоўвання параненых. Па даных ЗШПР на 1 лістапада 1943 г. ў савецкі тыл выйшла 485 партызан палка.

Моцна парадзелыя 2-і батальён і штабныя падраздзяленні 15-га палка прарваліся з блакіраванага Жалезінскага балота дробнымі падраздзяленнямі. Група камандзіра палка А. С. Дзямідава, каля 60 чалавек, на шляху да Дняпра сустрэлася з падраздзяленнямі 1-га батальёна. Разам яны фарсіравалі Дняпро і 7 лістапада былі ў в. Колбаўская Слабада. Да сярэдзіны снежня сюды выйшлі групы Каралёва, М. В. Ханінава і партызаны групы, якой да сваёй гібелі камандаваў начальнік штаба палка І. І. Вішнеўскі. Асабовы склад палка на 1 лютага 1944 г.— 183 партызаны.

Чырвоная Армія адцясняла акупантаў на захад. 25 лістапада яе перадавыя часці вызвалілі райцэнтр Слаўгарад і амаль ушчыльную падышлі да Дняпра ў раёне в. Новы Быхаў, дзе знаходзілася пераправа праціўніка з бясконцым патокам ваенных грузаў.

26 лістапада партызаны Быхаўскай ВАГ распачалі аперацыю па масавым разбурэнні шашэйных і грунтавых дарог, каб ускладніць ворагу перагрупоўку войск, падвоз рэзерваў тэхнікі і боепрыпасаў. Партызанскія палкі 810-ы, 425-ы, 152-і і асобныя атрады 225-ы, 435-ы, 820-ы, і 830-ы (агульнай колькасцю больш за 3 тыс. партызан) занялі аўтамабільныя дарогі на ўчастках паміж населенымі пунктамі Тайманава — Новы Быхаў, Дзедава — станцыя Тошчыца, Дзедава — Хамічы, Быхаў — Рагачоў, зрабілі завалы, замініравалі, перакапалі дарожнае палатно, разбурылі 3 масты. У далейшым такія аперацыі праводзіліся асобны-

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

мі атрадамі і батальёнамі самастойна. Да канца года партызаны падарвалі, спалілі і разбілі больш за 100 аўтамашын з войскамі і ваеннымі матэрыяламі. Не аслабляліся ўдары партызан і на чыгунцы. Каля станцыі Тошчыца, напрыклад, у другой палавіне лістапада падрыўныя групы 152-га і 425-га палкоў пусцілі пад адхон 8 паяздоў. У снежні на гэтым жа месцы падрыўнікі Быхаўскай ВАГ арганізавалі 24 дыверсіі, у выніку было разбіта або пашкоджана 20 паравозаў, 220 вагонаў і платформ, 58 аўтамашын і бронемашын, 59 матацыклаў.

Партызаны 830-га атрада ў засадзе на дарозе Хамічы — Дзедава 11 студзеня 1944 г. напалі на абоз з 18 параконных фурманак і каля паўбатальёна пяхоты. Прапусціўшы галаўную ахову, партызаны адкрылі агонь, а потым атакавалі праціўніка. У баі, які працягваўся каля 40 мінут, вораг пёс вялікія страты забітымі, аднак працягваў супраціўляцца да падыходу чарговай калоны пяхоты. Партызаны ўдала выйшлі з зоны агню.

На наступную ноч каля Гаралай казармы (мясцовая назва) падрыўнікі 820-га атрада А. Б. Вараб'ёў, С. М. Кажамякін, М. М. Сяргеенка і інш. падлажылі тол і 152-міліметровы артылерыйскі снарад. На міне падарваўся воінскі эшалон, разбіты паравоз, 4 платформы з танкамі і 2 вагоны з рэчамі.

Сярод разбітых нямецкіх часцей за Дняпро накіроўвалася калона пяхоты 1-га батальёна 278-га грэнадзёрскага палка 95-й пяхотнай дывізіі. Батальён размясціўся ў в. Новы Гарадзец. Камандаванне 425-га партызанскага палка атрымала загад 14 снежня знішчыць батальён праціўніка, у якім засталося крыху больш як 200 салдат і афіцэраў. Ноччу полк непрыкметна заняў выходныя пазіцыі і ў 2 гадзіны ночы атакаваў гарнізон праціўніка. Бой працягваўся дзве з паловай гадзіны. Грэнадзёры страцілі 105 салдат забітымі, партызаны знішчылі 14 грузавых і 2 спецыяльныя аўтамашыны (у т. л. з радыёстанцыяй), 2 міны, гармату, вывелі са строю бронемашыны, спалілі склады. Партызаны захапілі мінамёт, 196 мін, 65 аўтаматаў і вінтовак, патроны, 35 коней з павозкамі.

22 студзеня 1944 г. 810-ы і 152-і палкі адначасовым налётам разграмілі варожыя гарнізоны ў вёсках Асоўшчына, Савічаў Рог. У вёсцы Савічаў Рог размяшчаўся штаб і 11-я рота 703-га чыгуначнага батальёна. За 20 мінут партызаны імгненным кідком падавілі неарганізаванае супраціўленне праціўніка (39 салдат было забіта, астатнія збеглі пад прыкрыццё бункераў чыгуначнай аховы). Партызаны знішчылі гарнізонныя ўмацаванні, склады, 3 грузавыя аўтамашыны, захапілі станковы кулямёт, мінамёт і 17 вінтовак. Такой жа рашучай атакай партызаны разбілі гарнізон у в. Асоўшчына (вораг страціў забітымі 78 салдат). Аднак праціўнік суседняга Няражскага гарнізона атакаваў нашы батальёны на адкрытай мясцовасці. Першы батальён 810-га палка, прыкрываючы адыход асноўных сіл партызан, завязаў бой з пяхотай і танкамі праціўніка. Партызаны з боем выйшлі з-пад агню. Пры разгроме гарнізона і ў сустрэчным баі вызначыліся многія камандзіры і байцы. Стойка стрымлівала танкі рота М. С. Мельнікава. Радавы І. Сяржант прыкрываў кулямётным агнём адыход батальёна, пры моцнай атацы пяхоты, прапусціўшы танк, амаль ва ўпор стаў расстрэльваць варожы ланцуг за танкам. Радавы П. П. Мельнікаў, прыкрываючы адыход свайго ўзвода, знішчыў варожы кулямётны разлік, стрымліваў ворага, пакуль сам не загінуў. Камсамолец А. Г. Ткачоў ішоў у першых радах штурмуючых гарнізон Асоўшчына, у баі быў смяртэльна паранены ў грудзі і галаву. Адступаючы кароткімі перабежкамі, радавы Катляроў не заўважыў, як з боку на яго наязджаў танк, з адкрытага люка якога на байца глядзеў камандзір варожай машыны. Пасля хвілінпай збянтэжанасці партызан кулямётнай чаргой «перахрысціў» камандзіра і ўсе назіральныя шчыліны танка і пазбег пагоні. Гераізм і мужнасць дапамаглі партызанам з меншымі стратамі выйсці ў бяспечнае месца.

Становішча з кожным днём ускладнялася. Часці нашай 50-й арміі ў канцы лістапада ступілі на Быхаўскую зямлю ў раёне вёсак Хачкінка, Чырвоная Слабада, Абідавічы. Вораг ператварыў Быхаўшчыну ў магутны вузел супраціўлення. Яго абарона праходзіла па абедзвюх частках раёна. Уздоўж правага берага Дняпра яна складалася з дзвюх палос з развітай сістэмай траншэй, дзотаў і іншых інжынерных збудаванняў. Тут дыслацыраваліся войскі 12-га армейскага корпуса 4-й арміі і 31-й пяхотнай дывізіі 9-й нямецкай арміі. Камандаванне Быхаўскай ВАГ імкнулася ўстанавіць сувязь з часцямі 50-й савецкай арміі. У лютым 1944 г. яно тройчы пасылала сваіх разведчыкаў за лінію фронту. Аднак ні адна з груп не вярнулася назад — па той бок фронту рыхтавалася Рагачоўска-Жлобінская аперацыя, і, як стала потым вядома, правадпікамі нашых войск у тыле ворага сталі быхаўскія партызанскія разведчыкі.

Ноччу 20 лютага партызанская разведка непрыкметна для праціўніка правяла ўзмоцнены лыжны батальён 5-й Арлоўскай стралковай дывізіі 3-й арміі цераз Дняпро і чыгунку каля вёсак Кісцяні і Асінаўка. Раніцай тым жа шляхам прайшоў стралковы полк гэтай жа дывізіі. Пасля злучэння з батальёнам яны перарэзалі чыгунку ў раёне станцыі Тошчыца. У ходзе гэтай аперацыі перад быхаўскімі партызанамі была пастаўлена задача авалодаць правым берагам ракі Друць на ўчастку вёсак Чыгірынка, Вязьма і не прапусціць туды праціўніка. Партызаны гэтай задачы выканаць не змаглі — 24 лютага нямецкае камандаванне кінула сюды на падмацаванне каля двух пяхотных палкоў. У такой сітуацыі партызаны вымушаны

Быховский районный историко-краеведческий музей

былі дзейнічаць з засад у напрамку вёскі Дзедава, дзе і злучыліся з войскамі 5-й Арлоўскай стралковай дывізіі. Партызанскія палкі і атрады Быхаўскай ВАГ былі выведзены ў Рагачоўскі раён і загадам камандуючага 50-й арміяй расфарміраваны. З перадавымі часцямі Чырвонай Арміі злучылася 3926 партызан. За ўвесь перыяд баявых дзеянняў Быхаўскай ВАГ страты склалі: забітымі 179, без вестак прапаўшымі 48 партызан. 2499 партызан уліліся ў рады Чырвонай Арміі.

У астатняй частцы раёна, якая заставалася акупіраванай, дзейнічалі да поўнага вызвалення партызанскія палкі і атрады Кіраўскай, Магілёўскай, Клічаўскай ваенна-аператыўных груп. У сакавіку 1944 г., напрыклад, 537-ы полк разграміў гарнізон праціўніка ў в. Хамічы, 21 мая 113-ы полк Магілёўскай ВАГ — у в. Балонаў Сялец.

У красавіку 1944 г. 15-му партызанскаму палку былі перададзены 153 партызаны з 425-га палка Быхаўскай ВАГ, што не выйшлі з варожага тылу ў час яе злучэння з часцямі Чырвонай Арміі. На іх базе быў укамплектаваны 2-і батальён, які таксама выходзіў на дыверсіі і засады на тэрыторыі Быхаўскага раёна. У пачатку красавіка полк удзельнічаў у разгроме буйнога варожага гарнізона ў в. Пагост. У маі 1944 г. партызаны палка разбілі 6 аўтамашын, 2 масты, разагналі паліцэйскі гарнізон у в. Гарэнь. 20 чэрвеня 1944 г. ў аперацыі «Рэйкавая вайна» партызаны захапілі чыгуначную лінію ад станцыі Лотва да в. Цыркава ў Шклоўскім раёне, перабілі 155 рэек. Полк злучыўся з 348-й стралковай дывізіяй Чырвонай Арміі 28 чэрвеня 1944 г. каля в. Паплавы ў складзе двух батальёнаў (311 партызан). За перыяд баявых дзеянняў полк страціў забітымі і без вестак прапаўшымі 359 партызан. У баях было паранена 105 партызан, з якіх 5 памерлі ад ран, 30 эвакуіраваны ў савецкі тыл. 70 партызан былі вылечаны ў палкавым партызанскім шпіталі.

29 і 30 чэрвеня 1944 г. ў раёне вёсак Пупса, Эсьмоны, Заазер'е, Цількаўка і інш. сустрэлася з часцямі Чырвонай Арміі партызанскае злучэнне «Трынаццаць» у складзе 1-й, 3-й і 5-й брыгад і 11-га, 12-га, 13-га асобных атрадаў. Партызаны злучэння ў апошнія месяцы перад вызваленнем дзейнічалі ўздоўж чыгунак Орша — Магілёў, Орша — Барысаў, шашы Магілёў — Мінск (раней, у лютым 1944 г., вёў баі супраць карнікаў). 20 чэрвеня ў аперацыі «Рэйкавая вайна» на чыгункі паміж станцыямі Крупкі — Бобр перабіў 1388 рэек, на аўтамабільных дарогах Дзяніскавічы — Бобр, Дзяніскавічы — Сакаловічы партызаны разбурылі 2 масты.

1 ліпеня злучэнне выйшла маршам з Бялыніцкага раёна ў Смаленскую вобласць, дзе 23 ліпеня было расфарміравана. За перыяд баявых дзеянняў страты забітымі і без вестак прапаўшымі склалі 873 партызаны, у тыл эвакуіраваны 172 цяжкапараненыя партызаны. У баях, засадах і дыверсіях партызаны падарвалі, пусцілі пад адхон або пашкодзілі 338 воінскія эшалоны, 2 бронепаязды, 97 мастоў. Разграмілі 25 вайсковых гарнізонаў, 20 паліцэйскіх участкаў і валасных управаў, 5 воінскіх штабоў. Захапілі трафеі: 768 вінтовак, 51 аўтамат, 123 кулямёты розных сістэм, 9 мінамётаў, 4 гарматы, самаходную гармату.

За праяўлены гераізм і асабістую доблесць у баях Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР камандзіру злучэння палкоўніку С. У. Грышыну і партызану П. А. Галецкаму (пасмяротна) прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза.

А. Л. Манаенкаў.

КАМАНДНЫ СКЛАД ПАРТЫЗАНСКІХ ФАРМІРАВАННЯЎ БЫХАЎСКАГА РАЁНА

1-я БЫХАЎСКАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА

Арганізавана ў пачатку ліпеня 1942 г. ў Хачынскім лесе Быхаўскага раёна на базе атрадаў Г. І. Сазонава, С. П. Мардашкіна, Я. А. Курпачэнкі. Пазней створаны атрады І. П. Памятнёва, І. С. Сямёнава, Фралова, І. П. Дзюбы. Дзейнічала ў Быхаўскім, Слаўгарадскім, Чавускім, Крычаўскім раёнах Магілёўскай вобласці. У час карнай экспедыцыі ў верасні 1942 г. выйшла ў Клятянскі раён і перастала існаваць. Атрады ўліліся ў злучэнне чарнігаўскіх партызан на чале з А. Ф. Фёдаравым, а таксама ў асобныя атрады «Уперад» (пазней Гомельскай вобласці), імя С. Лазо Арлоўскай вобласці. Атрады І. П. Дзюбы і Г. І. Сазонава дзейнічалі асобна ў падпарадкаванні штаба Заходняга фронту.

Атрад Г. І. Сазонава (галаўны) арганізаваны 18 чэрвеня 1942 г. ў Быхаўскім раёне. З 4 верасня 1942 г. дзейнічаў самастойна ў Арлоўскай вобл., асабовы склад атрада паступова да канца студзеня 1943 г. выйшаў у савецкі тыл.

Камандзіры Сазонаў Георгій Іванавіч (чэрвень — снежань 1942), Кухарэнка Аляксей (в. а.), Бокаў (в. а). Камісары Палявы Міхаіл І. (чэрвень — ліпень 1942), Персаў Барыс Майсеевіч. Начальнік штаба Курпачэнка Якаў Аксенцьевіч (чэрвень — ліпень 1942).

Атрад С. П. Мардашкіна створаны 1 ліпеня 1942 г. з жыхароў рабочага пасёлка Ветранка Быхаўскага раёна. Дзейнічаў да лістапада 1942 г. Увайшоў у склад партызанскага злучэння А. Ф. Фёдарава.

Камандзір Мардашкін Стратон Прохаравіч (ліпень — лістапад 1942). Камісар Палявы Міхаіл І. (ліпень — лістапад 1942). Начальнікі штаба Дзюба Пётр Іванавіч (ліпень — жнівень 1942), Бялоў Аляксандр.

Атрад Я. А. Курпачэнкі арганізаваны ў ліпені 1942 г. Дзейнічаў у Быхаўскім раёне да 15 верасня 1942 г. Частка атрада на чале з Я. С. Арцёменкам улілася ў партызанскае злучэнне А. Ф. Фёдарава,

Быховский районный историко-краеведческий музей

Г. І. Сазонаў.

С. П. Мардашкін.

Б. М. Персаў.

Я. С. Арцёменка.

другая частка аб'ядналася з групай Ф. С. Тарасевіча ў 720-ы атрад.

Камандзір Курпачэнка Якаў Аксенцьевіч (ліпень — верасень 1942). Камісар Арцёменка Яфім Сцяпанавіч (ліпень — верасень 1942). Начальнік штаба Фёдараў Мікалай Пятровіч (ліпень — верасень 1942).

Атрад І. П. Памятнёва створаны ў ліпені 1942 г. на базе групы І. П. Памятнёва, дзейнічаў з мая 1942.

Камандзір Памятнёў Ілья Пятровіч (загінуў). Камісар Барысаў Аляксей.

Атрад І. С. Сямёнава арганізаваны ў ліпені 1942 г. Дзейнічаў у Быхаўскім раёне да 4 верасня 1942 г., выйшаў у Клятнянскі раён. У пачатку лістапада 1942 г. ўліўся ў партызанскае злучэнне А. Ф. Фёдарава.

Камандзір Сямёнаў Іван Сяргеевіч (ліпень — лістапад 1942). Камісар Фёдар Іванавіч (прозвішча не ўстаноўлена, верагодна, Парыцкі, загінуў).

Атрад Фралова сфарміраваны 15 ліпеня 1942 г. ў Хачынскім лесе з групы партызан, якія выдзяліліся з 620-га атрада імя В. І. Чапаева, і мясцовых партызан. У пачатку лістапада ўліўся ў партызанскае злучэнне А. Ф. Фёдарава.

Камандзір Фралоў.

Атрад І. П. Дзюбы створаны ў жніўні 1942 г. ў выніку падзелу атрада С. П. Мардашкіна. Да 4 верасня дзейнічаў у Быхаўскім раёне, потым выйшаў у Арлоўскую вобласць, дзейнічаў самастойна па заданню штаба Заходняга фронту, пазней перададзены ЗШПР. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі ў верасні 1943 г.

Камандзір Дзюба Іван Пятровіч (жнівень 1942 — верасень 1943).

11-я БЫХАЎСКАЯ ПАРТЫЗАНСКАЯ БРЫГАДА

Сфарміравана ў красавіку 1943 г. загадам ваенна-аператыўнай групы пры Магілёўскім падпольным абкоме КП(б)Б на базе самастойных 810-га і 425-га асобных атрадаў. Пазней у брыгадзе арганізаваны 225-ы і 435-ы атрады.

Акрамя Быхаўскага раёна, брыгада дзейнічала ў Клічаўскім, Кіраўскім раёнах Магілёўскай і Рагачоўскім раёне Гомельскай абласцей у складзе Магілёўскай (абласной) ВАГ.

У ліпені 1943 г. расфарміравана ў сувязі са стварэннем Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы. Атрады перададзены ваенна-аператыўнай групе самастойнымі баявымі адзінкамі.

Камандзір брыгады Падалян Фядот Пракопавіч (красавік — ліпень 1943). Начальнікі штаба Кісялёў Міхаіл Георгіевіч (красавік — чэрвень 1943), Федзячэнка Іван Паўлавіч (чэрвень — ліпень 1943, в. а.).

БЫХАЎСКАЯ ВАЕННА-АПЕРАТЫЎНАЯ ГРУПА

Створана ў ліпені 1943 г. ў Быхаўскім раёне ў адпаведнасці з пастановай Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б і загадам Магілёўскай (абласной) ВАГ на базе атрадаў расфарміраванай 11-й Быхаўскай брыгады і 152-га асобнага атрада. Пазней створаны атрады 820-ы, 830-ы. У кастрычніку 1943 г. атрады 810-ы, 425-ы, 152-і разгорнуты ў партызанскія палкі пад той жа назвай.

Дзейнічала ў Быхаўскім, Магілёўскім, Кіраўскім раёнах Магілёўскай і Рагачоўскім раёне Гомельскай абласцей. Злучылася з часцямі Чырвонай Арміі 24 лютага 1944 г. ў складзе 810-га, 425-га, 152-га палкоў і 225-га, 435-га, 820-га, 830-га асобных атрадаў агульнай колькасцю 3554 партызаны.

Кіруючы склад Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы: сакратары падпольнага райкома КП(б)Б Андрэенкаў Емяльян Цімафеевіч (ліпень — лістапад 1943), Падалян Фядот Пракопавіч (лістапад 1943 — люты 1944). Камандзіры ВАГ Падалян Фядот Пракопавіч (ліпень — лістапад 1943), Федзячэнка Іван Паўлавіч (лістапад 1943 — люты 1944). Начальнікі штаба Федзячэнка Іван Паўлавіч (ліпень — лістапад 1943), Рутман Ілья Барысавіч (лістапад 1943 — люты 1944).

810-ы партызанскі полк

Створаны ў кастрычніку 1943 г. У лютым 1942 г. ў вёсках Вялікі Лес і Жэліхоўка пачалі дзейнічаць патрыятычныя групы на чале з В. Ц. Гадуцовым і М. Л. Максімавым (псеўданім — Лебедзеў), у красавіку 1942 г. яны аформіліся ў партызанскі атрад, які ў жніўні таго ж года перадмслацыраваўся ў Клічаўскі раён і ўвайшоў у падпарадкаванне Клічаўскага аператыўнага цэнтра як 810-ы атрад. Дзейнічаў самастойна, з красавіка 1943 г. ў складзе 11-й Быхаўскай брыгады, з ліпеня ў Быхаўскай ВАГ.

Камандзір атрада Максімаў Міхаіл Лявонцьевіч (красавік 1942 — кастрычнік 1943). Камісары Гадун-

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

К. Н. Шыбанаў.

І. С. Зычкоў.

С. П. Рамакін.

Ц. С. Ляўшынскі.

цоў Васіль Цімафеевіч (красавік 1942 — ліпень 1943), Смагін Дзмітрый Анісімавіч (ліпень — кастрычнік 1943). Начальнікі штаба Федзячэнка Іван Паўлавіч (жнівень 1942 — красавік 1943), Вараб'ёў Іван Іосіфавіч (красавік — ліпень 1943), Феакцістаў Андрэй Рыгоравіч (ліпень — кастрычнік 1943).

У кастрычніку 1943 г. атрад разгорнуты ў 810-ы партызанскі полк. Стралковыя роты атрада пераўтвораны ў 1-ы, 2-і, 3-і батальёны. 25 кастрычніка арганізацыя палка зацверджана пастановай Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б.

Полк дзейнічаў акрамя Быхаўскага ў Кіраўскім раёне Магілёўскай і Рагачоўскім раёне Гомельскай абласцей. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 24 лютага 1944 г. ў складзе 3 батальёнаў агульнай колькасцю 1006 партызан. З іх членаў ВКП(б) 24, кандыдатаў 45, членаў ВЛКСМ 135, беспартыйных 802.

Камандзір палка Максімаў Міхаіл Лявонцьевіч (кастрычнік 1943 — люты 1944). Камісар Смагін Дзмітрый Анісімавіч (кастрычнік 1943 — люты 1944). Начальнік штаба Феакцістаў Андрэй Рыгоравіч (кастрычнік 1943 — люты 1944).

1-ы батальён арганізаваны 4 кастрычніка 1943 г. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 247 партызан.

Камандзір батальёна Макрасаў Фёдар Пятровіч (кастрычнік 1943 — люты 1944). Камісар Баркоў Мікалай Мікітавіч (кастрычнік 1943 — люты 1944). Начальнік штаба Ісачанка Цімафей Паўлавіч (кастрычнік 1943 — люты 1944).

2-і батальён сфарміраваны 4 кастрычніка 1943 г. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі ў колькасці 258 партызан.

Камандзір батальёна Стральцоў Карп Сяргеевіч (кастрычнік 1943 — люты 1944). Камісар Марчанка Даніла Харытонавіч (кастрычнік 1943 — люты 1944). Начальнікі штаба Бычыхін Мікалай Фёдаравіч (кастрычнік — лістапад 1943), Старавойтаў Сямён Раманавіч (лістапад 1943 — люты 1944).

3-і батальён створаны 4 кастрычніка 1943 г. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 275 партызан.

Камісар Астасенка Апанас Фёдаравіч (кастрычнік 1943 — люты 1944). Начальнікі штаба Старавойтаў Сямён Раманавіч (кастрычнік — лістапад 1943), Бычыхін Мікалай Фёдаравіч (лістапад 1943 — люты 1944).

152-і партызанскі полк

Створаны 5 кастрычніка 1943 г. З красавіка 1942 г. каля в. Марыямпаль пачала дзейнічаць група былых ваеннаслужачых на чале з М. Дз. Грыцанам. Пазней яна перайшла ў Клічаўскі раён (у ліпені пераўтворана ў 152-і атрад). У ліпені 1943 г. перадыслацыраваны ў Быхаўскі раён і ўключаны ў Быхаўскую ВАГ. Камандзір атрада Грыцан Міхаіл Дзмітрыевіч (чэрвень 1942 — кастрычнік 1943). Камісары Мірановіч Міхаіл Фёдаравіч (чэрвень — кастрычнік 1942), Ігуменаў Сяргей Мікітавіч (кастрычнік — ліпень 1943), Шыбанаў Кузьма Назаравіч (жнівень — кастрычнік 1943). Начальнікі штаба Рудаў Іван Фёдаравіч (чэрвень 1942 — снежань 1942), Рутман Ілья Барысавіч.

Паводле рашэння Быхаўскага падпольнага райкома КП(б)Б у кастрычніку 1943 г. атрад разгорнуты ў 152-і партызанскі полк. Стралковыя роты разгорнуты ў 1-ы, 2-і, 3-і батальёны. Арганізацыя палка зацверджана 15 снежня 1943 г. пастановай Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б.

Полк дзейнічаў у Быхаўскім, Кіраўскім, Магілёўскім і Клічаўскім раёнах Магілёўскай і Рагачоўскім Гомельскай абласцей. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 24 лютага 1944 г. ў складзе 3 батальёнаў, 898 партызан. З іх членаў ВКП(б) 23, кандыдатаў у члены ВКП(б) 39, членаў ВЛКСМ 140, беспартыйных 696.

Камандзір палка Грыцан Міхаіл Дзмітрыевіч (кастрычнік 1943 — люты 1944). Камісары Шыбанаў Кузьма Назаравіч (кастрычнік — снежань 1943), Зычкоў Іван Самсонавіч (снежань 1943 — люты 1944). Начальнікі штаба Рутман Ілья Барысавіч (кастрычнік — лістапад 1943), Еўтуховіч Кірыла Васілевіч (лістапад 1943 — люты 1944).

1-ы батальён арганізаваны 5 кастрычніка 1943 г. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі ў колькасці 290 партызан.

Камандзіры батальёна Рамакін Сяргей Пятровіч (кастрычнік — лістапад 1943), Філатаў Пётр Андрэевіч (лістапад 1943 — люты 1944). Камісары Філатаў Пётр Андрэевіч (кастрычнік — лістапад 1943), Срабняк Мікалай Ягоравіч (лістапад 1943 — люты 1944). Начальнікі штаба Самсонаў Барыс Фёдаравіч (кастрычнік — лістапад 1943), Алексяевіч Якаў Архіпавіч (лістапад 1943 — люты 1944).

2-і батальён створаны 5 кастрычніка 1943 г. На

Быхоўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 314 партызан.

Камандзір батальёна Бузін Пётр Іванавіч (кастрычнік 1943 — люты 1944). Камісар Алейнікаў Мікалай Мікітавіч (кастрычнік 1943 — люты 1944). Начальнікі штаба Якубоўскі Іпаліт Іосіфавіч (кастрычнік — лістапад 1943), Рамакін Сяргей Пятровіч (лістапад 1943 — люты 1944).

3-і батальён сфарміраваны 5 кастрычніка 1943 г. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 189 партызан.

Камандзір батальёна Максімаў Аркадзь Сцяпанавіч (кастрычнік 1943 — люты 1944). Камісары Срабняк Мікалай Ягоравіч (кастрычнік — лістапад 1943), Марозаў Аляксей Апанасавіч (лістапад 1943 — люты 1944). Начальнік штаба Карнаў Васіль Фёдаравіч (кастрычнік 1943 — люты 1944).

Г. Л. Альховікаў.

425-ы партызанскі полк

Створаны ў кастрычніку 1943 г. Фарміраваўся з групы ваеннаслужачых, якія не выйшлі з варожага тылу, на чале з Ф. Ф. Сухавым. Група пачала дзейнічаць 5 мая 1942 г. У далейшым выросла за лік патрыётаў з в. Залатва на чале з К. А. Адасёвым, групы ваеннапалонных, вызваленых партызанамі ў час бою каля в. Гарадзец, і групы В. В. Бабкова. У чэрвені аб'яднаная група аформілася ў атрад. У жніўні 1942 г. ўвайшоў у падначаленне Клічаўскага аператыўнага цэнтра пад нумарам 425. З красавіка 1943 г. ў 11-й Быхаўскай брыгадзе, з ліпеня 1943 г. ў складзе Быхаўскай ВАГ.

Камандзіры атрада Куракін Мікалай Паўлавіч (чэрвень — жнівень 1942), Фядотаў Давыд Ільіч (жнівень 1942 — красавік 1943), Сухаў Фёдар Фаміч (красавік — кастрычнік 1943). Камісары Адасёў Карп Лаўрэнцьевіч (чэрвень — жнівень 1942), Ляўшынскі Цімафей Іванавіч (жнівень 1942 — кастрычнік 1943). Начальнікі штаба Сухаў Фёдар Фаміч (чэрвень — жнівень 1942), Бабкоў Міхаіл Васілевіч (жнівень 1942 — сакавік 1943, загінуў), Юханаў Васіль Пятровіч (чэрвень — кастрычнік 1943).

Паводле пастановы Быхаўскага падпольнага райкома КП(б)Б атрад 5 кастрычніка 1943 г. разгорнуты ў 425-ы полк, стралковыя роты пераўтвораны ў 1-ы, 2-і, 3-і батальёны. Арганізацыя палка зацверджана 15 лістапада 1943 г. пастановай Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б. Полк дзейнічаў акрамя Быхаўскага раёна ў Магілёўскім, Кіраўскім раёнах Магілёўскай і Рагачоўскім раёне Гомельскай абласцей.

Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 24 лютага 1944 г. няпоўным складам (частка асабовага складу, якая засталася ў тыле ворага, увайшла ў іншыя фарміраванні Магілёўскай вобласці). Напярэдадні злучэння з перадавымі часцямі полк налічваў 807 партызан. З іх членаў ВКП(б) 37, кандыдатаў у члены ВКП(б) 38, беспартыйных 542.

Камандзір палка Сухаў Фёдар Фаміч (кастрычнік 1943 — люты 1944). Камісар Ляўшынскі Цімафей Іванавіч (кастрычнік 1943 — люты 1944). Начальнікі штаба Юханаў Васіль Пятровіч (кастрычнік — лістапад 1943), Сакалоўскі Цімафей Якаўлевіч (лістапад 1943 — люты 1944).

1-ы батальён арганізаваны 5 кастрычніка 1943 г. На дзень злучэння з перадавымі часцямі батальёна налічваў 220 партызан.

Камандзір батальёна Цагельнікаў Платон Максімавіч (кастрычнік 1943 — люты 1944). Камісар Полаўцаў Цімафей Мартынавіч (кастрычнік 1943 — люты 1944). Начальнікі штаба Юханаў Васіль Пятровіч (лістапад 1943 — люты 1944).

2-і батальён створаны 5 кастрычніка 1943 г. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 220 партызан.

Камандзір батальёна Альховікаў Іван Лаўрэнцьевіч (кастрычнік 1943 — люты 1944). Камісар Савін Фёдар Паўлавіч (кастрычнік 1943 — люты 1944).

3-і батальён арганізаваны 5 кастрычніка 1943 г. На дзень злучэння з перадавымі часцямі Чырвонай Арміі налічваў 245 партызан.

Камандзір батальёна Куксёнак Васіль Фёдаравіч (кастрычнік 1943 — люты 1944). Камісар Рудніцкі Сямён Міхайлавіч (кастрычнік 1943 — люты 1944). Начальнік штаба Цёма Якаў Сяргеевіч (кастрычнік 1943 — люты 1944).

225-ы асобны атрад

Сфарміраваны 4 ліпеня 1943 г. ў 11-й Быхаўскай брыгадзе на базе ініцыятыўнай групы М. Г. Кісялёва. 17 ліпеня 1943 г. атрад перададзены Быхаўскай ВАГ. Акрамя Быхаўскага атрад дзейнічаў на тэрыторыі Кіраўскага, Бабруйскага раёнаў Магілёўскай і Рагачоўскага раёна Гомельскай абласцей.

З перадавымі часцямі Чырвонай Арміі злучыўся 24 лютага 1944 г. ў колькасці 344 партызан. З іх членаў ВКП(б) 5, кандыдатаў у члены ВКП(б) 7, членаў ВЛКСМ 58, беспартыйных 259.

Камандзір атрада Кісялёў Міхаіл Георгіевіч (ліпень 1943 — люты 1944). Камісар Ермаліцкі Мацвей Рыгоравіч (ліпень 1943 — люты 1944). Начальнік штаба Шканурка Аляксей Апанасавіч (ліпень 1943 — люты 1944).

435-ы асобны атрад

Арганізаваны ў ліпені 1943 г. ў 11-й Быхаўскай брыгадзе з партызан, вылучаных 425-м атрадам. 17 ліпеня перададзены Быхаўскай ВАГ. Акрамя Быхаўскага атрад дзейнічаў у Кіраўскім раёне Магілёўскай і Рагачоўскім раёне Гомельскай абласцей. На дзень злучэння з перадавымі часцямі, 24 лютага 1944 г., налічваў 267 партызан. З іх членаў ВКП(б) 7, кандыдатаў у члены ВКП(б) 7, членаў ВЛКСМ 55, беспартыйных 155. Партыйная прыналежнасць 43 партызан не ўстаноўлена.

Камандзір атрада Дзянісаў Уладзімір Сяргеевіч (ліпень 1943 — люты 1944). Камісары Зычкоў Іван Самсонавіч (ліпень — снежань 1943), Шыбанаў Кузь-

Быховский районный историко-краеведческий музей

ма Назаравіч (снежань 1943 — люты 1944). Начальнік штаба Белаглазаў Міхаіл Яфімавіч (ліпень 1943 — люты 1944).

820-ы асобны атрад

Створаны ў ліпені 1943 г. з партызан 2-й роты 810-га атрада. Дзейнічаў у складзе Быхаўскай ВАГ на тэрыторыі Быхаўскага раёна. Злучыўся з перадавымі часцямі 24 лютага 1944 г. ў колькасці 442 партызан. З іх членаў ВКП(б) 20, кандыдатаў у члены ВКП(б) 10, членаў ВЛКСМ 67, беспартыйных 331. Партыйная прыналежнасць 24 партызан не ўстаноўлена.

Камандзір атрада Вараб'ёў Іван Іосіфавіч (ліпень 1943 — люты 1944). Камісар Гадунцоў Васіль Цімафеевіч (ліпень 1943 — люты 1944). Начальнік штаба Сядзяеў Аляксандр Міхайлавіч (ліпень 1943 — люты 1944).

830-ы асобны атрад

Сфарміраваны ў жніўні 1943 г. з групы партызан 810-га атрада і жыхароў Рагачоўскага і Буда-Кашалёўскага раёнаў Гомельскай вобласці. Атрад дзейнічаў у складзе Быхаўскай ВАГ у Быхаўскім і Кіраўскім раёнах Магілёўскай і Рагачоўскім раёне Гомельскай абласцей. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 24 лютага 1944 г., налічваў 162 партызан. З іх членаў ВКП(б) 6, кандыдатаў у члены ВКП(б) 5, членаў ВЛКСМ 16, беспартыйных 123. Партыйная прыналежнасць 12 партызан не ўстаноўлена.

Камандзір атрада Бархозаў Аскер Хабатавіч (жнівень 1943 — люты 1944). Камісар Стральцоў Іосіф Давыдавіч (верасень 1943 — люты 1944). Начальнік штаба Савін Сямён Антонавіч (жнівень 1943 — люты 1944).

15-ы ПАРТЫЗАНСКІ ПОЛК КЛІЧАЎСКАЙ ВАГ

Сфарміраваны 3 жніўня 1943 г. У канцы ліпеня 1942 г. з 208-га асобнага атрада імя І. В. Сталіна вылучана ініцыятыўная група на чале з А. С. Дзямідавым для арганізацыі 4-й роты. Група аб'яднала партызан мясцовай самаабароны вёсак Стаялы, Маркаўшчына Клічаўскага і Колбава, Ганькова Кіраўскага раёнаў (пазней далучылася група партызан з 760-га атрада імя М. Беразоўскага). У красавіку 1943 г. 4-я рота разгорнута ў 15-ы партызанскі атрад. Дзейнічаў у Быхаўскім, Прапойскім, Чавускім, Кармянскім раёнах.

Камандзір атрада Дзямідаў Аляксей Сяргеевіч (красавік — ліпень 1943). Камісар Ніжнік Іван Пракопавіч (красавік — ліпень 1943). Начальнік штаба Вішнеўскі Іван Іванавіч (красавік — ліпень 1943).

У пачатку жніўня 1943 г. атрад паводле загаду ВАГ пры Магілёўскім падпольным абкоме КП(б)Б разгорнуты ў 15-ы полк. У баях з карнікамі ў кастрычніку 1943 г. полк (760 чалавек) панёс вялікія страты. У снежні 1943 г. палку была перададзена група партызан 208-га палка імя І. В. Сталіна, у красавіку — маі 1944 г. ў яго ўвайшлі падраздзяленні Быхаўскай ВАГ, якія адсталі ад асноўных сіл у час злучэння іх з часцямі Чырвонай Арміі. Полк дзейнічаў самастойна ў Быхаўскім, Прапойскім раёнах, у снежні 1943 г. падпарадкаваны Клічаўскай ВАГ. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 28 чэрвеня 1944 г. У складзе 2 батальёнаў, 311 партызан. З іх членаў ВКП(б) 19, кандыдатаў у члены ВКП(б) 30, членаў ВЛКСМ 60, беспартыйных 202.

Камандзір палка Дзямідаў Аляксандр Сяргеевіч (жнівень 1943 — чэрвень 1944). Камісар Ніжнік Іван Пракопавіч (жнівень 1943 — чэрвень 1944). Начальнікі штаба Вішнеўскі Іван Іванавіч (жнівень — кастрычнік 1943, загінуў), Віліткевіч Пётр Антонавіч (кастрычнік 1943 — чэрвень 1944).

1-ы батальён арганізаваны 3 жніўня 1943 г. з асабовага складу 1-й стралковай і кулямётнай рот 15-га атрада. У баях з карнікамі ў кастрычніку 1943 г. панёс вялікія страты. У красавіку 1944 г. ўкамплектаваны партызанамі 15-га палка і зноў афармлены ў баявую адзінку. На 15 чэрвеня 1944 г. батальён налічваў 119 партызан.

Камандзіры батальёна Пракапенка Мікалай Рыгоравіч (жнівень — кастрычнік 1943, загінуў), Кастаўчыкі Рыгор Аляксеевіч (май — чэрвень 1944). Камісар Шаміга Еўдакім Гапеевіч (жнівень — кастрычнік 1943). Начальнікі штаба Матусевіч Міхаіл Рыгоравіч (жнівень — кастрычнік 1943, загінуў), Красноў Андрэй Дзянісавіч (чэрвень 1944).

2-і батальён створаны 3 жніўня 1943 г. з партызан 2-й і 3-й стралковых рот 15-га атрада. У баях з карнікамі панёс вялікія страты. У красавіку 1944 г. ўкамплектаваны партызанамі (153 чалавекі) з 425-га палка Быхаўскай ВАГ і зноў афармлены ў баявую адзінку.

Камандзіры батальёна Шубадзёраў Антон Іванавіч (жнівень — кастрычнік 1943, загінуў), Альховікаў Іван Лаўрэнцьевіч (красавік — чэрвень 1944). Камісары Каўшырка Ігнат Цімафеевіч (жнівень — кастрычнік 1943, загінуў), Савін Фёдар Паўлавіч (красавік — чэрвень 1944). Начальнікі штаба Шубадзёраў Аляксей Сяргеевіч (жнівень — кастрычнік 1943, загінуў), Апосталаў Даніла Сямёнавіч (красавік — чэрвень 1944).

На шлях барацьбы

З успамінаў М. А. Труснова, былога камандзіра 108-га партызанскага атрада імя Р. І. Катоўскага

У ліпені 1941 г. пасля цяжкіх баёў частка нашай дывізіі на чале з камандзірам генерал-маёрам Маўрычавым адыходзіла на ўсход. У Быхаўскім раёне было загадана застацца групе з пяці чалавек для арганізацыі партызанскага руху. У яе склад трапіў і я, малодшы лейтэнант артылерыі, паколькі меў вопыт вядзення баявых дзеянняў яшчэ з часоў фінскай кампаніі. Мяне прызначылі старшым групы. У лесе паміж вёскамі Чырвоны Бераг, станцыяй Тошчыца і паўстанкам Залатое Дно мы развіталіся з байцамі і генералам. Фронт у той час праходзіў па Дняпры, і ў вёсках было поўна гітлераўцаў. Каля вёскі Чырвоны Бераг пазнаёміліся з камсамольцамі Васілём Каваленкам, Мікалаем Сідарэнкам і піянерам

Быховский районный историко-краеведческий музей

Пецем Каваленкам. Яны дапамаглі ўстанавіць сувязь з былым старшынёй сельскага Савета П. П. Федзячэнкам, акружэнцам Іванам Вараб'ёвым. З іх дапамогай правялі першыя баявыя аперацыі: падарвалі на станцыі Тошчыца аўтамашыну з гітлераўцамі, на дарозе Камарычы — Чырвоны Бераг аўтамашыну з боепрыпасамі, перарэзалі тэлефонную сувязь. Гітлераўцы занепакоіліся, на прачоску навакольных лясоў кінулі палявую жандармерыю. П. Качуеўскаму, С. Розенбергу, С. Праскурыну, М. Андрушкевічу і мне давялося перайсці ў лясы Чэрыкаўскага і Прапойскага раёнаў. На Быхаўшчыну вярнуліся вясной 1942 г. Аднавіўшы сувязь са сваімі старымі знаёмымі, пачалі ствараць партызанскі атрад. Людзі да нас ішлі ахвотна. З дапамогай сялян адшукалі каля в. Лазаравічы гаўбічныя снарады, потым здабылі магнета ад трактара, тэлефонны провад. Стварылі дыверсійную групу з дзесяці чалавек. Разведалі подступы да 15-га раз'езда, станцыі Тошчыца і паўстанка Залатое Дно.

І вось мы, дзевяць чалавек — К. Кораткаў, В. Крывашэеў, А. Таўстапятаў, В. Салаўёў, М. Зямлянаў, Д. Аўчыннікаў, І. Бабкоў, В. Кузьмін і я — першы раз на чыгунцы. Хвалявaліся і за самаробны ўзрывальнік і за дзеянні кожнага з нас. Аднак усё прайшло ўдала, пад адхон паляцеў першы варожы цягнік.

На працягу чэрвеня — жніўня 1942 г. мы падарвалі 12 фашысцкіх эшалонаў. Апошні з іх складаўся з 12 класных вагонаў і 6 платформ, на якіх стаялі легкавыя машыны. Пазней мы даведаліся, што ў ім перабіраўся штаб танкавага корпуса. Пры падрыве «штабнога» эшалона былі значыліся Крывашэеў, Кораткаў і Таўстапятаў. Гітлераўцы не маглі дараваць нам такога. На знішчэнне партызан былі кінуты карніцкія атрады. Уступаць у адкрыты бой з такой сілай невялікай жменьцы партызан не было сэнсу, і мы адышлі ў Клічаўскія лясы.

З успамінаў М. П. Куракіна, былога камандзіра 425-га партызанскага атрада, члена Быхаўскага падпольнага райкома партыі

З-за лініі фронту ў Быхаўскі раён я прыбыў з групай таварышаў 15 кастрычніка 1941 г. Нашай задачай было ўстанавіць сувязь з адданымі Радзіме людзьмі, каб разам распаліць агонь партызанскай барацьбы супраць фашысцкіх акупантаў.

Людзі нас сустрэлі радасна, з надзеяй. Рызыкуючы сваім жыццём і жыццём блізкіх, на шлях барацьбы з моцным і каварным ворагам сталі сапраўдныя патрыёты Аляксандр Рудкоўскі і яго жонка Соф'я з в. Макранскія Хутары, Марыя Маліноўская з в. Людкоў, Трыфан Карпікаў, Акім Гарбачоў і Захар Краўчанка з в. Сарочына, Мікалай Караткевіч з в. Касічы, Настасся Хачкова з в. Глухі, Цімафей Зібераў і Іван Шындрык,

М. А. Трусноў.

М. П. Куракін.

жыхары в. Гарадзец наладзілі сустрэчу з настаўнікам, членам партыі з 1919 г. Мікалаем Носаравым, які знаходзіўся ў лесе з першых дзён акупацыі. Потым прыйшлі да нас з в. Гарадзец Фёдар Лукашоў, Трафім Міхасёў і акружэнец лейтэнант Носаў.

Зброяй мы запаслісся ў першыя ж дні прыбыцця ў Гарадзецкі лес. Іван Шындрык здабыў нават станковы кулямёт. Сувязному Зібераву ўдалося раздабыць радыёпрыёмнік. Мы рэгулярна пачалі прымаць зводкі Саўінфармбюро, перапісвалі іх і разам з нашымі заклікамі да насельніцтва распаўсюджвалі ў навакольных вёсках і ў Быхаве. Фашысты занепакоіліся. Здраднікі Радзімы амаль дакладна ўказалі ворагам месца нашай дыслакацыі. Ды не ўдалося ім знішчыць нашу групу. На пэўны час давялося змяніць стаянку, а ў красавіку 1942 г. зноў вярнуліся на ранейшую базу. Трымалі цесную сувязь з насельніцтвам, і ў гэтым была наша сіла. Разгром Глускага, Кіпяцкага і Лубяніцкага маслазаводаў, Касіцкага нарыхтоўчага пункта сельскагаспадарчых прадуктаў, паліцэйскіх участкаў у Гарадцы, Студзёнцы, Мокрым, Касічах і іншых вёсках — няпоўны пералік баявых дзеянняў нашага атрада.

У распрацоўцы баявых аперацый і іх выкананні заўсёды самы актыўны ўдзел прымаў Ілья Яўменавіч Трылеснік, былы старшыня Студзёніцкага сельсавета, з якім мы разам прыйшлі з-за лініі фронту. Бой 14 ліпеня 1942 г. быў апошнім у жыцці партызана-камуніста. Кучынскі паліцэйскі гарнізон вырашана было знішчыць нашым атрадам і атрадам М. К. Марусава. Партызаны ноччу ўзялі вёску ў кальцо. Ілья Яўменавіч з групай партызан заняў пазіцыю паміж в. Кучын і шашэйнай дарогай. Не было сумнення, што ворагі будуць рвацца да шашы, каб выйсці з агнявога мяшка. Паліцаі жорстка супраціўляліся. У бой уступіла група Трылесніка, заціскаючы ворага ў клешчы. У схватцы партызаны не заўважылі, як адзін з паліцаяў схаваўся за пнём. І калі Ілья Яўменавіч падняўся ва ўвесь рост і з

Быховский районный историко-краеведческий музей

І. Я. Трылеснік.

С. Е. Падольцаў.

крыкам «Кідай зброю, рукі ўгору!» кінуўся на ворага, з-за ніня пачалі страляць...

Партызаны адпомсцілі за смерць смелага партызанскага важака, Кучынскі гарнізон быў разгромлены: 15 здраднікаў забіта, 28 паранена. На дапамогу паліцаям прыбыло падраздзяленне гітлераўцаў. Мясцовым жыхарам удалося пераканаць іх, што партызан у вёсцы не было, паліцэйскія самі ў п'яным выглядзе ўчынілі паміж сабой перастрэлку. Гітлераўцы, разлаваўшыся на недысцыплінаванасць сваіх прыслужнікаў, расстралялі яшчэ дванаццаць паліцаяў.

Маральнай сілай і падтрымкай партызан былі жыхары навакольных вёсак. Ад іх мы ведаем аб задумах ворага. Рызыкоўная і небяспечная работа патрабавала ад нашых людзей вялікай мужнасці. У 1942 г. арыштавалі ў в. Касічы Мікалая Караткевіча. Ён вытрымаў нечалавечыя катаванні, але аб месцы знаходжання партызан не сказаў ні слова. Загінулі таксама нашы сувязныя Вера Самалётава з в. Сядзіч, Ганна Бараноўская з в. Холстаў, Цімафей Зібераў і Іван Шындрык з в. Гарадзец, Ігнат Бараноўскі з в. Трасцівец і многія іншыя патрыёты. Гэтыя людзі выканалі свой грамадзянскі абавязак, ахвяравалі сваім жыццём у імя Перамогі.

Паўпрэды райкома

Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Быхаўскага раёна ў гады Вялікай Айчыннай вайны Сяргей Ерафеевіч Падольцаў нарадзіўся ў 1897 г. ў в. Гадзілавічы Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці. Член КПСС з 1925 г. З 1916 г. ў арміі, з 1918 г. працаваў у міліцыі, старшынёй сельсавета, загадчыкам аддзела Гарадзецкага райвыканкома. З 1925 г. на розных пасадах у сістэме спажыўкааперацыі, з 1934 г. ўпаўнаважаны Народнага камісарыята нарыхтовак па Быхаўскім раёне. З 1940 г. С. Е. Падольцаў — другі сакратар Быхаўскага райкома КП(б)Б. Напярэдадні акупацыі гітлераўцамі Быхаўскага раёна быў пакінуты ў тыле для арганізацыі падпольнай работы і партызанскага руху разам з дырэктарам Кузькавіцкай МТС А. П. Тамілам. У ліпені 1941 г. на шклозаводзе «Ільіч» у в. Ветранка стварыў патрыятычную групу, якая ў жніўні 1941 г. выйшла ў Дабужскі лес і пачала свае баявыя дзеянні супраць фашысцкіх захопнікаў. Правёў работу па разгортванню партызанскага руху, арганізацыі падпольных партыйных камітэтаў. Разам з А. П. Тамілам аказаў дапамогу камандаванню 3-й арміі выйсці з акружэння на злучэнне з часцямі Чырвонай Арміі. У 1942 г. пасля сканчэння спецшколы Цэнтральнага штаба партызанскага руху С. Е. Падольцаў і А. П. Таміла накіраваны ў Быхаўскі раён. Пры спробе пераправіцца па правы бераг Дняпра каля в. Янава трапілі на варожую засаду і загінулі. На месцы гібелі С. Е. Падольцава і А. П. Тамілы пастаўлены помнік. У гонар С. Е. Падольцава в. Сцяпанькава Быхаўскага раёна перайменавана ў Падольцава.

* * *

Пра гібель паўпрэдаў райкома С. Е. Падольцава і яго вернага сябра А. П. Тамілу існуе некалькі версій. Адну з іх прапануем паводле ўспамінаў былога сакратара Быхаўскага падпольнага райкома партыі Ф. П. Падаляна.

У пачатку ліпеня 1942 г. былы другі сакратар Быхаўскага райкома партыі і былы член райкома партыі дырэктар Кузькавіцкай МТС А. П. Таміла, якія па заданню ЦК КП(б)Б былі закінуты з савецкага тылу ў Быхаўскі раён, наважыліся пераправіцца на правы бераг Дняпра. Неабходна было ведаць і трымаць пад кантролем становішча і ў правабярэжнай частцы раёна. На супрацьлеглым беразе раскінуліся вёскі Тайманава, Янава. Сяргей Ерафеевіч добра ведаў многіх іх працаўнікоў яшчэ з даваеннага часу. Явачная кватэра знаходзілася непадалёку ад Дняпра. Пераправіўшыся на супрацьлеглы бераг, Падольцаў і яго сябар трапілі на засаду. «Жывым не здавацца!» — паспеў сказаць сакратар. «Я прыкрыю, адыходзь»,— адказаў яму Таміла.

Беглі ў бок лесу, час ад часу залягаючы, каб выстраламі затрымаць пагоню. Сяргей Ерафеевіч кінуў гранату. У гэты момант яго моцна апякло, ён хацеў сказаць сябру, што паранены, ды не змог. Толькі ледзь прамовіў: «Бяжы!» Прагучаў выстрал з пісталета, у адказ — доўгая аўтаматная чарга...

Паліцэйскія доўга здзекаваліся над целамі Падольцава і Тамілы. Потым на фурманцы павезлі загінуўшых у Быхаў. Там у двары ацэтонавага завода іх кінулі ў яму і закапалі...

Быховский районный историко-краеведческий музей

На левым беразе Дняпра

З успамінаў П. І. Бажэнава, былога партызана атрада Г. І. Сазонава

П. І. Бажэнаў.

Тэхнік-інтэндант другога рангу, я быў кантужаны ў палтаўскім «катле» ў кастрычніку 1941 г. і трапіў у палон. Разам з сябрам — старшынёй Мікалаем Самарыным — чатыры разы спрабаваў уцячы з розных лагераў (адзін раз з самага страшнага на Украіне — Крамянчугскага). Апошні ўцёк 6 красавіка 1942 г. з лагера г. Александрыя Кіраваградскай вобласці быў удалым. Кірунак ўзялі на Беларусь. Пакуль дабраліся да Быхаўшчыны, нацярпеліся шмат прыгод, цудам вырываліся з лапаў гітлераўцаў. Ад сялян даведаліся, што ў Хачынскім лесе знаходзяцца партызаны, якія актыўна дзейнічаюць. Па дарозе каля хутара Пчэльня сустрэліся з Васілём Марозавым і Мікалаем Сядовым — дэсантнікамі з групы лейтэнанта Мікалая Іванова, закінутымі сюды ў сакавіку. Тут і спыніліся, пачалі збіраць зброю. А ў пачатку чэрвеня жыхар Пчэльні Кузянкоў перадаў Марозаву, што з ім хоча сустрэцца чалавек. На сустрэчу пайшлі з Марозавым. Чалавек, які назваўся Багамазам (гэта быў Ілья Пятровіч Памятнёў), паведаміў, што днямі высадзілася дэсантная група Сазонава і з ёю аб'ядналіся групы — яго, Курпачэнкі і Гаўрылава. Камандзіру групы дэсантнікаў Сазонаву вядома месцазнаходжанне групы Іванова, і ён, Багамаз, упаўнаважаны дамовіцца з намі аб сустрэчы. На наступны дзень каля в. Смаліца мы ўліліся ў атрад Сазонава. Камісарам стаў батальённы камісар Пялінь, начальнікам штаба — Курпачэнка. Памятнёў, які меў добрую сувязь з Магілёвам, стаў памочнікам Сазонава па разведцы і арганізацыйных пытаннях. Атрад пачаў баявыя аперацыі па ачыстцы раёна ад гітлераўцаў і паліцэйскіх. З Гіжэнскага лесу мы даставілі дзве 45-мм гарматы, снарады да іх, некалькі мінамётаў, станковыя і ручныя кулямёты, патроны. Пазней на шашы захапілі дзве варожыя аўтамашыны, на якіх з прычэпленымі гарматамі ездзілі на аперацыі. Па раёне пайшлі чуткі, што ў Дабужскім лесе высаджаны буйны дэсант. Да нас сталі ісці акружэнцы, ваеннапалонныя, мясцовае насельніцтва. У лес прыйшлі ўсе жыхары рабочага пасёлка Ветранка, большую частку якога складалі рабочыя шклозавода «Ільіч». Сярод іх сем'і Мурашовых, Коцікавых, маладыя дзяўчаты Дзіна Буранкова, Жэня Рыбакова, піянеры Сярожка Счысленак і Марат Казлоў, якія сталі мужнымі партызанамі, сапраўднымі героямі.

Дзякуючы значнаму колькаснаму росту атрада нам пад сілу сталі больш буйныя і значныя аперацыі. Так, у чэрвені 1942 г. быў разгромлены карны атрад маёра Генрыха Саада. Гэты мацёры эсэсавец быў узнагароджаны жалезным крыжам. Кіраваў аперацыяй лейтэнант Курпачэнка. Тады ж быў забіты здраднік і кат Ува, былы начальнік Грудзінаўскай паліцыі, а потым памочнік каменданта Быхава.

Пасля разгрому карнага атрада фашысты сталі штодзённа бамбіць лес і в. Ветранка. Аднойчы «юнкерс» на развароце зачапіўся крылом за дом і разбіўся. Нашы мінёры замініравалі трупы лётчыкаў, і яшчэ восем фашыстаў падарваліся, калі прыехалі на бронетранспарцёрах падабраць забітых.

У пачатку ліпеня сяржанту Малькову, які з групай вяртаўся з задання, удалося падбіць з ручнога кулямёта варожы самалёт Ме-109, які на невялікай вышыні з'явіўся над партызанамі. [Ад рэдакцыі: паводле ўспамінаў А. А. Гарчакова (глядзі артыкул «Полет Красницы») самалёт збіў кулямётчык А. Пакаціла. Не выключана, што так яно і было, паколькі агонь па самалёце вялі партызаны розных груп і з розных кропак.] Самалёт упаў каля в. Следзюкі, лётчык застаўся жывы, і яго немцы адвезлі ў Быхаў. Фашысты за дзёрзкасць партызан адпомсцілі мірнаму насельніцтву. Яны акружылі в. Красніца, якая знаходзілася ад лесу за 6—8 кіламетраў, і спалілі яе разам з жыхарамі.

Не спыняліся баявыя дзеянні нашых партызан і на шашэйных дарогах. У жніўні на шашы Гомель — Магілёў на міне падарвалася аўтамашына з фашысцкімі генераламі. З засады на шашы Масква — Варшава былі расстраляны дзве легкавыя машыны з афіцэрамі.

Баявыя дзеянні партызан усё больш і больш прыцягвалі патрыётаў з мясцовага насельніцтва. Неўзабаве з атрада Сазонава быў выдзелены атрад Курпачэнкі, а з атрада Мардашкіна — атрад лейтэнанта Дзюбы. З прыходам да нас атрада Фралова на левабярэжжы была арганізавана брыгада пад камандаваннем Сазонава. У яе ўвайшлі атрады Сазонава «Сокал», Мардашкіна «Голуб», Курпачэнкі «Стары», Дзюбы «Арол», Сямёнава «Чайка». З новымі сіламі партызаны ўда-

Быховский районный историко-краеведческий музей

ла правялі аперацыю «Маскарад» па разгрому паліцэйскага гарнізона ў Чырвоным Асаўцы, які прымаў удзел у знішчэнні Красніцы.

У нядзелю, калі ў гарнізоне праводзіліся заняткі (зборы), аўтамашына з пераапранутымі партызанамі (А. Гарчакоў у форме афіцэра СС, пяць чалавек у форме нямецкіх салдат, астатнія — з павязкамі паліцэйскіх на рукавах) пад'ехалі да вёскі. Кулямётны разлік, убачыўшы ў кузаве «нямецкіх» салдат і афіцэра, прапусціў нас да школы, дзе размяшчалася ўправа. «Немец» і «перакладчык» — Гарчакоў і Курпачэнка — узышлі на ганак школы, дзе іх сустрэлі ўраднік і староста. Каля аўтамашыны засталіся два кулямётныя разлікі, я спыніўся ля плота, каб трымаць пад прыцэлам вуліцу і кулямётчыкаў на яе ўскрайку. Лейтэнант Казакоў непрыкметна разгарнуў у кузаве хуткастрэльны кулямёт на трынозе. Каля задняга борта машыны сядзеў Персідскі са сваім станкачом. «Перакладчык» запрасіў паліцэйскіх ва ўправу. Калі яны пераступілі парог сенцаў, чацвёра партызан адабралі ў іх зброю. Кулямётчыкаў у вёсцы знялі без шуму. Так быў прыведзены ў выкананне прысуд здраднікам Радзімы.

У канцы жніўня партызаны брыгады адначасова нанеслі ўдар па двух буйных паліцэйскіх гарнізонах у Ніканавічах і Кузькавічах (у Кузькавічах загінуў мой зямляк кулямётчык Малькоў). У першыя дні верасня партызаны напалі на гарнізон у вёсцы Бахань.

У нас была і яшчэ адна моцная зброя, ідэалагічнага характару — партызанская кінаперасоўка і два кінафільмы: аб жыцці і дзейнасці С. М. Кірава і «Аляксандр Неўскі». Усё гэта багацце мы знайшлі ў заводскім клубе. За чатырыста кіламетраў ад фронту па сёлах левабярэжнай Быхаўшчыны раз'язджала кінаперасоўка. У час наступлення гітлераўскіх войск на фронце жыхары акупіраванай ворагам мясцовасці глядзелі сімвалічны фільм аб разгроме нямецкіх псоўрыцараў на Чудскім возеры. Як клятва, як заклік з экрана гучалі словы: «Хто з мячом да нас прыйдзе, той ад мяча і загіне!» Фашысты неадступна палявалі за кінаперасоўкай, але завалодаць ёю так і не змаглі. «Аляксандр Неўскі» ідзе на баявую аперацыю»,— гаварылі партызаны, калі кінамеханік грузіў сваю тэхніку на фурманку. Так яно і было на самай справе. І лепшай агітацыі нельга было прыдумаць. А пакуль ішоў фільм, партызаны з кулямётамі ахоўвалі падыходы да вёскі.

...Праз два дні пасля разгрому гарнізона ў в. Бахань часці 28-га механізаванага корпуса СС пачалі карную аперацыю супраць партызан. Атрад Фралова сустрэў ворага яшчэ на далёкіх подступах да лесу ў раёне в. Боўкі і на дарозе з Красніцы на Трылесіна. Пасля цяжкага бою партызаны па балоце адышлі ў лес каля в. Дабужа, дзе знаходзіліся нашы галоўныя сілы. Вораг наступаў. Пачаўся бой за лес. Маючы толькі лёгкае ўзбраенне мы не маглі доўга супрацьстаяць адборным эсэсаўскім часцям. Замініраваўшы дарогу, атрады адышлі за раку Ухлясць. Ноччу фарсіравалі раку Проню і ўвайшлі ў Гіжэнскі лес. За Сожам Сазонаў прыняў рашэнне групамі прабірацца ў Клятнянскія лясы на Браншчыну...

Попел Красніцы

З успамінаў былога партызана-разведчыка А. А. Гарчакова

А. А. Гарчакоў.

Вядомы савецкі празаік і кінадраматург Авідзій Аляксандравіч Гарчакоў у гады Вялікай Айчыннай вайны прайшоў лясны мі дарогамі Беларусі шмат кіламетраў у складзе 1-й Быхаўскай партызанскай брыгады. Правобразамі многіх герояў кніг пісьменніка сталі сябры-партызаны, баявыя паплечнікі па зброі.

Наша дыверсійна-разведвальная група ездзіла ноччу на гаспадарчую аперацыю пад Чавусы. У лагер вярнуліся апоўдні. Вартавы ля Гарбатага моста, здаровы хлопец з Красніцы, стаяў на пасту і плакаў. У адказ на нашы педаўменныя пытанні ён сказаў:

— Фашысты спалілі Красніцу... Сёння раніцай... З усімі жыхарамі...

Гэта вестка аглушыла нас. Мы нібы пачулі крыкі людзей, гул пажару, трэск пальбы, лямант звар'яцелых ад лютасці і страху немцаў і паліцаяў. І ліпеньскі поўдзень пацямнеў раптам.

— Усіх? — перапытваў я вартавога, які сутаргава ўчапіўся ў бакавіну воза.

— Пагалоўна! — адказаў вартавы мёртвым голасам.— Вось жа справа выйшла. Памятаеце, Сашко Пакаціла самалёт іхні збіў над Красніцай?

Быховский районный историко-краеведческий музей

Вось за тое і спалілі эсэсаўцы ўсю нашу вёску да сіняга пораху...

Кулямётчыка Сашко Пакаціпу мы ўсе добра ведалі. Лейтэнант-акружэнец, ён адным з першых прыйшоў у мясцовы атрад Якава Аксёнавіча Курпачэнкі. Памятаю, як яму ўдалося збіць той «месер». Наша група сустрэлася ў тую раніцу непадалёку ад Красніцы з групай Аксёнавіча. Мы вярталіся дамоў, у лагер, пасля мініравання шашы Магілёў — Гомель, а Аксёнавіч ноччу «раскурочыў» маслазавод, здаецца, у Доўгім Моху. Стаім, курым, а тут якраз гэты «Ме-109» ляціць з усходу амаль на брыючым. Ясна бачым нумар на фюзеляжы, чорныя крыжы на крылах, свастыку на хвасце, абведзеную жоўтай фарбай. «Ме-109» — аднаматорны знішчальнік, скорасць — да шасцісот кіламетраў у гадзіну, узброен гарматай і двума кулямётамі.

— Дазволь — спалохаю,— гаворыць Пакаціла Аксёнавічу, здымаючы «ручнік» з пляча.

— Дазваляю,— адказвае,— калі саб'еш.

РПД мог паражаць самалёты на дыстанцыях да пяцісот метраў. Рабіў ён да васьмідзесяці выстралаў у мінуту. Звычайна дазвалялася страляць кароткімі чэргамі.

Сашко Пакаціла ўстанавіў прыцэл, паклаў дула «дзегцяра» на плячо нашага атраднага волата Віцькі Токарава, прыцэліўся як след (на сто метраў вышыні — адзін корпус самалёта апярэджання), даў доўгую на ўвесь дыск чаргу, цэлячыся ў матор і ў жоўтае кляпанае чэрава, і ўсе мы са здзіўленнем убачылі, як «месер» распусціў чорны шлейф дыму і пайшоў на вымушаную пасадку. Прызямліўся «месер» далёка за пералескам, і мы не паспелі схапіць пілота. Паранены, ён дабраўся да свайго аэрадрома пад Старым Быхавам і ўсё расказаў. Немцы адразу змянілі сваю паветраную трасу, якая пралягала паміж Старабыхаўскім і Сешчынскім аэрадромамі акурат над Красніцай, у той жа дзень пачалі аблёт і бамбёжку нашага Хачынскага лесу.

Сашко Пакаціла хадзіў змянінікам.

— Ну, Сашка, ордэн Айчыннай вайны першай ступені табе забяспечан! — гаварылі яму хлопцы.— Уяўляеш, колькі бензіну і бомб фрыцы патрацяць на наш лес?!

Толькі Аксёнавіч не радаваўся разам з усімі.

— Баюся, каб гады не адпомсцілі Красніцы,— шчыра прызнаўся ён.— У мяне ў гэтай Красніцы многа родных, і родная Смаліца побач. А фашысты любяць помсціць.

І вось Красніцы больш няма.

— Народ увесь у лугах працаваў,— расказваў скрозь слёзы хлопец з Красніцы,— адны старыя ў вёсцы заставаліся, калі германы панаехалі. Тады гэтыя гітляругі падманам паслалі дзядоў па жыхароў: няхай, маўляў, усе спакойна прыйдуць на сходку, зямлю дзяліць будуць. А хто не прыйдзе, таму і зямлі не будзе. І старыя, курыная слепата, паверылі душагубцам, угаварылі народ. А калі сабраліся ўсе, вось тут і пачалося. Акружылі, мужыкоў амаль усіх у калгасную пуню загналі і там расстралялі. Астатніх па хатах развялі і забіваць пачалі чым папала — гранатамі, з аўтаматаў, з кулямётаў. Усіх падпалілі, усю вёску спалілі. У нашай сям'і, акрамя мяне, сямёра душ было, малодшай сястрычцы, Алесі, годзік усяго. Нікога ў мяне на свеце не засталося. Падмяніў бы з вас хто мяне, а? Прыбраць хоць костачкі...

Усе мы адразу павярнулі нашы вазы з ларогі, якая вяла да лагера, скінулі ўвесь наш груз і пагналі коней ва ўсю моц праз Гарбаты мост па Хачынскім шляху ў Красніцу.

...Яны стаялі ўздоўж Хачынскага шляху, які перасякаў Красніцу. Жанчыны ўсіх узростаў — маладухі-салдаткі, цёшчы і свякрухі, старыя прабабкі, белагаловыя дзеці, падлеткі. Не так ужо часта заязджалі да іх немцы, толькі летам мінулага года, у ліпені, прамчаліся на ўсход, у Прапойскі раён, у абход Магілёва. Усе яны, жыхары Красніцы, былі суседзямі, добра ведалі адзін аднаго. Стаялі ў даматканых кашулях, спадніцах і штанах, у лапцях з белымі анучамі і чорнымі аборамі, але больш — босыя. Глуха хвалявaўся натоўп. Усіх не арыштуюць... Мы ні пры чым. Мы іхнія законы не парушалі. Гады! Напэўна, будуць браць заложнікаў. На машынах прыехалі — могуць адвезці ў лагер, а то і ў нямеччыну пагоняць. Не, машыны ў іх бітком набітыя, у машынах яны самі едуць. Можа, народ за машынамі пагоняць?

— Шнэль! Раус! Шнэллер!..

Эсэсаўцы выкрыквалі нейкія каманды, перастройваліся, устанавілі два буйнакаліберныя кулямёты, некалькі ручных. А потым раптам пасыпаўся на натоўп свінцовы град. Сарваліся з дахаў і паляцелі чорна-белай чарадой буслы і вароны. Крыкі і плач заглушылі кулямётныя і аўтаматныя чэргі. На тварах ахвяр застывалі пакуты, жах, здзіўленне. Сціхалі крыкі, стогны і плач, перадсмяротныя хрыпы.

Па камандзе эсэсаўцы рассыпаліся па вёсцы. Цяпер расстрэльвалі людзей у дварах і хатах. Дабівалі хворых і старых. Забівалі дзяцей у калысках. Кідалі гранаты ў скляпы. Хто не загінуў ад гранаты, паміраў ад дыму. Прачэсвалі шквалам аўтаматнага агню гарышчы. Паліцаі выганялі на вуліцу кароў, коней, жывёлу. Потым эсэсаўцы падпальвалі хаты бутэлькамі з самазапальнай сумессю, аблівалі старыя сасновыя бярвёны бензінам з аўтамабільных каністраў. Над вёскай валіў дым — чорны, шэры, жоўты. Некаторыя спрабавалі ўцячы праз агароды, але ўсюды былі расстаўлены кулямётчыкі. Аўтаматчыкі прастрэльвалі нават барозны паміж градкамі на агародах. Ад гарачыні лопаліся шыбы ў вокнах. Вогненны смерч скручваў целы зажыва спаленых. Цяжкі смурод паплыў па вёсцы. Быццам чорны

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

снег, ляцелі камякі гару, і сонца свяціла, як у час зацьмення...

Калі мы прыехалі ў Красніцу, папялішча яшчэ дымілася. Я падышоў да знаёмых веснічак. Яны былі сарваны, а за імі — нічога. Адна печ ды груды абпаленых бэлек дымяцца. І пачарнелыя кусты і дрэвы ў палісадніку са скручанай лістотай. Я агледзеўся. Усё знікла! Ветлівыя жыхары Красніцы. Старыя дзедаўскія хаты з вокнамі, якія сустракалі столькі пагодлівых і пахмурных досветкаў. З запечнымі цвыркунамі і гнёздамі. З вячэрнімі спеўкамі дзяўчат. Асірацелыя сцежкі, па якіх яшчэ ўчора тупалі ружовыя пяткі мурзатых малышоў... Цяпер абрываюцца гэтыя сцежкі на краі чорнага пажарышча. Сотні чалавечых сэрцаў, якія раптам перасталі біцца, чалавечыя косці ў яшчэ гарачым попеле...

Па вуліцы наш атрадны ўрач Юрый Мікітавіч Мурашоў і яго жонка медсястра Люда вядуць пад рукі сівую жанчыну з перавязанай парашутным шоўкам галавой. І рукі ў яе ў бінтах. Страшным голасам крычыць яна:

— Дзіцячыя анёлавы душы іх праклялі! Будзьце вы праклятыя, праклятыя, праклятыя!..

— Адна з сям'і засталася,— шэпча мне ўрач, выціраючы пот з твару.— Звяр'ё! Звяр'ё! Сто дзевяноста восем двароў — дашчэнту. Амаль дзвесце чалавек! Цудам выратаваліся Шадзькоў Сямён, Зеляпужын Яўціхій, Бекарэвіч Ганна, Перапечына вось Лукер'я...

Губы ва ўрача трасуцца, позірк амаль такі ж вар'яцкі, як у Лукер'і... Амаль дзвесце чалавек!

Ці мог тады ведаць Юрый Мікітавіч, што такі ж лёс напаткаў і яго пасёлак Ветрынку, з якога ён пайшоў да нас у атрад, рабочых цыклозавода «Ільіч», якіх ён лячыў да вясны сорак другога.

Наша партызанка-разведчыца Вера Бекарэвіч плача, цалуе абпаленыя рукі старой маці, абдымае пляменнікаў — Уладзіка і Лёню. Яны ў шоку, глядзяць дзіка — бабуля іх з агню выцягнула...

На дарозе, у пыле валяюцца рамкі з рэшткамі мёду. Гэта падпальшчыкі, факельшчыкі аб'ядаліся ім. Аб'ядаліся і сплёўвалі воск. Не смак мёду — смак попелу адчуваўся ў роце. З калодзежа вады не выпеш... Забіта чыстая крыніца чорным попелам. За абгарэлай яблыняй паказаліся двое. Наперадзе з пачарнелым тварам ідзе Валодзя Шчаўкуноў. За ім... ды гэта Лявон Сілівонавіч! Яны нясуць, як насілкі, сарваныя з петляў веснічкі, а на іх штосьці чорнае, абпаленае, скурчанае. Не, я не магу, у мяне не хапае сіл на гэта глядзець!..

Рукі ў дзеда абпалены, у вялікіх пухірах і струпах — капаўся, відаць, у вуголлі, у сажы белая барада. Запэцканая сажай кашуля расшпілена на ўпалых грудзях, на шыі вісіць медны крыж на суравым шнурку. Позірк вар'яцкі, рот скошаны ў крывой усмешцы.

— Уся вось згарэла,— мармыча ён, падымаючы на мяне блакітныя вочы, поўныя слёз.

— Дзявочы залаты пярсцёнак амаль зусім расплавіўся, а пацеркі я сабраў... Нітка згарэла, дык я пацеркі сабраў. А я, стары, цэлы!.. Яе няма, а я цэлы!.. Выходзіць, няма бога! Ці памёр ён?.. А пчолы бунтуюцца, бунтуюцца пчолы...

Я штосьці гавару дзеду, але дзед не чуе мяне. А Шчаўкуноў — на яго рукі таксама страшна глядзець — мёртвым голасам выдыхае:

— Ён на лясной пасецы быў, таму і застаўся жывы. Звар'яцеў дзед...

А ў Валодзькі вочы таксама вар'яцкія:

— Капаліся ў вуголлі. Ад болю, разумееш, сэрца ў мяне ў абпаленых руках білася. І здавалася мне, быццам гэта яе сэрца ў вуглях...

Ледзь чутна хрыпіць стары:

— Я бачыў іхні флаг фашысцкі — чырвоны, чорны і белы. Чырвоны агонь, чорныя вуглі, белыя косці...

Я не магу глядзець на Лявона Сілівонавіча і на Валодзю. І на тое, што на насілках.

А ўдалечыні, заміраючы, разносіцца над папялішчам праціпаючы душу крык: — ...праклятыя, праклятыя, праклятыя!..

Пад светлым попелам пульсуе, успыхвае языкамі жар. Абпаленыя вянцы, кавалак старажытнай іконы Хрыста-збавіцеля з чорнай ад дыму фольгай.

У велізарнай брацкай магіле — не брацкай, бадай, а сямейнай, агульнавясковай — хавалі мы абпаленыя астанкі. Дацямна быў я на пажарышчы, варочаў яшчэ тлеючыя галоўкі бэлек, разам з партызанам з Красніцы, які стаў у адзін дзень круглым сіратой, выносіў у плашч-палатцы печыя абгарэлыя астанкі. Пот змываў куродым з нашых твараў, пёк абпаленыя рукі, капаў на зморшчаныя ад гарачыні, вымазаныя сівым попелам боты.

Цямнее. І тут і там чырвона і злосна мігцяць вуглі. Над змрочным пажарышчам, цяжка ўздыхваючы ружовымі ў апошніх промнях сонца крыламі, пралятае бусел. На шляху ясны след ад нямецкіх машын — бюсінгаў, опеляў, адлераў... і ўсюды — сляды вермахтаўскіх ботаў. Іх змые першы ж летні дождж. У тую мінуту мне вельмі захацелася пайсці па слядах карнікаў, дагнаць іх, забіваць, бязлітасна забіваць...

Праз многа гадоў пасля вайны, працуючы ў нашых ваенных архівах над трафейнымі нямецкімі дакументамі, я знайшоў сакрэтныя загады тых, хто спаняляў Красніцу. Імя галоўнага ката: СС-обергрупенфюрэр і генерал паліцыі Эрых фон дэм Бах-Зялеўскі.

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

Бой у Ніканавічах

З успамінаў А. А. Гарчакова

У лясным лагеры на беразе вірастай рачулкі Ухлясць заканчвалася падрыхтоўка да буйной аперацыі — адначасовага разгрому пяці варожых гарнізонаў на мяжы нашай маленькай «Хачынскай партызанскай рэспублікі». Найбольшы з іх быў Ніканавіцкі гарнізон (у гэтым апорным пункце ворага стаяла каля васьмідзесяці гітлераўцаў на чале з фельдкамендантам).

У тую ноч, 28 жніўня 1942 г., я, васемнаццацігадовы партызан, упершыню камандаваў групай разведкі. Да нашага галаўнога атрада Сазонава далучыліся партызаны 620-га асобнага атрада імя В. І. Чапаева. У поўнач у Ніканавічы ўвайшлі, скарыстаўшы тактыку «партызанскіх абцугоў», штурмавыя групы Кухарчанкі з захаду і Дзюбы з усходу. Бой завязаўся па правым флангу ў Кухарчанкі. Праз паўгадзіны мы, разведчыкі і кулямётчыкі, далучыліся да атрада Дзюбы і пачалі выбіваць гітлераўцаў з двароў. З Валодзем Шчаўкуновым кінулі гранаты ў цёмныя праёмы разбітых вокнаў аднаго дома і самі нырнулі ў іх. Ліхтарыкамі высвецілі жоўты чамадан, на стале стос дакументаў. Хуценька засунуўшы іх у чамадан, падалі яго праз акно палітруку Палявому.

Тры гадзіны прайшло пасля першага выстралу. Фашысты ўпарта супраціўляліся, засеўшы ва ўцалелых дамах, чакалі раніцы, а з ёй і дапамогі (яны не ведалі, што чатыры бліжэйшыя гарнізоны таксама былі ахоплены агнём). Кальцо вакол ворагаў сціскалася ў цэнтры вёскі. Байцы Кухарэнкі і Дзюбы падпальвалі дамы бутэлькамі з гаручай сумессю. Але моцны агонь з дзота прымусіў байцоў Дзюбы залегчы.

— Уперад! — крыкнуў Жорка Яўсеенка.— Бі гадаў!

У гэты момант каля яго ўпалі дзве нямецкія гранаты. Яўсеенка імгненна падхапіў іх і адкінуў назад. Не паспеў ён упасці на зямлю, як трэцяя граната з доўгай ручкай ударыла яго ў грудзі і, адскокваючы, узарвалася. Мяне адкінула, абдаўшы калючым гарачым пылам. Калі падняўся, убачыў партызан з баявой групы Кухарчанкі і Палявога, з якімі непрыкметна злучыліся ў цэнтры вёскі. «Уперад!» — паднімае байцоў Палявы. І тут мы ўбачылі такое, што на ўсё жыццё ўрэзалася ў памяць. На краі дарогі рантам падняўся ва ўвесь рост чалавек з вінтоўкай. Стральба прыціхла, і мы пачулі словы «Это есть наш последний и решительный бой...». Партызаны ўслед за ім узняліся ў атаку. Аднак агонь з амбразуры дзота на тым баку вуліцы зноў прыціснуў усіх да зямлі. На дарозе застаўся ляжаць адзін наш партызан.

«Коцікаў! Коцікаў!» — крычыць Палявы. Але той, хто ўзнімаў нас у атаку, не рухаецца. І тады на дарогу выбег яшчэ адзін партызан. Ён павярнуўся да нас, узняў вінтоўку. У ім я пазнаў Коцікава, Коцікава-сына. «Уперад!» — крычыць малодшы Коцікаў. Кароткая чарга — і з рук выпадае вінтоўка. Яны ляжаць на дарозе побач, партызаны з рабочага пасёлка Ветранка, былы шкловыдзімальшчык Яфім Іванавіч Коцікаў і яго сын камсамолец Дзмітрый Коцікаў.

Мы зноў падымаемся, і зноў кулямётныя чэргі не даюць рухацца наперад. Толькі санінструктар Вера Мурашова, родная сястра нашага ўрача Ю. М. Мурашова, паўзе да бацькі і сына Коцікавых. Затаіўшы дыханне, сочым за адважнай дзяўчынай. Вера падпаўзла да Коцікавых, адкрыла санітарную сумку... З дзота ў гэты момант прагучаў выстрал, адзіны выстрал. Галава дзяўчыны схіляецца да зямлі... Усе крычаць, і я таксама крычу. У варожы дзот ляцяць нашы апошнія гранаты, мы з крыкам кідаемся цераз дарогу смерці. Фашысты ўцякаюць, маўчыць варожы дзот.

Гэта чацвёртая гадзіна бою, калі я падпоўз да апошняй хаты, занятай фашыстамі. Абліўшы бензінам глухую сцяну, падпаліў яе. У тую ж секунду быццам жалезным ломам ударыла мяне ў левае плячо. За некалькі крокаў ад сябе ўбачыў гітлераўца з аўтаматам. Ён біў у мяне з «шмайсера». Адскочыўшы, я ўбачыў, як зялёныя светлякі трасіруючых куль праляцелі паміж мной і палаючым бярвеннем. На маё шчасце, гэты былі апошнія патроны ў ражку яго аўтамата.

Над вёскай узняліся тры чырвоныя ракеты — сігнал аб заканчэнні бою. Урач Мурашоў перавязаў маю рану, пасадзіў на фурманку побач з паміраючым Жорам Яўсеенкам. Сам жа ўсю дарогу ішоў, трымаючыся за фурманку, на якой ляжалі бацька і сын Коцікавы і яго сястра Вера...

Да апошняга дыхання

У канцы верасня 1941 г. цёмнай ноччу прыйшлі ў вёску Віляга Іван Сідараў, Пётр Кубышкін і Якаў Курпачэнка. Былі яны ўсе акружэнцы, зараныя, галодныя і зусім без сіл. Прытулак ім дала маці жонкі Курпачэнкі — Марыя Ёўдакімаўна. Крыху адпачыўшы, узяліся хлопцы за справу. Да пачатку зімы ў лесе ў розных тайніках у іх ляжалі сабраныя на месцы баёў вінтоўкі, кулямёты, гранаты, міны. Быў знойдзены няспраўны радыёпрыёмнік. Якаў адрамантаваў яго, і хлопцы сталі прымаць зводкі Саўінфармбюро. Лістоўкі перапісвалі ад рукі і распаўсюдж-

Быховский районный историко-краеведческий музей

Я. А. Курпачэнка.

Е. Ц. Андрэенкаў.

валі сярод насельніцтва. З іх жыхары навакольных вёсак даведаліся аб разгроме фашыстаў пад Масквой.

Вакол чырвонаармейцаў збіралася ўсё больш патрыётаў: акружэнец Іван Каладзяжны, мясцовыя камсамольцы Церах Сяброўскі, Раман Шэбаў, Косця і Церах Падголіны, Косця і Іван Шмідавы, Аляксей Салаўёў, рабочы шклозавода «Ільіч» Нічыпар Міткевіч і іншыя. Вясной 1942 г. група перайшла ў лес. Камандзірам стаў Якаў Курпачэнка. Партызаны пачалі дзейнічаць на шашы Магілёў — Гомель, імі былі падарваны некалькі варожых аўтамашын, паляцеў пад адхон эшалон на чыгунцы.

У чэрвені атрад Курпачэнкі ўвайшоў у склад левабярэжнай групы аб'яднаных атрадаў пад камандаваннем Г. І. Сазонава. Партызаны разграмілі некалькі варожых гарнізонаў, пачасціліся дыверсіі на шашы і чыгунцы.

У верасні 1942 г. гітлераўцы буйнымі сіламі блакіравалі месцазнаходжанне партызан каля вёсак Боўкі і Хачынка. Асноўная частка партызан адышла ў Бранскія лясы. Атрад Курпачэнкі падзяліўся на дзве групы. Адна на чале з камісарам Я. С. Арцёменкам пайшла на Браншчыну. Курпачэнка з астатняй часткай атрада застаўся на Магілёўшчыне і аб'яднаўся з групамі Ф. С. Тарасевіча — Г. А. Храмовіча. Камандзірам аб'яднанага атрада стаў Ф. С. Тарасевіч.

Набліжалася 25-я гадавіна Вялікага Кастрычніка. Партызаны рыхтаваліся адзначыць свята дыверсіямі на чыгунцы. У ноч з 6 на 7 і з 7 на 8 лістапада дыверсійная група ў складзе Якава Курпачэнкі (камандзір), Нічыпара Міткевіча, Косці Шмідава, Косці і Цераха Падголіных, Івана Каладзяжнага, Івана Сідарава і Аляксея Салаўёва на перагоне Быхаў — Рагачоў скінула пад адхон два варожыя эшалоны і накіравалася ў атрад. Па дарозе група занамавала ў вёсцы Рагі Клічаўскага раёна. На світанні вёска была акружана — на вуліцах з'явіліся бронетранспарцёры і танкеткі. Курпачэнка загадаў адыходзіць, а сам пачаў прыкрываць сяброў. Вораг таксама не шкадаваў куль. Упаў Нічыпар Міткевіч, потым Косця Падголін, не рухаўся Косця Шмідаў. Якаў, паранены, не спыняў агню, пакуль не скончыліся патроны. Калі наступіла цішыня, фашысты кінуліся да партызана, каб схапіць яго жывым. І раптам аглушальны выбух скалануў наваколле. Гэта Якаў узарваў пад сабой апошнюю гранату. Пахаваны герой-партызан у брацкай магіле ў в. Халадок Клічаўскага раёна.

Так сумленне загадвала

З успамінаў Е. Ц. Андрэенкава

Емяльян Цімафеевіч Андрэенкаў нарадзіўся ў 1898 г. ў в. Чырвоны Бераг Быхаўскага раёна. Член КПСС з 1925 г. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны старшыня Шклоўскага райвыканкома. У пачатку вайны знаходзіўся на вучобе ў Маскве, а потым у распараджэнні ЦК КП(б) Б. З сакавіка па лістапад 1943 г. сакратар Быхаўскага падпольнага райкома партыі. У пасляваенныя гады на партыйнай і савецкай рабоце. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Памёр у 1981 г.

Весной 1943 года меня вызвал секретарь ЦК КП(б)Б, начальник БШПД П. З. Калинин. Он сообщил, что я назначен секретарем Быховского подпольного райкома партии и что необходимо безотлагательно вылететь в тыл врага.

В самолете оказался вместе с членом ЦК КП(б)Б, заместителем начальника БШПД Иваном Петровичем Ганенко, секретарем Могилевского подпольного обкома партии Дмитрием Степановичем Мовчанским, редактором газеты подпольного обкома партии «За Радзіму» Александром Антоновичем Юшкевичем, который вез поистине бесценный груз — портативную типографскую машину, шрифт, запас бумаги.

Благополучно приземлились на аэродроме в Кличевской партизанской зоне. На следующий день Д. С. Мовчанский передал мне список состава Быховского подпольного райкома партии: Куракин Николай Павлович, Левшинский Тимофей Иванович, Лукашев Федор Иванович и Каспрюк Станислав Павлович.

Да, не на голом месте мне предстояло начинать свою деятельность. Райком уже немало сделал для организации партизанского движения. С командирами и бойцами отрядов мне предстояло встретиться здесь, на территории Кличевского района, куда они пришли в связи с блокировкой фашистами лесов Быховского района.

Д. С. Мовчанский сказал, что отряды нашего района следует объединить в бригаду. Цель этого

Быховский районный историко-краеведческий музей

ясна: повышение боеспособности, улучшение взаимодействия.

Перед уходом в Быховский район я присутствовал на совещании секретарей подпольных райкомов партии и комсомола, командиров партизанских отрядов. С большим вниманием мы прослушали выступление Ивана Петровича Ганенко.

И вот я прибыл в 810-й отряд, который зародился и действовал в моих родных местах. Одним из первых в штабе увидел своего младшего брата Василия. Какая встреча! Обрадовался, когда узнал, что здесь воюют многие земляки. В их числе командир отряда Михаил Леонтьевич Максимов-Лебедев из Верхней Тощицы, комиссар Василий Тимофеевич Годунцов из Нижней Тощицы. Они ознакомили меня с обстановкой.

Уже весной 1942 года в западной части района действовали 3 партизанских отряда. Командовал одним из них, известный впоследствии под номером 425, Н. П. Куракин. До войны он работал уполномоченным Наркомата заготовок по Быховскому району и хорошо знал кадры. Это помогло ему вовлечь людей в борьбу с врагом.

Одним из организаторов партизанского движения в районе являлся член партии с 1925 года Карп Лаврентьевич Адасев. Война застала его в Минске. Он обратился в военкомат с просьбой отправить на фронт. Но ему было под пятьдесят, на военном учете он не состоял по болезни. Чтобы успокоить Адасева, как и многих ему подобных, работник военкомата ответил:

— Если понадобитесь — вызовем.

Вскоре учреждения Минска эвакуировались. Пошел на восток и Адасев. Перейти линию фронта не удалось, и в июле он прибыл в деревню Золотва Быховского района, где проживали его братья. Здесь встретился с коммунистами Иваном Самсоновичем Зычковым, Тимофеем Ивановичем Левшинским и Сергеем Наумовичем Беребуловым. Так сложилась подпольная партийная организация, секретарем которой стал К. Л. Адасев. Примерно через месяц она установила связь с группой Н. П. Куракина, выросшей затем в отряд.

При создании Быховского подпольного райкома партии секретарем утвердили К. Л. Адасева, но через несколько дней его перевели в Могилевский райком КП(б)Б. Теперь мне поручили возглавить его.

Первое заседание нашего райкома проходило в небольшом сарае в деревне Барсуки. После утверждения решений первичной партийной организации 425-го отряда о приеме в партию наиболее отличившихся партизан я ознакомил участников заседания с приказом Верховного Главнокомандующего И. В. Сталина от 23 февраля 1943 года. Принятое постановление обязывало командиров организовать военную учебу партизан, уделив особое внимание тактике, предлагало комиссарам выделить пропагандистов и агитаторов для изучения приказа с личным составом и населением района. Особо подчеркивалась необходимость создания инициативных групп для организации новых отрядов.

Члены райкома распределили между собой обязанности, утвердили редактором районной подпольной газеты «Партизан Быховщины» Н. П. Куракина.

Находясь временно в Кличевском районе, 425-й и 810-й отряды были объединены в 11-ю Быховскую партизанскую бригаду. Во второй половине апреля она направилась в свой район. Партизаны прошли десятки километров, удачно преодолели шоссе Могилев — Бобруйск, реку Друть. В июле выделили первую инициативную группу из 7 партизан. К концу месяца она выросла до 56 бойцов, на вооружении которых находились 5 ручных пулеметов, 45 винтовок. Так образовался новый, 225-й отряд. Командиром его мы утвердили Михаила Георгиевича Киселева, комиссаром — Матвея Григорьевича Ермолицкого, коммуниста с большим стажем.

Тогда же по указанию обкома партии нам передали 152-й партизанский отряд Михаила Дмитриевича Грицана. До этого он базировался в Кличевском и Кировском районах, приобрел большой опыт боевых действий на коммуникациях противника. Этот опыт стал для нас ценным достоянием.

В июле Могилевский обком КП(б)Б принял постановление о создании военно-оперативной группы (ВОГ) при Быховском райкоме партии. Ее командиром утвердили Ф. П. Подоляна, начальником штаба — И. П. Федяченко.

На заседании райкома партии 17 июля решили создать еще два отряда. Для этого выделили инициативные группы, из которых вскоре выросли 820-й и 435-й отряды.

На этом работа по расширению партизанских отрядов не закончилась. 9 августа 1943 года считается днем рождения еще одного отряда. Его начало положила группа из 6 человек, имевших на вооружении только 2 винтовки и пистолет. И вот теперь райком вынес решение утвердить отряд в количестве 50 человек, присвоив ему 830-й номер.

Таким образом, к действовавшим ранее трем отрядам прибавилось еще четыре. Они быстро росли, вооружались и становились по-настоящему боевыми единицами, способными наносить чувствительные удары по врагу.

Значительное увеличение партизанских сил на Быховщине, рост новых отрядов потребовали от райкома и его военно-оперативной группы совершенствования боевой и политической работы. С учетом этого на своем заседании 4 октября обсудили отчет начальника штаба военно-оперативной группы Ивана Павловича Федяченко о деятельности 810, 820, 830 и 225-го отрядов за

Быховский районный историко-краеведческий музей

август и сентябрь. Присутствовали все командиры, комиссары и секретари партийных организаций. В выступлениях и принятом постановлении отмечалась активизация борьбы народных мстителей против оккупантов. Об этом свидетельствовал разгром гарнизонов в Комаричах, Таймановe, Новом Быхове, Лудчицах, а также крупная операция на станции Тощица. За два отчетных месяца отряды выросли количественно, более основательно вооружились. В закрепленных за ними сельсоветах усилилась массово-политическая работа среди населения. Партизаны помогли крестьянам убрать хлеб, дали отпор гитлеровским «заготовителям», сорвали вражеские планы угона молодежи на каторжные работы в фашистскую Германию. На заседании отмечались и недостатки. В частности, указывалось, что политработники и партийные организации отрядов не всегда учитывали новые моменты. Приводился такой факт. Ряды народных мстителей пополнялись многими молодыми людьми. С ними нужно вести кропотливую работу, умело воспитывать их в духе преданности Родине, жгучей ненависти к врагу. Однако этой категории уделялось недостаточно внимания.

В принятом постановлении указывалось на необходимость улучшить боевую и политическую учебу бойцов и командиров, проявлять заботу о дальнейшем росте отрядов и их вооружении, усиливать удары по коммуникациям врага. Райком предложил командирам и комиссарам сделать все возможное, чтобы защитить население от истребления и ограбления фашистами, не допустить вывоза сельско-хозяйственных продуктов и скота в Германию. Тогда же приняли решение о развертывании 425, 810 и 152-го отрядов в полки и утвердили их командиров, комиссаров и начальников штабов.

Выводить из строя вражеские коммуникации — такую задачу райком партии ставил перед всеми партизанами. В этом деле особенно прославился 152-й отряд. Здесь действовали 5 диверсионных групп, большую работу провели по изысканию необходимых взрывчатых материалов, обучению бойцов подрывному делу.

В марте — апреле 1943 года на участке железной дороги Бобруйск — Жлобин подрывники 152-го отряда пустили под откос 6 следовавших на фронт эшелонов, в том числе 2 с живой силой и техникой были на счету группы, в которую входил отважный партизан Николай Борисевич. Накануне войны он успешно окончил среднюю школу и мечтал учиться дальше. Внезапно вторгшиеся в нашу страну захватчики нарушили его планы. И Николаю пришлось проходить другую школу — школу мужества и борьбы. Воевал, как все его друзья, закалялся в боях. Но особенно ему хотелось стать подрывником. И когда мечта осуществилась, был счастлив.

В середине марта 1943 года на участке железной дороги Бобруйск — Жлобин, у деревни Омельно, Борисевич со своими боевыми друзьями подорвал паровоз и 10 цистерн с нефтью. 27 апреля — новый выход группы на железную дорогу. Спущены под откос паровоз и 18 вагонов. Противник понес большие потери. Теперь подрывное дело стало партизанской профессией Борисевича и его боевых друзей. 30 июня 1943 года на железнодорожном участке Бобруйск — Жлобин, в районе деревни Марусенька, эта группа подорвала эшелон. Разбиты паровоз и 14 платформ, на которых уничтожено и повреждено 144 автомашины. В июле 1943 года группа во главе с Кириллом Евтуховичем пустила под откос еще 2 вражеских состава с техникой и артиллерийскими снарядами.

Но ребята не ограничились действиями на коммуникациях противника. Они провели большую работу по вовлечению в партизаны молодежи, изысканию оружия и взрывчатки. За два летних месяца пришли в отряд 26 новых бойцов, доставили 25 винтовок, 3 ручных пулемета, 200 килограммов тола, выплавленного из снарядов и бомб, а также 170 разных мин и 2800 патронов.

Через некоторое время Николая Александровича Борисевича назначили командиром взвода. Кто мог предположить тогда, что этот скромный крестьянский парень станет в будущем известным ученым, академиком, внесет выдающийся вклад в советскую науку и будет избран президентом Академии наук БССР. Но думается, что его путь к таким успехам начался еще на войне.

Военно-оперативная группа райкома, командиры и политработники многое сделали по подготовке партизан к «рельсовой войне». В ночь на 3 августа 11-я Быховская бригада подорвала в районе станции Тощица 1117 рельсов. 2-й этап «рельсовой войны» начался 19 сентября. Мы опять перебили около 1000 рельсов на участках железной дороги Могилев — Жлобин и Жлобин — Гомель.

Одновременно народные мстители громили гитлеровские гарнизоны, карательные отряды, защищая население. 17 августа на большаке Гамария — Кипячи бойцы 425-го отряда уничтожили крупное подразделение карателей. 3 сентября в деревню Красный Берег с целью захвата и вывоза на каторжные работы трудоспособного населения, а также угона скота прибыл батальон гитлеровцев. Партизаны 810-го отряда наголову разбили его.

Отдел пропаганды и агитации райкома, партийные организации отрядов выпустили и распространили сотни листовок и обращений к населению. Среди них — «Ни грамма хлеба, картошки оккупантам», «Близок час расплаты с фашизмом», «Все на вооруженную борьбу против оккупантов» и др.

Почти на каждом заседании рассматривались заявления о приёме в партию. Коммунистами

Быховский районный историко-краеведческий музей

становились самые достойные. Всего за период деятельности нашего райкома принят в члены ВКП(б) 81 человек, кандидатами в члены партии — 139. В районе насчитывалось 16 партийных организаций. В них состояло на учете 310 коммунистов.

Наш райком постоянно занимался воспитанием молодежи, которая составляла большинство в отрядах. Мы мобилизовывали ее на беспощадную борьбу с фашистскими захватчиками. Активно действовали созданные из молодых партизан диверсионные и «охотничьи» группы по подрыву железных и шоссейных дорог и мостов, поездов и автомашин, уничтожению гитлеровских солдат и офицеров. Руководили этой борьбой 40 комсомольских организаций, объединявших 570 юношей и девушек.

Подпольный райком ЛКСМБ приступил к работе в сентябре 1942 года. Возглавлял его Виктор Николаевич Куракин, потом секретарем стал Павел Михайлович Короленко.

В населенных пунктах действовали 17 подпольных комсомольских организаций. Они вели пропаганду среди населения, устраивали диверсии, собирали оружие. Только в августе 1943 года подпольщики передали партизанам ручной пулемет, 8 винтовок и другое имущество.

Не чувствовали себя спокойно фашисты и в районном центре. Здесь советские патриоты подорвали водокачку и сожгли 70 тонн бензина. Мы получали от быховских патриотов данные о намерениях противника. Умело действовали Валентина Покрошинская и Ольга Позднякова. Они распространяли наши газеты и листовки, вели агитационную работу во вражеском гарнизоне.

Райком партии и командование принимали меры к защите населения от ограбления и истребления карателями. В лесу, в бывшем рабочем поселке леспромхоза, создали гражданский лагерь, в котором проживало около 1 тысяч человек. Здесь они под охраной партизан нашли надежный приют.

Красная Армия, вступив на территорию Могилевской области, с каждым днем приближалась к Быховскому району. Райком КП(б)Б обратился к населению с призывом вступать в ряды народных мстителей, шире развертывать всенародную борьбу. В обращении гневно обличались кровавые злодеяния гитлеровских извергов: более двух лет хозяйничали они в нашем районе, превратили Быхов в развалины, уничтожили все культурные учреждения, стерли с лица земли многие деревни вместе с жителями. Каждый из нас, разъясняя обращение райкома, приводил известные ему конкретные факты о зверствах фашистов.

В Быхове жил И. К. Федоров, с которым мы вместе воевали еще в гражданскую. Гитлеровцы схватили его и расстреляли. В конце ноября 1943 года они ворвались в деревню Городец, согнали в дом 76 человек, в основном женщин, детей, стариков, чтобы сжечь их заживо. Расправа намечалась на 1 декабря. Спасли советских людей партизаны 425-го полка. Стремительным налетом они разгромили карательный отряд.

В партизаны шло все новое и новое пополнение, что способствовало быстрому росту наших отрядов. Если в сентябре 1943 года в районе действовало более 1000 народных мстителей, то ко времени соединения с частями Красной Армии свыше 3,5 тысячи.

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Партизанское подполье в Белоруссии, 1941—44: Страницы воспоминаний: Витебская, Могилёвская, Гомельская, Полесская области. Мн., 1985. С. 194—203.

З успамінаў Ф. П. Падаляна

Фядот Пракопавіч Падалян нарадзіўся 17.7.1909 г. ў в. Русо-Крыклівец Крыжопальскага раёна Віницкай вобл. ў сям'і селяніна. Член КПСС з 1938 г. Завочна скончыў Магілёўскі педінстытут (1956). З 1928 г. на культурна-асветнай і гаспадарчай рабоце. З 1931 г. ў Чырвонай Арміі. Вайну сустрэў пад Слонімам, з 1942 г. ў партызанах — радавы, камандзір узвода, роты. У красавіку 1943 г. назначаны камандзірам 11-й Быхаўскай партызанскай брыгады, у ліпені — лістападзе 1943 г. камандзір Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы. З лістапада 1943 г. па люты 1944 г. сакратар Быхаўскага падпольнага райкома партыі. У 1944—1965 гг. на партыйнай і савецкай рабоце ў Бабруйскай і Магілёўскай абласцях. Ф. П. Падалян узнагароджаны 2 ордэнамі Леніна, ордэнамі Чырвонага Сцяга і Працоўнага Чырвонага Сцяга. Ганаровы грамадзянін г. Быхаў. Памёр 4.1.1971 г. Яго імем названа вуліца ў Быхаве.

Раненне ў першыя дні вайны, няўдалая спроба дагнаць сваіх, знясіленне і дапамога насельніцтва, пераважна жанчын і падлеткаў — усё гэта давялося перажыць не толькі мне, але і сотням байцоў, якія пасля жорсткіх працяглых баёў вымушаны былі адступаць.

У саўгасе «Зарэчча» Барысаўскага раёна мяне, наколькі далей я ісці не мог, прытуліў конюх саўгаса Васіль Сахончык. Калі раны загаіліся, стаў шукаць сувязь з акружэнцамі, якіх пямала засталося ў навакольных вёсках. Усе яны былі надзейнымі таварышамі, гатовымі ў любы момант перайсці да партызанскай барацьбы. Група расла, і ў снежні 1941 г. сорак шэсць чалавек пайшлі ў лес. Мы былі ўзброены (яшчэ раней выявілі склад са зброяй, якую перавезлі ў лес на аўтамашыне, што Эдуард Буцвілоўскі ўгнаў у немцаў). Група стала прабірацца на Клічаўшчыну, дзе разгортвалася партызанская барацьба. Тут мы ўліліся ў 208-ы партызанскі полк пад камандаваннем палкоўніка У. І. Нічыпаровіча. Пачынаў я артылерыстам, потым быў камандзірам дыверсійнай групы, камандзірам узвода, з верасня 1942 г.— камандзірам роты. У сакавіку 1943 г. мяне выклікалі ў Магілёўскі падпольны абком партыі. У зямлянцы знаходзіўся і сакратар ЦК КП(б)Б І. П. Ганенка. Пасля размовы з ім я быў зацверджаны камандзірам 11-й Быхаў-

Быховский районный историко-краеведческий музей

Ф. П. Падалян.

М. Л. Максімаў-Лебедзеў.

скай партызанскай брыгады. Тут жа сустрэўся і пазнаёміўся з сакратаром Быхаўскага падпольнага райкома партыі Е. Ц. Андрэенкам, які толькі што прыляцеў з Масквы. Родам з Быхаўскага раёна, у мінулым чырвонагвардзеец, ён шмат працаваў у раёне і добра ведаў людзей.

Брыгада разгортвалася на базе 425-га і 810-га партызанскіх атрадаў, камандзірамі якіх у той час былі ваеннаслужачыя Д. І. Фядотаў, М. Л. Максімаў-Лебедзеў. У атрадах налічвалася 546 байцоў, абстраляных партызан, якія да таго часу мелі багаты баявы вопыт. На першым пасяджэнні Быхаўскага падпольнага райкома партыі вырашылі выпусціць да 1 Мая 1943 г. першы нумар раённай газеты «Партизан Быховщины», былі прыняты ў рады ВКП(б) дзесяць нашых таварышаў, у іх ліку камандзір 425-га атрада Д. І. Фядотаў і будучы яго пераемнік Ф. Ф. Сухаў.

8 сакавіка брыгада рушыла ў зону свайго дзеяння — Быхаўскі раён. У Быхаўскіх лясах нас сустрэў цёплы веснавы дождж. Настрой быў прыўзняты, усе радаваліся наступленню цёплых дзён. Падпольны райком і камандаванне брыгады сабраліся на нараду. Перш за ўсё неабходна было аднавіць сувязь з людзьмі, якія раней дапамагалі партызанам, а таксама забяспечыць асабовы склад брыгады харчаваннем. У першыя ж дні было створана дзесяць падпольных груп, зацверджана 50 агітатараў — лепшых камуністаў і камсамольцаў. У красавіку — маі ў вёсках раёна пабывалі партызанскія агітатары — член КПСС з 1919 г. М. А. Носараў, сакратар партарганізацыі 425-га атрада Ф. І. Лукашоў, Васіль Андрэенка, Цімафей Ляўшынскі, Васіль Гадуноў, Марк Філімонаў.

1 Мая выйшаў першы нумар падпольнай раённай газеты «Партизан Быховщины». Газета ў дзесяць экземпляраў была склеена з чатырох аркушаў паперы і напісана ад рукі. Сціплыя старонкі пераходзілі з падраздзялення ў падраздзяленне, газету бралі з сабой агітатары ў вёскі. Трэба было бачыць твары людзей, калі чыталі на роднай мове орган падпольнага райкома партыі. Значыць, жыве, дзейнічае наша Савецкая ўлада!

А каб экземпляраў з сотню, ды адціснутых друкарскім спосабам! Гэта думка не давала спакою. І праз тыдзень пасля выхаду першага нумара рэдактар газеты М. П. Куракін і яе адказны сакратар В. Ц. Андрэенка накіраваліся ў Клічаўскі падпольны райком, які меў сваю друкарню. Вярнуліся яны праз пяць дзён з 200 экземплярамі газеты «Партизан Быховщины» і стосам лістовак. Газета і лістоўкі пайшлі па сёлах раёна, узнімаючы людзей на барацьбу з ворагам.

Да самага вызвалення людзі атрымлівалі з Клічаўскай друкарні нумары партызанскай газеты. Шырокая агітацыя, смелыя баявыя дзеянні яшчэ вышэй узнімалі аўтарытэт народных мсціўцаў. У брыгаду ішлі новыя людзі. Толькі за тры дні мая 1943 г. ў 425-ы атрад уступіла са зброяй і боепрыпасамі 85 чалавек. За чэрвень — жнівень ініцыятыўныя групы І. Вараб'ёва, А. Бархозава, У. Дзянісава, М. Кісялёва выраслі ў самастойныя атрады. У жніўні ў брыгадзе было 7 атрадаў, якія кантралявалі ўсё правабярэжжа Быхаўшчыны. Партыйныя арганізацыі ў іх сталі асноўнай арганізуючай сілай. Кола дзейнасці іх было шырокім і разнастайным, прыём у партыю лепшых партызан і партызанак, кіраўніцтва камсамолам, выхаванне асабовага саставу, баявая падрыхтоўка, распрацоўка баявых аперацый, агітацыйна-палітычная работа ў вёсках, арганізацыя вольнага часу партызан. Камуністы ганарыліся сваімі важакамі Ф. І. Лукашовым, М. М. Балыкіным, М. А. Нароўскім, І. Д. Юрчанкам. Гэта былі людзі вялікага жыццёвага вопыту, моцнай партыйнай загартоўкі. Аб аўтарытэце камуністаў сведчыць і такі факт. У момант стварэння брыгады ў партарганізацыі 810-га атрада было 28 камуністаў, а праз два месяцы — 59.

У рады партыі ў той грозны час уступілі камандзір узвода Арцём Салодышаў, які пазней стаў Героем Савецкага Саюза, камандзір партызанскай гарматы Канстанцін Бандарэнка, разведчык Яфім Балотнікаў, камбаты Сяргей Рамакін, Платон Цагельнікаў і Іван Альховікаў, партызанкі Раіса Каранкевіч, Марыя Каваленка, камсамольскія важакі Павел Караленка, Ганна Вараб'ёва, Рыгор Казлоў і многія іншыя.

У ліпені 1943 г. наша брыгада была пераўтворана ў Быхаўскую ваенна-аператыўную групу. Многае зрабілі падпольны райком і пярвічная партарганізацыя па падбору і расстаноўцы каманднага і палітычнага саставу злучэння. Іх узначалілі смелыя і рашучыя камандзіры Ф. Ф. Сухаў, М. Л. Максімаў-Лебедзеў, М. Д. Грыцан, А. Х. Бархозаў, С. П. Рамакін, П. М. Цагельнікаў, І. Л. Альховікаў, І. І. Вараб'ёў, Ф. М. Някрасаў, І. Г. Ермаліцкі, А. І. Салодышаў,

Быховский районный историко-краеведческий музей

Г. С. Самцоў. Выхаваннем асабовага складу ў духу бязмежнай адданасці Радзіме займаліся вопытныя, па-партыйнаму прынцыповыя камуністы В. Ц. Гадунцоў, І. С. Зычкоў, К. Н. Шыбанаў, Ц. І. Ляўшынскі, Д. А. Смагін, І. Д. Стральцоў, М. Ф. Філімонаў, Ц. М. Полаўцаў, Д. М. Сапожнікаў. Пад іх кіраўніцтвам было праведзена 85 баявых аперацый.

У лістападзе 1943 г. Е. Ц. Андрэенкаў быў адкліканы ў распараджэнне ЦК КП(б)Б. Сакратаром Быхаўскага падпольнага райкома партыі зацвердзілі мяне. Камандзірам злучэння стаў начальнік штаба І. П. Федзячэнка.

У лютым 1944 г. ў нас пачаў адчувацца востры недахоп боепрыпасаў. 50 партызан накіраваліся за лінію фронту, у іх былі разведданыя пра гарнізон на станцыі Тошчыца.

Камандзір 5-й Арлоўскай Чырванасцяжнай ордэнаў Суворава і Кутузава стралковай дывізіі палкоўнік Міхаліцын накіраваў у тыл ворага лыжны батальён капітана Б. Я. Каваленкі. Праваднікамі былі нашы партызаны. Батальён скрытна перайшоў лінію фронту і пасля жорсткага бою 23 лютага захапіў станцыю Тошчыца. А на наступны дзень у в. Дзедава сустрэліся партызаны з воінамі 80-га стралковага корпуса.

26 лютага 1944 г. ў 12 гадзін дня ў в. Шапчыцы адбыўся партызанскі парад. На гэтай незабыўнай урачыстасці былі прадстаўнікі 3-й і 50-й армій, пісьменнік Ф. І. Панфёраў і кінааператар І. Н. Вейняровіч. Прыехаў Е. Ц. Андрэенкаў, якога прызначылі першым сакратаром райкома партыі на вызваленай частцы Быхаўшчыны.

Наперадзе чакала нялёгкая і такая ж радасная праца на свабоднай вызваленай зямлі.

Ад групы да палка

Міхаіл Лявонавіч Максімаў-Лебедзеў нарадзіўся 23.5.1917 г. ў в. Верхняя Тошчыца Быхаўскага раёна. Пасля сканчэння ў 1937 г. педвучылішча працаваў настаўнікам у Новакубанскім раёне Краснадарскага краю. Скончыў Растоўскі настаўніцкі інстытут (1939). Восенню таго ж года прызваны ў Чырвоную Армію. У 1941 г. скончыў стралкова-кулямётнае вучылішча, вайну сустрэў на пасадзе камандзіра роты. З лютага 1942 г. ў партызанах: камандзір групы, з красавіка 1942 камандзір 810-га атрада, з кастрычніка 1943 г. па люты 1944 г. камандзір 810-га партызанскага палка Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы.

Пасля вайны на гаспадарчай рабоце ў Мінску. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі. Памёр у 1960 г.

Іван Хахлоў, Міхаіл і Ніна Максімавы з вёскі Ліпавы Рог, Міхаіл Асіпенка, Аляксандр Арцёменка, двое байцоў Чырвонай Арміі (імёны невядомы) аднымі з першых увайшлі ў патрыятычную групу лейтэнанта Чырвонай Арміі Міхаіла Максімава. Вёска Вялікі Лес, куды вярнуўся Міхаіл Лявонавіч пасля няўдалай спробы перайсці лінію фронту і дагнаць сваіх, стала своеасаблівым штабам патрыётаў у тыле ворага. Аляксандр Арцёменка дапамог раздабыць радыёпрыёмнік, пачалі збіраць зброю. У лютым 1942 г. сем патрыётаў на чале з Максімавым праклалі першую партызанскую сцяжынку ў лесе. Адважны камсамолец Уладзімір Гінжук звязаў іх з групай Васіля Німафеевіча Гадунцова, ураджэнца в. Ніжняя Тошчыца, як і Максімаў, ён выходзіў з акружэння, застаўся на Быхаўшчыне і стварыў падпольную групу ў в. Рыхартава. Вясной дзве групы аб'ядналіся ў атрад. Камандзірам стаў Максімаў (узяў сабе псеўданім Лебедзеў), камісарам — Гадунцоў. Пасля дыверсіі на чыгунцы і разгрому некалькіх паліцэйскіх упраў атрад пачаў хутка расці. У яго ўступілі былы лётчык Мікалай Тамашоў, Адам Вараб'ёў, Сцяпан Шаблаўнёў і яго сын Сцяпан, Яфім Кордычаў, Аляксандр Кавалёў, Цімафей Радчыкаў і іншыя. Арцём Салодынаў з дна Каплічнага возера дастаў тры кулямёты, больш трыццаці вінтовак, узброіў патрыётаў і прывёў у атрад.

Летам 1942 г. атрад стаў значнай сілай. На яго баявым рахунку дзесяткі спаленых мастоў і аўтамашын, пяць скінутых пад адхон эшалонаў. Народныя мсціўцы кантралявалі ўсю паўднёва-заходнюю частку раёна. Партызаны настойліва авалодвалі баявым майстэрствам. Лепшымі падрыўнікамі ў атрадзе лічыліся камсамольцы Васіль Каваленка, Мікалай Сідарэнка і Васіль Антоненка. Умелымі і знаходлівымі разведчыкамі сталі Апанас Сідарэнка і Дзмітрый Гадунцоў, бясстрашнымі кулямётчыкамі — Ліснеўскі і Шаблаўнёў, мінамётчыкам — Іван Марчанка. Нязмерна вырас сярод партызан і мясцовага насельніцтва аўтарытэт камандзіра атрада Максімава-Лебедзева. Асабістая адвага, жалезная вытрымка і самадысцыпліна, высокая патрабавальнасць камандзіра да сябе і падначаленых сталі вытокамі гэтай любві і павагі.

У жніўні 1942 г. гітлераўцы кінулі на разгром партызан карны атрад. Манеўруючы, партызаны перадыслацыраваліся ва Усакінскія лясы.

У красавіку 1943 г. 810-ы атрад, які ўжо налічваў 313 партызан, уліўся ў 11-ю Быхаўскую партызанскую брыгаду. У час «рэйкавай вайны» 3 жніўня 1943 г. партызаны атрада Максімава-Лебедзева па чыгуначным участку Рагачоў — Быхаў падарвалі 290 рэек. У верасні разгромілі варожы апорны пункт у вёсцы Лудчыцы, падарвалі шэсць эшалонаў, зрабілі на грунтавых дарогах завалы. У кастрычніку атрад разгарнуўся ў полк. Яго камандзірам быў зацверджаны Максімаў-Лебедзеў. Полк яшчэ больш узмацніў удары па ворагу ў прыфрантавой паласе. За адзін дзень

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

26 лістапада 1943 г., напрыклад, было падарвана 8 аўтамашын, перакананы і замініраваны многія стратэгічна важныя дарогі. Пазней было разгромлена шмат валасных управаў, гарнізонаў, у тым ліку ў вёсках Дручаны, Новы Быхаў, Тайманава, Камарычы, Асоўшчына, Савічаў Рог, Крушынаўка і іншых.

Камандаванне палка прадпрымала рашучыя меры па выратаванню насельніцтва ад карнікаў. У раёне тылавых баз палка былі створаны чатыры сямейныя лагеры, дзе пад аховай партызан знаходзілася каля чатырох тысяч чалавек.

24 лютага 1944 г. 810-ы полк злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі. У палку налічвалася 1006 партызан, баявы шлях большасці якіх працягваўся да пераможнага 1945-га.

Г. Е. Барысаў.

З успамінаў Ц. М. Полаўцава

Ц. М. Полаўцаў.

Цімафей Мартынавіч Полаўцаў нарадзіўся ў 1913 г. ў в. Гарадзец Быхаўскага раёна ў сялянскай сям'і. Член КПСС з 1943 г. У 1936 г. скончыў Магілёўскі зоаветэрфак, у 1941 г.— Віцебскі ветэрынарны інстытут. У партызанах з 1942 г. — радавы, палітрук роты, з жніўня 1943 г. камісар 1-га батальёна 425-га партызанскага палка, а 1944 г. на фронце. Быў двойчы паранены. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеняў, двума медалямі «За адвагу», медалём «Партызану Айчыннай вайны» I ступені і інш.

На сэрцы светла і радасна! Нарэшце скончаны інстытут, і я еду працаваць у свой родны раён. А праз суткі ўсё было перакрэслена вайной. У родны Гарадзец дабраўся не хутка. У вёсцы былі размешчаны паліцэйскі ўчастак і валасная ўправа. Жыў на паўлегальным становішчы, туляўся па чужых хатах, начаваў у бліжэйшых да лесу істопках і хлявах.

Неяк на краі вёскі ля калодзежа мы з Міхаілам Мельнікавым сустрэлі трох чалавек у армейскай форме. Завялі гутарку. Гэта былі акружэнцы Сухаў, Чарнышоў і Зайцаў. У гэты час з боку вёскі Лубянка паказалася фурманка, на якой ехалі пяць паліцэйскіх. Адзін з іх з карабінам саскочыў з фурманкі і стаў патрабаваць дакументы. Сухаў стаў расшпільваць кішэню гімнасцёркі. Паліцэйскі паставіў карабін і нагнуўся над вядром з вадой. І тут Сухаў выхапіў з кішэні пісталет, Чарнышоў схапіў карабін і загадаў паліцэйскаму падняць рукі ўгору. Паліцэйскія кінуліся наўцёкі, толькі ад'ехаўшы на паўкіламетра, адкрылі стральбу. У гэты час у воласці праходзіла рэгістрацыя акружэнцаў. Пачуўшы стральбу, валасное начальства і гітлераўцы разбегліся. Выкарыстаўшы паніку, каля сарака акружэнцаў уцяклі ў лес. Пад раніцу 25 чэрвеня 1942 г. я з Платонам Цагельнікавым пачуў з свайго начлегавага шум матораў — да вёскі набліжаліся карнікі. Мы кінуліся цераз балота ў лес. У лесе за рэчкай сустрэлі партызан Мікалая Куракіна, Мікалая Носарава, Фёдара Лукашова, Карпа Адасёва, Цімафея Ляўшынскага, з якімі даўно трымаў сувязь. Нас адразу залічылі ў групу.

Пасля карнай аперацыі ў Гарадцы і Студзёнцы фашысты пакіраваліся ў в. Чачэвічы. Наша група (у ёй тады было 20 партызан) абстраляла іх і адышла ў Кучынскі лес. Там мы аб'ядналіся з атрадам Марусава і правялі бой з карным атрадам Барчыка. У атрад прыходзіла ўсё новае папаўненне. У красавіку 1943 г. мы ўвайшлі ў склад 11-й Быхаўскай партызанскай брыгады. У ліпені, у сувязі са стварэннем Быхаўскай ВАГ, атрад рэарганізаваны ў 425-ы полк. Атрад, а потым полк граміў гарнізоны ў вёсках Вендараж, Пушча, Падзевічы, Дручаны, Замачулле, Пашкава, Лапша і інш.

У жніўні 1943 г. падпольны райком партыі зацвердзіў мяне камісарам 1-га батальёна, якім камандаваў мой добры сябар Платон Максімавіч Цагельнікаў. Мы многае з ім зрабілі, каб батальён стаў лепшым у палку. У вольны ад баявых аперацый час праводзілі сярод партызан палітінфармацыі, чыталі газету «Правда», абласную «За Радзіму», раённую «Партизан Быховщины». У нас з'явіўся радыёпрыёмнік. Радыст Навасёлаў добра ведаў сваю справу. А пасля разгрому гарнізона ў Пашкаве мы займелі пішучую машынку. З'явілася магчымасць друкаваць зводкі Саўінфармбюро, лістоўкі і распаўсюджваць іх сярод партызан і ў вёсках. Мацнелі сувязі партызан і мірных жыхароў. Партызаны абаранялі насельніцтва ад карнікаў, дапамагалі сеяць і ўбіраць ураджай. Увесь час расла колькасць сувязных і добраахвотных разведчыкаў з ліку мірных жыхароў. Няспынна павялічваліся нашы рады. Так, летам 1943 г. з вёсак Уюн, Уюнова Сяліба, Гамарня, Гута і Замошша толькі за адзін тыдзень прыйшло да нас больш за сорак чалавек.

24 лютага 1944 г. ў раёне в. Дзедава наш батальён злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі. Пасля расфарміравання батальёна мяне накіравалі ў 55-ы запасны полк, а пасля абучэння — у 369-ю стралковую дывізію. Удзельнічаў у баях за вызваленне Беларусі, Польшчы, біў гітлераўцаў у Германіі.

Запісаў П. Шлеянкоў.

Быховский районный историко-краеведческий музей

У баях з ворагам

З успамінаў Дз. А. Смагіна

Дз. А. Смагін.

П. М. Цагельнікаў.

Дзмітрый Анісімавіч Смагін нарадзіўся 5.5.1908 г. ў в. Смагіна Лівенскага раёна Арлоўскай вобл. ў сялянскай сям'і. Член КПСС з 1930 г. У Чырвонай Арміі з 1930 г.— курсант палкавой школы, артылерыйскага вучылішча, з жніўня 1935 г.— палітрук батарэі. На фронце з першых дзён вайны, інструктар палітаддзела 5-й стралковай дывізіі. У чэрвені 1942 г. накіраваны ў варожы тыл, камісар 8-й Круглянскай партызанскай брыгады. У ліпені 1943 г.— сакавіку 1944 камісар 810-га атрада, а потым палка Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы. Пасля вайны на партыйнай, гаспадарчай рабоце, працаваў выкладчыкам у школе. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, многімі медалямі. Жыве ў г. п. Кіраўск.

У ліпені 1943 г. Магілёўскі падпольны абком партыі накіраваў мяне і Якава Міхайлавіча Рыжкевіча ў Быхаўскі раён для ўзмацнення партыйна-палітычнай работы сярод партызан і насельніцтва. 17 ліпеня, у дзень нашага прыезду, адбылося пасяджэнне бюро падпольнага райкома партыі, на якім разгледзелі пытанне аб стварэнні Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы. Мяне зацвердзілі камісарам 810-га партызанскага атрада.

Пачаў са стварэння першых партыйных і камсамольскіх арганізацый ва ўзводах і ротах. У хуткім часе склікалі партыйную канферэнцыю, на якой выбралі партбюро атрада. Сакратаром партбюро стаў М. М. Балыкін. На наступны пасля канферэнцыі дзень атрад выйшаў на баявую аперацыю. Было ўзарвана каля двух кіламетраў чыгуначнага палатна паміж станцыяй Тошчыца і пятнаццатым раз'ездам. Пасля вяртання з задання нас чакаў загад па ваенна-аператыўнай групе: на базе атрада пранаоўвалася стварыць партызанскі полк. Атрад разгарнуўся ў трохбатальённы полк. Камандзірам палка быў прызначаны Максімаў-Лебедзеў, камісарам — я, начальнікам штаба — А. Р. Феакцістаў. Начальнікам асобага аддзела стаў Вароніч, начальнікам разведкі — Сібрын. На пасяджэнні партбюро памочнікам камісара палка па камсамолу зацвердзілі П. М. Дамброўскага.

У верасні 1943 г. сфарміравана санчасць з трох урачоў і трох медсясцёр. Начальнікам санчасці была назначана Л. М. Собалева, урачамі — Каран, Ягоранкава, медсёстрамі — Ясінецкая, Пшыркова, Мяцельская.

Полк штодзённа вёў баявыя аперацыі. З жніўня 1943 г. па люты 1944 г. былі знішчаны варожыя гарнізоны ў вёсках Новы Быхаў, Крупышаўка, Вішчын, Мадора, на пятнаццатым раз'ездзе (гарнізоны ў вёсках Лудчыцы, Камарычы і Тайманава былі разбіты за адну ноч). Нашы падрыўныя групы пусцілі пад адхон 11 варожых эшалонаў, спалілі больш за 50 аўтамашын, узарвалі 13 мастоў, пашкодзілі не адзін дзесятак кіламетраў сувязі. Бясстрашна дзейнічалі ў баях з ворагам камандзіры аддзяленняў Усцінаў і Радчанка, наводчык гарматы К. Ф. Бандарэнка, камандзір роты Шэрсцінаў, камандзір батальёна Някрасаў і многія іншыя.

З прыбліжэннем фронту насельніцтва раёна пайшло ў лясы. Былі арганізаваны чатыры сямейныя лагеры, абсталяваны зямлянкі, у кожнай з іх жыло па 10 сем'яў. Гэта былі ў асноўным дзеці, жанчыны і старыя.

23 лютага 1944 г. полк правёў баявую аперацыю па разгрому нямецкай гаспадарчай часці ў в. Крупышаўка Рагачоўскага раёна. А на наступны дзень у раёне в. Дзедава мы злучыліся з часцямі Чырвонай Арміі.

З успамінаў П. М. Цагельнікава, былога камандзіра 1-га батальёна 425-га партызанскага палка Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы

На фронт я пайшоў вопытным байцом: за плячыма былі вызваленне Заходняй Беларусі, фінская кампанія. Вялікая Айчынная пачалася для мяне на Смаленскім напрамку. У кастрычніку 1941 г. пад Вязьмай трапіў у палон, з якога ўдалося ўцячы. Абарваны, галодны, хворы, прыйшоў у родную вёску Гарадзец толькі ў пачатку 1942 г. Пазнаёміўся з ваеннапалоннымі і акружэнцамі, а праз некаторы час стаў партызанам 425-га партызанскага атрада пад камандаваннем М. П. Куракіна.

Першыя сур'ёзныя аперацыі правялі ў Гарадцы і Кучыне, дзе знаходзіліся варожыя гарнізоны. У пачатку 1943 г. ўдалося разграміць сіламі чатырох атрадаў вялікі варожы гарнізон у в. Пашкава Магілёўскага раёна. У тым баі акрамя багатых трафеяў, якія мы захапілі, удалося вызваліць вялікую групу савецкіх ваеннапалонных.

Запомніўся яшчэ сакавік 1943 г., калі мяне прынялі кандыдатам у члены ВКП(б) і пазначылі камандзірам узвода. Важную падзею адзначылі

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

ва ўзводзе засадай на шашы Бабруйск — Магілёў. Нам удалося разбіць восем варожых аўтамашын і адзін бронетранспарцёр. Пазней удзельнічалі ў разгроме паліцэйскіх гарнізонаў у в. Тошчыца, на торфазаводзе ў в. Ямнае і гарнізона ў в. Лапша.

Калі атрад перафарміравалі ў партызанскі полк, я стаў камандзірам батальёна. Аднойчы нам стала вядома, што ў в. Гарадзец гітлераўцы сагналі ў адну хату 73 жыхароў і прыгатаваліся спаліць. Мы ноччу наляцелі на вёску, разгромілі гарнізон і вызвалілі людзей ад немінучай смерці.

У 1944 г. вайна для мяне скончылася. Многія ж мае баявыя сябры пайшлі на фронт. Удзельнічаў у аднаўленні разбуранай народнай гаспадаркі на пасадзе старшыні выканкомаў Гарадзецкага, а пасля Дунайкоўскага сельсаветаў. Працаваў таксама старшынёй калгаса «Перамога». Разруху, голад, адсутнасць самай неабходнай тэхнікі, няхватку людзей — усё перамагалі. Галоўнае, што на нашай зямлі не засталося ніводзіў вораг. А стваральная праца — гэта шчаслівая праца. Чаго б яна ні каштавала.

Лясная артылерыя

З успамінаў М. М. Балыкіна, былога парторга 810-га партызанскага атрада Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы

У лютым 1943 г. за Друццю на былым артылерыйскім палігоне партызаны нашага, тады яшчэ 810-га, атрада знайшлі 45-міліметровую гармату. Яна ўжо пачала ржавець, адсутнічаў аптычны прыцэл, аднак страляць было можна. Камандзірам гарматнага разліку мы прызначылі К. Ф. Бандарэнку, першым і другім нумарам — Івана Лушчая і Івана Някрасава, ездавым — Якава Сотнікава. А калі вясной пры разгроме Гарадзецкага гарнізона (у Рагачоўскім раёне) мы захапілі чатыры ротныя і адзін батальённы мінамёты, было прынята рашэнне сфарміраваць у атрадзе артылерыйскі ўзвод. Яго камандзірам стаў У. В. Сібрын.

Многа слаўных баявых спраў на рахунку нашых артылерыстаў. Яны вызначыліся пры разгроме гарнізонаў у Тайманаве, Камарычах, Лудчыцах, Новым Быхаве, Падсёлах і іншых. У рукапісным часопісе «Партызан Быховщины» за кастрычнік 1943 г. была змешчана такая заметка: «Камандзіра гарматнага разліку т. Бандарэнку ведаюць як баявога камандзіра-камуніста. Ён заўсёды клапоціцца аб сваіх байцах і старанна рыхтуе іх да новых баёў. Бандарэнка прадстаўлены да ўрадавай узнагароды...». Сам факт наяўнасці гарматы ў партызан выклікаў разгубленасць ворагаў і павагу ў насельніцтва. З вёсак, праз якія праходзілі партызаны з гарматай, у полк ішло новае папаўненне добраахвотнікаў. Нараджаліся легенды — замест адной гарматы з'яўляліся дзесяткі. Апошнюю неацэнную службу саслужыў артылерыйскі ўзвод 24 лютага 1944 г., калі партызаны Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы пайшлі на злучэнне з часцямі Чырвонай Арміі. Узвод прыняў бой з нямецкімі танкамі, якія з'явіліся ў паласе прарыву варожай абароны.

ПАВЕДАМЛЕННЕ САКРАТАРА МАГІЛЁЎСКАГА ПАДПОЛЬНАГА АБКОМА КП(б)Б ДЗ. С. МАЎЧАНСКАГА І КАМАНДЗІРА МАГІЛЁЎСКАЙ ВАЕННА-АПЕРАТЫЎНАЙ ГРУПЫ С. Г. СІДАРЭНКІ-САЛДАЦЕНКІ НАЧАЛЬНІКУ БШПР П. З. КАЛІНІНУ ПРА БАЯВЫЯ ДЗЕЯННІ 425-га І 810-га ПАРТЫЗАНСКІХ АТРАДАЎ 3 ЖНІЎНЯ 1943 г.

6 жніўня 1943 г.

425-м партизанским отрядом (командир Сухов) 3 августа на ж. д. Могилев — Жлобин, [на] участке стн. Тощица — Червоный Пахарь, перебито рельсов — 268, уничтожен бункер (командир Кипкеев). 3 августа на этом же участке перебито 307 рельсов (командир Максимов). 3 августа [в] районе стн. Тощица перебито 163 рельса (командир Воробьев). 3 августа на этом же участке — 124 рельса, взорван бункер. 810-й партизанский отряд, обеспечивая операцию [на] ж[елезной] д[ороге], разгромил 2 полицейских гарнизона Таймоново и Комаричи, дзоты и разные укрепления взорваны. Взяты трофеи: 13 винтовок, 1 миномет, 32 патрона, 80 мин, 34 гранаты, документация. *Мовчанский, Солдатенко.*

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941—июль 1944). Т. 2, кн. 2. Мн., 1978. С. 84.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Боўкінская абарона

5—18 кастрычніка 1943 г. каля в. Боўкі адбываліся жорсткія баі партызанскага палка «Трынаццаць», 15-га партызанскага палка, 17-й партызанскай брыгады, атрада «Перамога», падраздзяленняў іншых атрадаў супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У пачатку кастрычніка 1943 г. гітлераўцы, каб ачысціць свае прыфрантавыя тылы, накіравалі супраць партызан каля 25 тысяч карнікаў. Разам з партызанамі ў лесе было больш чым 20 тысяч мірных жыхароў, якія знаходзіліся пад іх аховай. Карнікі мелі танкі, артылерыю, авіяцыю. Народныя мсціўцы занялі абарону ў Гарадзецкім урочышчы, што за 4 кіламетры на поўдзень ад в. Боўкі. Да 10 кастрычніка гітлераўцы не змаглі прарвацца ў лес. 11 кастрычніка яны ўкліняліся ў абарону партызан, занялі в. Дабужа і замкнулі акружэнне.

Пасля цяжкіх баёў 14 кастрычніка партызанскі полк «Трынаццаць» і большая частка мірнага насельніцтва адышлі ў глыб лесу і занялі абарону ва ўрочышчы Петрава за 3,5 кіламетра на паўднёвы ўсход ад в. Смаліца. Партызаны 15-га палка паспрабавалі прарвацца ў заходнім напрамку і панеслі вялікія страты. Працяглік бесперапынна атакаваў пазіцыі палка «Трынаццаць». У партызан скончыліся харчовыя прадукты, асталося мала боепрыпасаў. 18 кастрычніка яны з боем прарвалі акружэнне і выйшлі ў тыл праціўніка ў паўднёва-ўсходнім напрамку. За час блакады партызанскі полк «Трынаццаць» правёў больш як 20 жорсткіх баёў. У баях вызначыліся батальёны пад камандаваннем М. І. Масквіна, І. Т. Мацяша, П. І. Звяздаева, С. Д. Іванова, Я. Л. Дулькіна, атрад «Перамога» пад камандаваннем К. І. Новікава.

На месцы баёў каля в. Дабужа насыпаны Курган Бессмяротнасці ў памяць аб бязмежнай мужнасці загінуўшых і жывых партызан. Насыпаны ён рукамі жыхароў Быхаўшчыны. На мармуровай пліце абеліска напамін: «У гэтым прыфрантавым лесе ў кастрычніку 1943 года асобны партызанскі полк «Трынаццаць» пад камандаваннем Героя Савецкага Саюза Сяргея Уладзіміравіча Грышына гераічна змагаўся супраць адборных часцей 4-й нямецкай арміі. Вечная памяць героям, загінуўшым за гонар і незалежнасць Радзімы!».

Як гэта было

З успамінаў С. У. Грышына

С. У. Грышын.

Сяргей Уладзіміравіч Грышын — Герой Савецкага Саюза (7.3.1943), адзін з кіраўнікоў партызанскага руху. Нарадзіўся 18.3.1917 г. ў в. Фаміно Дарагабужскага раёна Смаленскай вобл. ў сялянскай сям'і. Рускі. Член КПСС з 1943 г. У 1935—1939 гг., скончыўшы педвучылішча і завочны Смаленскі педінстытут, працаваў загадчыкам пачатковай школы і адначасова настаўнікам сямігодкі. З 1939 г. ў Чырвонай Арміі. Вялікую Айчынную вайну камандзір танкавага ўзвода малодшы лейтэнант Грышын сустрэў у Беластоку. У жорсткіх баях пад Мінскам яго танк быў падбіты. Апынуўшыся ў тыле ворага, арганізаваў у роднай вёсцы патрыятычную групу, якая ў лістападзе 1941 г. аформілася ў невялікі атрад «Трынаццаць» (названы ў гонар адважных чырвонаармейцаў — герояў аднайменнага фільма). У чэрвені 1942 — маі 1944 г. камандзір асобага партызанскага палка «Трынаццаць», які з красавіка 1943 дзейнічаў на тэрыторыі Беларусі. З чэрвеня 1944 г. камандзір асобага партызанскага злучэння «Трынаццаць». Пасля вайны ў Савецкай Арміі. У 1947 г. скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе, у 1955 г.— Ваенную акадэмію Генеральнага штаба. Палкоўнік. З 1958 г. выкладчык, з 1966 г. намеснік начальніка кафедры Ваеннай акадэміі імя Фрунзе. Кандыдат ваенных навук (1964), дацэнт (1966). Ганаровы грамадзянін Быхава. Жыве ў Маскве.

«В Беларусь пришли мы из Смоленщины», — такія словы былі ў нашай палкавой песні. Мы спыніліся ў беларускіх лясах у красавіку 1943 г., калі асноўныя раёны Смаленшчыны былі ўжо вызвалены Чырвонай Арміяй. Насельніцтва сустракала партызан як сваіх вызваліцеляў і абаронцаў. Прыток новых байцоў у полк з мясцовага насельніцтва не спыняўся.

У верасні 1943 г. мы атрымалі загад штаба партызанскага руху накіраваць за лінію фронту свой партызанскі шпіталь, а самім тэрмінова пераправіцца на правы бераг Дняпра і працягваць там партызанскую барацьбу.

Са шпіталем быў накіраваны 4-ы батальён, мы ж, правёўшы разведку, рыхтаваліся фарсіраваць Днепр. Аднак вечарам 27 верасня была атрымана новая радыёграма — ісці на злучэнне з час-

Быховский районный историко-краеведческий музей

цямі Чырвонай Арміі. Мы павярнулі на ўсход, каб пераправіцца цераз р. Проню, на якой яшчэ не было нямецкіх умацаванняў. Партызаны радаваліся — доўгачаканая Вялікая Зямля вось-вось прыме нас. Але ўжо на маршы я атрымаў данясенне, што шпіталю не ўдалося пераправіцца цераз Сож і злучыцца з часцямі арміі. Пакідаць параненых на волю лёсу на законах партызанскай вайны лічылася самым цяжкім злачынствам. Ні разу мы не парушылі гэты святы закон. Не маглі мы пакінуць параненых і цяпер, калі самі збіраліся выйсці на Вялікую Зямлю. Я прыняў рашэнне павярнуць на поўдзень, узяць шпіталь пад ахову ўсяго палка і злучыцца з часцямі Чырвонай Арміі ў месцы яго размяшчэння. На пераход спатрэбілася ўсяго два дні, але яны змянілі многае. Гітлераўцы за гэты час занялі па рацэ Проня глыбокаэшаланіраваную абарону. Проня стала франтавой ракой. Мы стаялі ў в. Боўкі, у васемнаццаці кіламетрах ад фронту, нашы падраздзяленні вялі баі на дарогах. Мы не сумняваліся, што праз дзень-другі Чырвоная Армія прыйдзе нам на дапамогу. Аднак здарылася так, што па вышэйшых стратэгічных меркаваннях нашы часці, якія прайшлі з пераможнымі баямі сотні кіламетраў, на Проні скончылі асенняе наступленне 1943 г., каб падцягнуць тылы і падрыхтаваць рэзервы перад фарсіраваннем Дняпра. Так мы апынуліся ўкліненымі ў баявыя парадкі рэгулярных часцей 4-й нямецкай арміі групы «Цэнтр». Фельдмаршал Буш, скарыстаўшы перадышку на фронце, загадаў часцям фронту і ахове тылу пачаць аперацыю па знішчэнню палка.

Мы былі загартаваны ў баях і добра ўзброены, галоўным чынам трафейнай зброяй. У кожным батальёне мелася да сотні і больш кулямётаў. Але ў фашыстаў былі цяжкія віды ўзбраення, перавага ў жывой сіле ў некалькі разоў. Гітлераўцам, якія ўжо не раз даносілі свайму камандаванню аб «знішчэнні» нашага палка, давялося зноў сутыкнуцца з ім прычым каля самага фронту. На гэты раз яны кінулі на партызан 87-ы, 118-ы, 442-і і 747-ы грэнадзёрскія палкі, 260-ы артполк, 448-ы і 312-ы асобныя батальёны, батальён «Прыпяць», 617-ы пяхотны і 519-ы сапёрны батальёны, танкавую брыгаду асабістага рэзерву Буша, матарызаваныя падраздзяленні і іншыя спецчасці. На бліжэйшых пасадачных пляцоўках базіравалася бамбардзіровачная і разведвальная авіяцыя, а таксама знішчальная авіяцыя, задачай якой было не прапусціць ніводнага савецкага самалёта да партызан. Для абароны выбралі Гарадзецкае ўрочышча. Увайшлі ў лес 2 кастрычніка з боку вёскі Боўкі і пачалі хутка ствараць абарончыя збудаванні. Адначасова баявыя групы бязлітасна білі фашыстаў на суседніх дарогах і бальшаках. Ад нашых разведчыкаў і мірных жыхароў, якія ішлі над нашу ахову, мы даведаліся, што фашысты падрыхтавалі «мяшок» ля Дняпра. З кастрычніка ішлі баі з разведгрупамі ворага. На наступны дзень над лагерам з'явілася паветраная разведка праціўніка.

5 кастрычніка фашысты кінулі на нас свае часці. Пасля яраснага супраціўлення партызан яны вымушаны былі адступіць з вялікімі стратамі і адмовіцца ад лабавой атакі.

З 6 кастрычніка пачаўся метадычны артылерыйскі абстрэл і бамбардзіроўка нашых пазіцый з паветра, якія працягваліся днём і ноччу па ўсёй тэрыторыі лесу.

8 кастрычніка, не спыняючы абстрэлу і бамбардзіроўкі, фашысты кінулі буйныя сілы пяхоты з поўдня з мэтай авалодаць дарогай, якая падзяляла наш лагер на дзве часткі. Кровапралітны бой працягваўся двое сутак. Праціўнік з вялікімі стратамі адступіў.

10 кастрычніка вораг атакаваў нас па ўсёй кругавой лініі абароны. Але і гэта атака захлынулася. Фашысты, нягледзячы на вялікую колькасную перавагу, уцяклі, пакідаючы сваіх забітых і параненых. Трэба сказаць, што і ў такой складанай для нас абстаноўцы мы не толькі трымалі абарону, але працягвалі высылаць за кальцо блакады спецгрупы, якія з засад знішчалі жывую сілу і тэхніку ворага. У той жа дзень, 10 кастрычніка, падрыўнікі 3-га батальёна на чале з Іванам Маёравым разбурылі мост каля в. Трылесіна, па якім у бок фронту ішлі фашысцкія грузы. Адцзяленне камсамольца Казака падпаліла каля в. Кульшычы чатыры аўтамашыны і знішчыла 15 гітлераўцаў, узвод Фёдара Буслаева з 1-га батальёна спаліў некалькі аўтамашын і абстраляў паліцэйскі гарнізон.

11 кастрычніка на ўчастках 2-га, 3-га і 5-га батальёнаў карнікам удалося ўвайсці ў лес, але яны былі знішчаны.

З 11 па 14 кастрычніка лес літаральна ўзнімаўся ад разрываў бомбаў і снарадаў. Атакі ішлі хваля за хваляй. У перахопленым партызанамі загадзе камандуючага 4-й арміяй гаварылася: «Салдатам, якія вызначацца пры разгроме банды Грышына, будзе прадстаўлены двухтыднёвы адпачынак з выездам да сямей у Германію».

А мы трымаліся, хоць боепрыпасы былі на зыходзе, знясільваў голад. Мірныя жыхары дзяліліся з намі апошнімі сухарамі. Мы прынялі рашэнне ў ноч на 15 кастрычніка паспрабаваць прарвацца з акружэння і з ходу фарсіраваць Днепр. Мірным жыхарам прапанавалі ісці з намі або застацца ў лесе, ад якога мы спадзяваліся адцягнуць на сябе ворага. Маладзейшыя вырашылі ісці з намі. Але ў тую ноч выявілася, што фашысты падрыхтавалі нам пастку — адкрыўшы праход у сваім акружэнні, яны сканцэнтравалі ў адзіным выхадзе з лесу да Дняпра паміж двума балотамі сваю артылерыю і танкі. Калі б гэта здарылася, полк быў бы знішчаны. Але, на шчасце, нам удалося разгадаць каварны план ворага. Выкарыстаўшы перапынак, мы пакінулі старую

Быховский районный историко-краеведческий музей

абарону і ў трох кіламетрах ад яе ва ўрочышчы Петрава да раніцы занялі новую абарону.

Раніцай 15 кастрычніка была знішчана першая разведка праціўніка. Немцы вялі перагрупоўку, і гэта дало нам невялікую перадышку (бамбёжка не спынялася).

16 кастрычніка былі захоплены палонныя. Ад іх мы даведаліся, што 17 кастрычніка назначана камандаваннем апошнім днём знішчэння палка, чаго б гэта ні каштавала.

17 кастрычніка над нашым размяшчэннем з'явіўся самалёт-разведчык. Ён «хадзіў» над самымі вершалінамі дрэў, абстрэльваючы нас з кулямётаў. Нашы кулямёты маўчалі — вымушаны былі берагчы боепрыпасы. За разведчыкам з'явіліся бамбардзіроўшчыкі. Яны ішлі чарадой, скідаючы свой груз на маленькі пятачок-лясок. Як толькі прайшла апошняя хваля бамбардзіроўшчыкаў, адкрыла агонь артылерыя. Стала зразумела, што гітлераўскія афіцэры пасля двухтыднёвых няўдач у барацьбе з партызанамі рызыкавалі ўжо страціць не толькі гонар, але і галовы. І сёння яны не спыняцца ні перад чым.

На працягу дня атака за атакай захлыналася каля нашых акопаў. Афіцэры ішлі наперадзе. Асабліва жорсткай была атака, якая пачалася ў пятнаццаць гадзін сорак мінут. Мы эканомілі кожны патрон, вялі толькі прыцэльны агонь. Разведрота Гусарава, мой адзіны рэзерв, перакідвалася з аднаго месца ў другое, дзе ўзнікала небяспека прарыву. На лініі абароны часта завязваліся рукапашныя сутычкі. Але і гэты штурм быў адбіты. Мы перайшлі ў агульную контратаку і зноў адкінулі фашыстаў. Прастора паміж нашымі і нямецкімі акопамі была ўсеяна трупамі ворага. Партызаны забіралі ў іх патранташы. Але і нашы страты былі цяжкімі. Яшчэ адзін такі дзень баёў мы б не вытрымалі.

На змярканні наступіла цішыня. У дваццаць адну гадзіну я сабраў у сваёй зямлянцы ўвесь камсастаў. Пытанне было адно: што рабіць — з гонарам памерці ці зрабіць спробу прарвацца? Рашылі ісці на прарыў.

Усё жыццё шкадую, што ў тыя напружаныя мінуты не запісаў імя дзядулі, які прыйшоў да нас і паведаміў, што цераз балота, якое прымыкае да лесу і якое і мы і гітлераўцы лічылі непраходным, ёсць брод. Вывесці ўвесь полк, абцяжараны параненымі, і тысячы мірных жыхароў мы не змаглі б, але рота магла прабрацца... Выбралі роту Шабанава з батальёна Звяздаева. У старанна распрацаваным плане прарыву задача гэтай роты заключалася ў тым, каб прайсці з правадніком балота і ўдарыць фашыстам у тыл на ўчастку іх 2-га батальёна 747-га грэнадзёрскага палка.

Камандзіру 1-га батальёна Масквіну было загадана на гэтым участку прарваць абарону, а камандзіру 5-га батальёна Мацяшу расшырыць прарыў ударам злева.

Аперацыя ўдалася — мы прарваліся праз варожы заслон. На плячах на самаробных насілках выносілі мы сваіх параненых таварышаў. Услед ішлі мірныя жыхары. У Жалезінскім балоце, дзе мы сабраліся, я прыняў рашэнне выходзіць за Дняпро батальёнамі і злучыцца ў намечаным пункце збору.

Камандаванне і штаб палка з часткай падраздзяленняў павінны былі пераправіцца цераз Дняпро апошнімі, манеўруючы ў ранейшым раёне і прыцягваючы ўвагу праціўніка на сябе (пазней да нас далучыліся 1-ы, 2-і, 4-ы і 6-ы батальёны).

Пачалася разведка Дняпра і пошук сродкаў пераправы. У знясіленых баямі і голадам партызан не было ні боепрыпасаў, ні проста чалавечых сіл для таго, каб фарсіраваць Дняпро з боем. Выратавальнай партызан стала беларуская дзяўчына з в. Старая Трасна камсамолка Аня Лёгкая (цяпер Ганна Касьянаўна Халепа), якая тайком прыгнала лодкі да месца нашай пераправы.

...На правабярэжжы мы зноў грамілі ворага. І заўсёды нашымі разведчыкамі і памочнікамі, клапатлівымі сябрамі і гасціннымі гаспадарамі былі беларускія браты і сёстры, маці і дзяды. Удзячнасць ім назаўсёды перапоўніла нашы сэрцы, і кожны партызан нашага палка мог бы падпісацца пад радкамі аднапалчаніна Марка Максімава:

Белорусы! Я хожу под
дарованным небом
В неоплатном долгу у твоей
доброты
За последнюю корку из рук
твоих хлеба,
За рубаху, изорванную на
бинты,
За твои несравненные драники
с пылу,
Что для нас по ночам на
загнетке пекла,
И за то, что была ты не
вражеским тылом —
Партизанскою матерью
нашей была.

Камісар Іван Стралкоў

Іван Арсенцьевіч Стралкоў, былы работнік міліцыі, арганізатар знішчальнага атрада ў першыя дні вайны, удзельнік Смаленскай бітвы (атрымаў у ёй цяжкую кантузію), быў накіраваны ў ліпені 1941 Смаленскім абкомам партыі ў Рослаўскі раён для арганізацыі партызанскага атрада. У жніўні атрад ужо налічваў 60 чалавек. Аднак месца яго дыслакацыі было раскрыта.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Пасля жорсткага бою 32 партызаны адышлі ў Касплянскі раён. У маі 1942 г. яны аб'ядналіся з атрадам «Трынаццаць». Іван Арсенцьевіч стаў палітруком 1-й роты, затым парторгам атрада, а з чэрвеня 1942 г., калі атрад разгарнуўся ў партызанскі полк «Трынаццаць»,— камісарам палка.

Партызаны любілі свайго камісара за храбрасць, воінскае майстэрства і, напэўна, больш за ўсё за дабрату. Яна праяўлялася ва ўвазе да падначаленых, у клопаце аб параненых і хворых, у паўсядзённым імкненні аблегчыць фізічны і душэўны стан байцоў. Ад камісара партызаны нічога не ўтойвалі. Іван Арсенцьевіч заўсёды ўмеў выслухаць чалавека, увайсці ў яго становішча і зразумець матывы паводзін.

Стралкоў быў прыкладам для партызан і ў баявой дзейнасці. У архіве Смаленскага абкома партыі захаваліся некаторыя дакументы, якія сведчаць пра гэта.

...12 верасня 1942 г. нямецка-фашысцкае камандаванне распачало буйную аперацыю супраць палка «Трынаццаць» пад кодавай назвай «Жоўты слон». Полк аказаўся ў надзвычай цяжкім становішчы. Па даручэнню камандавання камісар Стралкоў адшукаў найлепшае месца выхаду палка з акружэння і падабраў новае месца яго ўкрыцця.

14 верасня 1942 г. камісар палка асабіста кіраваў боем 2-га батальёна. Бой працягваўся цэлы дзень. Ворагу нанесены вялікія страты, батальён без страт адведзены на больш выгадны рубеж...

3 студзеня 1943 г. полк прыняў адкрыты бой з немцамі. У выніку яго праціўнік страціў каля 300 чалавек. Стралкоў, знаходзячыся з 1-м батальёнам на перадавой лініі, асабіста кіраваў боем...

12 лютага 1943 г. І. А. Стралкоў, знаходзячыся ў 3-м батальёне, кіраваў ліцігадзінным боем каля вёскі Таранкі...

12 сакавіка 1943 г. полк вёў бой каля вёсак Бруханава і Шыркова. У выніку ўмелага абходнага манеўра праціўнік быў атакаваны адначасова ў лоб і з тылу і разгромлены. Атакай з фронту кіраваў камісар палка Стралкоў...

2 красавіка 1943 г. праціўнік прыцісnуў полк да балота каля ракі Упакой. Палку трэба было неадкладна навесці пераправу цераз раку і пабудаваць гаць цераз балота. Стралкоў асабіста кіраваў пераправай і забяспечыў выхад палка з акружэння без страт...

14 мая 1943 г. там. Стралкоў, знаходзячыся ў 3-м батальёне, сумесна з камбатам Звяздаевым распрацавалі план аперацыі па разгрому чыгуначнай станцыі Верамейкі. У пачатку бою Звяздаеў быў паранены. Аперацыю ўзначаліў Стралкоў...

У ноч на 18 кастрычніка 1943 г. ў самы крытычны момант Боўскай блакады ў Быхаўскім раёне камісар палка Стралкоў правёў у тыл ворага роту Шабанава, якая ўдарыла ў тыл нямецкай абароны ў момант агульнага пераходу палка на прарыў. У выніку ўмелай і дакладнай арганізаванай узаемадзеяння рот з тылу і палка з фронту ў цяжкіх умовах быў забяспечаны прарыў блакады і выхад палка з акружэння...

19 кастрычніка 1943 г. ў час акружэння палка ў Жалезенскім балоце Стралкоў асабіста пайшоў у разведку і, выяўляючы жыццём, знайшоў у нямецкай абароне слабае звяно, праз якое партызаны выйшлі з акружэння...

За заслугі па разгортванню партызанскага руху, за работу па ўмацаванню асабовага саставу палка, павышэнне яго баявой гатоўнасці, за асабісты ўдзел ва ўсіх баявых аперацыях Іван Арсенцьевіч Стралкоў у сакавіку 1943 г. быў узнагароджаны ордэнам Леніна. Ганаровы грамадзянін Быхава. Жыве І. А. Стралкоў у Смаленску.

Паміж Дняпром і Сожам

З успамінаў А. С. Дзямідава

Аляксандр Сяргеевіч Дзямідаў нарадзіўся 20.7. 1919 г. ў в. Базякова Ватульмінскага раёна Татарскай АССР у сям'і селяніна. З 1939 г. ў Чырвонай Арміі. У 1941 г. скончыў ваеннае пяхотнае вучылішча. У ліпені 1941 г. ўдзельнічаў у абароне Магілёва. Са студзеня 1942 г. ў партызанах: камандзір узвода, роты, атрада, з ліпеня 1943 г. камандзір 15-га партызанскага палка. Пасля вайны на савецкай рабоце ў Гродне. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Аўтар кнігі «У атаку падымаўся першым» (1967).

У красавіку 1943 г. з 208-га партызанскага палка імя І. В. Сталіна была вылучана 4-я рота, якой я камандаваў, і разгорнута ў 15-ы партызанскі атрад. Атрад атрымаў загад перадыслацыравацца з Клічаўскага раёна на левабярэжжа Дняпра ў Быхаўскі раён. У атрадзе ў той час было 100 байцоў, і мы ўжо мелі даволі багаты вопыт барацьбы з акупантамі.

У пачатку мая атрад прыбыў у новы раён дзеяння і размясціўся ў лесе каля в. Хачынка. Перш-наперш нам трэба было ўцягнуць як мага больш мясцовых жыхароў у актыўную барацьбу супраць акупантаў, ачысціць мясцовасць ад гарнізонаў праціўніка і разгарнуць дыверсіі на важнейшых камунікацыях ворага. З гэтага і пачалі.

У камісара атрада І. П. Ніжніка захаваліся запісы тых гадоў. Вось некаторыя з іх:

«6 мая група Леўчанкі на шашы Магілёў — Бабруйск знішчыла 4 аўтамашыны, забіла 9 фашыстаў і 6 — параніла. Захоплена 3 аўтаматы, 6 вінтовак, 4 пісталеты, тапаграфічныя карты, дакументы.

7 мая. Група Карнеева на шашы Прапойск — Крычаў узарвала 3 аўтамашыны, забіла 7 гітлераўцаў.

На шашы Магілёў — Быхаў аддзяленне Лісіцына разбіла легкавую аўтамашыну. Забіты генерал і 3 афіцэры. Захоплены зброя і дакументы.

За 11 і 12 мая дыверсійныя групы Шубадзёрава, Галкоўскага, Андрэева, Нікітчанкі і Завялава на шашы Магілёў — Быхаў і Прапойск — Доўск знішчылі 18 аўтамашын і ўсюдыход, узарвалі мост.

13 мая вярнуўся з баявога задання Н. Г. Пра-

Быхавский районный историко-краеведческий музей

капенка. Ён прывёў у атрад 97 чалавек. Прынесена 8 кулямётаў, 64 вінтоўкі, 2 аўтаматы...»

Актыўныя баявыя дзеянні высока ўзнялі аўтарытэт атрада, у яго няспынна ішло папаўненне. Прыходзілі адзіночкамі, цэлымі сем'ямі. У ліпені атрад налічваў ужо амаль тысячу чалавек і быў разгорнуты ў партызанскі полк.

Полк нарошчваў удары па камунікацыях 4-й і 9-й нямецкіх армій на ўчастках Быхаў — Магілёў, Прапойск — Доўск, Доўск — Магілёў. У жніўні 1943 г. нашы партызаны скінулі пад адхон 8 варожых эшалонаў, перабілі 920 рэек, спалілі на шашэйных дарогах 46 аўтамашын, разграмілі каля 10 нямецкіх гарнізонаў і паліцэйскіх участкаў. Ва ўсіх без выключэння аперацыях смела і рашуча дзейнічалі камсамольцы на чале са сваім баявым важаком Андрэем Клішковым.

У канцы верасня 1943 г. да раёна дыслакацыі палка наблізіўся фронт. Мы яшчэ больш узмацнілі ўдары па адступаючаму ворагу: «асядлалі» дарогі, узялі пад сваю ахову мірных жыхароў. Выключна смела дзейнічала рота Міхаіла Ханінава. Камандзір роты асабіста за няпоўны месяц скінуў пад адхон два варожыя эшалоны.

З першага кастрычніка 1943 г. для нас пачаліся надзвычай цяжкія выпрабаванні. Наступленне Чырвонай Арміі спынілася на Сожы і Проні. Выкарыстаўшы сітуацыю, гітлераўскае камандаванне паставіла перад сабой задачу знішчыць партызан у сваім тыле.

Невялічкі лес каля вёсак Хачынка і Дабужа быў адначасова акружаны з усіх бакоў. Пачаліся кровапралітныя баі. Над лесам, як хмара, віселі бамбардзіроўшчыкі, па лясных квадратах бесперапынна біла артылерыя, напралом лезла пяхота. Становішча з дня ў дзень усё больш ускладнялася. Упэўненасць надавала толькі суседства партызанскага палка «Трынаццаць», які насмерць абараняў свае пазіцыі. Полк меў багаты вопыт манеўранай вайны, не адзін раз прарываў блакады, намнога пераўзыходзіў нас па колькасці байцоў, узбраенню і вайсковай вывучцы. Семнаццаць доўгіх, як сама вечнасць, дзён і начэй працягваліся баі. Навечна засталіся тут мае баявыя сябры Л. Р. Пракапенка, І. І. Вішнеўскі, М. Р. Матусевіч, І. Ц. Каўшырка і многія-многія іншыя. Ніколі не забудзецца светлы вобраз настаўніцы з вёскі Папоўка партызанкі Тасі Барысенка. У самы цяжкі час блакады ёй было даручана прабрацца праз варожае акружэнне, разведаць абстаноўку і зноў вярнуцца ў полк, але Тася не вярнулася. Толькі праз год даведаліся пра яе лёс. Дзяўчыну схапілі карнікі і доўга катавалі. Мужная патрыётка вытрымала здзекі, загінула, але не выдала нас.

І. П. Ніжнік (злева) і А. С. Дзямідаў.

У час прарыву блакады полк панёс вялікія страты, выйшаў у Клічаўскі раён асобнымі групамі. Тут ён быў перафарміраваны і папоўніўся за кошт 208-га і 425-га палкоў і працягваў ваяваць з акупантамі да злучэння з часцямі Чырвонай Арміі 28 чэрвеня 1944 года.

З ЗАГАДА № 92 ПА ВАЕННА-АПЕРАТЫЎНАЙ ГРУПЕ ПРЫ МАГІЛЁЎСКІМ ПАДПОЛЬНЫМ АБКОМЕ КП(б) БЕЛАРУСІ

28 снежня 1943 г.

...425 боевой партизанский полк 14 декабря [1943 г.] в 2 часа под командованием командира полка Сухова, комиссара полка Лешинского, начальника штаба Соколовского произвел смелое и организованное нападение на 195 гренадерский батальон и тыл 278 пехотного полка 95 пехотной дивизии немцев в населенном пункте Новый Городец Быховского района. В ходе двухчасового огневого боя и трехкратных рукопашных схваток народные мстители славного 425 полка, окружив противника, не выпустили живыми ни одного гитлеровца: часть немцев пожгли в домах, а большую часть, выбегавших в нижнем белье наружу, расстреляли в упор... В итоге боя, помимо сожженных, на поле боя осталось 152 убитых немца. Сожжен склад с вооружением, уничтожено 11 трехтонных автомашин, груженных обмундированием и продовольствием, одна грузовая автомашина с радиостанцией, две легковые автомашины, одна бронемашина,

Быховский районный историко-краеведческий музей

один мотоцикл, одна 45 мм пушка, шесть ручных пулеметов, десять автоматов, три батальонных миномета, семьдесят винтовок и много другого военного имущества.

425 полком организовано крушение трех вражеских эшелонов. При крушении разбито три паровоза, пятнадцать крытых вагонов, из них шесть с живой силой, четыре с боеприпасами, пять с продовольствием, двенадцать платформ, из них две с танками, семь с автомашинами, три с заводским оборудованием. Из-под обломков было вытащено 85 убитых и 34 раненых немца. По диверсиям отличились Максимов, Латыговский, Михайлов, Кандюбов, Ханжин, Савельев, Ильющенко, Артемов, Стриков, Ефимов, Софрин, Печковский, Долецкий, Крутолевич и Гайворонский.

В проведенных операциях весь личный состав 425 партизанского полка показал свою высокую преданность делу партии и социалистической Родине, за что достойно партизаны полка занимают ведущее место в Могилевской области по успехам борьбы против гитлеровских людоедов.

Секретарь Могилевского подпольного обкома КП(б)Б, полковник *Мовчанский*
Командир военно-оперативной группы подполковник *Солдатенко*
Начальник штаба майор *Георгиевский*

Копія загада захоўваецца ў Быхаўскім краязнаўчым музеі.

З ДАНЯСЕННЯ КАМАНДАВАННЯ 152-га ПАРТЫЗАНСКАГА ПАЛКА КАМАНДЗІРУ ВАЕННА-АПЕРАТЫЎНАЙ ГРУПЫ ПРЫ БЫХАЎСКІМ ПАДПОЛЬНЫМ РАЙКОМЕ КП(б)Б МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ І. П. ФЕДЗЯЧЭНКУ АБ РАЗГРОМЕ ВАРОЖАГА ЭШАЛОНА НА ЧЫГУНЦЫ МАГІЛЁЎ — ЖЛОБІН 1 ЛЮТАГА 1944 г.

6 лютага 1944 г.

Доношу, что 1 февраля 1944 г. в 20.55 диверсионной группой 1-го б[атальо]на в составе 4 чел. под командованием ком[андира] отделения Тютюкина А. С. с участием партизан Концового И. Е., Будаева Ф. Н. и Ященко П. М. на ж. д. Могилев — Жлобин на участке стн. Ст[арый] Быхов — 15-й разъезд, в 1 км южнее н[аселенного] п[ункта] Савичев Рог, спущен под откос вражеский эшелон с танками, автомашинами и зап[асными] частями, следовавший со стн. Рогачев на стн. Ст[арый] Быхов.

В результате крушения разбито: паровоз, 3 платформы с танками, 5 платформ с автомашинами и 2 вагона с обслуживающим персоналом. При этом повреждено 3 танка, 9 автомашин...

Данные установлены личным наблюдением, а также подтверждаются связным нашего полка Галиновским П. К., проживающим в дер. Савичев Рог Быховского района.

Командир 152-го партизанского полка
лейтенант *Грицан*
Комиссар политрук *Зычков*
Нач. штаба лейтенант *Евтухович*

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Т. 3. Мн., 1982. С. 82.

З ГІСТОРЫІ 425-га ПАРТЫЗАНСКАГА ПАЛКА МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ АБ РАЗГРОМЕ ГАРНІЗОНА ПРАЦІЎНІКА Ў ВЁСЦЫ ЛАПША БЫХАЎСКАГА РАЁНА 16 СТУДЗЕНЯ 1944 г.

18 сакавіка 1944 г.*

В 1.30 16 января 1944 г. командир полка в н[аселенном] п[ункте] Подкленье отдает командному составу полка боевой приказ. Боевой приказ командира полка доводится командирами до каждого бойца. Каждый боец получает определенную задачу. В третьем часу ночи б[аталь]оны стали подходить на исходное положение для штурма. В 3.00 начался штурм. Противник был захвачен врасплох. Замысел командования полка удался. Штурмующие группы забросали гранатами дома и расстреливали выбегающих фрицев и изменников Родины.

Группы отвлечения открыли огонь по соседним гарнизонам. Батальонный миномет

* Датуецца па часе напісання гісторыі палка.

Быховский районный историко-краеведческий музей

вел переносной огонь по Хутору, Холстову и Сущеву. Противник в соседних гарнизонах также оказался в панике и не знал, что ему делать. Лаишичский гарнизон был разбит наголову. Противник потерял убитыми 55 чел. Взяты в плен 41 чел., сожжен во время боя склад с вооружением и боеприпасами.

Взяты следующие трофеи: ручных пулеметов — 2, винтовок — 30, патронов — 600 штук, свыше сотни гранат, радиоприемник, 85 немецких строевых артиллерийских и обозных лошадей с упряжью и седлами, 50 повозок, груженных военным имуществом, много снаряжения, обмундирования и продовольствия, кроме того, взято у пр[отивни]ка 25 коров и 15 овец. Героически отличились в бою тов. Куксенок, нач. штаба этого бат[альо]на тов. Цема, командир роты Ященко Д. П., командир взвода Мантров, бойцы Игнатенко М. М., Шурбенков, Максимов, Савченко, Плющенко, Денгловский и др..

Командир*

Комиссар*

Нач. штаба ст. л[ейтенан]т Соколовский

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 — июль 1944). Т. 3. Мн., 1982. С. 161—162.

---

* У дакуменце подпісы адсутнічаюць.

Клятве засталіся верныя...

М. Дз. Грыцан

Міхаіл Дзмітрыевіч Грыцан нарадзіўся 11.7.1920 г. ў г. Днепрадзяржынску ў сям'і рабочага. У 1940 г. скончыў Маскоўскае артылерыйскае вучылішча. Удзельнічаў у абароне Мінска. У партызанах з красавіка 1942 г., камандзір атрада. З кастрычніка 1943 г. па люты 1944 г. камандзір 152-га партызанскага палка Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы. У пасляваенны час прапаваў дырэктарам школы па Днепранятроўшчыне. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны, медалямі. Ганаровы грамадзянін г. Быхава.

«...Партызанскі полк пад камандаваннем старшага лейтэнанта Грыцана пусціў пад адхон 55 фашысцкіх эшалонаў, спаліў 37 мастоў і захапіў такую колькасць варожай зброі і боепрыпасаў, што яе б хапіла брыгадзе для паспяховага выканання баявых аперацый на працягу многіх месяцаў...» Гэтыя радкі ўзяты з характарыстыкі Магілёўскага падпольнага абкома партыі. Захаваўся яшчэ адзін пажоўклы ад часу дакумент-сведчанне ваенных гадоў. Напісаны ён камандзірам палка, магчыма, на хаду на плашпэце, а можа на прыкладзе аўтамата, і змест лаканічны: «Гарнізон нам па сіле, і мы ідзем яго граміць». А на адваротным баку гэтага лістка не менш лаканічны загад сакратара Быхаўскага падпольнага райкома партыі: «Жадаю поспехаў. Размеркаваць сілы так, каб у адно імгненне пасты, агнявыя кропкі былі закіданы гранатамі...». За час існавання 152-га партызанскага палка 25 фашысцкіх гарнізонаў сталі «па сіле» грыпанаўцам. І, магчыма, не кожны з байцоў ведаў, што іх смелы, рашучы камандзір, якому, здавалася, не былі вядомы такія паняцці, як страх, вагапне, разгубленасць, пачынаў вайну нядаўнім курсантам, неабстраляным артылерыстам. Што яго сапраўдная загартоўка і сталенне пачалося, калі жменька артылерыстаў, якія прарвалі акружэнне, пачала свой нялёгкі шлях у тыле ворага. Іх набралася чалавек трыццаць — артылерыстаў і пехацінцаў, пагранічнікаў і сапёраў, сувязістаў і шафёраў, якія ўцалелі ў няроўных жорсткіх баях і цяпер шукалі не ратунку, а гарэлі помстай за загінуўшых таварышаў. Уласным жыццём паклаліся да апошняга біць фашыстаў. Аб'яднаў і стаў іх камандзірам малады артылерыст лейтэнант Грыцан. Каля Бярэзіны стала зразумела, што лінію фронту ім не перайсці. Лейтэнант-сувязіст Кульдышаў прапанаваў тады дабрацца да бліжэйшай вёскі, дзе няма акупантаў, і паспрабаваць адшукаць нітачку, якая б прывяла да партызан. Неўзабаве знясіленыя і змораныя, яны размясціліся нанач у калгаснай канцылярыі. А ноччу ўварваліся паліцаі. Сілы былі няроўныя, і пасля непрацяглага супраціўлення байцоў у суправаджэнні вазка з кулямётам паліцаі пагналі ў бок гарнізона. Першым за конным паліцаем ішоў Грыцан. Ён з усяе сілы напружваў звязаныя рукі. Успомніў пра нож у кішэні. Непрыкметна

Быховский государственный историко-краеведческий музей

дастаў яго, перарэзаў вяроўкі. Замарудзіўшы хаду, каб параўняўся з ім баец, які ішоў следам, вобмацкам паласнуў па вяроўцы, што сціскала яго рукі, і перадаў яму нож. Паспеў шапнуць: «Рабі, як я!..» Калі параўняліся з лесам, байцы на камандзе Грыцана кінуліся ў гушчар. Затрашчаў кулямёт, але смерць абмінула іх. У лесе, на месцы былога бою, падабралі боепрыпасы, гранаты, некалькі дзесяткаў вінтовак, два кулямёты. Пачаўся час адліку баявых дзеянняў групы. Для кадравых ваенных нязвыклым было многае ў лясным жыцці. Усё было ўпершыню. У час баёў з ворагам выпрацоўвалася тактыка вядзення партызанскай вайны. Набывалі вопыт, аналізуючы ўласныя дзеянні. А яны з кожным днём станавіліся адчувальнымі, больш упэўненымі і значнымі па маштабу.

Праз нейкі час адбылася сустрэча з лейтэнантам Макеем, які прыбыў у атрад Грыцана па даручэнню камандзіра 208-га партызанскага палка палкоўніка Нічыпаровіча. Атраду Грыцана быў выдзелены раён дзеяння на Клічаўшчыне.

Мінулі месяцы. У ліпені 1943 г. 152-і партызанскі атрад перадыслацыраваўся ў Быхаўскі раён. У кастрычніку атрад разгарнуўся ў трохбатальённы 152-і партызанскі полк. Камандзірам яго быў зацверджаны Міхаіл Дзмітрыевіч Грыцан...

П. Каракаш.

Таленавіты камандзір

Ф. Ф. Сухаў.

Фёдар Фаміч Сухаў нарадзіўся 5.9.1920 г. ў пас. Малая Чуракоўка Кустанайскага краю ў сям'і селяніна. Член КПСС з 1945 г. Скончыў БДУ імя У. І. Леніна (1957). У 1937—1940 гг. працаваў настаўнікам у Кустанайскай вобласці. З 1940 г. ў Чырвонай Арміі. У чэрвені 1941 г. на фронце. З вясны 1942 г. ў партызанах, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў 425-га партызанскага атрада: у красавіку — кастрычніку 1943 г. камандзір атрада. З кастрычніка 1943 г. па люты 1944 г. камандзір 425-га партызанскага палка. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, медалямі. Жыве ў Мінску.

Вёскі Лубянка і Рэкі на Быхаўшчыне сталі першым прытулкам ваеннаслужачых Ф. Сухава, А. Скокава, Р. Чарнышова, якія разам з астатнімі таварышамі па службе, што не здолелі прарвацца за лінію фронту і размясціліся ў суседніх вёсках, выраШылі працягваць барацьбу ў тыле ворага. Хутка Фёдар Сухаў, чалавек жвавы і таварыскі, стаў душой тутэйшай моладзі. Фёдар і яго сябры пабывалі ў навакольных вёсках, пазнаёміліся з многімі людзьмі. Пачалі збіраць зброю, разведалі абстаноўку.

У пачатку мая 1942 г. група Сухава выйшла ў лес і пачала дзейнічаць. Хутка яна папоўнілася патрыётамі з в. Залатва на чале з Карпам Адасёвым. Партызаны разграмілі Гарадзецкую воласць, вызвалілі ваеннапалонных, якія далучыліся да Сухава. Аб'яднаная група ў чэрвені 1942 г. аформілася ў атрад. Неўзабаве пасля разгрому гарнізона ў в. Гарадзец у атрадзе здарылася няшчасце — трагічна загінулі Аляксандр Скокаў, Рыгор Чарнышоў, Аляксандр Цыгіб, лепшыя сябры Сухава. Партызанам стала вядома, што ў в. Касічы схоплена моладзь для адпраўкі ў Германію. Вызваляць іх папрасіліся Скокаў, Чарнышоў, Цыгіб. Уначы яны зняслі вартавых і выпусцілі нявольнікаў. Радасныя вярталіся хлопцы з задання, у канцы вёскі іх сустрэў мужчына з вінтоўкай-дзесяцізарадкай і папрасіў узяць з сабой у партызаны. Параіўшыся, хлопцы далі згоду. Каля в. Уюн партызаны зайшлі ў гумно, каб адпачыць. Тут іх сонных па-здрадніцку і забіў з дзесяцізарадкі фашысцкі агент. Трагічная смерць сяброў у пачатку барацьбы многаму навучыла народных мсціўцаў.

Потым былі жорсткі бой з карным атрадам Барчыка ў в. Кучын, разгром гарнізонаў у вёсках Падзевічы, Ямнае, засады на шашы і бальшаках, дыверсіі на чыгункі. І заўсёды ў крытычны момант, у самым «гарачым» месцы апынаўся кулямётны ўзвод Сухава. Асабліва вызначыўся Фёдар пры разгроме гарнізона ў в. Пашкава 11 лютага 1943 г. У аперацыі ўдзельнічала некалькі атрадаў. Усё ішло па плану. І раптам замінка — з акна камендатуры ярасна ўдарыў кулямёт. Партызаны заляглі. Нельга было марудзіць ні мінуты. Сухаў кінуўся да акна. Сарваўшы з галавы шапку, ён сунуў у яе руку, схапіў распаленае дула кулямёта і з усяе сілы рвануў яго на сябе. За акном толькі мільганулі рукі, не здолеўшыя ўтрымаць кулямёт. Фёдар кінуў гранату і пасля выбуху ўскочыў у дом. Аглянуцца часу не было, але ён быў упэўнены — сябры не адстануць. Яму ж неабходна было, пакуль вораг не апамятаўся, захапіць хоць бы яшчэ адзін пакой. Сухаў кінуўся ўперад. Дзверы! Ён так ударыў у іх нагой, што, не ўтрымаўшыся, разам з імі ўляцеў у другі пакой. Гэта і выра-

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

тавала яго — аўтаматная чарга прайшла над галавой. У наступны момант ён ужо страляў па ўцякаючых фашыстах. У гэтай схватцы Сухаў прыкончыў каменданта гарнізона, яго памочніка і двух кулямётчыкаў. А ў канцы бою быў сам паранены ў руку.

Грышынцы

М. І. Масквін.

П. І. Звяздаеў.

Мікалай Іванавіч Масквін, нарадзіўся ў снежні 1915 г. ў с. Троіцкае Навасільскага раёна Арлоўскай вобласці ў беднай сялянскай сям'і. Член КПСС з 1938 г. З 1937 г. ў Чырвонай Арміі, служыў на Далёкім Усходзе, удзельнік баёў на возеры Хасан. У 1940 г. скончыў з адзнакай Горкаўскае ваенна-палітычнае вучылішча, быў накіраваны ў Беларускую Асобую ваенную акругу, перад вайной палітрук батарэі артылерыйскага палка. На фронце з першых дзён вайны. Зводны дывізіён цяжкіх гармат, камісарам якога быў М. І. Масквін, прымаў удзел у разгроме нямецкай авіяцыі на Віцебскім аэрадроме ў ноч на 18 ліпеня 1941 г. Пасля акружэння пры спробе перайсці лінію фронту з рэшткамі дывізіёна быў цяжка паранены і з групай байцоў застаўся на акупіраванай тэрыторыі. Пасля папраўкі ў лістападзе 1941 г., аб'яднаўшы групу ваеннаслужачых, якія не выйшлі з акружэння, Масквін у другі раз — і зноў няўдала — спрабаваў выйсці за лінію фронту. У снежні 1941 г. ў час разведкі на чыгункі Смаленск — Віцебск М. І. Масквін трапіў у аблаву і быў адпраўлены ў рабочы лагер на ст. Рэшткі. Пры спробе ўцячы злоўлены і прыгавораны да смерці. У ноч перад пакараннем разам з двума байцамі ўдалося збегчы. З вясны 1942 г. ў партызанскім атрадзе С. У. Грышына. У верасні — лістападзе 1942 г. камісар, з лістапада 1942 г. да мая 1944 г. камандзір 1-га батальёна, у чэрвені — ліпені 1944 г. камандзір 1-й брыгады партызанскага злучэння «Трынаццаць». У пасляваенны час на партыйнай і савецкай рабоце. М. І. Масквін выбіраўся дэлегатам XXII з'езда КПСС. Аўтар кніг «Партызанскімі сцежкамі» (1967), «Дарогамі баявога брацтва» (1986). Узнагароджаны 4 ордэнамі. Ганаровы грамадзянін Быхава. З 1976 г. пенсіянер саюзнага значэння.

Пётр Іванавіч Звяздаеў, нарадзіўся 6 жніўня 1919 г. ў станіцы Паўладольская на Паўночным Каўказе. Член КПСС з 1940 г. У 1934 г. паступіў у чыгуначны тэхнікум. Пасля працаваў у дэпо Мінеральныя Воды, дзяжурным на ст. Кіславодск. У 1938 г. прызваны ў Чырвоную Армію, адкуль быў накіраваны ў ваеннае вучылішча. Пасля сканчэння вучылішча ў 1940 г. служыў камандзірам артылерыйскага ўзвода ў г. Калініне. З першых дзён вайны ў складзе 19-га артылерыйскага палка ўдзельнічаў у баях за Віцебск і Оршу. На Салаўёвай пераправе цераз Дняпро быў паранены. Жыхары в. Першамайская Дарагабужскага раёна, рызыкуючы жыццём, схавалі і вылечылі яго. Пасля папраўкі ўзначаліў арганізаваную групу з мясцовай моладзі і акружэнцаў, якая ў лістападзе 1941 г. пачала свае дзеянні. У снежні 1941 г. група ўвайшла ў атрад С. У. Грышына. П. І. Звяздаеў быў камандзірам узвода, роты, з чэрвеня 1942 г.—3-га батальёна. У чэрвені — ліпені 1944 г. камандзір 3-й партызанскай брыгады злучэння «Трынаццаць». Пасля злучэння з часцямі Чырвонай Арміі ў чэрвені 1944 г. П. І. Звяздаеў быў накіраваны на перападрыхтоўку ў Вышэйшую афіцэрскую школу. Прымаў удзел у разгроме японскіх захопнікаў. З 1946 г. П. І. Звяздаеў на савецкай і гаспадарчай рабоце. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1942), ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Ганаровы грамадзянін Быхава. З 1975 г. на пенсіі.

Іван Трафімавіч Мацяш, нарадзіўся 4 кастрычніка 1922 г. ў с. Юскаўцы Лохвіцкага раёна Палтаўскай вобласці. Пасля сканчэння Харкаўскага пяхотнага вучылішча ў чэрвені 1941 г. ў званні лейтэнанта прыбыў на месца службы. З першых дзён вайны на фронце. Пры адступленні пад Смаленскам трапіў у акружэнне. Вырваўшыся, спрабаваў разам з чырвонаармейцамі прабіцца да сваіх. Са студзеня 1942 г. ў партызанах: камандзір роты, у маі 1943 г.— чэрвені 1944 г. камандзір 5-га батальёна, у чэрвені — ліпені 1944 г. камандзір 5-й брыгады партызанскага злучэння «Трынаццаць». У пасляваенны час на савецкай рабоце, у органах унутраных спраў Смаленска. У 1955 г. І. Т. Мацяш у ліку трыццаціцысячнікаў працаваў старшынёй калгаса ў Ельніцкім раёне, потым дырэктарам саўгаса. З 1969 г. на савецкай рабоце ў Смаленску. Узнагароджаны трыма ордэнамі. Ганаровы грамадзянін Быхава.

Быховский районный историко-краеведческий музей

14 Зак. 2435

І. Т. Мацяш.

С. П. Скварцоў.

Сяргей Пятровіч Скварцоў, нарадзіўся 27 мая 1918 г. ў в. Муралёўская Шатурскага раёна Маскоўскай вобласці. Член КПСС. Да прызыву ў армію працаваў планавіком-эканамістам. У 1940 г. пасля сканчэння палкавой школы старшы сяржант Скварцоў быў накіраваны ў 13-ы мотастралковы полк 13-й танкавай дывізіі. З 27 чэрвеня 1941 г. ў складзе палка ваяваў на Заходнім фронце. Удзельнічаў у баях пад Барысавам, Оршай, Ярцавам. Пры адступленні палка арганізаваў пераправу цераз Днепр параненых чырвонаармейцаў і камандзіраў, штабных дакументаў, за што быў прадстаўлены да ордэна Чырвонага Сцяга. З уцалелых байцоў палка пад Вязьмай пасля няўдалай спробы злучыцца з часцямі Чырвонай Арміі, Скварцоў разам з іншымі гаварышамі прыняў удзел у арганізацыі партызанскага атрада. Адбылося гэта ў лістападзе 1941 г. каля в. Фаміно Дарагабужскага раёна. У чэрвені 1942 г. С. П. Скварцоў начальнік штаба 1-га батальёна палка «Трынаццаць», са снежня 1943 г.— начальнік штаба палка, у чэрвені 1944 г.— начальнік штаба злучэння «Трынаццаць». Вялікую Айчынную вайну закончыў у складзе 8-й гвардзейскай арміі 1-га Беларускага фронту. Звольнены ў запас з радоў Савецкай Арміі ў 1961 г., пераехаў у Курск. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, многімі медалямі. С. П. Скварцоў памёр у 1983 г.

Марк Давыдавіч Максімаў, партызанскі паэт, нарадзіўся 21 студзеня 1918 г. ў г. Шморс Чарнігаўскай вобласці. У 1940 г. скончыў літаратурны факультэт Кіеўскага педагагічнага інстытута імя Горкага. У Айчынную вайну на фронце, стралок-аўтаматчык. Потым у партызанах — палітрук коннай разведкі партызанскага палка «Трынаццаць», пазней — рэдактар палкавой газеты «Смерть врагам». Удзельнік Боўкінскай абароны, незабыўным дням якой прысвяціў паэму «У краі маўчання». У пасляваенны час выдаў шэраг кніг. Тэма ваеннага брацтва, дружбы народаў нашай краіны, пераемнасці пакаленняў пранізвае ўсе творы паэта. Яго пяру належаць праўдзівыя нарысы пра верных сяброў-партызан, легендарнага камандзіра партызанскага злучэння «Трынаццаць» Героя Савецкага Саюза С. У. Грышына. Максімаў вядомы і як драматург: яго п'еса «Сям'я Бугровых» ставілася ў Маскве, ішла ў многіх тэатрах краіны. Ён аўтар сцэнарыя гістарыка-рэвалюцыйнага фільма «Асабіста вядомы» (1958).

Вогненныя вёскі: праўда і памяць

Вёскі Боўкі, Ветрашка, Гарадзец, Дабужа, Замошша, Красніца, Лубянка, Мудчыцы, Смаліца, Студзёнка, Трылесіна... 72 вёскі і вёсачкі на Быхаўшчыне, якія ў ваенны час сталі вогненнымі. Так іх пазначылі ў нашых сэрцах тыя, хто гарэў разам з імі, каго забівалі ў родных сценах, на роднай зямлі. Вогненнымі яны сталі для загінуўшых у агні, для жывых, цудам уцалелых яны таксама засталіся ў памяці вогненнымі. Ад іх гарачага болю няма спакою. Страшэнная памяць і праўда тых дзён — гэта юнацтва, лепшыя гады жыцця чалавечага для большасці з тых сведкаў, што жывуць сёння. Пачатак і росквіт іх жыцця быў перакрэслены жудаснай смерцю родных, уласнай смерцю, у ланах якой набывалі яны самі.

Апошнія сведкі... Іх боль і страх перажытага ўскалыхвае, прымушае біцца сэрца, як тады — у сорак другім, сорак трэцім, сорак чацвёртым вогненных гадах...

ГАРАДЗЕЦКІ СЕЛЬСАВЕТ
ВЁСКА ГАРАДЗЕЦ

Да вайны ў ёй было 303 двары, 1060 жыхароў. Партызанскую вёску Гарадзец палілі двойчы. Першы раз — у чэрвені 1942. Акружылі з трох бакоў, людзей забівалі, мучылі, палілі ў хатах. У кастрычніку 1943 карнікі наведаліся сюды, каб спаліць усіх яе жыхароў. Людзей загналі ў тры хаты, забілі вокны, дзверы. Аднак выканаць свой намер ім не ўдалося — ноччу партызаны 425-га партызанскага палка ўратавалі людзей, разагнаўшы зграю фашысцкіх вылюдкаў... Але ад сваёй задумы карнікі не адмовіліся — праз нейкі час зноў вярнуліся, каб назаўсёды расправіцца з партызанскай вёскай. Рознымі хітрыкамі, падманам і абяцанкамі яны заманьвалі ў вёску людзей, якія перасяліліся ў той час у лес не толькі з Гарадца, а і з Замошша, Гуты, Сялібы. Даверлівыя старыя, жанчыны з дзецьмі прывезлі з лесу нават свае пажыткі. Не ведалі яны, што гэта — пастка... Карнікі загубілі 460 жыхароў, спалілі 297 двароў.

Быховский районный историко-краеведческий музей

З успамінаў Лізаветы Міхайлаўны Міхасёвай, 1902 года нараджэння, жыхаркі в. Гарадзец

...Майго брата папярэдзілі, што немцы ачанілі нашу вёску. І Студзёнку таксама, яшчэ з вечара. Ён адразу ж прыбег да нас. А куды мне было дзявацца? Мой мужык уцёк з іншымі, а я з дзецьмі засталася — Эдзіку было 3 гады, Надзя 2 класы да вайны скончыла. А яшчэ ў тую ноч якраз свіння апарасілася. Куды дзявацца? Мы сядзім, чакаем няведама чаго. Заходзіць паліцэйскі: «А вы яшчэ дома? — пытае.— Ідзіце да шляху»,— загадвае. Сагналі нас у адну кучу. Сталі біць людзей і дапрошваць: «Кармілі бандытаў з лесу?» Галіка-ва Антона, Тарасава Мішу, Аркадзя Мельнікава білі, вельмі Дуню Мінчукову білі. І ўсё за партызан. Тут генерал ці нейкі чын высокі з Быхава прыляцеў на машыне. «Разыходзьцеся»,— перавёў яго загад праважаты. Толькі гэта нас і выратавала. А ўсё Вера Дамброўская арганізавала. Да вайны яна доўгі час працавала ў нас акушэркай. У вайну ў яе, у Быхаве, кватараваў той генерал. Калі даведалася ад пераводчыка, што Гарадзец паехалі паліць, упэўніла яго, што тут невінаватыя людзі жывуць. А на выгане ўжо хаты гарэлі. Мы разбегліся, каб свае манаткі з хаты вынесці. І не ведалі яшчэ, што каля царквы нашых людзей у яму клалі кулямі. Я бегла глядзець, дзе людзі, і прабеглася па той яме, па людзях сваіх, значыцца, прысыпаных пяском. А побач з ямай той немец стаяў, прыгразіў аўтаматам мне. Сцярог відаць, каб не выкапалі...

З успамінаў Ганны Рыгораўны Казловай, 1926 года нараджэння, жыхаркі в. Гарадзец

...З трох бакоў людзей пачалі біць. А вёска вялікая — кіламетры на тры расцягнулася. Каля царквы сабралі многа-многа нашых, цяпер там помнік стаіць, і па спісу выклікаюць. І ўсіх, хто з партызанамі быў звязаны. Гэты спіс Верка Шклаўцова, раскулачаная, дапамагла скласці. Сама паказвала, калі хто маўчаў. Падводзілі да ямы, кулю ў грудзі, і — канец. Шундрыкаву Ульяну з дзецьмі забілі. Старэйшай яе дзеўцы болей 10 гадоў не было. Спачатку дзяцей яе забівалі. Чацвёра. Яна стаяла моўчкі, а на грудное дзіця, што на руках трымала, ківае, сама ўпала ў яму. Носарава Івана, толькі-толькі паспеў ажаніцца, забілі, Апанаса Сідарава, гарманіста Колю Старчанку дваццаці гадоў, Васіля Паўлюкова, Лазарыху Васільеву з дачкой. 27 чалавек паспелі забіць у гэтым месцы. А там генерал іхні прыехаў, спыніў усё гэта. А вёска ўжо гарэла, кроў нашых людзей родных лілася.

З успамінаў Марыі Гаўрылаўны Кавалёвай, жыхаркі в. Гарадзец[1]

...Прагналі на канец сяла. Сюды во, як едзеш во з Быхава, дзе астаноўка там, сюды прыгналі. Сяйчас прыгналі, ну, і тут паставілі. Паставілі, ну, і стой тут. Божа ж мой, дзеці крычаць. Ага. Яны пайшлі на другі бок вуліцы і сяйчас — раз, выстрал! А гэтыя дзеці: «А-а-а-а!» — крычаць. Дык адна смаленская баба — чацвёра дзяцей — дык яна кажа:

— Дзетачкі, чаго вы крычыцё, памучуць трохі, пастрашуць і пусцюць.

Ну, і мы ўжо, мы тут ужо каніцелімся:

— А бабачкі, а любачкі, а што дзелаць, куды пагонюць?

— Нікуды не пагонюць,— заяўляе паліцэйскі,— паб'ём, папалім. Усё вам!

Ну, і тут во яны яшчэ раз выстралілі. Цераз выстрал гэтыя людзі сталі ўжо каніцеліцца. Яны сяйчас заварочваюць:

— Ком, рус, ком, ком у хату!

Увагналі нас сюды ў хату, у гэту. Там, праўда, у гэтай хаце мосту не было. Тады, як бамбёжка была, дык вырывалі масты, гэту падлогу і ўсё гэта. Думалі: «Паедзем у лес і пасядзім, а вайна кончыцца, дык прыедзем, хоць зямляпку якую з тых дошак адзелаць». Мосту там не было. Ну, і нас сюды. І вочарадзь — р-р-р-р! З пулямёта ў дзверы. Каго ўбілі, каго ранілі. Дзверку закалочваюць і запальваюць дом еты.

Там адзін кажа:

— Цётка Манька, хадзі во тутка свіціцца. Ямка такая — бульбу сыпалі.

— Свіціцца! Дай-ка мы будзем драць гэту зямлю.

А я ўжо ранена. Мне ўжо некуды. Уся во так у крыві. Босая. Пакроўка, сняжок ужо, босая і ўся ўжо вот так у крыві! Голая ж! А божа ж мой! Давай мы так калупаць, давай. Ды ўжо прыцемкам, так во на змярканні.

— Лезь, чаго не лезеш!

Я палезла. Вылезла! І ён за мной. Дык я ўжо як вылезла, папаўзла ў ямкі — там колесь кірпіч дзелалі. Дык я ямкамі і там па агарод, там двор — я туды. Божа ж мой,— сабака!.. Ну, як сабака — я на агарод і попаўзкам, попаўзкам... Стажок стаяў — я пад гэты стажок рачочкам. І ўжо ў мяне ўсё. Во тут вырвала кусок, і цяпер рана ёсць такая. Ну, і ляжу. Думаю... Толькі ляжу, чую — кулямёт коціцца: тр-тр-тр. І немцы. Думаю, ну ўсё. Адтуль вылезла... Тут памяраць ужо буду. Ну, чую, крычыць Мархвачка тая, вечарам і крычыць:

— Лю-ю-юдцы! Хадзіце дамоў-ў-ў, паны-ы-ы завуць!

Пытанне: — Гэта яны прымусілі крычаць?

— Прымусілі. Узялі і павялі. І загадалі: «Гукай усіх людзей». І яна крычыць:

— Людцы! Хадзіце дамоў, паны завуць!..

[1] Друкуецца са скарачэннем па кн.: Адамовіч А., Брыль Я., Калеснік У. Я з вогненнай вёскі... Мн., 1975. С. 249—250.

Быховский районный историко-краеведческий музей

СЛЕДЗЮКОЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ
ВЁСКА КРАСНІЦА

Перад вайной у вёсцы было 283 двары, 769 жыхароў. Партызанскую вёску Красніца забівалі адну з першых у раёне. Людзі яе яшчэ не ведалі і не чулі, што можна такім чынам, так жорстка распраўляцца з чалавекам... 17 ліпеня 1942 г. 696 жыхароў і 283 двары спалілі карнікі, па-здрадніцку заманіўшы ў вёску мужчын і жанчын, якія былі на сенакосе. Потым, без лішняга шуму і мітусні, каб нікога не спалохаць і не ўпусціць з поля зроку, заганялі ў хаты...

З успамінаў Антаніны Цярэнцьеўны Рудаковай, 1936 года нараджэння, ураджэнкі в. Красніца, загадчыцы дзіцячага-сада № 3 г. Быхава

...Ранкам усе таты маіх сябровак пайшлі за вёску на балота касіць траву. Пайшлі многія з жанчын. Насупраць нас жыла цётка Анфіса, маміна сястра. Яна таксама збіралася за вёску, папрасіла паглядзець за яе сынам. Дзіме, так яго звалі, не было яшчэ і года. Я разаслала вялікую хустку на зямлі каля штучнай ямы, і мы ўсе гулялі. Наша хата стаяла насупраць школы па ўзгорку, а ўнізе праз вёску праходзіў шлях на Грудзінаўку. Мы, дзеці, відаць, першымі і заўважылі, як па дарозе шмат-шмат крытых машын паехала ў другі канец вёскі. Хутка пачаліся выстралы. Мне захацелася адразу ж расказаць пра гэта маме.

Помнік ахвярам фашызму ў в. Красніца.

Пра Дзіму я, зразумела, забылася, бо вельмі хвалявалася. Каля сваёй хаты ўбачыла маці, суседку Маланню з дачкой Шуркай, сяцёр маіх Лену і Ніну, брата Колю з сябрам Міцькам. Трохгадовы брат Шура трымаўся за мамін падол. Гадавалага браціка Ваньку маці трымала на руках. Усе стаялі нібыта здранцвелыя. Мы чулі глухія выбухі ў хатах, яны станавіліся бліжэй і бліжэй... Вось заскуголіў паранены сабака ў двары дзядзькі Аніскі, ужо чуем выстралы ў хаце цёткі Анфісы, на вуглу вуліцы ў Малінінаў. А потым высокі афіцэр з какардай і адзін рускі падышлі да нас. «Заходзьце, заходзьце»,— падштурхнуў афіцэр Маланню да нашай хаты. Яна кінулася прасіць і цалаваць афіцэру ногі. Ён уханіў цётку за валасы і пачаў цягнуць у нашу хату. Усіх нас загналі ў дом. Афіцэр пайшоў у другую палавіну, цётка Малання за ім. «Паночку, не страляй»,— прасілася яна. Мы з 12-гадовым братам Колем і яго дружком таксама пайшлі за афіцэрам. Я села ў вугал і паставіла перад сабой венік. Цётку Маланню афіцэр забіў першай. Куля прайшла ёй праз рот і зубы. Закрычала Шурка, яе дачка. Афіцэр выстраліў і ў яе. Сябар Колькі Міцька нырнуў пад стол, накрыты доўгім абрусам. Афіцэр стрэліў пад стол, паранены хлопчык закрычаў. Афіцэр паглядзеў на мяне і стрэліў яшчэ раз. Зноў крык. Немец яшчэ выстраліў і паглядзеў на мяне. Так паўтаралася некалькі разоў. Каля мяне прысеў Коля, а побач стаяў ложак, пад якім адкрывалася маснічына. Коля піхнуў мяне пад ложак, падняў маснічыну, зноў піхнуў мяне ў яму, дзе захоўвалася бульба і сам нырнуў. Сядзім. Чуем выстрал, потым хрыпенне. Пад пол ручаём палілася кроў... Было яшчэ некалькі выстралаў. Потым стала ціха. Мы вылезлі са сховішча, а ў вакне насупраць немец, глядзіць з вуліцы прама на нас. Мы зноў у яму пад ложкам палезлі. У гэты момант у хаце пачуўся моцны ўзрыў. Усё кругом стала трашчаць, ад дыму слязіліся вочы. Брат за руку выцягнуў мяне ў хату. Кругом усё пачынала гарэць, шыбы ў вокнах былі выбіты. Мы кінуліся на кухню, там яшчэ агню не было. І тут я ўбачыла тое, што ніколі не забуду... Лена ляжала забітая, роўна-роўна выцягнуўшыся на падлозе. Ніна таксама ляжала. Маці за сталом пічком ляжала на забітым Вані. А брат Шура верхам на маме. Чэрап у Шуры быў разбіты і ўсё расцякалася па маме... Мы не заплакалі. Перашагнуўшы цераз родных, выскачылі ў акно. На двары яшчэ стаяў немец. Мы ўпалі на зямлю і паўзком у жыта, потым па канаве. Паўзці было цяжка і я часта ўзнімалася. І адразу ж кулі «ці-ў, ці-ў» справа і злева. Гэта кулямётчыкі з даху стралялі па нас. Коля мяне прыціскаў да зямлі, і мы зноў паўзлі, аж да Голага балота. Гэта кіламетраў 5. У балоце напіліся вады і тады расплакаліся (тады яшчэ не ведалі, што разам з мужчынамі загінуў у агні і наш бацька). «А куды ж мы цяпер пойдзем, сястрычка?» — усё паўтараў Коля. «Пойдзем да цёткі, якая семечкі нам дава-

Быховский районный историко-краеведческий музей

ла»,— прапанавала я. І мы пайшлі ў Грудзінаўку да маёй хроснай маці Ганны Андрэеўны і Аляксандра Апанасавіча Мазуравых. Гэтыя людзі ўдачарылі мяне. Аляксандра Апанасавіча я называла бацькам, а яго жонку — бабуляй. Слова «мама» вымавіць не магла — перад вачыма адразу паўставала забітая маці.

Блуканне па пакутах працягвалася да самага канца вайны. Восенню 1943 г. з набліжэннем фронту нас перасялілі ў Быхаў, потым у вёску Залоцце. У пачатку лета 1944 г. нас, дзяцей і дарослых, пагналі перад сабой да Друці. Праз бясконцыя лясы ішлі ўперамежак з акупантамі. Потым нас кінулі. Мы схаваліся пад зямлёй у вялікім бліндажы, аднак праз некаторы час фашысты нас знайшлі і зноў пагналі перад сабой. Ішлі ноччу, па дарозе ў жыце, многія нябачна кідаліся ў яго, каб адстаць. Да раніцы ўсе, хто выратаваўся, чалавек пятнаццаць, прыбіліся да вялізнай сасны ў жыце. Праз нас ляцелі снарады ў абодва бакі. Было ясна, што хутка ўсё скончыцца. Аляксандр Апанасавіч парваў выдадзены акупантамі ў Быхаве дакумент і закапаў тут жа. Сярод нас была жанчына з грудным дзіцем, яно вельмі громка крычала. А калі паднялося сонца, убачылі, як прама на нас ішоў шчыльны ланцуг фашыстаў з бляхамі на грудзях у бліскучых чорных накідках. Некалькі спынілася каля нас, сталі патрабаваць дакументы... Астатнія ланцугом пайшлі далей. Адзін фашыст з ланцуга павярнуўся ў наш бок і аўтаматнай чаргой траніў у жанчыну і старога...

Гэта быў апошні дзень акупацыі. Днём мы сустрэліся з нашымі байцамі. Былі яны зморапыя, чорныя ад пылу і поту. Мы беглі ім насустрач па жытнёвым полі, замініраваным, як потым стала вядома, і крычалі. І ніхто з нас не ўзарваўся. Жанчыны кідаліся да іх ног, цалавалі рукі. Байцы пайшлі ўперад па тым жытнёвым полі. І на нашых вачах пачалі рвацца міны...

З успамінаў Палікарпа Міканаевіча Шакунова[1]

...Яны ішлі цераз дзярэўню, не трогалі нікога. З таго вунь канца цераз кладбішча. Толькі адзін набег уцякаць, дык яго ўлавілі:

— Ты парцізан?

— Не.

Ну, яго і пусцілі. З такой паліцікай, каб ета ўспакоіць, людзей было. Да. Ну, заселі яны. З'ездзілі яшчэ ў Быхаў узнаць, каторую Красніцу — Первую ці Утарую — біць. У Быхаве ўтачнілі, прыязджаюць, ацапілі ўсю дзярэўню. З вінтоўкамі, з кулямётамі, устанавілі немцаў. А ў дзярэўні былі і паліцаі. Бо калі заганялі ў хату, дык яны па-руску:

А. Ц. Рудакова.

— А ну, у хату захадзіце!

Ну што, нездагадлівы народ быў. Ідуць, і ўсё.

Пытанне: — А яшчэ не было блізка такіх выпадкаў, каб забівалі?

— Раньша не было яшчэ. Да гэтага дажа не слышна было.

Да. І сталі ў хаты заганяць. Заганяюць і далей ідуць, а ўслед ужо запальвалі. Хаты гэтыя з народам. Карань хаты. І з лугу людзі ідуць, сена вязуць, а немцы смяюцца гэтыя, каторыя там ахраняюць, часавыя гэтыя. Смяюцца толькі, што самі ідуць на гібель. А людзі ж не знаюць. Адзін з адным гавораць, што «гэта з партызанамі б'юцца, давай быстрэй уцякаць, а то будзе і тута...». А калі немцы толькі прыехалі, камендант аб'ясніў, каб на полі ні ската, ні саміх, ні каго штоб не было. Ні ў лясу, ні на полі. Таму што з парцізанамі будзе бой і будуць усіх убіваць. А ў дзярэўні не будуць трогаць. Ну, усе і кідаліся ў дзярэўню. Бягуць, бягуць і бягуць. А таго не знаюць, што яны бягуць, а іх — у хаты заганяюць, б'юць. Да. І палюць. Вот і ўсё.

Пытанне: — Ну а вы? Вас таксама?

— Нас шэсць чалавек ішло з косамі. Ну і іх ішло восем.

— Кідайце цераз забор,— загадваюць.

Ну мы і бросілі. Як бы на цяперашні розум, дык развярнуў бы гэтай касой — не справіўся б мяне застрэліць, як яму галаву ссек бы касой. Дурныя, можна сказаць, былі. Вось і ўсё. Не вучаныя. Не здагадваліся, што гэта робіцца...

Пытанне: — А крыкі людзей чуваць?

— Не чуць нічога. Нічаго не чуць. А толькі стральба і ў гэтым канцы гарыць. Да. Ну нас завярнулі і кажуць:

— Захадзіце ў гэту хату.

Мы заходзім у хату гэтую, а тут поўна ўжо загната. Людзей. І зразу ж гранату нам сюды — шарах! Граната ўзарвалася. Крык! Закрычаць — утарая! Трэцяя! Ну, кагда трэцяя, тагда ўжо ўсё. І замоўклі.

Пытанне: — А вы як у гэты момант?

— Я замеціў, што ён у дзвярах чаку з гранаты

[1] Друкуецца са скарачэннем па кн.: Адамовіч А., Брыль Я., Калеснік У. Я з вогненнай вёскі... Мн., 1975. С. 403—407.

Быховский районный историко-краеведческий музей

вынімае — я ж быў на вайне ўжо. Я ж у Фінляндыі быў на вайне, дык я знаю ўжо.

— Лажыцеся!.. Гранату кідае!

Я сам толькі ўспеў кінуцца, каторыя ляглі, каторыя не — ён ужо кінуў гранату. І мальчык, катораму жывот вырвала,— граната перад ім узарвалася,— ён бросіўся на мяне. Яго галава на маю галаву напала. І кагда ўжо трэцюю гранату яны кінулі, узарвалася,— усё, цішына стала. Дым гэты сышоў нямнога — заходзе адзін, немец ці паліцай, і правярае каждага. І з вінтоўкі дабівае. Гэтаму мальчышку — ён яшчэ жывы быў — пацягнуў, ён лыпнуў вачамі, дык ён яму ўдарыў, а яго галава была вышэй маёй, і мне толькі фуражку прабіла, а самаго не затрывожыла.

І з етай групы вышла нас два не ранетых, я тожа не ранеты быў. Ета не ранение, што шапку прабіла, валасы выскубнула. Да, і два ранетых вышла. А ўсе пагібшыя ў гэтай групе. Там народу, можа, сорак ці пяцьдзесят чалавек было — я не магу точна сказаць...

П ы т а н н е: — Вы доўга ляжалі?

— Не, як яны толькі выйшлі... Я сазнание не губляў, я слышу: выходзіць... вышаў... пайшоў... разгавор, пайшлі на вуліцу... Да, як на вуліцу пайшлі, я падымаюсь. Кругом паглядзеў — няма нікога, усе ляжаць! Ціхонька гавару:

— Ці ёсць хто жывы?

Да. Другі гавора:

— А я жывы.

І другі кажа:

— Я ранеты, але жывы.

Што рабіць? Да. Давай на чардак. Мы на чардак усхваціліся. Там дыра была. Да, я набліжаў. Яны пайшлі ў адну хату. Пасля далей. Я гавару:

— Будуць паліць, усё, мы нагарым тута.

— Ды не будуць!

— Ды як не будуць, дым ідзець жа, гарыць што-та.

Ну, саскочылі і — у гарод. Ячмень быў. У ячмень гэты. Да. І там поўзалі па гэтаму ячменю. А там праз лужок у жыта. Пакуль часавы адвярнуўшысь быў. І ў лес.

П ы т а н н е: — А ў вас сям'я была?

— Усіх пабілі. Адным словам, сродства, братніх дзяцей, сёстры, браты ў мяне,— пагібла ў тое ўрэмя ў мяне дваццаць пяць чалавек. І жану ўбілі...

ВЁСКА БОЎКІ

Да вайны ў вёсцы Боўкі было 298 двароў, 896 жыхароў.

Вёску Боўкі палілі разам з вёскай Дабужа — 14 кастрычніка 1943 г. Былі загублены 174 жыхары, спалена 298 двароў.

З успамінаў Аўхіміі Рыгораўны Ганчаровай, жыхаркі вёскі Боўкі

Пасля поўдня, на Пакроўку, ацапілі вылюдкі ўсё. Выганялі нас, хто ў чым быў, на вуліцу. А потым усіх у лазню вясковую. Былі толькі старыя ды малыя. Чалавек трыццаць удалося ім сабраць у гэтай лазні. Дзверы зачынілі і падперлі колам. А потым праз вакно шуганулі гранату. Адразу ж шмат забілася. І ўсе крычаць — ранетыя, і тыя, хто яшчэ цэлы. Я была там з двума дзеткамі. Аднаго забіла адразу, другое дзіцятка маё ў галоўку было ранета. Мне ў абедзве нагі трапіла. З намі бежанец адзін быў, звалі Васілём. Дык ён выбіў дзверы і набег. А тут яго куля — раз! За ім сталі выпаўзаць ранетыя, і ўсіх іх тут парасстрэльвалі. Я таксама напаўзла з жывым сыночкам. Не ведаю, не помню, як уратаваліся. Але сынка не ўберагла — намёрз ад ран. А нехрысці тыя лазню падпалілі, і хто там застаўся, каторыя не лезлі на кулі, згарэлі жывымі...

ТРЫЛЕСІНСКІ СЕЛЬСАВЕТ
ВЁСКА ДАБУЖА

Да вайны ў вёсцы Дабужа налічвалася 124 двары, 613 жыхароў. Палілі вёску не адзін раз. Асабліва «напрацавалі» карнікі ў жніўні 1942 г. і кастрычніку 1943 г. Былі спалены ўсе 124 хаты, забіты і згарэлі ў агні 117 жыхароў...

З успамінаў Ульяны Максімаўны Кірэевай, 1911 года нараджэння, жыхаркі в. Дабужа

Два разы нас палілі. Як пабілі людзей у Краснай, мы ўжо разумнейшымі сталі — пайшлі ўсе ў балота. Увесь ліпень там сядзелі. Толькі хлеба нанячы прыходзілі. Звычайна поччу. Бульбу таксама стараліся палоць. А ў вёсцы аб'ява вісела — наказваць будуць толькі за партызан. Ураднік у нас быў у вёсцы, Пімен Панцялееў. Нікога не выдаваў. У адзін дзень прыйшлі эсэсаўцы і напалілі амаль усе хаты — 15 засталося стаяць, астатнія агонь з'еў. Старыя выйшлі з балота на папялішчы, а тут, адкуль ні вазьміся, карнікі. Каго захапілі — загналі ў пограб, каля магазіна. «За партызан 5 чалавек давайце»,— кажуць. Гэта, значыцца, страляць іх будуць. Была там Дуня Марозава з маці і чатырма дзецьмі. Колю яе было некалькі месяцаў, а Галі старэйшай 12 гадкоў. Яна і выйшла ім насустрач з дзецьмі. Гэта, значыць, дабравольна хацела адвесці нас ад смерці. Немец яе адпіхнуў. Былі там яшчэ Квартальная Ульяна з дочкамі Лідай і Нінай, Матрона Салаўёва. Сабралі гэтак, каго дзе, а потым бензіну туды і гранату...

Да вясны жылі ў Боўках, а потым дамоў вярнуліся. Людзі некаторыя ўжо свае хаты адбудавалі, а большасць жыла ў пагрэбах і зямлянках. Там і пяклі хлеб партызанам Грышына. Іншы раз хадзілі на папялішчы сваёй хаты, дзе засталася печ, і ў ёй пяклі. У верасні 1943 г. зноў пайшлі ў балота — фронт ужо бліска быў. А ў балоце немцы з'явіліся, як прайшліся ланцугом — усіх нас падгрэблі. Чалавек сорак знайшлося. Пагналі ў Радзькаву Слабаду. Было гэта 18 кастрычніка.

Бытовский районный историко-краеведческий музей

У. М. Кірэева.

Мужчын ад нас аддзялілі, сказаўшы, што ім трэба два масты пабудаваць, а нас — на Стары Быхаў, маладзейшых акопы ганялі капаць. Хадзілі ў лапцях. Я неяк перавязала вяроўкай нагу, яна пачарнела і распухла. Паказваю немцу, а ён кажа: «Капут»,— і махнуў рукой. Думала, на волю вырвалася. А ісці сапраўды не магу, бо не чую нагу сваю. Нібы на адной стаю. Пазней сказалі, што шчаслівай нарадзілася. Неяк так-сяк дайшла да Ветранкі, там пачула, што мужыкоў з нашай вёскі не масты пакінулі будаваць, а ямы сабе капаць. Дакладней, шасцёра капалі, а астатнія стаялі ў абыгарадзі, дзе коні былі. Адзін з іх, Максімцоў Васіль, кінуўся бегчы ў ельнік. Немцы за ім. Тыя шасцёра бачаць такую справу — кінулі лапаты і таксама наўцёкі. Уратаваліся. А тыя 16 палягглі пад кулямі. Сярод іх быў мой бацька і брат Апанас...

У лістападзе 1943 г., хто застаўся ў Дабужы, эвакуіравалі ў Ветранку. Аднойчы пайшла ў Грылесіна, каб узяць дазвол пахаваць бацьку і брата. А там фашысты з какардамі. Выганяюць усіх з хат і пагналі нас капаць акопы. Каб неяк выбрацца адсюль, зрабіла з трапак сабе «жывот» і так прабралася дамоў. Ноччу прыйшла ў Дабужу — ні немцаў, ні нашых. А раніцой няведама адкуль узяліся — мужчын набралі, а нас, жанчын, не чапаюць. А ў 6 гадзін вечара нашы прыйшлі. Камандзір батальёна кажа ў нашай хаце, што, магчыма, тут будзе бой і лепш дзе-небудзь перасядзець. Пайшлі на ўскраек лесу. І схаваліся ў пагрэбы. Бачым, немцы ідуць п'яныя. Выгналі нас адтуль, а ў іншыя гранаты пакідалі. Нас чалавек 30 пасадзілі на гару — гэта каб салдацікі не маглі страляць у сваіх. А самі немцы сядзяць за гарой, нашых б'юць. «Чым гінуць тут над кулямі, набяжым»,— гавару Еве Салаўёвай. Так і пакаціліся ўніз пад нямецкімі кулямі. Дабягаем да провалакі, за якой нашы салдацікі...

ВЕРХНЯТОШЧЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ЗАЛАТОЕ ДНО

Вёсачка Залатое Дно на перагоне паміж раз'ездам Лудчыцы (15-ы раз'езд) і станцыяй Тошчыца была невялікай — усяго 10 дамоў. Спрадвеку мужчыны яе працавалі на чыгунцы, на станцыі Верхняя Тошчыца, якая была амаль побач. У вайну ад міп быхаўскіх партызан узляталі ў паветра варожыя эшалоны каля вёскі... У ліпені 1942 г. фашысты акружылі вёску, жыхароў выгналі з хат, будынкі спалілі. Вёска Залатое Дно не адрадзілася — на яе месцы мемарыяльны знак...

З успамінаў Мікалая Нічыпаравіча Іванова, 1933 года нараджэння, ураджэнца в. Залатое Дно, жыхара в. Чырвоная Беларусь

Гэта было летам 1942 г. Мы з братам гулялі каля вёскі на чыгунцы. Пачулі поезд. Я, смеючыся, сказаў брату: «Зараз гэты мосцік узляціць хвосцік». На чыгунку часта прыходзілі партызаны атрада Максімава-Лебедзева, і мы не адпойчы былі сведкамі крушэння ваенных саставаў. Праўда, у той дзень партызан не бачылі, але было нейкае прадчуванне, што поезд навінен згарнацца. Аднак прамільгнуў за паваротам апошні вагон, а наўкол было ціха і спакойна. Хутка яшчэ адзін эшалон імчаў на наш мосцік. У гэты раз на нашых вачах ад моцнага ўзрыву на месце састаў спыніўся. Мы кінуліся дамоў, аднак з поезда на нас пачалі страляць. Тады мы павярнулі ў балота. З лесу ўбачылі, што запалася полымем наша вёска...

З успамінаў Еўдакіі Якаўлеўны Івановай, 1907 года нараджэння, ураджэнкі в. Залатое Дно, жыхаркі в. Чырвоная Беларусь

...Страху пацярпеліся яшчэ да таго, як наша Залатое Дно згарэла. Жылі мы ўсё жыццё каля

Памятны знак на месцы вёскі Залатое Дно, спаленай фашыстамі.

Быховский районный историко-краеведческий музей

чыгункі, і мужыкі нашы на ёй да вайны працавалі. Калі сталі партызаны і пачалі ўзрываць рэйкі, усё падазрэнне спачатку лягло на нашых мужыкоў. Прыехалі аднойчы немцы, і забралі іх у Магілёў, у турму. Каля двух месяцаў таміліся там. А чыгунка па-ранейшаму ўзрывалася. Упэўніліся, відаць, што не нашы мужыкі вінаваты, і адпусцілі ўсіх да хаты. А яны як прыйшлі, так адразу ў лес падаліся, да партызан. Так і жылі ў вёсцы адны бабы з дзецьмі.

У той дзень, калі вёску нашу спалілі, мы спачатку пачулі выбух на чыгунцы. У мяне тады аж сэрца абарвалася — мае Коля і Віцечка гулялі паблізу на катлаване. Эшалон спыніўся, і ад яго ланцугом на вёску пайшлі немцы. Мы, як стаялі хто ў чым, пабеглі ўцякаць. Са мной беглі шасцігадовая дачка Нэля, сын Васілёк. Раніцай прыйшлі ў вёску, а яе няма, усё згарэла. Толькі ляжалі забітыя старая Праскоўя Шарэнка і бежанка адна... Пабеглі на 15-ы раз'езд, за тры кіламетры ад вёскі. Там сустрэла сыночкаў Колю і Віцю. Як сышлі з дому ў майках і трусах, у тым і начавалі ў лесе. Так пачаліся нашы пакуты — зіму жылі ў зямлянках, лагерам у лесе каля вёскі Камарычы. Шмат народу было — са Старасельля, Новага Быхава, Лудчыц, Камарыч. Аднойчы над нашым лагерам з'явілася нямецкая «рама», а ў хуткім часе атрад карнікаў прыйшоў на наша месца, пацягнулі ў Верхнюю Тошчыцу на дапрос. Пад кулямі нас загналі ў сарай — думалі, паліць нас будуць. Аднак сталі на дапросы выводзіць. І ўсё пыталіся, ці многа партызан у лесе, дзе мужык мой, пыталі. Гаварыла, што бацька дзяцей на міне падарваўся, што партызан поўны лес і зброі ўсялякай хапае, нават на ножках стаяць. Потым зачынілі нас усіх у стопку. Людзей было столькі, што думала, задыхнёмся. Паставілі кацёл баланды, у якім плавалі косці, і адну лыжку кінулі. Прывезлі ў Мазалава Рагачоўскага раёна. Вёска стаяла пустая, піводнай душы. Загадалі нам тут жыць. Жылі два тыдні. Аднойчы стаіць мой Колечка каля грубкі (вокны ў хаце былі на тры бакі) і ў адно акно бачыць немцаў, а ў другое — партызанаў. «Як гэта можа быць?» — пытаецца ў мяне. Пачалася перастрэлка. Немцы ўцяклі. Мы разам з людзьмі таксама падаліся ў бок Быхава, бліжэй да дому. Ішлі тыдзень з дзецьмі. Спыніліся ў вёсцы Руднецкае. Снаць было дзе, а есці зусім нічога не было. Аднойчы заскочылі ў нашу хату немцаў трыццаць — сорак і адразу ж паклаліся ўсе на падлогу. Праз паўгадзіны ўсхапіліся. А тут ужо чуваць канапада нашых. Некаторыя з немцаў пакідалі свае манаткі і зброю. Зноў прыйшлі на 15-ы раз'езд, жылі ў зямлянках. Пад ранак заўсёды набіралася вада. Хату ж змаглі пабудаваць толькі ў 1948 годзе...

Запісала *Ф. І. Кітаева.*

Іх было семнаццаць...

З успамінаў былога загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі Магілёўскага падпольнага абкома партыі І. П. Крыскаўца

Летам 1942 г. пачалося наступленне нямецка-фашысцкіх войск на Клічаўскі партызанскі раён, які цэлыя чатыры месяцы заставаўся свабодным, савецкім. Тут, у глыбокім тыле ворага, была ўстаноўлена Савецкая ўлада, дзейнічалі савецкія законы. Гэты невялікі і незалежны астравок у акружэнні варожых гарнізонаў не даваў спакою гітлераўцам. Скарыць яго, чаго б гэта ні каштавала, знішчыць яго гаспадарэў-партызан стала задачай чатырох дывізій, знятых з фронту, часцей аховы і паліцыі бліжэйшых гарнізонаў. У акружэнне трапіла 3500 партызан і мірных жыхароў. У наступленне на партызан былі кінуты авіяцыя, артылерыя, танкі, мінамёты.

Больш месяца працягваліся цяжкія блакадныя баі, якія праходзілі і на тэрыторыі сумежных раёнаў — Кіраўскага, Быхаўскага і іншых. Асноўнай нашай зброяй былі вінтоўкі і вельмі мала для такога размаху баёў кулямётаў, аўтаматаў.

Перад канцом блакады знясілены ў шматдзённых баях атрад Рыгора Паўлава траніў у акружэнне каля в. Кучын Быхаўскага раёна. У атрадзе заставалася крыху больш як 100 чалавек, канчаліся боепрыпасы, двое сутак партызаны нічога не елі. Разведка атрада далажыла, што яны акружаны ворагам колькасцю каля 800 чалавек. Намеснік камандзіра атрада лейтэнант камсамолец Якаў Фёдаравіч Каўшырка прапанаваў падабраць групу добраахвотнікаў для прыкрыцця выхаду атрада з бою. Другога выйсця не было. Смерць навісала над атрадам, і камандзір даў згоду.

Дванаццаць чалавек, усе камсамольцы, на чале з Каўшыркам падрыхтаваліся прыняць агонь на сябе. Старэйшаму, Якаву Каўшырку, споўнілася 22, малодшаму, яшчэ школьніку, Валодзю Валецду — 16 год. Група была ўжо скамплектавана, калі да лейтэнанта Каўшыркі падышоў 38-гадовы камуніст М. А. Ляйбовіч:

— Я ўжо выйшаў з камсамольскага ўзросту, але быў камсамольцам 20-х. Дазвольце і мне з вамі...

...Гітлераўцы хутка зразумелі, што партызан вельмі мала, і кінуліся на іх з крыкамі: «Рус, здавайся!» Але мужныя партызаны не думалі трапляць у палон. Доўга працягваўся гэты няроўны бой. Усё менш і менш выстралаў чулася ў адказ на варожы абстрэл. Выбывалі толькі мёрт-

Быховский районный историко-краеведческий музей

выя. Жывыя, сцякаючы крывёю, біліся да апошняга. Усе патрыёты загінулі, але, загінуўшы, яны перамаглі. Цаной свайго светлага жыцця і гераічнай смерці яны выратавалі таварышаў і паказалі ворагу, на што здольныя савецкія людзі. 85 гітлераўскіх катаў засталіся ляжаць каля в. Кучын 9 жніўня 1942 г.

Пасля блакады атрады сабраліся ва Усакінскіх лясах. Таварышы загінуўшых, як маглі, склалі шчырую песню ў памяць аб героях-камсамольцах:

...Их было тринадцать. Грозно и смело
За Родину бросились в бой.
И летнее солнце на миг потемнело,
Померкло от грозной отваги такой.
Их было тринадцать. Дела
боевые
Во славу родной и любимой
страны
Немеркнущим светом, вечно живые,
Горят на знаменах священной
войны.

А пасля стала вядома, што іх было семнаццаць — у час бою да Якава Каўшыркі далучыліся чатыры хлопцы з 255-га атрада Марусава.

...Каля вёскі Кучын у цішыні дрэў стаіць помнік на месцы бою 9 жніўня 1942 г. ў гонар семнаццаці загінуўшых герояў. Вось іх імёны: Уладзімір Валенда, Барыс Васянін, Міхаіл Вікрыцкі, Павел Жонін, Рыгор Зайцаў, Уладзімір Заяц, Васіль Зуеў, Пётр Кавалёў, Васіль Кандрацьеў, Іван Карнацкі, Якаў Каўшырка, Васіль Крайко, Васіль Краўцоў, Міхаіл Ляйбовіч, Міхаіл Палікарпаў, Хамат Салтаў, Мікалай Ушакоў...

САВЕЛІЙ ГЕРАСІМАВІЧ СІДАРЭНКА-САЛДАЦЕНКА

Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. Нарадзіўся 2 снежня 1905 г. ў в. Чырвоны Бераг Быхаўскага раёна. Член КПСС з 1928 г. У 1921—1927 гг. працаваў шахцёрам у Данбасе. З 1927 г. ў Чырвонай Арміі. Скончыў Маскоўскі педагагічны інстытут, Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1938), з таго ж года начальнік штаба дывізіі, памочнік начальніка аператыўнага аддзела штаба БВА, начальнік разведвальнага, аператыўнага аддзелаў штаба арміі. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г., савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг.

З першых дзён Айчыннай вайны на фронце. З жніўня 1941 г. ў партызанах, з лістапада 1942 г. начальнік штаба 6-й Магілёўскай брыгады, з красавіка 1943 г. начальнік штаба, з жніўня камандзір ваенна-аператыўнай групы пры Магілёўскім падпольным абкоме КП(б)Б. Адначасова з жніўня 1943 да чэрвеня 1944 г. з'яўляўся членам Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б. З 1944 г. намеснік наркома асветы БССР, у 1946—1962 гг. на гаспадарчай рабоце ў Мінску. Узнагароджаны ордэнам Кутузава, медалямі. Памёр С. Г. Сідарэнка-Салдаценка 26 кастрычніка 1980 года.



С. Г. Сідарэнка-Салдаценка.

ІВАН ПАЎЛАВІЧ СТАНКЕВІЧ

Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху ў Магілёўскай вобласці ў Айчынную вайну. Нарадзіўся 18 студзеня 1902 г. ў в. Глухская Сяліба Быхаўскага раёна. Член КПСС з 1921 г. У 1920—1922 гг. на савецкай рабоце, у атрадзе ЧОН. З 1928 г. на будаўніцтве, партыйнай рабоце, з 1941 г. першы сакратар Крычаўскага РК КП(б)Б. У Айчынную вайну пакінуты ў тыле ворага, з ліпеня 1941 г. ў партызанах: палітрук, радавы, з жніўня 1942 г. камісар атрада, адначасова ў студзені — красаві-

Помнік на брацкай магіле партызан у вёсцы Кучын.

Быховский районный историко-краеведческий музей

І. П. Федзячэнка.

І. Б. Рутман.

ку 1943 г. памочнік упаўнаважанага ЦК КП(б)Б па Магілёўскай вобласці; у жніўні 1943 г.— чэрвені 1944 г. сакратар Магілёўскага падпольнага РК КП(б)Б, адначасова кіраўнік Магілёўскай ваенна-аператыўнай групы. У маі — чэрвені 1944 г. член Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б. У 1944—1964 гг. на партыйнай, адміністрацыйна-гаспадарчай, прафсаюзнай і гаспадарчай рабоце ў Магілёве. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі. Памёр 26 студзеня 1980 г.

ІВАН ПАЎЛАВІЧ ФЕДЗЯЧЭНКА

Адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. Нарадзіўся 5 мая 1909 г. ў в. Чырвоны Бераг Быхаўскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1940 г. З 1931 г. ў Чырвонай Арміі. У Айчынную вайну на фронце, камандзір роты. У партызанах з лютага 1942: з жніўня 1942 г. начальнік штаба 810-га атрада, з чэрвеня 1943 г. в. а. начальніка штаба 11-й Быхаўскай брыгады, з ліпеня 1943 г. начальнік штаба Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы. У лістападзе 1943 — лютым 1944 г. яе камандзір. З 1944 г. на партыйнай, савецкай і гаспадарчай рабоце ў Магілёўскай і Бабруйскай абласцях. З 1950 г. на гаспадарчай рабоце ў Віцебску. З 1970 г. на пенсіі. Узнагароджаны двума ордэнамі.

ІЛЬЯ БАРЫСАВІЧ РУТМАН

Нарадзіўся 22 ліпеня 1906 г. ў Рагачове ў беднай рабочай сям'і. З 1926 г. ў Днепрапятроўску, рабочы лесапільнага завода. Потым курсант Кіеўскай пяхотнай школы, якую скончыў у 1931 г. Перад вайной служыў у штабе Заходняй ваеннай акругі. Выконваючы адказнае даручэнне, даставіў у першыя дні вайны над Гродна ў штаб 3-й арміі загад камандавання акругі. Зваротны шлях праз фашысцкія заслоны на дарогах быў цяжкі і небяспечны. Прабраўшыся ў Мінск, І. Б. Рутман праз некаторы час звязаўся з падпольшчыкамі, стаў у рады народных мсціўцаў. З 26 лютага 1942 г. ён у 208-м атрадзе імя І. В. Сталіна на пасадах радавога і памочніка начальніка штаба атрада. Потым начальнік штаба 152-га атрада, пазней — палка. З лістапада 1943 г. па люты 1944 г. начальнік штаба Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы.

Пасля злучэння партызанскіх фарміраванняў з часцямі Чырвонай Арміі І. Б. Рутмана накіравалі на вучобу ў Ваенную акадэмію імя М. В. Фрунзе. Скончыўшы паскораны курс, Рутман працягваў ваяваць на 2-м Беларускім фронце. Пасля вайны працаваў у народнай гаспадарцы. Узнагароджаны трыма ордэнамі Чырвонай Зоркі. Жыве ў Мінску.

Партызанскія важакі

Камандзіры аддзяленняў, узводаў, рот, батальёнаў былі заўсёды побач з партызанамі ў самыя цяжкія, крытычныя і радасныя хвіліны партызанскага баявога жыцця. Сваімі паводзінамі ў баі і ў час адпачынку, адносінамі да радавых партызан яны стваралі тую атмасферу, ад якой залежыў у рэшце рэшт зыход любой аперацыі.

Гэта яны, камісары, палітрукі, сакратары партыйных і камсамольскіх арганізацый і груп, забяспечвалі стойкасць духу лясных байцоў, фарміравалі іх маральны і палітычны ўзровень, кавалі веру ў непазбежнасць перамогі. Аб некаторых з іх наш расказ.

Уладзімір Сяргеевіч Дзянісаў нарадзіўся ў 1920 г. ў в. Азясь Макшанскага раёна Пензенскай вобласці. У маі 1941 г. скончыў Бабруйскае пяхотнае вучылішча і ў званні лейтэнанта быў накіраваны камандзірам узвода ў 161-ю стралковую дывізію. З чэрвеня 1941 г. на фронце. Удзельнічаў у баях пад Мінскам, на рацэ Бярэзіна, пад Бабруйскам.

Каля Магілёва дывізія трапіла ў акружэнне. У. С. Дзянісаў разам з баявым таварышам В. П. Юханавым апынуўся ў Быхаўскім раёне. Тут яны наладзілі сувязь з групай М. П. Куракіна і ў чэрвені 1942 г. далучыліся да яе. Дзянісаў спачатку камандаваў узводам, з мая 1943 г.— 1-й ротай у 425-м партызанскім атрадзе (яго сябар В. П. Юханаў з чэрвеня 1943 г. быў начальнікам штаба гэтага атрада).

У ліпені 1943 г. з партызан, вылучаных 425-м атрадам, арганізоўваецца 435-ы партызанскі атрад. Камандзірам атрада зацвярджаецца Дзянісаў. Атрад, папоўнены людзьмі і зброяй, удала праводзіў баявыя аперацыі на чыгункі, шашэйных і грунтавых дарогах. Партызаны разбурылі 16 мастоў, 1,2 кіламетра дарожнага профілю, зрабілі завалы на семнаццаці кіламетрах, падбілі 6 аўтамашын. У жніўні 1943 г. партызаны разам

Быховский районный историко-краеведческий музей

з усімі атрадамі Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы ўдзельнічалі ў аперацыі «Рэйкавая вайна» на чыгуначным участку Быхаў — Рагачоў, у разгроме варожых гарнізонаў у вёсках Тайманава, Камарычы, Балонаў Сялец, на станцыі Тошчыца. Партызаны атрада ўдзельнічалі ў выратаванні мірнага насельніцтва ад акупантаў, вялікая колькасць якога была выведзена за лінію фронту.

Пасля вайны Дзянісаў паехаў у родныя мясціны, выбраў для месца жыхарства Пензу. А на Быхаўскай зямлі засталіся яго баявыя сябры-пляечнікі. Да гэтага часу помняць свайго камандзіра і пры размове-ўспаміне абавязкова заўважаць: «Смелы і душэўны камандзір быў. Акупантаў біў бязлітасна, людзей бярог і ў крыўду не даваў...».

Рыгор Сцяпанавіч Казлоў нарадзіўся ў 1918 г. ў в. Стахоўшчына Быхаўскага раёна ў сям'і селяніна. Яшчэ ў школе марыў стаць настаўнікам. Да мэты ішоў настойліва. У 1935 г. ў пачатковай школе Смалявіцкага раёна адбыўся першы ўрок маладога педагога. Пасля стаў настаўнічаць у сваёй роднай Стахоўшчынскай школе. Перад вайной загадваў Радзькаўскай пачатковай школай.

Пасля акупацыі раёна малады настаўнік без ваганняў стаў на шлях барацьбы з ворагам. Спачатку ён радавы партызан, потым намочнік камісара па камсамолу 425-га партызанскага палка. Клапатліва і ўмела расціў рады членаў ВЛКСМ палка, асабістым прыкладам выхоўваў юных мсціўцаў. У кастрычніку 1943 г. Быхаўскі падпольны райком партыі прыняў Р. С. Казлова кандыдатам у члены ВКП(б).

Калі партызаны Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы злучыліся з часцямі Чырвонай Арміі, райком партыі рэкамендаваў Рыгора Сцяпанавіча загадчыкам раённага аддзела народнай асветы на вызваленай частцы Быхаўскага раёна. І былі намочнік камісара энергічна ўзяўся за справу, каб дзеці зноў маглі вучыцца ў школе. У неймаверна складаных умовах зроблена было амаль немагчымае, і ўжо ў красавіку 1944 г. заняткі пачаліся ў васьмі школах. А ў ліпені 1944 г. ўся вызваленая Быхаўшчына пачала мірную працу.

Шмат давялося Р. С. Казлову працаваць у пасляваенны час на партыйнай і савецкай рабоце ў Быхаўскім і Магілёўскім раёнах. І заўсёды камуніст апраўдваў давер, спраўляўся з ускладзенымі на яго задачамі.

Міхаіл Георгіевіч Кісялёў меў ужо багаты вопыт партызанскай барацьбы, калі ў пачатку чэрвеня 1943 г. яму даручылі стварыць з ініцыятыўнай групы партызан самастойны атрад. У сакавіку 1942 г. лейтэнант Кісялёў быў залічаны партызанам, неўзабаве стаў камандзірам узвода 277-га партызанскага атрада. З чэрвеня 1942 г. камандаваў ротай, быў начальнікам штаба 278-га атрада. А ў красавіку 1943 г. яго назначылі начальнікам штаба 11-й Быхаўскай партызанскай брыгады.

Улічваючы арганізатарскія здольнасці Міхаіла

У. С. Дзянісаў.

М. Г. Кісялёў.

Георгіевіча, далейшая яго дзейнасць звязана з падрыхтоўкай і расшырэннем радоў партызан. Вылучаная група партызан на чале з Кісялёвым разгарнула шырокую агітацыю сярод насельніцтва. Да партызан пайшла добраахвотна моладзь (за месяц група выросла да 56 чалавек). Партызаны ўжо мелі 5 ручных кулямётаў, 45 вінтовак, шмат гранат і патронаў. 4 ліпеня 1943 г. падпольны райком партыі зацвердзіў новы партызанскі атрад і прысвоіў яму нумар 225-ы.

Умела камандаваў атрадам яго камандзір. Партызаны паспяхова вялі адкрытыя і засадныя баі, арганізоўвалі дыверсіі на варожых камунікацыях, удзельнічалі ў разгроме варожых гарнізонаў у вёсках Тайманава, Касічы, Балонаў Сялец, Ямнае, у «рэйкавай вайне» на чыгуначным участку Быхаў — Тошчыца. Ратавалі насельніцтва ад прымусовага вывазу ў Германію.

Камандзір атрада М. Г. Кісялёў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «Партызану Айчыннай вайны» I ступені.

Васіль Тарасавіч Бацокін нарадзіўся ў 1917 г. ў станіцы Стара-Міхайлаўская Курганінскага раёна Краснадарскага краю. У Чырвонай Арміі з 1938 г., прымаў удзел у вызваленні Заходняй Беларусі. З першых дзён вайны на фронце. У баявой характарыстыцы Бацокіна ёсць такія радкі: «...З ліпеня 1942 па ліпень 1944 года быў байцом асобнага рэйдавага партызанскага злучэння «Трынаццаць», вырас ад кулямётчыка да камандзіра атрада. На асабістым рахунку Бацокіна два ўзарваныя эшалоны, пятнаццаць спаленых аўтамашын і восемдзесят забітых варожых салдат і афіцэраў.

Пад яго камандаваннем аддзяленне, узвод, рота, а потым атрад прымалі ўдзел у разгроме дваццаці гарнізонаў, у легендарнай Боўкінскай абароне, спалілі 97 грузавікоў, узарвалі чатыры эшалоны, узнялі ў паветра сем кіламетраў чыгуначных рэек, у баях забілі і ранілі звыш шасцісот гітлераўцаў.

За гераізм і мужнасць Бацокін В. Т. прад-

Быховский районный историко-краеведческий музей

В. Т. Бацкін.

М. М. Балыкін.

Ц. І. Сяброўскі.

Ф. І. Лукашоў.

стаўлены камандаваннем да вышэйшай урадавай узнагароды — ордэна Леніна».

Міхаіл Міхайлавіч Балыкін нарадзіўся ў 1913 г. ў в. Кавалі Бабруйскага раёна. З 1934 г. ў Чырвонай Арміі. Пасля дэмабілізацыі працаваў у гарадскім савеце асаавіяхіма. У 1939 г. палітрук Балыкін удзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі. Потым быў вылучаны на партыйную работу.

У пачатку вайны трапіў у палон. Двойчы ўцякаў. У жніўні 1941 г. прыйшоў дамоў у в. Цялуша, дзе жылі бацькі з сястрой. Звязаўся з былымі ваеннапалоннымі, патрыятычна настроенымі людзьмі, і ў хуткім часе ў вёсцы арганізавалася баявая група (у кастрычніку 1941 г. яна налічвала 20 чалавек, на ўзбраенні меліся 2 кулямёты, 15 вінтовак, звыш пяці тысяч патронаў, некалькі дзесяткаў бутэлек з гаручай вадкасцю).

У пачатку лета 1942 г. быў распрацаваны план уходу ўсёй групы ў партызаны. Перад гэтым меркавалі спаліць склады і гаражы акупантаў у былой Цялушскай МТС і на станцыі Цялуша. На першы аб'ект рыхтаваліся паслаць групу на чале з Мікалаем Левашовым, на станцыю — групу Міхаіла Балыкіна. План аперацыі быў усебакова прадуманы, аднак ажыццявіць яго не ўдалося — па даносу план быў раскрыты. Схапілі некалькі чалавек з групы, сярод іх і М. Балыкіна з бацькамі. Позняй вечарам патрыётаў павялі расстрэльваць на станцыю. У самы апошні момант Міхаіл кінуўся ў прыдарожны хмызняк. Гэта яго і выратавала. Астатніх былі расстраляны.

У в. Аляксандраўка Буда-Кашалёўскага раёна, дзе жыў родныя Міхаіла, ён арганізаваў патрыятычную групу з вясковай моладзі, якая ўлілася ў 810-ы партызанскі атрад. У атрадзе Міхаіл Міхайлавіч быў палітруком роты, памочнікам камісара, сакратаром партбюро атрада, а калі атрад быў ператвораны ў 810-ы полк Быхаўскай ВАГ — парторгам палка.

17 лістапада 1943 г. камандзір Быхаўскай ВАГ Федзячэнка пісаў камандзіру 810-га палка Максімаву-Лебедзеву: «...Перадайце парторгу палка Балыкіну, што ён прадстаўлены да ўрадавай узнагароды — ордэна Чырвонага Сцяга і да звання «старшы лейтэнант».

Адам Андрэевіч Бірукоў у лістападзе 1941 г. па заданню Рагачоўскага падпольнага райкома партыі пасланы ў Быхаўскі і Клічаўскі раёны для арганізацыі і стварэння партызанскіх атрадаў. Пачаў з арганізацыі баявых груп у вёсках Алень і Цвёрдава. У в. Алень знаёміцца з акружэнцам малодшым лейтэнантам М. К. Марусавым. К канцу лістапада тут была створана патрыятычная група з 15 чалавек. У яе штаб увайшлі М. К. Марусаў, А. Е. Галашчокаў і А. А. Бірукоў (пазней Н. А. Канстанцінаў, Д. А. Залатароў). К вясне 1942 г. да актыўнай барацьбы было падрыхтавана больш сарака чалавек, сабрана больш за 30 вінтовак, адзін мінамёт, два ручныя і адзін станковы кулямёты.

28 красавіка 1942 г. група арганізацыйна афармілася ў 255-ы партызанскі атрад. Камандзірам стаў Марусаў, камісарам — Бірукоў. А праз дзень партызаны атрада разграмілі Кучынскую валасную ўправу, крыху пазней — Хонаўскую воласць Магілёўскага і Гарадзецкую Быхаўскага раёнаў. 14 ліпеня 255-ы атрад разам з атрадам Куракіна разграміў карны атрад Барс Барчыка ў в. Кучына.

У канцы ліпеня атрад перадыслацыраваўся ў Рагачоўскі раён. Летам 1942 г. А. А. Бірукоў быў зацверджаны першым сакратаром Пінскага абкома камсамола.

Цярэнцій Іванавіч Сяброўскі, сын франтавіка, уключыўся ў барацьбу з ворагам восенню 1941 г., калі разам з сябрамі пачаў збіраць зброю, боепрыпасы на месцах былых баёў. А вясной 1942 г. разам са сваімі сябрамі-аднавяскоўцамі Цярэнцій пайшоў у партызанскі атрад, камандзірам якога быў Я. А. Курначэнка. Камсамольцу Сяброўскаму даверылі кулямёт. Малады баец прымаў удзел у падрыве мастоў цераз рэчкі Баброўку і Ухлясць, у мініраванні асобных участкаў на шашы Магілёў — Гомель. Вясной 1943 г. Сяброўскага назна-

Быховский районный историко-краеведческий музей

чылі камандзірам аддзялення, потым памочнікам камандзіра ўзвода. Наступнае сур'ёзнае выпрабаванне — гераічныя дні боўскай блакады ў кастрычніку 1943 г.

Потым быў фронт. Удзельнічаў у вызваленні гарадоў Чавусы, Магілёў. З дывізіяй дайшоў да Гродна і працягваў службу на граніцы. Дэмабілізаваўся Сяброўскі ў 1952 г., працаваў на савецкай і партыйнай рабоце, а пасля сканчэння Мінскай юрыдычнай школы — юрыстам.

Дзмітрый Іларыёнавіч Бычкоў нарадзіўся ў 1907 г. ў в. Дабраціна Рагачоўскага раёна. Працаваў лесарубам, служыў у Чырвонай Арміі. З 1932 г. на гаспадарчай і савецкай рабоце. У Вялікую Айчынную вайну сакратар партарганізацыі 537-га партызанскага атрада, з верасня 1943 г. — камісар 540-га партызанскага атрада. Пасля вайны на савецкай і гаспадарчай рабоце ў Горацкім, Касцюковіцкім, Смаргонскім, Быхаўскім раёнах. Памёр 13 чэрвеня 1975 г., пахаваны на могілках у Быхаве.

Фёдар Іванавіч Луканоў нарадзіўся ў 1907 г. ў в. Гарадзец Быхаўскага раёна. Працаваў калгаснікам, з 1935 г. намеснік, старшыня выканкома Гарадзецкага сельскага Савета. У 1940 г. ўступіў у рады Камуністычнай партыі. У першыя дні вайны добраахвотнікам пайшоў на фронт. У кастрычніку 1941 трапіў у палон, з якога ўцёк у снежні 1941, вярнуўся ў родную вёску. Са студзеня 1942 г. Фёдар Іванавіч стаў членам групы патрыётаў на чале з Мікалаем Куракіным, пазней яго выбралі сакратаром партыйнай групы. З сакавіка 1943 г.— член Быхаўскага падпольнага райкома партыі.

Пасля вызвалення працаваў старшынёй Дамітраўскага сельскага Савета Клічаўскага раёна. У 1947 г. пераехаў у Быхаўскі раён, працаваў на партыйнай і савецкай рабоце. З 1966 г. на пенсіі. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, многімі медалямі.

Карп Лаўрэнцьевіч Адасёў нарадзіўся ў 1896 г. ў в. Залатва. Пасля акупацыі раёна ў ліпені 1941 г. стварыў у в. Залатва партыйную групу, якая потым аб'ядналася з групай Куракіна. Пасля афармлення 425-га атрада К. Л. Адасёва выбралі сакратаром партыйнай арганізацыі атрада, да жніўня 1942 г. ён быў камісарам атрада. 7 сакавіка 1943 г. Адасёў зацверджаны сакратаром Быхаўскага падпольнага РК КП(б)Б і ў тым жа месяцы пераведзены ў Магілёўскі падпольны райком партыі.

За баявыя заслугі ўзнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і Чырвонай Зоркі, многімі медалямі. К. Л. Адасёў памёр у 1972 г.

Ганна Ігнатаўна Вараб'ёва (Каваленка) нарадзілася ў 1917 г. ў в. Чырвоны Бераг Быхаўскага раёна. Перад вайной працавала ў Тошчыцкай няпоўнай сярэдняй школе. У 1940 г. стала кандыдатам у члены партыі. У ліпені 1941 г. малады камуніст атрымала заданне рыхтаваць камсамольцаў роднай вёскі да барацьбы з акупантамі. Пазней Аня стала сувязной партызанскай групы Труснова, а 23 жніўня 1942 г. — байцом 810-га партызанскага атрада. У красавіку 1943 г. Быхаўскі падпольны райком партыі прыняў партызанку ў члены ВКП(б). Летам 1943 г. Магілёўскі падпольны абком камсамола зацвердзіў Вараб'ёву памочнікам камісара па камсамолу 820-га атрада. Ганна Ігнатаўна шмат зрабіла па згуртаванню моладзі на барацьбу з акупантамі, праявіла асабістую адвагу ў баях пры разгроме варожых гарнізонаў у Новым Быхаве, Шапчыцах, Рагінях, Чырвоным Аратым, Фёдараўцы, Ходасавічах, у «рэйкавай вайне». За баявыя заслугі ўзнагароджана медалём «Партызану Айчыннай вайны» I ступені. Памерла Г. І. Вараб'ёва ў 1981 г.

К. Л. Адасёў.

Г. І. Вараб'ёва (Каваленка).

Якаў Міхайлавіч Рыжкевіч у красавіку 1943 г. быў назначаны начальнікам асобага аддзела 11-й Быхаўскай брыгады. Ён, былы выпускнік школы аператыўных работнікаў НКУС, адразу ж разгарнуў дзейсную і мэтанакіраваную работу сярод насельніцтва. Неўзабаве ва ўсіх населеных пунктах раёна партызаны мелі сваіх людзей. Якаў Міхайлавіч быў выключна працаздольны, валодаў майстэрствам хутка разблытваць складаныя справы. Патрабавальны да сябе і да падначаленых, ён любіў парадак і дысцыпліну, вельмі сур'ёзна ставіўся да маральных якасцей сваіх таварышаў па рабоце. «У чэкіста павінна быць халодная галава, гарачае сэрца і чыстыя рукі»,— часта любіў паўтараць начальнік асобага аддзела словы Ф. Э. Дзяржынскага. У верасні 1943 г. Быхаўскі падпольны райком партыі зацвердзіў Я. М. Рыжкевіча начальнікам Быхаўскага раённага аддзела ўнутраных спраў.

Іван Іосіфавіч Вараб'ёў нарадзіўся 19 студзеня 1918 г. на хутары Камарова Дубаўскага раёна Растоўскай вобласці ў сялянскай сям'і. Член КПСС з 1943 г. У 1937—1939 гг. пасля сканчэння Новачаркаскага настаўніцкага інстытута працаваў настаўнікам. З 1939 г. ў Чырвонай Ар-

Быховский районный историко-краеведческий музей

Я. М. Рыжкевіч.

І. І. Вараб'ёў.

В. М. Куракін.

М. Ф. Філімонаў.

міі, вучыўся ў ваенна-пяхотным вучылішчы. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны на фронце. У баях пад Чавусамі разам з байцамі вырваўся з акружэння. З лета 1942 г. ў радах народных мсціўцаў: радавы, камандзір разведкі, камандзір узвода роты, намеснік камандзіра, з красавіка 1943 г. начальнік штаба 810-га партызанскага атрада. У ліпені 1943 — лютым 1944 гг. камандзір 820-га асобнага партызанскага атрада Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы. Пасля злучэння з часцямі Чырвонай Арміі І. І. Вараб'ёў на камсамольскай і гаспадарчай рабоце ў Слаўгарадскім і Быхаўскім раёнах. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Памёр у 1987 г.

Фёдар Рыгоравіч Сцяпкоў нарадзіўся ў 1919 г. ў в. Клятное Быхаўскага раёна. У 1937 г. паступіў у Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію, у гэтым жа годзе прызваны ў Чырвоную Армію. У 1941 г. ўдзельнічаў у абароне Кіева. З мая 1942 г. па красавік 1944 г. камандзір узвода 425-га партызанскага палка Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы. Пасля злучэння з часцямі Чырвонай Арміі ваяваў на 1-м Прыбалтыйскім фронце. У пасляваенны час скончыў сельгасакадэмію, працаваў землеўпарадчыкам. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, ордэнам Славы III ступені, многімі баявымі медалямі.

Віктар Мікалаевіч Куракін нарадзіўся 10 красавіка 1924 г. ў г. Жыткавічы Гомельскай вобласці. У тым жа годзе сям'я пераехала на радзіму ў Быхаўскі раён, бацькі ўступілі ў камуну імя Карла Лібкнехта. Член КПСС з 1945 г. Перад вайной скончыў Макранскую сярэднюю школу. З чэрвеня 1942 г. партызан 425-га партызанскага атрада 11-й Быхаўскай брыгады. З верасня 1942 г. па люты 1943 г. ўзначальваў Быхаўскі падпольны РК ЛКСМБ. Быў паранены ў баі. У маі 1944 г. вылецеў у савецкі тыл на лячэнне. Пасля вызвалення раёна з ліпеня па кастрычнік 1944 г. працаваў другім сакратаром Быхаўскага райкома ЛКСМБ. З 1946 г. пасля сканчэння Рэспубліканскай партыйнай школы пры ЦК КПБ працаваў першым сакратаром Ганцавіцкага РК ЛКСМБ. У 1948—1950 гг. слухач Мінскай юрыдычнай школы, потым працаваў у органах юстыцыі. З ліпеня 1959 г. на партыйнай рабоце. З сакавіка 1973 г. намеснік старшыні Магілёўскага абласнога суда. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, двума ордэнамі «Знак Пашаны», медалямі.

У 1931 г. дваццацітрохгадовы **Марк Філімонавіч Філімонаў**, былы батрак, камунар і актыўны селькор, стаў камуністам. Па накіраванні раённай газеты ён скончыў у 1933 г. Магілёўскі газетны тэхнікум. Потым была служба ў Чырвонай Арміі. Перад вайной Марк Філімонаў настаўнічаў, быў дырэктарам у школах Горацкага раёна.

З пачатку вайны ён на фронце, у жніўні 1941 г. трапіў у палон. Рашучы і знаходлівы чырвонаармеец з групай байцоў вырваўся з фашысцкага лагера і пасля некалькіх няўдалых спроб перайсці лінію фронту прыйшоў у в. Лазаравічы, куды да родзічаў перабралася яго жонка. З сакавіка 1942 г. Філімонаў — партызан 810-га партызанскага атрада, палітрук роты, з ліпеня 1943 г. сакратар партыйнай арганізацыі толькі што створанага 820-га атрада.

Пасля злучэння з часцямі Чырвонай Арміі ў лютым 1944 г. Філімонаў быў зацверджаны адказным рэдактарам быхаўскай раённай газеты «Сацыялістычная перамога», якая выдавалася на вызваленай левабярэжнай частцы раёна. За адвагу ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі М. Ф. Філімонаў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр М. Ф. Філімонаў у 1975 г.

Быхоўский районный историко-краеведческий музей

Ілья Памятнёў

Позняй лістападаўскім вечарам 1941 г. ў хату Фёдара Рыгоравіча Багданава зайшоў змораны, у нашарпаным паліто малады смуглявы хлопец. Шмат такіх знясіленых, галодных, часам цяжка параненых праходзіла праз іх вёску Рыжкаўку летам і восенню 1941. Таму адразу і не пазнаў Фёдар Рыгоравіч свайго пляменніка.

— Вырваўся з чортавых зубоў,— сказаў хлопец.— А прыйшоў да вас, больш ісці няма куды...

Багданавы прынялі свайго пляменніка Ілью Памятнёва з душэўнай цеплынёй, зрабілі ўсё, каб хутчэй вярнуць хлопцу сілы.

Аб сабе Ілья расказваў мала, тым больш, што ўсё перажытае было ў мінулым. Хваляваў дзень сённяшні, будучае. Не пакідала думка прабрацца ў Магілёў, звязацца з падпольшчыкамі (у тым, што яны ёсць, Памятнёў не сумняваўся). Аднак прабрацца ні ў Быхаў, ні ў Магілёў без адпаведных дакументаў было немагчыма. І Памятнёў знаходзіць выйсце. Ён дамаўляецца з папом Асавецкай царквы аб аднаўленні абразоў (маляваў хлопец няблага, і пра гэта многія ведалі ў вёсцы). Такім чынам быў атрыманы доўгачаканы пропуск на паездкі ў Магілёў, Быхаў, Чавусы за матэрыяламі для малявання. Адпойчы разам з фарбамі, гіпсам, палатном у зробленым тайніку фурманкі Ілья прывёз савецкія лістоўкі, бланкі і пячатку для афармлення нямецкіх дакументаў, медыкаменты.

Для «новай улады» ён заставаўся «багамазам» (дарэчы, гэта стала падпольнай мянушкай патрыёта), добрасумленна выконваў умовы кантракту. Для ваеннаслужачых, якія на зіму засталіся ў навакольных вёсках, мясцовых патрыётаў стаў важаком, неафіцыйным камандзірам. Пачалі збіраць зброю. На месцы баёў Памятнёў і Косця Сіўцоў знайшлі кулямёт, сабралі дванаць вінтовак, 50 мін і дзве скрынкі капсуляў. Усё было падзейна схавана ў лясным складзе.

У сярэдзіне красавіка 1942 г. ў доме Багданавых адбылася сустрэча Ілі Памятнёва з Падольцавым і Тамілам, накіпутымі для арганізацыі партыйнага падполля. Праз некалькі дзён пасля гэтага Памятнёў з 22 першымі таварышамі пайшоў у лес, узначаліў партызанскую групу. Камісарам групы стаў даваенны інструктар Тульскага абкома партыі Аляксей Барысаў, цудоўны чалавек і мужны воін, удзельнік абароны Магілёва. Група расла, зброі ж на ўсіх не хапала. На ініцыятыве камандзіра рашылі паспрабаваць захапіць яе ў воласці. Днём, калі ў памяшканні знаходзіліся бургамістр, ураднік і паліцай, увараліся Памятнёў і Сіўцоў. «Зброю на стол!» — загадалі партызаны. Так з'явіліся яшчэ тры пісталеты і вінтоўкі.

Праз месяц група значна выросла з жыхароў і моладзі вёскі Рыжкаўка. А было гэта так. Партызаны прыйшлі ў вёску і загадалі старасту склікаць сход. З палымянай прамовай на ёй выступіў Памятнёў. На яго заклік уступаць у рады народных мсціўцаў тут жа адгукнуліся камсамольцы і патрыёты вёскі. Многія, адкапаўшы і схаваўшы зброю, разам з партызанамі ў гэты дзень пайшлі ў вёску Прыбярэжжа, дзе быў праведзены такі самы сход. Група папоўнілася новымі байцамі і рушыла ў вёску Грузінаўка. Тут на складзе валасной управы партызаны захапілі 8 паўаўтаматычных вінтовак, некалькі ручных кулямётаў.

Добра ўзброеная група разгарнула смелыя баявыя аперацыі. У чэрвені 1942 г. група Памятнёва (Багамаза) улілася ў партызанскую брыгаду Г. І. Сазонава. У яе складзе партызаны правялі шэраг бліскучых аперацый — разграмілі гарнізоны ў вёсках Вейна пад Магілёвам, Кузькавічы, Ніканавічы, Чырвоны Асавец, удзельнічалі ў засадах на шашэйных дарогах і ў адкрытых баях. Вёў народных мсціўцаў іх бясстрашны важак Ілья Пятровіч Памятнёў.

У ліпені 1942 г. палымянага патрыёта, любімца партызан не стала. Вяртаючыся з задання, якое выконваў у Магілёве, у лесе каля вёскі Дабужа Ілья Пятровіч нарваўся на засаду...

Г. Аляксандраў, Г. Барысаў.

І. П. Памятнёў.

А. Х. Бархозаў.

Аскер Бархозаў

Камандзір дэсантнай роты танкавай дывізіі Аскер Бархозаў першы дзень вайны сустрэў над Пружанамі. У жніўні ў час адступлення прыняў стралковы батальён. Неўзабаве ў адным з баёў яго параніла разрыўной куляй у левую нагу. Бархозаў загадаў перацінуць параненую нагу абрыўкам

Быховский районный историко-краеведческий музей

плашч-палаткі і лежачы працягваў камандаваць боем. Але побач разарвалася міна, і асколкі трапілі ў параненую нагу.

Уначы салдаты данеслі камандзіра да бліжэйшай вёскі і пастукалі ў першае акно. На ганак выйшла старая жанчына.

— Прыміце, маці, старшага лейтэнанта. Вернемся — аддзякуем,— папрасілі салдаты.

Жанчына паглядзела на беспрытомнага камандзіра і сказала:

— Пакідайце. А дзякаваць няма за што. Вяртайцеся хутчэй. Тым і аддзякуеце.

Выхадзіла беларуская жанчына камандзіра, які родам быў з Каўказа. А ў снежні 1942 г. Аскер стаў памочнікам камандзіра ўзвода 810-га партызанскага атрада. Першай аперацыяй Бархозава быў захоп нямецкага маёра, камандзіра атрада, што размяшчаўся ў вёсцы. Разам з таварышам Бархозаў узяў яго ў хаце ўдавы-маладзіцы, да якой часта наведваўся маёр, так ціха звязаў і выкінуў праз акно, што вартавы, які ахоўваў свайго начальніка, нічога не заўважыў.

...На золку рота Бархозава (камандзірам роты стаў вясной 1943 г.) залягла ў засаду на бальшаку. А праз гадзіну паказалася калона аўтамашын. Падпусціўшы яе, партызаны адкрылі агонь. Загарэлася некалькі грузавікоў. Гітлераўцы, развярнуўшы машыны, уступілі ў бой. Чарга з варожага кулямёта прашыла нагу Аскера ад бядра да калені. Партызанка Аляксандра Сільчанка выцягнула параненага камандзіра з-пад куль і прывезла ў вёску Дзедава да сям'і Дзергачовых. Гаспадыня, яе дачка Ліда і сын Мікалай схавалі Аскера ў сене. А неўзабаве ў вёску ўварваліся фашысты. Дзергачовы паспелі папярэдзіць камандзіра аб смяротнай небяспецы.

— Са мною пісталет, жывым не дамся,— адказаў Бархозаў.— У выпадку чаго ідзіце ў атрад, вас прымуць...

Ліда пайшла на хітрасць. У кошык палажыла сена, а зверху яйкі. Прыманку паставіла каля дзвярэй у хляве, дзе ляжаў Аскер. Чацвёра карнікаў уварваліся ў двор. Двое з іх, наставіўшы аўтаматы, ірванулі дзверы хлява.

— Хто ёсць? Выходзь!

Аскер ляжаў нерухома, гатовы страляць. Зірнуўшы пад ногі, гітлераўец заўважыў кошык з яйкамі. Выцягнуўшы кошык, гітлераўцы расхапалі яйкі і пайшлі ў наступны двор.

Далячыўшыся ў партызанскім шпіталі, Аскер Хабатавіч, ужо камандзір 830-га партызанскага атрада, зноў разам са сваімі байцамі працягваў біць акупантаў. «Мы — народнае войска,— любіў гаварыць камандзір Бархозаў,— у нас дзве галоўнейшыя задачы: нішчыць гітлераўцаў і ахоўваць свой народ».

24 лютага 1944 г. Аскер атрымаў баявы загад падпольнага райкома партыі: прабівацца разам з 425-м атрадам на злучэнне з часцямі Чырвонай Арміі ў раёне вёскі Дзедава і вывесці з сабой больш як дзесяць тысяч мірных жыхароў, што знаходзіліся ў лесе. Загад неабходна было выканаць да дзевятнаццаці гадзін 24 лютага...

І партызаны не спазніліся ні на гадзіну ў выкананні таго загаду.

Для большасці лясных байцоў вайна была яшчэ не скончана. Пасля кароткага адпачынку яны папоўнілі часці Чырвонай Арміі. Аднак Аскеру па медкамісіі сказалі:

— Пасля вашых раненняў няма чаго і думаць аб фронце. І лёгкімі ў вас не ў парадку. Трэба лячыцца.

Аскера разам з жонкай, юнай партызанкай Машай Макаёнак, паслалі ў Кіславодск у санаторый. Перад ад'ездам партызанам былі ўручаны баявыя ўзнагароды. А праз месяц Бархозаў вярнуўся ў Беларусь, якая стала роднай за гады вайны. Адмовіўся ад далейшага лячэння і настойваў на неадкладным уладкаванні яго на работу. Аскеру Хабатавічу прапанавалі працу ў Магілёўскім гарсавеце. Неўзабаве ў дом прыйшла радасць — нарадзіўся сын. А ўслед за ёй хутка напаткала вялікае гора — трагічна загінула жонка Марыя... Аскер Бархозаў, чалавек моцны духам, прадаўжаў працаваць. Аднак таварышы заўважылі, што кашаль у яго ўзмацніўся. Зноў медкамісія. Вывад быў кароткі і катэгарычны: патрэбна сонца, горнае паветра. Аскер паехаў у Кіргізію да родзічаў. Год мужна змагаўся з бязлітаснай хваробай, але смерць была побач. 20 снежня 1945 г. дваццацідзевяцігадовага бясстрашнага партызана не стала...

В. Нежынскі.

Радавыя партызанскай вайны

Сувязныя, разведчыкі, падрыўнікі, аброшнікі, медыцынскія работнікі, кухары, пекары, шаўцы... Гэта на іх плечы, часам зусім юныя, лёг увесь цяжар нялёгкіх партызанскіх будняў на ўмовах лясного жыцця, частых абстрэлаў, карных аперацый. Дзеля дня вызвалення самаахвярна ішлі яны на верную смерць, стойка і мужна пераносілі страту баявых сяброў, родных. Як непазбежнае пераносілі нялёгкую работу, якой была партызанская вайна.

Аляксей Іванавіч Салаўёў з в. Дабужа скончыў сярэднюю школу ў 1941... А наступнай вясной быў ужо кулямётчыкам у атрадзе Я. А. Курпачэнкі. Камандзір любіў шчырага, добразычлівага, трапнага і смелага ў баях кулямётчыка. «Ну і вока ў цябе, Алёша! Фашыстаў стрыжэш прама пад «нулёўку»,— смяяўся Курпачэнка.

Напярэдадні 25-й гадавіны Вялікага Кастрычніка, узначаліўшы дыверсійную групу, Я. А. Курпачэнка павёў партызан на чыгунку. У першую ж ноч група пусціла пад адхон эшалон ворага ў раёне блок-паста 219-га кіламетра на перагоне

Бобруйский районный историко-краеведческий музей

Быхаў — Рагачоў. Вяртаючыся з задання, падрыўнікі спыніліся ў лясной вёсцы Рагі Клічаўскага раёна. На світанні на вуліцы з'явіліся карнікі. Завязаўся бой. У гэтым баі на вачах Алёшы смерцю героя загінуў камандзір Курпачэнка, падарваўшы гранатай гітлераўцаў, якія населі на яго. Алёша даў тады клятву адпомсціць за любімага камандзіра. І клятву сваю камсамолец стрымаў — з беларускіх лясоў ён дайшоў да Берліна. Кулямёт воіна Аляксея Салаўёва біў без промаху. Грудзі маладога байца ўпрыгожылі ордэн Айчыннай вайны II ступені, медалі «За адвагу», «Партызану Айчыннай вайны», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.».

Маладая настаўніца **Кацярына Іванаўна Валчкова** ў першыя дні вайны вярнулася з Капаткевіцкага раёна, дзе працавала, на родную Быхаўшчыну — у в. Падгор'е. Стала партызанскай сувязной. Не аднойчы хадзіла на яўкі ў Магілёў, трапляла ў небяспечныя становішчы, але знаходзіла заўсёды выйсце з іх. Многім патрыятычным і разведвальным групам дапамагла смелая дзяўчына. Адважная сувязная ўзнагароджана ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» II ступені.

Цяжкі след пакінула вайна ў памяці К. І. Валчковай: у барацьбе з акупантамі загінулі тры яе браты — Восіп, Міхаіл, Мікалай. Сама Кацярына Іванаўна пайшла працаваць у дзіцячы дом, дзе стала клапатлівай і пяшчотнай маці для сірот вайны.

«...Самым лепшым падрыўніком у нашым партызанскім палку з'яўляецца **Іван Маёраў**. Ён асабіста падарваў 15 варожых эшалонаў, нішчыў і выхаваў цэлую плеяду бясстрашных партызан-падрыўнікоў. Вось яны: Зыкалеў, Ісаеў, Елкін, Кожух, Акуленка...»,— пісала газета «Смерть врагам» партызанскага палка «Трынаццаць».

У баявой характарыстыцы партызана злучэння «Трынаццаць» **Мікалая Дзмітрыевіча Мітчанкава** запісана: «13-гадовым падлеткам уступіў у барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў. У партызанах з 1 мая 1942 г. Сумесна з атрадам прайшоў увесь цяжкі шлях барацьбы ў тыле ворага. Удзельнік многіх баёў і дыверсійных актаў на камунікацыях ворага. Акрамя таго, Мітчанкаў адважны разведчык. Юны партызан быў актыўным удзельнікам Боўскай абароны ў кастрычніку 1943 г. на тэрыторыі Быхаўскага раёна, мужна перанёс раненне і кантузію.

Мікалай Мітчанкаў за адвагу ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі прадстаўлены камандаваннем злучэння да ўрадавай узнагароды».

Іван Ільіч Гаравы пайшоў у партызаны, калі яму не было і васемнаццаці. Разам з вопытнымі байцамі хадзіў у разведку, удзельнічаў у баях.

Аднойчы разам з Міхаілам Камаровічам, узбекам Таджыбаевым і яшчэ двума партызанамі ён атрымаў задание ўзяць «языка». Накіраваліся да

К. І. Валчкова.



І. Маёраў.

в. Падклённе. Неўзабаве з засады ўбачылі чатыры варожыя фурманкі, на якіх сядзела дванаццаць гітлераўцаў. Партызаны абстралялі абоз. Акупанты ў паніцы кінуліся хто куды. Акрамя нямецкага унтэр-афіцэра, пяцёра партызан прыгналі ў лагер і фурманкі.

Пасля злучэння партызан з часцямі Чырвонай Арміі Іван Гаравы стаў салдатам. Пад г. Асавец гітлераўцы прадпрынялі танкавую атаку на пазіцыю іх роты. Выбраўшы зручны момант, Іван кінуў пад танк бутэльку з запальнай сумессю, за ёй — другую. Танк загарэўся. Смела дзейнічалі і астатнія байцы. Варожая атака захлынулася. За праяўленую ў гэтым баі асабістую адвагу і мужнасць І. І. Гаравы быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Апошні бой, у якім удзельнічаў Гаравы, адбыўся 28 красавіка 1945 г. пад Берлінам. Цяжка параненага асколкам варожага снарада байца адвезлі ў шпіталь.

Вярнуўся дамоў Гаравы з ордэнам Чырвонай Зоркі і двума медалямі «За адвагу».

Марыя Паўлаўна Альховік разам з іншымі камсамольцамі роднай в. Латкалонія па даносу здрадніка была схоплена летам 1942 г. Ноччу камсамольцам удалося ўцячы і дабрацца да партызан, якія знаходзіліся ў Боўскім лесе. Марыя стала партызанкай атрада І. П. Дзюбы.

У верасні 1942 г. ў час карнай экспедыцыі атрад, вырваўшыся з акружэння, трапіў у засаду. Вораг прыціснуў партызан да Сожа. Выхад быў адзін — пераправіцца на другі бераг. А пераплываць не было на чым. Трэба было тэрмінова шукаць брод, пакуль партызаны адбіваліся ад насядаючага ворага. Выканаць рызыкоўнае задание ўзялася Марыя. Убачыўшы памыты пясок, яна смела пайшла ў ваду. Але праз некалькі крокаў дно раптоўна знікла. Зброя і сумка адразу пацягнулі на дно. Аднак дзяўчыне ўдалося вынырнуць. З вялікай цяжкасцю ўчапіўшыся за корч, Марыя паплыла ўніз па рацэ. Адчуўшы на нейкі момант пад нагамі зямлю, партызанка была ўпэў-

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

нена, што менавіта тут зможа пераправіцца атрад. І не памылілася — байцы ўдала перайшлі раку ў тым месцы, дзе паказала Марыя, і былі выратаваны ад смерці. Потым Марыя Паўлаўна змагалася ў складзе атрада на Гомельшчыне і Браншчыне. Пасля вызвалення роднай Беларусі вярнулася ў родную вёску.

Ірына Васілеўна Аўчыннікава з в. Асоўшчына — адна з соцень тых простых жанчын, якія, рызыкуючы ўласным жыццём і жыццём сваіх дзяцей, сумлення і самааддана выконвалі грамадзянскі і мацярынскі абавязак. Сувязная Аўчыннікава жыла з траімі маленькімі дзецьмі на суседству са старастам і паліцаем. Аднак жанчына знаходзіла магчымасць дапамагаць партызанам 152-га партызанскага палка — па іх заданні збірала звесткі і інфармацыю аб ворагу. Знаходзілі ў хаце гэтай сардэчнай, ветлівай жанчыны і прытулак, і адпачынак партызаны, вяртаючыся ці ідучы на задание. Хоць побач была смяртэльная небяспека, жанчына ніколі не адпусціла іх, не накарміўшы. Аднойчы яна прапанавала партызанам забраць у лес карову: «Не сёння — заўтра ўсё роўна яе забяруць гітлераўцы. Няхай п'юць малако параненыя»,— настойвала жанчына. Ці можна забыць такое?..

Фама Міхайлавіч Еўмушкоў з в. Аляксандрава не быў у партызанах, непасрэдна не страляў у ворага. Аднак цяжка сказаць, колькі палягло акупантаў ад адрамантаваных ім кулямётаў і нават гармат. Кузня Фамы Міхайлавіча, якую гаспадар амаль ніколі не пакідаў, стала сапраўднай зброевай майстэрняй. І колькі радасці было, калі пасля ўпартай работы кулямёт, выцягнуты з возера або сапсаваны ў баі, пачынаў «гаварыць».

Еўмушкоў прыдумаў прыстасаванне для стральбы з супрацьтанкавых ружжаў па самалётах, якое выкарыстоўвалі партызаны ў час налётаў варожых самалётаў на вёскі, партызанскія базы. Па чарцяжы партызанскага збройніка рабілі спружыны для аўтаматаў. Вынайшаў майстар і змазку, якая хутка ачышчала зброю ад іржы. Фама Міхайлавіч не раз быў на валаску ад смерці, аднак мужна рабіў сваю справу.

Эмілія Пятроўна Кузняцова з в. Хамічы ноўк пасля вайны даведалася, што ў адной з газет былы партызан прасіў адгукнуцца жанчыну з в. Вязьма Быхаўскага раёна, якая выратавала жыццё яму і яго баявым сябрам. «Нічога ж асаблівага не зрабіла»,— вагалася жанчына, прымаючы рашэнне, даваць адказ ці не.

Так, у вайну яна жыла ў в. Вязьма, пякла партызанам хлеб. Аднойчы, выпаліўшы надвячоркам печ, паставіла ў яе хлеб. Жанчына чакала партызан, якія павінны былі прыйсці за ім. На душы чамусьці было трывожна, не хацелася нават у хаце быць. Жанчына выйшла ў двор. На краі вёскі забрахалі сабакі. Эмілія Пятроўна паглядзела ў той бок і сумелася — гітлераўцы. Яна праз сад выбралася за вёску і кінулася да луга, па якім звычайна ходзілі партызаны. Ад хвалявання і хуткага бегу жанчына не магла ні крычаць, ні гаварыць, калі ўбачыла знаёмых партызан, што выходзілі з хмызняку. Эмілія Пятроўна зняла хустку і пачала ёю падаваць сігнал трывогі. Байцы запяглі.

Неўзабаве разам з падмогай, якая з'явілася ў патрэбны час, партызаны нанеслі раптоўны ўдар па гітлераўцах і вымусілі іх пакінуць вёску.

Сібірак Рыгор Давыдкін

З успамінаў М. М. Алейнікава, былога камісара 2-га батальёна 152-га партызанскага палка

Па сіле, адважнасці і спрыту Рыгору Давыдкіну не было роўных у нашым батальёне (мне давялося самому фарміраваць гэты батальён, і я добра ведаў кожнага партызана). У нас было ад 300 да 350 байцоў, амаль палова якіх — кадравыя салдаты і камандзіры, якія нашанцавала ўцячы з канцлагераў і засценкаў гаспадароў «новага парадку».

Рыгор Давыдкін — сібірак, паляўнічы — быў вялікім майстрам на захопу «языкоў». Толькі за зіму 1943 г. ён даставіў у полк 10 афіцэраў. Аднойчы ён выпадкова наткнуўся на санны абоз гітлераўцаў. Скурчыўшыся ад марозу, яны беглі за санямі. На некаторай адлегласці ад іх не адставаў Рыгор, у думках распрацоўваючы план захопу «языка». І раптам адзін з карнікаў адстаў. Рыгор, выкарыстаўшы сітуацыю, бясшумна абязброіў яго і прывёў у штаб.

Неяк Грышу, каб выканаць заданне, давялося разыграць ролю бабкі. Сведкам і ўдзельнікам гэтага спектакля быў і я. «Бабка» з яго атрымалася б хоць куды, каб не вялізныя чаравікі 44-га размеру, якія выглядалі з-пад доўгай чорнай спадніцы.

З кошыкам цераз руку «бабка» крочыла па дарозе. На чыгуначным пераездзе яе сустрэў гітлераўец, які выйшаў з ахоўнай будкі. Аднак напалохаць нашу «бабку» было не надта проста. Зняўшы з рукі кошык, яна прапанавала вартаўніку куніць у яе яйкі і яблыкі. Аматар яек хутка спакусіўся і навёў «бабку» ў будку-дзот. Мы з Мішам Бацанам папаўзлі да будкі з другога боку. Была нядзеля. Вартавыя чыгункі рэзаліся ў карты. Убачыўшы поўны кошык ласункаў, яны кінуліся на іх. А «бабка» ў гэты момант выхапіла з-за пазухі супрацьтанкавую гранату і, адскочыўшы за дзверы, кінула яе ў будку-дзот.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Пасля гэтай аперацыі наш зброевы запас папоўніўся ручным кулямётам і шасцю аўтаматамі. Да таго ж «бабка» ў прыполе сваёй спадніцы прынесла больш пуда патронаў. Ці можна ж забыць такую «бабку»?

Агапа Юрчанка

А. С. Юрчанка.

Іх было дванаццаць у сям'і Сцяпана Юрчанкі з хутарка Закл каля вёскі Хачынка. Маленькая Агапка пайшла здабываць свой кавалак хлеба ў падпасках. Зорны час для тысяч такіх вось непісьменных, зморaных непасільным жыццём падлеткаў наступіў пасля Вялікага Кастрычніка. Бязмежная цяга да ведаў, усяго новага, што прынесла з сабой рэвалюцыя, была іх асноўнай рысай.

Агапа Юрчанка стала камсамольскім важаком моладзі. Сходы і вечары зацягваліся да позніх ноўняў. Час быў шчаслівы, рэвалюцыйна ўзнёслы.

...Хачынку акупіравалі ў сярэдзіне ліпеня 1941 г. Нехта данёс, што ў вёсцы жыве камсамольскі сакратар, калгасны актывіст Агапа Юрчанка. Маладую маці схапілі і павялі вешаць у сад каля хаты. Не маглі не заступіцца аднавяскоўцы за шчырую і працавітую жанчыну. Людзі сталі пераконваць афіцэра, што схапілі не тую, каго шукалі. Слізганула са старой вішні пяроўка, смерць адступіла ад Агапы. З таго дня прытулкам для яе стаў лес. Некалькі месяцаў хавалася адна, потым напаткала партызан. Яе залічылі ў атрад Сазонава. У канцы лета 1942 г. пасля цяжкіх баёў з карнікамі атрад перадыслацыраваўся ў Бранскія лясы. Там Юрчанка стала партызанкай славутага злучэння А. Ф. Фёдарава, удзельнічала ў шматверставым рэйдзе злучэння па Украіне, многіх жорсткіх баях з акупантамі.

Пасля вайны вярнулася Агапа Сцяпанаўна ў родную вёску з медалём на грудзях. Даведалася пра цяжкі лёс сваёй сям'і: фашысты закатавалі яе сястру Варвару, на валаску ад смерці была маці.

А зямля зачакалася сваіх гаспадароў. Працавітая, ўвішная Агапа Сцяпанаўна зноў у першых радах тых, хто аднаўляў родны калгас.

— На адзіным худым коніку, які меў тады калгас, везлі мы сабранае па дварах насенне для першай мірнай сяўбы. Людзі выходзілі з зямлянак, і кожны імкнуўся дапамагчы яму цягнуць зусім не цяжкі воз,— часта ўспамінала Юрчанка дарагі для яе эпізод.— У вачах людзей бліснчэлі слёзы і свяцілася ўпартая рашучасць: змаглі выстаяць, прагнаць чужынцаў, дык зможам і адрадзіць жыццё...

З сям'і патрыётаў

У цэнтры вёскі Чырвоны Бераг стаіць помнік. На ім прозвішчы аднавяскоўцаў, якія загінулі ў час ваеннага ліхалецця. Сярод іншых павечна ўпісаны імёны Андрэя Міхайлавіча Каваленкі і яго чатырох сыноў — Сяргея, Васіля, Пятра, Міхаіла...

Калі пачалася вайна, Андрэю Міхайлавічу Каваленку было пад шэсцьдзесят. Сам ужо не воін, ён у ваенкамат праводзіў двух сыноў — Сяргея і Пілліпа. Сяргей пайшоў на фронт, а з Пілліпам вярнуўся дамоў: падвёў хлопца зрок, не ўзялі ў армію. Дома чакалі яшчэ чацвёра сыноў-падлеткаў. Старэйшаму, Васілю, было семнаццаць, малодшаму, Віцю,— дзевяць. Ды дзве дачкі, таксама не ваякі. Аднак памыліўся стары салдат. Васіль і Пеця разам з сябруком Міколам Сідарэнкам першыя з вёскі пайшлі ў партызаны. З іх удзелам былі паспяхова праведзены першыя дыверсійныя аперацыі народных мсціўцаў. А праз нейкі час і сам Андрэй Міхайлавіч стаў дапамагаць партызанам. Спачатку выконваў даручэнні палітрука Кордышава з атрада Мікалая Труснова, а потым Васіля Данілава з атрада Міхаіла Максімава-Лебедзева. Галоўны абавязак быў — забяспечыць партызан прадуктамі.

У той жнівеньскі дзень 1942 г. Андрэй Міхайлавіч звозіў з поля снапы жыта. Па даносу здрадніка яго схапілі і кінулі ў «газніцу» — муравaную кладоўку з кратамі на вокнах, што знаходзілася на станцыі Тошчыца.

Восем сутак катавалі бацьку, дапытваліся пра партызан і сыноў. Але Андрэй Міхайлавіч вытрымаў здзекі. Нічога не дабіўшыся, яго разам з іншымі сувязнымі расстралялі (сярод іх быў Ягор Зычкоў з жонкай і сынам, якія пяклі хлеб

Быховский районный историко-краеведческий музей

Браты Каваленкі (злева направа): Пётр, Мікалай, Васіль.

партызанам). Не пазбегла б расправы ўся сям'я, каб не схавалася ў лесе.

«Праз некалькі тыдняў мы з братам Мішам вярнуліся дамоў,— успамінае Ганна Андрэеўна Каваленка.— Паставіўшы трыножак на агародзе, стала варыць бульбу ў гільзе ад снарада. Міша штосьці рабіў у хаце. Раптам бачу, як на двор заходзяць паліцэйскія, якія забіралі бацьку. Я кінулася на могільнік, што за вёскай. Адтуль бачыла, як арыштавалі сям'ю Пічыпара Рамановіча Каваленкі — яго жонку і двух дачок. У той жа дзень іх расстралялі разам з камуністам Аляксандрам Восіпавічам Сідарэнкам з жонкай, які да вайны працаваў старшынёй Тошчыцкага сельпо. А нашага Мішу фашысцкія каты зацягнулі ў пуню і пасеклі...»

Гібель блізкіх выклікала ў братоў Каваленкаў яшчэ большую нянавісць да фашыстаў. Аперацыі юных мсціўцаў вызначаліся дзёрзкасцю, разведкі — смеласцю. Хлопцы самі прасіліся на заданні. Яны праходзілі там, дзе не заўсёды маглі прайсці дарослыя.

У лютым 1944 г., калі падраздзяленні Быхаўскай ВАГ падрыхтаваліся да пераходу з Клічаўскага раёна ў Быхаўскі, група партызан, у якую ўваходзілі Васіль, Мікалай і Пеця Каваленкі, атрымала заданне разведаць шляхі, аднавіць старыя і наладзіць новыя сувязі сярод насельніцтва.

Група перабралася цераз шашу Магілёў — Бабруйск, прайшла дзесяткі кіламетраў і спынілася каля в. Слабодка Рагачоўскага раёна. Правесці разведку ў вёсцы і пабываць у доме сувязнога Ціхановіча ўзяліся браты Каваленкі і іх неразлучны сябар Мікалай Сідарэнка.

Хлопцы былі пільнымі, але не заўважылі нічога, што б прадвяшчала бяду. Фурманка ўжо пад'язджала да дому сувязнога, як раптам застрачыў варожы кулямёт. Партызаны ўступілі ў няроўны бой. Юных мсціўцаў Пецю і Васіля Каваленкаў, Мікалая Сідарэнку скасіла чарга. Толькі Мікалаю Каваленку ўдалося прабрацца ў лес.

Фашысты ўчынілі здзекі над загінуўшымі партызанамі, іх целы вылюдкі прыбілі цвікамі да сцяны хаты. Пасля загінуўшых герояў партызаны пахавалі на могілках у вёсцы Слабодка Азяранскага сельсавета.

...Імя піянера Пеці Каваленкі, узнагароджанага медалём «За адвагу» пасмяротна, носяць некалькі школьных піянерскіх дружын рэспублікі. Па хадайніцтву Цэнтральнага савета Усесаюзнай піянерскай арганізацыі імя У. І. Леніна і газеты «Пионерская правда» з 1974 г. імя піянера прысвоена сухагрузнаму судну. «...Мы рады, што робім добрую справу — захоўваем памяць аб героях, якія загінулі за нашу Радзіму,— напісаў у Быхаўскую раённую газету «Маяк Прыдняпроўя» капітан судна А. М. Кравец.— У чырвоным кутку мы ўстанавілі бюст Пеці Каваленкі, зрабілі мармуровую пліту для брацкай магілы, дзе пахаваны юны герой...»

Пяцёра з дзесяці членаў сям'і Андрэя Каваленкі загінулі ў смяротнай бітве з ворагам...

А. Гарошка.

* * *

Іх расло двое ў сям'і Ульяны і Якава Шмідавых, майстра Ветранскага шклозавода «Ільіч»: Косцік у 1941-м пайшоў семнаццаты, а малодшаму, Ваню, было пятнаццаць гадоў.

Калі фронт адкаціўся далёка за в. Смаліцу, дзе жыла гэта сям'я, хлопцы днямі прападалі ў лесе, збіралі па месцах баёў зброю і боепрыпасы. Аднойчы яны сталі сведкамі жорсткага бою ў паветры. На наш бамбардзіроўшчык, які вяртаўся з тылу ворага, наляцелі фашысцкія знішчальнікі. Гітлераўцы збілі наш самалёт. За двума белымі парашутамі, якія аддзяліліся ад самалёта, пільна сачылі Косця і Ваня Шмідавы...

У той дзень яны вярнуліся дамоў позна вечарам і, не стрымліваючы слёз, «адкрыліся» маці — у лесе хаваюцца параненыя лётчыкі, ім патрэбна дапамога. Маці заўсёды разумела сваіх сыноў, дапамагла ім і цяпер. Толькі папярэдзіла: «Я ўсё зраблю, што трэба, але будзьце асцярожныя. Сэрца маё не вытрымае, калі з вамі што здарыцца».

...Ішоў 1942 год. Косця авалодаў мінай справай і быў залічаны мінёрам у дыверсійную групу

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

партызанскага атрада Якава Курпачэнкі. Ваня стаў разведчыкам.

Бяда не ходзіць адна. Фашысты дашчэнту спалілі вёскі Смаліцу і Ветранку, забілі мужа Ульяны Фёдараўны. А хутка новае гора — у рукі гітлераўцаў трапіў Косця. Здарылася гэта ў ліпені 1942 г. Дыверсійная група заначавала ў в. Рагі. Раніцай вёску акружылі фашысты. Партызаны доўга адстрэльваліся, параненага падрыўніка Косцю Шмідава гітлераўцы захапілі ў палон. Яму абяцалі жыццё пры ўмове, што ён пакажа месцазнаходжанне партызанскага лагера. Пагеройску трымаўся на допытах юны партызан. Ён мужна перанёс усе катаванні, не выдаў партызанскай тайны і загінуў.

...Майскай ноччу 1943 г. ў вёску, дзе жыла Ульяна Фёдараўна, завіталі партызаны. Маці пачула пад акном родны голас Вані:

— Гатуй нам, мама, кашу ды такую смачную, як толькі ты адна ўмееш.

З таго дня Ульяна Фёдараўна больш не разлучалася з сынам — партызаны забралі яе з сабой

У. Ф. Шмідава.

П. М. Караленка.

у лес. Да прыходу Чырвонай Арміі гатавала яна ім ежу. Партызанскай маці звалі яе ласкавыя байцы.

Я. Казлоў.

У першых радах — камсамол

З успамінаў П. М. Караленкі

Павел Міхайлавіч Караленка нарадзіўся 21 верасня 1921 г. ў в. Ямнае Быхаўскага раёна. Член КПСС з 1943 г. У 1937 г. ўступіў у рады ВЛКСМ. Перад вайной працаваў сакратаром выканкома Клятнянскага сельскага Савета, быў выбраны пазаштатным сакратаром Быхаўскага райкома камсамола. З верасня 1942 г. прымаў актыўны ўдзел у партызанскім руху на Быхаўшчыне ў складзе 810-га партызанскага атрада. З красавіка 1943 г. першы сакратар Быхаўскага падпольнага райкома камсамола. Пасля вызвалення раёна першы сакратар Быхаўскага райкома камсамола, на гаспадарчай рабоце. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр 9 студзеня 1981 г.

Першага ліпеня 1941 г. на выкліку я быў у райкоме партыі. Т. І. Бурдзілаў, першы сакратар райкома, спытаў: «Як глядзіш, сынок, калі мы цябе пакінем на падпольную работу?». Я быў згодны.

Група, пакінутая для падпольнай работы, перадыслацыравалася ў лес на паўднёвы захад ад в. Выгода. Сакратар райкома партыі С. Е. Падольцаў праінструктаваў нас, як весці работу ў тыле ворага, параіў на першым часе легалізавацца ў сваіх вёсках. Такі ж інструктаж ён правёў і з іншымі групамі, пакінутымі для арганізацыі барацьбы на акупіраванай тэрыторыі раёна. Выконваючы рэкамендацыі сакратара райкома, я і мае таварышы вялі растлумачальную работу сярод насельніцтва, стваралі патрыятычныя групы, назапашвалі зброю і боепрыпасы.

У пачатку чэрвеня 1942 г. патрыятычная група в. Клятное пад кіраўніцтвам Васіля Зыкава абстраляла варожую ахову, якая гнала моладзь з вёсак Выгода, Уюн і Клятное для адпраўкі ў Германію. Моладзь разбеглася.

Актыўна дзейнічалі групы патрыётаў у вёсках Ямнае, Уюн, Лагадава, якімі кіравалі Павел Шураеў, Уладзімір Сцепанцоў, Канстанцін Яшчанка. Пазней яны перадалі ў партызанскі атрад 7 ручных кулямётаў, 29 вінтовак, 6 тысяч патронаў.

Агітацыйную работу мы накіроўвалі на зрыў мерапрыемстваў акупантаў. Бліскуча правёў аперацыю па захаванню сабранага ўраджаю 1942 г. ў в. Ямнае, дзе я тады жыў, кладаўшчык Сцяпан Гаўрылавіч Малашонак. Ён раздаў хлеб калгаснікам і так заблытаў улік, што акупанты не маглі знайсці канцоў. Актыўна ўдзельнічалі ў агітацыйнай рабоце, зборы зброі ў гэтай вёсцы Канстанцін Пірагоў, Сяргей Зыкаў, Герасім Касцюкоў, мае сёстры Вольга і Ніна.

Полымя партызанскай вайны ўсё шырэй ахоплівала раён. Бясстрашна дзейнічалі камсамольцы Іван Хахлоў, Мікалай Сідарэнка, Павел Шэйбус, Мікалай Каваленка, Аня Кавалёва, Косця і Іван Шмідавы, Цярэнцій Падголін, Аляксей Салаўёў, Вера Мурашова і іншыя. Акружэнец малодшы палітрук Чырвонай Арміі Яфім Фёдаравіч Кордычаў, які жыў у в. Новы Быхаў, разам з сябрамі-аднадумцамі рыхтаваў моладзь да партызанскай барацьбы. У чэрвені 1942 г. з вёсак Новы Быхаў і Лазаравічы ў партызанскі атрад Максімава прыйшло 15 патрыётаў, сярод якіх былі Жэня Дзергачова, Піліп Лагуноў, Андрэй Вараб'ёў, Сцяпан Шаблаўнёў. З верасня 1942 г. я таксама

Быховский районный историко-краеведческий музей

стаў партызанам гэтага атрада, радавым байцом 1-га ўзвода Івана Вараб'ёва. У першы ж дзень знаходжання ў партызанах прыняў удзел у разгроме паліцэйскага гарнізона ў в. Ямнае. Мы знішчылі валасную ўправу, парвалі тэлефонную сувязь, захапілі 3 кулямёты, 5 вінтовак, патроны, спалілі ўсю дакументацыю валасной управы.

З прыходам з-за лініі фронту ўпаўнаважанага ЦК ЛКСМБ па Быхаўскім раёне Дзяніса Яфімавіча Бычанкова камсамольская работа ў партызанскіх атрадах прыкметна ажывілася. Пачалі стварацца камсамольскія арганізацыі ў вёсках, якія кантраляваліся акупантамі. Дзяніс быў палымяным прапагандыстам і ўмелым арганізатарам. У лістападзе 1942 г. Бычанкоў з групай партызан пайшоў на левы бераг Дняпра на выкананне адказнага задання. Пазней мы атрымалі цяжкую вестку аб яго гібелі.

Камсамольскай работай у атрадзе кіраваў Я. Ф. Кордычаў. Пры яго непасрэдным удзеле былі створаны камсамольска-маладзёжныя дыверсійныя групы, праводзілася работа па разлажэнню варожых гарнізонаў у вёсках Новы Быхаў, Тайманава і іншых. Ішоў актыўны збор зброі, шырока распаўсюджваліся зводкі Саўінфармбюро і партызанскія лістоўкі.

У канцы студзеня 1943 г. Кордычаў узначаліў падрыўную групу з васьмі камсамольцаў. Вяртаючыся з чыгункі, непадалёк ад в. Слабада Рагачоўскага раёна група патрапіла на засаду. Хлопцы біліся да апошняга патрона. Гітлераўцы спрабавалі захапіць хоць бы аднаго партызана. Жывым не здаўся ніхто. (**Ад рэдакцыі:** па даных партархіва ІГП пры ЦК КПБ гэты бой адбыўся 13.2.1943, а Кордычаў пахаваны ў в. Кіцяні Рагачоўскага раёна.)

На Быхаўшчыне ў той час у асноўным дзейнічалі два партызанскія атрады — 810-ы і 425-ы, камсамольскімі сакратарамі ў якіх былі Валянцін Крывашэеў і Віктар Куракін. 16 красавіка 1943 г. быў створаны Быхаўскі падпольны райком камсамола. У яго ўвайшлі Павел Караленка, Ліза Рыкіцянская, Віктар Куракін, Ганна Вараб'ёва (Кавалёва), Валянцін Крывашэеў, Пётр Дамброўскі і Рыгор Казлоў.

У той дзень я стаў членам партыі. Адразу ж паміж членамі райкома былі размеркаваны абавязкі. Віктару Куракіну было даручана стварэнне камсамольскіх арганізацый у Гарадзецкім і Макранскім сельсаветах, Ганне Вараб'ёвай — праводзіць масава-палітычную работу сярод моладзі Чырнонабярэжскага, Ніжнятошчыцкага і Навабыхаўскага сельсаветаў. З даручэннямі ўсе члены райкома справіліся паспяхова. Ажывіліся і мэтанакіравана пачалі працаваць створаныя камсамольскія арганізацыі ў вёсках Дунаёк (сакратар Вольга Краўчанка), Мокрае (Васіль Буцін), Сарочына (Надзея Кірпічэнка), Глухская Сяліба (Марыя Грыгор'ева), Віляхаўка (Васіль Самуйлаў), Залатва (Лідзія Кавалёва).

Камсамольцы распаўсюджвалі лістоўкі, збіралі зброю і медыкаменты, зрывалі мерапрыемствы гітлераўцаў па вывазу моладзі ў Германію.

Пачаўся небывалы прыток моладзі ў партызаны. Ва ўсіх атрадах 11-й Быхаўскай брыгады былі створаны камсамольскія арганізацыі. Райком камсамола арганізаваў навучанне маладых партызан тактыцы партызанскай вайны, уменню валодаць зброяй, узрыўчаткай, выяўляць і знішчаць лініі сувязі, аказваць першую медыцынскую дапамогу. Камсамольцы ўдзельнічалі ва ўсіх баявых аперацыях, былі разведчыкамі, сувязнымі, выконвалі самыя адказныя і рызыкоўныя заданні.

Бясстрашнай і знаходлівай сувязной была камсамолка Надзея Кірпічэнка. У 1941 ёй было семнаццаць. З першых дзён акупацыі яна разам з Віцем Пекішам, Лёнем Краўчанкам, Насцяй Кірпічэнка збіралі зброю і перапраўлялі ў партызанскі атрад, распаўсюджвалі лістоўкі, здабывалі медыкаменты. Увосень 1943 г. Надзя па нашаму заданню ўстанавіла сувязь з антыфашыстам Эйхісам, які служыў у гарнізоне на раз'ездзе Баркалабава. Перад палётам на гарнізон Эйхіс зняў вартавых і вынес зброю з казармы. Народныя мсціўцы без перашкод уварваліся ў гарнізон, перабілі фашыстаў, разбурылі чыгуначнае палатно і падпалілі казарму.

Шмат гераічных учынкаў здзейсніла камсамолка Вера Самалётава з в. Сядзіч. Яе рукамі былі напісаны сотні лістовак, якія яна пачынала словамі «Смерць фашыстам». Дзяўчына перадала партызанам дзесяткі каштоўных звестак з варожых гарнізонаў. Вера загінула па-геройску на баявым посту.

Сапраўдным патрыётам быў Алёша Загрышаў. У студзені 1944 ён перайшоў лінію фронту і паведаміў савецкаму камандаванню звесткі аб штабе гітлераўскіх войск у в. Прыбар. Потым прывёў туды лыжны батальён нашых воінаў. Яны разграмілі штаб, захапілі каштоўныя дакументы, узялі ў палон каля пяцідзесяці фашысцкіх афіцэраў.

Надзейным сувязным быў Елісеенка з в. Гута. Гэта ён у жніўні 1943 паведаміў, што ў в. Гарадзец карнікі зганяюць людзей у хаты і збіраюцца іх знішчыць. Партызаны былі падняты на трывозе і падаспелі ў вёску своечасова. Дзякуючы камсамольцам Івану Альховіку, Івану Карамышаву, Дзмітрыю Волгіну, Пятру Антонаву, Мікалаю Казлову і іншым партызанам мірныя жыхары былі выратаваны.

У атрадах захаплялiся мужнасцю і знаходлівасцю 16-гадовай камсамолкі Ані Лёгкай з в. Старая Трасна, Наташы Гадуцовай з в. Рыхартава.

У «рэйкавай вайне» вызначыліся камсамольцы Іван Цвяткоў, Мікалай Барысевіч, Уладзімір Куксёнак, Іван Казлоў, Міхаіл Бондараў, Фёдар Елісеенка, Уладзімір Лысенка, Васіль Данілін, Мікалай Красільнікаў, Іван Дзюндзікаў і іншыя.

У лютым 1944 г. ў раёне дзейнічалі 42 пярвіч-

Быховский районный историко-краеведческий музей

ныя камсамольскія арганізацыі, у якіх налічвалася 585 камсамольцаў. 57 лепшых з іх падпольны райком камсамола рэкамендаваў для ўступлення ў партыю. Яны былі смелымі падрыўнікамі і разведчыкамі, палымяннымі агітатарамі, выпрабаванымі сувязнымі і надзейнымі правадніка-мі. Па ўсім нашым Прыдняпроўі грымела слава аб падрыўніках Мікалаю Каваленку, Міхаілу Лазоўскім, аб разведчыках Рудкоўскім, Паўлючкову, Лабкову, Катлярову, байцах Архінаву, Дзюндзікаву, Лагунову, Свірыдзенку, камандзіру ўзвода Мікалаю Барысевічу і многіх іншых. Камсамольска-маладзёжныя дыверсійныя групы спусцілі пад адхон 50 варожых эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай ворага, разбілі 17 паравозаў, 286 вагонаў, 7 танкаў, 16 гармат і шмат іншай ваеннай тэхнікі.

364 маладыя партызаны за мужнасць і гераізм былі прадстаўлены да ўрадавых узнагарод.

Пасля злучэння з Чырвонай Арміяй большасць камсамольцаў пайшла на фронт. Нялёгкая ноша лягла і на плечы тых, каму выпала аднаўляць народную гаспадарку раёна. У папялішчы ляжалі вёскі. Сотні дзяцей засталіся сіротамі. У зямлі было столькі варожых мін, што небяспека падпільноўвала на кожным кроку. Па закліку райкома камсамола сорак дзевяць камсамольцаў скончылі курсы разміравання. З іх дапамогай былі абясшкоджаны тысячы мін. Дзесяткі камсамольска-маладзёжных брыгад працавалі ў полі, будавалі жыллё для ўдоў, шэфствавалі над дзецьмі-сіротамі. Камсамолу да ўсяго была справа, ён быў у адказе за ўсё.

З успамінаў П. М. Дамброўскага, былога памочніка камісара па камсамолу 810-га партызанскага палка Быхаўскай ВАГ

У 1942 г. Цэнтральны Камітэт ЛКСМБ накіраваў на акупіраваную ворагам Магілёўшчыну групу камсамольцаў-беларусаў, у складзе якой быў і я. Было мне тады дваццаць гадоў. Перад намі стаяла задача разгарнуць агітацыйную і арганізатарскую работу сярод моладзі, узняць усіх, хто мог трымаць зброю ў руках, на барацьбу супраць акупантаў.

У сярэдзіне лета наша група прыбыла ў Быхаўскі раён у размяшчэнне 810-га партызанскага атрада, які ў той час дыслацыраваўся ў лесе каля в. Дзедава. Партызаны прынялі нас як дарагіх гасцей. Асноўным касцяком у атрадзе былі камсамольцы і моладзь. Вялікім аўтарытэтам карысталіся ў партызан Вася Каваленка, Мікола Сідарэнка, Аня Каваленка з в. Чырвоны Бераг, Ніна Максімава з Ліпавага Рогу, а таксама хлопцы і дзяўчаты, якія па розных прычынах апынуліся ў вайну на Быхаўшчыне: Саша Лысенка, Валянцін Крывашэеў, Іван Сяржант і многія іншыя.

Спачатку я быў падрыўніком у дыверсійнай

П. М. Дамброўскі.

групе, потым камандзірам аддзялення, а з студзеня 1943 г.— памочнікам камісара атрада па камсамолу. Наш атрад увесь час папаўняўся. Ішлі да нас людзі, якія мелі вопыт ваенных дзеянняў, шмат было і маладых партызан, якім яшчэ трэба было вучыцца ваяваць.

У кастрычніку 1943 г. атрад разгарнуўся ў партызанскі полк. У ім было каля 120 камсамольцаў. Усе яны па-геройску змагаліся з ворагам. Грымела слава аб разведчыках і падрыўніках Васю Каваленку і Міколе Сідарэнку. Адной-чы група, у якую ўваходзіў і я, пайшла выконваць заданне на чыгунку. Паспрабавалі падабрацца да палатна непадалёку ад 15-га разъезда, але не змаглі — фашысты пільна ахоўвалі чыгунку. Падаліся ў бок Камарыч. І там нас напаткала няўдача. Тады Каваленка і Сідарэнка, якія выдатна ведалі падыходы да чыгункі, прапанавалі правесці дыверсію пад Рагачовам. Там нам пашанцавала — быў скінуты варожы цягнік з жывой сілай і тэхнікай.

А камсамолец-падрыўнік Міша Лазоўскі 10 эшалонаў пусціў ён пад адхон. Пры спробе падарваць адзінаццаты адважны партызан загінуў.

У канцы кастрычніка 1943 г., калі адзначалася 25-я гадавіна з дня нараджэння Ленінскага камсамола, усе камсамольцы палка атрымалі баявое заданне: хто ішоў на чыгунку, хто ў засаду ці на «паляванне» за ворагам, хто са зводкамі Саўінфармбюро ў вёскі. І амаль усе вярнуліся з удачай. Не вярнуўся толькі Мікола Мельнікаў. На яго групу (6 чалавек) нанаў узвод фашыстаў. Юнакі знішчылі шмат гітлераўцаў. Але ад варожай кулі загінуў і іх камандзір.

Неацэнную дапамогу атрымлівалі мы ад камсамольцаў і моладзі, якія не былі ў партызанскіх атрадах разам з намі, але выконвалі не менш адказныя і рызыкоўныя заданні: з'яўляліся нашымі сувязнымі. Яны былі ў кожнай вёсцы. Праз іх полк атрымліваў звесткі аб дыслакацыі ворага, яго планах. Мы ў сваю чаргу забяспечвалі сувязных лістоўкамі, газетамі,

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

зводкамі. Пры дапамозе нашых баявых памочнікаў на месцах нам удалося, напрыклад, выявіць засланага ў полк фашысцкага шпіёна.

Камсамольскі важак Дзяніс Бычанкоў

Дз. Я. Бычанкоў.

Дзіцячыя і школьныя гады Дзяніса Бычанкова прайшлі ў в. Ніканавічы, дзе ён нарадзіўся ў 1924 г. Доўгімі зімовымі вечарамі збіраліся ў хаце Мішы Белакузава Дзяніс Бычанкоў, Піліп Авяр'янаў, Анатоль Смалянкоў. Расказвалі аб прачытаных кнігах, абгрунтоўвалі выбар сваіх любімых герояў. Дзяніс добра маляваў. Міхаіл любіў пісаць заметкі, і колькі было радасці ва ўсіх, калі яго матэрыялы друкаваліся ў піянерскіх газетах.

Пасля сканчэння сямі класаў і кароткатэрміновых курсаў Дзяніс быў накіраваны настаўнікам у в. Смаліца. Яго школьныя сябры Фядос Смалячкоў і Міхаіл Белакузаў паехалі вучыцца ў Ленінград у школу фабрычна-заводскага навучання.

20 чэрвеня 1941 г. Дзяніс паехаў у Ленінград да сваіх сяброў. Горад яму ўбачыць не давялося — калі пачуў, што вайна, адразу пайшоў добраахвотнікам на фронт. У першым жа баі быў паранены. Пасля шпіталю зноў ірваўся на фронт. Але юнака накіравалі на вучобу ў спецшколу. Пасля яе заканчэння Бычанкова паслалі ўпаўнаважаным ЦК ЛКСМБ па Быхаўскім раёне. У верасні 1942 г. ён з групай прыйшоў у размяшчэнне партызанскага атрада М. Л. Максімава-Лебедзева. Арганізаваўшы камсамольскую работу ў атрадзе і навакольных вёсках, камсамольскі важак перабраўся на левабярэжжа Дняпра. Праз сяброў дзяцінства і надзейных знаёмых наладзіў шырокую сетку разведкі, арганізаваў дыверсійныя групы, сам прымаў удзел у дыверсіях, паказваючы незвычайную адвагу і мужнасць.

Аднойчы жнівеньскай раніцай 1943 г. шэсць разведчыкаў выйшлі на заданне ў раён в. Прыбар, дзе размяшчалася буйная варожая часць. Нечакана партызаны трапілі на засаду. Завязаўся няроўны бой. Да апошняга патрона біліся разведчыкі на чале з камсамольскім важаком Дзянісам Бычанковым. На месцы іх гібелі ўстаноўлены памятны знак.

В. А. Белакузаў.

* * *

Артыкул В. А. Белакузава быў у свой час надрукаваны Быхаўскай раённай газетай «Маяк Прыдняпроўя» ў раздзеле «Летапіс народнай славы». Упаўнаважаным ЦК ЛКСМБ па Быхаўскім раёне называе Дз. Я. Бычанкова ў сваіх успамінах і былы сакратар Быхаўскага падпольнага РК ЛКСМБ П. М. Караленка.

Але ёсць і іншая інфармацыя. У Быхаўскім гісторыка-краязнаўчым музеі захоўваецца даведка партархіва ЦК КПБ ад 31 ліпеня 1969 г. за № 8304, паводле якой Бычанкоў Дз. Я., 1924 года нараджэння, член ВЛКСМ, нам[illegible], у канцы ліпеня 1942 г. па рашэнню ЦК КП(б)Б у складзе групы Міхневіча быў накіраваны ў Быхаўскі раён для выканання спецзадання. У спісах асабовага складу 810-га партызанскага атрада ён

Помнік Дзянісу Бычанкову на месцы яго гібелі каля вёскі Прыбар.

Быховский районный историко-краеведческий музей

лічыцца радавым партызанам з 1 жніўня 1942 г. Загінуў у маі 1943 г. ў Быхаўскім раёне.

Дакумент не называе Дз. Бычанкова ўпаўнаважаным ЦК ЛКСМБ, дае іншы час (больш верагодны) гібелі. Не выключана, што тым спецзаданнем, з якім ён быў накіраваны на Быхаўшчыну, магла з'яўляцца і работа па арганізацыі моладзі на партызанскую барацьбу, стварэнні падпольных камсамольскіх груп.

Але ясна адно: Дз. Бычанкоў быў сапраўдным патрыётам, сваё маладое, кароткае, але яскравае жыццё ён пражыў недарэмна.

Вернасць

З успамінаў М. А. Труснова, былога камандзіра 108-га партызанскага атрада імя Р. І. Катоўскага

Я. С. Дзергачова.

У чэрвені 1942 г. каля в. Чырвоны Бераг у наш атрад [1] прыйшла Жэня Дзергачова з в. Ботня, студэнтка медінстытута. Бацька яе, стары бальшавік, былы камандзір партызанскага атрада часоў грамадзянскай вайны, а потым камісар палка Чырвонай Арміі, у першыя ж дні вайны пайшоў разам з адступаючымі чырвонаармейцамі. Маці гітлераўцы расстралялі.

Камсамолку залічылі ў групу разведкі. Тут яна пасябравала з масквічом, былым лётчыкам Генадзем Бармашэнкам. Жэня і Генадзь імкнуліся на заданні хадзіць разам. Перад выхадам з Шапчыцкіх лясоў былога Журавіцкага раёна мы накіравалі Генадзя і Жэню ў разведку ў в. Свержань. Там яны трапілі ў засаду. Разведчыкам удалося вырвацца, але Бармашэнка быў цяжка паранены. Немцы ўзнялі па трывозе бліжэйшыя гарнізоны і пачалі праследаваць наш атрад. Пад кулямі днём вымушаны былі мы перапраўляцца на ўсходні бераг Сожа. Было гэта на поўдзень ад Кармы. Генадзя Бармашэнку паклалі на маленькую лодку. Жэня плыла за лодкай пад градам куль, падштурхоўваючы яе ўперад. На беразе вынесла параненага сябра ў бяспечнае месца. Але фашысты паспелі выставіць засады і на гэтым беразе. Больш 2 гадзін працягваўся бой, пакуль байцы атрада прарваліся ў Струменскія лясы. Наша група прыкрыцця з 9 чалавек так і не змагла пераправіцца. Давялося адысці ўверх па Сожы, потым вярнуцца ў Быхаўскі раён, каб працягваць дыверсійную работу.

Аб далейшым лёсе разведчыкаў Я. Дзергачовай і Г. Бармашэнкі нам стала вядома толькі пасля вайны. Мужная дзяўчына зрабіла ўсё, што змагла, каб выратаваць Генадзя. Яна зноў пераправіла яго на заходні бераг Сожа. Дастаўшы фурманку, спадзявалася адвезці разведчыка да знаёмых. Дзяўчына ведала, што рызыкуе, але інакш паступіць не магла.

Па дарогах шнырылі паліцэйскія, яны і затрымалі Жэню, знайшлі ў возе з сенам параненага разведчыка. Спачатку іх даставілі ў кармянскую паліцыю, потым перавялі ў бальніцу, каб пасля зноў працягваць допыты. Жэня рыхтавала ўцёк, але напярэдадні разведчыкаў пад узмоцненай аховай павезлі ў Журавічы. Іх жорстка катавалі, але яны не выдалі партызанскай тайны. Сведкам гібелі мужных патрыётаў былі многія жыхары Журавіч. Была там і Вольга Міронава з в. Лазаравічы, якую партызаны паслалі даведацца аб лёсе разведчыкаў. Дачка камісара партызанкі Я. С. Дзергачова прыняла смерць з высока ўзнятай галавой. «Памятайце, людзі! Мы нікога не выдалі, не здрадзілі Радзіме!» — паспела крыкнуць Жэня ў апошні момант жыцця...

Жыве ў народзе...

Марат Казлоў нарадзіўся ў 1930 г. ў в. Ветранка. У 1941 г. скончыў тры класы Ветранскай сярэдняй школы. З студзеня 1942 г. сувязны патрыятычнай групы, з чэрвеня 1942 г. партызан-разведчык атрада І. П. Дзюбы 1-й Быхаўскай партызанскай брыгады. У ліпені 1942 г. ў час выканання задання ў в. Кузькавічы быў схоплены ворагам і па-зверску закатаваны.

Пахаваны юны герой у в. Ветранка. У Быхаве Марату Казлову пастаўлены помнік, яго імем названа вуліца. Імя Марата Казлова прысвоена

[1] Маецца на ўвазе, напэўна, 810-ы партызанскі атрад, з групы якога ў сакавіку 1943 г. быў створаны 108-ы асобны атрад імя Р. І. Катоўскага.

Быховский районный историко-краеведческий музей

М. Казлоў.

піянерскім дружынам Ветранскай сярэдняй школы і Быхаўскай сярэдняй школы № 1. Яго імя прысвоена цеплаходу. Юнаму мсціўцу прысвяцілі свае паэмы Раіса Баравікова і Васіль Маеўскі, твор якога (з некаторымі скарачэннямі) друкуецца ніжэй.

СЛОВА ПРА МАРАТА КАЗЛОВА

...«Марата Казлова я ведаў,—
Стары партызан уздыхнуў,—
У пачатку вайны ў легенду
Хлапчынка героем шагнуў!..
Паклікаў Марата аднойчы
У трывожныя дні камандзір:
«Ёсць справа адказная, хлопча:
У разведку патрэбна схадзіць».
...Ішоў наш Марат па дарозе
Няспешнай дзіцячай хадой.
На палачцы торбачка з хлебам
Вісіць у яго праз плячо,
Ашратка ў хлапчынкі, што трэба,
Зірнеш — ну як ёсць пастушок.
Пяньковай пашлёгвае пужкай
За вечар ён сам яе звіў...
Кукуе ў лесе кукушка,
Навокал звіняць салаўі.
Ды толькі лясное няяпіе
Марата не вабіць зусім:
Адказнае ў хлопца заданне —
Жыве піянер толькі ім.
Вёрст колькі адмераў хлапчына.
Тым часам і сонца ўзыйшло.
Прысеў пад кустом у лагчыне —
Напарадзе тое сяло.
«Засела там лютая зграя»,—
З агідай туды ён зірнуў
З'еў хлебца апошні акраец,
Крынічнай вадзіцы глынуў.
Падняўся... Да першае хаты
Сто крокаў, не болей хады,
Як голас пранікі, хрыпаты
Данёсся: «Гэй ты, ком сюды!»
Пачуўшы пядобрыя словы,
Марат нетаропка ідзе:
«Паночак, збладзіла карова...
Рабая... мо бачылі дзе?»...
«Карова, сказаў?!. Без
падманкі?! —
На хлопца глядзіць паліцай.—
Адкуль сам?..»
«Ды з вёскі Ветранкі!»
«З Ветранкі?!. Тады пачакай...»
І бобік прарэзліва свіснуў —
І ў момант з'явіўся другі.
З-пад броў-капшукоў ненавісна
Глядзелі не вочы — кругі.
«Ага! Мой знаёмы,— вачыма
Ён ледзьве Марата не еў.—
Чаму ж ты адсюль, лайдачына,
Не едзеш у свой Магілёў? —
І да паставога.— Страчаўся
Я з ім, жабраком, разоў пяць...»
«А мне ж пастухом ён назваўся...
З Ветранкі»... «З Ветранкі?!.
Узяць!
То ж там на начах партызаны.
Казалі, бываюць штораз...
Магчыма, і гэты засланы
Як шпік партызанскі да нас»...
«Дрэнь справа,— на сэрцы ў
Марата
Трывога і роспач нуда.—
Ды што б ні рабілі мне каты —
Не здраджу сваіх не прадам...»
Хадзіў камендант ганарыста,
Круціў у руцэ рэвальвер:
«Я знаю, ты сын камуніста

Помнік М. Казлову ў Быхаве.

Быховский районный историко-краеведческий музей

І сам камуніст... Піянер!..
Але мы не будзем пра тое...
Жыццё ты сваё зберажэш,—
І ў бок паказаў ён рукою,—
Туды нас, у лес, навядзеш...
Пакажаш стаянку бандытаў,
Не будзеш у жмуркі гуляць —
І станем з табою мы квіты:
Не будзем табе назаляць...»
«Дык вось вы чаго захацелі?! —
Падумаў Марат. — Дабракі!..
Ах, каб вы ўсе струпянелі
З шалёнае зграі ваўкі!»
Акружаны лютаю зграяй
Юнак паўтарае адно:
«Нікога, нічога не знаю,
І ў лесе не быў я даўно».
«Не знае?! Усыпляем — прыпомніць!
Пакласці на стол смаркача!»
Пад палкамі страціў
прытомнасць
Марат, ды ні слова... Маўчаў...
«З якога ён вырас насення?! —
Ад злосці фашыст аж шалеў,—
Прайшоў я дарог шмат ваенных,
А з гэткімі справы не меў».—
І кажа з павязкамі катам: —
«Што трэба — ад хлопца ўзяць!
Вы ж трэцяга рэйха салдаты
Павінны як след ваяваць!»...
Паклалі хланца на фурманку —
Звязаны, увесь у крыві...
Прывезлі яго пад Ветранку
Крычаць: «Ну, давай назаві
Па прозвішчу ўсіх партызанаў,
І колькі іх там? Ну, кажы!..»
З пагардай Марат на іх глянуў:
«Іх хоніць, каб вас падушыць!»
Што як адбывалася далей —
Дазналіся мы апасля...
Бярозы ў жалобе стаялі,
Страсаючы слёзы з галля.
На захадзе сумная тлела
Палоскаю вузкай зара,
Знайшлі мы Маратава цела
У канаве паблізу яра.
Крываваю плямаю зорка
Ірдзела на целе яго.
О, што вы, майстры
жывадзёрства.
Зрабілі? Спалі вас агонь!
Жывому навырвалі вочы,
Адрэзалі вушы і нос.
О, колькі пакутаў наш хлопчык
Нялюдскіх тады перанёс!
Не плакаў ніхто, хоць і ныла.
Палала душа, як агонь,
Калі апускалі ў магілу
Мы юнага сябра свайго.
З тых дат ён жыве ў народзе
Марат-патрыёт-партызан:
У разведку ў легендах ён
ходзіць»,—
Закончыў расказ ветэран...

«Памру камсамолкай...»

В. П. Самалётава.

Дзевятнаццаць гадоў споўнілася Веры Самалётавай, калі пачалася вайна, а яе родная вёска Сядзіч была занята ворагамі. Вера стала членам маладзёжнай патрыятычнай групы, а з лета 1942 г. — сувязной 425-га партызанскага атрада, затым палка. Па яе разведданых партызаны правялі некалькі баявых аперацый. Дзейнічала камсамолка ўмела і адважна. Рызыкуючы жыццём, яна прабіралася ў варожыя гарнізоны і выконвала самыя небяспечныя заданні. У лютым 1944 г. пры выкананні чарговага задання Веру схапілі гітлераўцы. Пасля жорсткіх допытаў і катаванняў, нічога не выведаўшы, фашысты ўтапілі Веру ў Дняпры.

Адважнай беларускай партызанцы Веры Паўлаўне Самалётавай паэт А. Гаджы-Касімаў прысвяціў паэму «Вера», урывак з якой друкуецца ніжэй.

...Февральские ветры в ледовые
латы
Сковали просторы земли.
В разорванном платье
фашистские гады
Ее на мороз увели.
От холода ежится фриц.
Замерзая,
Шинельный поднял воротник.
А Вера по снегу ступает босая,
В бедро упирается штык.
Кровь стынет и тело, как
камень,
Но девушку нет, не сломить!
Замерзшими еле ступая ногами,
Она продолжает твердить:
«Умру комсомолкой. Не выдам
вовеки.
Меня не страшит даже смерть.
Прекрасно родиться на свет
человеком,
Прекраснее — им умереть!»
Окончив над Верой ужасные
пытки,
Эсэсовец ей пригрозил:

Быховский районный историко-краеведческий музей

В. М. Куракіна.

«Подумай до завтра. Не
сделай ошибки.
А утром допрос повторим».
...Мороз в двадцать градусов —
это не шутка!
Февральская ночь на дворе.
И снежные ели стоят в полушубках,
И крыши в сплошном серебре.
Фашисты втолкнули прикладами
Веру
В сарай и захлопнули дверь.
А ветер холодный метался за
дверью,
Ревел, как разгневанный зверь...
Всю ночь простояла у стенки
сарая.
Но вот наступил и рассвет.
Фашисты ключами сарай
отпирая,
Гадали: «Жива или нет?»
Эсэсовец, молча войдя к
партизанке,
Застыл неподвижно в дверях:
— Ну, что ж, вот и утро.
Но я буду кратким:
Судьба твоя в наших руках.
Ну, где партизаны? Молчишь?
Пожалеешь
О том, что, как рыба молчишь...
Ну, хватит! Молчать ты, я вижу,
умеешь,
Тем лучше! Навек замолчишь!»
Застыли огромные белые льдины
Безмолвно над гладью реки.
На льду остановка. И вот из
кабины
Ступили на лед сапоги.
Эсэсовец что-то прокаркал
шоферу.
Минуту спустя, топором
Тот стал вырубать кругловатую
прорубь,
И лед зазвенел над Днепром.
Работа окончена. Прорубь
готова.
К ней Веру враги подвели.
И слова не дали,
последнего слова.
А солнце вставало вдали.
И крикнула Вера: «Вот солнце,
Вот солнце победы встает!..»
Толчок, и над Верой сомкнулись
днепровские воды,
Лизнув ослепительный лед.

ВАЛЯ КУРАКІНА

Были ребята солдатами...
Их называли орлятами
В годы последней войны.

Словы гэтага верша нібыта напісаны пра юную партызанку Валю Куракіну з в. Сарочыны і тых хлопчыкаў і дзяўчынак, што ў барацьбе з ворагам наравні з дарослымі пераносілі ўсе пакуты вайны. Валя Куракіна вучылася ў Макранскай сярэдняй школе, скончыла 7 класаў. Была вельмі жывой, таварыскай дзяўчынкай. У гады вайны яе бацька, Мікалай Паўлавіч Куракін, узначаліў 425-ы партызанскі атрад. 15-гадовая Валя разам з сям'ёй прыйшла ў партызаны ў 1942 годзе, стала ў атрадзе бацькі медсястрой. Партызаны любілі дзяўчыну за смеласць, ласкава называлі сястрычкай. Аднак Валя не толькі выходжвала сваіх параненых таварышаў, а ў патрэбны момант магла і абараніць бездапаможных у шпіталі. Трапна страляць яна навучылася яшчэ ў школе, у ваенна-стралковым гуртку.

У красавіку 1944 г. Валя захварэла на тыф. Вырашылі да выздараўлення схаваць яе ў в. Касічы. Неўзабаве ў вёску ўварваліся фашысты і схапілі хворую. «Партызанка!» — крычалі раз'юшаныя фашысты, знайшоўшы пад яе падушкай рэвальвер. Зусім слабую дзяўчынку завезлі ў магілёўскую турму і закатавалі.

...Прайшлі гады. Яе аднагодкі — ужо сталыя людзі. Аднак жыве ў сэрцах людскіх памяць аб слаўнай партызанцы. Яна, гэта памяць, у справах піянерскіх дружын і атрадаў, якім прысвоена імя піянеркі, у працоўных здабытках маракоў цеплахода «Валя Куракіна» ардэнаноснага Латвійскага параходства, у назве вуліцы ў нашым родным Быхаве.

Л. Рындзіна.

Загінаны навечна

17 чэрвеня 1941 г. Міша Кузьміноў, сакратар камсамольскай арганізацыі калгаса «Іскра», атрымаў табель паспяховасці. «Быць табе, Міша, паэтам!» — не аднойчы гаварыў настаўнік мовы і літаратуры Ц. Д. Прынц. Яму падабаліся шчырыя, з грамадзянскім пафасам вершы лепшага вучня ў класе. А праз пяць дзён пачалася вайна. Юнак ірваўся на фронт, але ў армію не бралі — не падыходзіў па ўзросту. З чэрвеня да 10 ліпеня сакратар камсамольскай арганізацыі разам з камсамольцамі роднай вёскі Іскань працаваў на будаўніцтве ўмацаванняў на беразе Дняпра.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Капаць акопы і траншэі, супрацьтанкавыя равы яшчэ неакрэплым юнакам было справай нялёгкай. Аднак ніхто не скардзіўся на цяжкасці, працавалі і пад кулямётным агнём варожых самалётаў. Вораг падыходзіў усё бліжэй і бліжэй — трэба было спяшацца. Ужо захоплены Быхаў, Новы Быхаў, Ніканавічы. 27 ліпеня ў Іскань уварваліся акупанты (чырвонаармейцы адступілі да в. Пахар). Цяпер лініяй фронту стала родная вёска, і гітлераўцы ўсё насельніцтва выгналі да Дняпра, у свой тыл. Вярнуліся ў вёску толькі праз месяц. Дзесьці далёка на ўсходзе чуліся глухія выбухі. «Збіраць зброю і патроны»,— вырашылі камсамольцы. Міша няспынна шукаў сувязей з партызанамі. Захавалася фатаграфія камсамольца з надпісам: «1942 год — год маіх вандраванняў па рускай зямлі, калі давялося перанесці шматлікія цяжкасці. 15 чэрвеня 1942 г.». У атрад Мішу не ўзялі — на месцах свае людзі патрэбны былі не менш, чым у лесе. І Міша Кузьміноў стаў партызанскім сувязным.

Летам 1943 г. налёты фашыстаў у вёску сталі пастаяннымі — хапалі моладзь і забіралі з сабой. Заставацца далей было небяспечна, і Міша пайшоў у атрад Р. А. Варажышчава, што размяшчаўся ў Хачыпскім лесе.

У кастрычніку 1943 г. групы і атрады, аб'яднаўшыся вакол партызанскага палка «Трынаццаць», вялі цяжкія кровапралітныя баі супраць адборных гітлераўскіх часцей. Гэтыя баі ўвайшлі ў гісторыю партызанскага руху як Боўкінская абарона.

— 10 кастрычніка мне запомнілася асабліва,— успамінае М. М. Семчанка, аднавясковец Мішы. Я ляжаў у акопе з ручным кулямётам. Разам са мной былі Міша Кузьміноў і яшчэ адзін партызан. Чакалі немцаў з боку Смаліцы. Пасля артабстрэлу немцы рушылі на нашы пазіцыі. Адкрываем агонь. Гітлераўцы залягли, а потым кінуліся на нашы акопы. Кузьміноў падняўся, каб кінуць гранату. Над галавой засвісталі кулі. «Кладзіся!» — крыкнуў я. Весці агонь з акопа было нязручна. Я падняўся і пачаў страчыць з кулямёта. І раптам па нагах штосьці ўдарыла. Разрыўная куля прабіла ногі. За кулямёт лёг Міша. Напэўна, я страціў на нейкі час прытомнасць, бо калі адкрыў вочы, у акопе нікога не было, ззаду адыходзілі двое. Я пачаў крычаць, што жывы. Не вярнуліся. Думаў: цяпер усё, кінулі аднаго. Адпак хутка Кузьміноў вярнуўся з некалькімі партызанамі і панеслі мяне па балоце.

Камсамольскі білет новага ўзору М. С. Кузьмінова, выдадзены Быхаўскім райкомам ЛКСМБ.

Параненага М. Семчанку Кузьміноў з таварышамі вынеслі з лесу і ноччу прынеслі ў в. Доўгае. Паколькі вяртацца ў блакіраваную зону не мела сэнсу, а сувязь з атрадам была страчана, Міхаіл вярнуўся дамоў. У канцы лістапада ў яго родную вёску ўвайшлі байцы Чырвонай Арміі і хлопец стаў чырвонаармейцам. І зноў яму давялося змагацца з ворагам у сваім родным раёне. Міхаіл у першых баях звярнуў на сябе ўвагу і заслужыў павагу франтавікоў. Шмат расказваў аб зверствах акупантаў, барацьбе партызан.

У баі пад в. Дабужа ён першы кінуўся ў атаку і быў цяжка паранены. Таварышы зрабілі ўсё, каб выратаваць баявога сябра, але раны былі смяртэльныя. 17 студзеня 1944 г. цела воіна прывезлі ў родную вёску. Узвод салдат і ваенны аркестр праводзілі яго ў апошні шлях.

За гэты подзвіг імя былога сакратара камсамольскай арганізацыі калгаса «Іскра» Міхаіла Кузьмінова занесена навечна ў спісы камсамольскай арганізацыі Быхаўскага раёна. На яго імя выпісаны камсамольскі білет, які перададзены на захаванне ў музей Ісканскай школы.

Аня і Сяргей

Быў ліпень 1941 года. Па шашы Магілёў — Гомель няспынна рухаліся калоны фашысцкіх танкаў і аўтамашын. І хоць вёска Старая Трасна размяшчалася далёка ад шашы, за лесам, але і сюды даносіўся гул, звінелі шыбы ў вокнах, паветра было насычана пахам гару.

Аднойчы ў поўдзень з-за аблокаў нечакана вынырнулі бамбардзіроўшчыкі з чырвонымі зоркамі на крылах і абрушылі бомбавы ўдар на шашу. Загарэліся танкі і аўтамашыны, узнік моцны пажар. Калі самалёты ляглі на зваротны курс, адзін з іх быў падбіты. Лётчык (ім быў Аркадзь Сяргеевіч Куракін) прызямліўся на парашуце ў лесе недалёка ад Старай Трасны. У яго былі перабіты ногі, ён страціў прытомнасць. Невядома, чым бы гэта скончылася, каб

Быховский районный историко-краеведческий музей

Г. К. Лёгкая.

С. Л. Пугачоў.

не жыхар вёскі Лазар Пугачоў, які знайшоў Куракіна ў лесе недалёка ад дарогі і схаваў у больш падзейным месцы. Дапамаглі яму яго пятнаццацігадовы сын Сяргей і суседская дзяўчынка Аня Лёгкая. Яны змайстравалі ў лясным гушчары невялікі будан і перанеслі туды лётчыка. Рызыкуючы жыццём (у вёсцы ўжо стаялі гітлераўцы), Сяргей і Аня штодня прабіраліся ў лес і прыносілі лётчыку ежу, рабілі перавязкі.

Праз тры месяцы, калі загаіліся раны, лётчык сардэчна развітаўся з юнымі патрыётамі і пайшоў на ўсход.

...Ранняй вясной 1942 г. да Дняпра падышла група партызан. Ім неабходна было пераправіцца на правы бераг ракі. Старшы групы, сакратар Чэрыкаўскага падпольнага райкома партыі Крамовіч, папрасіў Аню Лёгкую дастаць лодку. Гэта было цяжкае і небяспечнае даручэнне. Гітлераўцы адабралі ўсе перапраўныя сродкі і звезлі іх у Быхаў. Ускінуўшы невялікі клуначак на плечы, Аня пайшла ў горад. Днём разведала, дзе стаяць прывязаныя лодкі, і, як толькі сцямнела, пракралася да прыстані і нажом перарэзала вяроўкі. Лодкі, падхопленыя цячэннем, паплылі. У адной з іх, лёгшы на дно, плыла дзяўчына. За сваёй вёскай Старая Трасна дзяўчына вылавіла яшчэ дзве лодкі і прыгнала іх да берага. Заданне партызан было выканана.

На лодках, надзейна схаваных у зараснику вербалозу, Аня перавезла цераз Дняпро многіх партызанскіх разведчыкаў і падрыўшікоў з розных атрадаў Магілёўшчыны.

Неацэнную дапамогу аказалі Аня і Сяргей у канцы 1943 г. партызанскаму палку «Трынаццаць». Прарваўшы кальцо нарожай блакады ў прыфрантавой палосе, полк пайшоў на захад. Трэба было за адну ноч фарсіраваць Дняпро. Камандзір палка Грышын паслаў да ракі Фёдара Раннёва з групай партызан, каб падрыхтаваць пераправу. Партызаны звярнуліся за дапамогай да Ані і Сяргея, і яны выручылі народных мсціўцаў. Разведаўшы падыходы да ракі і выбраўшы месца для пераправы, яны прыгналі лодкі, амаль усю ноч перавозілі партызан і ўзбраенне на правы бераг Дняпра. За здзейснены подзвіг Аня і Сяргей былі ўзнагароджаны баявымі медалямі «За адвагу».

У летку 1944 года, калі была ўжо вызвалена родная вёска Старая Трасна, над ёю аднойчы нізка праляцеў наш штурмавік і скінуў на зямлю вымпел. У ім была запіска Сяргею і Ані ад выратаванага імі ў пачатку вайны лётчыка...

Г. Е. Барысаў.

Саша Салянін: партызан і матрос

З успамінаў П. Р. Бажэнава, былога партызана 1-й Быхаўскай партызанскай брыгады

У чэрвені 1942 г. наш партызанскі лагер размяшчаўся каля вёскі Дабужа. Аднойчы з заставы каля Гарбатага моста дазорныя прывялі чарнявага хлопца год шаснаццаці. Быў ён у пашарпаным паліто, з якога даўно вырас, у кароткіх штанах і кірзавых ботах. На плячах вісеў нямецкі аўтамат, на рамяні два падсумкі з патронамі, з кішэні тырчала рукаятка гранаты. Гэта нас зацікавіла.

— Ты хто такі? — спытаў яго камандзір атрада Памятнёў.

— Саша Салянін... з Вейна...

— Ну, а чаго прыйшоў?

— Дык... кругом фашысты... вось прыйшоў... абмяняцца думкамі, як жыць далей,— прамовіў хлопец.

Мы не ўтрымаліся ад смеху.

— Абмяняцца думкамі, гаворыш? — Памятнёў узяў Сашу за плечы.— І, мяркуючы па тваёй экіпіроўцы, нашы думкі, мне здаецца, супадаюць?..

...На вайне мужнеюць хутка. Праз тры месяцы Саша Салянін ужо быў кулямётчыкам. У вераснёўскіх баях з карнікамі ён разам з кулямётным разлікам Паўла Завалішына вёў бой на трылесінскім могільніку. Тры гадзіны яны стрымлівалі націск карнікаў з боку вёскі Красніцы. Толькі расстраляўшы ўсе патроны, кулямётчыкі адышлі па балоце ў лес. Потым быў прарыў блакады і рэйд атрада ў Клятнянскія лясы на Браншчыне. Не раз Саша Салянін трапляў, здавалася б, у бязвыхаднае становішча, але адвага і кемлівасць выратоўвалі партызана.

...Сцюдзёная марозная раніца 1943 года. Чацвёра партызан — Шчалкупоў, Гарчакоў, Жыткоў

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

і Салянін — ідуць на заданне. На ўскрайку лесу прытулілася невялікая вёсачка, да якой вяла надзейная вузкакалейка. У вёсцы заўсёды знаходзіўся пост суседняй брыгады, і партызаны смела ішлі па вузкакалейцы. Калі падышлі да крайніх хат, заўважылі вялікую групу людзей у маскхалатах. Гэта былі фашысты. Разведчыкі кінуліся назад. Саша бег па чыгуначным палатне, астатнія — па глыбокім снезе. Фашысты адкрылі агонь, білі па нагах, каб параніць і ўзяць у палон. Саша ўжо быў у некалькіх кроках ад драўлянага мосціка, за якім пачынаўся лес, як з-пад яго выскачылі два нямецкія аўтаматчыкі. І адразу чарга ва ўпор. Кулі прасвісталі каля твару. Саша ўпаў і прыкінуўся забітым. Да яго падышоў фашыст, паклаў на снег аўтамат і пачаў здымаць з «забітага» партызана валёнкі. І раптам атрымаў удар нагамі ў жывот і паляцеў з насыпу. Саша імгненна схапіў варожы аўтамат і кароткай чаргой «прашыў» гітлераўца, а сам кінуўся ў лес...

Узрыў моста быў апошняй аперацыяй, у якой я ўдзельнічаў разам са знаходлівым юнаком. Пад моцным агнём варожых кулямётаў партызаны ўварваліся на насып. Сярод першых быў і семнаццацігадовы кулямётчык Саша Салянін. Закідаўшы бункеры і дзоты гранатамі, партызаны замініравалі мост. Праз некаторы час ён узляцеў у паветра.

Потым нашы партызанскія шляхі разышліся, і я да канца вайны не ведаў пра лёс адважнага беларускага камсамольца.

Восенню 1945 г. да мяне на кватэру ў Маскве зайшоў рослы шыракаплечы марак з ордэнскай планкай на грудзях і з перавязанай рукой. Пакуль я напружваў памяць, дзе бачыў гэтага чалавека, марак прагудзеў басам: «Вось прыйшоў... абмяняцца думкамі... як жыць далей...»

Гэта быў Саша Салянін! Узмужнелы, амаль удвая шырэй і вышэй таго юнака, якога я памятаў. Пасля злучэння з часцямі Чырвонай Арміі ў канцы 1943 г. Саша трапіў на Чарнаморскі флот, ваяваў на мінаносным катэры. А калі той быў патоплены, Саша пайшоў у марскую пяхоту. І амаль год цяжкіх баёў, хвацкіх матроскіх атак. Апошні раз Саша біўся з фашыстамі на Дунаі. У час начнога пошуку «языка» на нейкае імгненне апярэдзіў Сашу і разрадзіў у яго аўтамат. Маракі вынеслі да сваіх беспрытомнага сябра і здалі ў медсанбат. Пачаліся доўгія вандраванні па шпіталях. Раны зажылі, а з рукой справы абстаялі горш — кулі раздрабілі косць ад пляча да локця. Рука пасля лячэння стала карацей.

А. І. Салянін.

В. Рудкоўскі.

Некалькі дзён спатрэбілася на ўспаміны пра партызанскае жыццё, загінуўшых сяброў у той першы Сашын прыезд.

...Ідзе час. Усё менш і менш застаецца баявых сяброў. І ўсё болей хвалююся, калі чую ў тэлефоннай трубцы родны голас з Магілёва і словы: «Трэба... абмяняцца думкамі...».

Юныя героі

Колькі іх было на той вайне, хлопчыкаў і дзяўчынак, піянераў і зусім юных камсамольцаў, што нароўні з дарослымі пераносілі цяжар ваенных будняў. Разведчыкаў, сувязных, падрыўнікоў... Сваімі гераічнымі дзеяннямі, адвагай і мужнасцю яны выклікалі павагу і любоў старэйшых таварышаў.

...У Віці Рудкоўскага маці была партызанскай сувязной. Паліцаі схапілі яе ў Быхаве, дзе яна выконвала заданне. Маці расстралялі, а хату спалілі. Віця прыйшоў у 425-ы партызанскі полк. Стаў разведчыкам. Яго адразу палюбілі партызаны за смеласць і знаходлівасць. Віця бездакорна выконваў баявыя заданні. У 1944 г. юны разведчык загінуў у няроўнам баі з гітлераўцамі. Пахаваны В. Рудкоўскі ў в. Замошша Быхаўскага раёна, на магіле пастаўлены абеліск.

...Да вайны Лёня Бегуноў скончыў тры класы Быхаўскай сярэдняй школы № 3. У перыяд акупацыі ўся іх сям'я падтрымлівала сувязь з партызанамі. У верасні 1943 года гітлераўцы расстралялі брата Лёні Валодзю, а ў кастрычніку схапілі і расстралялі бацьку. Лёня разам са старэйшым братам Васілём пайшоў у партызаны, стаў разведчыкам 11-й Быхаўскай брыгады. Удзельнічаў у баях, праяўляў кемлівасць і адвагу ў разведцы.

У лютым 1944 невялікая група разведчыкаў наскочыла на засаду. Варожая куля трапіла хлопчыку ў нагу, зачапіла косць. Лёня ўпаў тварам на пачырванелы ад крыві снег. Ён яшчэ чуў, як да яго наблізіліся гітлераўцы і нехта з іх прамовіў: «Кіндэр капут», а потым хлопец страціў прытомнасць. Праз некалькі гадзін яго падабралі

Быховский районный историко-краеведческий музей

Н. Ц. Гадунцова-Рубцова.

Б. Кільчыцкі.

баявыя таварышы. Лёня доўга лячыўся ў партызанскім шпіталі. Цяжка яму было пасля вайны, але ён не здаваўся. Каб не быць абузай для маці, на руках якой заставаліся меншыя дзеці, хлопец едзе ў Караганду. Там ён вучыцца ў вячэрняй школе, працуе на шахце. Лёня скончыў завочна Днепрапятроўскі горны інстытут, стаў інжынерам...

Піянерка Наташа Гадунцова ў вайну была сувязной Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы. Кемлівая дзяўчына дзейнічала заўсёды рашуча і смела. У час баявой аперацыі па разгрому гарнізона на станцыі вызначылася і Наташа. Праз чыгуначны пераезд, які пільна ахоўваўся, ёй неабходна было пранесці баявы загад групе Федзячэнкі. Дзяўчыне параілі перабінтаваць нагу і схаваць ў бінце загад. Але яна запярэчыла: «Бінт мяне адразу выдасць». Узяла хлебны мякіш, загарнула ў яго загад, потым прыляпіла да нагі і завязала брудной анучай. Партызаны ёй не пярэчылі, іх здзівіла разваглівасць і жыццёвая знаходлівасць юнай сувязной. З вялікай трывогай усе чакалі ўмоўнага сігналу — гарматнага стрэлу. І ўздыхнулі з палёгкай, калі пачулі яго. Загад быў атрыманы. Наташа была ўзнагароджана медалямі «За адвагу» і «Партызану Айчыннай вайны» II ступені. Ёй прысвяціла верш паэтэса Раіса Баравікова.

...Наташа, Наташа... Была сувязною,
Усяму навучыла вайна.
У атрадзе яе называлі дачкою
— Наташа, дачушка, дачка..
І недзе цяпер, калі водар духмяны
Узяў у абдымкі зямлю,
Успомняць Наташу сябры-партызаны:
Дачку, сувязную сваю.

...Піянер Барыс Кільчыцкі з Быхава амаль цэлы год быў сувязным 425-га партызанскага палка. Перадаў шмат вінтовак, гранат, патронаў. Выконваў адказныя заданні па разведцы абстаноўкі на чыгуначнай станцыі, у бліжэйшых вёсках. Калі ж хлопец пачынаў прасіцца ў атрад, яму адказвалі: «Рана. У Быхаве ты патрэбней. Ды і маленькі яшчэ, кволы. «Карандаш», адным словам». Мянушка Карандаш так і прыліпла да хлопца. Аднойчы піянера напаткала бяда. Перадаўшы чарговае данясенне, ён вяртаўся ў Быхаў. Каля вёскі Язвы яго схапілі карнікі. Жорстка збілі і кінулі ў хлеў. Ноччу ўдалося падкапацца пад сцяну і ўцячы. На досвітку хлопец дабраўся да Быхава. Доўга хварэў. Ачуняўшы, пайшоў у лес. Адмовіць яму на гэты раз не маглі. Так з верасня 1943 па май 1944 Барыс Кільчыцкі быў разведчыкам 425-га палка. Вельмі чакаў сустрэчы з Чырвонай Арміяй. Але з-за хваробы яго адправілі на Вялікую зямлю. Пасля папраўкі спрабаваў уцячы на фронт. Вярнулі ў дзіцячы дом. Потым было чыгуначнае вучылішча ў Мінску, работа на вагонарамонтным заводзе, Мінскай дыстанцыі грамадзянскіх збудаванняў... Барыс Давыдавіч Кільчыцкі залічаны ў атрад беларускіх арлянят.

Слова аб медыках

З успамінаў Ф. В. Гусева, былога начальніка медыцынскай службы Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы

У пачатку 1943 г. ў самых буйных партызанскіх атрадах 810-м і 425-м, якія дзейнічалі на прыбарэжжы Быхаўшчыны, было ўсяго па два медработнікі. Ні адзін з іх не меў хірургічнай падрыхтоўкі. Медыкаментамі забяспечваліся ў асноўным толькі праз сувязных. Не было медыцынскіх халатаў, ручнікоў. У такіх умовах медработнікі рабілі амаль немагчымае, выратоўваючы жыццё параненых і хворых партызан.

Пасля аб'яднання атрадаў у 11-ю Быхаўскую партызанскую брыгаду пачалі папаўняцца рады партызанскіх медыкаў. А ў канцы 1943 г. ў Быхаўскай ВАГ было дзевяць медыцынскіх і чатыры ветэрынарныя ўрачы, дзевятнаццаць фельчараў, два фармацэўты, трыццаць восем медыцынскіх сясцёр і санітарак. Гэта дало магчымасць арганізаваць санітарную службу ў атрадах, рыхтаваць на месцы санітараў, аказваць партызанам больш кваліфікаваную дапамогу. Праўда, наша работа ўскладнялася тым, што не было медыцынскай літаратуры.

Першая дапамога, як правіла, аказвалася на полі бою ротным фельчарам або санінструктарам з абавязковай праверкай параненага на каманд-

Быховский районный историко-краеведческий музей

ным пункце ўрачом атрада або палка. Калі ў баявых аперацыях удзельнічалі ўсе часці і атрады, разам з імі ішоў увесь склад медработнікаў. Дапамога аказвалася і непасрэдна ў час бою, на падводах або ў бліжэйшых сялянскіх хатах.

Гарачы бой быў каля в. Студзёнкі. Некалькі партызан тады загінулі і больш дзесяці былі паранены. У цяжкім стане санітары даставілі ў в. Барсукі байца Яндоўскага. Адна куля прабіла яму руку, другая раструшчыла нагу. Марудзіць нельга было — пачыналася гангрэна. У вясковай хаце на ссунутых сталах тэрмінова пачалі аперацыю. Нагу ампутавалі, а руку ўдалося зберагчы.

Быў і такі выпадак. Атрады Вараб'ёва, Бархозава і Кісялёва арганізавалі засаду на Хаміцкім шляху. У разгар бою асколак снарада трапіў у жывот былому лётчыку партызану Барабанаву. Праведзеная ў палявых умовах аперацыя была паспяховай. Нам з фельчарам Пахомавай удалося раздабыць хірургічны набор, што дазволіла рабіць складаныя хірургічныя аперацыі.

Вядома, спецыяльнай аперацыйнай у нас не было. Звычайна ёю служыла зямлянка санчасці партызанскага атрада, а то і фурманка пад адкрытым небам. У нас амаль не было магчымасці эвакуіраваць параненых, таму лячылі іх у партызанскіх лагерах.

Лічылі мы сваім абавязкам і аказанне дапамогі насельніцтву. За кожным атрадам былі замацаваны вёскі, куды рэгулярна выязджалі або знаходзіліся там нашы медыцынскія работнікі. Асаблівы клопат аб грамадзянскім насельніцтве праяўлялі начальнік санслужбы 810-га партызанскага палка Собалева, урач Карап, медыцынскія сёстры Мяцеліца, Ягоранкава, Пахомава, Бабылёва, урачы 152-га партызанскага палка Жалудкова, Міронаў, Клепча, Сіненка і іншыя. Па іх

Ф. В. Гусеў.

Н. М. Лабенская.

ініцыятыве былі пабудаваны лазні, ізалятары. Партызаны 152-га палка спрабавалі наладзіць выраб мыла. Аднак з-за адсутнасці каўстычнай соды вымушаны былі спыніць яго. Усе мы актыўна выступалі ў «баявых лістках» з артыкуламі пра інфекцыйныя захворванні і меры барацьбы з імі.

Баявыя аперацыі, частыя маршы, працяглыя пераходы, адсутнасць мыла, бялізны, добрага абутку — усё гэта рабіла нашу работу ў шмат разоў цяжэйшай, патрабавала фізічнай загартоўкі, вытрымкі, нечалавечых намаганняў. А сярод медыцынскіх работнікаў большасць складалі жанчыны... Усе яны без выключэння — героі, моцныя духам, міласэрныя, мужныя. Собалева, Жалудкова, Пахомава, Ясінецкая, Паддубская і многія іншыя за сваю нястомную, гераічную працу ўзнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі.

Выпрабаванне

З баявой характарыстыкі Надзеі Міхайлаўны Лабенскай, медыцынскай сястры атрада імя В. І. Чапаева злучэння двойчы Героя Савецкага Саюза А. Ф. Фёдарава

«...У партызанскім атрадзе з ліпеня 1942 года. За час знаходжання ў партызанскім атрадзе тав. Лабенская Н. М. праявіла сябе смелай і дысцыплінаванай, вынослівай партызанкай. Удзельнічала ў баявых паходах атрада супраць нямецкіх акупантаў. Тав. Лабенская Н. М. праяўляла выключныя клопаты па аказанню медыцынскай дапамогі параненым і хворым партызанам. За адвагу і мужнасць у барацьбе з ворагамі Савецкага Саюза тав. Лабенская Н. М. прадстаўлена да ўрадавай узнагароды...

Камандзір атрада Кудзінаў

22.04.44 г.»

Усё, аб чым сказана ў скупых словах характарыстыкі, было пазней. А тады, пахмурным вераснёўскім днём 1941 г. Надзя Лабенская і Люда Біткоўская былі сведкамі, як па вуліцы роднай Ветранкі паліцаі вялі затрыманага акружэнца. Сяброўкі пераглянуліся: «Пагубяць хлопца. Трэба ратаваць».

...Задума ўдалася, і Надзя прывяла ў хату да свякрухі Эміліі Адамаўны пастаяльца. «Прабач, мама, але інакш я паступіць не магла»,— глядзела ў вочы жанчыне Надзя. І тая згадзілася, мо таксама ўявіла, што і яе сын, баец Чырвонай Арміі, мог трапіць у такое ж становішча.

Хутка іх пастаялец, палітрук Я. С. Арцёменка, былы партыйны работнік, праз Надзю і Люду пазнаёміўся з мясцовымі патрыётамі Юрыем Мурашовым, Фёдарам Парыцкім, Сяргеем Горбачам, а праз іх звязаўся з Якавам Курпачэнкам.

Быховский районный историко-краеведческий музей

У пачатку вясны 1942 г. пайшлі чуткі, што ў лясах з'явіліся партызаны. Гэта пачаў дзейнічаць атрад Якава Аксёнавіча Курпачэнкі, касцяк якога склалі акружэнцы і ваеннапалонныя, якія зімой 1941 г. знаходзіліся ў Ветранцы і навакольных вёсках. Акупантам кінулася ў вочы і знікненне пастаяльца Лабенскіх. Надзю схапілі і некалькі дзён трымалі пад арыштам. Але прамых доказаў аб сувязі яе з партызанамі ў ворага не было. Надзея вярнулася дамоў. Аднак на волі прабыла пядоўга. Неяк з партызанскага атрада Курпачэнкі прыйшоў сувязны з просьбай ад камандавання даставіць медыкаменты. Раздабыўшы іх, Надзя на світанні выбралася з Ветранкі і накіравалася ў лес. За паваротам стаяла разбітая машына. «Нашэўна хлопцы папрацавалі», — толькі паспела падумаць жанчына, як з засады выскачылі фашысты і паліцаі.

— Рукі ўгару!

Упаўшы нібы з перапуду, Надзя паспела сунуць у снег вузельчык з медыкаментамі. У руцэ застаўся толькі клуначак з бялізнай.

— Партызанская сволач! — пачалі тузаць за каўнер Лабенскую.

Надзя паказала пропуск, але гэта не дапамагло. Яе арыштавалі і адправілі ў быхаўскую турму. Пачаліся допыты. Фашысты падсадзілі ў камеру правакатара, які выдаваў сябе за камандзіра Чырвонай Арміі. Ён упэўніваў, што ёсць магчымасць уцячы, але не ведае, як знайсці дарогі да партызан. Надзя маўчала. Неўзабаве патрыётку перавялі ў магілёўскую турму. Не знайшоўшы ніякіх доказаў, фашысты выпусцілі яе.

Ветранка сустрэла яе нязвыклай цішынёй — усё дарослае насельніцтва пайшло ў партызаны. Трэцяга ліпеня 1942 г. прыйшла ў партызанскі лагер і Надзя. Партызанскі доктар Юрый Мурашоў залячыў ёй раны, якія засталіся пасля жорсткіх катаванняў. Потым Надзя сама лячыла хворых і параненых партызан.

Пасля прарыву блакады восенню 1942 г. партызаны адышлі на Браншчыну. Там Надзея Лабенская ваявала ў атрадзе імя Чапаева да злучэння з часцямі Чырвонай Арміі. *А. Гарошка.*

Гэтага — не забыць

Настассі Мікітаўне Дзегцяровай выпаў суровы, незвычайны лёс. У гады ваеннай навалы вынослівасці 19-гадовай медыцынскай сястры (і адначасова ўрача, санітаркі) мог пазайздросціць любы партызан у атрадзе. А натхнёны паэт пакланіўся б міласэрнасці і душэўнай прыгажосці жанчыны-партызанкі (у канцы вайны ёй давялося стаць яшчэ і разведчыцай).

Не абыходзілі яе цяжкасці і пасля вайны. У напружаныя гады аднаўлення была старшынёй калгаса, узначальвала сельскі Савет. Палепшала жыццё, сталі загойвацца ваенныя раны, зноў вярнулася да адвечна жаночага абавязку — лячыць людзей. І перш-наперш міласэрнасцю, чуйнасцю, добрым словам...

З успамінаў былой партызанкі Быхаўскай ВАГ, удзельніцы партызанскага парада ў Мінску Н. М. Дзегцяровай

На другі дзень вайны разам з маленькім сынам стала прабірацца з Мінска, дзе служыў муж, у свой родны Гарадзец. Чыгунку моцна бамбілі, і дабіраліся ў асноўным пешшу.

Непазнавальнай, вымерлай стаяла родная вёска. Акупанты шукалі камуністаў, актывістаўкалгаснікаў і бязлітасна распраўляліся з імі, рабавалі насельніцтва. Аднак рэпрэсіі не запалохалі, не патушылі нашай любві да Савецкай Радзімы. Вясковыя камсамольцы і чырвонаармейцы-акружэнцы тайком збіраліся ў хаце Яфрэмавых, раіліся, як змагацца далей, як дапамагчы Чырвонай Арміі. Мы ад рукі пісалі лістоўкі-заклікі і расклейвалі іх на вясковых калодзежах. Узімку 1941 г. ў гэтай хаце я пазнаёмілася з І. Я. Трылеснікам, а напрадвесні з кіраўніком патрыятычнай групы Ф. Ф. Сухавым. Па іх прапанове стала партызанам-медыкам 425-га атрада. Байцоў у атрадзе было яшчэ няшмат, а жанчыны толькі тры — Зіберава, Тарасава і я. З сваімі абавязкамі спраўлялася (да вайны скончыла Быхаўскую медыцынскую школу).

Першы бой, у якім прыняла ўдзел, быў у вёсцы Кучына. Грамілі карны атрад наш 425-ы пад камандаваннем Куракіна і 255-ы атрад Марусава. Вораг тады не шкадаваў боепрыпасаў, упарта біўся з упэўненасцю, што мы не вытрымаем і адступім. Але перамога засталася за намі. На месцы бою вораг пакінуў шмат забітых. Былі страты і ў нас. Загінуў душэўны чалавек, храбры воін Ілья Яўменавіч Трылеснік. Ад ран на маіх руках памёр камсамолец Іван Коласаў. Цяжкія раны атрымалі партызаны з атрада Марусава Іван Рудкоўскі, Сямён Хамельянскі і яшчэ два хлопцы (прозвішчаў іх не памятаю). Я клапатліва выходжвала гэтых параненых — былі яны першымі ў маёй медыцынскай практыцы і таму вельмі дарагімі. З цягам часу яны ўсе паправі-ліся і сталі ў строй. Пасля гэтага Міхаіл Кузьміч Марусаў угаварыў мяне перайсці ў іх атрад — партызаны рыхтаваліся да рэйду.

Працуючы медыкам, хадзіла, як і ўсе партызаны, на баявыя заданні. Запомніўся разгром буйных гарнізонаў у вёсках Гадзілавічы і Рэкта. Пасля цяжкага бою ў Гадзілавічах з групай партызан прыкрывала адыход асноўных сіл атрада.

Найвялікшым выпрабаваннем нашых фізічных і маральных сіл былі варожыя блакады партызанскіх зон. Тады, каб збіць ворага са следу, даводзілася са шпіталем бязліч разоў перапраўляцца цераз рэчкі, паўзці па балотнай жыжы,

Бабовічскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

суткамі ісці, перамагаючы сябе, па калючых снежных сумётах. Сэрца заходзілася, гледзячы на страшэнныя пакуты партызан. Перавязкі ім рабіла пад адкрытым небам, гнойныя раны прамывала настоем, які сама гатавала з бярозавых і альховых пупышак, разнастайных траў. Пасля аднаго з такіх бясконцых, пакутлівых вандраванняў папрасіла камандзіра атрада пакінуць хворых і параненых на балоце каля вёсак Хрэлеў і Зеляніца. У гэтым было адзінае выратаванне маіх падапечных. На балотнай выспе па загаду камандзіра партызаны выкапалі тры зямлянкі. У дапамогу далі дзяўчыну Жэню, пакінулі запас харчоў. З лютага па красавік увесь шпіталь знаходзіўся на нашых руках. Многія параненыя ўжо сталі папраўляцца, як над намі навісла страшэнная небяспека. Недзе ў канцы красавіка прыбег сувязны з вёскі і паведаміў, што акупанты рыхтуюцца напасці на наш шпіталь. Мы, не марудзячы ні мінуты, адразу перанеслі параненых у другое месца. Затрымайся мы крыху, і ўсё б скончылася трагічна — праз паўгадзіны фашысты закідалі гранатамі пустыя зямлянкі шпіталя.

Давялося мне паваяваць у партызанскай разведцы. У час адной баявой аперацыі мяне параніла і кантузіла. Трое сутак не ведала, дзе знаходжуся. Пасля папраўкі зноў ваявала, аж да

Н. М. Дзегцярова.

злучэння атрада з часцямі Чырвонай Арміі. Мне пашчасціла быць удзельніцай партызанскага парада ў Мінску. Гэты векапомны дзень ніколі не забудзецца.

Вярнуўшыся ў родную вёску, сустрэлася з мамай і сынком. Якая гэта была радасць! Яны перанеслі безліч цяжкіх пакут за час акупацыі. Вёску спалілі фашысты, і яны, не маючы прытулку, галадалі. Штодзень над імі вісела смерць. Але ўсё можна перанесці і сцярпець, калі ёсць вера ў перамогу, агульначалавечую справядлівасць.

Партызанскія часопісы

Былы рэдактар падпольнай раённай газеты «Партизан Быховщины» М. П. Куракін успамінаў, што ў палках ваенна-аператыўнай групы выдаваліся рукапісныя часопісы. Аб якім пісалі яны ў той грозны час? Дзе і як выдаваліся, хто іх рэдагаваў? Пачаўся пошук партызанскіх выданняў. Праходзілі тыдні, месяцы. І вось першая знаходка: у жыхара Бабруйска, былога сакратара партбюро 810-га партызанскага палка М. М. Балыкіна захаваўся другі нумар часопіса «Партизан Быховщины», выдадзены ў кастрычніку 1943 г. На 68 старонках машынапіснага тэксту змешчана дваццаць тры матэрыялы. Сярод іх артыкул памочніка камісара па камсамолу Пятра Дамброўскага «25 год Ленінскага камсамола», карэспандэнцыі партызан Антоненкі, Радчыкава, Шарсцінава, замалёўка Баркова. Цікавы літаратурны раздзел часопіса, які адкрывае верш народнага паэта рэспублікі Якуба Коласа «Заняволенай Беларусі». Далей ідзе падборка твораў партызана Міхаіла Мельнікава. Яго верш «Уставай, беларускі народ!» страсна клікаў на барацьбу супраць фашысцкіх прыгнятальнікаў. Змешчаны таксама верш Гулянкова, балада Лўтушкова, паэма Сібрына, партызанскія песні. Партызан Лысоў праілюстраваў часопіс малюнкамі, карыкатурамі, застаўкамі. Вось толькі адзін малюнак: хлопчык канваіруе ў лес трох фашыстаў, а ніжэй подпіс:

— Откуда, парнишка?
— Из деревни вестимо.
Крестьяне их ловят,
А я отвожу...

Рэдагаваў часопіс М. Баркоў, мастацкім афармліцелем быў партызан Старавойтаў. Часопіс выдаваўся непасрэдна ў партызанскім лагеры.

Хацелася, аднак, даведацца і пра першы нумар часопіса, калі ён выйшаў. Як склаўся далейшы лёс ваенкораў часопіса? Гутаркі з былымі партызанамі, пісьмы ў розныя куткі краіны прынеслі свой плён. Сярод шэрагу адказаў быў і самы доўгачаканы — ад былога рэдактара часопіса камісара 1-га батальёна М. М. Баркова, які настаўнічаў у Буда-Кашалёве. Мікалай Мікітавіч пісаў: «...Першы нумар часопіса выйшаў у жніўні 1943 г. ў чатырох экземплярах. Напісаны ён быў ад рукі. У ім змяшчаліся апавяданні партызан аб баявых дзеяннях і іншыя матэрыялы. Якая была радасць, калі пры разгроме нямецкага гарнізона нашы партызаны захапілі машынку з рускім шрыфтам. Цяпер можна было павялічыць тыраж часопіса. Выросла яго папулярнасць, пашырыўся актыў ваенкораў. Нам прыносілі свае артыкулы камандзіры, палітработ-

Быховский районный историко-краеведческий музей

Тытульны ліст рукапіснага часопіса «Партизан Быховщины».

нікі, радавыя партызаны, а таксама насельніцтва. Часопіс разыходзіўся па ротах. У перапынках паміж баямі партызаны чыталі артыкулы і вершы сваіх таварышаў, падказвалі, якім павінен быць наступны нумар. Калі яны ішлі на баявое заданне, то бралі з сабой часопіс. У вёсках партызаны праводзілі мітынгі і чыталі часопіс. Асобныя экземпляры яго пакідалі сувязным для работы сярод насельніцтва...».

Затым прыйшло пісьмо і ад У. С. Лысова — былога камандзіра аддзялення, мастака рукапіснага партызанскага часопіса. Ён расказаў, што многія карыкатуры маляваў амаль з натуры. Напрыклад, мастак сам быў сведкай, як піянер канваіраваў у партызанскі лагер трох фашыстаў, якіх абяззброілі сяляне. Пасля злучэння партызан з часцямі Чырвонай Арміі Лысоў да самай пенсіі працаваў шахцёрам у Данбасе.

Адгукнуўся з Калінінграда і намеснік рэдактара часопіса партызанскі паэт М. С. Мельнікаў, чые вершы і да гэтага часу памятаюць былыя партызаны. Былі ў пісьме такія радкі: «Ваша пісьмо прынесла мне нямала хвалюючых мінут — і радасных, і горкіх: вайна ёсць вайна. І ведаем мы яе не з кніг. І вось яна, нечаканая сустрэча з мінулым — далёкім, цяжкім, гераічным. Скрыгат падарваных рэек, кулямётны пошчак, а з сэрца рвуцца радкі: «Народ замучаны, уставай!» Так, пісаў я тады многа. Шкада, што безнадзейна загінуў мой партызанскі сшытак, а ў ім было добрых пяць-шэсць дзесяткаў вершаў, напісаных сэрцам і крывёю...».

Міхаіл Самуйлавіч на ўсё жыццё застаўся верным журналістыцы.

Прыйшла вестка з Пяцігорска і ад С. Р. Старавойтава, мастацкага афарміцеля часопіса.

«...Калі атрымаў пісьмо,— піша ён,— жонка і ўнучка былі здзіўлены маім хваляваннем. А як жа было не хвалявацца! Упершыню пасля столькіх гадоў на мяне зноў павеяла беларускім лесам. А колькі радасці прынесла мне фотакопія тытульнай старонкі часопіса «Партизан Быховщины». Уяўляеце, што такое ўбачыць плён сваіх рук праз многа гадоў? Так, друк саслужыў важную ролю ў развіцці партызанскага руху ў прыдняпроўскіх лясах...» *Г. Е. Барысаў.*

Перад вызваленнем

З успамінаў У. П. Апенкі, былога палітрука роты 425-га партызанскага палка Быхаўскай ВАГ, жыхара Днепрапятроўска

Спецыяльнай дырэктывай ЦК КП(б)Б перад партызанамі была пастаўлена задача выратаваць беларускі народ ад знішчэння і вывазу ў Германію, не дазволіць адступаючаму ворагу нішчыць народнае дабро. Менавіта з выкананнем гэтай задачы і былі звязаны баявыя дзеянні 425-га палка ў канцы 1943— лютым 1944 г.

Аднойчы разведка данесла, што на станцыю Тошчыца павінен прыбыць эшалон з падмацаваннем мясцоваму гарнізону для правядзення карпай аперацыі ў в. Дзедава. Перад партызанамі была пастаўлена задача «асядлаць» дарогу на Дзедава і знішчыць карнікаў. Нашай 1-й роце трэба было захапіць чыгуначны пераезд.

Да вызначанага месца прыйшлі ў тры гадзіны ночы. Заляглі ланцугом і да самага світання чакалі карнікаў. Але яны чамусьці не з'явіліся. Тады мы самі пайшлі насустрач ворагу. На

Быховский районный историко-краеведческий музей

ўзгорку перад пераездам гітлераўцы пабудавалі дзот. З яго амбразур былі добра бачны ўсе падыходы да чыгункі.

...З лесу выйшлі трое. Наперадзе мужчына нёс кошык, за ім ішла жанчына з «дзіцём» на руках. За імі ішла яшчэ адна жанчына. Такую карціну ўбачылі са свайго сховішча гітлераўцы. Мы ж ведалі, што ў першага пераапранутага партызана ў кошыку ляжалі гранаты, другі, у жаночым адзенні, трымаў у руках аўтамат, захутаны ў коўдру. Трэці таксама быў узброены партызан. Дарога ішла ўздоўж дзота. Наблізіўшыся да яго, партызаны прапанавалі фашыстам яйкі і пачулі каманду падысці бліжэй. Гэтага толькі і чакалі партызаны — кулі адразу скасілі двух гітлераўцаў, адначасова ў дзот паляцелі гранаты. Пераезд быў захоплены...

Аперацыя па разгрому гарнізона ў в. Лапша. Атрад выйшаў на шырокую лясную прасеку, якую называлі «партызанскім праспектам». Хутка мы дайшлі да в. Гамарня. З камандзірам 1-га батальёна П. М. Цагельнікавым спыніліся на панялішчы маёй роднай хаты. Гітлераўцы не толькі спалілі дом і ўсе гаспадарчыя пабудовы, але і высеклі сад. Цудам уцалела толькі адно дрэва.

У. П. Апенка.

Калі сцямнела, партызаны ланцугом наблізіліся да в. Лапша. Гітлераўцаў засталі знянацку, з хат яны выскоквалі ў адной бялізне. Але на вуліцы паратунку ім таксама не было. Гарнізон быў разгромлены. На базу мы вярталіся з багатымі трафеямі.

З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ЗА 25 ЛІСТАПАДА 1943 г.

На днях наши войска, расположенные в районе Пропойска, перешли в наступление против немецко-фашистских войск. Успешно форсировав реки Сож и Проня, наши войска за три дня упорных боев прорвали сильно укрепленную оборонительную полосу противника протяжением по фронту 60 километров и, продвинувшись вперед от 18 до 45 километров, овладели районным центром Могилевской области городом Пропойск, районными центрами Гомельской области городом Корма, Журавичи, а также заняли более 180 других населенных пунктов; среди них крупные населенные пункты Узгорск, Улуки, Рабовичи, Железинка, Шеломы, Васьковичи, Ржавка, Гайшин, Безуевичи, Тереховка, Черняковка, Славня, Хлебно, Золотомино, Косель, Салабута, Рудня, Литвиновичи, Зятковичи, Роги, Перегон, Ректа, Старый Быч, Новый Быч, Старая Алешня, Новая Алешня, Добрый Дуб, Большая Зимница, Драгунск, Хатовня, Полянинович, Искань, Селец-Холопеев, Обидовичи, Веть.

Сообщения Советского Информбюро. М., 1944. Т. 5. С. 257.

З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ЗА 6 СТУДЗЕНЯ 1944 г.

Западнее Пропойска наш лыжный батальон скрытно проник в тыл противника и форсировал реку Днепр. Советские лыжники внезапно ворвались в деревню, в которой находился штаб немецкой пехотной дивизии. Смелой атакой наши бойцы уничтожили охрану и много штабных офицеров. Разгромив штаб и захватив пленных, в том числе несколько немецких офицеров, лыжники благополучно вернулись в свою часть[1].

Сообщения Советского Информбюро. М., 1944. Т. 6. С. 11.

З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ЗА 24 ЛЮТАГА 1944 г.

На днях войска Первого Белорусского фронта перешли в наступление против немецко-фашистских войск, расположенных в районе Рогачева. Успешно форсировав реку Днепр,

---

[1] Апісаныя падзеі адбыліся ў в. Прыбар Быхаўскага раёна. Аб гэтым баі расказана ў артыкуле «Подзвіг Алёшы Загрышава».

Быховский районный историко-краеведческий музей

наши войска прорвали сильно укрепленную оборону противника на фронте 50 километров, за три дня напряженных боев продвинулись вперед на 20—25 километров и 24 февраля штурмом овладели городом и крупной железнодорожной станцией Рогачев — важным опорным пунктом противника на Бобруйском направлении, а также с боями заняли более 100 других населенных пунктов, в том числе крупные населенные пункты Новый Быхов, Лазаревичи, Виляховка, Верхняя и Нижняя Тощица, Кистени, Вищин, Дедово, Еленово, Мадоры, Селец, Старое Село, Озеране, Большая и Малая Коноплица, Заборово, Турск, Ходосовичи, Цупер, Луговая Варня, Колыбовка и железнодорожную станцию Тощица. Нашими войсками полностью ликвидирован важный плацдарм немцев на левом берегу Днепра, восточнее Рогачева и Жлобина.

Сообщения Советского Информбюро. М., 1944. Т. 6. С. 97.

З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ЗА 27 ЧЭРВЕНЯ 1944 г.

На Могилевском направлении наши войска, преследуя противника, повсеместно вышли к восточному берегу реки Днепр на участке Орша, Могилев, Быхов, освободив при этом более 300 населенных пунктов, среди которых крупные населенные пункты Зубова, Копысь, Никитиничи, Ржавцы, Заречье, Луполово, Сидоровичи, Следюки и железнодорожные станции Зубры, Дары, Луполово. Наши войска форсировали реку Днепр севернее и южнее города Могилев, перерезали железную дорогу Орша — Могилев и завязали уличные бои в городе Могилев.

З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ЗА 28 ЧЭРВЕНЯ 1944 г.

Войска 2-го Белорусского фронта, форсировав реку Днепр на участке протяжением в 120 км, прорвали вторую оборонительную полосу немцев, подготовленную ими по западному берегу реки, и штурмом овладели крупным областным центром Белоруссии — городом Могилев, а также с боями заняли районные центры Могилевской области город Шклов, город Быхов и более 450 других населенных пунктов, среди которых крупные населенные пункты Полкниженье, Уланово, Черное, Черноручье, Дубровка, Браково, Сеньково, Голынец 1-й и 2-й, Новая и Старая Лежневки, Бовшев, Липовка, Ходутичи, Мокрое и железнодорожные станции Копысь, Шклов, Лотва, Полыковские хутора, Буйничи, Дашковка, Барсуки, Борколабово, Ямница, Быхов.

З АПЕРАТЫЎНАЙ ЗВОДКІ ЗА 29 ЧЭРВЕНЯ 1944 г.

К западу от города Могилев наши войска, преследуя отступающего противника, продвинулись вперед до 35 километров и заняли более 500 населенных пунктов, среди которых районный центр Могилевской области город Белыничи, крупные населенные пункты Тетерин, Головчин, Олешковичи, Осовец, Калиновка, Техтин, Большие Белевичи, Количенко, Золотва, Городец, Долгое и железнодорожные станции Вендриж, Семуковичи. На ряде участков наши войска форсировали реку Друть.

Сообщения Советского Информбюро. М., 1945. Т. 7. С. 12—17.

Вызваление

З успамінаў генерал-маёра ў адстаўцы У. А. Куўшыннікава, былога начальніка штаба 80-га стралковага корпуса

Раніцай 25 лістапада 1943 г. 80-ы корпус 3-й арміі, якім камандаваў генерал-маёр Іван Лявонавіч Рагуля, разгарнуў баявыя дзеянні за вызваленне Быхаўскага раёна. На Палянінавічы і Сялец наступала 283-я Чырванасцяжная стралковая дывізія пад камандаваннем палкоўніка В. А. Канавалава. К вечару таго ж дня 858-ы стралковы полк падпалкоўніка А. М. Карабейнікава авалодаў Сяльцом і перарэзаў шашу Магілёў — Гомель. На поўдзень ад Абідавіч да шашы выходзіў 860-ы стралковы полк маёра А. С. Нябайкіна. Зламаўшы супраціўленне ворага каля Хатоўні, у раён в. Вець набліжаліся часці 17-й стралковай дывізіі палкоўніка Раманенкі. 362-я Чырванасцяжная

Быховский районный историко-краеведческий музей

стралковая дывізія генерал-маёра В. Н. Далматава развівала наступленне на Хачынку і Бахань, прыкрываючы правы фланг корпуса ад удару праціўніка з поўначы.

Разведчыкі 283-й дывізіі невялікімі групамі на лодках пераправіліся на процілеглы бераг Дняпра. Група на чале з начальнікам разведкі 858-га палка капітанам В. П. Баранавым дасягнула в. Адаменка, разведчыкі Іваноў, Асін, Мяркулаў і іншыя на чале з сяржантам Малявіным правялі разведку ў пасёлку Леніна і каля Тайманава. Сіл і сродкаў для фарсіравання Дняпра корпус тады не меў, ды і абставіны патрабавалі хутка замацавацца на адбітай у ворага тэрыторыі. Раніцай наступнага дня разведчыкаў давялося вярнуць. Байцам групы Малявіна дапамагаў жыхар Сяльца Трафім Федарэнка. Ён усю ноч быў з імі, а потым на сваёй лодцы перавёз іх назад на ўсходні бераг.

На наступны дзень войскі корпуса авалодалі рубяжом Палянінавічы — Сялец — Абідавічы — Вець. Гэта вельмі занепакоіла фашысцкае камандаванне, і яно ўзмацніла націск, каб вярнуць шашу і аднавіць сувязь сваіх раз'яднаных груповак. 283-я дывізія пры падтрымцы артылерыі ўвесь дзень 25 лістапада адбівала контратакі пяхоты і танкаў праціўніка. Рашуча дзейнічала разведрота старшага лейтэнанта П. Запарожца. На шашы на поўдзень ад в. Сялец гітлераўцы спрабавалі акружыць нашу групу на чале з камандзірам дывізіі, якая вырвалася ўперад. Але ў час падаспеў узвод разведкі, якім камандаваў Р. К. Берсянёў. Разведчыкі хутка ацанілі абстаноўку і атакавалі ворага. Р. К. Берсянёў быў паранены ў галаву, але працягваў кіраваць боем. Праціўнік панёс страты і быў адкінуты.

Цяжкі бой ішоў у гэты дзень у раёне Сяльца. На адным з участкаў гітлераўцам удалося прарвацца да агнявой пазіцыі мінамётнай роты Пятра Вінічэнкі. Калі скончыліся міны, камандзір роты павёў за сабой байцоў у рукапашны бой. Вораг быў адкінуты, але адважны камандзір загінуў. П. Дз. Вінічэнку пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

17-я стралковая дывізія ўзяла Вець і адбівала атакі ворага з поўдня. К вечару стала ўскладняцца становішча 283-й дывізіі. У 19 гадзін гітлераўцы абрушылі на Сялец і раён на поўдзень ад яго ўраганны кулямётны і артылерыйска-мінамётны агонь, а потым перайшлі ў контратаку. Нашы падраздзяленні вымушаны былі пакінуць вёску і замацаваліся на паўднёвым беразе ракі Баброўка.

Раніцай 26 лістапада вораг пераўзыходзячымі сіламі двойчы атакаваў 858-ы стралковы полк. Першую атаку ўдалося адбіць, пасля другой нашы байцы адышлі на 5—6 кіламетраў і замацаваліся. Вялікі арганізатарскі талент і волю праявілі камандзір палка А. М. Карабейнікаў і яго памочнік па палітычнай частцы маёр С. Г. Семянюк.

У. А. Куўшыннікаў.

Яны зрабілі ўсё, каб ва ўзаемадзеянні з 856-м стралковым палком утрымаць рубеж Палянінавічы — Пагоркі — Кашалёўка.

860-му палку і часцям 17-й стралковай дывізіі пры падтрымцы карпусной артылерыі ўдалося ўтрымаць Абідавічы. На працягу дня было адбіта пяць контратак праціўніка. Выключны гераізм праявілі нашы воіны. Шквал агню абрушылі на ворага мінамётчыкі. Асабліва храбра дзейнічаў разлік камсамольца Івана Занькіна. Разлік сяржанта Ягора Папова выкаціў гармату на адкрытую пазіцыю і прамой наводкай знішчыў станковы, два ручныя кулямёты і каля 15 варожых салдат. Бранябойшчыкі ўзвода супрацьтанкавых ружжаў Іван Караткоў і Дзмітрый Леўчанка падбілі па танку. Разлік 45-мм гарматы сяржанта Васіля Палтарабаткі сваім агнём адсек варожую пяхоту ад танкаў. Кулямётны разлік Віктара Абрамава знішчыў 17 фашыстаў. Камандзір аддзялення камуніст Канстанцін Смірноў пры артылерыйскім налёце ворага сваім целам прыкрыў камандзіра ўзвода. Сам быў паранены, але выратаваў камандзіра. Бранябойшчык Мікалай Іваноў пад агнём ворага вынес з поля бою цяжка параненага камандзіра ўзвода лейтэнанта Банчанку. Санітар камуніст Уладзімір Цыганкоў на працягу дня вынес з поля бою 18 параненых салдат і афіцэраў. Ездавы Віктар Круцікаў пад агнём праціўніка ўвесь дзень бесперапынна дастаўляў боепрыпасы на агнявыя пазіцыі разлікаў. Тэлефаніст камсамолец Аляксей Васенка ў складаных умовах падтрымліваў бесперапынную сувязь. Ён быў паранены, але не пакінуў поля бою, пакуль не былі адбіты варожыя атакі.

Падраздзяленні палка за дзень знішчылі каля 200 варожых салдат і афіцэраў, падбілі і спалілі 4 танкі і самаходныя гарматы. Шаша засталася за намі. Рух ворага на поўдзень і на поўнач па ёй быў спынены.

Войскі 3-й арміі ў гэты час працягвалі наступаць на Доўск і ў пачатку снежня выйшлі да Дняпра на ўчастку ад Сяльца да Гадзілавіч. На ўсход ад Быхава войскі 50-й арміі на сваім

Быховский государственный историко-краеведческий музей

левым флангу авалодалі Боўкамі, Смаліцай, але далей прайсці наперад не змаглі.

Наступіў 1944 год. У пачатку студзеня дывізіі нашага корпуса зноў перайшлі ў наступленне і выбілі часці 267-й пяхотнай дывізіі ворага з вёсак Ніканавічы, Усохі, Сялец, Палкі. У цэнтры корпуса наступала 362-я Чырванасцяжная стралковая дывізія генерала Далматава. Нашы войскі яшчэ бліжэй падышлі да Быхава, аднак на рубяжы Прыбар — лес на поўнач ад Ніканавіч былі спынены. Для гітлераўцаў Быхаў як вузел дарог быў вельмі важным. Вялікае значэнне мела і пераправа, наведзеная імі на поўнач ад Прыбара для сувязі з усходнім берагам.

У пачатку лютага наш корпус перадаў участак Ніканавічы — Сялец войскам 50-й арміі, а сам у складзе 5-й і 283-й дывізій перадыслацыраваўся ў раён на захад ад Доўска. У сярэдзіне лютага мы пачалі рыхтавацца да прарыву абароны ворага на заходнім беразе Дняпра. 186-й стралковай дывізіі было загадана абараняць рубеж Шапчыцы і далей на поўнач па беразе Дняпра, а 283-й і 5-й дывізіям — прарваць абарону ворага на поўнач ад Кісцянёў у напрамку Тошчыцы.

У ноч на 21 лютага войскі занялі зыходнае становішча для наступлення. На світанні пачалася артылерыйская падрыхтоўка, а потым байцы пайшлі ў атаку. Першымі ў варожыя траншэі на заходнім беразе Дняпра ўварваліся сяржант Васіль Жарыкаў, малодшыя сяржанты Іван Стаўцаў і Аляксандр Азнобін, салдат Сямён Прохараў і многія іншыя. Пачатак прарыву быў паспяховым. Развіваючы наступленне ўздоўж Дняпра на поўнач, часці 283-й дывізіі на захад ад Залаззя разгромілі штаб нямецкага 45-га пяхотнага палка. Але ўжо ў в. Ніжняя Тошчыца ім давялося адбіваць моцныя контратакі 267-й нямецкай пяхотнай дывізіі з танкамі і ўдар авіяцыі, якая рабіла палёты групамі да 25 бамбардзіроўшчыкаў. У тым баі ўзвод супрацьтанкавых ружжаў, якім камандаваў Герой Савецкага Саюза старшы сяржант Чамадураў, падбіў танк і знішчыў 25 варожых салдат. Вялікія страты праціўніку нанеслі сваім агнём разлікі другой кулямётнай роты 860-га стралковага палка старшых сяржантаў Фёдара Пятровіча і Маскута Юнасава. Камандзір палка падпалкоўнік А. М. Карабейнікаў некалькі разоў сам вадзіў байцоў у атаку і быў паранены. І ўсё ж полк у той дзень вымушаны быў адысці ад Ніжняй Тошчыцы. Яна была занята намі толькі на другі дзень. У гэтым баі загінуў выключна храбры воін камуніст сяржант Жукіман Максімаў.

5-я дывізія пад камандаваннем палкоўніка Міхаліцына ў першы дзень уклінілася ў абарону ворага на глыбіню да 5 км і выбіла яго з вёсак Бальшавік, Ліпа. 283-я дывізія авалодала моцным вузлом праціўніка — вышынёй у раёне Віляхаўкі. У 7 гадзін раніцы 24 лютага 856-ы стралковы полк 283-й дывізіі ва ўзаемадзеянні з суседам справа выбіў ворага з Новага Быхава і, развіваючы наступленне на поўнач, да 16 гадзін дасягнуў ручая каля вёскі Адаменка. 860-ы

Ветэраны 283-й стралковай дывізіі. Сядзіць у цэнтры камандзір дывізіі генерал-маёр В. А. Канавалаў

Быховский районный историко-краеведческий музей

стралковы полк у гэты дзень вызваліў ад ворага Верхнюю Тошчыцу. У ліку першых у вёску ўварваліся малодшы сяржант Ягор Назалаў і салдат Міхаіл Гладкоў. Ў разрыў паміж дывізіямі першага эшалона ў напрамку Ліпа — Чырвоны Бераг камандзір корпуса генерал І. Л. Рагуля ўвёў другі эшалон — 186-ю стралковую дывізію генерал-маёра Равуненкава. Рота капітана Палякова з 290-га стралковага палка скрытна выйшла на ўсход ад Тошчыцы, выбіла праціўніка з занятай ім пазіцыі і пайшла ўперад. Капітан Палякоў загінуў смерцю героя ў гэтым баі. Камандзір трэцяй стралковай роты гэтага ж палка афіцэр Карнееў, паранены, на працягу некалькіх гадзін працягваў кіраваць боем. Санітарка Паддубава вынесла з поля бою 12 раненых. Пад Чырвоным Берагам 186-я дывізія напаткала моцныя контратакі гітлераўцаў. Часці злучэння па глыбокім снезе сталі абыходзіць вёску з захаду і ўсходу. Пасля цяжкага бою яны ва ўзаемадзеянні з 860-м стралковым палком 25 лютага авалодалі вёскай, а 858-ы полк у начным баі вызваліў ад гітлераўцаў в. Істопкі. У гэтых баях нашы воіны праявілі масавы гераізм. Смела, рашуча кіраваў боем камандзір першай роты 238-га стралковага палка капітан Бабылёў, ён загінуў у гэтым баі. Малодшы сяржант Самсонаў першы кінуўся ў атаку. Ён забіў 8 фашыстаў, але і сам быў цяжка паранены. Храбры камандзір капітан Казлоў з невялікай групай байцоў кінуўся да аднаго з крайніх дамоў, дзе заселі аўтаматчыкі. Фашыстаў выбілі, але Казлоў загінуў. Радавы пятай роты 290-га стралковага палка Кісялёў паўзком дабраўся да кулямётнага гнязда і ў рукапашным баі знішчыў кулямётчыкаў. Камандзір аддзялення Гацеміраў закідаў гранатамі бліндаж, уварваўся ў траншэю і забіў трох гітлераўцаў. Такіх гераічных дзеянняў было мноства.

Невыпадкова так упарта і жорстка супраціўляўся вораг. Наступленне 80-га стралковага корпуса на поўнач і асноўных сіл 3-й арміі ў напрамку Рагачова пагражала выхадам у глыбокі тыл магілёўскай групоўкі ворага, асноўныя сілы якой усё яшчэ займалі абарону на левым беразе Дняпра за 50 км на ўсход ад Магілёва. Фашысты сцягвалі ў міжрэчча Дняпра і Друці пяхоту, танкі, артылерыю.

40-ы стралковы корпус 24 лютага выйшаў да ракі Друць і адваяваў невялікі плацдарм на яе заходнім беразе ў раёне Вялікіх Канапліц. Часці 41-га стралковага корпуса ў гэты дзень вызвалілі Рагачоў. 80-ы стралковы корпус працягваў наступаць у паўночным і паўночна-заходнім напрамках. 28 і 29 лютага часці 186-й дывізіі падышлі да Гуты Раманяцкай. У баях за вёску вялікую мужнасць праявілі воіны 4-й роты 298-га стралковага палка капітана Прыходзькі. Рота прыняла на сябе асноўны ўдар контратакі і адбіла яе. Страты ворага толькі забітымі склалі больш за 100 чалавек. Моцнае супраціўленне сустрэлі часці 5-й дывізіі ў раёне в. Хамічы. У ходзе баёў суадносіны сіл рэзка змяніліся на карысць ворага. На рубяжы Камарычы — Гута — Хамічы і далей па рацэ Друць актыўныя дзеянні сталі заціхаць. Толькі рэдкая агнявая перастрэлка парушала спакой. Лінія фронту нібы застыла да лета.

Надышоў чэрвень. Перад світаннем 24 чэрвеня войскі корпуса пачалі наступленне. 858-ы полк 283-й стралковай дывізіі атакаваў Хамічы. 5-я і 186-я дывізіі ўдарылі на Ліпкі, Будаўку, Нямкі. Да 13 гадзін яны прарвалі пазіцыі ворага на глыбіню 5 кіламетраў. 858-ы полк захапіў вёску, забяспечыў наступленне дывізіі на поўдзень, але поўнасцю авалодаць вузлом абароны яму не ўдалося. З 15 гадзін і да канца дня ён адбіваў моцныя контратакі нямецкай пяхоты і танкаў. На галоўным напрамку 5-я і 186-я дывізіі, ламаючы жорсткае супраціўленне ворага, да канца дня прарвалі яго абарону. Гэта дало магчымасць выйсці на фланг і ў тыл праціўніка як у паўночным, так і ў паўднёвым напрамку.

Каб не дапусціць 80-ы корпус на шашу Магілёў — Бабруйск, праціўнік перакінуў з Быхава часці 267-й пяхотнай дывізіі і мотапяхоту з танкамі. Чырвонаармейцы тут за дзень адбілі 25 контратак. Спробы нашай 283-й дывізіі авалодаць трэцяй траншэяй ворага перад лесам на поўнач ад Хамічоў былі беспаспяховыя. 26 чэрвеня на напрамку галоўнага ўдару корпуса з'явіліся часці 707-й нямецкай пяхотнай дывізіі, якія прыбылі з раёна Быхава. Аднак нашы злучэнні адстаялі рубеж, забяспечылі наступленне галоўных сіл арміі. А 27 чэрвеня часці нашага корпуса нанеслі ўдар уздоўж заходняга берага Друці на поўнач і захапілі дарогі на Быхаў, Чыгірынку, Перунова. Дывізія палкоўніка Міхаліцына вызваліла вёскі Шмакі, Чырвоны Прыбар, Чыгірынку. 186-я дывізія падышла да Падлужжа і перарэзала шашу. 28 чэрвеня дывізія генерала Равуненкава пасля чатырохгадзіннага напружанага бою штурмам авалодала вёскай Чачэвічы і пераправамі на Друці. У раёне на ўсход ад Чыгірынкі і Чачэвіч абходным манеўрам быў завершаны разгром 164-га пяхотнага і 157-га артылерыйскага палкоў 57-й нямецкай дывізіі. Гітлераўцы пакінулі на агнявых пазіцыях і на дарогах 35 гармат розных калібраў, цягачы, павозкі, іншы ваенны рыштунак. Нашы часці захапілі там 220 артылерыйскіх коней. З поўдня, у напрамку Уюна, пачала наступленне 283-я дывізія. 362-я, 324-я і 110-я стралковыя дывізіі 50-й арміі вызвалілі ад ворага Быхаў і паўночную частку раёна. Войскі 2-га Беларускага фронту ў гэты дзень занялі Магілёў. Быхаўская групоўка ворага пачала ў паніцы адкочвацца на паўночны захад, але ўцякаць ёй ужо не было куды.

80-ы стралковы корпус, часова пакінуўшы ў раёне Чачэвіч 186-ю стралковую дывізію, раніцай

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

29 чэрвеня аспоўнымі сіламі рушыў на захад. 2 ліпеня ён быў ужо ў раёне Чэрвеня.

З успамінаў палкоўніка ў адстаўцы І. А. Ціханава, былога начальніка аператыўнага аддзялення штаба 269-й стралковай дывізіі

Злучэнні 3-й арміі ў канцы лістапада і пачатку снежня 1943 г. ўвайшлі ў межы Быхаўскага раёна, вызвалілі вёскі Абідавічы, Вець, перарэзалі шашу Магілёў — Доўск і выйшлі на ўсходні бераг Дняпра.

Праціўнік у міжрэччы Ухлясці, Баброўкі і Трасны ў раёне вёсак Ліпаўка, Чырвоная Слабада, Ніканавічы, Усохі, Прыбар, Сялец утрымліваў плацдарм на ўсходнім беразе Дняпра. На працягу снежня вёскі Чырвоная Слабада, Палкі, Ніканавічы, Усохі былі ператвораны акупантамі ў апорныя пункты кругавой абароны. Асабліва былі ўмацаваны Чырвоная Слабада і Палкі, размешчаныя на пярэднім краі іх абароны. На ўсходняй ускраіне в. Палкі вораг пабудаваў драўляна-земляную агароджу, за якой размяшчаліся гарматы і кулямёты. На пярэднім краі праціўнік меў суцэльную траншэю поўнага профілю, абсталяваную кулямётнымі пляцоўкамі і бліндажамі. Месцамі перад пярэднім краем былі драцяныя загароды і мінныя палі. Населеныя пункты, узлескі, вышыні, усе натуральна-зручныя рубяжы мясцовасці да самага Дняпра былі таксама прыстасаваны да абароны. На плацдарме абаранялася 267-я пяхотная дывізія і іншыя часці праціўніка.

У канцы снежня камандуючы 3-й арміяй генерал А. В. Гарбатаў прыняў рашэнне нанесці ўдар у міжрэччы Ухлясці, Трасны, Баброўкі, збіць праціўніка з рубяжа (вёскі Ліпаўка, Чырвоная Слабада, Палкі, Сялец), авалодаць яго плацдармам і выйсці на ўсходні бераг Дняпра ад вусця Ухлясці і далей на поўдзень.

Разам з іншымі злучэннямі 3-й арміі 269-я стралковая дывізія пад камандаваннем палкоўніка А. Ф. Кубасава (пасля вайны генерал-лэйтэнант у адстаўцы), узмоцненая 36-м танкавым палком і прыдадзенай артылерыяй, атрымала задачу: к раніцы 4.1.1944 г. прарваць абарону праціўніка на рубяжы на поўнач ад в. Забродзе, на ўсход ад узлесся каля в. Палкі. Наступаць у напрамку в. Старая Трасна, знішчыўшы праціўніка на яго пярэднім краі і ў апорных пунктах, перарэзаць шашэйную дарогу Магілёў — Доўск і да зыходу дня 5 студзеня выйсці на ўсходні бераг Дняпра на рубеж вёсак Прыбар, Старая Трасна і на поўдзень ад іх. 4 студзеня ў 7 гадзін раніцы 269-я стралковая дывізія заняла зыходнае становішча для наступлення: 1020-ы стралковы полк на поўнач і поўдзень ад в. Забродзе, 1022-і стралковы полк па заходнім ускрайку в. Тараськаўка, 1018-ы стралковы полк у якасці танкавага дэсанта ў в. Ліпавіца, у раёне зыходнага становішча 36-га танкавага палка. Лыжны батальён на паўднёвы захад ад в. Малыя Боркі прыкрываў правы фланг 1020-га палка і стык з 362-й дывізіяй. Артылерыя папярэдадні заняла агнявыя пазіцыі: 68 гармат на агнявых пазіцыях для вядзення агню прамой наводкай, 20 гармат дывізіённай артылерыі і батарэя мінамётаў для вядзення агню з закрытых агнявых пазіцый.

Артылерыйская падрыхтоўка пачалася ў 8 гадзін 30 мінут. Удар быў магутны і нечаканы. Пад прыкрыццём артылерыйскага агню пяхота падышла ўшчыльную да траншэй праціўніка, і, як толькі агонь быў перанесены ў глыбіню яго абароны, у паветры з'явіліся чырвоныя ракеты — сігнал для атакі. Па ўсім фронце наступлення дывізіі грымнула «ура!».

Услед за пяхотай у наступленне перайшлі танкі, падаўляючы агнявыя кропкі ворага. Праціўнік пачаў адыход, адстрэльваючыся на вышынях і зручных рубяжах для абароны.

1020-ы полк пад камандаваннем падпалкоўніка І. Т. Кірычэнкі ва ўзаемадзеянні з лыжным батальёнам авалодаў апорным пунктам праціўніка Усохі і злучыўся ў гэтым раёне з танкамі, перарэзаў дарогу Магілёў — Доўск у трох кіламетрах на паўднёвы захад ад Ніканавіч. У ходзе прарыву і наступлення вызначыліся 6-я і 7-я стралковыя роты камуністаў старшых лейтэнантаў Сцерлічава і Чарнова.

1022-і полк пад камандаваннем падпалкоўніка Н. І. Круглякова прарваў абарону праціўніка на захад ад Тараськаўкі. Батальёны палка, узаемадзейнічаючы з 2-м батальёнам 1018-га палка пад камандаваннем старшага лейтэнанта Дз. Н. Карлука, пасаджаным дэсантам на танкі, абышлі апорны пункт Палкі з паўночнага захаду і штурмам авалодалі вёскамі Гаёўка, Крапіва і вышынямі на паўночным захадзе ад іх. На поўдзень ад Усохаў праціўнік аказаў агнявое супраціўленне, але стрымаць моцнага і арганізаванага ўдару пяхоты і танкаў не змог. Праследуючы ворага, нашы байцы перарэзалі шашу Магілёў — Доўск на захад ад Усохаў.

У баях 4 студзеня вызначыліся многія воіны палка. Уменне камандаваць ротай у складанай сітуацыі паказаў камандзір 1-й роты капітан Малхасян. Памочнік камандзіра ўзвода гэтай роты старшына Гардзееў агнём з аўтамата знішчыў 10 гітлераўцаў. Пасля ранення Малхасяна ён прыняў камандаванне ротай на сябе. Радавы Валянцін Ардашоў з ручным кулямётам першы ўварваўся ў траншэі праціўніка і знішчыў трох фашыстаў, двух узяў у палон. Мужна дзейнічаў удзельнік Сталінградскай бітвы, пяць разоў паранены ў баях камуніст старшы лейтэнант Швыроў. Паранены і ў гэтым баі, ён не пакінуў поля бою. Рота пад яго камандаваннем знішчыла шмат ворагаў, 20 салдат і афіцэраў узяла ў палон.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Смела змагаўся з ворагам герой баёў за Арол Мухутдзін Умурдзінаў.

1018-ы полк пад камандаваннем падпалкоўніка В. Н. Бічана ва ўзаемадзеянні з 1022-м палком атакаваў апорны пункт праціўніка Палкі. Вораг шалёна супраціўляўся. Аднак у 12 гадзін дня, панёсшы вялікія страты, спыніў супраціўленне. Падраздзяленні 1018-га палка, развіваючы наступленне, перарэзалі шашэйную дарогу Магілёў — Доўск на поўнач ад Сяльца.

Паспяхова рашаў свае задачы на правым флангу наступлення дывізіі лыжны батальён пад камандаваннем капітана Е. Е. Фёдарава. Імклівым ударам батальён выбіў праціўніка з вёсак Смалькоўка і Падгор'е. Не вытрымаўшы ўдару батальёна, праціўнік падпаліў некалькі дамоў у в. Ніканавічы і адышоў у лес. Да гадзіны ночы 5 студзеня Ніканавічы былі поўнасцю ачышчаны ад ворага. Батальён выйшаў на шашу Магілёў — Доўск і замацаваўся фронтам на паўднёвы захад ад вёскі.

У баях за гэтыя населеныя пункты вызначыліся камандзіры ўзводаў малодшыя лейтэнанты Шышкін, Белавусаў, радавыя Галееў, Гайдараў, Новікаў, Тамілін, сяржант Кірэеў. Умела кіруючы боем, праявіў адвагу камандзір 2-й лыжнай роты старшы лейтэнант Кузьмін.

Ноччу 5 студзеня дывізія зламала супраціўленне гітлераўцаў у лясах паміж Дняпром і шашэйнай дарогай і выйшла на ўсходні бераг Дняпра. Заданне камандавання 3-й арміі было выканана. У выніку двухдзённых баёў у праціўніка было захоплена 17 гармат розных калібраў, 4 буйнакаліберныя кулямёты, 21 станковы і 36 ручных кулямётаў, 65 аўтаматаў, 225 вінтовак, 8 мінамётаў і многа іншага ваеннага рыштунку, было знішчана 480 салдат і афіцэраў, 37 узята ў палон. Баявы шлях 269-й стралковай дывізіі працягваўся.

З успамінаў П. Н. Шлеянкова, былога камандзіра мінамётнага разліку ў лыжным батальёне 269-й стралковай дывізіі, настаўніка Чарнаборскай сярэдняй школы Быхаўскага раёна

...Пасля прарыву нямецкай абароны я ішоў на лыжах упередзе разліку. Раптам ззаду пачуў выбух. Гэта ўзарвалася закладзеная ўвосень міна. У мяне, як камандзіра разліку, была лёгкая зброя, наводчык ішоў другім (у яго была бусоль — таксама лёгкая), а трэці, зараджальшчык, пёс ствол мінамёта і націснуў на снег мацней. Загінулі наводчык, зараджальшчык і падносчык плиты, а падносчык мін быў паранены і адпраўлены ў шпіталь. Усе хлопцы разліку ведалі хатнія адрасы адзін аднаго, каб напісаць дамоў у выпадку якога-небудзь здарэння з сябрам.

Падносчык мін Мікалай Судзілоўскі трапіў у шпіталь, які знаходзіўся ў Касцюковічах. Крыху ачуняўшы, напісаў маці пісьмо аб маёй смерці.

І. А. Ціханаў.

На шчасце, мая маці працлакала тады толькі адзін дзень, а вечарам палтальёнка прынесла маё пісьмо. Па даце пісьма ўсёй вёскай рашылі, што я жывы. Наступныя мае пісьмы канчаткова пацвердзілі гэту думку. А мяне пасля таго прызначылі камандзірам аддзялення аўтаматчыкаў у першую роту старшага лейтэнанта Кананенкава. Мы ўдзельнічалі ў баях за вёскі Ніканавічы, Прыбар. У Прыбары, як даведаліся пазней, размяшчаўся буйны нямецкі штаб. Вакол вёскі былі створаны магутныя ўмацаванні, паміж дрэвамі спіраллю наматаны калючы дрот. Ён амаль не бачны быў з-пад снегу, тым больш уначы. Лыжнікі нашага аўтаматнага ўзвода незнарок і наскочылі на спіраль. Лыжы заблыталіся ў дроце і іх цельга было выслабаніць. Давялося залегчы і прыняць бой, фашысты нас заўважылі і асвяцілі наваколле ракетамі. На шчасце, перада мною аказалася таўшчэзная, у два абхваты сасна. Яна, як добрая сястра, прыкрыла і выратавала мяне ад варожых куляў. Усю ноч наш лыжны батальён вёў бой, а над раніцу нас змянілі стралковыя часці. За тыя баі я быў узнагароджаны медалём «За адвагу».

...Прайшлі гады. І вось аднойчы, ужо ў наш мірны час, на піларраму ў вёску Чорны Бор прывезлі сасновыя бярвенні на распілоўку. Радаваліся будаўнікі, што будуць добрыя дошкі. Запусцілі раму, і праз метр — паўтара пачуўся лязг жалеза, і дзве пілы лопнулі, як струны. Пачулася лаянка піларамшчыкаў. Я ў гэты час праходзіў недалёка і спытаў, у чым справа.

— Ды вось чортавы калодкі рвуць ужо чацвёртую пілу,— адказалі рабочыя.

— А адкуль лес? — пытаю.

— З Прыбарскага лясніцтва,— адказаў прараб саўгаса, які тут прысутнічаў.

— Тады ўсё зразумела! Адпілуйце 1,5—2 метры ад камля, і пілы не будуць ірвацца.

— Адкуль ведаеш?

Я расказаў пра бой над Прыбарам, пагладзіў сасновы камель, які, магчыма, выратаваў мне жыццё ў далёкім 1943 годзе...

Быховский районный историко-краеведческий музей

Подзвіг Алёшы Загрышава

А. В. Загрышаў.

Пры спробе перайсці лінію фронту юнага партызана Алёшу Загрышава схапілі фашысты і прывезлі ў вёску Прыбар. «Куды ішоў, хто пасылаў?» — дапытваў падлетка нямецкі палкоўнік. Алёша маўчаў. Не дабіўшыся нічога, яго кінулі ў бункер-турму.

Апоўначы Алёша пастукаў у дзверы і папрасіў вартавога вывесці яго па патрэбе. Круціла завіруха. Вартавы на імгненне адвярнуўся, падстаўляючы спіну пранізліваму ветру. Алёша глянуў на вартавога і... скочыў цераз плот. Услед у цемру ўдарыла запозненая аўтаматная чарга. Аляксей перапоўз цераз вуліцу і падаўся далей ад вёскі. Праз двое сутак ён перайшоў лінію фронту і трапіў у размяшчэнне 17-й стралковай дывізіі, дзе расказаў камандаванню, што ў Прыбары знаходзіцца буйны варожы гарнізон.

...Ваенны савет 3-й арміі рашыў у першыя дні студзеня 1944 г. ліквідаваць быхаўскі баявы ўчастак, які ўтрымліваўся ворагам. Галоўны ўдар па ім рыхтаваліся нанесці ад вёскі Чырвоная Слабада ў напрамку вёсак Нікалаевічы і Вараніно, дапаможны — па шашы Гомель — Магілёў. Паведамленне Аляксея Загрышава было як нельга ў час. Прымаецца рашэнне аб стварэнні спецыяльнага лыжнага атрада. Перад ім стаяла задача прабрацца ў тыл праціўніка і да раніцы 4 студзеня, да пачатку наступлення, знішчыць штаб 267-й пяхотнай дывізіі ў вёсцы Прыбар.

У ноч на 4 студзеня 1944 г. пачаўся рэйд лыжнага атрада ў складзе 230 байцоў і афіцэраў пад камандаваннем капітана Тайвакайнена. Праваднікам байцоў быў Алёша Загрышаў. 980-ы артполк павінен быў падтрымліваць агнём лыжнікаў, таму з атрадам ішоў і камандзір узвода ўпраўлення другога дывізіёна старшы лейтэнант Ц. І. Чарнюк.

Атрад быў разбіты на тры групы. Лыжнікам некалькі разоў даводзілася перасякаць па лёдзе Днепр і шматлікія затокі. Група старшага лейтэнанта Глушкова перарэзала перад вёскай тэлефонную сувязь, а калі па сігналу ракеты пачаўся штурм, яна атакавала 15 дамоў у цэнтры вёскі. Другая група капітана Карнілава атакавала паўночную частку вёскі, імкнучыся захапіць аператыўны аддзел штаба дывізіі. Трэцяй групе старшага лейтэнанта Яфрэмава прадстаяла захапіць вузел сувязі, знішчыць цыстэрны з гаручым і гараж.

У гэтым баі вызначыліся дзесяткі савецкіх воінаў. Камуніст радавы Пушкароў закідаў гранатамі легкавыя машыны, знішчыў некалькі афіцэраў. Камсорг Жарабецкі, уварваўшыся ў дом, забіў 5 афіцэраў, радавы Ісаеў перастраляў 15 салдат. Сяржант Валынкін і байцы Сідараў і Фугаеў разграмілі вузел сувязі. Сяржант Іван Калодкін падарваў чатыры штабныя аўтобусы з дваццаццю фашыстамі. Парторг Мікалай Караблёў захапіў у палон афіцэра, забіў палкоўніка і трох салдат. Удзельнікі рэйду знішчылі больш трохсот гітлераўцаў, спалілі 50 розных машын, вузел сувязі, склад з гаручым і прадуктамі, захапілі ўсе аператыўныя дакументы.

Як успамінае афіцэр 980-га артпалка старшы лейтэнант П. М. Малінка, юны праваднік так добра ведаў усе падыходы да вёскі Прыбар і ўмела правёў нашых байцоў, што пры іх дзёрзкім і рàптоўным налёце нават не спатрэбілася артылерыйская падтрымка.

Смелы налёт лыжнага атрада на фашысцкі штаб дапамог на працягу двух дзён поўнасцю ліквідаваць умацаваны ўчастак. Удзельнікі рэйду былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Аб гераічным рэйдзе байцоў даведалася ўся краіна. Карэспандэнцыі былі надрукаваны ў газетах «Правда», «Известия», «Красная Звезда». Савецкае інфармбюро паведаміла аб геройскіх дзеяннях лыжнага атрада ў аператыўнай зводцы ад 6 студзеня 1944 года.

...Наступнай аперацыяй, у якой удзельнічаў былы партызан, праваднік лыжнага атрада, а потым баец Чырвонай Арміі, была гераічная бітва на легендарнай вышыні 150,9 пад вёскай Лудчыцы...

Праз лінію фронту

У лістападзе 1943 г. войскі 3-й арміі генерала А. В. Гарбатава і 50-й арміі генерала І. В. Болдзіна, прарваўшы нямецкую абарону на рацэ Сож, выйшлі да Дняпра. Пачыналася вызваленне Быхаўшчыны. Камандаванне Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы, падпольны райком партыі прынялі рашэнне ўстанавіць сувязь з часцямі Чырвонай Арміі і паслаць праз лінію фронту групу партызан. Неабходна было ўзгадніць пытанні ўзаемадзеяння, дамовіцца аб месцы і часе злучэння, атрымаць боепрыпасы. Пасланыя раней

Быховский районный историко-краеведческий музей

2 групы партызан з 820-га атрада лінію фронту перайсці не змаглі. Накіравалі яшчэ адну групу з пакетам для камандавання 3-й арміі. У яе ўвайшлі жыхары в. Новы Быхаў В. Н. Тамашоў, А. С. Часты, І. А. Банадысеў, а таксама Бяляеў і Шышкін.

У глухім лесе за в. Гамінкі партызаны групы заўважылі зямлянку, дзе хаваліся мясцовыя жыхары. З імі была і Кацярына Андрыянава — жонка камандзіра Чырвонай Арміі, якой удалося ўцячы з месца прымусовых работ на пярэднім краі абароны гітлераўцаў. Андрыянава ведала размяшчэнне варожых умацаванняў, мінных палёў і выказала жаданне ісці з партызанамі.

Групе з вялікімі цяжкасцямі ўдалося перабрацца цераз Днепр у размяшчэнне 283-й стралковай дывізіі і перадаць камандаванню пакет.

Прыкладна ў той жа час праз лінію фронту прайшлі партызанскія групы 810-га партызанскага палка на чале з Дземідзенкам і 152-га партызанскага палка. Як развіваліся падзеі далей, успамінае палкоўнік запасу ветэран 283-й стралковай дывізіі **А. С. Дзяраеў:**

«З 13 па 20 лютага 1944 г. 3-я армія рыхтавала наступальную аперацыю, якая атрымала назву Рагачоўскай. Пры яе падрыхтоўцы разам з іншымі мерапрыемствамі планавалася ўзаемадзеянне войск і партызанскіх атрадаў. Было вырашана для сувязі з партызанамі накіраваць у тыл ворага групу разведчыкаў. У яе склад ад нашай стралковай дывізіі было ўключана 5 чалавек: яфрэйтары Д. В. Утукін (старшы групы), А. А. Мышкароў, Н. П. Трусаў і партызаны В. Н. Тамашоў і А. С. Чысты, якія прыбылі з-за лініі фронту і добра ведалі мясцовасць на напрамку наступлення нашых войск.

Раніцай 21 лютага 1944 г. група пераадолела нейтральную зону шырынёй каля двух кіламетраў. Утукін, выбраўшы зручны для назірання пункт, намеціў участак, дзе можна было непрыкметна прайсці ў тыл ворага. Як толькі пачалося наступленне часцей дывізіі, разведчыкі скрытна прабраліся праз абарону праціўніка, якая складалася з дзвюх ліній траншэй, і рушылі ў напрамку лесу. На ўзлеску размяшчалася артылерыйская батарэя ворага, якую ўдалося непрыкметна абысці. Каля чыгункі група сутыкнулася з нямецкімі салдатамі. Абставіны патрабавалі рашучых дзеянняў. Байцы адкрылі агонь з аўтаматаў і імгненна знішчылі гітлераўцаў, адкрыўшы сабе дарогу далей...»

Ва ўзнагародных лістах аб выкананні групай баявой задачы запісана:

«...Група разведчыкаў фарсіравала раку Днепр, выйшла ў тыл праціўніка і ў раёне вёскі Барсукі наладзіла сувязь з групоўкай партызан Падаляна, перадаўшы ёй пастаўленую камандаваннем задачу. Пасля група разведчыкаў у колькасці пяці чалавек пад кіраўніцтвам Д. В. Утукіна правяла 4000 чалавек партызан і злучылася з часцямі Чырвонай Арміі...»

Партызаны злучыліся з наступаючымі часцямі Чырвонай Арміі 24 лютага 1944 г. паміж вёскамі Дзедава і Хамічы. Разам з партызанамі выйшлі з варожага тылу некалькі тысяч мірных жыхароў.

За хадайніцтву камандавання 283-й стралковай дывізіі ўся група была ўзнагароджана ордэнамі Чырвонай Зоркі.

Вышыня герояў

На вышыні ля Лудчыц —
Гранітны абеліск,
На вышыні ля Лудчыц
Жытнёвыя палі.
Тут раннія зязюлі
Адлічваюць гады,
Салдацкія матулі
Ідуць здаля сюды.
Вянкамі дол усцелюць,
Пасядуць у цішы,
І кожная надзею
Люляе ў душы:
«Мо і майму сыночку
Хто-небудзь прыкладзе
Рамонкавы вяночак
Да маладых грудзей».

Змітрок Марозаў

З лістапада 1943 г. па чэрвень 1944 г. ў баях за вызваленне Быхаўшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў удзельнічалі воіны 3-й арміі 1-га Беларускага і 50-й арміі 2-га Беларускага франтоў. Сыны многіх народаў Савецкай Айчыны праявілі тут выключны гераізм і мужнасць, воінскае братэрства. Многія з іх назаўсёды засталіся ляжаць у беларускай зямлі, аддаўшы за яе свабоду сваё жыццё.

За 1,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі Лудчыцы ёсць вышыня — месца жорсткіх баёў у 1944 г. На штабных картах яна была пазначана лічбай 150,9. У 1984 г. на гэтай вышыні адкрыты Мемарыял воінскай славы як сімвал доблесці і мужнасці савецкіх воінаў, як знак глыбокай удзячнасці і памяці быхаўчан. Неўміручыя подзвігі здзейснілі ў баях на Лудчыцкай вышыні і на подступах да яе рускія П. Дз. Вінічэнка, Б. Я. Каваленка, У. К. Мартынаў, Я. Б. Фрадкоў, беларус І. А. Барысевіч, грузін Г. С. Размадзе, казах Сундуткалі Іскаліеў, узбек Гулям Якубаў. Усім ім прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза. Трое з іх — С. Іскаліеў, У. К. Мартынаў, Г. Якубаў — загінулі пры штурме вышыні 150,9 у чэрвені 1944 г. Мемарыял воінскай славы ўяўляе сабой скульптурна-архітэктурную кампазіцыю (скульптары П. Белавусаў, У. Лятун, архітэктары В. Бялянкін, М. Мызнікаў). На кургане пастаўлена сілумінавая сімвалічная фігура

Быховский районный историко-краеведческий музей

Баяна, які ўслаўляе подзвігі воінаў-герояў. Каля падножжа кургана на авальнай пляцоўцы размешчана ўвагнутая сцяна-стэла з пагруднымі выявамі 6 Герояў Савецкага Саюза: І. А. Барысевіча, П. Дз. Вінічэнкі, С. Іскаліева, У. К. Мартынава, Г. С. Размадзе, Г. Якубава. Ніжэй бронзавымі літарамі напісаны іх імёны. Побач устаноўлена абліцаваная гранітам стэла з інфармацыйным надпісам, запалены Вечны агонь. Злева ад уваходу да помніка 16 флагаў, што сімвалізуюць адзінства народаў Савецкай Радзімы. Стваральнікі мемарыяла ў 1986 г. ўдастоены Дзяржаўнай прэміі БССР.

Па ініцыятыве членаў калгаса «Беларусь» і рашэннем Быхаўскага райкома КПБ, камсамольскай арганізацыі раёна поле каля мемарыяла аб'яўлена полем баявой і працоўнай славы, высокай культуры земляробства. Права працаваць на ім атрымліваюць звенні і брыгады хлебаробаў, якія дасягнулі самых высокіх паказчыкаў у сацыялістычным спаборніцтве. Пераможцам спаборніцтва ўстаноўлены прыз імя ўвекавечаных у мемарыяле герояў.

* * *

Барысевіч Іван Андрэевіч. Герой Савецкага Саюза (22.8.1944). Нарадзіўся 26.3.1917 г. ў в. Аляксандраўка Балахцінскага раёна Краснаярскага краю. З сялян. Член КПСС з 1942 г. У Чырвонай Арміі з 1939 г. З 1942 г. на Заходнім, Бранскім, 2-м Беларускім франтах. Камандзір гарматы старшы сяржант І. А. Барысевіч вызначыўся ў баях за вызваленне Быхаўскага раёна (на подступах да вышыні 150,9). 22.2.1944 г. разлік яго гарматы ў складзе батарэі падтрымліваў наступленне батальёна. Калі буйныя



І. А. Барысевіч.

сілы праціўніка перайшлі ў контратаку, паранены І. А. Барысевіч, які адзін з усяго разліку застаўся жывым, трапным агнём падбіў 2 танкі, а трэці прымусіў павярнуць назад. 25—28.3.1944 г. з разлікам гарматы адбіў некалькі жорсткіх варожых контратак і ўтрымліваў важную пазіцыю. Пасля вайны да 1967 г. І. А. Барысевіч на гаспадарчай рабоце. Жыў у Краснаярску. Памёр 21.11.1981 г. На месцы подзвігу І. А. Барысевіча ў 1972 г. пастаўлена стэла.

З успамінаў І. А. Барысевіча

Калі мы падышлі да Дняпра, майму разліку быў загад пераплыць раку са сваёй гарматай і падтрымаць нашу пяхоту. Плыт быў ужо зроблены. Мы пагрузіліся на яго. У разліку нас было чацвёра, і яшчэ нам прыдалі 20 чалавек пяхоты. Хоць на дварэ стаяў месяц люты, а па Дняпры можна было плысці, лёд быў разбіты бомбамі і снарадамі. Пераплывалі пад моцным



Мемарыял воінскай славы на Лудчыцкай вышыні.

Быховский районный историко-краеведческий музей

варожым абстрэлам. Адзін снарад трапіў у плыт, кавалак яго адарвала, загінулі 2 байцы з разліку і 12 пехацінцаў. Гармата засталася цэлай. Мы хуценька выкацілі яе на яр. На золку падбілі ўжо 2 варожыя гарматы і 2 кулямёты. У гэты час я быў паранены, паранены быў і мой таварыш з разліку, беларус, неўзабаве ён загінуў. Пехацінцы дапамаглі нам выкаціць гармату фашыстам у фланг і нанасілі снарадаў. Раніцай працiўнік пусціў радыёкіроўную танкетку, я падбіў яе. А пасля танкеткі на нас рушылі танкі з дэсантам. Два з іх я падбіў, трэці павярнуў назад. Аўтаматчыкі былі рассеяны і адступілі. Фашысты распачалі тады яшчэ некалькі контратак, і ўсе яны былі адбіты. А ўвечары прыйшло падмацаванне, прыбыло наша батарэйнае камандаванне, прыйшоў камандзір палка Пшанічны. Мяне накіравалі ў сваю батарэю, у яе складзе я ўдзельнічаў у далейшых баях за вышыню, падбіў яшчэ 8 танкаў, 12 гармат, 10 кулямётаў, знішчыў шмат варожых салдат і афіцэраў.

У дні святкавання 30-годдзя Вялікай Перамогі я наведаў тыя мясціны, з вялікім хваляваннем у сэрцы пазнаў Лудчыцкую вышыню, месца нашай пераправы.

* * *

Вінічэнка Петр Дзмітрыевіч. Герой Савецкага Саюза (3.6.1944). Нарадзіўся ў 1911 г. ў в. Мартынаўка Суджанскага раёна Курскай вобл. Працаваў у калгасе. На фронце з верасня 1941 г. Камандзір мінамётнай роты старшы лейтэнант П. Дз. Вінічэнка вызначыўся ў 1943 г. пры вызваленні Гомельскай і Магілёўскай абл. У баі за ўмацаваны пункт ворага, умела выкарыстоўваючы агонь мінамётаў, знішчыў жывую сілу і тэхніку працiўніка. Загінуў у баі 25.11.1943 г. Пахаваны ў в. Сялец Быхаўскага раёна.

Пётр Вінічэнка камандаваў ротай мінамётчыкаў. Жартаўнік, часам нават свавольнік, ён быў любімцам палка. Многія здзіўляліся, як ён, учарашні калгасны брыгадзір, так хутка авалодаў майстэрствам вядзення бою. У яго, як у добрага гаспадара, заўсёды ўсё было на месцы. Так, напрыклад, міны ён трымаў у запасе. І здаралася, гэта прадрашала вынік бою.

Гарачая бітва разгарнулася за ўмацаваны апорны пункт гітлераўцаў Сялец-Халапееў на шашы Гомель — Магілёў. На падыходзе да вёскі Вінічэнка заўважыў, што па шашы рухаецца калона аўтамашын. І тут жа прыняў рашэнне не дапусціць варожых падмацаванняў да апорнага пункта. Арганізаваўшы групу, камандзір роты мінамётчыкаў павёў яе скрытым шляхам на перахоп матарызаванай калоны. Удар быў нанесены знянацку. На шашы і абапал яе засталося ляжаць 35 гітлераўцаў. У рукі смельчакоў трапілі багатыя трафеі: каля двух дзесяткаў грузавікоў з боепрыпасамі, харчаваннем і іншым ваенным рыштункам.

283-я дывізія здолела зламаць супраціўленне

Помнік на месцы подзвігу І. А. Барысевіча.

Магіла П. Дз. Вінічэнкі ў вёсцы Сялец.

Быховский районный историко-краеведческий музей

ворага, які бесперапынна контратакаваў, і, авалодаўшы вёскай Сялец-Халапееў, выйшла да Дняпра. Асабліва значную ролю ў гэтым адыгралі мінамётчыкі 858-га палка. Генерал-маёр запасу У. А. Куўшыннікаў, які быў у той час начальнікам штаба 80-га корпуса, успамінаў: «Бой быў няроўны. Гітлераўцы кінулі супраць нас танкі. Пяхота праціўніка рушыла на мінамётную батарэю. У роце Вінічэнкі не засталося мін. Тады старшы лейтэнант крыкнуў: «За мной, хлопцы!» — і павёў байцоў у рукапашную. Яны адкінулі ворага. Больш чым 80 забітых фашыстаў засталося на полі бою. Але быў смяртэльна паранены і Пётр Вінічэнка».

* * *

У пачатку вясны 1944 г. 556-ы стралковы полк 169-й дывізіі заняў пазіцыі на паўднёва-ўсходняй частцы вышыні 150,9. Камандаваў палком Пётр Васілевіч Качур, адважны і рашучы камандзір. 20 чэрвеня 1944 г. перад ім была пастаўлена задача стварыць баявы атрад, які павінен быў інсцэніраваць галоўны ўдар арміі па гітлераўцах, адцягнуць на сябе іх увагу і сілы. Полк выканаў баявую задачу — ён прыкаваў да сябе многа тысяч адборных фашысцкіх войск, садзейнічаў вызваленню Быхава. У цяжкіх кровапралітных баях савецкія воіны прадэманстравалі цуды храбрасці і гераізму. За выключную мужнасць трое з іх пасмяротна былі ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Іскаліеў Сундуткалі (Сундэткалі). Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся ў 1924 г. ў в. Канстанцінаўка Чынгірлаўскага раёна Уральскай вобл. З сялян. Член ВЛКСМ. На фронце з ліпеня 1942 г. Аўтаматчык стралковай роты радавы С. Іскаліеў вызначыўся пры вызваленні Быхаўскага раёна. У ноч на 24.6.1944 г. ў баі за вышыню 150,9 у ліку першых уварваўся ў траншэю праціўніка. У крытычны момант бою закрыў сваім целам амбразуру варожага дзота. Пахаваны на брацкіх могілках за 4 км ад в. Камарычы Быхаўскага раёна, на магіле пастаўлена стэла. Імем Іскаліева названы вуліцы ў Быхаве і Мінску, піянерская дружына Няражскай 8-гадовай школы Быхаўскага раёна.

З успамінаў Н. Н. Адасёва

Назар Нічыпаравіч Адасёў — ураджэнец Быхаўшчыны. У складзе 556-га стралковага палка прымаў удзел у вызваленні родных мясцін, удзельнічаў у баях за вышыню 150,9. За храбрасць і адвагу быў узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны і Чырвонай Зоркі, медалямі.

Памятаю, як у разгар бою Сундуткалі поўз да дзота, каб знішчыць яго, як напружана сачыла рота за кожным яго рухам. Вось ён ужо каля самога дзота, з пашчы якога сячэ і сячэ злосны кулямётны агонь. Іскаліеў прыўзняўся, кінуў гранату. Кулямёт як бы задыхнуўся, стала ціха. Адразу ж над полем прагучала «ура!»: нашы пайшлі ў атаку. Але што гэта? У пашчы дзота зноў замільгалі рыжыя языкі полымя. Мы бачылі, як Іскаліеў прыўзняўся і тут жа ўпаў. Яго раніла, а варожы кулямёт па-ранейшаму не даваў нам падняць галовы. І рантам бачым: Сундуткалі ўскочыў, падбег да дзота і лёг грудзьмі на яго амбразуру. У наступную секунду рота пайшла ў атаку.

Мартынаў Уладзімір Кірылавіч. Герой Савецкага Саюза (23.4.1945). Нарадзіўся 17.3.1919 г. ў в. Дальнавідава Залягошчынскага раёна Арлоўскай вобл. З сялян. Член КПСС з 1943 г. Працаваў у калгасе, з 1939 г. на заводзе ў Златаусце. На фронце з 1941 г. Камандзір стралковай роты старшы лейтэнант У. К. Мартынаў вызначыўся ў баях за вызваленне Быхаўскага раёна. У ноч на 24.6.1944 г. рота прарвала абарону ворага на паўднёвы ўсход ад в. Лудчыцы, авалодала вышынёй 150,9 і 19 гадзін адбівала контратакі 2 батальёнаў праціўніка, якія падтрымлівала артылерыя і мінамёты, знішчыла 470 гітлераўцаў. Да зыходу дня праціўніку ўдалося акружыць роту. Байцы на чале з камандзірам змагаліся да апошняга патрона, але не пакінулі захопленага рубяжа. У. К. Мартынаў загінуў у гэтым баі. Пахаваны на брацкіх могілках за 4 км ад в. Камарычы Быхаўскага раёна, на магіле пастаўлена стэла. Яго імем названа вуліца ў Быхаве.

Якубаў Гулям. Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 15.9.1915 г. ў населеным пункце Мірзабад Ленінскага раёна Андзіжанскай вобл. З сялян. Член КПСС з 1943 г. Працаваў у калгасе. Скончыў курсы ўдасканалення камсаставу (1941). У Чырвонай Арміі з 1937 г. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. У час Вялікай Айчыннай вайны на фронце з 1942 г. Камандзір роты аўтаматчыкаў капітан Г. Якубаў вызначыўся ў баях на тэрыторыі Быхаўскага раёна. У ноч на 24.6.1944 г. ў час прарыву абароны праціўніка рота пад яго камандаваннем імклівa пераадолела 3 варожыя траншэі і падышла да в. Лудчыцы; за 20 гадзін бою на вышыні 150,9 адбіла 40 варожых контратак, знішчыла 425 гітлераўцаў. Акружаная праціўнікам рота вяла няроўны бой, але не пакінула заваяваных рубяжоў. Г. Якубаў загінуў у гэтым баі. Пахаваны на брацкіх могілках за 4 км ад в. Камарычы Быхаўскага раёна, на магіле пастаўлена стэла. Імем Г. Якубава названы вуліцы ў Мінску і Ленінску Андзіжанскай вобл., там жа пастаўлены і помнік герою.

Уначы рота Мартынава выйшла на «нейтралку» і заняла зыходную пазіцыю для атакі. На золку закіпеў бой. Сказаць, што ён быў цяжкім, значыць нічога не сказаць. Лёгкіх баёў на вайне наогул не бывае. Але і апісаць ход таго бою, неймаверны цяжар выпрабаванняў, цану баявога поспеху таго дня таксама нялёгка. Вышыню нашы байцы занялі. Аднак вораг хутка апамятаўся, былі прыведзены ў баявы стан другі эшалон і рэзервы. А днём супраць роты Мартынава пайшлі танкі. За дзевятнаццаць гадзін бою мартынаўцы адбілі больш за дваццаць атак. Зямлю наўсцяж укрылі трупы гітлераўцаў. Але і ў роце Мартынава засталося менш чым 30 чалавек. Гітлераўцы адрэзалі роту ад палка. Нашы сал-

Быховский районный историко-краеведческий музей

С. Іскаліеў.

У. К. Мартынаў.

Г. Якубаў.

П. В. Качур.

даты вялі бой без сувязі з астатнімі падраздзяленнямі, ім нельга было дапамагчы ні артылерыяй, ні мінамётамі, ні нават падбадзёрыць словам.

Міхаіл Коханаў быў у роце Мартынава разведчыкам. Ён, як і Назар Адасёў, родам з Быхаўшчыны. І вось у гэтым баі ён хадзіў у атаку на тую самую вышыню, дзе некалі хлапчуком гуляў «у вайну». Міхаіл выйшаў жывым з таго бою, хоць і параненым. Ён успамінаў пасля:

— Мартынаў перад штурмам загадаў мне трымацца яго. Ты, маўляў, тут кожны ўзгорачак, кожны кусцік ведаеш. Памятаю, салдаты перадалі адзін аднаму яго загад: падрыхтавацца да контратакі. Першы падняўся Мартынаў. Страшэнная схватка ўрукапашную. Гітлераўцы не вытрымалі, бягуць назад. Мы за імі. Раптам бачу, упаў Мартынаў. Я падбег да яго, апусціўся на калені. «Таварыш камандзір! — крычу.— Што з вамі? Вы паранены?» Ні слова ў адказ. Аўтаматная чарга скасіла нашага камандзіра палка. Тут і мяне параніла...

Побач з ротай Мартынава насмерць стаялі аўтаматчыкі Гуляма Якубава. Перад штурмам вышыні каля палкавога сцяга камандзір 566-га стралковага палка П. В. Качур абняўся і пацалаваўся з кожным сваім афіцэрам. Якубаў сказаў: «Вы, таварыш падпалкоўнік, заўсёды называлі маю роту сваёй палкавой гвардыяй. Будзьце ўпэўнены, гвардыя не падвядзе...»

Аўтаматчыкі Якубава абрушыліся на ворага дзёрзка і знянацку. Захоплена першая траншэя, другая. Але вораг апамятаўся хутка. Маючы ў 10 разоў болей жывой сілы, артылерыі, не гаворачы пра танкі, праціўнік вырашыў не толькі аднавіць на гэтым участку становішча, але і прарваць нашу абарону. Атакі ішлі адна за адной. На траншэі, занятыя салдатамі Якубава, налятаў шквал агню, следам насоўваліся гітлераўскія танкі, потым ішла пяхота. І зноў танкі, і зноў артылерыя. Дваццаць гадзін трымала абарону рота Якубава. За гэты час у няроўных схватках яна адбіла больш за сорак атак праціўніка. Байцы Якубава гаварылі: «Калі з намі Гулям, лічы, што нас не рота, а батальён».

Усё было так, як сказаў Качуру Гулям Якубаў, ідучы ў ноч. Вышыня была ўзята, утрымана, заданне выканана. Вось толькі ні адзін салдат з роты Якубава назад не вярнуўся. І падпалкоўнік Качур ужо больш ніколі не абняў Гуляма.

* * *

Каваленка Барыс Яўгенавіч. Герой Савецкага Саюза (23.7.1944). Нарадзіўся 15.5.1917 г. ў Маскве. З служачых. Член КПСС з 1944 г. Скончыў Маскоўскі інстытут фізічнай культуры (1941), Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1948), Свярдлоўскі мантажны тэхнікум (1960). На фронце са снежня 1941 г. Удзельнік абароны Ленінграда. Змагаўся на Бранскім і Беларускім франтах. Вызначыўся пры вызваленні Быхаўскага раёна. У лютым 1944 г. асобны лыжны батальён пад камандаваннем маёра Б. Я. Каваленкі непрыкметна пераправіўся цераз Дняпро, паглыбіўся ў тыл праціўніка, наладзіў сувязь з партызанамі і печаканым ударам з тылу разбіў варожы гарнізон, вызваліў станцыю Тошчыца, вывеў у савецкі тыл каля 7 тысяч мірных жыхароў. Да 1955 г. Б. Я. Каваленка служыў у Савецкай Арміі, падпалкоўнік. Жыве ў Свярдлоўску.

* * *

Размадзе Галакціён Самсонавіч. Герой Савецкага Саюза (23.7.1944). Нарадзіўся 21.8.1913 г. ў с. Цмендауры Онскага раёна Грузінскай ССР. З сялян. Член КПСС з 1941 г. Скончыў Кутаіскі сельскагаспадарчы тэхнікум (1934), Тбіліскую школу МУС (1940), курсы «Выстрал» (1945). Працаваў аграномам у зямельным аддзеле Онскага р-на, следчым МУС у Тбілісі. У Чырвонай Арміі з 1935 г. Удзельнік баёў з японскімі захопнікамі каля возера Хасан у 1938 г. У час Вялікай Айчыннай вайны на 1-м і 2-м Беларускіх франтах. Камандзір стралковай роты капітан Г. С. Размадзе вызначыўся ў баях пры вызваленні Гомельскай і Магілёўскай абласцей. 21.2.1944 г. рота першай у палку фарсіравала Дняпро каля в. Кісцяні Рагачоўскага раёна, авалодала варожай траншэяй. Г. С. Размадзе знішчыў разлік кулямёта, які перашкаджаў наступленню роты. 23.2.1944 г. ў баі за чыгуначную стан-

Быховский районный историко-краеведческий музей

Б. Я. Каваленка.

Г. С. Размадзе.

Я. Б. Фрадкоў.

П. А. Панілаў.

цыю Тошчыца Быхаўскага раёна рота адбіла 5 контратак праціўніка. Тройчы ранены, Размадзе не пакінуў поля бою. Да 1946 г. служыў у Савецкай Арміі, маёр. Да 1967 г. на адміністрацыйнай рабоце. Жыве ў Маскве.

Вядомы беларускі пісьменнік Міхась Лынькоў у 1944 г. напісаў нарыс пра Героя Савецкага Саюза Г. С. Размадзе (Полымя. 1945. № 9. С. 68—70). Вось як расказваецца там аб тым, як вызваляў Беларусь сын грузінскай зямлі.

— Было гэта ў лютым месяцы 1944 года,— апавядае Галактыён Самсонавіч Размадзе.— Стаялі мы са сваёй дывізіяй пад Старым Быхавам, рыхтаваліся да прарыву абароны. Дні стаялі халодныя, снежныя. У нас у гэты час, у Грузіі, цёпла, сонца ўвесь дзень, усё зелянее, вясною пахне. А тут мароз, завеі, снегавыя гурбы. Днепр пад ільдом. Праўда, ад мін і снарадаў суцэльныя палонкі, перабрацца па лёдзе — майстэрства трэба. Вось у такія дні і паранілі фарсіраванць Днепр.

Я тады ротаю камандаваў. Камандуючы арміяй сабраў нас, камандзіраў рот, аб нашых задачах гаварыў, настаўляў перад боем. Сказаў паміж іншым: хто першым будзе на другім беразе, можа і Героем Савецкага Саюза стаць. Даў я сваё афіцэрскае слова: буду на тым беразе... Перабіраліся мы ўначы па лёдзе, без артылерыйскай падрыхтоўкі, каб поўнаю нечаканасцю перахітрыць ворага, збіць яго з толку. Засталі, можна сказаць, мы немцаў без штаноў, навялі на іх паніку. Праўда, забіліся яны ў дзоты, з кулямётаў адстрэльваюцца. Ну мы тут гранаты ў ход, па амбразурах. Кулямётныя разлікі знішчылі. Уварваліся ў дзоты, першыя і другія траншэі ўзялі, перарэзалі дарогу Быхаў — Рагачоў. Ішлі ўперад, пакуль не атрымалі загад камандзіра палка — затрымаць роту, замацавацца.

Такія дэталі бою, расказаныя капітанам Размадзе. Паводле яго слоў усё было проста, усё было лёгка. І толькі па словах відавочцаў, другіх удзельнікаў справы, вырысоўваецца ў поўным святле ўвесь малюнак гэтага выключнага па адвазе і мужнасці пачнога штурму нямецкай абароны. І як ішлі людзі цераз Днепр у суровую начную пургу. І як пераадольвалі яны агнявы шквал з нямецкіх умацаванняў, як штурмавалі яны з канатамі і драбінамі берагавую кручу Дняпра. І як з гранатамі ў руках кінуўся капітан Размадзе на амбразур дзотаў і асабіста знішчыў некалькі кулямётных разлікаў. І як рота смельчакоў выбіла да зубоў узброеных фашыстаў, пабудаваўшых магутныя ўмацаванні, якімі спадзяваліся стрымаць тут, на Дняпры, нашы войскі, не пусціць іх далей на захад...

Галактыён Самсонавіч быў у шматлікіх баях. Ён удзельнічаў у захопе станцыі Тошчыца, калі перарэзана была чыгунка Магілёў — Жлобін. Тут былі склады, тут была база, якая харчавала ўсе нямецкія часці на заходнім беразе Дняпра. Тады быў ажыццёўлены глыбокі рэйд на лыжах у тыл ворага. Лясамі, густым кустоўем па балотах цягнулі за сабою байцы кулямёты, мінамёты, боепрыпасы. Глыбокаю ноччу штурмам авалодалі станцыяй, разбілі моцны гарнізон, разграмілі падаспеўшых на бронецягніку нямецкіх аўтаматчыкаў, адбілі пяць контратак. Былі захоплены вялізныя склады, паралізаваны бліжэйшы нямецкі тыл. Пасля Тошчыцы наступалі на Хамічы. У баях пад гэтым пунктам капітан Размадзе асабіста забіў дваццаць тры гітлераўцы і аднаго захапіў у палон. Баі былі жорсткія, упартыя. Галактыён Самсонавіч быў тройчы ранены ў гэтых баях. Пабыў тры дні на перавязцы, у шпіталь не пайшоў...

* * *

Фрадкоў Яфім Барысавіч. Герой Савецкага Саюза (29.6.1945). Нарадзіўся 4.11.1921 г. ў г. Дзямідаў Смаленскай вобл. З рабочых. Член КПСС з 1943 г. Скончыў ваенную акадэмію (1951). У Чырвонай Арміі з 1939 г. На фронце з 1941 г. Першае баявое «хрышчэнне» пагранічнік Яфім Фрадкоў атрымаў каля Перамышля. Удзельнік Курскай бітвы 1943 г. Камандзір гарматы старшы сяржант Я. Б. Фрадкоў вы-

Быховский районный историко-краеведческий музей

значыўся ў баях за вызваленне Быхаўскага раёна. 28.11.1943 г. ў баі каля в. Александроў з яго ўдзелам адбіта 13 контратак, знішчана 2 гарматы. 23.2.1944 г. каля Быхава адным з першых пераправіўся з гарматай цераз Дняпро, на захопленым плацдарме ў раёне вышыні 150,9 да 10.3.1944 г. разам з разлікам знішчыў 2 гарматы, 2 дзоты, мінамёт, 5 кулямётаў, 2 аўтамашыны з пяхотай праціўніка. У ліпені 1944 г. пры ліквідацыі мінскага «катла» падбіў 3 танкі, 2 самаходныя артылерыйскія ўстаноўкі, 4 гарматы, 6 бронетранспарцёраў, 18 аўтамашын, 23 павозкі. За гады вайны Я. Б. Фрадкоў падбіў і знішчыў 17 танкаў і самаходных гармат, сотні варожых салдат. Да 1981 г. служыў у Савецкай Арміі, з 1967 г. палкоўнік юстыцыі. Заслужаны юрыст УССР (1982). Жыве ў Адэсе.

Палітработнік Пётр Данілаў

Пётр Аляксеевіч Данілаў — Герой Савецкага Саюза (23.7.1944). Нарадзіўся ў 1915 г. ў в. Малая Агараўка Цёпла-Агараўскага раёна Тульскай вобл. З сялян. Член КПСС. Скончыў Іванькаўскі сельскагаспадарчы тэхнікум (1937). Да вайны на савецкай і камсамольскай рабоце. У Чырвонай Арміі з 1937 г. На фронце з 1941 г. Памочнік начальніка палітаддзела арміі па камсамолу маёр П. А. Данілаў вызначыўся ў лютым 1944 г. ў наступальных баях каля в. Ніжняя Тошчыца Быхаўскага раёна. Фарсіраваўшы Дняпро, захапіў з байцамі плацдарм, асабістым прыкладам павёў іх у атаку. Быў паранены, але поля бою не пакінуў. Загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў в. Доўск Рагачоўскага раёна. Яго імя высечана на мемарыяльнай сцянестэле ў скверы Герояў у Туле.

З успамінаў В. Круглікава, былога камсорга батальёна 856-га стралковага палка

Надышоў час фарсіравання Дняпра. Камбат падаў каманду. Аднак першая рота чамусьці марудзіла.

— Бяжы, Вася, у роту, зрабі ўсё, каб загад быў выкананы,— сказаў мне камандзір.

Аказалася, што камандзір роты, нядаўна паранены, адчуў сябе дрэнна. Тады я ва ўвесь голас закрычаў:

— Рота, слухай маю каманду! У атаку! Наперад!

І пабег да Дняпра. Секлі кулі. Снарады прабівалі варонкі ў лёдзе. Байцы беглі да крутога заходняга берага. Завязаўся рукапашны бой. Батальён авалодаў першай і другой траншэямі. Вораг адступаў праз лес. І вось мы каля в. Ніжняя Тошчыца. Вось тут якраз у батальёне з'явіўся Данілаў.

— Як справы?

— Усё добра. Сам вёў роту ў атаку.

Раптам пачуўся рокат матораў, і з-за хмызняку паказаліся тры нямецкія танкі, за імі пяхота. Мы адкрылі агонь з супрацьтанкавых ружжаў і аўтаматаў. Адзін танк быў падбіты, а два павярнулі назад. Пяхота залягла. Наш батальён зноў кінуўся ў атаку на ворага. Наперадзе атакуючых быў маёр Данілаў. Ён натхняў байцоў. У гэты час і напаткала яго шалёная куля. Фельчар Бандарэнка зрабіла яму перавязку і пачала адправіць у тыл. Данілаў катэгарычна адмовіўся. Ён зноў падняўся ў атаку, а за ім кінуліся байцы і камандзіры. Гэта была апошняя атака Данілава. Другая варожая куля абарвала яго жыццё.

У час кароткага зацішша мы развіталіся з баявым таварышам і пакляліся адпомсціць за яго. Вылучылі чатырох байцоў, якія павінны былі пераправіць цела загінуўшага цераз Дняпро ў тыл дывізіі.

Кулямётчык Кульбашны

С. З. Кульбашны.

Сідар Захаравіч Кульбашны — Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся ён у 1911 г. ў г. Чаркасы. На фронце з 1941 г. Камандзір кулямётнага разліку 856-га стралковага палка. С. З. Кульбашны вызначыўся пры вызваленні Беларусі. 24.6.1944 г. ў баі за в. Хамічы Быхаўскага раёна ён прабраўся з кулямётам да варожых пазіцый на 40—50 метраў і адкрыў агонь. У стане ворага пачалася паніка. Гітлераўцы заляглі. Контратака ворага з фланга была сарвана. Праціўнік, заўважыўшы кулямёт Кульбашнага, адкрыў па ім агонь. Разлік умелым манеўрам перамясціўся на іншую зручную пазіцыю і ўступіў у кулямётны паядынак, у выніку якога знішчыў 2 станковыя кулямёты ворага разам з разлікамі, разлік пушкі і захапіў у палон 4 гітлераўцаў. Пасля вайны С. З. Кульбашны жыў у Кіеве. Памёр у 1947 г.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Мой апошні бой

З успамінаў М. Умурдзінава

Стэла на месцы подзвігу М. Умурдзінава каля вёскі Палкі.

Умурдзінаў Мухітдзін — Герой Савецкага Саюза (4.6.1944). Нарадзіўся 10.4.1912 г. ў населеным пункце Байстан Кувінскага раёна Ферганскай вобл. З сялян. Узбек. Член КПСС з 1943 г. У Чырвонай Арміі з 1937 г. На фронце з студзеня 1942 г. Памочнік камандзіра ўзвода старшы сяржант М. Умурдзінаў вызначыўся 5.8.1943 г. ў баях пад Арлом і пры вызваленні Быхаўскага раёна. 4.1.1944 г. ў баі за в. Палкі Быхаўскага раёна замяніў параненага камандзіра роты. Сам быў цяжка паранены ў гэтым баі. Пасля вайны жыў у калгасе «Камунізм» Кувінскага раёна. Ганаровы грамадзянін Быхава. Памёр 21.5.1981 г. Яго імем названы школа, вуліца на радзіме. У в. Палкі Быхаўскага раёна пастаўлены помнік.

Наш узвод займаў зыходныя пазіцыі для атакі непадалёку ад вёскі Палкі. Ноч была цёмная, але мы заўважылі нямецкі дазор. Непрыкметна падкраліся да яго і захапілі адразу двух «языкоў». Яны далі звесткі аб размяшчэнні абарончых рубяжоў і агнявых пазіцый. Камандзір палка прыняў рашэнне перакінуць нашу роту ў раён невялікай вышыні і захапіць яе ў час артылерыйскай падрыхтоўкі.

Маю групу ўзмацнілі двума станковымі кулямётамі. На досвітку загрымелі гарматы. Снарады клаліся правей і лявей, а мы праз праход у драцяной загародзе кінуліся ў лабавую атаку, захапілі вышыню. Адразу ж тут асталяваўся камандны пункт палка.

Раніцай пачалася агульная атака. Салдаты ўварваліся ў варожыя траншэі. Завязаўся рукапашны бой. У траншэі гітлераўскі афіцэр збіў з ног камандзіра роты Садыра Імалдзінава, наваліўся на яго і пачаў душыць. Садыр страціў прытомнасць. Я заўважыў гэта і кінуўся на выручку. Ускочыўшы ў траншэю, стукнуў фашыста прыкладам аўтамата па галаве. Жыццё камандзіра было выратавана, але кіраваць боем ён не змог, і я прыняў камандаванне ротай на сябе. Атака закончылася паспяхова. Вызначаны рубеж быў узяты, вёска Палкі вызвалена ад фашыстаў. Але для мяне гэты бой быў апошнім. Атака праходзіла пад моцным артылерыйскім агнём. Побач са мной разарваліся два варожыя снарады. Ачуняў я толькі праз дзесяць дзён у тылавым шпіталі. Медыкі налічылі на маім целе чатырнаццаць ран...

У баі за Ветранку

М. Умурдзінаў.

Я. Д. Гасан.

Ягор Давыдавіч Гасан нарадзіўся ў 1912 г. ў в. Ларнеўск Краснагорскага раёна Бранскай вобл. Працаваў пастухом, потым рабочым у саўгасе. З 1933 г. ў Чырвонай Арміі. Пасля дэмабілізацыі працаваў у гарваенкамаце ў г. Клінцы. На фронце з 1941 г. Удзельнік баёў пад Масквой, на Арлоўска-Курскай дузе, вызвалення Смаленшчыны і Браншчыны. 444-ы стралковы полк пад камандаваннем падпалкоўніка Гасана ў верасні 1943 г. адным з першых удзельнічаў у вызваленні Беларусі, у баі за Хоцімск полк першым уварваўся ў горад, разам з іншымі часцямі дывізіі знішчыў каля двух варожых батальёнаў, узяў у палон каля 100 гітлераўцаў. Працягваючы наступленне, полк фарсіраваў р. Проня і захапіў плацдарм на яе заходнім беразе. Я. Д. Гасан загінуў 4.1.1944 г. ў баі за вызваленне в. Ветранка Быхаўскага раёна. Пахаваны на радзіме. Імем Я. Д. Гасана названа вуліца ў пас. Гадылёва, яго імя прысвоена піянерскай дружыне Гадылёўскай сярэдняй школы.

Быховский районный историко-краеведческий музей

З успамінаў І. Карабузава, былога камандзіра батарэі 444-га стралковага палка

...Вызваліўшы вёску Боўкі, наш полк падышоў да вёскі Дабужа і разгарнуўся на ўскраіне лесу для рашучага штурму варожых пазіцый, размешчаных на вышынях за вёскай. Тры дні няспынных атак, у якіх непасрэдны ўдзел прымалі камандзір палка падпалкоўнік Гасан і яго намеснік капітан Рубцоў, прынеслі палку поспех. Немцы былі скінуты з вышынь і вымушаны былі заняць абарону на мясцовасці, якая добра праглядалася з нашых назіральных пунктаў. У баях за вышыні былі паранены капітаны Рубцоў і Навойка.

У ноч на новы 1944 год мы змянілі часці, якія знаходзіліся ў абароне перад вёскай Ветранка, і перад світаннем прыступілі да разведкі і прыстрэлкі пярэдняга краю абароны праціўніка. На наступны дзень пасля артылерыйскага налёту падраздзяленні палка выбілі фашыстаў з Ветранкі, уброд перайшлі рэчку Ухлясць і апынуліся на ўскраіне гаю перад былым шклозаводам.

4 студзеня 1944 г. Гасан, як заўсёды, перад пачаткам наступлення знаходзіўся ў баявых парадках стралковых падраздзяленняў. Пяхота па яго сігналу ўзнялася ў атаку. У гэты час на бруствер траншэі ўпала варожая міна. Пачуўся выбух. Смяротна паранены падпалкоўнік Гасан упаў на дно траншэі...

«Уперад, браты-славяне!»

З успамінаў маёра запасу А. А. Васільева, былога камсорга 336-га стралковага палка

Промні сонца не маглі прабіцца скрозь шчыльнае воблака дыму і пылу, якое вісела над полем бою і засланяла нашы стралковыя роты, прыціснутыя да зямлі агнём праціўніка. За гэтай заслонай у невялікім раўчуку салдаты, што пачалі ўжо акопвацца, адчувалі сябе ўпэўнена. А падыміся вышэй, і, здаецца, не будзе ратунку ад куль і асколкаў мін.

Спроба павесці ў атаку залёгшых байцоў поспеху не мела. Цяжка параніла камандзіра роты, быў забіты адзін і паранена двое ўзводных.

Адыходзячы, праціўнік пакінуў на пануючай вышыні моцны заслон. Трэба было любой цаной выбіць ворага. Але палкавая артылерыя падтрымлівала ў гэты час іншыя падраздзяленні. Міны ў батальённых мінамётчыкаў скончыліся. «Што рабіць, як падняць роты?» — мучыла думка намесніка камандзіра батальёна старшага лэйтэнанта Карніеўскага, які знаходзіўся на назіральным пункце. Каб лепш агледзецца, ён выйшаў з укрыцця і паміж дрэвамі ўбачыў свайго вернага сябра — каня па мянушцы Віхр. Рашэнне прыйшло імгненна...

На вайне, нават на самым пярэднім краі, бывалі мінуты зацішша, калі раптам абрывалася артылерыйская канонада, якая толькі што грымела, і станавілася чутным нават стракатанне конікаў. І вось у такое імгненне да салдат данеслася цокатне конскіх капытоў, і ўсе ўбачылі конніка, які імчаў галопам і клікаў: «Уперад, браты-славяне, уперад!»

Толькі ў выключных выпадках Карніеўскі ўжываў гэтыя ласкава-даверлівыя словы «браты-славяне». Яны мелі магічную, прыцягальную сілу.

Калі пазналі намесніка камбата, усе анямелі ад страху за яго. Ад нечаканасці разгубіліся і гітлераўцы. Яны не стралялі. І здарылася тое, што абавязкова павінна было здарыцца, на што разлічваў Карніеўскі — у адзіным парыве ўзняліся роты. Загрымела магутнае салдацкае «ура!». Вышыню ўзялі і адкрылі шлях да ракі.

Адважны афіцэр быў узнагароджаны ордэнам Леніна. Старшы лейтэнант Карніеўскі не дажыў да Перамогі. Ён загінуў на быхаўскай зямлі, пад станцыяй Тошчыца ў час імклівай атакі, калі наш батальён быў накрыты агнём варожага браняпоезда.

Яны вызвалялі Быхаўшчыну

З восені 1943 г. да лета 1944 г. савецкія войскі вялі ўпартыя баі за вызваленне Быхаўскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Прадстаўнікі розных нацыянальнасцей Савецкага Саюза прадэманстравалі тут сапраўдныя прыклады гераізму і храбрасці. Многія з іх былі загартаваны ў шматлікіх баях і выпрабаваннях, удзельнічалі ў Сталінградскай і Курскай бітвах, мелі ўжо высокія ўрадавыя ўзнагароды, франтавая слава іншых на Быхаўшчыне толькі пачыналася.

Пры фарсіраванні Дняпра каля Быхава вызначылася шмат воінаў 324-й стралковай дывізіі. Снайпер **Барыс Іванавіч Маскоўскі** напярэдадні летняга наступлення ў Быхаўскім раёне ў 20-гадовым узросце стаў камуністам. У баях за вызваленне вёсак Ветранка і Красніца адважны снайпер знішчыў 9 гітлераўцаў, 7 з іх былі афіцэрамі. За гэты подзвіг ён быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені. Да моманту выхаду дывізіі на дзяржаўную граніцу снайпер знішчыў яшчэ 25 ворагаў і атрымаў ордэн Славы II ступені. У час баёў ва Усходняй Прусіі ён знішчыў каля паўсотні фашыстаў. Указам ад 29 чэрвеня 1945 г.

Быховский районный историко-краеведческий музей

У. Я. Карнеенка.

П. І. Балякін.

Б. І. Маскоўскі быў узнагароджаны ордэнам Славы I ступені.

Сямён Фёдаравіч Салаўёў — поўны кавалер ордэна Славы. Родам ён з в. Афанасава Барысаглебскага раёна Яраслаўскай вобл. У 324-й дывізіі быў камандзірам аддзялення разведкі. У час фарсіравання Дняпра ў Быхаўскім раёне ён на чале групы разведчыкаў першы пераправіўся на правы бераг. У баі на захопленым плацдарме асабіста знішчыў 12 гітлераўцаў і быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Уладзімір Якаўлевіч Карнеенка родам з в. Губеншчына, што на Крычаўшчыне. Быў партызанам палка «Трынаццаць», у снежні 1943 г. стаў байцом Чырвонай Арміі. У лютым 1944 г. цёмнай ноччу рота, у якой ваяваў У. Я. Карнеенка, пасля хова фарсіравала Дняпро і наблізілася да вышыні каля в. Янава Быхаўскага раёна. Калі прагучала каманда да атакі, першы нумар кулямётнага разліку У. Я. Карнеенка разам з іншымі адкрыў шквальны агонь па гітлераўцах. Амаль сорак фашыстаў скасіў Карнеенка. Добра дапамагалі яму ў баі таварышы па разліку. Князеў са Смаленска і Раманенка з Вязьмы. Князеў загінуў у тым цяжкім баі. Паранены ў плячо Карнеенка вёў бой да канца. Варожыя ўмацаванні былі ўзяты. За мужнасць і адвагу ён быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені. Ордэн яму ўручылі тут жа, каля вёскі Янава. Другі ордэн Славы — II ступені — адважны кулямётчык атрымаў таксама ў Быхаўскім раёне, за ўмелыя дзеянні пры ўзяцці вышыні ля в. Красніца. Ордэн Славы I ступені У. Я. Карнеенка атрымаў за мужныя дзеянні ў баі ў раёне Смалявіч.

Выдатна ваяваў ураджэнец Маскоўскай вобласці **Павел Іванавіч Балякін.** Да пачатку баёў на тэрыторыі Быхаўскага раёна ён быў ужо ўзнагароджаны ордэнамі Славы III і II ступеней. А в. Віляга, што на Быхаўшчыне, запомніў на ўсё жыццё. Быў тады Павел Іванавіч камандзірам узвода 1260-га стралковага палка. Узвод наступаў і раптам вымушаны быў залегчы, бо з дзота гітлераўцы адкрылі моцны агонь. Кожная мінута пагражала новымі ахвярамі. Трэба было штосьці рабіць. І старшына Балякін рашыўся. Па баразне, потым па канаве падпоўз ён да дзота і кінуў у амбразуру супрацьтанкавую гранату. Кулямёт змоўк. Узвод падняўся ў атаку. Баявая задача была выканана — новая пазіцыя занята. Праз гадзіну фашысты пайшлі ў наступленне. Атака ішла за атакай, сем іх адбіў узвод, знішчыў больш за трыццаць варожых салдат і афіцэраў. Камандзір узвода П. І. Балякін за мужнасць і адвагу ў гэтым баі быў узнагароджаны ордэнам Славы I ступені.

Дзмітрый Піліпавіч Скварцоў быў камандзірам разліку 76-мм гарматы ў 971-м стралковым палку, які вызваляў паўночную частку Быхаўскага раёна. Артылерысты павінны былі падтрымліваць наступленне пяхоты. Гармата Дз. П. Скварцова выдатна справілася з баявой задачай — знішчыла некалькі кулямётных кропак, мінамётную батарэю і дзот ворага. Пехацінцы пагналі фашыстаў і выйшлі на ўсходні бераг Дняпра ў раёне в. Баркалабава. Каб дапамагчы батальёну фарсіраваць водную перашкоду, байцы падкацілі гармату блізка да берага і паставілі на прамую наводку. Трапным агнём былі падаўлены кропкі, і батальён без страт фарсіраваў Дняпро. Потым пераправіліся і артылерысты. Там яны дапамагалі адстаяць і расшырыць плацдарм. За гэта і быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені старшына сяржант Дз. П. Скварцоў. А пасля вызвалення Беластока і Лідзбарка-Вармінскага ў Польшчы ён стаў поўным кавалерам ордэна Славы.

Калі 110-я стралковая дывізія фарсіравала Дняпро ў раёне вёсак Малая Бароўка — Дальняе Ляда, старшаму сяржанту **Аляксандру Міхайлавічу Патрацкаму** давялося ўзяць на сябе камандаванне ротай, бо паранены камандзір выбыў са строю. Бой быў выйграны, а Аляксандра Міхайлавіча ўзнагародзілі ордэнам Славы III ступені. Потым ён стаў поўным кавалерам ордэна Славы за храбрасць і гераізм пры вызваленні Польшчы.

20-гадовы **Альмукан Аспанавіч Сямбінаў,** ураджэнец сяла Жана-Берлік Цалінаградскага раёна Казахскай ССР, ваяваў у аддзяленні разведкі 1210-га стралковага палка 362-й стралковай дывізіі. У ноч на 28 чэрвеня дывізія павінна была фарсіраваць Дняпро каля Быхава. Як заўсёды, наперадзе ішлі разведчыкі. Альмукан Сямбінаў і яго таварышы першыя пераправіліся цераз Дняпро, замацаваліся на захопленым участку і дапамагалі фарсіраваць раку іншым падраздзяленням. За доблесць і мужнасць, праяўленыя пры фарсіраванні Дняпра і вызваленні Быхава, Альмукан Сямбінаў быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені. Неўзабаве разведчык зноў паказаў выключную адвагу пры ўзяцці «языка», за што быў узнагароджаны ордэнам Славы II ступені. А поўным кавалерам ён стаў у час Берлінскай насту-

Быховский районный историко-краеведческий музей

пальнай аперацыі, дае праявіў ініцыятыву і знаходлівасць.

Бой кіпеў каля в. Касічы Быхаўскага раёна. Радавы **Сямён Яфімавіч Васільеў** наводзіў лінію сувязі ў стралковы батальён, наступленне якога падтрымлівалі мінамётчыкі. На зваротным шляху да батарэі ён убачыў цяжка параненага камандзіра ўзвода кіравання. Сувязіст перавязаў яго, прынёс ва ўкрыцце, а потым адправіў у медсанбат. За смелыя дзеянні С. Я. Васільеў быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені. Другі раз храбры сувязіст вызначыўся на літоўскай зямлі, поўным кавалерам ордэна Славы стаў на берлінскім напрамку.

Іван Андрэевіч Шыраеў родам з в. Яраслаўка Дуванскага раёна Башкірскай АССР. Яшчэ да баёў на Быхаўшчыне ён быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені. Калі 6-я стралковая рота фарсіравала Дняпро, у першай лодцы знаходзіўся радавы Шыраеў. Пераправіўшыся на правы бераг, ён адразу ж уступіў у бой і знішчыў больш чым 20 варожых салдат і афіцэраў. За адвагу пры фарсіраванні Дняпра і захопе плацдарма радавы Шыраеў быў узнагароджаны ордэнам Славы II ступені. У Польшчы, пры фарсіраванні ракі Нараў салдат зноў вызначыўся і атрымаў ордэн Славы I ступені.

Глеб Мікалаевіч Зарубін родам з Растова-на-Доне. У час Вялікай Айчыннай вайны быў санінструктарам у 2-м батальёне 1093-га стралковага палка 324-й дывізіі, прайшоў па многіх франтавых дарогах. У час вызвалення Быхаўскага раёна батальён вёў жорсткі бой каля в. Трылесіна. На дапамогу параненым спяшаўся радавы Зарубін. Ён быў лепшым санінструктарам у батальёне і палку. Здавалася, пельга ўзняць галаву ад зямлі — такі шалёны агонь вёў праціўнік. Але там паранены, ён чакае дапамогі, можа памерці ад вялікай страты крыві. І да яго спяшаецца санітар. 14 цяжка параненых воінаў вынес з перадавой у баі каля Трылесіны Зарубін, а за ўсё лета 1944 г.— 96. Выносячы параненых, Глеб Мікалаевіч ніколі не пакідаў іх зброі. Калі нельга было забраць адразу, то потым вяртаўся. Адважны санінструктар быў узнагароджаны ордэнам Леніна, а да гэтага ён ужо меў ордэны Чырвонага Сцяга і Чырвонай Зоркі.

Іван Васілевіч Маслаў — лётчык, Герой Савецкага Саюза (17.7.1944), родам з в. Ісакава Мажайскага раёна. На фронце знаходзіўся з першага дня вайны, апошні вылет зрабіў на Берлін 1 мая 1945 г. Камандзір знішчальнай авіяэскадрыллі старшы лейтэнант І. В. Маслаў прымаў удзел у Рагачоўскай наступальнай аперацыі ў лютым 1944 г., у выніку якой быў захоплены плацдарм у раёне Новага Быхава. І. В. Маслаў вылятаў на прыкрыццё савецкіх войск і раёна пераправы цераз Дняпро ад паветранага нападу праціўніка.

У вызваленні г. Быхава ў чэрвені 1944 г. ў складзе 362-й дывізіі прымаў удзел камандзір узвода

І. В. Маслаў.

разведкі Герой Савецкага Саюза **Сцяпан Лаўрэнавіч Ушакоў.** Разведчыкі на чале са сваім храбрым камандзірам узялі 13 «языкоў», знішчылі амаль чатыры ста фашыстаў.

У вызваленні Быхаўшчыны ўдзельнічала і 144-я Крычаўская артылерыйская брыгада (у складзе 50-й арміі). Камандзір брыгады **Канстанцін Аляксандравіч Турчанінаў** за мужныя дзеянні пры фарсіраванні Дняпра ў Быхаўскім раёне быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

Камандзір артылерыйскай батарэі маёр **І. М. Макараў** умела арганізаваў своечасовую дапамогу пехацінцам, якія адбівалі шалёныя контратакі праціўніка пры захопе і ўтрыманні плацдарма на правым беразе Дняпра. Маёр І. М. Макараў быў узнагароджаны ордэнам Леніна.

Перад 1291-м палком была пастаўлена задача прарваць абарону праціўніка на паўднёвы ўсход ад хутара Віляга і авалодаць вышынёй. Бой пачаўся 4 сакавіка 1944 г. Не вытрымаўшы націску савецкіх воінаў, гітлераўцы пакінулі вышыню. Больш дзесяці контратак адбілі на працягу сутак байцы батальёна і рота аўтаматчыкаў, якія ўтрымлівалі вышыню. Умела арганізоўваў сістэму агню камбат **М. І. Вельмесаў.** Мужна дзейнічалі аўтаматчыкі **Васіль Кавалёў, Канстанцін Анціпенка** і іншыя. Пад ураганным агнём своечасова наладжвалі сувязь і рамантавалі пашкоджанні сувязісты на чале з **Р. Ф. Еўдакімавым.** Полк паспяхова выканаў ускладзеную на яго задачу. За гэты бой камандзір палка **С. М. Дзмітрэнка** быў узнагароджаны ордэнам Аляксандра Неўскага, камандзіры батальёнаў адзначаны ордэнамі Чырвонага Сцяга. А ўсяго за гэту баявую аперацыю былі ўзнагароджаны 143 воіны палка.

Цяжкія і доўгія баі ішлі ў раёне Смаліцы, вёска па пекалькі разоў пераходзіла з рук у рукі. У баях за яе вызначыліся кулямётчыкі 110-й стралковай дывізіі **Елкін** і **Хабібулін.** Мінамётчык 82-мм гарматы 1093-га стралковага палка 324-й стралковай дывізіі **Іван Фёдаравіч Гогалеў,** які паранены не пакінуў поля бою, быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені.

23 лютага 1944 г. воіны 1071-га знішчальнага

Быхаўскі гісторыка-краязнаўчы музей

П. С. Маглоў.

М. М. Яфрэменка.

супрацьтанкавага артпалка паміж вёскамі Стараселле і Лудчыцы ўступілі ў паядынак з 10 варожымі танкамі. У цяжкім баі чырвонаармейцы падбілі больш за палавіну танкаў, астатніх прымусілі павярнуць назад. Камандзіры гармат **А. Адуеў, А. Дзіж,** наводчык **В. Налдзін** былі ўзнагароджаны ордэнамі Славы, наводчык **Р. Ткачэнка** — ордэнам Чырвонай Зоркі, зараджальшчыкі **В. Велесь, М. Півавар,** радыст **М. Стацэнка** — медалямі «За адвагу».

Камандзір 5-й батарэі 887-га стралковага палка 324-й дывізіі **Мікалай Міхайлавіч Яфрэменка** вызначыўся ў баях пад в. Красніца, яго аднапалчанін сувязіст **Пётр Сяргеевіч Маглоў** — у баях за в. Мокрае, зараз ён з'яўляецца ганаровым грамадзянінам гэтай вёскі.

936-ы артылерыйскі полк 362-й дывізіі ўдзельнічаў у вызваленні Быхава. За адвагу і мужнасць у баях ордэнам Славы III ступені быў узнагароджаны камандзір гарматы старшы сяржант **І. С. Бітус.** Старшы сяржант **А. М. Груздоў** атрымаў ордэн Славы II ступені. Шчырай падзякі ад камандзіра палка М. М. Хахаева заслужылі камандзіры аддзяленняў сапёраў **П. П. Селязнёў,** сувязі **А. А. Арканаў** і **А. В. Антонаў,** медыцынскія сёстры **Е. В. Зарубіна, Е. А. Пакулева** і іншыя.

Вясной 1944 г. цяжкія баі ў раёне Быхава вяла 362-я стралковая дывізія. Пасля некалькіх шалёных контратак фашысты пачалі псіхічную атаку. Але савецкія воіны стаялі насмерць. Кулямётчык **Нургаліеў,** цяжка паранены ў абедзве нагі, працягваў бой, пакуль не страціў прытомнасць. Вызначыліся ў гэтым баі таксама старшы сяржант **Шабалін,** радавы **Давыдзенка** і іншыя воіны.

Упартыя баі ішлі за в. Хамічы — буйны апорны пункт ворага. Артылерысты першымі пачалі агонь па ўмацаваннях фашыстаў. Толькі батарэяй гвардыі капітана **Жураўлёва** было разбурана шэсць дзотаў. Мужна дзейнічалі і сапёры. Яны зрабілі дваццаць праходаў у драцяных загародах праціўніка. Асабліва вызначылася аддзяленне сяржанта **Г. Марозава.** Ён асабіста абясшкодзіў у начной цемры 12 варожых мін. За гэты бой ён быў узнагароджаны ордэнам Славы II ступені (пазней Марозаў стаў поўным кавалерам ордэна Славы). Рашуча дзейнічалі ў гэтым баі і пехацінцы. Асабліва вызначыліся старшы сяржант **Ш. Байматаў,** камандзір узвода лейтэнант **М. Кузнеў,** радавы **Сафронаў,** сяржанты **Даурбаеў** і **Крахінаў,** камсорг **С. Логінаў,** кулямётчыкі **С. Галубчыкаў, А. Сарокін, І. Мандрыкін** і іншыя.

Немагчыма пералічыць імёны ўсіх воінаў Чырвонай Арміі, якія, не шкадуючы свайго жыцця, змагаліся за вызваленне быхаўскай зямлі ад фашысцкай навалы. Удзячныя быхаўчане ніколі не забываюць аб тым, якой цаной дасталіся нам свабода і незалежнасць, нізка схіляюць свае галовы перад бессмяротным подзвігам савецкіх воінаў у самай цяжкай з войнаў.

Крутымі дарогамі вайны

Прапахла потам гімнасцёрка,
Ад солі зрубянела ўся.
У горле суха, у роце горка,
Баліць і цела, і душа.
А мы ідзём. Пячэ спякота.
Здаецца, тоны на нагах.
Хвала табе, мая пяхота,
На ўсіх дарогах і шляхах!
Табе прыйшлося, як нікому,
У той час суровы і цяжкі.
З цябе б намаляваць ікону,
Каб пакланяліся вякі.

* * *

Ішлі палкі на адпачынак,
Салдат з палёгкай уздыхаў
Аб родным краі, аб Айчыне,
Дзе ён даўно ўжо не бываў.
Наўкол было чужое неба,
Зямля чужая і вада.
Яму свая Радзіма трэба,
Свая і радасць, і бяда.
Раскажа ён прасторам Волгі,
Як браў з «Кацюшаю» Берлін,
Як над рэйхстагам сцяг свабоды,
Наш сцяг Чырвоны ўзнялі.

В. Карпечанка.

Тысячы быхаўчан сталі на абарону сваёй Радзімы ў цяжкі для яе час. Яны абаранялі Брэсцкую крэпасць, Ленінград, Маскву, прымалі ўдзел у Сталінградскай і Курскай бітвах, вызвалялі родную Быхаўшчыну, народы Еўропы, бралі Берлін.

Быховский районный историко-краеведческий музей

В. В. Карпечанка.

В. М. Мельнікаў.

Р. К. Берсянёў.

Ф. Н. Белачкін.

Аўтар прыведзеных вершаў **Васіль Васілевіч Карпечанка** быў яшчэ школьнікам, калі пачалася вайна. А восенню 1943 г. яму ў складзе 186-й дывізіі давялося вызваляць Быхаўскі раён. Дайшоў да Усходняй Прусіі, тройчы быў паранены. За мужнасць у баі пры вызваленні в. Чырвоны Бераг Быхаўскага раёна ўзнагароджаны ордэнам Славы III ступені, а за бой ля г. п. Ломжа — медалём «За адвагу».

Давялося вызваляць родную Быхаўшчыну былым партызанам, а пасля воінам Чырвонай Арміі **Пятру Аляксандравічу Стральцову, Венядзікту Мікітавічу Мельнікаву** — кавалеру ордэнаў Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, Чырвонага Сцяга (у баях на тэрыторыі Польшчы, у раёне г. Шчэціна камандзір супрацьтанкавай гарматы сяржант В. Мельнікаў падбіў танк, 3 бронетранспарцёры і самаходку гітлераўцаў), бясстрашнаму разведчыку **Мікалаю Міхайлавічу Анціпенку,** які не аднойчы хадзіў брацьі «языка» за лінію фронту, Прывялі франтавыя дарогі на родную Быхаўшчыну **Антона Ільіча Лапаткова,** вадзіцеля пантоннага батальёна. Праўда, родную вёску Няраж вызваляць яму не давялося, у баі пад Смаліцай быў паранены, а яго аднавяскоўцы браты Каржовы загінулі. Нерамогу сустрэў Антон Ільіч пад Берлінам. А вось старшаму сяржанту, камандзіру аддзялення супрацьтанкавых ружжаў **Сяргею Фёдаравічу Кучараву** на рэдкасць пашанцавала — ён вызваляў ад гітлераўцаў родную вёску Віляга. У жорсткім баі чырвонаармейцы падбілі некалькі варожых танкаў, у т. л. адзін з іх сам камандзір. За гэты бой ён быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, а пасля быў яшчэ ордэн Славы III ступені, медаль «За адвагу» і іншыя ўзнагароды. У складзе 3-й арміі прыйшоў на родную Быхаўшчыну **Рыгор Клаўдзіевіч Берсянёў.** Шмат у яго ўзнагарод, але першы ордэн — Чырвонай Зоркі — асабліва памятны. Браты **Фёдар** і **Еўдакім Шчэпавы** прыйшлі ў Быхаўскі раён у складзе 380-й стралковай дывізіі. Фёдар быў удзельнікам вызвалення Заходняй Беларусі, савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. За некалькі дзесяткаў кіламетраў пралягаў іх шлях ад роднай вёскі Хамічы, так і не змаглі яны ўбачыць сваіх родных, ад якіх не было ніякіх вестак. За бой пад Ядранай Слабадой, што ў Клічаўскім раёне, Фёдар быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Еўдакім загінуў у баях пад Мінскам. А сям'ю Фёдара Дзянісавіча, як потым стала вядома, напаткаў страшэнны лёс. Адступаючы, гітлераўцы гналі мірных жыхароў за сабой. Разам з імі была і жонка Фёдара з пяцярымі дзецьмі. У дарозе памерла чацвёра дзяцей, а з шасцігадовым Валодзем змагла вярнуцца Матруна Міхайлаўна ў спаленую вёску. Але сіл хапіла толькі на тое, каб адвезці сына да блізкіх. У 1945 г. Фёдар Дзянісавіч даведаўся аб лёсе родных. Яму далі кароткатэрміновы водпуск, і ў часць ён вярнуўся ўдвух з сынам Валодзем. Начальнік штаба 325-га палка гвардзейскіх мінамётаў («кацюш») маёр **Фёдар Нічыпаравіч Белачкін** родам з Лудчыц. 4 красавіка 1944 г. полк прыбыў у раён Быхава, які быў тады ў руках ворага, і заняў агнявыя пазіцыі на лясных палянах на ўсход ад саўгаса «Вараніно». Гітлераўцы рыхтавалі там буйную наступальную аперацыю. Але нашы мінамётчыкі апярэдзілі іх, абрушыўшы на галовы ворага 128 рэактыўных снарадаў. Ф. Н. Белачкін знаходзіўся на фронце з першага да апошняга дня вайны, праявіў сябе як мужны і валявы камандзір, узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны і Чырвонай Зоркі.

Былы партызан **Леанід Сямёнавіч Касцюкевіч** пасля вызвалення раёна ў складзе войск 3-га Беларускага фронту вызваляў Польшчу, штурмаваў Кёнігсберг, удзельнічаў у Берлінскай аперацыі. Ён са сваім аддзяленнем на амфібіі фарсіраваў Одэр. На сярэдзіне ракі фашысцкі снарад трапіў у машыну. Тады Леанід разам з аддзяленнем пад шалёным агнём праціўніка ўплаў пераправіўся на варожы бераг і з ходу ўступіў у бой. За гэты подзвіг Л. С. Касцюкевіч

Быховский районный историко-краеведческий музей

Л. С. Касцюкевіч.

М. У. Пазнякоў.

М. М. Калеснікаў.

К. Р. Валькоўскі.

атрымаў ордэн Славы III ступені. А да таго ён быў узнагароджаны двума медалямі «За адвагу», двума ордэнамі Чырвонай Зоркі.

Быхаўчанін **Сяргей Фёдаравіч Азярны,** кавалер ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга, заслужаны работнік прамысловасці БССР у час вайны быў партызанам, потым стаў наводчыкам супрацьтанкавай гарматы ў адной з часцей 1-га Украінскага фронту. Узнагароджаны ордэнам Славы III ступені, медалём «За адвагу».

Міхаіл Сцяпанавіч Камаровіч з Трасціўца быў партызанам 152-га палка. Пасля ваяваў у складзе 362-й стралковай дывізіі. Удзельнічаў у вызваленні многіх гарадоў і вёсак Беларусі, Польшчы. За мужнасць пры фарсіраванні Віслы быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені. А за адважныя дзеянні пры фарсіраванні Одэра і ўтрыманне плацдарма — ордэнам Славы II ступені. Міхаіл Сцяпанавіч успамінае: «У сярэдзіне красавіка наш полк наведаў маршал І. К. Жукаў. А неўзабаве пачаўся штурм Берліна. 30 красавіка мы нанеслі сакрушальны артылерыйскі агонь па нямецкім аэрадроме. Ніводны самалёт не ўзняўся ў паветра. А 1 Мая мы ўбачылі, як над рэйхстагам залунаў Чырвоны Сцяг. Якая вялікая была наша радасць!»

У складзе рэгулярных часцей Чырвонай Арміі заканчвалі вайну былыя партызаны **Фёдар Лукіч Сурынаў** з Лудчыц, **Цярэнцій Іванавіч Сяброўскі** з Смаліцкі і многія іншыя.

На заходняй граніцы сустрэлі ў 1941 г. вайну: палітработнік **Міхаіл Ульянавіч Пазнякоў,** кавалер двух ордэнаў Чырвонага Сцяга, двух ордэнаў Чырвонай Зоркі, ордэна Айчыннай вайны I ступені; сяржант, механік-вадзіцель танка **Дзмітрый Міхайлавіч Старавойтаў,** які ўдзельнічаў пасля ў Сталінградскай і Курскай бітвах, дабіваў ворага на тэрыторыі Германіі, узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі; лейтэнант **Мікалай Маркавіч Калеснікаў,** які закончыў вайну ў Прыбалтыцы ў 1945 г. ў званні маёра, быў тройчы паранены, некалькі разоў кантужаны, узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і Чырвонай Зоркі.

Сталіцу нашай Радзімы — Маскву абаранялі **Пётр Харытонавіч Уласаў,** які потым вызваляў Украіну, родную Беларусь, Польшчу, Венгрыю, браў Берлін, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За адвагу» і іншымі; кавалер ордэна Чырвонай Зоркі **Марк Іванавіч Буканаў,** якому давялося ўдзельнічаць у парадзе на Краснай плошчы 7 лістапада 1941 г.; удзельнічаў у гэтым парадзе і **Уладзімір Васілевіч Каліноўскі,** які абараняў Маскву ў складзе 316-й стралковай дывізіі пад камандаваннем І. В. Панфілава; **Кірыл Цітавіч Палазкоў,** які 9 мая 1945 г. сустрэў у Празе, узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалём «За адвагу» і іншымі ўзнагародамі СССР, «Ваенным крыжам» і трыма медалямі Чэхаславакіі.

Канстанцін Рыгоравіч Валькоўскі з Баркалабава сустрэў вайну ў Карэліі, дзе служыў у пагранічных войсках, потым прымаў удзел у Сталінградскай бітве. Спачатку быў радавым байцом у мінамётным разліку, потым стаў камандзірам «кацюшы». Быў тройчы паранены. За трапны агонь па Мамаевым кургане, дзе акапаліся фашысты, быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Мікалай Цярэнцьевіч Камандышка — удзельнік грамадзянскай вайны. І ў Вялікую Айчынную вайну ён з першага і да апошняга дня на розных франтах. За праяўленую адвагу палкоўнік М. Ц. Камандышка быў узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

Храбра грамілі ворага лётчыкі — ураджэнцы Быхаўшчыны. **Мікалая Сяргеевіча Куляшова** з Следзюкоў вайна застала ў Ленінградзе, дзе ён вучыўся ў фабрычна-заводскім вучылішчы. Па «дарозе жыцця» цераз Ладажскае возера быў вывезены разам з іншымі падлеткамі на Вялікую зямлю, стаў працаваць на заводзе ва Ульянаўску. Пасля сканчэння школы паветраных стралкоў

Быховский районный историко-краеведческий музей

М. Ц. Камандышка.

І. С. Ганчароў.

М. С. Камаровіч.

Я. Ф. Сідараў.

быў накіраваны ў авіяцыйны корпус, якім камандаваў Герой Савецкага Саюза Г. Байдукоў. У М. С. Куляшова 92 баявыя вылеты. Удзельнічаў у вызваленні Жлобіна, Бабруйска, Польшчы, у баях ва Усходняй Прусіі, Германіі. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны І і ІІ ступеней, медалём «За адвагу» і іншымі. Паветраны стралок-радыст **Іван Сідаравіч Ганчароў** пачаў свой баявы шлях з парада на Краснай плошчы 7 лістапада 1941 г. Ён тады якраз скончыў школу малодшага лётнага каманднага саставу. Ваяваў на Заходнім, на 1-м і 2-м Прыбалтыйскіх, на Ленінградскім і 3-м Беларускім франтах. За смеласць і ініцыятыву быў узнагароджаны ордэнам Славы ІІІ ступені, ордэнам Вялікай Айчыннай вайны ІІ ступені, медалямі «За адвагу», «За баявыя заслугі». Лётчык, камандзір звяна штурмавога авіяпалка **Андрэй Іванавіч Масюкоў** зрабіў на сваім Іл-2 каля ста баявых вылетаў, закончыў вайну ў Германіі. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Айчыннай вайны І і ІІ ступеней. З 1941 г. да апошніх дзён вайны ваяваў у авіяцыі старшына **Антон Аляксеевіч Сакалоў.**

Павел Васілевіч Далгіх у складзе танкавага палка змагаўся з ворагам на Паўночным Каўказе. Пры высадцы дэсанта ў раёне Керч — Феадосія быў паранены. Пасля вяртання са шпіталя быў прызначаны камандзірам роты бранябойшчыкаў на Малую зямлю. Павел Васілевіч расказвае: «Вораг любой цаной імкнуўся захапіць вышыню, на якой замацавалася рота. За дзень мы адбівалі па 10—12 атак. З усёй роты засталіся жывымі некалькі чалавек. Але вышыню мы ворагу так і не аддалі». Закончыў вайну П. В. Далгіх у Берліне. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Славы ІІІ ступені, медалём «За адвагу».

Піліп Кузьміч Карпенка сустрэў вайну ў Пінску, потым удзельнічаў у баях пад Гомелем. Быў разведчыкам на Бранскім фронце, а пасля механікам-вадзіцелем у 12-м разведбатальёне 4-га танкавага корпуса. На ўсё жыццё запомніў Піліп Кузьміч танкавы бой, у якім з нашага боку было 58 танкаў, з варожага — 80. Яго танк тады быў падбіты, а сам ён цудам выратаваўся ад смерці. Пасля ўдзельнічаў у Сталінградскай бітве, вызваляў Нікалаеў, Адэсу, дайшоў да Одэра, штурмаваў Берлін. Узнагароджаны ордэнамі Славы ІІІ і ІІ ступеней, медалямі.

Абаронцы Ленінград кавалер ордэна Чырвонага Сцяга **Еўдакім Емяльянавіч Башарымаў,** снайпер **Іван Апанасавіч Васількоў.** У лютым 1942 г., пасля сканчэння палкавой школы снайпераў І. А. Васількоў адкрыў свой асабісты рахунак знішчаных гітлераўцаў, а к канцу вайны гэта лічба дасягнула 68. Пад Ленінградам і Псковам, на Ладажскім возеры суткамі высочваў ён ворага. Іван Апанасавіч узнагароджаны ордэнам Славы ІІІ ступені, медалём «За адвагу» і іншымі.

Фёдар Антонавіч Шалянкоў з Палянінавіч на фронце з 23 чэрвеня 1941 г., ваяваў пад Курскам і Арлом, вызваляў родную Беларусь, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Быхаўчанін **Дзмітрый Данілавіч Гашкоў** ваяваў на Калінінскім і Заходнім франтах, вызваляў Чэхаславакію, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны ІІ ступені.

Мікалай Лявонавіч Дудкоў пачаў ваяваць з ворагам на Поўначы, у раёне Кандалакшы, потым служыў у 32-й стралковай брыгадзе Волхаўскага фронту, у цяжкіх баях пад Ціхвінам замяніў камандзіра роты, 2 разы быў цяжка паранены, вайну закончыў у складзе чыгуначных войск, дадому вярнуўся толькі ў 1946 г.

Маёр **Іван Нічыпаравіч Кравец** камандаваў інжынернай штурмавой ротай у час баёў на адным з перавалаў галоўнага Каўказскага хрыбта.

Васіль Малахавіч Азараў удзельнічаў у баях на Заходнім, Калінінскім, Паўднёва-Заходнім, Бранскім, 1-м і 2-м Прыбалтыйскіх, 3-м Беларускім франтах. Узнагароджаны 2 ордэнамі «Чырвонай Зоркі», медалямі.

З першага да апошняга дня знаходзіўся на фронце **Сяргей Хрысанавіч Шалыгін.** Быў паліт-

Быховский районный историко-краеведческий музей

руком, камандаваў ротай, быў начальнікам сувязі палка.

Якаў Фёдаравіч Сідараў быў камандзірам батарэі на Закаўказскім фронце, потым ваяваў на 1-м Украінскім, удзельнічаў у Львоўска-Сандамірскай аперацыі, вызваляў Заходнюю Украіну, Польшчу. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны, Чырвонай Зоркі. Якаву Фёдаравічу выпала шчасце камандаваць групай артылерыі, якая давала гістарычны салют у гонар Перамогі над фашысцкай Германіяй.

Быхаўчанін **Фёдар Піліпавіч Ільюшчанка** ў 19 год (з красавіка 1943 г.) стаў партызанам 425-га партызанскага палка Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы. Пасля злучэння з перадавымі часцямі Чырвонай Арміі ў лютым 1944 г. ваяваў у дзеючай арміі. Вызваляў Быхаў, пры фарсіраванні ракі Нёман быў цяжка паранены. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі, многімі медалямі.

Усяго некалькі дзесяткаў прозвішчаў з тысяч, некалькі фрагментаў з мноства біяграфій... Колькі было іх, быхаўчан, маладых і сталых, сямейных і халастых, зусім бязвусых юнакоў, якія вынеслі на сваіх плячах нялёгкую ношу салдата Вялікай Айчыннай. Кожны з іх, хто дажыў і хто не дажыў да пераможнага мая, хто названы і не названы ў гэтай кнізе, зрабіў свой уклад у агульную справу Перамогі. Вялікая і шчырая ўдзячнасць патомкаў усім ім за тое, што яны зрабілі ў імя будучага!

Камбат Арлоўскі

Мемарыяльная дошка К. І. Арлоўскаму на будынку дзіцячага сада № 4 у Быхаве.

Канстанцін Іванавіч Арлоўскі — Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 15.12.1913 г. ў Быхаве. З сялян. Беларус. Скончыў Бабруйскае танкавае вучылішча (1939). У Чырвонай Арміі з 1934 г. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г., савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. У час Вялікай Айчыннай вайны на фронце з ліпеня 1941 г. Камандзір танкавага батальёна капітан К. І. Арлоўскі вызначыўся ў ліпені 1944 г. пры вызваленні Латвіі. Батальён над яго камандаваннем двойчы прарываў лінію абароны праціўніка на дзвінскім участку фронту, за 8 дзён наступлення прайшоў з баямі каля 300 км, перарэзаў шашу і чыгунку Дзвінск — Рэзекне, закрыў шлях да адступлення дзвінскай групоўцы праціўніка, знішчыў 12 танкаў, 8 танкетак, 8 самаходных і больш чым 40 супрацьтанкавых гармат, каля 300 гітлераўцаў. К. І. Арлоўскі загінуў у баі 22.7.1944 г. Пахаваны ў брацкай магіле ў г. Даўгаўпілс Латвійскай ССР. Яго імем названы вуліцы ў Быхаве і Даўгаўпілсе, 2 завулкі ў Быхаве, на будынку дзіцячага сада па вуліцы Леніна, дзе размяшчалася школа, у якой ён вучыўся, устаноўлена мемарыяльная дошка.

Вышэй сярэдняга росту, імклівы, з хуткім дапытлівым позіркам, Канстанцін Іванавіч лічыўся сярод сваіх сяброў-танкістаў чалавекам нястомным. Здавалася, што ён можа знаходзіцца ў танку суткамі.

— У мяне свой рахунак з фашыстамі,— сказаў неяк Канстанцін сваім сябрам.

...У ліпені 1941 г. ў адным з цяжкіх баёў танк Арлоўскага быў падбіты, а ён, паранены, схоплены фашыстамі. Жудасныя дні палону, зверствы гітлераўцаў, разлічаныя на тое, каб або знішчыць чалавека, або прымусіць яго страціць чалавечае аблічча. Але не такім быў Канстанцін Арлоўскі. Калі рана крыху загаілася, ён з групай сяброў уцёк з палону, з іх дапамогай дабраўся да сваіх. Працяглы час знаходзіўся ў шпіталі, а пасля — зноў на фронце. За ўзорнае выкананне баявых заданняў камандаванне ўзнагародзіла яго ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

...Летам 1944 г. К. Арлоўскі прымаў удзел у вызваленні Латвіі. Раніцай 21 ліпеня на ўчастку дзеяння 100-га корпуса загрымела артылерыйская канапада. Наша артылерыя ўзламала ўмацаваны абарончы рубеж ворага. Танкавы корпус рушыў у прарыў. 1-ы танкавы батальён капітана Арлоўскага ішоў на чале перадавога атрада 41-й танкавай брыгады корпуса.

Брыгада за апошнія дні прайшла з баямі больш чым 300 кіламетраў, і батальён Арлоўскага на працягу ўсёй аперацыі вызначаўся зладжанасцю,

Быховский районный историко-краеведческий музей

імклівасцю манеўра, трапнасцю агню. Ні адной паломкі, ні аднаго адсталага і страчанага танка.

І вось зараз прадстаяў цяжкі, упарты бой на галоўным напрамку. Танкі ў вызначаны тэрмін сканцэнтраваліся ва ўказаным для іх раёне. Арлоўскі абышоў экіпажы, усё дакладна праверыў.

Вось як апісваюцца ва ўзнагародным лісце дзеянні камбата Арлоўскага і яго батальёна ў баі за вызваленне Даўгаўпілса:

«...У баях з нямецкімі захопнікамі з 17 па 22 ліпеня 1944 года капітан Арлоўскі праявіў цудоўныя валявыя і арганізатарскія якасці як камандзір. Яго батальён двойчы прарываў умацаваную паласу праціўніка, выходзіў у тылы, няшчадна граміў там штабы, абозы, рваў камунікацыі праціўніка, раз'ядноўваў яго дзеянні, дэзарганізоўваў кіраванне і прымушаў гітлераўцаў адступаць, даючы такім чынам брыгадзе і корпусу магчымасць рушыць у прарыў і неадступна праследаваць праціўніка на вялікую глыбіню...»

Войскі арміі сумесна з танкавым корпусам зламалі абарону і ўшчэнт разбілі 200-ю пяхотную дывізію гітлераўцаў. Яны авалодалі важнейшымі апорнымі пунктамі ў сістэме абароны ворага. Менавіта ў гэтым жорсткім баі вызначыўся 1-ы

К. І. Арлоўскі.

Дз. Я. Аскаленка.

танкавы батальён капітана К. І. Арлоўскага. Гэта яго танкі першымі ўварваліся ў размяшчэнне праціўніка, перарэзалі шашу і чыгунку Дзвінск — Рэзекне і закрылі шлях адыходу варожай групоўцы войск.

На гэтым рубяжы, стрымліваючы шалёны націск контратакуючага ворага, і загінуў смерцю героя капітан Арлоўскі. *П. Баўман.*

Абаронца Ленінграда

Дзмітрый Яфімавіч Аскаленка — Герой Савецкага Саюза (14.2.1943). Нарадзіўся ў 1920 г. ў в. Следзюкі Быхаўскага раёна. З сялян. Член КПСС. Скончыў 3 курсы Мінскага політэхнічнага тэхнікума (1937). Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939 — 1940 гг. У час Вялікай Айчыннай вайны на фронце з чэрвеня 1941 г. Камандзір звяна знішчальнага авіяпалка старшы лейтэнант Дз. Я. Аскаленка вызначыўся пры абароне Ленінграда; адзін з першых авалодаў тэхнікай начных палётаў. У паветраных баях над Ленінградам ён асабіста збіў 14 самалётаў праціўніка, 10 — у групавых баях. Загінуў у паветраным баі 26.9.1942 г. Імем героя названы эскадрылля, у якой ён ваяваў, вуліцы ў Ленінградзе і Быхаве, завулак у Быхаве; у в. Следзюкі на будынку школы, дзе ён вучыўся, устаноўлена мемарыяльная дошка.

На Ленінградскім фронце не было лётчыка, які не ведаў бы імя паветранага аса Дзмітрыя Аскаленкі. Аб ім пісалі ў газетах, расказвалі па радыё, яго імя перадавалася ад аднаго лётчыка да другога. Дз. Аскаленка першым на Ленінградскім фронце збіў варожы самалёт у начным баі, адным з першых стаў лятаць і праследаваць ворага ноччу. Яго паважалі і любілі за прастату і выключную сціпласць, самаадданасць, вернасць баявому сяброўству, за мужнасць і майстэрства ў баі.

26 верасня 1942 г. шасцёрка савецкіх знішчальнікаў І-16 завязала над Іванаўскім «пятачком», той пядзяй зямлі каля Неўскай Дубраўкі, дзе ўвосень 1942 г. ішлі асабліва жорсткія баі, паветраны бой супраць 8 варожых Ме-109. Самалёт Аскаленкі быў збіты. Лётчык пакінуў машыну, але парашут не раскрыўся, бо скачок быў зроблены з малой вышыні. І ў апошнім баі Дзмітрый застаўся верным сабе — перш чым кулямётная чарга прашыла яго самалёт, ён паспеў збіць яшчэ аднаго фашыста.

З франтавых пісем Дз. Аскаленкі сваёй жонцы Ніне

«Да, Нинуля, не сбылись наши мечты провести следующий вечер вместе. Ты, конечно, не могла не заметить неопределенности в моем голосе, когда я обещал прийти к тебе и сердито посмотрел на красивую, но злосчастную луну. Короче говоря, через три дня после нашего расставания моя машина была подбита, и я кое-как дотянул до линии фронта. Приземлился на огородике, где, к великой радости, были наши. Сейчас чувствую себя хорошо. А как чувствовал себя тогда — не помню. Небольшой осколок повредил мне нос и лоб. Придется немного полежать».

«Знаешь, Нинка, сегодня бесчисленное число посетителей совершенно меня расстроило. Хорошо быть здоровому, знать, что ты можешь выполнять любое дело, любое задание. И как плохо лежать на больничной койке. Не дождусь, когда выпишут.

Быховский районный историко-краеведческий музей

И снова в бой. Нина, дорогая, пиши чаще. Очень соскучился. Всегда твой».

«Спешу поделиться радостью. Я на старом месте. Влился в настоящую боевую жизнь. Тянет в бой. Скорее бы! Привет от Яши и Лешки. Они здорово дерутся!»

«Сегодня Федя Скрипниченко передал мне твое письмо. Как раз перед ночной работой. Ты не представляешь себе, как я обрадовался. И это, пожалуй, обеспечило успех. В ту же ночь летал на штурмовку и заставил замолчать одну зенитку. Вот что значит хорошее настроение. Пиши, не забывай».

«Очень рад твоей весточке. Да, красиво ты пишешь о лесе, где бродишь по снегу, валишь деревья. Я, дорогая, в том лесу вырос. Потом уехал и, признаться, стал понемногу отвыкать от прежней жизни. Но вот твои воспоминания о лесной избушке и будущей нашей жизни в ней, о твоем согласии следовать за мной повсюду глубоко тронули меня. Жизнь! Какая все-таки это чудесная штука! Всеми силами я буду драться за каждую минуту жизни не только своей, но и твоей, всех честных людей».

«Очень много приходится работать. Ночью летаю в бой, а днем вожу в строй молодежь. Вот так и живем...

А в том ночном, что я тебе писал, все говорят, что я здорово отличился. Ведь это же первый случай».

«Ничего нового нет в моей жизни. Все собираюсь съездить на рентген — что-то беспокоит в боку. А в общем все в порядке. Знаешь, как-то совестно болеть. Вылетишь в бой, и все болезни проходят. Сегодня Мациевич получил от Вани Автухова письмо, такое патриотическое, с большим стихотворением, посвященным мне. Вот чудак! Придется отругать его как следует. Подумаешь — писатель. Заставляет меня краснеть».

«Жив-здоров и вообще все в порядке. Третьего еще увеличил счет на одного стервятника. Сегодня все спокойно. Наверное, будем ночью работать, потому что очень ясная погода. В эти дни я почему-то очень много думаю о жизни. Хорошая жизнь! Из-за этого мы воюем, чтобы жить. И у нас есть любовь, преданность Родине. И ради Родины мы готовы на все, даже на смерть. Не думай, что это сказано для красного словца. Нет, Нина, так поступает каждый из нас, когда требуется...»

«Пишу тебе, Нина, после очень жаркого боя. На глазах потерял одного парнишку, сам зверски устал, четыре часа дрался, шею натер — не повернуть, но фашисты получили сполна. Свой счет увеличил еще на одного. Уже темнеет, писать почти невозможно, да и для ночки работа предстоит. Крепко целую. Навеки твой».

«Только что получил от тебя письмо. Ты обижаешься, что мало пишу. Нет, дорогая, два дня назад я послал тебе письмо, хотя времени почти не было. Молодежь выводил ночью. Толковые ребята. Будут хорошими помощниками в боях. Сегодня отдыхаем. После ужина все разбежались. Остался командир, Ионыч. Поговорили по душам. Я подсчитал свои дела. Ни много ни мало, а четырнадцать фашистов я срубил, причем троих ночью. И все же мало, Нина. Надо больше, без счета. Ненавижу я их, а потому и рука моя так страшна для врага, поэтому и недоволен я тем, чего достиг в бою. До тех пор, пока я жив, я буду без устали бить проклятых гадов, бить так, чтобы другого пути, как в могилу, у них не оставалось...»

Мацней за браню

Л. С. Данілюк.

Леанід Сямёнавіч Данілюк — Герой Савецкага Саюза (31.5.1945). Нарадзіўся 3.5.1919 г. ў в. Студзёнка Быхаўскага раёна. З служачых. Беларус. Член КПСС з 1942 г. Скончыў Магілёўскі педінстытут (1939), Тбіліскае артылерыйскае вучылішча (1941). У Чырвонай Арміі з 1939 г. У час Вялікай Айчыннай вайны на Паўночна-Заходнім, 2-м Украінскім, 1-м Беларускім франтах. Камандзір самаходнага артылерыйскага палка маёр Л. С. Данілюк вызначыўся ў Берлінскай аперацыі. 18.4.1945 г. па яго ініцыятыве полк атакаваў ворага каля г. Бернаў. На падбітай самаходнай гармаце Данілюк прарваўся на ўскраіну горада, выклікаў паніку ў радах праціўніка, што садзейнічала паспяховаму наступленню корпуса. Да 1955 г. служыў у Савецкай Арміі, падпалкоўнік. Працаваў у Харкаве, Магілёве. Апошні час жыў у Рагачове. Памёр 24.9. 1987 г. Пахаваны ў Быхаве. Імем Л. С. Данілюка названа школа ў Бернаў (ГДР).

Асабістай мужнасцю лейтэнант-артылерыст Л. Данілюк паказваў прыклад байцам свайго ўзвода. За ўмелыя і храбрыя дзеянні ў баі за адну з вышынь Леанід атрымаў ордэн Чырвонага Сцяга. Цяжкасць выканання задачы заключалася ў тым, што ворагаў было ўтрая больш. Але чырвонаармейцы ўтрымалі вышыню, яны знішчылі 150 варожых салдат. У тым баі Данілюк быў

Быховский районный историко-краеведческий музей

цяжка паранены. Пасля доўгіх месяцаў лячэння ў шпіталі ён атрымаў строгі прысуд медыцынскай камісіі: да далейшай службы ў страявых часцях непрыгодны. Леанід не мог змірыцца з гэтым, рапарт за рапартам пісаў ён і нарэшце восенню 1943 г. дабіўся накіравання на фронт. Намеснікам камандзіра самаходна-артылерыйскага палка прымаў удзел у баях пад Александрыяй, Знаменкай, Кіраваградам. У баі за Александрыю Данілюк кіраваў трыма батарэямі палка, якія знішчылі 13 танкаў, 8 аўтамашын з пяхотай, 4 гарматы і каля дзвюх рот пяхоты праціўніка. Паранены, не пакінуў поля бою, працягваў кіраваць падраздзяленнямі. За гэты гераічскі бой на грудзях Леаніда заззяў другі ордэн Чырвонага Сцяга. А потым Л. С. Данілюк ужо як камандзір палка вызваляў родную Беларусь, умела правёў самастойную аперацыю па вызваленні Брэста, за што палку было прысвоена ганаровае найменне «Брэсцкага», далей яго баявы шлях пралягаў праз Польшчу, і нарэшце — фашысцкая Германія. Увесь час полк ішоў у баявых парадках пяхоты і агнём і гусеніцамі расчышчаў ёй шлях. За ўмелае правядзенне наступальных аперацый Л. С. Данілюк быў узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней і трэцім ордэнам Чырвонага Сцяга. І вось — Берлінская аперацыя, авалоданне горадам Бернаў, калі пасля лабавой атакі палка гарнізон горада-крэпасці вывесіў белы флаг. Ужо пазней, праз шмат гадоў асэнсаваў Леанід Сямёнавіч, што такая імклівая атака і як вынік яе белы сцяг над крэпасцю захавалі многія жыцці і нашых салдат, і мірных жыхароў горада, выратавалі старажытны Бернаў ад разбурэнняў, якія магла прынесці зацяжная артылерыйская асада. Акрамя таго, як высветлілася, гітлераўцы збіраліся ўзарваць горад перад здачай. Учынак, імя якому подзвіг, яко тады правільна ацаніла камандаванне і Маршал Савецкага Саюза Г. К. Жукаў напісаў на ўзнагародным лісце: «З малымі ахвярамі ўзяў крэпасць. Дастойны прысваення звання Героя Савецкага Саюза». А да рэйхстага, дзе распісаўся Леанід Данілюк, заставалася 13 кіламетраў, якія пераадольвалі 21 дзень — так цяжка заваёўвалася Перамога.

З успамінаў Л. С. Данілюка

Бернаў вінчэрыўся артылерыйскімі байніцамі, кішэў, як тараканамі, карычневымі «фаўстнікамі». Фюрэр істэрычна клікаў да татальнага супраціўлення. Бернаў, апяразаны крапасной сцяной таўшчынёй да 6 метраў, прыкрываў Берлін, да якога было рукой падаць. Франтальная атака танкавага корпуса захлынулася. З горыччу глядзеў я на палаючыя танкі і самаходкі. У гэты момант палкавая разведка далажыла пра пралом у сцяне — вузкі, але танкі павінны прайсці. Так з'явіўся шанц узяць крэпасць раптоўна, прарвацца ў яе праз пралом. Усім агнявым сродкам загадаў паліць па ім, а сам павёў полк у атаку. Мая «трыццацьчацвёрка» першай апынулася ў праломе, падмяла пад сябе супрацьтанкавую гармату, а за ёй ішлі і расцякаліся паўз крапасную сцяну нашы самаходкі з аўтаматчыкамі на броні. І тут, нібы метэарыт — расплаўлены, гарачы, прашыла балванка танк. Дробныя асколкі брані сцебанулі па камбінезоне. Запахла гарэлай фарбай. Двое з экіпажа былі забіты. Механік вёў параненую машыну на артылерыйскую ўстаноўку. На шчасце, цэлай аказалася рацыя. І хоць я быў моцна аглушаны, пачуў у шлемафоне голас камандзіра корпуса:

— Данілюк, маёр, дзе знаходзішся, чаму не дакладваеш? Што з палком?

— У Бернаў, таварыш генерал. Мінуты дзве, як у Бернаў,— адказваю.

— Трымайся, маёр. Іду на падмогу.

Танк давялося пакінуць. Шкада, добрая машына была. Яшчэ з Польшчы на ёй ваяваў, а боем кіраваў прама ад крапасной сцяны.

Дарэчы, за час вайны згарэла дзве самаходкі і чатыры танкі, на якіх я ваяваў. Аказваецца, чалавек мацнейшы за сталь. Але быў са мной выпадак, яшчэ пад Ціхвінам, калі я знаходзіўся на краі магілы, звычайнай брацкай магілы, якіх тысячы на нашай зямлі. А выратаваў мяне, выцягнуў, можна сказаць, з яе, даручэнец Рыгор Забалотнікаў. Без прыкмет жыцця, кантужанага і параненага разрыўной куляй у галаву хавалі мяне разам з загінуўшымі. Твар быў заліты крывёю. Рыгор стаў адвінчваць ордэн і адчуў: сэрца б'ецца!

...Пасля вайны давялося двойчы пабываць у Бернаў. Асабліва хвалюючай была другая паездка — восенню 1982 г. У Бернаў пабудавалі новую школу. У вестыбюлі — шарэнгі школьнікаў. І вось пачалося такое, што ад хвалявання нават горла сціснула: сакратар акружкома зачытала пастанову ўрада ГДР аб прысваенні школе майго імя. Я ўручыў сцяг школы піянерскай арганізацыі. Потым карэ школьнікаў выстраілася на двары. Я здагадаўся: на пастаменце, пад пакрывалам, танк. Скрозь кветкі на танкавай брані чытаю: «На гэтым «Т-34» Герой Савецкага Саюза маёр Леанід С. Данілюк 18 красавіка 1945 года вызваляў Бернаў ад фашыстаў». А ў гарадскім музеі ўручылі шашку з надпісам на яе лязе: «Выраблена ў адным экземпляры для вызваліцеля Бернаў, Героя Данілюка». Жыхары Бернаў ведаюць, што савецкі чалавек ніколі не ўзнімаў і не ўзніме меч над іншымі галовамі...

Пуховский районный историко-краеведческий музей

Маршал авіяцыі

С. А. Красоўскі.

«Маршал авіяцыі Сцяпан Акімавіч Красоўскі — выдатны военачальнік, камуніст у самым цудоўным сэнсе гэтага слова. Яго розум, высокае пачуццё абавязку перад Айчынай і савецкімі людзьмі, яго ўвага, душэўная цеплыня, спагадлівасць, многае-многае іншае выклікалі і выклікаюць імкненне быць падобным на яго, быць такім жа сціплым, такім жа сумленным у адносінах да ўсяго.

Сказанае — толькі малая частачка таго добрага, што хацеў бы сказаць аб сваім настаўніку і камандзіры С. А. Красоўскім кожны з яго выхаванцаў. Адным з іх з'яўляюся і я.

Вечна ўдзячны А. Т. Кузьмін».

Такі запіс пакінуў аднойчы ў кнізе ганаровых гасцей народнага музея Глухскай сярэдняй школы былы сакратар ЦК КПБ Аляксандр Трыфанавіч Кузьмін.

Герой Савецкага Саюза, маршал авіяцыі, прафесар Сцяпан Акімавіч Красоўскі нарадзіўся 20.8.1897 г. ў вёсцы Глухі Быхаўскага раёна ў сялянскай сям'і. Скончыў народнае вучылішча, Быхаўскае вышэйшае пачатковае вучылішча.

У маі 1916 г. яго прызвалі ў царскую армію. Пасля заканчэння курсаў бяздротавага тэлеграфа ў г. Мінску быў прызначаны начальнікам радыёстанцыі ў 20-ы армейскі корпус на Заходнім фронце. Удзельнічаў у баях у раёне Смаргоні, Маладзечна, дзе быў паранены. У сакавіку 1917 г. Красоўскага перавялі ў 25-ы авіяцыйны атрад. Там ён быў радыёнаглядчыкам, потым авіяцыйным матарыстам. Летам 1917 г. зрабіў першы палёт на самалёце «Вуазен» і атрымаў чын унтэр-афіцэра.

Летам 1917 г. актывісты арганізаванага ў 25-м авіяцыйным атрадзе палітычнага гуртка стварылі групу спачуваючых бальшавікам. С. А. Красоўскі быў выбраны яе сакратаром. Гэта група і склала пасля ядро партыйнай арганізацыі авіяатрада. У верасні 1917 г. Красоўскі быў арыштаваны за рэвалюцыйную дзейнасць чыноўнікамі Часовага ўрада. Яго справа была перададзена ваеннаму палявому суду. У час дазнання Красоўскі ўцёк са станцыі Глыбокае ў Петраград.

У лістападзе 1917 г. Сцяпан Акімавіч пачаў службу чырвонагвардзейцам у адным з першых авіяатрадаў маладой Савецкай рэспублікі. У 1918 г. малады ваенлёт стаў членам партыі бальшавікоў. У 1918—1919 гг. ён выконваў абавязкі сакратара партячэйкі РКП(б) 2-й Цвярской авіягрупы, служыў матарыстам і начальнікам сувязі ў 33-м авіяатрадзе на Уральскім і Усходнім франтах, авалодаў яшчэ адной з вядучых прафесій таго часу — лётчыка-назіральніка. Восенню 1919 г. авіяатрад быў пераведзены ў Астрахань і перададзены ў састаў 11-й арміі, С. А. Красоўскі неўзабаве стаў ваенкомам атрада. У Астрахані ён пазнаёміўся з С. М. Кіраўым, у наступныя гады яны не раз сустракаліся па службовых справах у Азербайджане і Ленінградзе. У канцы красавіка 1920 г. 11-я армія ўступіла ў Баку, у баях за горад вызначыліся авіятары 33-га атрада.

Да кастрычніка 1926 г. С. А. Красоўскі быў камісарам у розных авіяцыйных часцях на Каўказе, потым у Маскоўскай ваеннай акрузе, дзе з лістапада 1927 г. да сакавіка 1934 г. камандаваў 3-м авіяцыйным атрадам, які насіў імя іванаўскіх рабочых. У 1931 г. камандзіру атрада і яго памочніку першым у Ваенна-Паветраных Сілах СССР былі ўручаны нагрудныя знакі «Выдатны паветраны баец». Пастановай ЦВК СССР ад 27. 10.1932 г. С. А. Красоўскі за безаварыйную работу і высокія паказчыкі ў вучэбна-баявой падрыхтоўцы 3-га авіяатрада быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

З вясны 1934 г. да восені 1935 г. С. А. Красоўскі камандаваў 253-й штурмавой авіябрыгадай Ленінградскай ваеннай акругі. На восеньскіх вучэннях 1935 г. авіябрыгада дзейнічала разам з механізаваным корпусам. Вынікі вывучкі лётчыкаў, якімі камандаваў камбрыг Красоўскі, атрымалі высокую ацэнку прысутнага на вучэннях намесніка наркома абароны Маршала Савецкага Саюза М. М. Тухачэўскага. Сцяпан Акімавіч быў узнагароджаны імянным залатым гадзіннікам, а затым накіраваны на вучобу ў Ваенна-паветраную акадэмію імя Жукоўскага, якую скончыў у 1936 г. Зноў вярнуўся ў Ленінградскую ваенную акругу: камандзір авіябрыгады, потым авіякорпуса. У якасці камандзіра Мурманскай авіябрыгады і памочніка камандзіра ВПС 14-й арміі прымаў удзел у савецка-фінляндскай вайне 1939—1940 гг. Пасля заканчэння ваенных дзеянняў С. А. Красоўскі — начальнік ваенна-авіяцыйнага вучылішча, памочнік камандуючага (з чэрвеня 1941 г. камандуючы) ВПС Паўночна-Каўказскай ваеннай акругі. На апошняй пасадзе і застала яго Вялікая Айчынная вайна. Генерал-маёр С. А. Красоўскі ваяваў на Паўднёвым, Бранскім, Паўднёва-Заходнім, Варонежскім і 1-м Украінскім франтах у якасці камандуючага ВПС 56-й арміі, ВПС Бранскага і Паўднёва-Заходняга франтоў, 2-й і 17-й паветранымі арміямі. 20.12.

Быховский районный историко-краеведческий музей

1942 г. С. А. Красоўскаму было прысвоена званне генерал-лейтэнанта авіяцыі. Сцяпан Акімавіч прымаў удзел у баявых аперацыях каля Растова-на-Доне, на Каўказе, Сталінградскай, Курскай бітвах, вызваленні Украіны, Польшчы, Чэхаславакіі, Вісла-Одэрскай, Берлінскай і Пражскай аперацыях. Умела кіраваў авіяцыяй і арганізацыяй узаемадзеянняў з наземнымі войскамі пры авалоданні Берлінам, Дрэздэнам і вызваленні Прагі. 29.5.1945 г. яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. З 1945 г. С. А. Красоўскі на адказных камандных пасадах у ВПС (у 1955—1956 гг. у БВА). У 1956—1968 гг. начальнік Ваенна-паветранай акадэміі імя Гагарына. У 1959 г. прысвоена званне маршала авіяцыі, у 1966 — прафесара. З 1970 г. ён — ваенны інспектар-саветнік Групы генеральных інспектараў Міністэрства абароны СССР. На XXII з'ездзе КПСС быў выбраны членам Цэнтральнай рэвізійнай камісіі (1961—1966), член ЦК КПБ у 1956—1960 гг.

Узнагароджаны шасцю ордэнамі Леніна, ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі, ордэнамі Суворава I і II ступеней, чатырма ордэнамі Чырвонага Сцяга і інш., а таксама чатырнаццаццю

Ю. А. Гагарын і С. А. Красоўскі.

ордэнамі і медалямі Чэхаславакіі, Манголіі, Польшчы, Балгарыі, ГДР, Кітая, Венгрыі. Аўтар кнігі «Жыццё ў авіяцыі». (3 выд. Мн., 1976). Памёр 21.4.1983 г. Імем С. А. Красоўскага названа плошча ў Быхаве, яго імя прысвоена піянерскай дружыне Быхаўскай сярэдняй школы № 3.

Канец фашысцкай Германіі

...Подготовка к Берлинской операции проводилась в сжатые сроки. Обстановка требовала как можно быстрее нанести завершающий удар по врагу, чтобы фашистское руководство не успело вступить в сговор с империалистами Запада. В Берлин первой должна вступить Красная Армия. Это понимали все — от солдата до маршала...

Летчики 2-й воздушной армии готовились к сражению за Берлин с большим подъемом и очень тщательно. Все детали предстоящих боевых вылетов были продуманы до мелочей. В районе прорыва вражеской обороны должны действовать две тысячи самолетов. Время и маршрут полета экипажей определялись с максимальной точностью, строго согласовывались с действиями артиллерии, чтобы избежать перекрещивания маршрутов наших «илов» с траекториями артиллерийских снарядов...

В ночь на 16 апреля вместе с офицерами штаба А. И. Гнатюком и А. А. Исаевым я выехал на командный пункт фронта. Там, на берегу Нейсе, были оборудованы блиндажи с амбразурами, из которых хорошо просматривался левый берег реки, занятый противником. Как никогда, беспокоился я о точности метеорологического прогноза, о предстоящих действиях штурмовых корпусов, которые должны уложиться в тридцать пять минут, отведенных для нанесения первого массированного удара, об экипажах для подавления зенитной артиллерии в Мускау...

Спать в эту ночь почти не пришлось. Едва за-

Мемарыяльная дошка на будынку Глухскай сярэдняй школы.

Быховский районный историко-краеведческий музей

брезжил рассвет, как из частей стали докладывать о готовности к боевой работе.

Время приближалось к тому моменту, который во всех планах обозначен буквой «Ч» — это срок перехода войск в атаку. Но прежде чем пехота и танки начнут наступление, артиллерия и авиация должны нанести по врагу сокрушительные удары.

И вот из-за горизонта появился ярко-оранжевый диск солнца. Сразу же послышался гул сотен моторов. Бомбардировщики шли на задание плотным строем — девятка за девяткой. Первый удар был обрушен на основные опорные пункты фашистской обороны — Форст и Мускау. Двести восемь экипажей точно положили весь боезапас по целям. Над вражескими позициями высоко в небе поднялись столбы огня и дыма.

Когда на короткое время взрывы смолкли, над линией фронта, над самой гладью Нейсе, пролетела восьмерка «илов», ведомая командиром 144-го гвардейского штурмового авиаполка Героем Советского Союза майором М. И. Степановым. За самолетом тянулся бесконечный шлейф белого дыма. Плотная завеса скрыла оконы противника и одновременно ослепила фашистских наблюдателей, наводчиков орудий, стрелков. Наши войска приступили к форсированию реки...

В боях за Берлин отличились многие летчики. Бомбардировщики громили опорные пункты противника, штурмовики непрерывно держали под воздействием все, даже самые мелкие группировки вражеских войск, истребители полностью парализовали деятельность фашистской авиации.

Огненный вал быстро приближался к столице Германии. 22 апреля 3-я гвардейская танковая армия подошла к каналу Тельтов, на южной окраине Берлина. Фашисты упорно обороняли этот водный рубеж. Командующий войсками фронта приказал использовать для огневой поддержки танкистов крупные силы авиации. Свыше двухсот самолетов нанесли бомбовый удар по огневым точкам противника на северном берегу канала. Авиация вместе с артиллерией подавила очаги сопротивления, и танкисты благополучно переправились через водную преграду на пути к центру немецкой столицы...

Трудно теперь с абсолютной точностью сказать, кому принадлежала идея подготовки знамен Победы. И не случайно почти одновременно на Берлин было сброшено два алых полотнища.

В ночь на 1 мая летчики сами готовили знамена. Штурман 115-го гвардейского истребительного полка майор С. Ф. Тихонов, расстелив на полу кумачовое полотнище, белой краской вывел на нем короткое звучное слово: «Победа», а чуть ниже — «Слава советским войскам, водрузившим Знамя Победы над Берлином!» Такое же знамя было изготовлено и в 1-м гвардейском истребительном авиаполку. На нем были надписи: «Победа!» и «Да здравствует Первое мая!»

В 12 часов 1 мая с аэродрома Альтено поднялись в воздух две группы самолетов. Первую вел командир 115-го гвардейского полка подполковник А. Ф. Косс. В парадном строю летели семнадцать лучших летчиков, в том числе дважды Герой Советского Союза А. В. Ворожейкин, Герои Советского Союза К. В. Новоселов, В. Н. Буянов, И. П. Лавейкин, П. И. Песков. Под посадочными щитками «яка», на котором летел Новоселов, находилось знамя. В 12 часов 25 минут наши самолеты на высоте восемьсот метров появились над самым центром Берлина. Новоселов выпустил щитки. Высвободившееся кумачовое полотнище развернулось и плавно опустилось на рейхстаг.

Через несколько минут к Берлину подошла вторая группа истребителей, ведущим которой был майор Ищенко. С ним летели командир 1-го гвардейского истребительного полка майор И. А. Малиновский, летчики И. Д. Свиридов, А. Т. Фролов, Е. А. Антонов. Знамя находилось на борту самолета Малиновского. Во второй кабине Як-9у находился корреспондент армейской газеты капитан А. М. Хорунжий. По команде летчика над рейхстагом Хорунжий развернул свое полотнище и опустил за борт.

Над Берлином гордо реяли алые стяги Победы, их видели наши офицеры и солдаты, завершающие разгром вражеского гарнизона. Радиостанция наведения с позывными «Залив — Булатов» передала летчикам:

— Знамена видны отлично. Да здравствует наша Победа!

Чувство великой гордости за свою Родину, за свой народ и его армию испытывали летчики, возвращаясь на свой аэродром. Они по праву гордились тем, что на их долю выпало счастье совершить полет в Берлин со знаменами Победы, полет, который навсегда войдет в историю советской авиации...

Друкуецца са скарачэннямі па кн.: Красовский С. А. Жизнь в авиации. 3 изд. Мн., 1976. С. 261—268.

Адважны лётчык

Георгій Мяфодзьевіч Надтачэеў — Герой Савецкага Саюза (13.4.1944). Нарадзіўся ў 1916 г. ў в. Краснiца 1-я Быхаўскага раёна. З сялян. Беларус. Скончыў Магілёўскі аэраклуб (1940). Працаваў электраманцёрам на чыгунцы ў Магілёве. На фронце з чэрвеня 1941 г. Лётчык-штурмавік малодшы лейтэнант Г. М. Надтачэеў ажыццявіў 100 баявых вылетаў. 31.1.1944 г. ў час налёту на варожы аэрадром самалёт яго камандзіра быў падбіты і зрабіў вымушаную пасадку каля аэрадрома праціўніка. Г. М.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Надтачэеў пушачна-кулямётным агнём разагнаў гітлераўцаў, якія беглі да самалёта камандзіра, пасадзіў сваю машыну, узяў экіпаж падбітага самалёта і вярнуўся на свой аэрадром.

Загінуў 25.4.1944 г. ў баі за вызваленне Севастопаля. Імем Г. М. Надтачэева названы вуліцы ў Магілёве і Быхаве, на радзіме пастаўлены абеліск.

Курская дуга. Гітлераўцы рыхтаваліся да летняга наступлення. Кожную ноч над імі віселі У-2. Яны рвалі камунікацыі, выводзілі са строю тэхніку, варожых салдат і афіцэраў. Не раз вылятаў на бамбёжку пярэдняга краю гітлераўцаў і Георгій Надтачэеў. Кожнае заданне выконваў адважна і ўмела. Разведчыкам літаральна ў апошні момант удалося выявіць яшчэ адну агнявую кропку. Георгій атрымаў заданне знішчыць яе. Цёмнай ноччу яго У-2 перасек пярэдні край. З выключаным маторам самалёт Георгія павіс над агнявой кропкай і скінуў бомбы. Больш у гэтым месцы нашым салдатам не пагражала небяспека.

...У-2 ляцеў над варожым тылам на вышыні 1500 метраў. Цэль — склад гаручага. Самалёт вызваліўся ад грузу, пачуліся выбухі, шуганула полымя. І раптам штосьці балюча ўдарыла лётчыка па правай руцэ. У-2 хістануўся і, страціўшы кіраванне, рэзка пайшоў уніз. Толькі каля самай зямлі Георгію ўдалося вывесці самалёт з піке. Але ж трэба яшчэ дацягнуць да сваіх. Звычайна лётчыкі-начнікі лінію фронту пераляталі на вялікай вышыні з выключанымі маторамі. Гэтым яны блыталі карты варожым зенітчыкам, якія стралялі на гук. Набраць патрэбную вышыню Надтачэеў не мог. Не было ўжо сілы. І ён паляцеў амаль над самымі галовамі немцаў. Ашаломленыя нечуванай дзёрзкасцю, яны адкрылі агонь наўздагон, але У-2 ужо ляцеў над сваімі пазіцыямі.

У студзені 1944 г., пасля шпіталю, малодшы лейтэнант Надтачэеў дэбютаваў у ролі лётчыка-штурмавіка 76-га гвардзейскага штурмавога авіяпалка 1-й штурмавой авіядывізіі. Лётаў на бамбёжку танкавых калон і чыгуначных станцый, граміў артылерыйскія батарэі, абараняў сваіх баявых сяброў ад атак нямецкіх знішчальнікаў і абараняўся сам.

31 студзеня 1944 г. тры групы Іл-2 узняліся ў паветра. Ім трэба было нанесці бомбавы ўдар па буйным нямецкім аэрадроме. Група, у якую ўваходзіў Надтачэеў, абавязана была падавіць агонь зенітных батарэй праціўніка. Вось

Г. М. Надтачэеў.

Ф. Ф. Раўчакоў.

ужо знішчана каля 30 фашысцкіх самалётаў, выведзена са строю ўся сістэма супрацьпаветранай абароны аэрадрома. Час вяртацца назад. Але што здарылася з машынай лейтэнанта Протчава? Яна задымілася і пайшла на вымушаную пасадку.

— Сокал! Дазвольце ісці на выручку,— папрасіў Надтачэеў вядучага.

— Пятнаццаты, пятнаццаты? Ці ведаеш ты, на якую рызыку ідзеш?

— Ведаю. Пастараюся...

— Дзейнічай!

Іл з пятнаццатым нумарам на фюзеляжы пайшоў на зніжэнне. Да самалёта, што гарэў на зямлі, беглі гітлераўцы.

— Грыгор'еў! Папрацуй па наземных цэлях! — загадаў Надтачэеў.

Удар, яшчэ ўдар аб няроўнасці зямлі, і Іл падкаціў да падбітага самалёта. Праз некалькі хвілін Надтачэеў з выратаванымі баявымі сябрамі трымаў курс на родны аэрадром.

У красавіку 1944 г. Георгій Мяфодзьевіч вылецеў на штурмоўку ворага ў раён Севастопаля. У журнале баявых дзеянняў 1-й гвардзейскай штурмавой авіядывізіі запісана: «25 красавіка 1944 г. экіпажы знішчалі артылерыю і жывую сілу і падаўлялі агнявыя кропкі праціўніка ў раёне развілкі дарог, што на паўднёвы ўсход ад Сапун-гары. Не вярнуўся лейтэнант Надтачэеў. Па назіранню экіпажаў быў падбіты зенітнай артылерыяй за паўтара кіламетра на ўсход ад калгаса «Бальшавік» (зараз саўгас «Залатая Балка»).

Герой баёў за Віслу

Фёдар Фёдаравіч (Фядотавіч) Раўчакоў — Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 27.9.1910 г. ў в. Кузькавічы Быхаўскага раёна. З сялян. Беларус. Член КПСС з 1944 г. З 1928 г. ў Чырвонай Арміі. Скончыў ваенна-ветэрынарную фельчарскую школу (1933), 2-е Маскоўскае пяхотнае вучылішча (1943). У 1937—1941 працаваў ветэрынарам на Украіне. З ліпеня 1941 г. на Паўднёва-Заходнім, 2-м і 1-м Беларускіх франтах. Камандзір стралковай роты старшы лейтэнант Ф. Ф. Раўчакоў вызначыўся ў баі каля г. Пулавы (Польшча). 29.7.1944 г. рота пад яго камандаваннем пераправілася на левы бераг Віслы,

Быховский районный историко-краеведческий музей

захапіла плацдарм і за 2 дні адбіла 8 варожых контратак, падтрыманых танкамі і самаходнымі гарматамі, захапіла вышыню, расшырыла плацдарм, замацавалася на ім і садзейнічала пераправе цераз Віслу іншых падраздзяленняў палка. Пасля вайны Ф. Ф. Раўчакоў працаваў у міліцыі, потым ветэрынарам. Памёр 20.4.1952 г. Яго імем названы вуліцы ў Магілёве, Быхаве, у в. Кузькавічы — на радзіме героя, там жа яму пастаўлены абеліск.

У 1937 г. па стану здароўя Фёдар Раўчакоў дэмабілізаваўся з Чырвонай Арміі і працаваў на ветэрынарных участках у Бярдзічаўскім раёне на Украіне. У маі 1941 г. яго зноў прызвалі ў Чырвоную Армію. Айчынную вайну сустрэў на заходняй граніцы, тут прыняў першы бой з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. 1 верасня ў баі быў цяжка паранены. Нямала часу прайшло, пакуль медыкам удалося зноў паставіць воіна на ногі. У 1943 г., пасля заканчэння пяхотнага вучылішча, яго прызначылі камандзірам узвода ў 965-ы полк 274-й стралковай дывізіі. У баі 3 жніўня 1943 г. Раўчакоў атрымаў цяжкую кантузію. Пасля вяртання са шпіталю старшы лейтэнант Ф. Раўчакоў быў прызначаны камандзірам роты. Байцы ведалі Фёдара Фёдаравіча як чалавека цвёрдай волі, смелага ў баі, уважлівага да сваіх падначаленых. Яны паважалі і любілі свайго ротнага, адважна ішлі за ім на выкананне любога задання.

Баі за вызваленне Польшчы. Жорсткая схватка з ворагам разгарэлася 29 ліпеня 1944 г. Пехацінцы Раўчакова вырваліся да берага Вісты ў раёне горада Пулавы, і ротны з групай салдат пад моцным артылерыйска-мінамётным агнём на рыбацкай лодцы пераправіўся цераз раку і захапіў плацдарм. Закапаўшыся ў зямлю, салдаты моцным кулямётным агнём стрымлівалі праціўніка, які контрнаступаў, а старшы лейтэнант Раўчакоў, вярнуўшыся зноў на ўсходні бераг, арганізаваў пераправу астатніх байцоў сваёй роты. Не прайшло і гадзіны, як уся рота фарсіравала Віслу.

У той дзень фашысты пяць разоў кідаліся ў атаку на жменьку савецкіх воінаў, імкнучыся спіхнуць іх у раку. Але намаганні былі дарэмнымі. Нашым байцам да зыходу дня ўдалося расшырыць плацдарм.

На світанні 30 ліпеня гітлераўцы пры падтрымцы танкаў і самаходных гармат пайшлі ў шалёную атаку на роту Раўчакова. Тройчы падымаў камандзір сваіх байцоў у контратакі. У выніку нашы воіны разгромілі і адкінулі ворага, захапілі пануючую вышыню і канчаткова замацаваліся на плацдарме.

Шлях салдата

Арцём Іванавіч Салодышаў — Герой Савецкага Саюза (24.3.1945). Нарадзіўся 5.10.1910 г. ў в. Лазаравічы Быхаўскага раёна. З сялян. Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г., савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. У Вялікую Айчынную вайну партызан, з 1943 г. камандзір узвода 810-га партызанскага палка, з 1944 г. на фронце. Камандзір стралковага аддзялення сяржант А. І. Салодышаў вызначыўся пры вызваленні Магілёўскай вобл. 27.6. 1944 г. над моцным артылерыйска-мінамётным агнём пераправіўся цераз Дняпро на поўдзень ад Магілёва. У баі за в. Стайкі гранатамі знішчыў дзот, які стрымліваў наступленне савецкай пяхоты. Быў паранены, але поля бою не пакінуў. Агнём з аўтамата знішчыў 27 гітлераўцаў. Пасля вайны жыў у Быхаве, працаваў інспектарам Дзяржрыбнагляду. Памёр 27.1. 1960 г. Пахаваны ў Быхаве. Імем А. І. Салодышава названы вуліца і завулак у Быхаве, яго імя носяць піянерскія дружыны Быхаўскай сярэдняй школы № 4 і Навабыхаўскай сярэдняй школы Быхаўскага раёна.

Ва ўсіх баявых партызанскіх аперацыях Арцём Салодышаў вызначаўся выключнай адвагай і знаходлівасцю. Менавіта ён захапіў важнага «языка», наладзіў сувязь з антыфашыстам венграм Феры Шандар Варда і прывёў яго ў атрад. Узвод Салодышава стаў адным з самых баявых у атрадзе.

У пасёлку Першамайскі стаяў фашысцкі гарнізон. Гітлераўцы тэрарызавалі жыхароў навакольных вёсак, рабавалі іх маёмасць, вывозілі моладзь у Германію. Арцём папрасіў у камандзіра дазволу на разгром гэтага гадзючага гнязда. Цёмнай ноччу ўзвод скрытна падышоў да гарнізона і ярасна ўдарыў па гітлераўцах. Раніцай на месцы ўмацавання датлявалі галавешкі. Трыццаць захопленых чужынцаў былі дастаўлены ў партызанскі лагер.

У незабыўныя дні «рэйкавай вайны» за смелыя і рашучыя дзеянні ўзводу Салодышава, як і многім іншым, была аб'яўлена падзяка, а камандзір быў прадстаўлены да ўрадавай узнагароды.

24 лютага 1944 г. падраздзяленні Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы злучыліся з часцямі Чырвонай Арміі. На ўрачыстым партызанскім мітынгу ў вёсцы Шапчыцы А. І. Салодышаву была ўручана баявая ўзнагарода — медаль «Партызану Айчыннай вайны» I ступені. А пасля Арцём Іванавіч стаў байцом 1260-га стралковага палка 380-й дывізіі, якая вяла цяжкія баі ў раёне Ветранкі. Калі пачалася аперацыя «Баграціён» і 50-я армія перайшла ў наступленне, Арцём Салодышаў з сваім аддзяленнем у ліку першых фарсіраваў Дняпро. Уперадзе была вёска Стайкі — важны апорны пункт. Трэба было як мага хутчэй выбіць адтуль фашыстаў, асядлаць шашу Магілёў — Бабруйск і адрэзаць шляхі адыходу гітлераўцам. І раптам — шалёныя кулямётныя чэргі. Байцы заляглі. Варта было ўзняць галаву, як тут жа, уздымаючы фантаны пылу, у

Быховский районный историко-краеведческий музей

зямлю ўпіваліся кулі. Масіўны, з дзвюма амбразурамі дзот грозна ўзвышаўся над наваколлем і здаваўся непрыступным. Над галавой пачуўся знаёмы гул авіяцыйных матораў. Некалькі самалётаў з чырвонымі зоркамі пранесліся над пазіцыямі гітлераўцаў, і тут жа ўзняліся ў паветра клубы агню і дыму. Але ледзь толькі пяхота ўзнялася ў атаку, як зноў ажыў дзот і па чырвонаармейцах ударыў свінцовы лівень.

Маскіруючыся ў складках мясцовасці, старшы сяржант Салодышаў папоўз да дзота. Калі да яго ўжо заставалася не больш чым 10 метраў, востры боль апёк раптам левае плячо. Сціснуўшы зубы, папоўз далей. Потым прыўзняўся і моцна шпурнуў у амбразуру адну за адной дзве гранаты. Варожыя кулямёты захлынуліся. Аддзяленне паднялося ў атаку. Разам з баявымі сябрамі Арцём уварваўся ў Стайкі. Вакол ірваліся міны і снарады. Забыўшы пра рану, Салодышаў кіраваў боем.

— Ідзіце ў абход, я прыкрыю агнём! — загадаў ён сваім салдатам.

Але тут нечым цяжкім ударыла па назе, і Арцём упаў. Трацячы прытомнасць, ён паспеў заўважыць зялёную ракету, што ўзвілася ў неба. Гэта быў сігнал да агульнай атакі. Значыць, іх аддзяленне выканала сваю задачу.

Пасля шпіталю А. І. Салодышаў зноў на фронце, вызваляў Польшчу, браў Берлін. *Г. Е. Барысаў.*

А. І. Салодышаў.

Ф. А. Смалячкоў.

Снайпер Смалячкоў

Феадосій Арцёмавіч Смалячкоў — Герой Савецкага Саюза (6.2.1942). Нарадзіўся ў 1923 г. ў в. Падгор'е Быхаўскага раёна. З сялян. Шаснаццацігадовым юнаком паехаў у Ленінград, дзе ў 1941 г. скончыў школу ФЗН, стаў будаўніком. У першыя дні вайны Ф. Смалячкоў уступіў у 5-ю дывізію народнага апалчэння Выбаргскага р-на Ленінграда. У ліпені 1941 г. быў прызваны ў дзеючую армію і залічаны ў асобную разведвальную роту 13-й стралковай дывізіі Ленінградскага фронту. Удзельнічаў у баях на подступах да Ленінграда. У перыяд пазіцыйнай абароны ў савецкіх войсках, якія абаранялі Ленінград, нарадзіўся снайперскі рух. Ф. Смалячкоў адным з першых у 42-й арміі адкрыў асабісты рахунак знішчаных ворагаў, быў ініцыятарам баявога спаборніцтва снайпераў Ленінградскага фронту. Амаль штодзённа Феадосій выходзіў на агнявы рубеж. І ў дождж, і ў сцюжу па 12—14 гадзін ляжаў у снезе, высочваючы гітлераўцаў. Не раз фашысты спрабавалі знішчыць адважнага снайпера. Двойчы Смалячкоў адбіваўся гранатамі, а потым зноў браўся за вінтоўку. У сваёй роце Смалячкоў падрыхтаваў 10 выдатных снайпераў, якія знішчылі не адну сотню ворагаў. Бясстрашны камсамолец Ф. Смалячкоў за 90 дзён баёў знішчыў 125 фашыстаў, на якіх затраціў 126 патронаў. Дзевятнаццацігадовы патрыёт загінуў 15.1.1942 г. на баявым пасту. Імем Ф. Смалячкова названы вуліцы ў Ленінградзе, Мінску (установлена мемарыяльная дошка) і Быхаве, пасёлак у Ленінградскай вобл., саўгас у Быхаўскім раёне, гарадскі стралковы клуб ДТСААФ у Ленінградзе, піянерскія дружыны. Яму пастаўлены помнікі ў Ленінградзе, у Быхаўскім раёне каля пасёлка Варанiно на шашы Магілёў — Гомель і ў в. Падгор'е. Славутаму снайперу прысвяціў сваю паэму народны паэт Беларусі Пятрусь Броўка. Песню пра яго напісалі паэт А. Астрэйка і кампазітар Дз. Лукас.

Паэма пра Смалячкова
(урывак)

Ён — горада Леніна воін, юнак, абаронца суровы,
З бароў беларускіх да славы й бясмерця прывёў яго шлях.
Прайдзіся ж ты, сціплая песня,
па мужных слядах Смалячкова,
Па снайперскіх тайных засадах,
на плошчах і шумных палях.
Прайшоў ён праз полымя боек у жоўтыя дні лістапада,
Гадзінамі стыў на марозе,
схаваны між гурб снегавых;
Налітае волавам неба вісела ля сцен Ленінграда,
Ён паў, разганяючы хмары,
бліснуўшы маланкай між іх,

Маці Ф. Смалячкова Фёкла Патанаўна сярод піянераў.

Белорусский государственный историко-краеведческий музей

Помнік Ф. А. Смалячкову ў вёсцы Падгор'е.

Да рускай зямлі прытуліўся,
спавіты паўночнай зарою,
Маўклівы;
раскінуўшы рукі пад ветрам зімы
ледзяным,
Ды пільна ўглядаліся ўдалеч юнацкія вочы героя,
Туды,
дзе сябры-камсамольцы ў баях ўспаміналі
аб ім.
За ім баявая сталіца, што грознаю вартаю стала,
Там плошчы,
дзе ў памяці дружнай і сёння ён ходзіць жывы.
Заводаў узнятыя трубы,
гранітнай чаканкі кварталы,
І рокаты Фінскай затокі, і гордыя плыні Нявы.
Ты спі, наш таварыш, спакойна!
Атакі сабрамі адбіты.
І вораг разбіты скапае. Мы верным у мэту адну —
Імя тваё, Федзя, мы ўзнімем на вуліцах,
сонцам аблітых,
І ў родных палях Беларусі з бацькамі
сустрэнем вясну,
Мы пройдзем,—
па травах духмяных абсыплюцца зорныя росы,
Загойдаюць ветры ласкава палёў залатыя дары;
Мы пройдзем сцяжынкамі тымі,
дзе хлопчыкам бегаў ён босы;
Журботна схіліўшы галовы,
аб ім нам раскажуць бары,
Мы ўбачым народ,
у якога ўзяў ён арлініыя крыллі,
Адкуль яго постаць асілка і зоркія вочы чаму,
Якая зямля ўзгадавала, якія крыніцы паілі,
Якія дубровы спявалі ваяцкую песню яму.

Пятрусь Броўка.

Камандзір-танкіст

Г.М. Станкевіч.

Ц. Я. Сычкоў.

Гемел Міхайлавіч Станкевіч — Герой Савецкага Саюза (27.6.1945). Нарадзіўся 8.3.1925 г. ў в. Сяліба Быхаўскага раёна. З сялян. Беларус. Член КПСС з 1948 г. Скончыў 1-е Харкаўскае танкавае вучылішча (1944), юрыдычны інстытут у Ташкенце (1955). У 1941—1942 гг. рабочы на заводзе ў Ленінградзе. У Чырвонай Арміі з 1943 г. На фронце з 1944 г. Вызначыўся ў баях за г. Губен (Германія). 24.2. 1945 г. танкавы ўзвод пад камандаваннем малодшага лейтэнанта Г. М. Станкевіча прарваў абарону праціўніка і першым уварваўся ў горад. Пры адбіцці адной з контратак танк Г. М. Станкевіча быў падпалены. Экіпаж патушыў пажар і ліквідаваў непаладкі ў машыне. За 4 дні баёў экіпаж танка знішчыў 3 самаходныя гарматы, 2 танкі, 4 пушкі, 3 мінамёты і каля 180 гітлераўцаў. Да 1951 г. Г. М. Станкевіч у Савецкай Арміі. Пасля працаваў следчым у Ташкенце. Памёр 5.1.1962 г. Імем Г. М. Станкевіча названа вуліца ў Быхаве.

У трыццатыя гады сям'я Станкевічаў пераехала на жыхарства ў Ленінград. Гемел вучыўся ў школе на «выдатна», марыў стаць юрыстам. У час блакады Ленінграда, семнаццацігадовы Гемел Станкевіч працаваў рабочым завода «Электрык». Як і іншым ленінградцам, яму выпала зведаць усё: голад, холад, жорсткія артылерыйскія абстрэлы і бамбёжкі. Цяжкахворага, знясіленага юнака па «дарозе жыцця» вывезлі ў савецкі тыл. А калі крыху ачуняў, Гемел папрасіўся ў райваенкамаце на фронт. У 1944 г., скончыўшы танкавае вучылішча, стаў камандзірам танкавага ўзвода. Смелы, ініцыятыўны малады камандзір хутка заваяваў павагу сярод танкістаў. Яго баявыя подзвігі былі адзначаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны I ступені.

24 лютага 1945 г. ў баях за г. Губен у Германіі

Быховский районный историко-краеведческий музей

ўзвод Станкевіча прарваў умацаваны ўчастак абароны і першым уварваўся ў горад. Пры адбіцці адной з варожых контратак танк Станкевіча быў падпалены. Камандзір не разгубіўся — загадаўшы экіпажу тушыць агонь, сам з кулямёта ва ўпор біў па фашыстах, якія імкнуліся захапіць экіпаж у палон. Адважныя танкісты патушылі полымя, адрамантавалі пад варожым агнём танк і працягвалі бой. За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў гэтым баі, малады камандзір быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза.

Пераправа, пераправа...

З успамінаў Ц. Я. Сычкова

Цярэнцій Яфрэмавіч Сычкоў — Герой Савецкага Саюза (3.6.1944). Нарадзіўся 6.1.1922 г. ў в. Хутар Быхаўскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1944 г. Скончыў Барысаўскае ваенна-інжынернае вучылішча (1941), Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1952). У Чырвонай Арміі з 1940 г. З 1942 г. на Паўночна-Каўказскім, Варонежскім, 1-м і 2-м Украінскіх, 1-м і 2-м Беларускіх франтах. Удзельнічаў у баях за Крым і Паўночны Каўказ, у Курскай бітве, вызваляў Украіну, Беларусь, Польшчу. Камандзір інжынернай роты старшы лейтэнант Ц. Я. Сычкоў вызначыўся ў баях пры вызваленні Украіны. 25.9.1943 г. ў час наступлення пад агнём праціўніка рота на чале з ім на дэсантных лодках пераправіла на правы бераг Дняпра 802 байцоў, а за ўвесь перыяд пераправы — 8,8 тысячы чалавек, 398 т боепрыпасаў, 216 т харчовых прадуктаў, каля 6 тысяч мін, 82 гарматы, 164 павозкі з грузам, 8 мінамётаў, на левы бераг Дняпра — 430 параненых. Да 1972 г. Ц. Я. Сычкоў служыў у Савецкай Арміі, палкоўнік. У 1972 — 1985 гг. працаваў у жытомірскім абласным аб'яднанні «Міжкалгасбуд». Жыве ў Жытоміры. Вядзе вялікую грамадскую работу, з'яўляецца дэпутатам Жытомірскага гарадскога Савета народных дэпутатаў, намеснікам старшыні прэзідыума гарадскога Савета ветэранаў вайны і працы.

У дзяцінстве я вельмі любіў ваенных, марыў стаць камандзірам. Перад вайной двойчы паступаў у ваеннае вучылішча ў Ленінградзе і абодва разы не праходзіў, не хапіла росту (патрэбна не меней 150 см, а ў мяне было 149 см). І вось нарэшце ў 1940 г. мне пашанцавала — я паступіў у Барысаўскае ваенна-інжынернае вучылішча. Вайна прымусіла нас рана пасталець — пасля 11 месяцаў вучобы ў ліпені 1941 г. я быў выпушчаны з вучылішча лейтэнантам і накіраваны для службы ва Уральскую ваенную акругу. Камандаваў спачатку узводам, потым вучэбнай ротай. Увесь час прасіўся на фронт. Нарэшце ў маі 1942 г. я атрымаў накіраванне на Паўночна-Каўказскі фронт у якасці камандзіра інжынерна-сапёрнай роты. Баявы шлях пачалі на Таманскім паўвостраве — устанаўлівалі мінныя палі перад пярэднім краем абароны, узрывалі розныя аб'екты пры адыходзе нашых войск, абсталёўвалі абарончыя рубяжы, займаліся разміраваннем тэрыторыі, пераправай войск пры фарсіраванні водных перашкод, будаўніцтвам мастоў і інш. У лютым 1943 г. ў складзе атрада марской пяхоты ўдзельнічаў у баях на Малой Зямлі пад Новарасійскам. За ўстаноўку маёй ротай міннага поля і падрыў на ім трох нямецкіх танкаў, дзвюх бронемашын і каля 100 гітлераўцаў атрымаў сваю першую ўзнагароду — медаль «За адвагу». А пасля была Курская дуга, дзе на мінных палях, устаноўленых ротай, падарваліся дзесяткі фашысцкіх танкаў.

І вось — сівы Дняпро. Гітлераўскае камандаванне прыняло ўсе меры, каб стварыць на правым беразе ракі магутную абарону і не дапусціць пераадолення Дняпра Чырвонай Арміяй. На падыходзе да ракі мы атрымалі пераправачныя сродкі, у ліку якіх былі 24 надзіманыя лодкі (на кожнай умяшчалася 20 стралкоў з узбраеннем), а таксама драўляныя канструкцыі для зборкі паромаў. Рота была прыдадзена 23-й стралковай дывізіі для забеспячэння пераправы яе часцей праз Дняпро за 3 км на поўнач ад Канева. 23 кастрычніка 1943 г. часці дывізіі, ведучы ўпартыя баі з адступаючым праціўнікам, падышлі да ракі. Аднак, калі да яе заставалася паўкіламетра, аўтамашыны загразлі ў Дняпроўскіх плаўнях. Салдатам прыйшлося несці на сабе грувасткія пераправачныя сродкі. На беразе хуценька падрыхтавалі лодкі, пасадзілі на іх стралкоў і ў 23 гадзіны рушылі ў цемру да процілеглага правага берага. Я быў у цэнтры, на лодцы № 8. На сярэдзіне ракі фашысты асляпілі нас ракетамі і адкрылі ўраганны агонь па лодках. Бясконцыя трасы куль, узрывы снарадаў і слупы вады вакол лодак, але ні адна з іх не павярнула назад, нават тыя, што былі месцамі пашкоджаны, упарта рухаліся да крутога правага берага. Мы прычалілі

Ц. Я. Сычкоў на сустрэчы з вучнямі Холстаўскай 8-гадовай школы.

Быховский районный историко-краеведческий музей

да яго і наспяхова высадзіліся. Пасля кароткай перагрупоўкі атакавалі праціўніка і адваявалі ў яго плацдарм плошчай 700×600 м. Сапёры вярнуліся да цэлых лодак, пагрузілі цяжкараненых і пад агнём праціўніка рушылі да левага берага, а адтуль — зноў на правы, з папаўненнем, боепрыпасамі і агнявымі сродкамі. Стралковыя падраздзяленні вялі баі па расшырэнню плацдарма, а сапёры роты працягвалі забяспечваць іх усім неабходным.

За забеспячэнне пераправы і праяўленыя пры гэтым гераізм і адвагу пяці воінам нашай роты было прысвоена ганаровае званне Героя Савецкага Саюза: сяржанту Ф. І. Васільеву — рускаму, яфрэйтару В. В. Гванцаладзе — грузіну, радавому А. А. Захарчуку — украінцу, лейтэнанту І. І. Осіпаву (пасмяротна) — рускаму і мне — старшаму лейтэнанту Ц. Я. Сычкову, беларусу. Такі нацыянальны склад герояў роты яшчэ раз нацвердзіў цеснае адзінства нашай арміі і савецкага народа, што з'явілася адной з прычын краху планаў гітлераўскага камандавання, якое разлічвала пасеяць нацыянальную варожасць і тым самым аслабіць моц СССР.

Пасля баёў за Дняпро я са сваёй ротай прымаў удзел у вызваленні роднай Беларусі, Польшчы. Пад Варшавай я быў паранены і адпраўлены ў шпіталь...

У 1946—1948 гг. я быў камандзірам інжынернабудаўнічага батальёна, удзельнічаў у аднаўленні разбуранага гітлераўцамі завода «Запарожсталь». У 1947 г. быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Героі зенітнай батарэі

Васіль Іванавіч Цямчук — Герой Савецкага Саюза (24.12.1943). Нарадзіўся ў 1920 г. на хутары Хаткі недалёка ад в. Дзедава Быхаўскага раёна. З сялян. Беларус. Член ВЛКСМ. Да вайны шахцёр у Варашылаўградскай вобл. На фронце з 1941 г. У складзе разліку зенітна-артылерыйскага палка яфрэйтар В. І. Цямчук збіў 5 самалётаў праціўніка. 22. 10. 1943 г. ў час налёту на батарэю 27 варожых самалётаў мужна адбіваў атакі пікіруючых бамбардзіроўшчыкаў. Загінуў у гэтым баі. Пахаваны ў в. Ходараў Міронаўскага р-на Кіеўскай вобл. Імем героя названа вуліца ў Быхаве. На будынку сярэдняй школы на станцыі Тошчыца Быхаўскага раёна ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Мемарыяльная дошка на будынку сярэдняй школы на станцыі Тошчыца.

Восень 1943 г., вызваленне Украіны... 981-ы зенітны артполк у складзе 9-й зенітнай дывізіі прыкрываў баявыя парадкі злучэнняў 40-й арміі. 23 верасня полк разам з стралковымі часцямі выйшаў да Дняпра ў раёне в. Козінцы і атрымаў задание прыкрыць пераправу часцей 47-га стралковага корпуса. 4-я батарэя, у якой ваяваў В. І. Цямчук, заняла агнявую пазіцыю на ўсходняй ускраіне вёскі, прыкладна ў паўкіламетры ад Дняпра.

Баі на вузкай палосцы плацдарма не сціхалі нават ноччу. Гітлераўцы імкнуліся любымі сродкамі скінуць у Дняпро савецкіх воінаў. Варожая авіяцыя з золаку да позняй ночы вісела над ракой, спрабуючы бамбіць пантонныя пераправы, паромы, плыты са смельчакамі. Аднак нанесці прыцэльны ўдар па аб'ектах ёй амаль не ўдавалася. Але на плацдарме, дае яшчэ не было зенітчыкаў, фашысты лютавалі.

Загад аб пераправе батарэі на правы бераг паступіў пасля таго, як стралковыя часці крыху расшырылі плацдарм. Адразу ж правялі камсамольскі сход. У разліку малодшага сяржанта Асманава былі тры камсамольцы. Ад іх імя намеснік камандзіра Васіль Цямчук вынес прапанову: да світання быць на правым беразе Дняпра, памерці, але плацдарм не аддаць.

У густой цемры, пад абстрэлам варожай артылерыі разлік Асманава першы заняў агнявую пазіцыю на плацдарме ў раёне Зарубінцы. Зенітчыкі пераправіліся своечасова: днём 29 верасня гітлераўцы распачалі жорсткую контратаку, якую актыўна падтрымлівала авіяцыя.

Упартыя баі на плацдарме не сціхалі ні днём, ні ноччу. Некаторыя пункты па некалькі разоў пераходзілі з рук у рукі. Зенітчыкі, знаходзя-

Быховский районный историко-краеведческий музей

чыся ў баявых парадках пяхоты, зрывалі ўсе атакі варожай авіяцыі. А ў гэты час на плацдарм ішло падмацаванне, рыхтавалася рашучае наступленне. 12 кастрычніка нашы войскі авалодалі добра ўмацаваным вузлом — вёскамі Вялікі Букрын і Ходараў, расшырылі захоплены плацдарм.

21 кастрычніка батарэя лейтэнанта Аксёнава заняла агнявую пазіцыю на паўночна-ўсходняй ускраіне в. Ходараў. На наступны дзень пачалася шалёная контратака эсэсаўскай дывізіі. Артылерыя і мінамёты білі на ўсю глыбіню нашых войск, якія спешна пераходзілі да абароны. Самалёт-карэкціроўшчык кружыў над перадавой, але ў зону зенітнага агню не ўваходзіў. А хутка праціўнік кінуў у бой дзесяткі бамбардзіроўшчыкаў.

Той дзень выдаўся на дзіва цёплы, сонечны. Неба чыстае і блакітнае, такое не часта ўбачыш у канцы кастрычніка нават на Украіне.

— Будзьце напагатове,— загадаў камандзір палка лейтэнанту Аксёнаву.— Падрыхтуйце бранябойныя снарады, магчыма, давядзецца страляць па танках.

На пазіцыі ўсё часцей і часцей сталі рвацца снарады і міны — варожая артылерыя перанесла агонь з пярэдняга краю ў глыбіню. У небе з'явіліся чорныя кропкі — самалёты ворага. 27 бамбардзіроўшчыкаў ішлі трыма хвалямі.

«Юнкерсы» перастроіліся ў кільватарную калону, рыхтуючыся да бамбёжкі з пікіравання. Камандзір батарэі добра ведаў тактыку ворага, своечасова ўлавіў гэты момант і скамандаваў:

— Па пікіруючым!

Вось чарговы «юнкерс» пайшоў у піке. Праніз-ліва завылі скінутыя бомбы. Пазіцыя ахуталася воблакамі дыму і пылу. За грукатам выбухаў не чутны каманды малодшага сяржанта Асманава. Наводчыкам Цемчуку і Лаўрэнцьеву здалося, што самалёт пікіруе прама на іх, бомбы ляцяць у іх акоп. Трэба было мець вялікую вытрымку, волю і смеласць, каб удакладніць наводку і даць доўгую чаргу. Побач разарвалася бомба. Камякі зямлі засыпалі гарматны разлік, хтосьці крыкнуў ад болю. Але людзі зноў прыпалі да гармат. Цямчук удакладніў наводку і даў яшчэ чаргу. «Юнкерс» задымiў, потым успыхнуў і, не выходзячы з піке, урэзаўся ў зямлю недалёка ад батарэі. Гэта быў пяты варожы самалёт, збіты разлікам Асманава.

В. І. Цямчук.

М. Р. Бяляеў.

Наследзячы на страты, гітлераўцы працягвалі бамбіць плацдарм з яшчэ большай злосцю. Два «юнкерсы» непрыкметна зайшлі з сонечнага боку і скінулі бомбы на агнявую пазіцыю. Адна з іх трапіла ў акоп разліку Асманава...

Хавалі герояў усім палком. Іх мужнасць і адвага, вытрымка і стойкасць усхвалявалі баявых таварышаў. Усяму складу разліку (8 чалавек) было пасмяротна прысвоена высокае званне Героя Савецкага Саюза. Недалёка ад Дняпра, у в. Ходараў, узвышаецца помнік. На мармуры высечаны імёны герояў, якія стаялі тут насмерць.

Камандзір мінамётнага разліку

Мікалай Рыгоравіч Бяляеў — поўны кавалер ордэна Славы. Нарадзіўся 5.6.1925 г. ў в. Кругліца Быхаўскага раёна. З сялян. З сакавіка 1944 г. на 1-м Беларускім фронце. Камандзір мінамётнага разліку гвардыі старшы сяржант М. Р. Бяляеў вызначыўся ў баях на тэрыторыі Польшчы і Германіі. 7.10.1944 г. ў раёне Магнушаўскага плацдарма агнём з мінамёта знішчыў кулямёт і расеяў каля ўзвода пяхоты праціўніка; 31.1.1945 г. у баях за г. Шверын ліквідаваў 3 агнявыя кропкі ворага; 16.4.1945 г. пры прарыве абароны праціўніка і ў наступных баях на Зеелаўскіх вышынях ліквідаваў 3 кулямётныя кропкі і знішчыў 25 гітлераўцаў, у баях за Берлін — 2 варожыя кулямёты з разлікам. Жыве і працуе ў г. Ладыжын Вінніцкай вобласці.

Тры подзвігі Мікіты Перавознікава

Мікіта Іосіфавіч Перавознікаў — поўны кавалер ордэна Славы. Нарадзіўся 27.1.1908 г. ў в. Чачэвічы Быхаўскага раёна. З сялян. Беларус. Член КПСС з 1950 г. Да 1941 г. працаваў у міліцыі. У час вайны з 1942 г. партызан, з 1944 г. на фронце. Памочнік камандзіра стралковага ўзвода гвардыі старшы сяр-

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

М. І. Перавознікаў.

П. Т. Курсакоў.

жант М. І. Перавознікаў вызначыўся ў баях за вызваленне Польшчы. 19.8.1944 у час наступлення ў ліку першых уварваўся ў траншэю праціўніка, быў паранены, але поля бою не пакінуў; 21.12.1944 г. ў варожым тыле на Вісленскім плацдарме закідаў гранатамі траншэю праціўніка, знішчыў кулямётную кропку, прыкрыў адыход групы разведчыкаў; 22.2.1945 г. ў баі за Познань удзельнічаў у ліквідацыі апорнага пункта гітлераўцаў, адбіцці 2 контратак. Пасля вайны жыў і працаваў у пасёлку Малое Ісакава Гур'еўскага раёна Калінінградскай вобл. Памёр 6.10.1966 г.

Вось што сказана ў прадстаўленні да ўзнагароды Перавознікава ордэнам Славы I ступені, падрыхтаваным камандаваннем палка ў апошнія тыдні вайны: «Перавознікаў Мікіта Восіпавіч, гвардыі старшы сяржант, разведчык 244-га гвардзейскага палка 82-й гвардзейскай стралковай дывізіі. Прадстаўляецца да ордэна Славы першай ступені.

Таварыш Перавознікаў у баях па знішчэнню акружанай групоўкі ворага ў горадзе Познані 22 лютага 1945 года пры штурме крэпасці «Цытадэль» першым дабраўся да дота і гранатай і бутэлькай з гаручай сумессю знішчыў гарнізон дота ў колькасці чатырнаццаці салдат на чале з афіцэрам. Затым таварыш Перавознікаў павёў пяхоту на другі дот, дзе немцы спрабавалі контратакаваць групу нашых воінаў. Смельчакі, узброіўшыся гітлераўскімі фауст-патронамі, адбілі дзве контратакі ворага і знішчылі 9 гітлераўцаў, чым садзейнічалі поспеху бою.

Камандзір 244-га гв. стр. палка
гвардыі падпалкоўнік К. Паўленка.
22.4.45 г.»

Хадайніцтва камандзіра палка падтрымалі камандзір 29-га стралковага корпуса гвардыі генерал-маёр артылерыі Хетагураў і камандуючы 8-й гвардзейскай арміяй гвардыі генерал-палкоўнік В. І. Чуйкоў.

Справа ўсяго жыцця

З успамінаў Антаніны Мядзведскай, сястры генерала П. Т. Курсакова

Павел Трафімавіч Курсакоў нарадзіўся 3(15). 3.1897 г. ў в. Ветранка Быхаўскага раёна. Генерал-маёр (1943). З рабочых. Член КПСС з 1917 г. Скончыў курсы «Выстрал» (1931), Вышэйшыя акадэмічныя курсы (1947). З 1916 г. ў царскай арміі, з 1917 г. ў Чырвонай гвардыі, потым у Чырвонай Арміі. Удзельнічаў у баях пад Оршай, Полацкам, Глыбокім, Гроднам, разгроме контррэвалюцыйнага мяцяжу ў Яраслаўлі — камісар палка, эскадрона. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. У Айчынную вайну на Заходнім і 1-м Беларускім франтах, камандзір кавалерыйскай дывізіі, удзельнічаў у Ржэўска-Сычоўскай, Калінкавіцка-Мазырскай, Вісла-Одэрскай, Усходне-Памеранскай і Берлінскай аперацыях. З 1948 г. ў запасе. Узнагароджаны 2 ордэнамі Леніна, 5 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Суворава I і II ступеней, медалямі. Памёр П. Т. Курсакоў 16.1.1952 г.

Рана пачалося працоўнае жыццё Паўла Курсакова. У 1909 г. ён, дванаццацігадовы хлопец, ужо стаяў ля дыхаючай гарачынёй печы — варыў шкло. Працуючы побач з кадравымі рабочымі на Ветранскай гуце, ён з захапленнем слухаў расказы старэйшых аб рэвалюцыі, паступова засвойваў пралетарскі светапогляд. Калі Паўла прызвалі ў армію, ён ужо разумеў, што набліжаецца новая рэвалюцыйная бура. Гэта разуменне стала перакананнем у час лютаўскай буржуазнай рэвалюцыі. Тады Павел Курсакоў уступіў у партыю бальшавікоў і прымаў актыўны ўдзел у рабоце палкавога камітэта, вёў агітацыю сярод салдат за давядзенне рэвалюцыі да перамогі рабочых і сялян, за перадачу ўсёй улады Саветам. З радасцю сустрэў салдат Павел Курсакоў Вялікую Кастрычніцкую сацыялістычную рэвалюцыю. З гэтага часу ўсё сваё жыццё прысвяціў службе ў радах Узброеных Сіл першай сацыялістычнай дзяржавы. Былы начальнік штаба 17-й гвардзейскай дывізіі С. Н. Сеўругоў у сваіх успамінах пісаў: «Павел Трафімавіч Курсакоў быў з тых ваенных, на лёс якіх выпаў асноўны цяжар салдацкай працы ў першы перыяд іспавання Савецкай дзяржавы. Удзельнічаў у баях супраць чэхаславацкіх легіёнаў і «самарскай учрадзілкі», супраць арміі Калчака. Быў камандзірам узвода, палітруком, камандзірам эскадрона...» Летам 1918 г. камісар палка Курсакоў вадзіў сваіх кавалерыстаў на падаўленне белагвардзейскага мяцяжу ў Яраслаўлі. Потым баявы вопыт дапамагаў байцам яго палка пастаянна весці баі на Заходнім фронце. На іх шляху былі Орша і Полацк, Глыбокае і Гродна — гарады і мястэчкі роднай Беларусі.

Быхаўскім раённым гісторыка-краязнаўчым музеем

Павел Трафімавіч праводзіў работу не толькі сярод байцоў. У вызваленых ад кайзераўскай акупацыі раёнах ён дапамагаў мясцовым камуністам ствараць Саветы, ваенныя камісарыяты і камбеды, вербаваць добраахвотнікаў у Чырвоную Армію, выступаў перад землякамі-беларусамі, растлумачваў сэнс Кастрычніцкай рэвалюцыі, унутранае і знешняе становішча Савецкай Расіі, нацыянальную палітыку. На гэтых сходах прымаліся рэзалюцыі і ў падтрымку рабоча-сялянскага ўрада.

Толькі аднойчы Паўлу давялося пабываць на роднай Быхаўшчыне. Ён заехаў у Ветранку да маці, калі ў 1920 г. накіроўваўся ў складзе 3-й Туркестанскай кавалерыйскай дывізіі ў Фергану граміць басмачоў.

У гады Вялікай Айчыннай вайны кавалерысты палкоўніка Курсакова рабілі смелыя рэйды па тылах ворага пад Ржэвам і Вязьмай, Калінкавічамі і Мазыром. Саўінфармбюро паведамляла: «Прарваўшыся ў канцы лістапада ў тыл ворага, кавалерыйская група палкоўніка Курсакова перарэзала важную чыгуначную магістраль, паралізавала ўсякі рух на гэтай дарозе і на працягу шэрагу дзён з баямі яе ўтрымлівала. Пазней, выконваючы загад камандавання, кавалерыйская група паглыбілася ў тыл ворага і граміла там варожыя гарнізоны, узрывала масты і чыгуначныя лініі, разбурала сродкі сувязі...» За гэты рэйд П. Т. Курсакову было прысвоена званне генерал-маёра, а 527 афіцэраў, сяржантаў і салдат былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі.

У «Гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Савецка-га Саюза, 1941—1945» (М., 1964. Т. 3. С. 365) расказваецца пра смелыя дзеянні 2-га гвардзейскага кавалерыйскага корпуса, які імкліва ўвайшоў у прарыў, прабіўся ў варожы тыл, перапраўіўся 11 верасня 1943 года цераз Дзяснy і захапіў плацдарм на яе правым беразе: «Чатыры дні да падыходу агульнавайскавых злучэнняў корпус утрымліваў плацдарм на Дзясне. Вораг рабіў усё, каб акружыць і знішчыць коннікаў. Да васьмі разоў у дзень нямецкая пяхота пры падтрымцы танкаў і авіяцыі атакавала кавалерыстаў, але кожны раз адкочвалася назад, пакідаючы на полі многа забітых.

За смелыя і рашучыя дзеянні пры фарсіраванні Дзясны 2-і гвардзейскі кавалерыйскі корпус быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. 20-я Чырванасцяжная ордэна Леніна кавалерыйская дывізія гэтага корпуса пад камандаваннем генерал-маёра П. Т. Курсакова, якая асабліва вызначалася ў баях, была перайменавана ў 17-ю гвардзейскую Чырванасцяжную ордэна Леніна кавалерыйскую дывізію».

Праз лясы Смаленшчыны і глыбокія снягі Падмаскоўя, праз Вяземскія, Курскія, Арлоўскія і Бранскія лясы, праз дрыгвяністыя балоты Беларусі прайшлі коннікі майго брата. Яны вызвалялі Польшчу, грамілі ворага ў Памеранii і каля Брандэнбурга пераможна завяршылі свой паход.

Тры раненні, атрыманыя ў баях, падарвалі здароўе брата. Ён памёр у росквіце сіл у Пяцігорску.

Браты-франтавікі

М. І. Юрчанка.

У сям'і Івана Рыгоравіча і Юліі Міхайлаўны Юрчанкаў з в. Праточнае было чацвёра сыноў: Георгій, Мікалай, Аляксандр і Уладзімір. З першых дзён вайны ўсе чацвёра апынуліся на фронце. Па-рознаму склаўся іх лёс. Аляксандр у саставе баявой часці абараняў Ленінград і загінуў смерцю героя ў 1941 г. Быў ён палітруком мінамётнай батарэі. Мінамётчыкі адважна біліся з ворагам, стрымліваючы яго шалёны націск, але сілы былі няроўныя. Скончыліся боепрыпасы. І тады мужныя воіны кінуліся ў рукапашную. Палітрук Юрчанка — у першых радах. У гэтым баі ён асабіста знішчыў чатырох гітлераўцаў. Бой стаў для яго апошнім. А да вайны Аляксандр быў чалавекам самай мірнай прафесіі — настаўнікам.

Самы малодшы з Юрчанкаў — Уладзімір. У званні малодшага лейтэнанта быў датэрмінова выпушчаны восенню 1941 г. з артылерыйскага вучылішча і накіраваны ў дзеючую армію камандзірам агнявога ўзвода асобнай стралковай брыгады, якая стрымлівала націск акупантаў пад Масквой. У рукапашным баі быў цяжка паранены. Пасля шпіталя камандаваў супрацьтанкавай батарэяй. Потым былі яшчэ раненне і кантузія, шпіталь і зноў фронт. Прайшоў баявы шлях ад Масквы да Кёнігсберга. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Лейтэнант бранятанкавых войск, кадравы афіцэр Чырвонай Арміі Мікалай Юрчанка напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны камандаваў сапёрнай ротай у танкавым палку. У час цяжкіх абарончых баёў летам 1941 г. ён быў прызначаны начальнікам інжынернай службы. Калі салдаты з горыччу пакідалі гарады і вёскі, на душы ў Мікалая Юрчанкі было асабліва цяжка — на шляху адступлення трапляліся населеныя пункты з дарагімі яму назвамі Бахань, Слаўгарад, Вець. У жніўні 1941 г. полк трапіў у акружэнне, але байцы не палі духам. У момант прарыву варожага кальца яны праявілі масавы гераізм. З гонарам выканала сваю задачу група інжынернага забеспячэння на чале з М. І. Юрчанкам. Далейшы яго баявы шлях да самага дня Перамогі быў звязаны з асобным Станіслаўскім ордэна Чырвонай Зоркі пантонна-маставым батальёнам, у якім ён камандаваў ротай, выконваў абавязкі начальніка штаба. М. І. Юрчанка ўдзельнічаў у вызваленні Румыніі, Венгрыі, Польшчы, Чэхаславакіі. Пяць ордэнаў і дзевяць медалёў — так адзначыла Радзіма яго ўклад у справу Перамогі. Мае Мікалай Іванавіч і 2 узнагароды ЧССР.

Старэйшы з братоў — Георгій Іванавіч перад вайной знаходзіўся ў запасе ў званні тэхніка 1-га рангу. З першых дзён барацьбы з фашысцкімі захопнікамі ён быў у радах абаронцаў Радзімы. Узначальваў спецыяльныя падраздзяленні чыгуначнікаў, на долю якіх выпадала нялёгкая задача па эвакуацыі людзей і абсталявання ў глыбокі тыл, удзельнік абароны Масквы, пад бомбамі аднаўляў разбураныя чыгуначныя станцыі. Давялося яму ўдзельнічаць і ў вайне з імперыялістычнай Японіяй.

Пасля вайны браты вярнуліся да мірнай працы. Як на фронце не шкадавалі жыцця, так і на рабоце не шкадавалі сіл. Цяпер яны на заслужаным адпачынку, часта сустракаюцца з моладдзю, вядуць вялікую выхаваўчую работу. Уладзімір Іванавіч жыве ў г. Андропаў. Георгій Іванавіч доўгі час працаваў настаўнікам у Быхаве, дзе і жыве. Тут жа жыве і Мікалай Іванавіч Юрчанка, маёр у адстаўцы. Працаваў інструктарам райкома партыі, старшынёй выканкома гарадскога Савета народных дэпутатаў, дырэктарам аўтабазы.

Т. Бабцова, Я. Сідараў.

Праз агонь і ваду

К. І. Маркоўскі.

В. І. Маркоўскі.

Перад вайной у сям'і старшыні мясцовага калгаса Івана Апанасавіча Маркоўскага з в. Балонаўка і яго жонкі Надзеі Андрэеўны падраслі два сыны — Канстанцін і Васіль. Абодва ў час вайны сталі абаронцамі сваёй Радзімы, абодвум давялося зведаць нягоды і трапляць часам у такія сітуацыі, з якіх, здавалася, і выйсця няма. Але, як сказаў Васіль Іванавіч, мабыць, было з імі франтавое шчасце, якое і дапамагло выжыць, дайсці да Перамогі.

Часць, у якой служыў Косця Маркоўскі, дыслацыравалася на Волзе. Калі пачалася вайна, яна была перакінута ў Беларусь. У час цяжкіх абарончых баёў на тэрыторыі роднай Магілёўшчыны Канстанцін трапіў у палон, стаў вязнем Лупалаўскага лагера смерці. Калі ўдалося вырвацца на волю, далучыўся да народных мсціўцаў. Пасля злучэння партызан з часцямі Чырвонай Арміі ў складзе войск 2-га Беларускага фронту дайшоў да Кёнігсберга. Пасля вайны працаваў вадзіцелем, загадчыкам гаража. Зараз Канстанцін Іванавіч на заслужаным адпачынку, жыве ў Быхаве. Яго ведаюць як працавітага і сумленнага чалавека, камуніста.

Не забывае родных мясцін і брат Васіль Іванавіч Маркоўскі. І хоць няма ўжо бацькоў, а сам жыве ў Мінску, часта бывае ў Балонаўцы. Яго, адважнага лётчыка, кавалера трох ордэнаў Чырвонага Сцяга, ордэна Айчыннай вайны I ступені, тут добра ведаюць і паважаюць.

Нарадзіўся В. І. Маркоўскі ў 1922 г. Член КПСС з 1947 г. Пасля скончэння ў 1941 г. Магілёўскага аэраклуба, быў накіраваны ў Ейскае ваенна-марское авіяцыйнае вучылішча. Стаў курсантам у маі 1941 г., перад самай вайной. Потым быў пераведзены ў Саранскае ваенна-марское авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў-штурмавікоў, якое скончыў у кастрычніку 1943 г. Быў накіраваны лётчыкам у 46-ы штурмавы авіяполк Паўночнага флоту. У складаных умовах Запаляр'я даводзілася выконваць яму нялёгкія баявыя задачы. З 1944 г. камандаваў авіязвяном. За час баявых дзеянняў на Паўночным флоце Васіль Іванавіч здзейсніў 37 паспяховых баявых вылетаў, у выніку якіх знішчыў 85 салдат і афіцэраў праціўніка, 4 самалёты на зямлі

Быховский районный историко-краеведческий музей

і 1 у паветры, 3 павозкі з грузам, патапіў 6 суднаў, пашкодзіў транспарт водазмяшчэннем 5000 т і маторны катэр, спаліў і разбурыў 27 варожых пабудоў, склад гарадской прыстані і прычал порта, выклікаў 5 ачагоў пажару. Пасля вайны працягваў служыць у Паўночным флоце. У 1949 г. па стану здароўя пакінуў лётную работу. У 1961 г. звольнены ў запас у званні маёра. Працаваў выкладчыкам, інжынерам, у 1973—87 гг.— дыспетчарам службы руху Мінскага аб'яднанага авіятрада Беларускага ўпраўлення грамадзянскай авіяцыі. Выдатнік Аэрафлота.

З успамінаў В. І. Маркоўскага

Аб іншым чалавеку кажуць, што ён прайшоў і агонь, і ваду... Агню мне давялося бачыць шмат: па мне білі карабельныя і берагавыя зеніткі ў кожным вылеце. А вады таксама было ўдосталь — усё Баранцава мора пад крылом. А яго ледзяны холад давялося зведаць уласным целам. Колькі разоў быў на валаску ад гібелі, але, мабыць, у сарочцы нарадзіўся — вязучы! А адзін дзень, дарэчы гэта быў якраз дзень майго нараджэння — 23 красавіка, можна лічыць, што я нарадзіўся другі раз. Такі цяжкі быў тады бой, не верылася, што выйду з яго жывым. Красавік 1944 г. ў Запаляр'і быў халодны, мокры, часта ішоў снег, дождж. Раніцай нас сабралі ў зямлянцы-клубе для атрымання баявой задачы. Паводле даных паветранай разведкі варожы канвой у складзе 8 транспартаў, 20 караблёў аховы і 6 мінаносцаў рухаўся курсам на поўнач. Над канвоем патрулявалі гітлераўскія знішчальнікі. На штурмоўку канвоя накіроўвалася ўдарная група з васьмі Іл-2, вядучым быў прызначаны капітан І. Б. Катунін. Я павінен быў ляцець вядзёным на сваім аднамесным самалёце. У яго бамбавюках былі 4 фугасныя бомбы вагой па 100 кг, пад крыламі віселі рэактыўныя снарады, пушкі і кулямёты мелі поўны боекамплект. У навушніках пачуліся пазыўныя нашага камандзіра, ён паведаміў, што вышыня воблачнасці ў раёне цэлі 400 м. Тым часам фашысты засекці нашу васьмёрку і выслалі для прыкрыцця канвоя некалькі груп Ме-109, а караблям далі каманду зайсці ў порт пад ахову берагавых батарэй. Вялікія транспарты так і зрабілі, з боку мора іх ахоўвалі два рады баявых караблёў. Шчыльным паўкальцом іх прыкрылі 6 мінаносцаў, якія накіравалі нам насустрач свае гарматы. Набраўшы вышыню, Катунін павёў групу на збліжэнне з цэллю. Сам ён выбраў вялікі транспарт у цэнтры канвоя. У гэты час у небе з'явіліся «месершміты» і кінуліся на нас у атаку. Ім наперарэз паімчалі нашы «Яко» з групы прыкрыцця. У бой уступалі і нашы паветраныя стралкі. Мне даводзілася круціцца ва ўсе бакі, я ж быў адзін. Гэта зразумелі варожыя знішчальнікі, як мага стараліся прарвацца бліжэй да мяне. Я спаймаў у перакрыжаванне прыцэла адзін з мінаносцаў і адкрыў па ім агонь. У гэты час мой самалёт і самалёты першай чацвёркі, якія пайшлі ў атаку, ахутала густымі жоўта-аранжавымі ўспышкамі зенітных снарадаў. Яны рваліся спераду, збоку, ззаду. Загаварылі ўсе зенітныя сродкі порта і канвоя. Але наш вядучы ўпарта ідзе ў атаку, і мы таксама. Яго паветраны стралок вядзе бесперапынную барацьбу з «месершмітамі». Раптам з-пад яго кабіны палыхнула полымя. У эфіры трывожныя галасы: «Гарыць вядучы». А Катуніна усё роўна камандуе: «Бомбы кідаць з пікіравання! З баявога курса не зварочваць!» Першай уваходзіць у піке ахопленая полымем машына Катуніна. Яна так з піке і не выйшла, накіраваная цвёрдай рукой камандзіра, яна вогненным смерчам урэзалася ў фашысцкі транспарт. Як загіпнатызаваны, глядзеў я на гэту карціну, пакуль маю машыну выбуховай хваляй не падкінула ўверх. Тады я зразумеў, што, атакуючы мінаносец, я знізіўся да вышыні 200 м і трапіў у небяспечную зону, дзе рваліся бомбы. А ў мяне пад плоскасцямі бомбы вісяць. Я накіраваў свой «Іл» у гушчыню канвоя і даў максімальныя абароты рухавіку. Спераду па курсу, прыціснуўшыся да стромай скалы, амаль побач стаялі два фашысцкія транспарты. Накіраваў свой «Іл» на іх. Гэта заўважылі варожыя знішчальнікі. Адзін з іх, аддзяліўшыся ад сваёй групы, імчаўся мне наперарэз. «Ці паспею? — маланкаю праслалася думка,— ці «худы» зрэжа мяне раней?» І вачам сваім не паверыў: «месершміт» імгненна разляцеўся на часткі. Яго абломкі паляцелі на свае ж караблі. Мой самалёт над цэллю. Увёў яго ў пікіраванне, скінуў бомбы, стаў выходзіць з піке. І раптам прама перад вачыма стромая скала. Вось-вось мой «Іл» урэжацца ў яе. Імгненна перавёў машыну ў слізготны віраж і каля самага грэбеня хвалі абагнуў перашкоду. На максімальна малой вышыні вырваўся з кальца варожых зенітных снарадаў, манеўруючы паміж узнятымі ад іх вадзянымі слупамі. І тут заўважыў фашысцкі супрацьлодачны самалёт, які перасек мой курс. Я рашыў не прапусціць яго. Падышоўшы бліжэй, даў па ім доўгую чаргу з пушак. Задраўшы нос, «Блонфос-138» упаў у мора. «Гэта табе за Катуніна»,— крыкнуў я і паляцеў даганяць сваю групу. Азвярэлыя ад страт фашысты хацелі адпомсціць нам. Завязаўся жорсткі паветраны бой. Гітлераўцы пераўзыходзілі нас колькасна. Мы ішлі «змейкай», не даючы ворагам магчымасці рассеяць нас, каб пасля біць па-аднаму. Мне на маім аднамесным самалёце было надзвычай складана. Я круціўся ва ўсе бакі, на малой вышыні манеўраваў так, што галава ішла кругам, але ўсё ж не дарма — не папаў у прыцэл ніводнаму фашысцкаму знішчальніку і, больш таго, сам паспяваў паслаць насустрач ім прыцэльную пушачную чаргу. І невядома, чым бы скончыўся гэты наш паядынак з ворагам, калі б у гэты момант у небе не з'явілася новая група нашых штурмавікоў. Варожыя знішчальнікі, пакінуўшы нас, кінуліся

Быховский районный историко-краеведческий музей

ім наперарэз. Аднак перапыніць іх атаку ўжо не змаглі. Толькі «Ілы» паспелі скінуць на цэль свой бомбавы груз, як над караванам ужо з'явіліся нашы бамбардзіроўшчыкі, а потым і тарпеданосцы. А дабівала варожы караван ужо новая група савецкіх штурмавікоў. Вось так мы прарываліся праз агонь...

Мелі справы і з вадой. Аднойчы вяртаўся з баявога задання. Варожыя караблі былі паспяхова атакаваны. Але на душы было цяжка — не адказваў па перагаворным устройстве на мае пытанні паветраны стралок, мабыць, зноў парадзелі рады баявых сяброў. А ад моцнага зенітнага агню была пашкоджана масласістэма рухавіка. Унізе пляскаліся сцюдзёныя з белымі баранчыкамі хвалі. Абароты рухавіка катастрафічна падалі. Я з вялікай цяжкасцю ўтрымліваў машыну ў гарызантальным становішчы. Але вось у маторы штосьці абарвалася. Вінт у апошні раз зрабіў абарот і спыніўся. Сем тон металу падалі ў ледзяную ваду. Удар! Самалёт адскочыў ад вады, як быццам яго падкінула спружына. Я ўдарыўся галавой аб браняспінку, страціў прытомнасць. Апрытомнеў ад шуму вады, якая з усіх шчылін хлынула ў кабіну. Я паспеў адшпіліць прывязныя рамяні, але адчыніць ліхтар удалося толькі пад вадой. Выратавальны жылет разам з парашутам выкінуў мяне наверх і адразу ж перакуліў уніз галавой. Захлынаючыся, я адшпіліў лямкі. Цяпер галава была на паверхні. Але рукі і ногі звяло сутаргай. Калі мяне выносіла на вяршыню хвалі, я ўбачыў караблі. «Свае ці чужыя?» А хутка над галавой закружыў чырваназорны самалёт. «Дзякуй, браток...» І тут я зноў страціў прытомнасць. Калі апрытомнеў, мой выратавальнік усё яшчэ кружыў нада мной. Вартавы катэр, выкліканы ім па рацыі, падабраў мяне.

На вышыні ля вёскі Пустынка

З успамінаў І. К. Галіноўскага

Іван Кірылавіч Галіноўскі нарадзіўся 17.10.1917 г. ў в. Залеская Слабада Быхаўскага павета. Член КПСС з 1944 г. У 1936 г. скончыў Магілёўскі педтэхнікум, працаваў настаўнікам, пасля завучам. З 1939 г. ў Чырвонай Арміі. У Вялікую Айчынную вайну на Паўночна-Заходнім, Бранскім, 1-м Прыбалтыйскім і 3-м Беларускім франтах — памочнік камандзіра ўзвода артразведчыкаў. Быў цяжка кантужаны. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны, Чырвонай Зоркі, медалямі. У 1950 г. скончыў Белдзяржуніверсітэт. З 1946 г. працаваў дырэктарам Глухскай сярэдняй школы, Быхаўскай сярэдняй школы № 2, з 1963 выкладчык Быхаўскай сярэдняй школы № 3. І. К. Галіноўскаму першаму з настаўнікаў раёна ў 1959 г. прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР».

У лютым 1943 г. 16-я армія (пазней 11-я гвардзейская) рыхтавалася да прарыву нямецкай абароны і наступлення на Арол. Наш артылерыйскі разведдывізіён актыўна вёў разведку. Штурм пярэдняга краю фашыстаў пачаўся 22 лютага. Пасля амаль гадзіннай артпадрыхтоўкі нашы войскі перайшлі ў наступленне. На шляху дзеяння арміі большасць агнявых кропак ворага была знішчана або падаўлена. Аднак некаторыя захавалі сваю баяздольнасць. Асабліва ўпарта фашысты супраціўляліся на вышынях каля вёсак Пустынка і Буда-Манастырская. Трэба было дадаткова правесці разведку агнявых кропак на гэтых вышынях. У канцы першага дня наступлення начальнік разведкі артылерыі арміі накіраваў старшага лейтэнанта Люцікава Г. К., старшага сяржанта Ойстагера М. В. і мяне, старшага сяржанта, у раён апорных пунктаў для тэрміновай разведкі агнявых кропак ворага.

Да вышыні ля в. Пустынка дабраліся ноччу. А як толькі пачало світаць, нямецкая авіяцыя пачала бамбіць падыходы да пярэдняга рубяжа абароны. Аднак частку нямецкай траншэі нашы войскі змаглі захапіць яшчэ ў першы дзень наступлення. Мы кінуліся да яе. Ледзь ускочылі ў траншэю, як разанулі кулямётныя чэргі. Тут аддыхаліся, агледзеліся. Палова траншэі была ў нашых руках, астатняя — у фашыстаў. Шэсць нашых салдат, якія засталіся пасля ўчарашняга бою, блакіравалі праход, а цяжкасцю ўтрымлівалі траншэю, бо значная частка вышыні знаходзілася ў руках ворага. Жменька байцоў мела выключную патрэбу ў падмацаванні. На світанні вораг узмацніў агонь па нашай абароне. Гэта дапамагло нам выявіць яго агнявыя кропкі, нанесці іх на карту і вызначыць каардынаты. А потым фашысты пайшлі ў контратаку. Цяпер ў траншэі нас было дзевяць чалавек.

І. К. Галіноўскі.

М. Н. Лабатрасаў.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Старшы лейтэнант Люцікаў імгненна размясціў нас паўкругам і загадаў страляць кароткімі чэргамі. Эканомілі патроны, бо іх было мала. Фашысты, відаць, адчувалі гэта і няўмольна набліжаліся да нас. Становішча было крытычным. На бруствер паклалі гранаты, да трафейных вінтовак прымацавалі штыкі. Біцца рашылі да апошняга патрона.

Зусім развіднела, мясцовасць праглядалася далёка-далёка, што было нам на карысць. Прыкмеціўшы перамяшчэнне ворага, мы адкрылі мінамётны агонь. Праціўнік залёг, але праз некаторы час зноў кінуўся да траншэі. Мы падрыхтавалі да бою гранаты. У гэты цяжкі час зусім нечакана для нас загрукацелі залпы рэактыўных мінамётаў. Контратака ворага захлынулася. Праз 20—30 мінут да нас прыбыло падмацаванне. Каардынаты агнявых кропак праціўніка неадкладна былі перададзены начальніку артразведкі арміі. Наступленне нашых войск працягвалася.

У імя жыцця

З успамінаў былога партызана-разведчыка, удзельніка штурму Берліна А. Ф. Палякова

За баявыя партызанскія справы мяне ўзнагародзілі медалём «Партызану Айчыннай вайны» I ступені. Пасля злучэння з часцямі Чырвонай Арміі я быў накіраваны ў вучэбны батальён на курсы малодшых камандзіраў. Пасля ў складзе гэтага батальёна ўдзельнічаў у баях за в. Прыбар. 24 красавіка 1944 г. быў паранены (тады ж узнагародзілі медалём «За адвагу»). Пасля шпіталю прызначылі камандзірам аддзялення 369-й стралковай дывізіі. У жніўні 1944 г. ў баях за крэпасць Асавец атрымаў другое раненне. Пасля напраўкі зноў вярнуўся ў сваю дывізію. Мы рухаліся на захад, усё далей і далей заставаліся родныя мясціны. Баі былі асабліва жорсткія. Вораг абараняўся ўпарта. Запомніўся бой у верасні 1944 г. У час варожай контратакі загінуў кулямётчык Я. Даронка. Пагроза прарыву немцаў на нашым участку магла стаць рэальнасцю. Я не разгубіўся, лёг за кулямёт і не адпусціў ад яго, пакуль не адбілі атаку праціўніка. Многія тады былі ўзнагароджаны, я таксама атрымаў першы ордэн Чырвонай Зоркі. У студзені 1945, ужо на тэрыторыі Германіі, давялося адбіваць шалёную атаку варожых танкаў. За гэты бой быў прадстаўлены да другога ордэна Чырвонай Зоркі. Потым зноў раненне, шпіталь і зноў родная дывізія.

Да логава гітлераўскіх фашыстаў заставаліся лічаныя кіламетры. У красавіку 1945 г. фарсіравалі Одэр. Нас было 20 байцоў і афіцэраў, якія першымі на нашым участку пераправіліся цераз раку і цэлы дзень утрымлівалі захоплены плацдарм. Памяць пра той незабыўны бой — трэці ордэн Чырвонай Зоркі. А апошняй баявой узнагародай быў ордэн Славы III ступені за штурм Берліна.

У кастрычніку 1945 г. прыехаў у родную в. Балонаў Сялец. Скончыўшы курсы трактарыстаў, стаў працаваць на роднай вызваленай зямлі. Потым, у 1952 г., старшынёўская пасада ў калгасе імя Громава, на якой прабыў цэлых сем гадоў. Далейшая праца таксама звязана з людзьмі, з роднай зямлёй. А ў сям'і тым часам непрыкметна выраслі, сталі дарослымі трое дзяцей. У іх свае дзеці. Так і ідзе жыццё па крузе.

Чатыры ордэны разведчыка

Доўгі час працаваў гамаэлектразваршчыкам у Балонавасялецкай МТС, потым у саўгасе «Быхаўскі» Міхаіл Навумавіч Лабатрасаў. У святочныя дні пінжак ветэрана ўпрыгожваюць чатыры баявыя ордэны. У Вялікую Айчынную вайну Міхаіл Навумавіч быў палкавым і дывізійным разведчыкам 139-й стралковай дывізіі.

У чэрвені 1944 г. ў час баёў за Магілёў Міхаіл Лабатрасаў з групай разведчыкаў ноччу прабраўся ў горад. Каля аднаго з дамоў стаяла легкавая машына, у якую фашысты грузілі чамаданы. Калі пямецкі палкоўнік садзіўся ў машыну, разведчыкі напалі на яго і салдат. Палкоўніка даставілі ў штаб дывізіі. За гэту аперацыю Лабатрасаў быў узнагароджаны ордэнам Славы III ступені.

Пад Навагрудкам Міхаіл з разведчыкамі ўзяў яшчэ двух вельмі каштоўных «языкоў», за што Лабатрасаў атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі.

Надзвычай цяжкія баі ішлі за крэпасць Асавец. Фашысты ўмацавалі яе шасцю радамі траншэй з хадамі зносін. Каб разведаць сістэму абароны, Міхаіл з таварышамі тройчы хадзіў у разведку, і нарэшце ім пашанцавала «язык» — дывізіённы інжынер з картамі. Ён даў каштоўныя звесткі. За гэту баявую аперацыю Лабатрасаў быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені. А потым адважны разведчык браў Кёнігсберг, дабіваў фашыстаў у іх логаве — Берліне. За мужнасць, праяўленую ў баях на Кюстрынскім плацдарме пад Берлінам, Міхаіл Навумавіч быў узнагароджаны другім ордэнам Чырвонай Зоркі.

П. Шлеянкоў.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Танкіст Мікалай Лагуцёнак

М. А. Лагуцёнак.

Мікалай Андрэевіч Лагуцёнак нарадзіўся ў 1921 г. ў Быхаве. У 1940 г. стаў салдатам Чырвонай Арміі, у 1941 г.— абаронцам сваёй Радзімы. І рабіў ён сваю нялёгкую ваенную справу на працягу ўсёй вайны, не шкадуючы ні сіл, ні жыцця.

...У баі пад Кіраваградам рота цяжкіх танкаў пад камандаваннем старшага лейтэнанта Мікалая Лагуцёнка з прыдадзенай ротай аўтаматчыкаў заняла зыходны рубеж. На світанні танкісты імкліва павялі ўперад свае машыны па папярэдне размінiраваных праходах. А следам кінуліся пехацінцы. Фашысты спачатку разгубіліся, але хутка здолелі арганізаваць контратаку, адкрылі па нашых воінах кулямётны і гарматны агонь, кінулі супраць іх каля дзесятка танкаў і самаходак. М. Лагуцёнак скамандаваў роце выйсці на прамую наводку, а свайму механіку-вадзіцелю загадаў трымаць напрамак на галаўны варожы «тыгр». Моцна ўчапіўшыся рукамі ў прыцэльны прыбор, Мікалай лавіў на перакрыжаванне фашысцкі танк. Стрэл. «Тыгр» гарыць. Перанёсшы агонь, Лагуцёнак запаліў яшчэ два «тыгры». Два варожыя бронетранспарцёры і самаходную гармату «фердынанд» падбілі яго падначаленыя. Пераадольваючы шалёнае супраціўленне фашыстаў, савецкія войскі штурмам авалодалі Кіраваградам. За мужнасць і адвагу, праяўленыя пры вызваленні горада, М. А. Лагуцёнак быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

З магутнай, здавалася, непрыступнай варожай абаронай сутыкнуліся савецкія войскі над Бунцлавам. Напярэдадні штурмуючым нашым часцям фашысты кінулі бронецягнік. Танкаваму палку, у складзе якога была і рота Лагуцёнка, была паставлена задача разбіць рухомую, багата насычаную агнявымі сродкамі крэпасць на колах. Полк выканаў гэту задачу. Расстраляўшы бронецягнік, танкісты вырваліся на дарогу, якая была забіта варожай тэхнікай. Больш трохсот аўтамашын, шмат гармат, зенітных установак, бронетранспарцёраў было разбіта ўшчэнт. За майстэрства, праяўленае ў гэтым баі, адважнаму танкісту Лагуцёнку быў уручаны другі ордэн Чырвонага Сцяга.

На падыходзе да Берліна перад фронтам наступаючых савецкіх войск немцы закапалі ў зямлю танкі і самаходкі, замініравалі ўсе падыходы да сваёй абароны. Бой прадстаяў цяжкі і крывапралітны. Уважліва вывучыўшы сістэму агню праціўніка, намеціўшы сабе месца прарыву, танкісты з наступленнем сігнала аб наступленні ўзламалі абарону і пачалі расшыраць прарыў. Гітлераўцы спрабавалі перайсці ў контратаку, але не зматлі адкінуць савецкіх воінаў, якія рваліся да Берліна. Вось і першая вуліца. Завязаліся ўпартыя баі за кожны дом, за кожны метр дарогі. Рота М. Лагуцёнка, пераадольваючы супраціўленне, прасоўвалася ўперад, знішчаючы агнявыя кропкі ворага. Камандзір стралковага батальёна паказаў Лагуцёнку новую цэль — установленую ў падвале дома гармату. Развярнуўшы танк, Лагуцёнак трапным выстралам разбіў яе. І ў гэты момант удар страшнай сілы абрушыўся на танк — фаустпатрон трапіў у правы бок. Абгарэлага, параненага падабралі Мікалая санітары.

Прыехаўшы пасля доўгага лячэння ў Быхаў, ён быў старшынёй раённага камітэта ДТСААФ, на партыйнай рабоце. Памёр 8.2.1977 г. *І. Дрыгант.*

Таццяна-беларусачка

Таня Зароўная, малодшая з дачок жыхароў Быхава Аляксандра Паўлавіча і Ірыны Яўціхаўны Зароўных пісала бацькам з Масквы, што хутка з дыпломам урача прыедзе дадому на адпачынак. І вось дыплом атрыманы, сабраны чамаданчык. 22 чэрвеня 1941 г. дзяўчына раненька ўстала, каб адправіцца ў дарогу. Але жудасная вестка ашаламіла людзей: вайна! Таццяна тут жа накіравалася ў Чырвонагвардзейскі райваенкамат Масквы. У званні ваенурача трэцяга рангу яна была накіравана на работу ў Маскоўскі ваенны шпіталь. Вораг бамбіў падмаскоўныя абарончыя збудаванні. Параненых было шмат. Маладому ўрачу-тэрапеўту Зароўнай прыйшлося пераквалiфікавацца на хірурга.

Калі ў кастрычніку 1941 г. быў кінуты кліч «Камуністы, на абарону Масквы!», Таццяна добраахвотна пайшла на фронт у складзе 3-й Маскоўскай камуністычнай дывізіі. Тут яна стала членам КПСС. «Не аддадзім фашыстам Маскву!» — разам з аднапалчанамі дала клятву ўрач Т. А. Зароўная.

Быховский районный историко-краеведческий музей

У баях пад Псковам дывізія была акружана ворагам. І ў акружэнні воіны біліся з гітлераўцамі смела і рашуча. На пятую ноч вырваліся з акружэння. Параненыя былі вынесены з поля бою. А ноччу камандзір санітарнай роты Т. А. Зароўная разам са сваімі падначаленымі выйшла за паласу бою і падабрала забітых.

З дзяцінства Таня Зароўная, вучаніца сярэдняй школы № 1 г. Быхава, была смелая, бойкая, гаваркая, займалася спортам, выдатна плавала. Таму яна, невялікага росту, хударлявая, вынесла ўсе цяжкасці франтавога жыцця — праходзіла дзесяткі кіламетраў пешшу, пераплывала цераз рэкі і азёры (бывала, што і з параненымі на плячах) у ваенным абмундзіраванні, пад варожым агнём. Так было, напрыклад, пры пераправе цераз шырокую раку Пола, што пад Псковам. Нярэдка пад абстрэлам даводзілася аказваць не толькі першую дапамогу, але і рабіць неадкладныя аперацыі. Любілі байцы свайго маладога доктара і звалі «Таццяна-беларусачка». І яна ганарылася гэтым. А для параненых байцоў не шкадавала ні сіл, ні часу, сваім шчодрым сэрцам, чуласцю загойвала раны франтавікоў. Толькі душа яе балела па родных мясцінах, па бацьках, якія знаходзіліся пад варожай акупацыяй. Ці жывыя яны? І нарэшце ў 1943 г. пачула, што пачалося

Т. А. Зароўная (Бігашова).

А. С. Кулеш.

вызваленне Беларусі. Пасля Перамогі наведала родны дом, бацькоў. Ёй паведамілі горкую вестку, што любімы малодшы брат Ваня загінуў на фронце ў 1942 г.

Зараз маёр медыцынскай службы ў адстаўцы Т. А. Зароўная (Бігашова) жыве ў Маскве. Яна ўзнагароджана ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

В. Кілеса.

Сястрычкі

Медыцынскія сёстры Вялікай Айчыннай вайны. Маладымі дзяўчаткамі прыйшлося ім надзець шынялі, прыняць на свае кволыя плечы столькі цяжкасцей, прайсці столькі тысяч кіламетраў, зведаць і холад і смякоту, кожную хвіліну глядзець смерці ў вочы! А колькі крыві ім давялося бачыць, колькі ран і пакут салдацкіх! І ні з чым ненараўнальныя дозіркі, у якіх застыла нямое пытанне: «Сястрычка, ці буду жыць?» І яны, сястрычкі, рабілі ўсё магчымае, а часам нават і немагчымае для таго, каб параненыя байцы зноў станавіліся ў строй — выносілі іх з поля бою, аказвалі першую дапамогу пад кулямі і бомбамі, дзяжурылі ў шпіталях па 16—20 гадзін, а то і цэлымі суткамі, няшчотаю сваіх жаночых рук, дабратою і сардэчнасцю лячылі іх раны. А ў цяжкія хвіліны бою франтавыя сёстры са зброяй у руках дапамагалі сваім аднапалчанам і, калі даводзілася прыняць смерць, з нічуць не меншай адвагай, чым мужчыны, аддавалі за Радзіму свае жыцці. Былі сярод іх і слаўныя дочкі Быхаўшчыны.

Алякеандра Савельеўна Кулеш. Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, семнаццацігадовая Саша добраахвотна запісалася на курсы медыцынскіх сясцёр і за восем месяцаў прайшла праграму, якая ў мірны час была разлічана на два гады. Вясну 1942 г. дзяўчына сустрэла пад Ціхвінам. Там яна прыняла і сваё першае баявое хрышчэнне: на эшалон, які спыніўся, наляцелі фашысцкія сцярвятнікі. Скінулі бомбы, а потым на брыючым палёце сталі расстрэльваць людзей. Жудасна было дзяўчыне, але абавязак медыка клікаў да параненых — у самае пекла. Ноччу эвакашпіталь пераправілі цераз Ладажскае возера ў асаджаны Ленінград. Тут людзі галадалі, ледзь трымаліся на нагах, але не падалі духам. У шпіталях не хапала медыкаментаў, крыві для пераліванняў, і тады самі медработнікі станавіліся донарамі. Кроў Сашы Кулеш захавала жыццё сямі воінам.

У час аднаго з налётаў авіяцыі дзяўчыну параніла асколкам у руку, але яна засталася ў страі, працягвала аказваць дапамогу абаронцам горада. А ў адзін з чэрвеньскіх дзён 1942 г. дзяўчыну самую эвакуіравалі на Вялікую зямлю — у будынак шпіталя трапіла варожая фугаска. Саша атрымала цяжкую кантузію, якая пашкодзіла зрок і слых. Прайшлі многія месяцы лячэння, складаная аперацыя вачэй, пакуль яна зноў змагла працаваць у шпіталі, будучы інвалідам другой групы. Пасля вайны А. С. Кулеш пасялілася ў Быхаве. Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны, многімі медалямі.

Настасся Якаўлеўна Азярная. Ёй споўнілася 20 гадоў, калі пачалася вайна. Паўднёва-Заходні, Сталінградскі, Сцяпны франты, бітвы на Арлоўска-Курскай дузе, пад Корсунь-Шаўчэнкаўскім, вызваленне Польшчы, Чэхаславакіі — такі баявы шлях прайшла старшына медыцынскай службы, член КПСС з 1944 г. Н. Я. Азярная.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Франтавыя будні, месяцы і гады вялікіх выпрабаванняў, якія патрабавалі вялікай мужнасці, вынослівасці, асабліва калі працавала ў авіяпрыёмніку. Як і яе сяброўкам у перыяд наступлення нашых войск даводзілася разгружаць машыны з параненымі, пераносіць іх у аперацыйную, а потым у палаткі, грузіць на транспарт, бо санітары не ўпраўляліся. Працяглыя дзяжурствы, у час якіх старалася прыносіць салдатам палёгку, і кроў сваю аддавала, каб выратаваць параненых, Настасся Якаўлеўна ўспамінала: «Памятаю, прывезлі ў шпіталь лётчыка. Неабходна было зрабіць тэрміновую аперацыю, а машына з медыкаментамі ўжо ў дарозе, мы пераязджалі на новае месца дыслакацыі. Раздумваць не было калі, і я прапанавала ўрачу ўзяць у мяне кроў. Аперацыя была зроблена ўдала, лётчык застаўся жывы, і яго адразу эвакуіравалі ў тылавы шпіталь».

Пасля вайны Н. Я. Азярная прыехала ў Быхаў і да выхаду на пенсію працавала ў раённай бальніцы. За добрасумленную працу, чулыя адносіны да людзей была ўзнагароджана ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Марыя Андрэеўна Ваднёва. Пуцёўку ў жыццё дала ёй Быхаўская школа медсясцёр, пасля скончэння якой яна працавала ў Рыжкаўскай бальніцы. Тут і застала яе вайна. 24 чэрвеня 1941 г. Марыя Андрэеўна была прызвана на ваенную службу і прызначана медыцынскай сястрой на 121-ы санітарны поезд, дзе праслужыла да верасня 1943 г. Дні і ночы працавала яна ў гэтым шпіталі на колах, вывозіла цяжка параненых салдат і афіцэраў у тылавыя шпіталі. Успамінаючы тыя дні, Марыя Андрэеўна гаворыць: «Вагоны № 9 і № 10. Яны назаўсёды засталіся ў маёй памяці. Гэта былі мае вагоны, дзе я даглядала параненых. Куйбышаў, Уфа, Чэлябінск, Новасібірск, Іркуцк, Чыта... Дзе толькі Радзіма не прымала сваіх сыноў і дачок, якія пралілі кроў за яе свабоду і незалежнасць».

А потым ужо да самага канца вайны служыла Марыя Андрэеўна на санітарным поездзе № 188. Не раз трапляў поезд пад варожыя бамбёжкі. І тады, рызыкуючы жыццём, яна выносіла з палаючых вагонаў параненых і хавала іх ва ўкрыцці. Не пералічыць, колькі разоў аддавала Марыя Андрэеўна сваю кроў параненым. Апошні эшалон старшына медыцынскай службы М. А. Ваднёва суправаджала з Кёнігсберга ў Тулу.

— Было гэта ў ноч на 9 мая 1945 г.,— успамінае Марыя Андрэеўна.— Я дзяжурыла на эшалоне і раптам пачула ўрачысты голас Левітана, які перадаваў паведамленне аб нашай перамозе. Я кінулася да нашых медыкаў: «Таварышы! Вайна скончылася! Наша перамога!» Што тут зрабілася! Мы плакалі ад радасці, цалаваліся, віншавалі адзін аднаго з перамогай. І яшчэ застанецца назаўсёды ў маёй памяці ўжо мірны рэйс, калі з Тулы везлі мы на парад Перамогі ў Маскву юных суворацаў. Самым вялікім шчасцем для мяне было пасля безлічы вандровак з фронту на фронт прысутнічаць на тым урачыстым парадзе.

Пасля вайны Марыя Андрэеўна працавала ў дзіцячай кансультацыі, а пасля ў Навабыхаўскай участковай бальніцы.

Людміла Астапаўна Макарава. У 1939 г. пасля сканчэння медыцынскага вучылішча па камсамольскай пуцёўцы паехала яна будаваць Камсамольск-на-Амуры. Калі грымнула вайна, Людміна была адна з тых, хто першым прыйшоў у гарваенкамат. 1 ліпеня 1941 г. яна стала байцом. Прасілася на Заходні фронт, каб ваяваць супраць ворага ў роднай Беларусі. Але крайне было не менш важна трымаць на замку і свае далёкаўсходнія граніцы. 9 жніўня 1945 г. Савецкая краіна пачала ваенныя дзеянні супраць мілітарысцкай Японіі. У складзе Далёкаўсходняга фронту Л. А. Макарава прымала ўдзел у баях. Людміла Астапаўна ўспамінае, як цяжка было наступаць па гарах і балотах. У брызентавай палатцы, якая служыла перавязачнай, медыкі ўдзень і ўначы аказвалі дапамогу параненым. У тыя цяжкія дні стала яна членам КПСС.

Антаніна Барысаўна Карпечына. У верасні 1941 г., калі прымала воінскую прысягу, ей не было і васемнаццаці гадоў. Спачатку ў эвакашпіталі, а потым у складзе медсанбата стралковай дывізіі яна прайшла па многіх франтавых дарогах Украіны, Румыніі, Венгрыі і Чэхаславакіі. Удзельнічала ў разгроме гітлераўцаў на тэрыторыі Германіі і японскіх самураеў у Маньчжурыі. Нават цяжка ўявіць сабе, як можна было суткамі без сну і адпачынку не адыходзіць ад аперацыйнага стала, калі ногі падкошваліся ад стомы, а сэрца заходзілася, бачачы столькі крыві і чалавечых пакут. Усё гэта давялося зведаць асістэнту хірурга Антаніне Карпечынай. «Здаралася,— успамінае Антаніна Барысаўна,— што за дзень па некалькі разоў разгортвалі і згортвалі аперацыйную, працавалі пад агнём варожай артылерыі, гублялі сваіх таварышаў».

Пасля вайны А. Б. Карпечына вярнулася на Быхаўшчыну, працавала ў Гадылёўскай участковай бальніцы.

Соф'я Мікалаеўна Халяўка. У 1941 г. скончыла яна медыцынскае вучылішча і не паспела яшчэ нарадавацца свайму дыплому, як пачалася вайна. Адразу ж прыйшла павестка з ваенкамата, і яна стала медыцынскай сястрой эвакуацыйнага шпіталя па станцыі Навабеліца пад Гомелем. Сястрычка Соня — так пяшчотна называлі яе параненыя. За шпіталем, які размяшчаўся ў поездзе, палявалі варожыя самалёты і неўзабаве разбамбілі яго. Ад Гомеля да Чарнігава — 140 кіламетраў. Як цяжка было іх прайсці пешшу, несучы параненых, медыцынскі інструмент, абсталяванне. Але ішлі і неслі, бо разумелі, што інакш нельга. Як толькі ні перамяшчаўся потым шпіталь: па чыгунцы, на аўтамашынах, на конных падводах. І ўсю-

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

ды медыцынскі персанал, не ведаючы сну і адпачынку, рабіў сваю справу — лячыў параненых і вяртаў іх у строй. Соф'я Мікалаеўна ўспамінае, як аднойчы ўлетку быў атрыманы загад фарсіраваць Дон. У тэрміновым парадку зняліся і пайшлі да месца пераправы. Пад прыкрыццём цемры размясціліся на беразе, каб пакарміць параненых. Але, відаць, не драмаў і вораг. Ён заўважыў рух на беразе і адкрыў моцны міна-мётны агонь. Страты панеслі вялікія, але з-пад агню ўсё ж выйшлі і пераправіліся на другі бераг. Разам са сваім шпіталем па доўгіх дарогах Паўднёва-Заходняга фронту дайшла медсястра С. М. Халяўка да Варшавы. Тут у час баёў атрымала раненне і другую кантузію, а першая была ў баях пад Харкавам. На тым вайна для Соф'і Мікалаеўны скончылася. Пасля лячэння вярнулася ў родны Быхаў і зноў стала лячыць людзей.

Аўтограф Ліскова

П. І. Ліскоў.

Пяць баявых машын давялося страціць хлопцу з Абідавіч, покуль прайшоў шлях ад Варонежа да Берліна. Відаць, усё ж чалавек мацней за метал, нават калі назва яму — браня...

1943 год. На Курскай дузе разгортваюцца важныя падзеі. Савецкае камандаванне спешна перакідвала на гэты ўчастак выпрабаваныя ў баях вайсковыя часці. Сюды трапіў і механік-вадзіцель танка Т-34 Пётр Ліскоў.

— Гэта была нечуваная ў гісторыі бітва,— успамінае былы танкіст.— Сапраўднае пекла. З-за выбухаў снарадаў і мін, чорнага, нібы сажа, дыму цяжка было нават адрозніць дзень ад ночы. Агнём і гусеніцамі мы грамілі фашыстаў. У тых баях быў падбіты мой першы танк. Прамым трапленнем снарада ў машыну мяне параніла ў галаву. З пяці членаў экіпажа ў жывых засталіся двое. А я пасля Курска чатыры разы пакідаў разбіты або ахоплены полымем танк, ратаваў параненых і хаваў загінуўшых баявых сяброў. Сам быў двойчы паранены. Пасля шпіталя зноў садзіўся ў баявую машыну і разам з новым экіпажам ішоў далей на захад.

...«Трыццацьчацвёркі» з ходу ўварваліся ў прадмесце Берліна. Выконваючы загад камандзіра роты, танк Пятра Ліскова збочыў у вузкую вулачку, загрувашчаную бітай цэглай і бетонам. Тамсям вакол уцалелых дамоў звешваліся белыя флагі — знак капітуляцыі. Убачыўшы іх, танкіст кулямётчык перастаў страляць. І ў гэты момант моцны ўдар абрушыўся на машыну. Фаустпатрон трапіў у борт танка. Чорны дым ад саляркі завалок наваколле. Гарэў пяты танк, на якім ваяваў Ліскоў.

Пётр Ільіч усё ж пакінуў аўтограф у Берліне. Праўда, не там, дзе хацелася б. Сцены рэйхстага зверху да нізу былі распісаны савецкімі воінамі, не было дзе літару паставіць. А побач стаяла разбітая гаўбіца, на якой пехта напісаў: «Парадзіў танкавых войсках». Ніжэй механік-вадзіцель з Абідавіч вывеў: «Варонеж — Берлін. Ліскоў». Пасля дэмабілізацыі Пётр Ільіч вярнуўся ў родную вёску, сеў за рычагі трактара і стаў выконваць такую нялёгкую і такую важную справу — вырошчваць хлеб. І такі ўжо ён чалавек — за што б ні браўся, робіць на «выдатна». Таму да баявых узнагарод танкіста — ордэна Славы III ступені, медалёў «За адвагу», «За баявыя заслугі» і іншых — дабавіліся ўзнагароды за мірную працу — ордэны Леніна і «Знак Пашаны». А за актыўны ўдзел у ваенна-патрыятычным выхаванні працоўных і ў сувязі з 35-годдзем Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне трактарыст калгаса «XVIII партз'езд» Пётр Ільіч Ліскоў быў узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Быховский районный историко-краеведческий музей

„Родныя вы нашы.
У смутку вялікім схіліўшы галовы,
стаім перад Вамі.

Вы не скарыліся лютым забойцам
у чорныя дні фашысцкай навалы

Вы смерць прынялі,
ды полымя сэрцаў Вашай любові
да Савецкай Радзімы навек незгасальна.

Памяць пра Вас у нас назаўсёды,
як неўміруча наша зямля
і як вечна яркае сонца над ёю“.

Быховский районный историко-краеведческий музей

ЗАГІНУЎШЫЯ ЎДЗЕЛЬНІКІ КАМУНІСТЫЧНАГА ПАДПОЛЛЯ, ПАРТЫЗАНЫ, АСОБЫ, ЯКІЯ АКТЫЎНА САДЗЕЙНІЧАЛІ ПАРТЫЗАНСКАМУ РУХУ І КАМУНІСТЫЧНАМУ ПАДПОЛЛЮ, ЧЛЕНЫ ІХ СЕМ'ЯЎ, ЖЫХАРЫ ПАРТЫЗАНСКІХ ЗОН І РАЁНАЎ, ШТО ПАДВЕРГЛІСЯ ФАШЫСЦКАМУ ТЭРОРУ

АБІДАВІЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА АБІДАВІЧЫ

АРЛОЎСКІ Павел Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1920.

ГІРЫЧАЎ Васіль Паўлавіч, нарадзіўся ў 1904, да вайны працаваў старшынёй калгаса імя Калініна, закатаваны ў 1942.

ГРУЗДОЎ Васіль Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1915, закатаваны ў 1942 у Магілёве.

КАТАНКОВА Праскоўя Паўлаўна, нарадзілася ў 1924, да вайны працавала ў калгасе, загінула ў 1944 у в. Смаліца.

КАТАНКОЎ Фёдар Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1888.

ЛІСКОВА Дар'я Цімафееўна, нарадзілася ў 1912.

НАБОКА Міхаіл Пятровіч, нарадзіўся ў 1923, г. Чэлябінск, партызан, загінуў 4.1.1944.

САЗУРАЎ Іван Платонавіч, нарадзіўся ў 1911.

ХОБАТНІКАЎ Даніла Ягоравіч, нарадзіўся ў 1904, да вайны працаваў сакратаром сельскага Савета, закатаваны ў 1942.

ЧУБАЎ Мікалай Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1925, у партызанах з 1942.

ШАКАЛАЎ Адам Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1926, з 1943 у партызанах.

ВЁСКА ВЕЦЬ

АЛЕШЫНАЎ Фёдар Пракопавіч, нарадзіўся ў 1874.

АСТАСЬКОВА Матрона Якаўлеўна, нарадзілася ў 1896, загінула ў час варожага артылерыйскага абстрэлу.

АСТАСЬКОЎ Аніс Іванавіч, нарадзіўся ў 1896, загінуў у час варожага артылерыйскага абстрэлу.

БАРАНАЎ Іван Данілавіч, нарадзіўся ў 1888, расстраляны.

ГАЛКІН Васіль Іванавіч, нарадзіўся ў 1924, партызан, загінуў 28.11.1943, пахаваны ў в. Дуброва.

ГАЛКІН Сямён Піліпавіч, нарадзіўся ў 1923, да вайны працаваў у калгасе, партызан, загінуў 27.3.1944.

ГРОДНІКАВА Аляксандра, нарадзілася ў 1871, загінула ў час варожага артылерыйскага абстрэлу.

ДЗЕМ'ЯНКОЎ Фёдар, нарадзіўся ў 1875, расстраляны.

КАНЦАВЫ Яфім Конанавіч, нарадзіўся ў 1889, загінуў у час варожага артылерыйскага абстрэлу.

КУКСОВА Марыя Сяргееўна, нарадзілася ў 1912, расстраляна.

ОСІПАВА Праскоўя Фёдараўна, нарадзілася ў 1871.

ПАЛЯКОВА Настасся Цімафееўна, нарадзілася ў 1895, загінула ў час варожага артылерыйскага абстрэлу.

ШАЦАВА Дар'я Конанаўна, нарадзілася ў 1892.

ЯКІМАЎ Сяргей Іванавіч, нарадзіўся ў 1924, партызан, загінуў у сакавіку 1944.

ЯКІМЧАНКА Кузьма Іванавіч, нарадзіўся ў 1895, расстраляны.

ВЁСКА ДРУЖБА

АНЦІПАЎ Васіль Мітрафанавіч, нарадзіўся ў 1925, партызан.

ВЁСКА ІСКАНЬ

ГІРЫЧАВА Софія Андрэеўна, нарадзілася ў 1914, загінула ў Ленінградзе.

ГЛУСЦОВА Фядора Ціханаўна.

КАНАТОПАЎ Іван Цімафеевіч.

КУЛЯШОВА Вера Пятроўна.

КУЛЯШОВА Вера Якаўлеўна, загінула ў верасні 1941.

КУЛЯШОВА Ксенія Пятроўна, нарадзілася ў 1923.

КУЛЯШОВА Марыя Пятроўна, нарадзілася ў 1926.

КУЛЯШОЎ Пётр Карпавіч.

КУЛЯШОЎ Рыгор Пятровіч, нарадзіўся ў 1910.

МАЛЯЎКІН.

ПАДЛІПСКІ Міхаіл Максімавіч.

ПРЫЛЕПАЎ Васіль Трафімавіч.

САМУСЕЎ Мікалай Пятровіч, нарадзіўся ў 1926.

ВЁСКА ПАЛКІ

БАБКОЎ Пётр, нарадзіўся ў 1919.

ГВАРДЗЕЕНКА Васіль Антонавіч, нарадзіўся ў 1920.

ДОЎГАЛЕЎ Ціхан Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1905, да вайны працаваў старшынёй калгаса ў в. Ліпавіца, расстраляны ў 1942.

ДОЎГАЛЕЎ Ціхан Канстанцінавіч, нарадзіўся ў 1910.

ДОЎГАЛЕЎ Т. К.

Быховский районный исторический краеведческий музей



Помнік на брацкай магіле савецкіх воінаў і партызан у в. Палкі.

ЗАЙЦАЎ А. У.
КАЎКІН Лёва Каймавіч, нарадзіўся ў 1929.
КАЎКІНА Брайка, нарадзілася ў 1906.
КАЎКІНА Лейка Беркаўна, нарадзілася ў 1895.
КУЗЬМІНАЎ Л. Т.
НОВІКАВА Вольга Восіпаўна, нарадзілася ў 1902.
САВЕТНІКАЎ Уладзімір Фадзеевіч, загінуў у 1941.
СІВАКОВА Е. С.

ВЁСКА ПАЛЯШНАВІЧЫ

АНДРЭЙЧЫКАЎ Дзмітрый Конанавіч, нарадзіўся ў 1881.
АНДРЭЙЧЫКАЎ Пётр Конанавіч, нарадзіўся ў 1878.
БУХАНАЎ Арцём Усцінавіч, нарадзіўся ў 1907.
ПІШЧЫКАЎ Фёдар Ісакавіч, нарадзіўся ў 1908, партызан, загінуў у 1943 пад Віцебскам.
ТУПІКОВА Ганна Антонаўна, нарадзілася ў 1901.
ФІЛІМОНАЎ Рыгор Апанасавіч, нарадзіўся ў 1923.
ЦІШКОЎ Анатоль Емяльянавіч, нарадзіўся ў 1923 у в. Забалотнае, партызан, загінуў у 1942 у Хачынскім лесе.
ЦІШКОЎ Якаў Пятровіч, нарадзіўся ў 1925, партызан, прапаў без вестак у 1942.
ШУРУБАВА Васіліса Кляменцьеўна, нарадзілася ў 1895.
ШУРУБАЎ Аляксандр Лаўрэнавіч, нарадзіўся ў 1924, сувязны, партызан, загінуў у 1943 пры фарсіраванні Дняпра над Быхавам.
ШУРУБАЎ Кляменцій Барысавіч, нарадзіўся ў 1876.

ВЁСКА СЯЛЕЦ

ІВАНЦОЎ Мікалай Антонавіч, нарадзіўся ў 1927, партызан, загінуў у 1943.
ПАТАПЕНКА Самуіл Іванавіч, нарадзіўся ў 1904.

БАРКАЛАБАЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА БАРКАЛАБАВА

МАНДРЫК Апанас Лявонавіч, нарадзіўся ў 1911, партызан, загінуў 19.9.1943.
УСЦІНАЎ Рыгор Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1924 у в. Кісцяні Рагачоўскага р-на, партызан, загінуў 16.12.1943, пахаваны ў в. Баркалабава.

ВЁСКА ЗАЛАХВІННЕ

ЦІМОХАЎ Мікалай Фадзеевіч, нарадзіўся ў 1922, да вайны скончыў 9 класаў, быў камсоргам мясцовай камсамольскай арганізацыі, расстраляны за дапамогу воінам Чырвонай Арміі пры пераправе цераз Дняпро, пахаваны ў Быхаве.

ВЁСКА КАСІЧЫ

БУДКОЎСКІ Мікалай Іванавіч, нарадзіўся ў 1922, да вайны працаваў на торфапрадпрыемстве, сувязны 435-га партызанскага атрада Быхаўскай ВАГ.
КАРАТКЕВІЧ Мікалай, сувязны, закатаваны ў 1924.

ВЁСКА САРОЧЫНА

ЦЫГІБ Аляксандр Ільіч, нарадзіўся ў 1915, скончыўшы 6 класаў, працаваў рабочым, у Чырвонай Арміі з 1939, у вайну быў партызанам, загінуў у Шчучынскім раёне.

ГОРАД БЫХАЎ

БАРАНОЎСКІ Мікалай Максімавіч, нарадзіўся ў 1923 у Быхаве, партызан, загінуў у 1944.
БАРАНЧУК Зіновій Іванавіч, нарадзіўся ў 1924, расстраляны ў 1941 за прыналежнасць да камсамола.
БАРАНЧУК Міна Іванавіч, нарадзіўся ў 1906, да вайны працаваў ў Быхаўскім леспрамгасе, партызан, загінуў у 1944.
БЕГУНОЎ Валодзя, расстраляны восенню 1943 разам з бацькам.
БЕГУНОЎ Майсей Іларыёнавіч, нарадзіўся ў 1899 у Быхаве, партызан, загінуў 27.11.1943, пахаваны ў Быхаве.
ДЗЕМ'ЯНОВІЧ Кузьма Іванавіч, нарадзіўся ў 1891, перад вайной працаваў упраўляючым нарыхтоўкай сена, у канцы чэрвеня 1941 расстраляны як савецкі актывіст.
ДЗЕМ'ЯНОВІЧ Марат Кузьміч, нарадзіўся ў 1923, у ліпені 1942 арыштаваны за сувязь з партызанамі, адпраўлены ў канцлагер Бухенвальд, памёр у 1943.

Быховский районный историко-краеведческий музей



А. А. Кілеса.

ЕЎДАКІМАЎ Сцяпан Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1888, да вайны працаваў у калгасе, з 1943 у партызанах, загінуў у Шклоўскім раёне.

ЗАВАЛІШЧІК Пётр Андрэевіч, нарадзіўся ў 1912, да вайны працаваў механікам у Быхаўскай нарыхтоўчай канторы, партызан.

КІЛЕСА Аляксандр Анісімавіч, нарадзіўся ў 1914, да вайны працаваў у Быхаўскай МТС, партызан 108-га партызанскага палка Быхаўскай ВАГ, расстраляны ў 1944.

КІЛЕСА Аляксандр Іванавіч, нарадзіўся ў 1909, партызан.

КІЛЕСА Пётр Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1893, павешаны ў ліпені 1941 як савецкі актывіст.

З успамінаў жыхара г. Быхава Алега Пятровіча Кілеса

Быхаў у пажары. Куды ні кінеш вокам — полымя і чорныя клубы дыму, што рвуцца ў вышыню, засцячы сонца. Гарыць Чырвонаармейская, цэнтральная вуліца, што цягнецца ад замка да чыгуначнага вакзала, у агні Савецкая, Ленінская, Пралетарская, Рэвалюцыйная, Куйбышаўская, Пушкінская, Валадарскага, Замкавая, Друкарская... Такім запомніўся мне на ўсё жыццё той дзень 4 ліпеня 1941 г., калі ў наш родны горад уварваліся фашысты. Над усімі, хто застаўся ў Быхаве, навісла чорная хмара смерці.

У адзін з ліпеньскіх дзён падкацілі машына з гітлераўцамі да хаты, дзе мы жылі на Макранскай вуліцы. У руках у аднаго была нейкая папера. Выгукнуўшы прозвішча, ён таўхнуў бацьку да машыны. Тут жа забралі Азара Данілавіча Маханька і Слепушэнку. Ніхто не ведаў, за што іх арыштавалі. Раніцай наступнага дня да нас прыбеглі людзі і сказалі, што бацьку павесілі. Так яно і было. Усіх трох мы ўбачылі павешанымі на рэях дняпроўскага моста. А па вуліцах горада быў расклеены загад каменданта, у якім гаварылася, што Кілеса, Маханёк і Слепушэнка пакараны смерцю за намер узарваць часовы мост цераз Дняпро, які немцы ўзвялі побач са старым, згарэўшым. Пасля таго ліпеньскага дня мінулі гады, але і цяпер баліць сэрца па загінуўшым бацьку.

КІЛЕСА Яўген Васілевіч, нарадзіўся ў 1924, партызан, загінуў у 1943 пры выкананні баявога задання.

КІЛЬЧЫЦКІ Пётр Раманавіч, нарадзіўся ў 1875, схоплены паліцыяй у 1943 за сувязь з партызанамі, закатаваны.

КІСЛЯКОЎ Васіль Якаўлевіч, нарадзіўся ў 1923, да вайны скончыў ФЗВ, з кастрычніка 1943 партызан 152-га партызанскага палка Быхаўскай ВАГ, загінуў 14.1.1944 каля в. Гамарня.

ЛАГУЦЁНАК Андрэй Кузьміч, нарадзіўся ў 1896, працаваў да вайны цесляром на фабрыцы, расстраляны ў лістападзе 1941 як савецкі актывіст.

ЛАГУЦЁНАК Леанід Андрэевіч, яго сын, нарадзіўся ў 1926, у лістападзе 1941 расстраляны разам з бацькам.

МАХАНЁК Азар Данілавіч, нарадзіўся ў 1890, павешаны ў ліпені 1941 як савецкі актывіст.

МЕЛЬНІКАЎ Ілья Міхайлавіч, партызан, загінуў у 1944.

МЕЛЬНІКАЎ Міхаіл Ігнатавіч, партызан, пахаваны ў Быхаве.

НОВІКАЎ Сямён Акулавіч, нарадзіўся ў 1911 у Быхаве, партызан, загінуў 17.11.1943, пахаваны ў Быхаве.

ПУСІК Ганна Васілеўна, расстраляна ў 1944 за сувязь з партызанамі.

РАГАЛЕНКА Фёдар Пракопавіч, нарадзіўся ў 1919, партызан, загінуў у 1944 каля в. Залатое Дно.

САКАДЫНЕЦ Лідзія Рыгораўна, нарадзілася ў 1918, з лістапада 1943 разам з сям'ёй у партызанах у Кіраўскім раёне, загінула ў красавіку 1944 пад Рагачовам.

САКАДЫНЕЦ Міхаіл Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1920, партызан, малодшы палітрук, загінуў 25.4.1943 каля в. Колбава Кіраўскага раёна.

СЛЕПУШЭНКА Пётр Зіноўевіч, нарадзіўся ў 1916, павешаны ў ліпені 1941 як савецкі актывіст.

СТАРАСЕЛЕЦ Ульяна Лукінічна, расстраляна ў 1944 за сувязь з партызанамі.

СТРАЛЬЦОВА Соф'я Віктараўна, нарадзілася ў 1915, да вайны працавала ў сталовай у Быхаве, прапала без вестак.

ТУРЧАНКА Уладзімір Анісімавіч, нарадзіўся ў 1922, партызан, загінуў 26.8.1943.

ФЁДАРАЎ І. К., удзельнік грамадзянскай вайны, расстраляны ў 1943.

ВЕРХНЯТОШЧЫЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ВЯЛІКІ ЛЕС

БРУХАВЕЦКІ Мікалай Ягоравіч, нарадзіўся ў 1924, да вайны працаваў у калгасе «Чырвоны партызан», партызан 810-га партызанскага палка Быхаўскай ВАГ, загінуў у 1943 у в. Ніжняя Тошчыца.

ЛУК'ЯНАЎ Дзям'ян Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1915, да вайны працаваў стрэлачнікам на чыгунцы, з 1942 у партызанах, загінуў у 1944 у в. Хамічы.

ХАХЛОЎ Іван Кузьміч, нарадзіўся ў 1927, да вайны працаваў у калгасе «Чырвоны партызан», расстраляны ў 1944 за сувязь з партызанамі.

ЯНАЧКІН Лявон Кандратавіч, нарадзіўся ў 1922, да вайны працаваў стрэлачнікам, з 1942 у партызанах, загінуў у 1944.

ВЁСКА ВІЛЯХАЎКА

АРЦЁМЕНКА Надзея Мікалаеўна, нарадзілася ў 1923, да вайны працавала ў калгасе «Маяк камуны», расстраляна ў 1942.

ЕРМАЛАЕЎ Пётр Апанасавіч, нарадзіўся ў 1924, да вайны працаваў у калгасе «Маяк камуны», партызан, прапаў без вестак 23.2.1944.

КАЗЛОЎ Адам Архіпавіч, нарадзіўся ў 1902, да

Быховский районный историко-краеведческий музей

вайны працаваў у калгасе «Маяк камуны», партызан, загінуў у в. Залозье Рагачоўскага р-на.

КАЗЛОЎ Архіп Фролавіч, нарадзіўся ў 1902, да вайны працаваў брыгадзірам у калгасе «Маяк камуны», з 1943 у партызанах, расстраляны на ст. Тошчыца.

КАЗЛОЎ Іван Аляксандравіч, нарадзіўся ў 1907, да вайны працаваў лесніком у Навабыхаўскім лясніцтве, у 1944 спалены ў в. Віляхаўка.

КАЗЛОЎ Сцяпан Якімавіч, нарадзіўся ў 1914, да вайны працаваў у калгасе «Маяк камуны», расстраляны ў 1943 паліцаямі ў в. Віляхаўка.

КАЛЕСНІКАЎ Павел Васілевіч, нарадзіўся ў 1910, да вайны працаваў у калгасе «Маяк камуны», партызан, загінуў у 1943 у в. Новы Быхаў.

ЛАБКОЎ Віктар Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1925, да вайны працаваў у калгасе «Маяк камуны», з 1942 у партызанах, загінуў пад Быхавам.

НАСЦІН Піліп, нарадзіўся ў 1909, да вайны працаваў у калгасе «Маяк камуны», спалены ў 1944 у в. Віляхаўка.

НАСЦІНА Варвара, нарадзілася ў 1908, да вайны працавала ў калгасе «Маяк камуны», спалена ў 1944 у в. Віляхаўка.

ПАЎЛАЎ Іван Харытонавіч, нарадзіўся ў 1923, да вайны працаваў у калгасе «Маяк камуны», расстраляны ў 1943 на ст. Тошчыца.

ПАТАПАЎ Іван Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1922, да вайны працаваў у калгасе «Маяк камуны», партызан, прапаў без вестак.

ПРЫБЫЛЬСКІ Іван Емяльянавіч, нарадзіўся ў 1924, да вайны працаваў у калгасе «Маяк камуны», прапаў без вестак.

ВЁСКА НІЖНЯЯ ТОШЧЫЦА

ГЛУШАНКОЎ Міхаіл Андрэевіч, нарадзіўся ў 1924, да вайны працаваў у калгасе «1 Мая», партызан, загінуў у 1942 у в. Барсукі Магілёўскага р-на.

ЛАЗОЎСКІ Міхаіл Арцёмавіч, жыў у в. Ніжняя Тошчыца, партызан, загінуў 24.6.1944, пахаваны ў брацкай магіле на чыгуначнай станцыі Тошчыца.

ХАТКЕВІЧ Ягор Сафронавіч, нарадзіўся ў 1920, да вайны працаваў у калгасе «1 Мая», партызан, загінуў у 1943.

ВЁСКА РЫХАРТАВА

ДЗЯМІДАВА Варвара Восіпаўна, нарадзілася ў 1918, да вайны працавала паляводам у калгасе «Ільіч», расстраляна ў 1942.

ДЗЯМІДАВА Юлія Карнееўна, нарадзілася ў 1924, да вайны працавала паляводам у калгасе «Ільіч», расстраляна ў 1942 у в. Шчыбрын Рагачоўскага р-на.

ДЗЯМІДАЎ Карней Гаўрылавіч, нарадзіўся ў 1902, да вайны працаваў паляводам у калгасе «Ільіч», расстраляны ў 1942 у в. Шчыбрын Рагачоўскага р-на.

КАВАЛЁЎ Даніла Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1897, да вайны працаваў паляводам у калгасе «Бальшавік», расстраляны ў 1942 у в. Рыхартава.

КАЛЕСНІКАЎ Яўсей Іванавіч, нарадзіўся ў 1895, да вайны працаваў паляводам у калгасе «Ільіч», расстраляны ў 1942 у в. Рыхартава.

КАРНАВУХАВА Валянціна Кірылаўна, нарадзілася ў 1930, расстраляна ў 1942 у в. Рыхартава.

КАРНАВУХАВА Вольга Кірылаўна, нарадзілася ў 1936, расстраляна ў 1942 у в. Рыхартава.

КАРНАВУХАВА Ульяна Дзмітрыеўна, нарадзілася ў 1910, да вайны працавала ў калгасе «Бальшавік», расстраляна ў 1942 у в. Рыхартава.

КАРНАВУХАЎ Уладзімір Кірылавіч, нарадзіўся ў 1940, расстраляны ў 1942 у в. Рыхартава.

КОЛБАСАВА Ганна Яўстратаўна, нарадзілася ў 1926, расстраляна ў 1942 у в. Рыхартава.

КОЛБАСАВА Настасся Дзмітрыеўна, нарадзілася ў 1892, да вайны працавала паляводам у калгасе «Бальшавік», расстраляна ў 1942 у в. Рыхартава.

КОЛБАСАВА Ніна Яўстратаўна, нарадзілася ў 1933, расстраляна ў 1942 у в. Рыхартава.

КОЛБАСАЎ Міхаіл Яўстратавіч, нарадзіўся ў 1929, расстраляны ў 1942 у в. Рыхартава.

КРУЧКОВА Ефрасіння Міхайлаўна, нарадзілася ў 1903, расстраляна ў 1942 у в. Рыхартава.

КРУЧКОЎ Мікалай Ільіч, нарадзіўся ў 1937, расстраляны ў 1942 у в. Рыхартава.

КРУЧКОЎ Міхаіл Ільіч, нарадзіўся ў 1926, расстраляны ў 1942 у в. Рыхартава.

КУЛІКОВА Валянціна Іванаўна, нарадзілася ў 1926, расстраляна ў 1942 у в. Рыхартава.

КУЛІКОВА Ева Іванаўна, нарадзілася ў 1936, расстраляна ў 1942 у в. Рыхартава.

КУЛІКОВА Лізіяя Васілеўна, нарадзілася ў 1933, расстраляна ў 1942 у в. Рыхартава.

КУЛІКОВА Пелагея Аўдзееўна, нарадзілася ў 1876, да вайны працавала паляводам у калгасе «Бальшавік», расстраляна ў 1942 у в. Рыхартава.

КУЛІКОЎ Аляксей Васілевіч, нарадзіўся ў 1926, расстраляны ў 1942 у в. Рыхартава.

КУЛІКОЎ Васіль Дзмітрыевіч, нарадзіўся ў 1910, да вайны працаваў паляводам у калгасе «Бальшавік», расстраляны ў 1942 у в. Рыхартава.

КУЛІКОЎ Васіль Іванавіч, нарадзіўся ў 1930, расстраляны ў 1942 у в. Рыхартава.

КУЛІКОЎ Іван Васілевіч, нарадзіўся ў 1911, да вайны працаваў паляводам у калгасе «Бальшавік», расстраляны ў 1942 у в. Рыхартава.

КУЛІКОЎ Канстанцін Іванавіч, нарадзіўся ў 1870, да вайны працаваў паляводам у калгасе «Бальшавік», расстраляны ў 1942 у в. Рыхартава.

КУНДЗЕЛЕВА Марыя Яўстратаўна, нарадзілася ў 1914, да вайны працавала паляводам у калгасе «Бальшавік», расстраляна ў 1942 у в. Рыхартава.

КУНДЗЕЛЕЎ Аляксей Апанасавіч, нарадзіўся ў 1936, расстраляны ў 1942 у в. Рыхартава.

КУНДЗЕЛЕЎ Зяней Апісімавіч, нарадзіўся ў 1870, да вайны працаваў паляводам у калгасе «Бальшавік», расстраляны ў 1942 у в. Рыхартава.

РАДЧЫКАЎ Трафім Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1898, да вайны працаваў паляводам у калгасе «Бальшавік», расстраляны ў 1942 у в. Рыхартава.

РАДЧЫКАЎ Фядос Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1902, да вайны працаваў паляводам у калгасе «Бальшавік», расстраляны ў 1942 у в. Рыхартава.

САФОНАВА Галіна Іванаўна, нарадзілася ў 1908, да вайны працавала ў паляводстве ў калгасе «Бальшавік», расстраляна ў 1942 у в. Рыхартава.

САФОНАВА Валянціна Яфімаўна, нарадзілася ў 1930, расстраляна ў 1942 у в. Рыхартава.

САФОНАВА Вольга Яфімаўна, нарадзілася ў 1933, расстраляна ў 1942 у в. Рыхартава.

САФОНАЎ Яфім Піліпавіч, нарадзіўся ў 1900, расстраляны ў 1942 у в. Рыхартава.

СЕЛІВАНАВА Марыя Іванаўна, нарадзілася ў 1910, да вайны працавала ў калгасе «Бальшавік», расстраляна ў 1942 у в. Рыхартава.

Быховский районный историко-краеведческий музей

СЕЛІВАНАВА Настасся Якаўлеўна, нарадзілася ў 1926, расстраляна ў 1942 у в. Рыхартава.

СЕЛІВАНАЎ Якаў Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1908, да вайны працаваў у калгасе «Бальшавік».

ТУПАЛАВА Марфа Захараўна, нарадзілася ў 1910, расстраляна ў 1942 у в. Рыхартава.

ВЁСКА СІНЕЖ

НАВУМАВА Таццяна Іванаўна, расстраляна ў 1942 на ст. Тошчыца.

ВЁСКА ТОШЧЫЦА

КАЗЛОЎ Васіль Уладзіміравіч, нарадзіўся ў 1924, в. Гадзілавічы Рагачоўскага р-на, партызан, загінуў 4.11.1943, пахаваны ў брацкай магіле на чыгуначнай станцыі Тошчыца.

КАНЦАВЫ Іван Трафімавіч, нарадзіўся ў 1919, в. Шапчыцы Рагачоўскага р-на, партызан, загінуў 6.10.1943, пахаваны ў брацкай магіле на чыгуначнай станцыі Тошчыца.

ВЁСКА ЧЫРВОНЫ БЕРАГ

АНДРЭЕНКА Ганна Максімаўна, нарадзілася ў 1905, да вайны працавала паляводам у калгасе «Чырвоны партызан», спалена ў 1944 у в. Чырвоны Бераг.

АНДРЭЕНКА Емяльян Лявонцьевіч, нарадзіўся ў 1928, да вайны працаваў паляводам у калгасе «Чырвоны партызан», спалены ў 1944 у в. Чырвоны Бераг.

АНТОНЕНКА Андрэй Карпавіч, нарадзіўся ў 1890, да вайны працаваў у калгасе «Чырвоны партызан», спалены ў 1944 у в. Чырвоны Бераг.

АНТОНЕНКА Лідзія Андрэеўна, нарадзілася ў 1930, спалена ў 1944 у в. Чырвоны Бераг.

АНТОНЕНКА Марфа Герасімаўна, нарадзілася ў 1894, да вайны працавала паляводам у калгасе «Чырвоны партызан», спалена ў 1944 у в. Чырвоны Бераг.

АНТОНЕНКА Мікалай Максімавіч, нарадзіўся ў 1896, да вайны працаваў паляводам у калгасе «Чырвоны партызан».

АНТОНЕНКА Ніна Мікалаеўна, нарадзілася ў 1930, спалена ў 1944 у в. Чырвоны Бераг.

АНТОНЕНКА Таццяна Іларыёнаўна, нарадзілася ў 1890, да вайны працавала ў калгасе «Чырвоны партызан», спалена ў 1944 у в. Чырвоны Бераг.

АНТОНЕНКА Яўгенія Мікалаеўна, нарадзілася ў 1922, да вайны працавала у калгасе «Чырвоны партызан», спалена ў 1944 у в. Чырвоны Бераг.

ЗЫЧКОЎ Ягор, яго жонка, сын, расстраляны за сувязь з партызанамі.

КАВАЛЕНКА Васіль Андрэевіч, партызан 810-га партызанскага палка Быхаўскай ВАГ, загінуў у лютым 1943 каля в. Слабада Рагачоўскага р-на, пахаваны на вясковых могілках у в. Касцяні Рагачоўскага р-на.

КАВАЛЕНКА Ганна Фёдараўна, нарадзілася ў 1910, да вайны працавала ў калгасе «Чырвоны партызан», спалена ў 1944 у в. Чырвоны Бераг.

КАВАЛЕНКА Ефрасіння Іванаўна, нарадзілася ў 1910, да вайны працавала ў калгасе «Чырвоны партызан», расстраляна ў 1943 у в. Чырвоны Бераг.

КАВАЛЕНКА Зосім Кастанцінавіч, нарадзіўся ў 1902, да вайны працаваў паляводам у калгасе «Чырвоны партызан», спалены ў 1944 у в. Чырвоны Бераг.

КАВАЛЕНКА Лідзія Нічыпараўна, нарадзілася ў 1924, расстраляна ў 1943 у в. Чырвоны Бераг.

КАВАЛЕНКА Мікалай Зосімавіч, нарадзіўся ў 1930, спалены ў 1944 у в. Чырвоны Бераг.

КАВАЛЕНКА Міхаіл Андрэевіч, нарадзіўся ў 1938, расстраляны ў 1943.

КАВАЛЕНКА Ніна Нічыпараўна, нарадзілася ў 1928, расстраляна ў 1943 у в. Чырвоны Бераг.

КАВАЛЕНКА Нічыпар Раманавіч, нарадзіўся ў 1900, да вайны працаваў кладаўшчыком у калгасе «Чырвоны партызан», расстраляны ў 1943 у в. Чырвоны Бераг.

КАВАЛЕНКА Пелагея Іванаўна, нарадзілася ў 1880, да вайны працавала ў калгасе «Чырвоны партызан», спалена ў 1944 у в. Чырвоны Бераг.

КАВАЛЕНКА Пётр Андрэевіч, нарадзіўся ў 1937, расстраляны ў 1943.

КАВАЛЕНКА Праскоўя Андрэеўна, нарадзілася ў 1900, да вайны працавала ў калгасе «Чырвоны партызан», спалена ў 1944 у в. Чырвоны Бераг.

КАВАЛЕНКА Раіса Іванаўна, нарадзілася ў 1934, спалена ў 1944 у в. Чырвоны Бераг.

ПАСЫНКАВА Марыя Васілеўна, нарадзілася ў 1915, да вайны працавала ў калгасе «Чырвоны партызан», спалена ў в. Чырвоны Бераг.

ПАСЫНКАЎ Аляксандр Дзмітрыевіч, нарадзіўся ў 1938, спалены ў 1944 у в. Чырвоны Бераг.

ПАСЫНКАЎ Рыгор Дзмітрыевіч, нарадзіўся ў 1936, спалены ў 1944 у в. Чырвоны Бераг.

СІДАРЭНКА Аляксандр Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1910, да вайны працаваў старшынёй сельскай спажывецкай кааперацыі, расстраляны ў 1943 у в. Чырвоны Бераг.

СІДАРЭНКА Кацярына Іванаўна, нарадзілася ў 1880, да вайны працавала ў калгасе «Чырвоны партызан», спалена ў 1944 у в. Чырвоны Бераг.

СІДАРЭНКА Мікалай, партызан 810-га партызанскага атрада, загінуў у лютым 1943 каля в. Кісцяні Рагачоўскага р-на.

СІДАРЭНКА Настасся Несцераўна, нарадзілася ў 1915, да вайны працавала ў калгасе «Чырвоны партызан», расстраляна ў 1943 у в. Чырвоны Бераг.

СІДАРЭНКА Наталля Маркаўна, нарадзілася ў 1915, да вайны працавала паляводам у калгасе «Чырвоны партызан», спалена ў 1944.

СІДАРЭНКА Юлія Тарасаўна, нарадзілася ў 1937, спалена ў 1944 у в. Чырвоны Бераг.

ФЕДЗЯЧЭНКА Пімен Іванавіч, нарадзіўся ў 1907, да вайны працаваў брыгадзірам у калгасе «Чырвоны партызан», расстраляны ў 1942.

ГАРАДЗЕЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ГАРАДЗЕЦ

АЗАРАНКА Аляксей Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1910, да вайны працаваў у калгасе «Перамога», партызан 425-га партызанскага палка Быхаўскай ВАГ, загінуў 10.2.1944, пахаваны ў в. Гарадзец.

ДАРАФЕЕЎ Міхаіл Пятровіч, нарадзіўся ў 1926, в. Хмеліна Рагачоўскага р-на, партызан, загінуў 30.11.1943, пахаваны ў в. Гарадзец.

ЗІБЕРАЎ Цімафей, сувязны.

КАВАЛЁЎ Уладзімір Нічыпаравіч, нарадзіўся ў 1923, да вайны працаваў у калгасе «Перамога», партызан 425-га партызанскага палка Быхаўскай ВАГ, загінуў у чэрвені 1944.

КАЗАКОЎ Павел Кірылавіч, нарадзіўся ў 1918,

Быховский районный историко-краеведческий музей

в. Падрабінкі, партызан, загінуў 14.12.1943, пахаваны ў в. Гарадзец.

ЛЫСЯНКОЎ Мікалай Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1922, да вайны працаваў у калгасе «Перамога», партызан 425-га партызанскага палка, загінуў у лістападзе 1943.

МЕЛЬНІКАЎ Сцяпан Анікеевіч, нарадзіўся ў 1917, да вайны працаваў у калгасе «Перамога», партызан 425-га партызанскага палка, загінуў у чэрвені 1943.

МІХЕЕЎ Іван Васілевіч, нарадзіўся ў 1918, да вайны працаваў у калгасе «Перамога», камандзір узвода 425-га партызанскага палка, загінуў у маі 1944.

ПАЛАСУХІН Аляксей Дзмітрыевіч, нарадзіўся ў 1910, да вайны працаваў у калгасе «Перамога», партызан 425-га партызанскага палка, загінуў у сакавіку 1943.

ПАЛАСУХІН Яфім Савельевіч, нарадзіўся ў 1922, да вайны працаваў у калгасе «Перамога», партызан атрада «Слаўны» Баранавіцкай вобл., загінуў у снежні 1943.

СЛУГАРАЎ Канстанцін Паўлавіч, нарадзіўся ў 1915, в. Збораў Рагачоўскага р-на, партызан, загінуў 29.12.1943, пахаваны ў в. Гарадзец.

СТАРАВОЙТАЎ Васіль Паўлавіч, нарадзіўся ў 1921, да вайны працаваў у калгасе «Перамога», партызан 425-га партызанскага палка Быхаўскай ВАГ, загінуў у лютым 1944.

СЯРОГІН Сяргей Раманавіч, нарадзіўся ў 1921, да вайны працаваў у калгасе «Перамога», партызан 425-га партызанскага палка Быхаўскай ВАГ, загінуў у сакавіку 1943.

ТАРАЙАЎ Трыфан Пятровіч, нарадзіўся ў 1912, да вайны працаваў настаўнікам, партызан 425-га партызанскага палка, прапаў без вестак.

ТАРАСАЎ Піліп Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1912, да вайны працаваў у калгасе «Перамога», партызан партызанскага атрада «Перамога», загінуў у снежні 1942.

ТАРАСАЎ Уладзімір Цімафеевіч, нарадзіўся ў 1918, да вайны працаваў у калгасе «Перамога», партызан 425-га партызанскага палка Быхаўскай ВАГ, загінуў у лістападзе 1943.

ШАЛУШКОЎ Іван Кандратавіч, нарадзіўся ў 1908 у Рагачоўскім р-не, партызан, загінуў 15.2.1944, пахаваны ў в. Гарадзец.

ШАНДРЫК Іван, сувязны.

ШКЛАЎЦОЎ, нарадзіўся ў 1901, да вайны працаваў у калгасе «Перамога», партызан 425-га партызанскага атрада, загінуў у лютым 1944.

ВЕСКА ГУТА

РУДКОЎСКІ Віктар Лукіч, нарадзіўся ў 1925, да вайны працаваў у калгасе «Адказ шкоднікам», разведчык 425-га партызанскага палка, загінуў у чэрвені 1943.

РУДКОЎСКІ Рыгор Яфімавіч, нарадзіўся ў 1910, да вайны працаваў у калгасе «Адказ шкоднікам», радавы 425-га партызанскага палка, загінуў у маі 1944 у канцлагеры Трасцянец пад Мінскам.

ВЕСКА ЛУБЯНКА

АТРАШКОЎ Анатоль Ягоравіч, нарадзіўся ў 1924, партызан 425-га партызанскага палка Быхаўскай ВАГ, загінуў у ліпені 1943.

БАБЦОЎ Макар Фёдаравіч, нарадзіўся ў 1908, да вайны працаваў у калгасе «2-я пяцігодка», загінуў у лістападзе 1943.

Магіла А. Я. Атрашкова.

ГАРАВАЯ Марыя Захараўна, нарадзілася ў 1915, да вайны працавала ў калгасе «2-я пяцігодка», расстраляна за сувязь з партызанамі.

Неяк восенню 1941 г. ў двор Гаравых зайшлі адпачыць жанчыны, якія вярталіся з лесу з поўнымі кошыкамі грыбоў. Ад жанчын Марыя даведалася, што ў лесе каля ручая яны напаткалі ўзброеных незнаёмых людзей, якія распытвалі аб акупантах. Пагаварыўшы, жанчыны разышліся. Марыя, устрывожаная расказам, пасля нядоўгіх ваганняў пайшла да ручая. Але ні ў першы раз, ні ў другі нікога там не сустрэла. Паходы ў лес працягваліся. Нарэшце яна ўбачыла групу людзей, сярод якіх пазнала свайго былога настаўніка Мікалая Арцёмавіча Носарава. З гэтага часу Марыя Гаравая стала выконваць яго даручэнні. Рызыкуючы жыццём, хадзіла ў Быхаў, па навакольных вёсках, наладжвала сувязі і сустрэчы партызан з патрыётамі. Аднойчы Марыя не вярнулася з лесу, засталася разам з партызанамі — стала вядома, што на сувязную зроблены данос. Акупанты арганізавалі аблаву, у час якой арыштавалі бацьку, выгналі з хаты маці з унукам Янекам.

Ішоў час, з груп народных мсціўцаў выраслі партызанскія атрады і брыгады. Марыя па-ранейшаму знаходзілася ў лесе. Пад выглядам бежанкі вяла разведку ў варожых гарнізонах. Зімой 1944 ёй перадалі, што захварэў тыфам яе сынок Янек. Цёмнай ноччу яна наведала ў чужой хаце старую маці і ледзь жывога сынка. Праз дзень яго не стала. Без голасу плакала Марыя, рыхтуючы сына ў апошнюю дарогу. У гэты час у хату ўварваліся гітлераўцы і паліцаі,

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

схапілі Марыю, арыштавалі яе сястру Хадору. Ноч трымалі партызанку ў прамерзлым гумне. А раніцай пачалі допыт і катаванне. Дзевяць бясконцых дзён працягвалі здзекі. На дзесятую ноч партызанку забілі на вясковых могілках.

Страшэнная вестка зусім надламала сілы маці — старая жанчына дажыла толькі да вызвалення, у хуткім жа часе хата Гаравых асірацела. Не змагло мацярынскае сэрца перанесці смерць дачкі, сына Івана, які зімой 1944 памёр ад тыфу, гібель у партызанах зяця Макара Бабцова, былога старшыні калгаса «2-я пяцігодка» (загінуў у 1943 пры вызваленні мірных жыхароў ад агню ў вёсцы Гарадзец). Другі зяць Сяргей Радзькоў таксама не вярнуўся з вайны.

Дарагой цаной заплаціла сям'я Гаравых з вёскі Лубянка за вызваленне народа ад фашысцкай навалы. Нізкі паклон ёй і вечная памяць. *А. Цароў.*

ВЁСКА РЭЗКІ

БАБЦОЎ Аляксей Васілевіч, партызан, загінуў у сакавіку 1943, пахаваны ў Быхаве.

ВАРАБ ЁЎ Аксён Трафімавіч, нарадзіўся ў 1889, да вайны працаваў у калгасе «З'езд індустрыялізацыі», партызан 425-га партызанскага атрада Быхаўскай ВАГ, загінуў у сакавіку 1943, пахаваны ў в. Рэзкі.

Шмат экскурсантаў наведвае і музей народнай славы пры Глухскай сярэдняй школе. У ім багатая экспазіцыя, прысвечаная славутаму земляку — Герою Савецкага Саюза, маршалу авіяцыі С. А. Красоўскаму, многа іншых цікавых экспанатаў.

Быхаўская зямля багатая на таленавітых і працавітых людзей. Сярод іх — вядомы савецкі геолаг і геахімік, акадэмік АН БССР Канстанцін Ігнатавіч Лукашоў, доктар тэхнічных навук, член-карэспандэнт АН СССР Аляксандр Аляксандравіч Вахрушаў, пісьменнік, доктар філалагічных навук, прафесар Барыс Васілевіч Стральцоў, доктар філасофскіх навук, прафесар Емяльян Клімовіч Азаранка, савецкі гісторык, прафесар Васіфей Іванавіч Надтачэеў, доктар медыцынскіх навук, прафесар Аркадзь Аляксеевіч Мацвееў, доктар гістарычных навук, прафесар Аркадзь Самсонавіч Ерусалімскі, савецкі дэндролаг, доктар біялагічных навук Аляксей Фядосавіч Іваноў, крытык і літаратуразнаўца, доктар філалагічных навук Міхаіл Іосіфавіч Мушынскі і іншыя.

На Быхаўшчыне нарадзіўся і вырас чэмпіён свету 1984 г. па класічнай барацьбе Міхаіл Пракудзін.

Старанна і мэтанакіравана працуюць быхаўчане ў 12-й пяцігодцы, ператвараюць у жыццё рашэнні XXVII з'езда КПСС і XIX партый-

Удзельнікі вызвалення Быхаўшчыны Г. С. Размадзе, Я. Б. Фрадкоў, П. В. Качур на сустрэчы са школьнікамі Быхава.

Быховский районный историко-краеведческий музей

най канферэнцыі. Павялічваецца аб'ём выпуску прамысловых тавараў, прадукцыі сельскай гаспадаркі, гандлю, бытавых паслуг. Расце сетка навучальных і культурна-асветных устаноў. На пачатак 1989 г. ў раёне дзейнічала 16 сельскіх і раённы Дамы культуры, кінатэатр, 34 клубы, 49 бібліятэк, кніжны фонд якіх складае 585 тысяч тамоў розных выданняў, працуюць 20 сярэдніх, 20 васьмігадовых, 19 пачатковых, 6 музычных і дзіцячая спартыўная школы, камбінат вытворчага навучання, 3 пазашкольныя і 41 дашкольная ўстановы, Дом піянераў, дзесяткі стадыёнаў і спартыўных пляцовак.

Медыцынскае абслугоўванне насельніцтва праводзяць раённая і 8 участковых бальніц, 2 урачэбныя амбулаторыі, 33 фельчарска-акушэрскія пункты, раённая і стаматалагічная паліклінікі, гарадская і сельскія аптэкі.

У сферы бытавога абслугоўвання насельніцтва раёна працуюць каля 600 чалавек, якія аказваюць больш чым 20 відаў паслуг.

Калі на Чарнобыльскай АЭС здарылася аварыя, яе рэха дакацілася і да Быхаўскага раёна, які трапіў у лік іншых раёнаў Магілёўшчыны, забруджаных радыёактыўнымі элементамі (цэзій-137, стронцый і інш.). Ваколіцы в. Александроў, якая размяшчалася па суседству з Слаўгарадскім раёнам, забруджаны цэзіем-137 (больш чым 40 кюры на км^2). Жыхары вёскі былі пераселены ў чыстыя зоны, і зараз аб яе існаванні нагадваюць толькі некалькі асірацелых дамоў. Чорная хмара Чарнобыля не абмінула і Быхаў, дзе колькасць цэзію-137 складае больш чым 5 кюры на км^2, не меншы гэты паказчык у лясных масівах Баркалабаўскага, Навабыхаўскага, Вараніноўскага, Прыбарскага, Трылесінскага лясніцтваў, на пойме Дняпра. Безумоўна, у такіх умовах цяжка атрымаць чыстую сельскагаспадарчую прадукцыю як ў калгасах і саўгасах, так і ў асабістых гаспадарках. Гэты фактар адмоўна ўплывае на развіццё эканомікі раёна, на стан здароўя людзей. Вось якім суровым папярэджаннем людзям стаў атам, які выйшаў з-пад улады чалавека.

Добрыя творчыя сувязі наладжаны ў быхаўчан з жыхарамі балгарскага горада Дранава — пабраціма Быхава. З году ў год развіваецца дружба і супрацоўніцтва паміж іх жыхарамі. Толькі за першыя гады 11-й пяцігодкі больш за 230 жыхароў Быхаўскага раёна пабывала ў Балгарыі. Створана раённае таварыства савецка-балгарскай дружбы, якое садзейнічае паглыбленню сувязей паміж калектывамі кансервава-агароднінасушыльнага завода, калгаса імя Ільіча, медыцынскіх работнікаў і аднатыпнымі калектывамі Дранава. Сталі традыцыйнымі і сумесныя святкаванні знамянальных дат у жыцці брацкіх народаў. 9 верасня — нацыянальнае свята НРБ — быхаўчане адзначаюць, як правіла, разам з прадстаўнікамі працоўных калектываў і грамадскіх арганізацый г. Дранава.

Адкрыццё помніка Ф. А. Смалячкову на перакрыжаванні аўтадарог Магілёў — Гомель і Быхаў — Вараніно. 1966 г.

Вялікая работа праводзіцца ў раёне па патрыятычным выхаванні працоўных. Заслужанай пашанай карыстаюцца ў раёне тыя, хто, не шкадуючы жыцця, змагаўся на гэтай зямлі з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Рашэннем выканкома Быхаўскага гарадскога Савета народных дэпутатаў 13 чалавекам прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Быхава». Сведчаннем вечнай памяці ўдзячных быхаўчан з'яўляюцца мемарыял Воінскай Славы, створаны каля в. Лудчыцы, Курган бессмяротнасці ў в. Дабужа, а таксама дзесяткі помнікаў і абеліскаў на месцах пахавання воінаў Чырвонай Арміі і партызан, якія аддалі сваё жыццё за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы. Па абодва бакі ад Лудчыцкай вышыні ляжаць землі розных гаспадарак раёна. Самыя ўрадлівыя ўчасткі на іх названы палямі Герояў Савецкага Саюза, якія вызначыліся ў баях за гэту вышыню. Права працаваць на іх атрымліваюць самыя лепшыя хлебаробы.

У Быхаўскім раёне дзве з паловай тысячы ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Гэтыя людзі заўсёды былі на пярэднім краі і ў ваенны, і ў мірны час. Прыкладам актыўнай пазіцыі з'яўляецца жыццё такіх ветэранаў, як Васіль Уладзіміравіч Сініца з в. Новая Слабодка. Удзельнік трох войнаў — дзвюх сусветных і грамадзянскай — у мірны час быў ён і столярам, і цесляром, і кавалём, і брыгадзірам, і старшынёй калгаса... Аднавяскоўцы не раз выбіралі яго дэпута-

Быховский районный историко-краеведческий музей

там Глухскага сельсавета. А былы сяржант, абаронца Ленінграда М. І. Прохараў з в. Усходняе доўгі час пасля вайны працаваў у калгасе, карыстаецца вялікай павагай аднавяскоўцаў. Многія ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны і зараз у страі. Ветэраны з гонарам выконваюць свой грамадзянскі абавязак — шчодра перадаюць моладзі баявы і працоўны вопыт старэйшых пакаленняў. Садзейнічае ім у гэтым і Быхаўскі раённы савет ветэранаў вайны і працы, які ўзначальвае П. М. Фіткевіч.

Вялікая пошукавая работа праводзіцца ў раёне чырвонымі следапытамі, супрацоўнікамі Быхаўскага гісторыка-краязнаўчага музея, краязнаўцамі-энтузіястамі, сярод якіх і самі ветэраны. Жыхарка вёскі Янава Людміла Іосіфаўна Катырля, вярнуўшыся пасля вызвалення раёна на папялішча роднай хаты, убачыла ў сваім садзе наспех пахаванага салдата. Зрабіла насып, пасадзіла кветкі. І вось ужо 44 гады з тае пары дбайна даглядае магілу. У 1978 г. ў Ісканскай 8-гадовай школе настаўнік Н. К. Шульга стварыў клуб «Пошук», члены якога ўстанавілі каля 580 імён салдат і афіцэраў, што загінулі на тэрыторыі Абідавіцкага сельсавета.

Так з пакалення ў пакаленне перадаецца жывая нітка Памяці. Ратны і працоўны подзвіг старэйшых пакаленняў працягваецца ў мірных стваральных справах сённяшняга дня, у смелых марах і планах моладзі, у імкненні савецкага народа захаваць мір і шчасце на зямлі.

М. П. Хобатаў.

Жадаем поспехаў!

З 25 па 28 жніўня 1944 года ў Быхаве праходзіла раённая настаўніцкая канферэнцыя. На ёй былі падведзены вынікі зробленай работы, абмеркавана пытанне аб правядзенні 1944—1945 навучальнага года. З вялікім задавальненнем адзначалася, што за два месяцы пасля вызвалення раёна ад фашысцкіх захопнікаў сіламі настаўнікаў, бацькоў і вучняў былі адноўлены 3 сярэдняя, 11 няпоўна-сярэдніх і 57 пачатковых школ.

З гэтай нагоды ў пачатку кастрычніка на імя загадчыка Быхаўскага раённага аддзела народнай асветы Р. С. Казлова ад Старшыні СНК БССР тав. П. К. Панамарэнкі прыйшла тэлеграма такога зместу:

«Адабраем абавязацельствы настаўнікаў, прынятыя на раённай канферэнцыі па аднаўленню школ, культурных устаноў у горадзе і вёсках, па ўмацаванню палітыка-масавай работы сярод насельніцтва. Выказваем упэўненасць, што настаўніцкі калектыў раёна прыме ўсе меры да поўнага аднаўлення разбураных нямецка-фашысцкімі захопнікамі школ, хат-чытальняў, да павышэння паспяховасці навучаючыхся, да ўзмацнення палітыка-масавай і культурна-асветнай работы сярод працоўных раёна. Жадаем поспехаў! Па даручэнню ЦК і СНК — Старшыня Савета Народных Камісараў Беларускай ССР П. Панамарэнка».

Міны і хлеб

Жудасныя сляды пакінула на Быхаўшчыне вайна. У папялішчах ляжалі вёскі і прамысловыя прадпрыемствы, чартапалохам параслі палі. І яшчэ адна страшэнная небяспека падсцерагала людзей на кожным кроку — міны. Велізарная колькасць іх засталася на палях і лугах, у лясах і пералесках. Трэба было найхутчэй абясшкодзіць іх, каб даць магчымасць людзям без боязі хадзіць па вызваленай зямлі. Па закліку раённага савета Асаавіяхіма 49 юнакоў паступілі на курсы мінёраў і пасля адпаведнай падрыхтоўкі разам з мінёрамі-воінамі знайшлі і абясшкодзілі тысячы варожых мін.

Вызначыліся адвагай і знаходлівасцю Дзмітрый Нароўскі, Сяргей Пугачоў, Ігар Баранкевіч, Анатоль Стральцоў, Георгій Кільчыцкі, Уладзімір Фёдаравіч і Уладзімір Іванавіч Корзы, Міхаіл Раманаў, Іван Філоненка, Анатоль Камаровіч, Уладзімір Станкевіч, Уладзімір Хрытанцоў, Мікалай Бараноўскі, Каравацкі, Уладзімір Чорствы і інш. Больш дзесяці мінёраў аддалі сваё жыццё ў барацьбе з «чорнай смерцю».

З успамінаў У. Ц. Хрытанцова

У няпоўныя 16 год стаў я байцом партызанскага атрада М. Д. Грыцана. Ваяваў ва ўзводзе М. А. Барысевіча, цяпер акадэміка АН БССР.

У лютым 1944 г. наша Быхаўскае партызанскае злучэнне з'ядналася з часцямі Чырвонай Арміі. У армію мяне не ўзялі, хоць і вельмі прасіўся. Хутка даведаўся, што раённы Асаавіяхім набірае хлопцаў на курсы мінёраў. Я — туды. Прынялі. І пачалася вучоба. Наш кіраўнік сам усе міны назубок ведаў і нас вучыў, часта паўтараючы: «Мінёр толькі адзін раз у жыцці памыляецца...».

Аднойчы летам праз шмат гадоў пабываў я ў калгасе імя Куйбышава. Пахадзіў, палі паглядзеў, і душа радасцю зайшлася. Збажына сцяной стаіць, лён сінее, бульба лапушыцца. Успомні-

Быховский районный историко-краеведческий музей

лася, як у пачатку 1944 давялося ачышчаць гэтыя месцы ад мін.

Прыехалі, памятаю, у Ніканавічы. Слязамі сустрэлі нас жанчыны: «Дзеткі, родныя, ратуйце нас ад гэтай навалы. Па роднай зямлі як па распаленай патэльні ходзім».

Супакоілі мы іх, як маглі, і ўзяліся за справу. Спачатку жудасна было, а потым паабвыклі. На палях толькі аднаго Ніканавіцкага сельсавета знайшлі і абяшкодзілі больш тысячы мін. За гэтае чыстае поле многа нашых таварышаў мінёраў сваё жыццё аддалі. Калі б была на тое мая воля, я б на тым месцы помнік паставіў. Вось такі: стаіць на пастаменце мінёр, у адной яго руцэ абяшкоджаная міна, у другой — сноп жыта... І маё жыццё на валаску не адзін раз вісела. Аднойчы аддзяленне разміноравала луг. Выбралі супрацьтанкавыя міны і ўжо рашылі паставіць на гэтым кропку. Раптам закралася сумненне: чаму ў адным месцы міны далекавата адна ад адной стаялі? Прашчупаў яшчэ раз у гэтым месцы. Прадчуванне не падвяло: у зямлі затаілася міна. Асцярожна адкапаў яе і толькі ўзяўся за капсуль, як спіна пакрылася халодным потам. У капсулі зусім з'едзена ржаўчынай чака. Маленькая неасцярожнасць — і памінай як звалі. Сабраўшы ўсю сілу волі, я выняў капсуль і, аднёсшы яго далей, кінуў ад сябе. Капсуль, не даляцеўшы да зямлі, узарваўся. Тады я атрымаў падзяку...

Дзесяткі тысяч мін абяшкодзілі мы на нашай Магілёўшчыне. А потым прыйшоў час ісці мне служыць у Савецкую Армію. Аднойчы паклікаў мяне камандзір часці. Руку паціснуў і ўручыў кніжачку. Я разгарнуў яе: «Пасведчанне № 291. Выдадзена таварышу Хрытанцову Уладзіміру Цімафеевічу ў тым, што ён за выдатнае выкананне заданняў па разміраванню тэрыторыі Магілёўскай вобласці, праяўленыя пры гэтым адвагу і мужнасць пастановай Прэзідыума ЦК Саюза Асаавіяхіма СССР ад 27 лютага 1945 года ўзнагароджаны знакам «Выдатны мінёр».

Светлы дзень

Дзень 9 мая 1945 года выліўся ў вялікае ўсенароднае свята. Раённая газета «Сацыялістычная перамога» 10 мая надрукавала шэраг матэрыялаў, прысвечаных гэтай падзеі. Сярод іх расказ супрацоўніцы рэдакцыі Веры Анісімаўны Кілеса аб святкаванні дня 9 мая ў Быхаве. Вось вытрымкі з яе артыкула «Велізарнейшае свята Перамогі»:

«6 гадзін раніцы. Яшчэ толькі з-за гарызонта выглянула майскае сонца, а вуліцы горада поўныя ўжо ад людзей. Вестка па радыё аб заканчэнні вайны, аб канчатковым разгроме гітлераўскай Германіі з хуткасцю маланкі абляцела кожны дом.

— Вайна скончылася! Германія капітуліравала! Сёння вялікае свята — свята Перамогі! — гэтыя словы перадаваліся з вуснаў у вусны на вуліцах, у кватэрах.

Незабываемыя і неацэнныя хвіліны! Я бачу, як бягуць па вуліцы дзеці, старыя. Сустракаючы адзін другога, людзі кідаюцца ў абдымкі, са слязамі радасці на вачах цалуюцца. Няма слоў, каб перадаць усё, што можна было бачыць раніцай 9 мая на вуліцах горада.

10 гадзін. Калона рабочых, калгаснікаў, інтэлігенцыі, школьнікаў крочыць на стадыён на мітынг. Гучаць франтавыя песні, музыка. На трыбуну ўзнімаюцца сакратар райкома КП(б)Б тав. Андрэенкаў, старшыня выканкома райсавета дэпутатаў працоўных тав. Турчыкаў, другія партыйныя і савецкія работнікі.

Вораг разгромлены. Вайна закончылася перамогай гераічнай Чырвонай Арміі. Сёння на нашай вуліцы вялікае свята,— гаворыць, звяртаючыся да прысутных, тав. Андрэенкаў. Кожнае слова аб гераічнай Чырвонай Арміі пакрываецца дружным «Ура!», якое разносіцца па ўсяму стадыёну, па ўсяму гораду.

Незабыўны дзень! З раніцы і да 12 гадзін ночы людзі весяліліся, спявалі, славілі савецкіх воінаў-пераможцаў, родную Камуністычную партыю».

Газета паведамляла...

На старонках раённай газеты «Сацыялістычная перамога»

11 ліпеня 1944 г.

ПАДНІМЕМ З РУІН НАШ РОДНЫ БЫХАЎ

Фашысцкія разбуральнікі зруйнавалі і спалілі самае каштоўнае, што было ў нашым родным горадзе. Электрастанцыю, тры сярэднія школы, два будынкі ясляў, кінатэатр, клуб, аптэку, усе магазіны, лесапільны завод, буйную майстэрню металістаў, маслазавод і рад іншых прадпрыемстваў і ўстаноў фашысцкія варвары ператварылі ў руіны і папялішчы.

Самы цэнтр любімага горада з лепшымі збудаваннямі разбуран і спален. Больш тысячы сямей засталіся без жылля. На месцы іх жыллёвых будынкаў засталіся груды цэглы, абломкі жалеза і папялішчы, заросшыя бур'яном.

Там, дзе сваімі купаламі высока паднімалася

Быховский районный историко-краеведческий музей

царква Праабражэнія, ляжаць велізарныя грудy цэглы і каменя. Там, дзе было велізарнае збудаванне ацэтонавага завода, стаяць развернутыя каменныя сцены і ізуродаваныя машыны.

Перад тым, як уцячы з Быхава, атрад разбуральнікаў думаў зруйнаваць ушчэнт увесь горад і не пакінуць ніводнага будынка. Але свае злачынныя планы ажыццявіць да канца гітлераўцы не змаглі. Пад ударамі Чырвонай Арміі яны вымушаны былі адкаціцца далёка на захад.

Чычаеў.

15 жніўня 1944 г.

РАЁННЫ СХОД КАМСАМОЛА

13 жніўня адбыўся раённы камсамольскі сход. На сходзе прысутнічала каля 100 камсамольцаў.

З дакладам аб выніках 5-га пленума ЦК ЛКСМБ выступіў сакратар райкома камсамола тав. Караленка. У сваім дакладзе т. Караленка звярнуў асаблівую ўвагу камсамольцаў на аднаўленне прадпрыемстваў, устаноў і калгасаў нашага раёна, разбураных немцамі. Тав. Караленка заклікаў камсамольцаў раёна к таму, каб камсамол і моладзь сваім гераічным трудом паказвалі прыклад, як трэба працаваць у ваенны час, каб сваім гераічным трудом на ўборцы ўраджаю дапамагчы Чырвонай Арміі праследаваць па пятах параненую фашысцкую гадзіну і дабіць яе ў яе ўласным логаве...

ЗДАЮЦЬ ХЛЕБ У ФОНД АБАРОНЫ

БАРКАЛАБАЎ. (Наш кар.). Сацыялістычнае спаборніцтва паміж калгасамі сельсавета па здачы хлеба ў фонд Чырвонай Арміі шырыцца з кожным днём. Датэрмінова разлічыўшыся з дзяржавай па хлебаздачы, калгасы здаюць хлеб у фонд сваёй гераічнай Чырвонай Арміі.

Калгаснікі калгаса імені Карла Лібкнехта здалі ў фонд абароны 513 кілаграмаў зярна. Калгас «Чырвоны барацьбіт» у фонд Чырвонай Арміі здаў 504 кілаграмы высакаякаснага хлеба. Здаюць хлеб у фонд Чырвонай Арміі і калгасы імені Калініна і «Чырвоны шлях».

18 кастрычніка 1945 г.

З ЗЯМЛЯНАК — У НОВЫЯ ХАТЫ

Прайшоў год і чатыры месяцы з дня вызвалення раёна. За гэты перыяд вёска Чырвоны Асавец адноўлена занава. На месцы папялішчаў і развалін пабудавана 130 хат для калгаснікаў. З зямлянак у новапабудаваныя хаты пераведзены ўсе калгасныя сем'і. Адначасова з адбудовай вёскі калгаснікі ўзвялі новы кароўнік, свіран. Пройдзе год-два — і вёска будзе яшчэ лепшай і прыгажэйшай, чым да фашысцкага нашэсця. Для гэтага калгаснікі не шкадуюць ні сіл, ні энергіі. Поспех на адбудове вёскі дасягнут дзякуючы правільнай арганізацыі працы. Старшыня калгаса тав. Бібікаў надае вялікае значэнне перасяленню калгаснікаў з зямлянак у хаты. У калгасе былі створаны будаўнічыя і транспартныя брыгады. Дамы сем'ям загінуўшых і інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны пабудаваны ў першую чаргу.

10 лістапада 1945 г.

СТВОРАНА 8 БУДАЎНІЧЫХ БРЫГАД

ДУНАЁК. У калгасе «Новае жыццё» нямецкія факельшчыкі спалілі ўсе пабудовы калгаса і дамы калгаснікаў.

Калгаснікі і калгасніцы дружна ўзяліся за адбудову сваёй роднай вёскі. Тут створана 8 будаўнічых і транспартных брыгад, якія паўсядзённа працуюць на адбудове вёскі, 160 новых хат і 16 зрубаў ужо адбудавана і нарыхтавана 915 кубаметраў лесаматэрыялаў для адбудовы калгасных пабудоў і дамоў калгаснікам.

7 лютага 1946 г.

СУД НАД ЗДРАДНІКАМ РАДЗІМЫ

З 4 лютага ў горадзе Быхаве адбываўся судовы працэс над здраднікам Радзімы. У адкрытым судовым пасяджэнні Ваенны Трыбунал войск НКВД па Магілёўскай вобласці пад старшынствам старшага лейтэнанта юстыцыі тав. Гразных разгледзеў справу аб здрадзе Радзіме грамадзяніна з вёскі Закупленне Клічаўскага раёна Салдаценка А. Е.

Зала суда ўвесь час была перапоўнена жыхарамі горада. Тут прысутнічалі з бліжэйшых вёсак Макранскага, Лудчыцкага, Студзёнецкага і другіх сельсаветаў раёна.

Салдаценка А. Е. здрадзіў Радзіме, перайшоў на бок ворага. У 1941 годзе ён добраахвотна паступіў на службу ў паліцыю. Вызначыўшыся зверствамі над мірнымі жыхарамі як паліцай, Салдаценка быў залічан у нямецкі карны атрад «СС» і атрымаў пасаду камандзіра ўзвода.

Сведкі Куракова Нася, Спічакоў Ананій, Буцкова Марыя, Нушкоў Фёдар, Спічакоў Афанасій і другія расказалі суду, як лютавалі карнікі атрада «СС», дзе быў камандзірам узвода Салдаценка, над мірнымі жыхарамі ў Клічаўскім, Кіраўскім і Быхаўскім раёнах. Сведка Нушкоў Фёдар расказаў:

— У ліпені 1942 года я быў у гасцях у вёсцы Збышын Клічаўскага раёна. Карнікі акружылі гэтую вёску. Усіх жыхароў яны сагналі ў гумно і сарай, дзе іх зажыва спалілі. Тых, хто ўцякаў у лес, карнікі расстрэльвалі з кулямётаў і аўтаматаў. Нейкім цудам схаваўшыся ў кустах паблізу ад гумна, дзе былі спалены зажыва людзі, я бачыў, як Салдаценка, падвёўшы да гарашчага

Быховский районный историко-краевед ческий музей

гумна, укінуў туды двух малых дзяцей. Спаліўшы 172 чалавекі зажыва, карнікі спалілі ўсю вёску.

Сведкі з Чачэвіч, з Балонава Сяльца, з Яленшчыны і з другіх вёсак падрабязна расказалі, як выradак Салдаценка разам з сваімі падначаленымі карнікамі забіваў ні ў чым не вінаватых мірных людзей, грабіў насельніцтва, спальваў вёскі, вёў барацьбу з народнымі мсціўцамі—партызанамі.

Брыдкі выradак прызнаў тыя злачынствы, якія ён тварыў, спадзеючыся, што савецкі суд пакіне яму жыццё.

Але не можа быць ніякай літасці да здраднікаў Радзімы — беларуска-нямецкіх нацыяналістаў, лакеяў германскага фашызму. І савецкі суд вынес заслужаны прыгавор. Салдаценка А. Е. прыгаворан да вышэйшай меры пакарання — расстрэлу.

Прысутныя ў зале суда сустрэлі справядлівы прыгавор аднадушным адабрэннем. *М. Лясноў.*

27 красавіка 1947 г.

АРГАНІЗАВАНА РАСПАЧАЛІ ТОРФАСЕЗОН

На торфазаводзе «Чырвоная Беларусь» арганізавана распачалі торфасезон. На торфаздабычу выйшлі 42 брыгады рабочых. Працуе торфаздабываючая машына, якая дае штодзённа звыш 80 тон прасаванага торфу.

З першых дзён торфасезона ў брыгадах тарфянікаў высокі вытворчы і палітычны ўздым. Брыгады Чорнага Грыгорыя і Кавалёва свае зменныя нормы значна перавыконваюць.

У чэсць усенароднага свята Першае Мая калектыў торфазавода дасць краіне больш 3000 тон торфу. Адначасова з торфаздабычай разгортваецца будаўніцтва. Заканчваецца будаўніцтва 8-кватэрнага будынка для сямей рабочых. Распачата будаўніцтва інтэрната для сезонных рабочых. На 60 дзяцей адчыняецца дзіцячы сад, абсталёўваецца радыёвузел. *В. Г. Ляшчоў.*

25 снежня 1947 г.

ВЯЛІКІ АСАРТЫМЕНТ ПРАМЫСЛОВЫХ ТАВАРАЎ

Добра падрыхтаваліся работнікі прамтаварнага магазіна, дзе загадчыкам тав. Хонанаў, да гандлю без картак. З першых дзён пасля адмены картак у магазіне выключны парадак і арганізаванасць. Усе гэтыя дні ў магазіне вялікі асартымент прамысловых тавараў. Тут ёсць дастаткова разнастайнай мануфактуры, гатовага адзення, абутку і іншых рэчаў.

Работнікі прылаўка Дрыбінская Міра, Гіршчык Марыя і сам загадчык магазіна Хонанаў праяўляюць выключную ветлівасць да пакупнікоў. Характэрна, што за першы тыдзень магазін прадаў розных тавараў больш, чым прадаваў ён за месяц да адмены картак.

Пакупнікі выходзяць з магазіна вельмі задаволенымі. *М. Мельнікаў.*

14 сакавіка 1948 г.

КОНІ — ГОНАР КАЛГАСА

Недарам ганарацца калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імя Варашылава Грудзінаўскага сельсавета сваімі конямі. Ды і не толькі сваімі конямі, а і тымі, хто даглядае іх, поіць і корміць.

Зойдзеш на канюшню калгаса — сэрца радуецца. Кідаецца ў вочы выключны парадак і чыстата. Для кожнага каня зроблен станок. На станку — надпіс з назвай каня. На сцяне — поўны камплект збруі. Тут жа надпіс калгасніка або калгасніцы, за якімі замацаван конь.

Такі парадак на канюшні ўведзен старшым конюхам Тараканавым Лукашом. Ён распрацаваў парадак догляду і карыстання конямі. Гэты распарадак з дакладнасцю выконваюць конюхі Зайцаў Лявон, Гурчанка Даніл, усе калгаснікі і калгасніцы.

Для коней выдзелена неабходная колькасць высокаякаснага сена і аўсу. Цяпер коні адпачываюць, а як толькі прасохне глеба, калгаснікі на сытых і моцных конях змогуць выконваць і перавыконваць нормы выпрацоўкі на ворыве і на іншых палявых работах.

Вось чаму ў калгасе ўсе коні добрай і выдатнай укормленасці. На такіх конях у перыяд веснавых работ магчыма будзе папрацаваць на славу.

Не памыляецца старшыня праўлення калгаса тав. Максімаў, які гаворыць:

— На сваіх калгасных конях мы правядзём сяўбу за 8—10 рабочых дзён з высокай якасцю апрацоўкі глебы. *В. Кілеса.*

13 чэрвеня 1948 г.

ТЭЛЕФАНІЗАЦЫЯ СЕЛЬСАВЕТАЎ

Раённы аддзел сувязі праводзіць вялікую работу па тэлефанізацыі сельскай мясцовасці. Толькі ў гэтым годзе тэлефанізаваны Нова-Быхаўскі, Тайманаўскі, Чырвона-Беражскі і Ніжня-Тошчыцкі сельсаветы.

Зараз вядуцца падрыхтаванні да тэлефанізацыі Трылесінскага, Красніцкага, Чырвона-Асавецкага і Дунайкоўскага сельсаветаў.

У 1949 годзе будуць адноўлены ўсе тэлефонныя лініі, якія існавалі да пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

РАСЦЕ ЛІК ДЗІЦЯЧЫХ УСТАНОЎ

З кожным годам ў горадзе Быхаве і вёсках раёна павялічваецца колькасць дзіцячых устаноў.

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

За чатыры гады пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў адноўлены Баркалабаўскі і Грудзінаўскі дзіцячыя дамы для дзяцей-сірат. Ветранскі дзіцячы дом арганізаван занава. У трох дзіцячых дамах выхоўваюцца савецкія дзеці, бацькі якіх загінулі ад рук гітлераўскіх людаедаў.

У горадзе Быхаве працуюць два дзіцячыя сады, дзіцячыя яслі і дзіцячая пляцоўка.

5 кастрычніка 1950 г.

НА КАСІЦКАЙ ГЭС

Паспяхова заканчваецца будаўніцтва Касіцкай гідраэлектрастанцыі Баркалабаўскага сельсавета. Тут ужо поўнасцю ўзведзена плаціна, будынак электрастанцыі, заканчваецца ўстаноўка турбін. Электрамантажнікі завяршаюць работу па падвешванню дроту на стаўбах і па правядзенні правадоў у грамадскія памяшканні калгасаў і дамы калгаснікаў.

Электрыфікацыя калгасаў аблегчыць працу калгаснікаў. Электрычнасць будзе прыводзіць у дзеянне сельскагаспадарчыя машыны і дасць магчымасць механізаваць працу на жывёлагадоўчых фермах.

Калектыў будаўнікоў электрастанцыі абавязаўся да 33-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі поўнасцю закончыць будаўніцтва і здаць гідраэлектрастанцыю ў эксплуатацыю.

6 верасня 1953 г.

ПА ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЙ ВУЛІЦЫ

БЫХАЎ. Прыгожымі двухпавярховымі дамамі забудоўваецца Чырвонаармейская вуліца горада. На працягу двух гадоў тут узведзены будынкі райвыканкома, райкома партыі, два жылыя дамы чыгуначнікаў, будуецца новы кінатэатр. Па гэтай вуліцы размешчаны будынкі сярэдняй школы № 2, сямігадовай чыгуначнай школы, гасцініца, 4 магазіны, раённая і дзіцячая бібліятэкі, гарадскі стадыён і сквер.

Людзі шчырага сэрца

У другім нумары газеты «Известия Быховского ревкома» за 27 снежня 1918 г. павятовы аддзел народнай асветы надрукаваў спіс кандыдатаў на настаўніцкія пасады ў школе 2-й ступені. У ім сярод іншых значыліся А. А. Цыбулькін (1882—1951) і Ф. П. Уладзіміраў (1879—1955). Гэта былі самаадданыя людзі, для якіх настаўніцкая праца, выхаванне і навучанне дзяцей былі справай усяго жыцця, любімай і адзінай прафесіяй. Журналіст І. Дыгант, былы іх вучань, напісаў у свой час пра настаўнікаў успаміны, якія прыводзяцца ніжэй.

Прыходу ў клас настаўніка малявання Аляксандра Аляксеевіча мы чакалі як свята. Палюбілі адразу і яго, такога па-бацькоўску ласкавага, і ўрокі малявання.

Праз нейкі час у класе выявіліся здольныя да малявання вучні. Мы ўжо ўмелі карыстацца фарбамі, каляровымі алоўкамі. І вось аднойчы Цыбулькін запрасіў нас да сябе. Адзін за адным уваходзілі мы ў пакой настаўніка. Перад намі паўстала такая прыгажосць, што мы нават разгубіліся. Сцены кватэры былі ўвешаны малюнкамі. Мы пераходзілі ад аднаго да другога і ўсё глядзелі, глядзелі на цудоўныя краявіды, якія не раз бачылі ў наваколлях Быхава. Аляксандр Аляксеевіч з цёплай усмешкай назіраў за намі, а потым пачаў расказваць аб малюнках, аб прыгажосці роднага краю. Скончылася наша гутарка тым, што настаўнік запрасіў пайсці разам з ім на эцюды.

У час летніх канікул мы пабывалі ў многіх месцах, малявалі з натуры лес, дняпроўскія берагі, быхаўскі замак на высокай кручы. Настаўнік быў заўсёды побач, падказваў, як лепш зрабіць малюнак, якія фарбы ўзяць. Захапленне работай было такое, што толькі дождж прымушаў сядзець дома. Затое да пачатку навучальнага года ў нас сабралася столькі малюнкаў, што мы зрабілі ў школе выстаўку. Цыбулькін непрыкметна, але настойліва прывіваў нам любоў да прыгожага, і за гэта мы былі ўдзячны яму.

Аляксандр Аляксеевіч быў улюбёным у роднае Прыдняпроўе, яго акварэльныя пейзажы вызначаліся майстэрствам і экспанаваліся на шматлікіх абласных, рэспубліканскіх і ўсесаюзных выстаўках. У 1948 г. на Усесаюзнай выстаўцы яго карціны занялі другое месца, праз год Цыбулькін стаў пераможцам рэспубліканскай выстаўкі мастакоў-аматараў. У тым жа годзе за дасягнутыя поспехі ў галіне самадзейнага мастацтва і народнай творчасці А. А. Цыбулькін быў узнагароджаны Ганаровай граматай Камітэта па справах мастацтва пры Савеце Міністраў СССР і Усесаюзнага Дома народнай творчасці. У 1950 г. на рэспубліканскай выстаўцы карціны мастака прыцягнулі да сябе асобую ўвагу і былі набыты Мастацкім музеем БССР. У кастрычніку 1950 г. Магілёўскі абласны аддзел па справах мастацтва і абласны Дом народнай творчасці правялі вечар з нагоды 50-годдзя творчай дзейнасці нашага настаўніка.

Настойлівым і да канца адданым сваёй справе быў і Ф. П. Уладзіміраў. Выкладаў ён матэматыку. Яе не заўсёды лёгка было засвоіць, ды не ва ўсіх хапала для гэтага цярпення, сілы волі. Вось тут і паказаў свой «характар» настаўнік. Нікому і ніколі ні пры якіх абставінах не рабіў ён скі-

Быховский районный историко-краеведческий музей

Ф. П. Уладзіміраў.

А. А. Цыбулькін.

У. А. Скалуба.

П. М. Фіткевіч.

дак, а патрабаваў вучыць свой прадмет і вучыць. Не падрыхтаваўшы матэматыкі, мы проста баяліся ісці ў школу. І не таму, што Фама Пракопавіч паставіць «дрэнна» ці, што яшчэ горш, «вельмі дрэнна». Баяліся яго маўчання, дакорлівага позірку глыбока пасаджаных вачэй. Паглядзіць, паківае галавой і моўчкі адвернецца, быццам і няма цябе. А як ён радаваўся, калі бачыў поспехі сваёй работы. Матэматыку ў яго ведалі ўсе, і гэта было самай лепшай узнагародай, лепшай удзячнасцю, якую маглі яму выказаць вучні.

Дарослымі мы стараліся ўбачыцца з Фамой Пракопавічам, пагутарыць з ім, параіцца. Ён цікавіўся нашымі справамі і, калі мог прынесці якую-небудзь карысць, дапамагчы чым, не праміналў зрабіць гэта. Жыў ён дзеля сваіх выхаванцаў і ў гэтым бачыў сэнс настаўніцкай дзейнасці.

Героі працы

АНІСІМАЎ Іван Ерамеевіч. Нарадзіўся ў 1920 г. ў в. Балонаў Сялец Быхаўскага раёна. Член КПСС з 1941 г. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1945—1949 гг. на гаспадарчай рабоце. У 1949—1959 гг. працаваў інструктарам Крэцінгскага павятовага камітэта Кампартыі Літвы, загадчыкам аддзела, сакратаром былога Дзісенскага райкома КПБ. З 1959 г. старшыня калгаса «Цвіціна», з 1970 г. аб'яднанага калгаса імя Цітова Міёрскага раёна Віцебскай вобласці. У 1976 г. за поспехі і працоўную доблесць у выкананні планаў і сацыялістычных абавязацельстваў у павелічэнні вытворчасці і продажу дзяржаве збожжа, бульбы і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнам Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», Кастрычніцкай Рэвалюцыі медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Памёр І. Е. Анісімаў 26 жніўня 1986 г.

СКАЛУБА Уладзімір Антонавіч. Нарадзіўся ў 1930 г. ў в. Лудчыцы Быхаўскага раёна. Член КПСС з 1968 г. У 1945—1951 гг. трактарыст Лудчыцкай МТС, з 1954 г. трактарыст, у 1964—1976 гг. звеннявы механізаванага звяна па вырошчванню бульбы ў калгасе «Беларусь». У 1966 г. за поспехі ў павелічэнні вытворчасці і нарыхтовак сельскагаспадарчай прадукцыі яму прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Выбіраўся членам Быхаўскага райкома КПБ, дэпутатам сельскага, раённага і абласнога Саветаў народных дэпутатаў. Памёр У. А. Скалуба 16 снежня 1976 г.

ФІТКЕВІЧ Пётр Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1927 г. ў в. Макранскія Хутары Быхаўскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1951 г. Удзельнік партызанскага руху на Беларусі. У 1954 г. скончыў Магілёўскую сярэднюю сельскагаспадарчую школу. З 1950 г., пасля службы ў Савецкай Арміі, працуе на радзіме ў сельскай гаспадарцы: калгаснікам, аграномам, намеснікам старшыні і старшынёй калгаса. У 1962—1968 гг. начальнік механізаванага атрада Сельгастэхнікі, з 1968 г. старшыня калгаса імя Ільіча. З 1978 г. старшыня Быхаўскага міжгаспадарчага аб'яднання «Дняпро». У 1976 г. за поспехі ў выкананні планаў і сацыялістычных абавязацельстваў па павелічэнні вытворчасці і продажу дзяржаве сельгаспрадуктаў прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, «Знак Пашаны», медалямі. Выбіраўся членам Быхаўскага РК КПБ, дэпутатам сельскага і раённага Саветаў народных дэпутатаў, у 1980 — дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Жыве і працуе ў Быхаве. Вядзе грамадскую работу.

Быховский районный историко-краеведческий музей

6 Зак. 2435

Узнагароджаны ордэнам Леніна

Славу і гонар Быхаўскай зямлі памнажаюць яе сыны, выхаванцы ваеннага і мірнага стваральнага часу. Больш сарака з іх удастоены высокай дзяржаўнай узнагароды — ордэна Леніна. Ардэнаносцы здзяйснялі свой подзвіг,— ці то было гэта на фронце, ці то ў бітве за вялікі хлеб і малако,— у імя чалавека, у імя яго лепшага жыцця...

АЎТУШКОЎ Мінай Сяргеевіч. Нарадзіўся ў 1929 г. ў в. Дружба Быхаўскага раёна. З сялян. Перад вайной скончыў 4 класы Абідавіцкай школы, з 1945 г. пачаў працаваць трактарыстам Сялецкай МТС Журавіцкага раёна. У 1958 г. пераехаў у родную вёску, працуе трактарыстам у калгасе «XVIII партз'езд». М. С. Аўтушкоў узнагароджаны ордэнам Леніна (1973).

БАГДАНОВІЧ Пётр Барысавіч. Нарадзіўся ў 1903 г. ў Быхаве. З рабочых. Член КПСС з 1940 г. У 1920 г. скончыў школу 2-й ступені ў Быхаве, потым Ленінградскае ваенна-марское вучылішча. З 1925 г. капітан 1-га рангу П. Б. Багдановіч служыў у ваенна-марскім флоце. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1951), двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Айчыннай вайны, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. П. Б. Багдановіч памёр 18.5.1987 г.

БАРЫСАЎ Васіль Пятровіч. Нарадзіўся ў 1929 г. ў в. Іскань Быхаўскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1969 г. З 1946 г. пачаў працаваць у калгасе «Іскра». З 1953 г., пасля службы ў Савецкай Арміі, В. П. Барысаў працаваў рабочым леспрамгаса ў Карэліі. У 1958 г. вярнуўся ў родны калгас «Іскра», працаваў брыгадзірам. З 1986 г., пасля аб'яднання калгасаў, памочнік начальніка вытворчага ўчастка калгаса «XVIII партз'езд». Узнагароджаны ордэнам Леніна (1972), Працоўнага Чырвонага Сцяга. Жыве ў в. Іскань.

БУШКЕВІЧ Іван Міхайлавіч. Нарадзіўся 15.7.1907 г. ў в. Глухская Сліба Быхаўскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1931 г. З 1920 г. пачаў працаваць па найму, потым рознарабочым на ст. Друць. З 1929 г. служыў у Чырвонай Арміі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Ваяваў на Паўднёвым, Варонежскім і іншых франтах. Быў паранены. Пасля дэмабілізацыі ў 1955 г. І. М. Бушкевіч жыў у Быхаве. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1954), Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалямі. І. І. Бушкевіч памёр 9.3.1985 г.

ВАЛУЕЎ Віктар Паўлавіч. Нарадзіўся 18.6.1932 г. ў в. Дубніца Магілёўскага раёна ў сялянскай сям'і. Член КПСС з 1967 г. Вучыўся ў Гадылёўскай сярэдняй школе. Да 1956 г. працаваў у калгасе, потым у Магілёве, пасля на торфапрадпрыемстве «Дняпроўскае» Быхаўскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1971). В. П. Валуеў памёр у 1976 г.

ГАРАШЧУК Юлія Конанаўна. Нарадзілася ў 1928 г. ў в. Бахань Слаўгарадскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1968 г. У 1945 г. скончыла школу ФЗН у Гомелі, працавала тынкоўшчыцай у будаўнічых арганізацыях Гомеля, Рэчыцы, г. Кандалакша Мурманскай вобласці, Быхаве. З 1961 г. брыгадзір тынкоўшчыкаў Быхаўскай перасоўнай механізаванай калоны № 20. У 1967 г. Ю. К. Гарашчук выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. У 1968 г. ёй прысвоена званне «Заслужаны будаўнік БССР». Ю. К. Гарашчук узнагароджана ордэнамі Леніна (1974), Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны». З 1983 г. Ю. К. Гарашчук на пенсіі. Жыве ў Быхаве.

ГАРБАЧОЎ Аркадзь Іванавіч. Нарадзіўся 14.1.1917 на станцыі Павялец Скопінскага раёна Разанскай вобласці ў сям'і рабочых. З 1930 г. працаваў у калгасе «Рэвалюцыя» ў Быхаве, праз год паступіў вучнем слесара на Быхаўскі ацэтона-бутылавы завод, потым скончыў курсы аператараў перагоннага цэха, з 1937 г. працаваў слесарам. У 1938 г. А. І. Гарбачоў прызваны ў ваенна-марскі флот, служыў у Каспійскай ваеннай флатыліі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1942 г. абараняў Сталінград. З 1943 г. ваяваў у складзе Азоўскай ваеннай флатыліі Чарнаморскага флоту, быў паранены. Пасля дэмабілізацыі А. І. Гарбачоў з 1947 г. працаваў токарам, а потым механікам сушыльнага цэха на Быхаўскім кансервава-агародніна-сушыльным заводзе. З 1981 г. пенсіянер. А. І. Гарбачоў узнагароджаны ордэнамі Леніна (1966), Айчыннай вайны I ступені, медалямі. Жыве ў Быхаве.

ГРАДУСАВА Марыя Міхайлаўна. Нарадзілася 10.5.1938 г. ў в. Прудок Слаўгарадскага раёна. З сялян. У 1956 г. пераехала ў Быхаўскі раён, пачала працаваць даяркай у саўгасе «Вараніно». У 1977 г. ёй было прысвоена званне «Лепшая даярка калгаса». М. М. Градусава выбіралася дэпутатам Быхаўскага раённага і Следзюкоўскага сельскага Саветаў народных дэпутатаў. Узнагароджана ордэнам Леніна (1976), ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Жыве ў пас. Вараніно.

ЗАЙЦАЎ Міхаіл Якаўлевіч. Нарадзіўся ў 1945 г. ў в. Халоднікі Калінкавіцкага раёна. З сялян. Член КПСС. У 1970 г. пасля сканчэння Чырвонабярэжскага сельскагаспадарчага тэхнікума працаваў у калгасе імя Ільіча Быхаўскага раёна аграномам, галоўным аграномам, намеснікам старшыні калгаса. М. Я. Зайцаў узнагароджаны ордэнамі Леніна (1976), Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ЗАЙЦАЎ Ціт Сямёнавіч. Нарадзіўся 31.12.1903 г. ў в. Збышын Кіраўскага раёна ў беднай сялянскай сям'і. З лістапада 1925 г. ў Чырвонай Арміі. Член КПСС з 1927 г. 22 чэрвеня 1941 г. батальён пад камандаваннем Ц. С. Зайцава ўступіў у бой з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на заходняй граніцы нашай краіны, на захад

Быховскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

Ю. К. Гарашчук.

А. І. Гарбачоў.

Ц. С. Зайцаў.

Л. Дз. Клепік.

ад Гродна. Потым Ціт Сямёнавіч ваяваў на розных франтах. Быў двойчы паранены. Другое раненне, вельмі цяжкае, закончылася ампутацыяй левай рукі. Пасля доўгага лячэння ў шпіталі з сакавіка да снежня 1942 г. быў прызнаны непрыгодным да ваеннай службы. Аднак па сваёй настойлівай просьбе Зайцаў быў пакінуты ў арміі і прызначаны камандзірам стралковага батальёна па забеспячэнню аховы грузаў, якія дастаўлялі на фронт. Працягваў службу ў арміі да 1951 г. З 1952 г. Ц. С. Зайцаў жыве ў Быхаве, доўгі час быў на гаспадарчай рабоце. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1951), Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалямі.

КАЛЕСНІКАЎ Мікалай Сяргеевіч. Нарадзіўся ў 1923 г. ў г. Варашылаў Прыморскага краю ў сям'і рабочых. Член КПСС з 1954 г. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1940 г. паступіў у ваеннае авіяцыйнае вучылішча. Здзейсніў шмат баявых вылетаў. Пасля вайны працягваў службу ў арміі да 1964 г. З 1970 г. начальнік штаба грамадзянскай абароны Быхаўскага раёна. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1957), Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр М. С. Калеснікаў 4.4.1973 г.

КАНАПЛЁВА Ганна Яфімаўна. Нарадзілася ў 1937 г. ў в. Абідавічы Быхаўскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1965 г. Пасля сканчэння Абідавіцкай сярэдняй школы з 1957 г. працуе ў калгасе «XVIII партз'езд». Узнагароджана ордэнам Леніна (1971), медалямі. Жыве ў в. Абідавічы.

КАНТАНІСТАВА Ксенія Трафімаўна. Нарадзілася 1.2.1920 г. ў в. Рагі Слаўгарадскага раёна. З сялян. Да Айчыннай вайны працавала звеняявой паляводчай брыгады ў калгасе «Пралетарый» Слаўгарадскага раёна. З 1950 г. была даяркай у саўгасе «Вараніно». К. Т. Кантаністава ўзнагароджана ордэнам Леніна (1971). З 1975 г. на пенсіі. Жыве ў пас. Вараніно.

КЛЕПІК Леў Дзмітрыевіч. Нарадзіўся ў 1903 г. ў в. Мокрае Быхаўскага раёна. З сялян. Член КПСС. У 1918 г. скончыў школу 2-й ступені ў Быхаве. У час грамадзянскай вайны працаваў у павятовым харчовым камітэце. Л. Дз. Клепік скончыў Кіеўскае пяхотнае вучылішча, працаваў выкладчыкам у ваенных навучальных установах. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1948), Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны, Чырвонай Зоркі, медалямі. Л. Дз. Клепік памёр 27.2.1986 г. ў Маскве.

КОШКІН Уладзімір Іванавіч. Нарадзіўся ў 1932 г. ў в. Следзюкі Быхаўскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1966 г. З 1948 г. працуе трактарыстам у калгасе імя Ільіча. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1978), Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Жыве ў в. Следзюкі.

КУДРАЎЦАЎ Аляксандр Пятровіч. Нарадзіўся 2.7.1922 г. ў г. п. Стара-Дрыбін Горацкага раёна Магілёўскай вобласці. З сялян. Член КПСС з 1949 г. Пасля сканчэння рамеснага вучылішча працаваў токарам на заводзе ў Кранштаце. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У кастрычніку — снежні 1941 г. на фронце быў цяжка паранены. Пасля доўгага лячэння ў шпіталі прызнаны непрыгодным да ваеннай службы, працаваў у народнай гаспадарцы. З 1954 г. старшыня калгасаў у Іўеўскім раёне Гродзенскай вобласці. У 1962—1982 гг. старшыня калгаса «Рэвалюцыя» ў Быхаве. Выбіраўся членам Быхаўскага райкома КПБ і яго бюро, дэпутатам раённага Савета народных дэпутатаў. А. П. Кудраўцаў узнагароджаны ордэнамі Леніна (1973), Айчыннай вайны I ступені, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак Пашаны», медалямі. З 1982 г. на пенсіі. Жыве ў Быхаве.

КУЗНЯЦОЎ Андрэй Сямёнавіч. Нарадзіўся ў 1897 г. ў с. Ваюціна Мелянкоўскага раёна Уладзімірскай вобласці. З сялян. Член КПСС з 1939 г. Працаваў у сельскай гаспадарцы. У 1926—1943 гг. служыў у органах міліцыі ў г. Выкса Горкаў-

Быховский районный историко-краеведческий музей

А. П. Кудраўцаў.

М. Ф. Лявіцкі.

Ц. Я. Міранцоў.



А. А. Муштукоў.

скай вобласці, у 1944—1954 гг.— у Быхаўскім райаддзеле міліцыі. Узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі. А. С. Кузняцоў памёр у жніўні 1984 г.

ЛІСКОЎ Пётр Ільіч. Нарадзіўся ў 1923 г. ў в. Абідавічы Быхаўскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1962. З 1940 г. працаваў у калгасе «XVIII партз'езд». Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З першых яе дзён на фронце, механік-вадзіцель танка. З 1945 г. і да выхаду на пенсію П. І. Ліскоў працаваў трактарыстам у калгасе «XVIII партз'езд». Узнагароджаны ордэнам Леніна (1953), ордэнамі Айчыннай вайны, Славы III ступені, «Знак Пашаны», медалямі. Жыве ў в. Абідавічы.

ЛЯВІЦКІ Мікалай Фадзеевіч. Нарадзіўся ў 1906 г. ў в. Мокрае Быхаўскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1931 г. У 1922 г. скончыў школу 2-й ступені ў Быхаве, у 1929 г.— Ленінградскую авіяцыйную школу. Удзельнік баёў на Халхін-Голе ў 1939 г. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у абароне Ленінграда. У пасляваенны час М. Ф. Лявіцкі скончыў ваенна-інжынерную авіяцыйную акадэмію імя Жукоўскага, выкладаў у ваенна-навучальных установах. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1953), ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр М. Ф. Лявіцкі 9.2.1975 г. ў Львове.

МЕЛЬНІКАЎ Іван Аляксандравіч. Нарадзіўся ў 1923 г. ў в. Антонаўка Чавускага раёна. З сялян. Член КПСС з 1945 г. З 1940 г. пачаў працаваць слесарам на Магілёўскім аўтарамонтным заводзе. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, быў партызанам. Пасля вызвалення Беларусі І. А. Мельнікаў на партыйнай рабоце ў Плісkім раёне Полацкай вобласці. Скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ (1953), завочна Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС (1960) і Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію (1973). Да выхаду на пенсію працаваў у сельскай гаспадарцы: дырэктарам саўгаса «Грудзінаўскі», намеснікам старшыні калгаса, аграномам калгаса «Грудзінаўскі». І. А. Мельнікаў узнагароджаны ордэнам Леніна (1966), ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеняў, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі. Жыве ў в. Барышаўка Чавускага раёна.

МІРАНЦОЎ Ціхан Яфімавіч. Нарадзіўся 22.6.1894 г. ў в. Ямнае Быхаўскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1920 г. У 1912 г. паехаў на працу ў Кіеў, потым працаваў у гарадах Нікапалі, Бярозаўка Адэскай вобласці. З 1915 г. ў царскай арміі, удзельнік першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. У 1918 г. ўступіў у першы Быхаўскі чырвонагвардзейскі атрад. З жніўня 1918 г. стаў чэкістам. Доўгі час працаваў у органах НКУС. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, у верасні 1941 г. быў кантужаны на фронце. Пасля выздараўлення працягваў службу ў органах дзяржбяспекі ў Прыволжскай ваеннай акрузе. У 1948 г. ў званні палкоўніка звольнены ў запас. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1945), двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр Ц. Я. Міранцоў 12.11.1972 г. ў г. Краснагорск Маскоўскай вобласці.

МУШТУКОЎ Анані Акімавіч. Нарадзіўся ў 1894 г. ў в. Слабада Слаўгарадскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1943 г. З 1909 па 1915 працаваў перапісчыкам у валасным праўленні ў в. Доўгі Мох. З 1915 служыў пісарам у вайсковага начальніка ў Быхаве, з 1917 г. служыў у Петраградзе. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі. У лютым 1918 г. пасля дэмабілізацыі вярнуўся на радзіму ў в. Машэцкая Слабада Быхаўскага павета, добраахвотна ўступіў у Прапойску (цяпер Слаўгарад) у валасны ваенны камісарыят і праводзіў мабілізацыю ў Чырвоную Армію. У 1923—1930 гг. працаваў у Быхаўскім райваенкамаце, у 1930—1953 гг. на адказных пасадах у ваенкаматах Казані, Хоцімска, Быхава. З 1953 г. на пенсіі, вёў актыўную работу па ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі. Узнагароджаны ордэнамі Ле-

Быховский районный историко-краеведческий музей

І. К. Пазнякоў.

Г. І. Паўлюкоў.

М. Д. Плотнікаў.

С. С. Самусёў.

ніна (1949), Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр А. А. Муштукоў у 1974 г.

НЕМЦАЎ Пётр Канстанцінавіч. Нарадзіўся ў 1932 г. ў в. Лудчыцы Быхаўскага раёна. З сялян. Член КПСС. Працаваў у калгасе. З 1951 г. ў Чырвонай Арміі. У 1954—1964 гг. трактарыст, брыгадзір трактарнай брыгады калгаса «Беларусь», з 1964 г. трактарыст гэтага калгаса. Быў членам Быхаўскага райкома КПБ. У 1987 г. прэміраваны Выставачным камітэтам ВДНГ СССР. П. К. Немцаў узнагароджаны ордэнам Леніна, ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны». Жыве ў в. Лудчыцы Быхаўскага раёна.

НЕРАДЗЕНКАВА Ніна Іванаўна. Нарадзілася ў 1920 г. ў в. Грудзінаўка Быхаўскага раёна. З служачых. У 1938 г. пачала працаваць настаўніцай у Хачынскай сямігадовай школе. У Вялікую Айчынную вайну ў Чырвонай Арміі на інтэнданцкай службе. Пасля сканчэння у 1946 г. Магілёўскага педінстытута працавала настаўніцай у Магілёве, з 1947 г.— у Чавусах. У 1949 г. Н. І. Нерадзенкава пераехала ў родную вёску, да выхаду на пенсію працавала ў Грудзінаўскай сярэдняй школе. Узнагароджана ордэнам Леніна (1971). Жыве ў в. Грудзінаўка.

ПАЗНЯКОЎ Іван Канстанцінавіч. Нарадзіўся 14.5.1934 г. ў в. Няраж Быхаўскага раёна. З сялян. Пасля сканчэння сямігадовай школы працаваў у калгасе пастухом. З 1953 г. ў Савецкай Арміі. Пасля дэмабілізацыі паступіў у сельскае прафесіянальна-тэхнічнае вучылішча. З 1958 г. працаваў трактарыстам, з 1984 г.— брыгадзірам трактарнай брыгады ў калгасе «Рэвалюцыя». І. К. Пазнякоў узнагароджаны ордэнам Леніна (1981), ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Жыве ў в. Няраж.

ПАЎЛЮКОЎ Гаўрыла Іванавіч. Нарадзіўся 25.3.1904 г. ў в. Гарадзец Быхаўскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1927 г. У 1926 г. быў прызваны ў Чырвоную Армію. Пасля звальнення ў запас працаваў на Матавіліхінскім машынабудаўнічым заводзе ў Свярдлоўскай вобласці, потым вучыўся ў Пермскай савецка-партыйнай школе, быў на партыйнай рабоце. З 1932 г. зноў у Чырвонай Арміі. Пасля сканчэння курсаў палітсаставу займаў пасады палітрука роты, артдывізіёна, сакратара партбюро палка. У Вялікую Айчынную вайну на 2-м Украінскім фронце, намеснік камандзіра знішчальна-супрацьтанкавага палка. Удзельнічаў ва ўзяцці гарадоў Ясы, Унгены, у прарыве абароны праціўніка пад Будапештам і фарсіраванні Дуная, узяцці горада Брно ў Чэхаславакіі. У 1954 г. звольніўся ў запас. Жыў у Быхаве, праводзіў вялікую работу па патрыятычным выхаванні моладзі. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1954), ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I і II ступеней, Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр 13.7.1986 г.

ПІСКУНОВІЧ Павел Іванавіч. Нарадзіўся 3.2.1906 г. ў Гомелі. З рабочых. Член КПСС з 1926 г. Кадравы ваенны, у Чырвонай Арміі з 1928 г. Скончыў школу лётчыкаў у Ленінградзе (1931), курсы старшых авіятэхнікаў (1933). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. П. І. Піскуновіч пасля дэмабілізацыі ў 1954 г. прыехаў на пастаяннае месца жыхарства ў Быхаў. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1957), ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр П. І. Піскуновіч у 1976 г.

ПЛОТНІКАЎ Міхаіл Данілавіч. Нарадзіўся 19.8.1921 г. ў в. Сялец Быхаўскага раёна ў сялянскай сям'і. Член КПСС з 1956 г. Скончыў Гомельскі сельскагаспадарчы тэхнікум, Рагачоўскі настаўніцкі інстытут, Цімірazеўскую сельскагаспадарчую акадэмію, працаваў настаўнікам у Віцебскай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну з кастрычніка 1943 г. М. Д. Плотнікаў — партызан 225-га асобнага атрада Быхаўскай ваенна-аператыўнай групы. З 1944 г. аграном Сялецкай МТС Журавіцкага раёна, з 1952 г. старшыня калгаса «XVIII партз'езд» Быхаўскага раёна. Калгас пад кіраўніцтвам М. Д. Плотнікава стаў адной з перадавых гаспадарак у

Быховский районный историко-краеведческий музей

І. Г. Сафонаў.

Ю. П. Скажанюк.

Н. А. Сліж.

Т. Пз. Солахава.

раёне. Быў выбраны членам Быхаўскага райкома КПБ, дэпутатам Быхаўскага раённага і Магілёўскага абласнога Саветаў народных дэпутатаў. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1966), ордэнам «Знак Пашаны», медалём «За баявыя заслугі». М. Д. Плотнікаў трагічна загінуў у аўтамабільнай катастрофе 27.7.1969 г.

САМУСЁЎ Сямён Сідаравіч. Нарадзіўся ў 1902 г. ў в. Лазаравічы Быхаўскага раёна. З дзесяці гадоў пачаў працаваць у сельскай гаспадарцы. Быў калгаснікам, старшынёй калгасаў, старшынёй сельсавета. Удзельнік савецка-фінляндскай 1939—1940 гг. і Вялікай Айчыннай войнаў. У гады Айчыннай вайны сувязны, палітрук роты 810-га партызанскага палка. У пасляваенны час актыўна ўдзельнічаў у аднаўленні народнай гаспадаркі, працаваў старшынёй калгасаў «Рэвалюцыя», імя Ільіча. У 1959 г. быў выбраны дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1958), медалямі. С. С. Самусёў памёр 25.3.1982 г.

САПЕГІН Іван Максімавіч. Нарадзіўся 23.4. 1923 г. ў с. Махіцкае Краснінскага раёна Смаленскай вобл. ў сялянскай сям'і. Член КПСС з 1951 г. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. На фронце з 1943 г. Пасля дэмабілізацыі працаваў у калгасе на радзіме, а пасля сканчэння ў 1948 г. Гарадоцкага тэхнікума механізацыі сельскай гаспадаркі — механікам, дырэктарам МТС. У 1965 г. скончыў Харкаўскі інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, узначальваў Ульскую і Ветранскую МТС, потым саўгас «Рыдамлькі», упраўленне сельскай гаспадаркі Талачынскага раёна. У 1971—1978 гг. працаваў дырэктарам саўгаса «Вараніно» Быхаўскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1966), ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі, сярэбраным медалём ВДНГ. Памёр І. М. Сапегін 4.12.1985 г.

САФОНАЎ Іван Георгіевіч. Нарадзіўся ў 1903 г. ў в. Трасцівец Быхаўскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1926 г. У 1920 г. скончыў школу 2-й ступені ў Быхаве. З 1922 г. працаваў на шахтах Данбаса. У Чырвонай Арміі з 1925 г. З 1940 г. на выкладчыцкай рабоце ў ваенных навучальных установах. Палкоўнік І. Г. Сафонаў — удзельнік абароны Масквы. У 1956—1961 гг. працаваў інжынерам у войсковай часці ў Рызе. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1951), ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны, Чырвонай Зоркі, медалямі. І. Г. Сафонаў памёр 12.2.1981 г. ў Рызе.

СКАВАРОДКІН Пётр Андрэевіч. Нарадзіўся ў 1927 г. ў в. Навасёлкі Магілёўскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1966 г. З 1945 г. працаваў рабочым у Лупалаўскім лясніцтве Магілёўскага лясгаса, з 1953 г.— машыністам торфаўборачнага камбайна на торфапрадпрыемстве «Дняпроўскае» Быхаўскага раёна. У цяперашні час — трактарыст калгаса імя Ільіча. П. А. Скавародкін узнагароджаны ордэнам Леніна (1966), медалямі. Жыве ў в. Следзюкі.

СКАЖАНЮК Юлій Паўлавіч. Нарадзіўся ў 1897 г. ў в. Загорцы Плужнянскага раёна Хмяльніцкай вобласці. Член КПСС. У лістападзе 1917 г. ў Петраградзе, чырвонагвардзеец Першага Паўночнага атрада (пазней перафарміраваны ў полк імя Сцяпана Разіна), прайшоў баявымі дарогамі Урал, ваяваў з белагвардзейцамі ў Казахстане і на Алтаі. Пасля грамадзянскай вайны 30 гадоў служыў у Чырвонай Арміі. У Вялікую Айчынную вайну на фронце. Камандаваў танкавым палком. Пасля вайны — намеснік камандзіра танкавай брыгады. Дэмабілізаваўшыся з арміі ў 1947 г., палкоўнік у адстаўцы Ю. П. Скажанюк прыехаў на пастаяннае жыхарства ў Быхаў, вёў выхаваўчую работу сярод моладзі. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр Ю. П. Скажанюк у 1969 г.

СЛІЖ Ніна Аляксандраўна. Нарадзілася ў 1896 г. ў Вільнюсе. З служачых. У 1912 г. скончыла гімназію ў Вільнюсе. Працавала настаўніцай у Духаўшчынскім і Дарагабужскім паветах Смаленскай губерні. З 1918 г. выкладала ў школах

Быховский районный историко-краеведческий музей

А. В. Ставянкоў.

І. І. Стасін.

Слаўгарадскага раёна, у 1939—1941 гг. у Быхаве, у 1941 г. завочна скончыла пединстытут. У гады вайны Н. А. Сліж працавала ў савецкім тыле, з 1945 г. працягвала работу ў школах Быхава. З 1955 г. на пенсіі. Узнагароджана ордэнам Леніна (1948). Памерла Н. А. Сліж 5.10.1970 г.

СМАЛЯНКОВА Марыя Цімафееўна. Нарадзілася ў 1922 г. ў в. Усходняя Быхаўскага раёна ў сялянскай сям'і. У 1939—1941 гг. вучылася ў Ейскай сельскагаспадарчай школе. У 1942 г. пасля сканчэння курсаў трактарыстаў пры Ейскім зернесаўгасе працавала ў гэтым саўгасе.

З 1949 г. была трактарысткай, брыгадзірам у Быхаўскай і Балонавасялецкай МТС, потым у саўгасах «Быхаўскі» і «Усход». У 1951 г. М. Ц. Смалянкова выбрана дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, у 1976— членам Рэвізійнай камісіі Кампартыі Беларусі. Узнагароджана ордэнам Леніна (1976), ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, медалямі. М. Ц. Смалянкова жыве ў в. Усходняя.

СМОЛКІНА Марыя Беркаўна. Нарадзілася 20.4.1920 г. ў в. Журавічы Рагачоўскага раёна. З рабочых. Член КПСС з 1951 г. Перад вайной скончыла 3 курсы Віцебскага ветэрынарнага інстытута. У гады Вялікай Айчыннай вайны працавала ў савецкім тыле. Пасля вызвалення Журавіцкага раёна працавала ў райземаддзеле ветэрынарным урачом. У 1957—1984 гг.— старшыня калгаса «Іскра» Быхаўскага раёна. М. Б. Смолкіна выбіралася членам Быхаўскага РК КПБ, дэпутатам раённага Савета народных дэпутатаў. Узнагароджана ордэнам Леніна (1973), ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга. На пенсіі. Жыве ў Магілёве.

СОЛАХАВА Таццяна Дзмітрыеўна. Нарадзілася ў 1938 г. ў в. Абідавічы Быхаўскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1960 г. З 1957 г., пасля сканчэння Жыліцкага сельскагаспадарчага тэхнікума, працавала аграномам калгаса, потым рабочай саўгаса ў Чэрыкаўскім раёне. У 1960 г. пераехала на Быхаўшчыну і працавала ў калгасе «XVIII партз'езд» кладаўшчыком, брыгадзірам комплекснай брыгады, з 1971 г. працуе начальнікам вытворчага ўчастка. У 1975 г. была выбрана дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Узнагароджана ордэнам Леніна (1975), ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, медалём. Жыве ў пасёлку Дружба Быхаўскага раёна.

СТАВЯНКОЎ Анатоль Васілевіч. Нарадзіўся 3.12.1896 г. ў в. Касічы Быхаўскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1932 г. З 1915 г. ў царскай арміі, удзельнік 1-й сусветнай вайны, за храбрасць быў узнагароджаны Георгіеўскім крыжам і медалём. З лістапада 1917 г. ў Чырвонай гвардыі, потым у Чырвонай Арміі, намеснік камандзіра партызанскага атрада, памочнік і камандзір кавалерыйскага эскадрона, памочнік камандзіра кавалерыйскага палка. Удзельнічаў у баях на Паўднёвым, Усходнім і Заходнім франтах, разгроме бандаў Антонава і Бакунчоў. За гераізм, праяўлены ў гады грамадзянскай вайны, узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонага Сцяга. У 1924 г. А. В. Ставянкоў скончыў курсы камсаставу, у 1940 г.— курсы ўдасканалення пры Акадэміі Генштаба. У Вялікую Айчынную вайну камандзір кавалерыйскай дывізіі, намеснік камандзіра кавалерыйскага корпуса на Заходнім, Сталінградскім, Паўднёва-Заходнім, Цэнтральным і 1-м Беларускім франтах. Пасля вайны генерал-маёр А. В. Ставянкоў на адказных пасадах ва Узброеных Сілах СССР, з 1957 г. ў запасе. Узнагароджаны 3 ордэнамі Леніна, 3 ордэнамі Чырвонага Сцяга, 3 іншымі ордэнамі, медалямі, ордэнамі ПНР. Памёр А. В. Ставянкоў 8.5.1968 г., пахаваны на Новадзявочых могілках у Маскве.

СТАСІН Іван Іванавіч. Нарадзіўся ў 1921 г. ў в. Дунаёк Быхаўскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1945 г. Працоўную дзейнасць пачаў у 1939 г. рабочым на Макееўскім хімічным заводзе. У Чырвонай Арміі з 1940 г. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Ваяваў на Заходнім, Калінінскім, Варонежскім, 1-м, 2-м, 4-м Украінскіх франтах. З 1946 г. працаваў памочнікам машыніста Сулінскага рудаўпраўлення ў Растоўскай вобласці. У 1948 г. І. І. Стасін прыехаў на пастаяннае жыхарства на Быхаўшчыну, працаваў у калгасе «Чырвоны гай». У 1951—1971 гг. рабочы, тэхнік транспарту, машыніст матавоза, трактарыст, майстар участка па здабычы торфу на торфапрадпрыемстве «Чырвоная Беларусь». Узнагароджаны ордэнам Леніна (1971), двума ордэнамі Айчыннай вайны, медалямі. І. І. Стасін на пенсіі, жыве ў пасёлку Чырвоная Беларусь.

ЦЮТНЕЎ Іван Сцяпанавіч. Нарадзіўся 12.1.1903 г. ў с. Дуброўскае Лябяжаўскага раёна Курганскай вобласці. З сялян. Член КПСС з 1942 г. Працоўную дзейнасць пачаў з 1916 г. У Чырвонай Арміі з 1925 г. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. У Вялікую Айчынную вайну з першых дзён на фронце. Дэмабілізаваўся ў 1954 г. Жыў у Быхаве. Узна-

Быховский районный историко-краеведческий музей

А. В. Чаркашын.

гароджаны ордэнам Леніна (1951), ордэнам Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. І. С. Цютнеў памёр 20.1.1974 г.

ЧАРКАШЫН Аркадзь Васілевіч. Нарадзіўся ў 1922 г. ў в. Міхайлаўка Цюпскага раёна Кіргізскай ССР у сям'і рабочых. Член КПСС з 1945 г. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1942 г. скончыў Ташкенцкае авіяцыйнае вучылішча. З 1943 г. ў дзеючай арміі — штурман звяна авіяцыйнага бамбардзіровачнага палка. Удзельнічаў у многіх баях, у тым ліку ў бамбардзіроўках Берліна. Працягваў службу ў арміі да 1959 г. Пасля дэмабілізацыі А. В. Чаркашын працаваў у народнай гаспадарцы ў Быхаве. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1957), трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр А. В. Чаркашын 29.3.1987 г.

ШЫНЯЛЁЎ Аляксандр Нічыпаравіч. Нарадзіўся ў 1929 г. ў в. Смолина Быхаўскага раёна. З рабочых. Пасля вайны працаваў трактарыстам у калгасе. З 1978 г. брыгадзір трактарнай брыгады калгаса «Беларусь». А. Н. Шынялёў быў дэпутатам сельскага Савета народных дэпутатаў. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1972), ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Жыве ў в. Лудчыны Быхаўскага раёна.

Са званнем «Заслужаны...»

За выдатныя працоўныя поспехі ў розных галінах народнай гаспадаркі і культуры больш як 30 прадстаўнікам Быхаўшчыны прысвоены ганаровыя званні Беларускай ССР.

Заслужаны аграном Беларускай ССР — КАНЭЛЬСКАЯ Ганна Сямёнаўна (1966, аграном калгаса «Беларусь»)[1].

Заслужаныя будаўнікі Беларускай ССР: ГАРАШЧУК Юлія Конанаўна (1969, брыгадзір тынкоўшчыкаў ПМК № 20); **ЧОРСТВЫ Ілья Пятровіч** (1979, брыгадзір МПМК № 107).

Заслужаны меліяратар Беларускай ССР — БУТАНАЎ Канстанцін Яфрэмавіч (1978, брыгадзір ПМК № 9, ПМК № 85).

Заслужаны механізатар Беларускай ССР — ЯЎЦІХІН Іван Іванавіч (1968, кіраўнік Дняпроўскага аддзялення Сельгастэхнікі).

Заслужаныя настаўнікі Беларускай ССР: АРЛОЎСКАЯ Ніна Іванаўна (1975, настаўніца СШ № 1 г. Быхава); **ВІЛЬТОЎСКАЯ Ніна Львоўна** (1960, настаўніца СШ № 2 г. Быхава); **ГАЛІНОЎСКІ Іван Кірылавіч** (1959, дырэктар СШ № 2, настаўнік СШ № 3 г. Быхава); **ГОНТАРАВА Ганна Архіпаўна** (1973, настаўніца Ветранскай СШ); **ГРЫЦАЎ Аляксей Максімавіч** (1977, дырэктар Холстаўскай васьмігадовай школы); **ДЗЕВІШАВА Дзіляра Харысаўна** (1968, дырэктар СШ № 1 г. Быхава); **КАМАРОВА Настасся Аляксееўна** (1957, настаўніца СШ № 1 г. Быхава); **КРАВЕЦ Марыя Андрэеўна** (1968, загадчыца дзіцячага сада кансервава-агароднінасушыльнага завода); **КРАСНІЦКАЯ Марыя Фёдараўна** (1971, загадчыца метадычнага кабінета РАНА); **ЛІСАЎ Анатоль Пятровіч** (1978, загадчык РАНА, дырэктар СШ № 1 г. Быхава); **ЛУГАЎЦОВА Марыя Гаўрылаўна** (1980, настаўніца СШ № 4 г. Быхава); **ЛЫСУХА Надзея Пракопаўна** (1968, настаўніца СШ № 2, Быхава); **ЛЫЧОВА Наталля Цімафееўна** (1974, загадчыца Залахвянскай пачатковай школы); **МАКЕЕЎ Рыгор Лявонцьевіч** (1966, настаўнік СШ № 2 г. Быхава); **НАВУМЕНКА Вера Уладзіміраўна** (1964, завуч СШ № 1 г. Быхава); **ПАБОРЦАВА Таісія Раманаўна** (1970, настаўніца Макранскай СШ); **РАЕНТАВА Надзея Пятроўна** (1972, настаўніца Сушчоўскай васьмігадовай школы); **СЛІЖ Уладзімір Сямёнавіч** (1955, настаўнік СШ № 2 г. Быхава); **ТАМАШЭВІЧ Таццяна Паўлаўна** (1967); **ШЧАРБІНА Алена Авакумаўна** (1968, настаўніца Перакладавіцкай пачатковай школы).

Заслужаны работнік бытавога абслугоўвання насельніцтва Беларускай ССР — БАРАНЧУК Ганна Уласаўна (1970, швачка райбыткамбіната).

Заслужаны работнік гандлю Беларускай ССР — САПЯЖЫНСКАЯ Клара Іванаўна (1971, супрацоўніца Быхаўскага райспажыўсаюза).

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР — БАРЫСАЎ Георгій Ера-

[1] У дужках даецца год прысвоення звання, пасада і месца працы ўзнагароджанага на той час.

Быховский районный историко-краеведческий музей

меевіч (1974, рэдактар раённай газеты «Маяк Прыдняпроўя»).

Заслужаны работнік прамысловасці Беларускай ССР — АЗЯРНЫ Сяргей Фёдаравіч (1970, газаэлектразваршчык агароднінасушыльнага завода).

Заслужаны работнік сацыяльнага забеспячэння Беларускай ССР — КАРБОЎСКІ Іван Паўлавіч (1981, дырэктар Быхаўскага дома-інтэрната).

Заслужаны ўрач Беларускай ССР — КУГЕЛЬ Калман Шмеркавіч (1966, галоўны ўрач Рыжкаўскай сельскай бальніцы).

Заслужаны эканаміст Беларускай ССР — КОРЗА Леанід Мікалаевіч (1971, кіраўнік Быхаўскага аддзялення Дзяржбанка СССР).

ЕМЯЛЬЯН КЛІМЕНЦЬЕВІЧ АЗАРАНКА

Беларускі савецкі філосаф, доктар філасофскіх навук (1962), прафесар (1962). Нарадзіўся ў 1908 г. ў в. Узнікі (цяпер Чырвоная Слабада) Быхаўскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1940 г. Пасля сканчэння ў 1929 г. Магілёўскага педагагічнага тэхнікума настаўнічаў у 1920—1932 гг. на Віцебшчыне. У 1938 г. скончыў Ленінградскі універсітэт. З 1938 г. працаваў намеснікам дырэктара Арлоўскага педагагічнага і настаўніцкага інстытута, дырэктарам Чарапавецкага настаўніцкага інстытута Валагодскай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну ў 1941—1942 гг. камандзір роты на абарончых умацаваннях на чыгунцы Волагда — Масква, з 1944 г. ў распараджэнні ЦК КП(б)Б, да 1950 г. працаваў у апараце ЦК КП(б)Б. У 1950—1954 гг. прарэктар БДУ імя У. І. Леніна. З 1957 г. загадчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі Мінскага медыцынскага інстытута. З 1976 г. на пенсіі. Аўтар кнігі «Светапогляд М. В. Ламаносава» (1959), апублікаваў больш як 60 навуковых прац. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалямі. Памёр Е. К. Азаранка 22 лютага 1988 г.

АЛЯКСАНДР АЛЯКСАНДРАВІЧ ВАВІЛАЎ

Савецкі вучоны ў галіне аўтаматыкі і працэсаў кіравання, доктар тэхнічных навук, член-карэспандэнт АН СССР. Нарадзіўся ў 1921 г. на Смаленшчыне. Член КПСС з 1943 г. У пачатку 1930-х гадоў бацькі Вавілава пераехалі на жыхарства ў Быхаў, тут ён вучыўся ў СШ № 2. У 1939 г., будучы вучнем 9-га класа, здаў экстэрнам экзамены за 10-ы клас і паступіў у Ленінградскі электратэхнічны інстытут імя У. І. Ульянава (Леніна). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, служыў у радыёвойсках. У 1951 г. скончыў Ленінградскі электратэхнічны інстытут (ЛЭТІ), пазней узначальваў кафедру аўтаматыкі і працэсаў кіравання ў інстытуце, у 1968—1983 гг. быў рэктарам гэтага інстытута. Напісаў і выдаў больш за 200



А. А. Вавілаў.

навуковых работ. Асноўная сфера навуковай дзейнасці А. А. Вавілава — праблемы тэорыі і практыкі аўтаматыкі і працэсаў кіравання. А. А. Вавілаў быў дэлегатам XXV з'езда КПСС, неаднаразова выбіраўся членам Ленінградскага абкома КПСС, дэпутатам Ленінградскага гарадскога Савета народных дэпутатаў, быў старшынёй савета ректараў ленінградскіх ВНУ, членам Вышэйшай атэстацыйнай камісіі. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Памёр А. А. Вавілаў 12 кастрычніка 1983 г.

АРКАДЗЬ САМСОНАВІЧ ЕРУСАЛІМСКІ

Савецкі гісторык, доктар гістарычных навук (1948). Нарадзіўся 1 чэрвеня 1901 г. ў в. Новы Быхаў Быхаўскага раёна. Член КПСС з 1938 г. У 1923 г. скончыў 1-ы Маскоўскі універсітэт. У 1925—1945 гг. старшы навуковы супрацоўнік Інстытута сусветнай гаспадаркі і сусветнай палітыкі АН СССР, адначасова прафесар Інстытута чырвонай прафесуры ў 1930—1932 гг., у 1939—1941 гг. прафесар, загадчык кафедры Вышэйшай дыпламатычнай школы пры НКЗС СССР. У Вялікую Айчынную вайну начальнік замежнага аддзела газеты «Красная звезда». У 1944—1956 гг. выкладчык, прафесар Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. В. Ламаносава, у 1945—1965 гг. старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН СССР, быў старшынёй групы па вывучэнню гісторыі Германіі пры Інстытуце гісторыі АН СССР. У 1956—1962 гг. узначальваў Камісію гісторыкаў СССР — ГДР, садзейнічаў цеснаму супрацоўніцтву вучоных дзвюх краін. А. С. Ерусалімскі быў буйным спецыялістам па гісторыі Германіі. Прызнаннем заслуг у гэтай галіне стала выбранне яго ў 1956 г. членам-карэспандэнтам Акадэміі навук ГДР. Аўтар кніг «Германія, Антанта і СССР» (1928), «Знешняя палітыка і дыпламатыя германскага імперыялізму ў канцы XIX стагоддзя» (1948, 1951), «Германскі імперыялізм: гісторыя і сучаснасць» (1964),

Быховский районный историко-краеведческий музей

«Бісмарк. Дыпламатыя і мілітарызм» (1968) і інш., у якіх паслядоўна выкрываў агрэсіўную сутнасць германскага імперыялізму і мілітарызму. Шэраг работ А. С. Ерусалімскі прысвяціў германскаму пытанню і іншым праблемам міжнароднай палітыкі навейшага часу. Кароткі агляд асабістага фонду А. С. Ерусалімскага апублікаваны ў 8-м томе інфармацыйна-даведачнага выдання «Архіў Акадэміі навук СССР. Агляд архіўных матэрыялаў» (выдавецтва «Навука», Ленінградскае аддзяленне, 1986 г.). Вялікі раздзел у фондзе — перапіска А. С. Ерусалімскага з савецкімі гісторыкамі Н. М. Дружыніным, М. В. Нечкінай, Е. В. Тарле, А. М. Панкратавай, І. М. Майскім, з замежнымі вучонымі і палітычнымі дзеячамі В. Ульбрыхтам, Л. Больцам, В. Бартэлем і інш. За кнігу «Знешняя палітыка і дыпламатыя германскага імперыялізму ў канцы XIX стагоддзя» прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР 1950 г. Памёр А. С. Ерусалімскі 30 лістапада 1965 г.

АЛЯКСЕЙ ФЯДОСАВІЧ ІВАНОЎ

Беларускі савецкі дэндролаг, доктар біялагічных навук (1968). Нарадзіўся ў 1913 г. ў в. Чачэвічы Быхаўскага раёна. Член КПСС з 1945 г. Скончыў Беларускі лесатэхнічны інстытут (1938). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1946—1948 гг. дырэктар Ваўкавыскага лясгаса. З 1948 г. ў АН БССР. У 1969—1975 гг. загадчык аддзела дрэўных раслін Інстытута эксперыментальнай батанікі АН БССР. А. Ф. Іваноў — аўтар прац па біялогіі і інтрадукцыі дрэўных раслін на Беларусі, адзін з складальнікаў выдання «Інтрадукаваныя дрэвы і кусты ў Беларускай ССР» (вып. 1—3, 1959—61, адзін з аўтараў кніг «Адносіны дрэўных раслін да вільготнасці і кіслотнасці глебы» (1966, разам з А. У. Панамаровай, Т. Ф. Дзяругінай), «Біялогія дрэўных раслін» (1975). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР 1976 г. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр А. Ф. Іваноў 30 верасня 1976 г.

КАНСТАНЦІН ІЎЛІЯНАВІЧ ЛУКАШОЎ

Беларускі савецкі геолаг і геахімік, акадэмік АН БССР (1953), доктар геолага-мінералагічных навук (1937), прафесар (1938), заслужаны дзеяч навукі БССР (1967), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР. Нарадзіўся ў 1907 г. ў в. Гарадзец Быхаўскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1927 г. Скончыў Ленінградскі універсітэт (1931). У 1925—1927 гг. працаваў сакратаром камітэта сялянскіх таварыстваў узаемадапамогі, загадчыкам клуба шклозавода «Ільіч». У 1927 г. па пуцёўцы камсамола накіраваны на вучобу ў Ленінградскі дзяржаўны універсітэт. Студэнтам удзельнічаў у рабоце Усесаюзнага з'езда глебазнаўцаў, дзе выбіраўся членам аргкамітэта па падрыхтоўцы Міжнароднага кангрэса. З 1931 г. загадчык кафедры грунтазнаўства, дэкан глебава-геалагічнага факультэта ў 1938—1939 гг., рэктар Ленінградскага універсітэта. У 1939—1944 гг. працаваў у Наркамаце замежнага гандлю СССР, з 1944 прафесар, загадчык кафедры эканамічнай геаграфіі Інстытута знешняга гандлю СССР, кафедры фізічнай геаграфіі замежных краін Маскоўскага універсітэта. У 1953—1956 гг. рэктар БДУ імя У. І. Леніна, у 1956—1969 гг. віцэ-прэзідэнт АН БССР, адначасова ў 1963—1970 гг. загадчык лабараторыі геахімічных праблем АН БССР, у 1971—1977 гг. дырэктар, з 1975 г. адначасова загадчык лабараторыі геахіміі тэхнагенезу Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР. К. І. Лукашоў — заснавальнік генетычнага кірунку ў грунтазнаўстве і беларускай геахімічнай школы. Ён зрабіў вялікі ўклад у вывучэнне кары выветрывання, геалогіі і палеагеаграфіі, літалогіі і геахіміі зоны гіпергенезу і антрапагену, фізічнай і эканамічнай геаграфіі, у пошукі карысных выкапняў, а таксама ў распрацоўку геахімічных аспектаў тэхнагенезу, аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага прыродакарыстання. Яго працы садзейнічалі адкрыццю радовішчаў нафты, комплекснаму выкарыстанню прыродных рэсурсаў. За адкрыццё і разведку нафты ў рэспубліцы ўдастоены Дзяржаўнай прэміі БССР 1972 г. Ён — аўтар навуковых прац: «Грунты СССР» (1939), «Асновы літалогіі і геахіміі кары выветрывання» (1958), «Генетычныя тыпы і фацыі антрапагенавых адкладаў» (1960), «Нарысы па геахіміі гіпергенезу» (1963), «Геалогія чацвярцічнага перыяду» (1971), «Уводзіны ў палеагеахімію зямной кары» (1974), «Геахімічнае вывучэнне зямной кары» (1977, разам з У. А. Кузняцовым, В. К. Лукашовым) і інш. К. І. Лукашоў вёў вялікую грамадскую работу. Ён быў членам ЦК КПБ у 1954—1959 гг., членам Рэвізійнай камісіі КПБ у 1960—1961 гг., дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР у 1952—1967 гг., членам Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР у 1963—1967 гг. Узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонага

К. І. Лукашоў.

М. Г. Мушынскі.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Сцяга, ордэнам Дружбы народаў, медалямі, Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Памёр К. І. Лукашоў 23 мая 1987 г.

АРКАДЗЬ АЛЯКСЕЕВІЧ МАЦВЕЕЎ

Беларускі савецкі вучоны, доктар медыцынскіх навук (1975). Нарадзіўся ў 1932 г. ў Быхаве. Член КПСС з 1983 г. Скончыў Віцебскі медыцынскі інстытут у 1956 г. Працаваў галоўным урачом Віцебскай раённай санэпідстанцыі, потым намеснікам галоўнага ўрача Віцебскага раёна па лячэбнай рабоце. З 1957 г. па сумяшчэнню асістэнт кафедры інфекцыйных хвароб Віцебскага мединстытута, з 1960 у аспірантуры, у 1963—1971 гг. асістэнт, з 1971 г. дацэнт гэтай кафедры, з 1979 г. прафесар. З 1985 г. дэкан факультэта ўдасканалення ўрачоў пры Віцебскім медыцынскім інстытуце. Асноўная тэма навуковых даследаванняў А. А. Мацвеева — вірусныя гепатыты, вельмі пашыраныя інфекцыйныя захворванні, пры якіх пашкоджваецца печань. Распрацаваныя пад кіраўніцтвам А. А. Мацвеева методыкі лячэння віруснага гепатыту атрымалі шырокае распаўсюджанне ва ўрачэбнай практыцы ў рэспубліцы. Апублікаваў больш за 70 навуковых прац; разам з калектывам кафедры праводзіць даследаванні па імуналогіі гепатытаў, прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. Пад яго кіраўніцтвам падрыхтаваны 4 кандыдаты навук, 2 з іх сталі лаўрэатамі прэміі Ленінскага камсамола Беларусі.

МІХАІЛ ІОСІФАВІЧ МУШЫНСКІ

Беларускі савецкі крытык і літаратуразнавец, тэкстолаг, доктар філалагічных навук (1978). Нарадзіўся ў 1931 г. ў в. Мокрая Быхаўскага раёна. Член КПСС з 1976 г. Скончыў БДУ імя У. І. Леніна (1955). У 1955—1956 гг. працаваў у выдавецтве БДУ імя У. І. Леніна. З 1956 г. навуковы супрацоўнік, з 1979 г. загадчык сектара тэксталогіі і выданняў Інстытута літаратуры АН БССР. Член Саюза пісьменнікаў БССР (з 1973). Друкуецца з 1957 г. Даследуе жыццё і творчасць Я. Коласа, тэарэтычныя і метадалагічныя аспекты станаўлення беларускай крытыкі і літаратуразнаўства, праблемы практычнай тэксталогіі. М. І. Мушынскі — адзін з аўтараў кніг «Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (т. 2, 1969), «Беларуская савецкая проза. Раман і аповесць» (1971), «Шляхі развіцця беларускай савецкай прозы» (1972, разам з В. А. Каваленкам, А. С. Яскевічам) і інш. Апублікаваў больш за 100 работ у навуковым, перыядычным друку, у т. л. шэраг буйных манаграфій. Аўтар кніг «Ад задумы да здзяйснення» (1965), «Беларуская крытыка і літаратуразнаўства. 20—30-я гады» (1975, адзначана медалём галоўнага камітэта ВДНГ СССР у 1977 г.), «Беларускае савецкае літаратуразнаўства» (1979), «Якуб Колас: Летапіс жыцця і творчасці» (1982), «Беларуская крытыка і літаратуразнаўства. 40-я — першая палавіна 60-х гг.» (1985), «Літаратура і ідэалагічная барацьба» (1987). У 1971 г. за поспехі ў навукова-даследнай рабоце ўзнагароджаны медалём «За працоўную доблесць». У 1980 г. за ўдзел у 2-томным даследаванні «Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры» і «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры» (1977, на рус. мове) прысуджана Дзяржаўная прэмія імя Я. Коласа.

ДАСІФЕЙ ІВАНАВІЧ НАДТАЧАЕЎ

Савецкі вучоны, гісторык. Нарадзіўся ў 1912 г. ў в. Чырвоная Слабада (раней в. Узнікі) Быхаўскага раёна. З сялян. Член КПСС з 1940 г. У 1935 г. скончыў Магілёўскі палітыка-асветны інстытут, у 1938 г.— аспірантуру пры Маскоўскім дзяржаўным педінстытуце імя У. І. Леніна. З 1930 г. працаваў у рэдакцыі раённай газеты ў Быхаве. З 1938 г. асістэнт кафедры гісторыі СССР, з 1939 г. дацэнт Маскоўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя У. І. Леніна. У 1940—1943 гг. у Чырвонай Арміі: чырвонаармеец 607-га стралковага палка 185-й стралковай дывізіі МВА, палітрук узвода аховы, старшы інструктар палітаддзела Ваенна-юрыдычнай акадэміі. У 1943—1945 гг. старшы выкладчык кафедры марксізма-ленінізма гэтай акадэміі. У 1945—1948 гг. намеснік загадчыка сектара Інстытута Маркса — Энгельса — Леніна пры ЦК ВКП(б). З 1948 г. выкладчык кафедры гісторыі партыі, з 1949 г. намеснік рэктара Акадэміі грамадскіх навук, з 1950 г. рэктар Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС. У 1955—1958 гг. загадчык кафедры гісторыі КПСС Маскоўскага універсітэта імя М. В. Ламаносава, у 1958—1961 гг. дырэктар выдавецтва сацыяльна-эканамічнай літаратуры, у 1961—1964 гг. прафесар Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС. У 1964—1976 гг. загадчык кафедры марксізма-ленінізма Маскоўскага дзяржаўнага гісторыка-архіўнага інстытута. З 1976 г. на пенсіі. Жыў у Маскве. Памёр Д. І. Надтачаеў у маі 1984 г.

БАРЫС ВАСІЛЕВІЧ СТРАЛЬЦОЎ

Беларускі савецкі літаратуразнавец, публіцыст, пісьменнік, доктар філалагічных навук (1978), прафесар (1979). Нарадзіўся ў 1926 г. ў в. Хутар Быхаўскага раёна. Член КПСС з 1963 г. Скончыў БДУ імя У. І. Леніна (1956). У 1953—1969 гг. працаваў у газетах «Чырвоная змена» і «Звязда», з 1969 г. загадчык кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі БДУ. Даследуе жанры сучаснай публіцыстыкі, аўтар манаграфіі «Газета і мараль» (1971), кніг «Публіцыстычнасць інфармацыйных жанраў» (1973), «Аналітычныя жанры: Пытанні тэорыі і практыкі» (1974), «Публіцыстыка: Жанры. Майстэрства» (1977),

Быховский районный историко-краеведческий музей

«Фельетон: Тэорыя і практыка жанру» (1983). Навуковыя працы Б. В. Стральцова вядомы ў нашай краіне і за мяжой. Яго манаграфія «Беларусь» выдадзена ЮНЕСКА на англійскай, нямецкай, французскай і іспанскай мовах. Б. В. Стральцоў піша і мастацкія творы, асноўная тэматыка якіх — сучаснае жыццё грамадства: раман «Між крутых берагоў» (1980), аповесць «Вячэрняя планета» (1975), зборнікі апавяданняў «Сыходзяцца бальшакі і прасёлкі» (1969), «Наследнік» (1963), нарысаў «Дружная рунь» (1962, з Э. І. Чэчкай) і інш. Жыве ў Мінску.

АНДРЭЙ ІВАНАВІЧ ЦЁМКІН

Дзяржаўны дзеяч БССР. Нарадзіўся ў 1902 г. ў в. Ветранка Быхаўскага раёна. Член КПСС з 1924 г. Удзельнік грамадзянскай, Вялікай Айчыннай войнаў. Скончыў Інстытут чырвонай прафесуры (1932). З 1922 г. на савецкай і партыйнай рабоце. З 1932 г. на палітрабоце ў Чырвонай Арміі, з 1935 г. ў Аб'яднанай Беларускай ваеннай школе. У 1937—1938 гг. першы намеснік Старшыні СНК БССР. З 1938 г. старшыня Мінскага аблвыканкома. У 1941—1946 гг. у Чырвонай Арміі, з 1946 г. начальнік Упраўлення па справах сельскага і калгаснага будаўніцтва пры Савеце Міністраў БССР, з 1950 г. намеснік міністра камунальнай гаспадаркі БССР, у 1958—1959 гг. намеснік начальніка Галоўнага ўпраўлення матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння пры Савеце Міністраў БССР. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1947—1951 гг. Памёр А. І. Цёмкін 3 студзеня 1981 г.

Ганаровыя грамадзяне Быхава

Сярод ганаровых грамадзян Быхава Е. Ц. Андрэенкаў, М. Дз. Грыцан, С. У. Грышын, П. І. Звяздаеў, М. І. Масквін, І. Т. Мацяш, Ф. П. Падалян, І. А. Стралкоў, М. Умурдзінаў, успаміны і біяграфіі якіх змешчаны ў ваенным раздзеле кнігі. Ніжэй прыведзены звесткі пра іншых ганаровых грамадзян Быхава.

ЕНШЫН Міхаіл Аляксандравіч. Герой Савецкага Саюза (6.4.1945). Нарадзіўся 3.12.1900 г. ў Смаленску. Член КПСС з 1927 г. З снежня 1917 г. ў Чырвонай гвардыі, удзельнік грамадзянскай вайны. Скончыў сярэднюю ваенную навучальную ўстанову, Вышэйшую паграншколу НКУС, курсы камандзіраў дывізій пры Ваеннай акадэміі імя Фрунзе. У 1923—1941 гг. служыў у пагранічных войсках, удзельнічаў у ліквідацыі басмацтва, савецка-фінляндскай вайне 1939—1940 гг. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны на фронце. 28.6.1941 г. 362-я стралковая дывізія пад камандаваннем М. А. Еншына вызваліла Быхаў. Пасля вайны генерал-лейтэнант М. А. Еншын жыў у Маскве. Памёр у 1984 г.

КАНАВАЛАЎ Васіль Андрэевіч. Нарадзіўся ў 1910 г. ў Курскай вобласці. З сялян. Кадравы ваенны. Скончыў Ваенную акадэмію імя Фрунзе. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны на фронце, камандзір стралковага палка, маёр. У лістападзе 1943 г. 283-я стралковая дывізія пад камандаваннем В. А. Канавалава ўступіла на Быхаўскую зямлю, у лістападзе 1943 — чэрвені 1944 г. вяла абарончыя і наступальныя баі на тэрыторыі раёна. Генерал-маёр В. А. Канавалаў жыве ў Маскве.

КАЧУР Пётр Васілевіч. Нарадзіўся ў 1913 г. ў в. Любаміраўка Бярэзнегавацкага раёна Нікалаеўскай вобласці. З сялян. З 1936 г. ў Чырвонай Арміі, кадравы ваенны. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны на фронце, удзельнік Сталінградскай бітвы, са снежня 1942 г.— камандзір 556-га стралковага палка 169-й стралковай дывізіі. У час аперацыі «Багратыён» 556-ы полк у ноч з 23 на 24 чэрвеня 1944 г. ў раёне в. Лудчыцы Быхаўскага раёна на сутыку двух франтоў здзейсніў удар з мэтай адцягнення сілы і тэхнікі праціўніка. Вышыня была ўзята і ўтрымана (гл. артыкул *«Вышыня герояў»*). Пасля вайны П. В. Качур працягваў службу ў Савецкай Арміі. Палкоўнік ў адстаўцы П. В. Качур жыве ў Краснадары.

ХІЖНЯК Іван Лукіч. Нарадзіўся ў 1893 г. ў г. Ейску Краснадарскага краю. Член КПСС з 1917. З лістапада 1917 г. ў Чырвонай гвардыі. Кадравы ваенны. З першых дзён вайны на фронце — намеснік камандзіра 167-й стралковай дывізіі, камандзір 117-й стралковай дывізіі, палкоўнік. У ліпені — пачатку жніўня 1941 г. часці 117-й стралковай дывізіі ўдзельнічалі ў абарончых баях на тэрыторыі Быхаўскага раёна. У час вайны генерал-лейтэнант І. Л. Хіжняк камандаваў 11-м стралковым корпусам. Узнагароджаны 6 ордэнамі, медалямі. Жыў у Маскве. Памёр І. Л. Хіжняк у 1984 г.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Воіны Савецкай Арміі — ураджэнцы Быхаўшчыны, якія загінулі ў Афганістане

Л. В. Буглак.

А. А. Грыгор'еў.

С. В. Корабаў.



М. Ц. Маскалькоў.

БУГЛАК Леанід Віктаравіч, нарадзіўся 22.8.1962 г. ў Магілёве. У 1978 г. скончыў 9 класаў сярэдняй школы № 26 г. Магілёва, у 1982 г.— Магілёўскі політэхнічны тэхнікум. У Савецкую Армію прызваны ў сакавіку 1982 г., з чэрвеня гэтага года служыў у г. Кундуз (Афганістан). Радавы Л. В. Булгак загінуў 22.7.1982 г. Пахаваны ў в. Кучын Быхаўскага раёна на радзіме бацькоў. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа».

ГРЫГОР'ЕЎ Аляксандр Аляксандравіч, нарадзіўся 10.4.1961 г. ў в. Грудзічына Быхаўскага раёна ў сям'і рабочых саўгаса. Член ВЛКСМ. У 1977 г. скончыў 8 класаў Чыгірынскай сярэдняй школы, у сакавіку 1979 г.— Магілёўскае ПТВ № 44. Працаваў слесарам-рамонтнікам, тэхнікам на швейнай фабрыцы імя Баладарскага ў Магілёве. У Савецкай Арміі з 1980 г. Загінуў 21.4.1982 г., пахаваны ў в. Прарочнае Быхаўскага раёна, на магіле пастаўлены помнік. А. А. Грыгор'еў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

І. Я. Міцькоў.

З пісьма А. А. Грыгор'ева сваім родным.

Привет из ДРА!

Здравствуйте, дорогие родные папа, мама, бабушка, сестренка и братишки. Письмо ваше получил и даю ответ. Служба проходит нормально, но медленно, сейчас на операции никуда не ходим. У нас уже тоже весна, тепло, но в горах снег еще долго лежать будет. Нас пока не тревожат, хотя по данным, которые нам доводят, их (душманов) здесь много и они, наверное, ждут весну. Зимой некоторые банды переодевались в нашу форму и производили налеты на кишлаки или на дорогах останавливали машины и издевались, кто там был в машине — как всегда были простые дехкане (селяне). Они обрезали (им) уши, носы и бросали на дороге. Это нам зимой не раз зачитывали...

До свидания, Александр.

КОРАБАЎ Сяргей Віктаравіч, нарадзіўся 24.4.1964 г. ў Быхаве ў сям'і рабочых. Член ВЛКСМ. У 1978 г., пасля сканчэння сярэдняй школы № 1 г. Быхава, паступіў у Кіраўскае СПТВ механізацыі сельскай гаспадаркі. Атрымаў спецыяльнасць газаэлектразваршчыка. У Савецкай Арміі з 20.9.1982 г. Загінуў 3.12.1983 г. Пахаваны ў Быхаве, на могілках пастаўлены помнік. С. В. Корабаў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

...Баявая група нашых воінаў у час рэйду трапіла ў засаду. Душманы пачалі іх акружаць. Было прынята рашэнне адыходзіць. Сяргей Корабаў і яшчэ двое байцоў засталіся прыкрываць таварышаў. Групе ўдалося выйсці з-пад абстрэлу, але хлопцы, што выклікалі агонь на сябе, пагеройску загінулі...

МАСКАЛЬКОЎ Мікалай Цімафеевіч, нарадзіўся 1.11.1961 г. ў Быхаве ў сям'і рабочых. Член

Быховский районный историко-краеведческий музей

У. Л. Смыкаў.



П. М. Стральцоў.

ВЛКСМ. У 1969 г. скончыў сярэднюю школу № 4 г. Быхава. У Савецкай Арміі з лістапада 1979 г. Загінуў 27.9.1980 г. Пахаваны ў Быхаве, на магіле ўстаноўлены помнік. М. Ц. Маскалькоў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

...Батальён вяртаўся з баявой аперацыі ў правінцыі Баглан. Мікалай Маскалькоў на сваім ЗІЛе замыкаў калону. Нечакана раздаліся стрэлы. Адна куля трапіла ў байца Маскалькова...

МІЦЬКОЎ Ігар Яўгенавіч, нарадзіўся 2.8.1966 г. ў Быхаве ў сям'і рабочых. Член ВЛКСМ. У 1983 г. скончыў сярэднюю школу № 2 у Быхаве, потым Бабруйскую школу ДТСААФ. Працаваў рабочым-будаўніком у Быхаўскай ПМК № 19. У Савецкай Арміі з 16.10.1984 г. Загінуў 27.10.1985 г. Пахаваны ў Быхаве, на магіле пастаўлены помнік. І. Я. Міцькоў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

З пісьма І. Я. Міцькова брату Васілю

15 лютага 1985 г.

Привет из Шинданда!

Здравствуй, мой братишка Вася! Вот решил написать тебе письмо, ну, и конечно, получить от тебя ответ...

Немного напишу о себе. Я служу в Шинданде, вблизи иранской границы. Служба идет и не плохо и не хорошо. Но лучше было бы, если бы здесь не служил никто и чтобы все было спокойно... Ну, ладно, об этом... Лучше будем говорить о твоих делах... Вася, ты, наверное, уже с девчатами ходишь. Но за меня тоже не расстраивайся. Я тоже с ними хожу во сне. У меня «подруга» такая есть, что любой из вас, гражданских, позавидует. Эта «подруга» днями висит на плече, очень ревнивая, кому хочешь мозги выбьет. Во такие у нас «девчата».

Пиши, Вася, жду очень, пиши о себе, о своих делах, о доме, обо всем пиши...

Игорь.

СМЫКАЎ Уладзімір Леанідавіч, нарадзіўся 9.5.1965 г. ў в. Кузькавічы Быхаўскага раёна ў сям'і рабочых саўгаса. Член ВЛКСМ. Вучыўся ў Кузькавіцкай васьмігадовай школе, у 1983 г. скончыў 10 класаў Ветранскай сярэдняй школы. Пасля працаваў на племзаводзе «Вараніно». У Савецкай Арміі з 28.10.1983 г. Загінуў 19.3.1985 г. Пахаваны ў в. Кузькавічы, на магіле пастаўлены помнік. У. Л. Смыкаў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

...У час захопу склада з боепрыпасамі і ліквідацыі верхавода банды мяцежнікаў радавы Уладзімір Смыкаў быў цяжка паранены ў жывот. Больш трох гадзін змагаліся ўрачы за жыццё байца. Аднак раненне было смяротным...

СТРАЛЬЦОЎ Пётр Міхайлавіч, нарадзіўся 8.7.1964 г. ў в. Малінаўка Быхаўскага раёна ў сям'і калгаснікаў. Член ВЛКСМ. У 1981 г. скончыў Макранскую сярэднюю школу, у 1982 г. Магілёўскае ПТВ № 4, працаваў электрыкам. У Савецкую Армію прызваны восенню 1982 г. Загінуў 27.8.1983 г. ў час прыкрыцця групы нашых байцоў. Пахаваны ў в. Макраны, на магіле ўстаноўлены помнік. П. М. Стральцоў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Народныя калектывы

Быхаўскі народны духавы аркестр раённага Дома культуры. Арганізаваны ў 1963 г., з 1973 г. мае званне народнага. Кіраўнік: А. Зарэцкі (1963—1973), В. Куляшоў (з 1973).

У рэпертуары аркестра канцэртны марш «Канстанцін Заслонаў» А. Яроменкі, канцэртная фантазія на тэмы песень аб працоўнай доблесці «У славу Радзімы» М. Вахуцінскага, фантазія «Партызаны Беларусі» А. Аміра на тэмы песень У. Алоўнікава, аранжыроўкі песень савецкіх, у тым ліку беларускіх, кампазітараў, беларускіх народных танцаў, балетных фрагментаў. Калектыў гастраліруе па рэспубліцы, выступаў у г. Шаўляй (Літоўская ССР, 1979). Дыпламант Усесаюзнага фестывалю ў гонар 50-годдзя Вялікага Кастрычніка (1967).

Быхаўскі народны хор народнай песні медыцынскіх работнікаў раённай бальніцы. Арганізаваны ў 1975 г., з 1980 г. мае званне народнага. Кіраўнік І. Івашкова (з 1977).

Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей

У рэпертуары хора беларускія народныя песні «А ў полі крыніца», «Антон маладзенькі», «Ехалі хлопцы з кірмашу», песні беларускіх савецкіх кампазітараў «Ты ў сэрцы маім, Беларусь» А. Граса, «Песня рабочай славы» Ю. Семянякі, «Партызанскі край» і «Калгасная карагодная» І. Кузняцова, «Ой ты, край любімы», «Ой, зайграйце, музыкі» А. Шыдлоўскага, а таксама песні рускіх савецкіх кампазітараў; літаратурна-музычная кампазіцыя «Ваенурачы 40-х гадоў». У складзе хору працуюць мужчынскі і жаночы вакальныя ансамблі, квартэт, трыо, дуэты.

Быхаўскі гісторыка-краязнаўчы музей



Адна з залаў Быхаўскага гісторыка-краязнаўчага музея.

4.6.1979 г. Бюро ЦК КПБ прыняло рашэнне аб стварэнні гісторыка-краязнаўчага музея ў Быхаве. Пачалася актыўная падрыхтоўка да стварэння і адкрыцця экспазіцыі музея. Асноўную частку экспанатаў склалі матэрыялы, перададзеныя з музея рэдакцыі раённай газеты «Маяк Прыдняпроўя», які працаваў таксама грамадскіх пачатках. Шмат дакументаў, фатаграфій і іншых матэрыялаў сабрана работнікамі музея. Адкрыццё музея адбылося 29 чэрвеня 1984 г.

Музей размешчаны на тэрыторыі былога Быхаўскага замка, мае 8 экспазіцыйных залаў, агульнай плошчай 288 м². Музейныя фонды налічваюць каля 2,5 тысячы адзінак. Адкрывае экспазіцыю зала археалогіі, экспанаты якой у храналагічным парадку раскрываюць гісторыю развіцця краю і далёкіх продкаў. Вялікую цікавасць у наведвальнікаў выклікаюць рэдкія экспанаты: зуб маманта, фрагменты біўняў маманта, каменныя прылады працы, гліняны посуд. Ёсць у музеі матэрыялы пра гісторыю г. Быхава, Быхаўскі замак, вызваленчую вайну беларускага і ўкраінскага народаў у 1648—1654 гг., Паўночную вайну 1700—1721 гг., Айчынную вайну 1812 г., Вялікую Кастрычніцкую сацыялістычную рэвалюцыю, грамадзянскую вайну, калектывізацыю. Увагу наведвальнікаў прыцягваюць матэрыялы аб стварэнні і дзейнасці адной з старэйшых камун — камуны імя Карла Лібкнехта ў в. Сарочына, аб дваццаціпяцітысячніку П. З. Захарыеву з Балгарыі, які стаў 1-м старшынёй калгаса «1 Мая». Шмат матэрыялаў музея прысвечана ўдзелу ўраўнікаў Быхаўшчыны ў Вялікай Айчыннай вайне. Стэнды залаў расказваюць пра абарону Быхава ў 1941 г., партызанскі рух у раёне, пра дзейнасць падпольных райкомаў партыі і камсамола. У зале Перамогі ўстаноўлена 14 бюстаў Герояў Савецкага Саюза, якія нарадзіліся ў Быхаўскім раёне. Асобны стэнд прысвечаны Герою Савецкага Саюза, маршалу авіяцыі С. А. Красоўскаму, які нарадзіўся ў в. Глухі. На другім стэндзе змешчаны фатаграфіі 11 Герояў Савецкага Саюза, якім было прысвоена гэта высокае званне за подзвігі, здзейсненыя на тэрыторыі Быхаўскага раёна. Шмат матэрыялаў сабрана пра легендарную Лудчыцкую вышыню. Аб лепшых прадпрыемствах раёна, калгасах і саўгасах, развіцці медыцыны, народнай асветы, культуры і спорту расказвае экспазіцыя адной з заключных залаў. Асобны стэнд прысвечаны савецка-балгарскай дружбе. Завяршае экспазіцыю музея куток прыроды.

За час існавання музея яго наведалі каля 50 тысяч экскурсантаў з раёна і розных рэгіёнаў рэспублікі і краіны, пабывалі госці з замежных краін. У залах музея праводзяцца сустрэчы з вядомымі людзьмі, ветэранамі вайны і працы, піянерскія зборы, уручэнне камсамольскіх білетаў, пашпартоў. Людзі ідуць сюды, каб пазнаёміцца з гісторыяй Быхаўшчыны, каб лепш зразумець яе сённяшні дзень, больш пазнаць яе прыроду.

Л. М. Усава.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Змест

Да чытача 17
Зямля нашых продкаў 19
За ўладу Саветаў 69
Да новага жыцця 119
Ішла вайна свяшчэнная 157
Спісы загінуўшых у Вялікую Айчынную вайну 293
У мірнай працы 551

Прадстаўнікі грамадскасці Быхаўскага раёна, што прымалі актыўны ўдзел у пошуку, зборы і падрыхтоўцы матэрыялаў для кнігі «Памяць»:

Н. Н. Адасёў, Е. Ц. Андрэенка, Т. М. Бабцова, В. А. Белакузаў, М. М. Васюкоў, І. К. Галіноўскі, А. Ф. Гарошка, В. С. Гунева, І. Х. Дрыгант, М. П. Завальнікаў, І. І. Казлоў, В. А. Кілеса, Я. А. Красоўскі, Н. М. Нарэўская, М. П. Паляўцоў, Г. І. Скібінская, П. Н. Шлеянкоў, М. К. Шульга, С. М. Ярошчанка.

Супрацоўнікі выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі, якія працавалі над кнігай:

рэдакцыя гісторыка-дакументальных хронік — Г. К. Кісялёў (загадчык рэдакцыі), Л. М. Драбовіч, І. В. Камароў, З. І. Каршакова, Ф. І. Кітаева, Н. В. Шаўрук; з іншых рэдакцый і службаў выдавецтва — С. А. Жукавень, Т. У. Кавалеўская, М. А. Маўзон, Т. П. Панчанка, Г. Н. Фешчанка, М. К. Хадыка.

Фота: В. Антонава, А. Спрынчана, з фондаў Быхаўскага гісторыка-краязнаўчага музея, асабістых архіваў і архіва БелСЭ.

Массово-политическое издание

ПАМЯТЬ

Историко-документальная хроника Быховского района

Минск, издательство «Белорусская Советская Энциклопедия» имени Петруся Бровки

На белорусском языке

Масава-палітычнае выданне

ПАМЯЦЬ

Гісторыка-дакументальная хроніка Быхаўскага раёна

Мастацкі рэдактар *П. Я. Кухта*
Тэхнічныя рэдактары: *М. І. Грыневіч, І. І. Цыцаня, Н. М. Шэвель*
Карэктары: *В. І. Багдановіч, І. П. Васілеўская, Н. А. Дзянісава, М. С. Мельнік, Т. Я. Радзевіч, Л. У. Сідарава, Л. В. Суцягіна, А. А. Федасеева*

ИБ № 140

Здадзена ў набор 17.04.89. Падпісана да друку 04.04.90. АТ 05538. Фармат 70×90¹/₁₆. Папера афсетная. Гарнітура звычайная новая. Друк афсетны. Ум.-друк. арк. 42,1. Ум. фарба-адбіткаў 47,38. Ул.-выд. арк. 76,34. Тыраж 20 000 экз. Зак. 2435. Цана 3 р. 80 к.

Выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі Дзяржаўнага камітэта Беларускай ССР па друку. 220600, Мінск, вул. Ф. Скарыны, 15а.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, вул. Чырвоная, 23.

Быховский районный историко-краеведческий музей

Быховский районный историко-краеведческий музей

Быховский районный историко-краеведческий музей

- MADE -
Ж.С.Ф.
~2011~